ПАМЯЦЬ

КЛІЧАЎСКІ РАЁН

ПАМЯЦЬ

КЛІЧАЎСКІ РАЁН



БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАМЯЦЬ

ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ ХРОНІКА
КЛІЧАЎСКАГА РАЁНА



МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ
1995

ББК 63.3(2Б)
П 15
УДК 947.62

ГАЛОЎНАЯ РЭДАКЦЫЯ «БЕЛАРУСКАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ»:

Б. І. Сачанка (галоўны рэдактар), І. П. Хаўратовіч, С. П. Самуэль, Я. В. Малашэвіч, М. М. Курловіч

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

М. А. Сінькевіч (старшыня камісіі), Л. Л. Ачыновіч, У. У. Заскевіч, Н. С. Кляўко, Т. М. Касцюкевіч, К. А. Харчанка

Рэдактар-складальнік У. А. Салановіч
Мастак А. М. Хількевіч

9470620000—011
П ——————— 13—95
М 318(03)—95
ISBN 985-11-0009-9

© Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, 1995
© Складанне. У. А. Салановіч, 1995
© Афармленне. А. М. Хількевіч, 1995



СЯЛЕЦ

ВЯЗЕНЬ
Той скрываўлены ранак быў
чорны ад горкага дыму
І дрыжэла зяпля ад
сняротнага стогну дахвяр.
Боль пякучы ў сэрцах
стрымайце,беражыце Радзіму
Каб ніколі не выбухнуў
новы ваенны пажар!

СЛАВА ВАМ
ХРАБРЫЕ,
СЛАВА,
БЕССТРАШНЫЕ,
ВЕЧНУЮ СЛАВУ
ПОЕТ
ВАМ НАРОД
ДОБЛЕСТНО
ЖИВШИЕ,
СМЕРТЬ
СОКРУШИВШИЕ
ПАМЯТЬ О ВАС
НИКОГДА
НЕ УМРЕТ.

ДОБРО ПОЖАЛОВАТЬ

АСНОЎНЫЯ СКАРАЧЭННІ, ПРЫНЯТЫЯ Ў КНІЗЕ «ПАМЯЦЬ»

авіяц. (авиац.) — авіяцыйны
арт.— артылерыйскі
в. (д.) — вёска (деревня)
вобл. (обл.) — вобласць
воп.— вопіс
г.— год, горад
гл.— глядзі
г. п.— гарадскі пасёлак
гв.— гвардзейскі, гвардыі
ДА — Дзяржаўны архіў
інж. (инж.) — інжынерны
інш.— іншыя
истреб.— истребительный
кав.— кавалерыйскі
кап.— капітан
л.— ліст
лейт.— лейтэнант
мал. (мл.) — малодшы
отд.— отдельный
нар. (р.) — нарадзіўся
палк.— палкоўнік
пас. (пос.) — пасёлак
рад. (ряд.) — радавы
развед.— разведвальны
р-н — раён
с.— сяло
С.— старонка
сп.— стралковы полк
сд.— стралковая дывізія
с/с — сельсавет
ст.— старшы, станцыя, станіца
старш.— старшына
сяржа. (серж.) — сяржант
т.— том
танк.— танкавы
ф.— фонд
Чырв. Армія — Чырвоная Армія
штурм.— штурмавы
яфр. (ефр.) — яфрэйтар

ЗМЕСТ

АД ШЧЫРАГА СЭРЦА 17
Клічаўскі раён (кароткая даведка) 18
ХТО МЫ І АДКУЛЬ 19
Клічаў і Клічаўшчына 19
Археалагічныя знаходкі сведчаць 20
Як жылі ў сярэднявеччы 26
Павіннасці сялян маёнтка Вольса 29
Пасля прыгону 31
Дакументы сведчаць 40
Данясенне палкоўніка Рэйхарта шэфу жандараў князю Далгарукаву пра разгром атрада Дыбоўскага каля в. Ялоўка 41
З данясення Мінскаму губернатару 41
З абвінаваўчага акта па справе сялян в. Дулебна Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні 41
Звесткі пра колькасць насельніцтва ў Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета 42
З гісторыі населеных пунктаў 42
«Лёс асудзіў мяне на раннюю гібель...» 69
Прысуд выканаў невядомы. Урыўкі з нарыса У. Арлова 71
Данясенне начальніка С.-Пецярбургскай губернскай жандарскай управы ў дэпартамент дзяржаўнай паліцыі № 2768 74
Данясенне Віленскага, Ковенскага і Гродзенскага генерал-губернатараў пану міністру ўнутраных спраў № 337 74
Ці была Клічаўшчына бязбожнай? 75
З легенд і паданняў Клічаўшчыны 81
ВЯЛІКІ ПЕРАЛОМ 84
Подых рэвалюцыі 84
На новы лад 86
Што пісала пра Клічаўскі раён Бабруйская акруговая газета «Камуніст» у 1925 годзе 87
Чорны цень рэпрэсій 90
Эканоміка раёна напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны 91
Дзьмуў вецер перамен. З успамінаў І. П. Лук'яновіча 94
Клічаўскае раённае таварыства краязнаўства 95
Клічаўскі кірмаш 95
І назвалі калгас «Абуджэнне» 97

Аб чым пісала раённая газета «Сталінскі шлях» у 1938 годзе . . . 100
Салодкае слова — воля! 101
Бацэвіцкі пан — міністр Польшчы 104
Палац Назабытоўскага ў Бацэвічах 107
Першы прафесар геаграфіі на Беларусі 108
«Незалежнасць Беларусі» 113
Лёс Наталоўскага польскага сельсавета 114
Жыў-быў кулак Антон 115
Салодкае слова — воля! (працяг) 116
Блуканне па пакутах. З успамінаў М. Л. Кушнер 123
Вернутыя імёны. Спіс жыхароў Клічаўскага раёна, якія беспадстаўна рэпрэсіраваныя і рэабілітаваныя 124
Удзельнікі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 151
Аб чым пісала раённая газета «Сталінскі шлях» у 1940 годзе . . . 152
Воіны-землякі, якія загінулі ў савецка-фінляндскую вайну 154
Аб чым пісала раённая газета «Сталінскі шлях» у 1941 годзе . . . 156
У ПОЛЫМІ ВАЙНЫ 157
Партызанскі край 157
Клічаўская партызанская зона 171
Партызанскія фарміраванні 171
Арганізатары партызанскага руху 175
Баявыя аперацыі 177
Бой за Клічаў 178
Развадаўскі бой 182
Зарэчанска-Усохскі бой 183
Дуброўскі бой 184
Ваевіцкі бой 185
На пераправе ў Заполлі 188
Дакументы сведчаць 188
З пастановы Клічаўскага падпольнага райкома КП(б)Б і выканкома раённага Савета дэпутатаў працоўных аб узнаўленні савецкай улады ў Клічаўскім раёне 188
Пастанова Клічаўскага падпольнага райкома КП(б)Б і выканкома раённага савета дэпутатаў працоўных аб веснавой сяўбе і карыстанні зямлёю на тэрыторыі Клічаўскага савецкага раёна ў 1942 г. . . . 188
Пратакол № 5 пасяджэння Клічаўскага падпольнага райкома КП(б)Б па пытанні рэалізацыі пастановы ад 23 красавіка 1942 г. «Аб стварэнні фондаў таварыскай дапамогі» 189
Пастанова Клічаўскага падпольнага райкома КП(б)Б і выканкома раённага Савета дэпутатаў працоўных аб размеркаванні азімых пасеваў, сенакосных угоддзяў і стварэнні ў раёне харчовых фондаў абароны 189
Пісьмо сакратара падпольнага РК КП(б)Б Я. І. Зайца ў ЦК КП(б)Б з просьбай прыслаць урача, медыкаменты і інш. 190
Рашэнне ўпаўнаважанага ЦК ЛКСМБ па Магілёўскай вобл. І. А. Матыля аб скліканні і парадку правядзення раённых падпольных камсамольскіх канферэнцый 191
Пратакол 1-й падпольнай камсамольскай канферэнцыі Клічаўскай раённай арганізацыі ЛКСМБ 191
Пастанова Клічаўскага падпольнага райкома КП(б)Б Магілёўскай вобл. аб зборы сродкаў на пабудову танкавай калоны «Беларускі партызан» 192
Зводка штаба ваенна-аператыўнай групы пры Магілёўскім падпольным абкоме КП(б)Б аб разгроме партызанамі гарнізонаў праціўніка 20 і 21 красавіка 1943 г. 193
Загад № 11 ваенна-аператыўнай групы пры Магілёўскім падпольным абкоме КП(б)Б аб адначасовым разгроме партызанамі 8 варожых гарнізонаў у ноч на 13 красавіка 1943 г. 194
З палітдонясення сакратара Клічаўскага падпольнага райкома ЛКСМБ М. Д. Лапцёнка 194
Партызанскі друк 194
Неслі людзям праўду 195

Карныя аперацыі 201
Крывавыя сляды карнікаў 206
«Галоўка яго баліць...» 206
Несхадзімае гора 208
У святы дзень, на Пакровы 212
Усакінскі лес 215
Вось так і жылі 223
Была і свая самаабарона 224
Партызанскі млын 225
Ваявалі ўсёй сям'ёй 226
«Не сорамна за сваіх настаўнікаў і вучняў» 228
Маладосць ёсць маладосць 229
Пакуль б'ецца сэрца 230
Хвацкія хлопцы-падрыўнікі 233
Засады на шашы 234
Вось такія яны, Кукушкіны 234
Браты-героі 237
Разгромілі акупантаў 238
Выбух на чыгунцы 239
У тую трывожную ноч 240
І словам гарачым, і справамі баявымі 241
«Лепш бы мяне...» 242
Пабрацімы 242
Клятве Гіпакрата не здрадзілі 245
З успамінаў У. А. Ціхамірава 245
Першае выпрабаванне 247
Так ваявалі медыкі 248
«Нізка пакланіцеся доктару» 250
Апошні бой героя 251
Вызваленне 253
На вогненных франтавых дарогах 254
Паядынак 257
Было наканавана лятаць 260
Баявы шлях Міхаіла Буцанца 260
Распісаўся на рэйхстагу 261
Тройчы перамог смерць 261
Бамбіў Берлін у 1941 262
Прысягаў жыццём 262
Абаронца Брэсцкай крэпасці 263
Крылаты Аляксей Вікторчык 264
Танкіст Іван Сокалаў 264
Ад Масквы да Берліна 264
Змагаўся і ў Войску Польскім 266
На вайне як на вайне 266
І франтавік, і партызан 267
Красная плошча ў маім лёсе 268
Курс — партызанскі аэрадром 268
Воіны-землякі, якія загінулі і прапалі без вестак на франтах Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг. 269
Воины Красной Армии, погибшие при обороне и освобождении Кличевского района и захороненные на его территории 347
Партизаны — уроженцы других районов и областей, которые погибли и похоронены на территории Кличевского района 353
Загінуўшыя партызаны і асобы, якія актыўна садзейнічалі партызанскаму руху, удзельнікі антыфашысцкага руху і падполля, члены іх сем'яў, мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору 359
ПАД МІРНЫМ НЕБАМ 409
Сённяшні дзень Клічаўшчыны 415
Нашы знакамітыя землякі 420
З гісторыі школы 421
Магілёўскі саўгас-тэхнікум 422
Наш лясгас 422

Першыя фермеры 423
Вялікая сям'я Кундзікавых 424
Чарнобыльскі след 425
Апошняя вышыня маёра 425
Дараваць можна, але забыць нельга 426
Людзі працоўнай доблесці 427
Заслужаныя работнікі Беларусі 432
Нашы землякі — беларускія пісьменнікі 435
Шлях у навуку 441
Лунаюць песні над Нясятай 447
І адгукнецца ў сэрцы... 449
Страдывары з Заполля 450
«Благаслаўляю прыгажосць» 451
Харавы калектыў 452
Агапа-чарадзейка 452
«Пошук, творчасць, ініцыятыва» 453
Боль Афганістана 454
Курган Бессмяротнасці 454
Усакінскі мемарыяльны комплекс 455
Музей народнай славы 457
Клічаўскі вальс 458

У пошуку, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў да кнігі «Памяць» прымалі ўдзел:

Прадстаўнікі грамадскасці Клічаўскага раёна: У. Р. Альцыванovіч, М. В. Аляхновіч, І. П. Барышчык, І. Ф. Галацэвіч, С. С. Ждановіч, Т. М. Ільянава, М. І. Ісаічкін, Т. М. Касцюкевіч, В. Р. Коўрык, М. І. Круты, С. В. Кудзін, В. Ц. Лепікаў, В. М. Лепа, С. І. Лісаковіч, К. Л. Малішэўская, Г. І. Маркава, І. В. Маркаў, С. В. Мароз, В. Р. Мігдасёў, А. П. Міхалап, А. В. Мязян, У. М. Назараў, У. У. Новік, Л. Я. Русецкая, З. І. Самец, З. Е. Самуйлёнак, Т. М. Талпыга, М. М. Тарасава, Н. М. Фралкова, Т. В. Харкевіч, К. С. Харлап, Н. У. Храмянкова, В. П. Шыдлоўскі.

Навукоўцы Мінска: У. Дз. Будзько, А. І. Валахановіч, Г. Дз. Кнацько, В. Я. Кудрашоў, А. Л. Манаенкаў, У. С. Пасэ, М. А. Сакалова.

Над кнігай працавалі: навуковыя рэдактары: У. А. Салановіч (рэдактар-складальнік), Т. І. Малашэвіч, Н. П. Ракіцкая, В. А. Юшкевіч; літаратурны кантроль: Т. М. Бутэвіч (загадчык рэдакцыі), навуковыя рэдактары М. А. Маўзон, Т. П. Панчанка, Е. П. Фешчанка, рэдактар М. К. Хадыка; рэдактар-картограф В. Ф. Надзененка; фотакарэспандэнты: Г. М. Бажанкоў (загадчык рэдакцыі), В. У. Харчанка.

Фота В. У. Харчанкі, з архіва БелЭн, Клічаўскага музея народнай славы, асабістых архіваў.

АД ШЧЫРАГА СЭРЦА

Клічаўшчына! Мілая сэрцу лясная салаўіная старонка, любы і дарагі куточак адвечнай нашай Бацькаўшчыны! Ты люляла нас — тваіх удзячных сыноў і дачок — пад шатамі векавых дуброў і пушчаў, паіла жывой вадой з чысцюткіх крыніц, песціла дабрынёй і чуласцю чалавечых сэрцаў, жывіла, ачышчала і мацавала дух вялікай мудрасцю продкаў. Дзякуй табе за ўсё — за нялёгкую школу працы, за гартаванне характараў, за шлях у жыццё! Дзе б ні былі мы, куды б ні закінуў нас лёс, мы — дзеці твае, помнім цябе і заўжды душою і сэрцам з табою!

Мы свята шануем памяць пра тых, хто аддаў за цябе жыццё, хто праславіў цябе працоўнымі, баявымі і творчымі подзвігамі. Клічаўшчына дала нямала наватараў вытворчасці, вядомых пісьменнікаў і паэтаў, военачальнікаў, навукоўцаў. Тут нарадзіўся выдатны грамадскі дзеяч Беларускай дзяржавы, знакаміты прафесар геаграфіі А. А. Смоліч. Пад Клічавам працаваў лесніком беларускі пісьменнік Карусь Каганец, які збіраў тут народныя паданні і літаратурна апрацоўваў іх.

Нашым землякам ніколі не бракавала мужнасці і адвагі. У ліхую гадзіну яны грудзьмі станавіліся на абарону Айчыны, свабоды і незалежнасці. У клічаўскіх лясах гуртаваліся паўстанцкія атрады Кастуся Каліноўскага. На Клічаўшчыне ўзгадаваны мужны нарадаволец Ігнат Грынявіцкі, які свядома пайшоў на непазбежную смерць дзеля лепшае долі народа, як быў у тым глыбока перакананы. Адсюль рабіліся партызанскія налёты на няпрошаных заваёўнікаў і акупантаў. У вяках не згасне бессмяротны подзвіг клічаўскіх партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Мы ганарымся тваімі поспехамі, Клічаўшчына.Для гэтай кнігі ўсе мы, хто дзе мог, рупна, па крупінцы збіралі, нібы кветкі ў вянок, звесткі. Так хацелася, каб светлы вобраз твой быў адлюстраваны поўна і ўсебакова. Даруй, калі што-небудзь зроблена недакладна. Прымі ў падарунак гэты вянок памяці! Няхай гэта кніга збярэ сыноў і дачок тваіх (хоць у думках) да родных клічаўскіх мясцін, з'яднае нашы душы, напоўніць сэрцы пачуццём вялікага далучэння да самай вялікай святыні — Бацькаўшчыны.

Раённая камісія па напісанні кнігі «Памяць» і выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі шчыра ўдзячны ўстановам, арганізацыям і прыватным асобам, якія аказалі садзеянне ў зборы, падрыхтоўцы, удакладненні матэрыялаў і выданні гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Клічаўскі раён».



Клічаўскі раён размешчаны ў паўднёва-заходняй частцы Магілёўскай вобласці. Утвораны ён 17.7.1924 г. Яго плошча 1,8 тыс. км^2. На тэрыторыі раёна 141 населены пункт, 8 сельсаветаў: Акцябрскі, Віркаўскі, Бацэвіцкі, Ганчанскі, Доўгаўскі, Каўбчанскі, Патоцкі, Нясяцкі. Цэнтр раёна — гарадскі пасёлак Клічаў.

Тэрыторыя раёна знаходзіцца ў межах Цэнтральнабярэзінскай раўніны; яе вышыня над узроўнем мора 200—240 м. Карысныя выкапні небагатыя: Ганчанскае радовішча торфу з агульнымі запасамі 9,1 млн. т і 2 невялікія радовішчы цагельнай сыравіны — Гліннае і Новы Спор.

Сярэдняя тэмпература студзеня —6,8, ліпеня 18,3 °С. Ападкаў 618 мм за год. Вегетацыйны перыяд 188 сутак. У межах раёна працякаюць рэкі: Бярэзіна (суднаходная) і яе левы прыток Ольса з Нясетай і Сушанкай, Друць (сплаўная) з Даўжанкай.

Пад лесам 56 % тэрыторыі раёна, пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі 30,4 %, у тым ліку 17,9 % ворных зямель. У раёне 8 калгасаў, 5 саўгасаў (1993 г.).

Працуюць прадпрыемствы харчовай, паліўнай, дрэваапрацоўчай прамысловасці.

Па тэрыторыі раёна праходзяць чыгунка Магілёў — Асіповічы, аўтамабільныя дарогі Бераэіно — Клічаў — Бабруйск і Клічаў — Чачэвічы.

ХТО МЫ І АДКУЛЬ!

Дзіўную ўласцівасць мае час: жывуць людзі — у кожнага сваё імя, біяграфія, пульсуюць жыццём гарады і вёскі, шумяць пушчы, нясуць свае воды рэкі, а праз стагоддзі пра многае губляецца след. І мы па зярнятку рупна збіраем звесткі пра наша далёкае мінулае, каб узнавіць гістарычную існасць, дакапацца да сваіх каранёў. Для нас гэта вельмі важна і неабходна, бо толькі спазнаўшы, як жылі і за што змагаліся нашы продкі, мы можам лепш спазнаць і саміх сябе, больш дакладна акрэсліць свае імкненні і мэты.

Клічаў і Клічаўшчына

Гаварыць пра Клічаўскі раён у сучасным разуменні правамерна з 1924 г., калі ён быў утвораны з цэнтрам у Клічаве. Што тычыцца тэрыторыі Клічаўшчыны, то ў 9 ст. яна ўваходзіла ў склад Кіеўскай Русі, з 12 ст.— у Мсціслаўскае княства, у складзе якога ў 1-й палове 14 ст. ўвайшла ў Вялікае княства Літоўскае. З 2-й паловы 16 ст. знаходзілася ў складзе Мінскага ваяводства. У 1793 г., калі да Расійскай імперыі была далучана цэнтральная частка Беларусі і на яе тэрыторыі створана Мінская губерня, у склад апошняй увайшлі Бацэвіцкая і Свіслацкая воласці Бабруйскага, Брадзецкая і Даўжанская воласці Ігуменскага паветаў.

Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што ўпершыню Клічаў як сяло Кличово ў Віцебскім ваяводстве ўпамінаецца пад 1592 г. у акце «Замѣна имѣній Дречихъ-Лукъ и Верховья, принадлежавшихъ князю Друцкому-Соколинскому, на имѣніе Соколинское, принадлежавшее Льву Сапѣгѣ, съ ограниченіемъ того и другого». У гэтым акце гаворыцца: «Въ селѣ Кличовѣ: Васько Никипоровичъ, подъ нимъ пулъ службы, платить пулъ копы грошей широкихъ» (Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею. Вильна, 1874. Т. 7. С. 457). Тут, паводле версіі А. І. Валахановіча, у назве сяла дапушчана памылка: назву трэба чытаць не Клигово, а Кличово, як яна і прыведзена ў геаграфічным паказальніку названага вышэй дакумента.

З сярэдзіны 16 ст. ў розных дакументах упамінаюцца многія іншыя населеныя пункты Клічаўшчыны — Бацэвічы, Нясята, Бёрда, Доўгае, Дубно, Заполле, Коўбча, Востраў, Суша (1560 г.). Захавалася апісанне сяла і двара Вольса ў 1-й трэці 17 ст., што ўваходзіла ў той час у склад Бабруйскага староства.

Мінулае гэтага ляснога краю цікавіла многіх вучоных і мясцовых краязнаўцаў. Шэраг каштоўных звестак пра населеныя пункты Клічаўшчыны змешчаны ў «Геаграфічным слоўніку Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краін». Зрабіў гэта беларускі гісторык і этнограф А. К. Ельскі, які бываў на Клічаўшчыне. Ёсць звесткі пра Клічаўшчыну і ў 3-м томе «Жывапіснай Расіі», што выдавалася пад рэдакцыяй віцэ-старшыні Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства П. П. Сямёнава-Цян-Шанскага. Рупліва збіралі гістарычныя звесткі пра свой край, яго легенды, паданні і самі мясцовыя жыхары. Дарэчы, на аснове пачутага тут у час працы лесніком беларускі пісьменнік Карусь Каганец напісаў некалькі сваіх твораў, якія змяшчаюцца ў гэтай кнізе.

Афіцыйна Клічаўскі раён утвораны ў адпаведнасці з пастановай 2-й сесіі ЦВК Беларусі, паводле якой былі скаса-

ваны паветы і воласці, а замест іх пачалі дзейнічаць акругі і раёны. Былыя Бацэвіцкая, Свіслацкая, Брадзецкая і Даўжанская воласці ўвайшлі ў склад Бабруйскай акругі. З гэтых валасцей 17 ліпеня 1924 г. і ўтвораны Клічаўскі раён, які ўвайшоў у склад Бабруйскай акругі. 20 жніўня ён быў падзелены на 12 сельсаветаў: Бацэвіцкі, Ваевіцкі, Ганчанскі, Запольскі, Клічаўскі, Кабылянскі, Каўбчанскі, Нясяцкі, Новамаксімавіцкі, Убалацкі, Уладзімірскі, Усакінскі. 8 кастрычніка 1924 г. ўтвораны Усохскі, а 17 снежня 1926 г.— Наталоўскі нацыянальны польскі сельскія Саветы. 8 ліпеня 1931 г. да Клічаўскага раёна далучаны Віркаўскі, Востраўскі, Грыбавецкі, Даўжанскі (Доўгаўскі), Дубенскі, Сялібскі, Ядрана-Слабодскі і Якшыцкі сельсаветы з ліквідаваных Свіслацкага і Чачэвіцкага раёнаў. 25 ліпеня 1931 г. Сялібскі і Якшыцкі сельсаветы перададзены Бярэзінскаму, а 12 лютага 1935 г. Грыбавецкі сельсавет — Кіраўскаму раёнам.

З 20 лютага 1938 г. Клічаўскі раён увайшоў у склад Магілёўскай вобласці, утворанай 15 студзеня 1938 г. 27 верасня 1938 г. Клічаў атрымаў статус гарадскога пасёлка, а 10 ліпеня 1939 г. быў скасаваны Клічаўскі і ўтвораны Дзмітраўскі сельсавет. На пачатак 1941 г. у раёне было 18 сельсаветаў: Бацэвіцкі, Ваевіцкі, Віркаўскі, Востраўскі, Ганчанскі, Дзмітраўскі, Доўгаўскі, Дубенскі, Запольскі, Кабылянскі, Каўбчанскі, Максімавіцкі, Нясяцкі, Убалацкі, Уладзіміраўскі, Усакінскі, Усохскі, Ядрана-Слабодскі, а таксама гарадскі пасёлак Клічаў.

З 20 верасня 1944 г. Клічаўскі раён у складзе Бабруйскай вобласці, а з 8 студзеня 1954 г. зноў у складзе Магілёўскай вобласці. 25 снежня 1962 г. Клічаўскі раён ліквідаваны, а яго тэрыторыя ўвайшла ў склад Кіраўскага раёна, а ў 1965 г. зноў адноўлены ў межах 1962 г. У ім (1994 г.) 8 сельсаветаў: Бацэвіцкі, Віркаўскі, Ганчанскі, Доўгаўскі, Каўбчанскі, Нясяцкі, Акцябрскі (былы Кабылянскі), Патоцкі.

Археалагічныя знаходкі сведчаць

На думку вучоных, засяленне тэрыторыі Клічаўшчыны пачалося прыкладна 12 тыс. гадоў назад. Гэта быў час так званага алеродскага пацяплення, калі адбыліся спрыяльныя змены ў прыродным асяроддзі і паўночна-заходняя частка Рускай раўніны вызвалілася з-пад ледавіковага покрыва. Прасторы цэнтральнай часткі Беларусі пакрыліся мяшанымі хваёва-бярозавымі лясамі, у далінах Бярэзіны, Друці, Дняпра сфарміраваліся надпоплаўныя тэрасы, зручныя для пасялення чалавека. Напэўна, у гэты час, у эпоху фінальнага палеаліту, сюды па Дняпры і яго прытоках з поўдня праніклі першыя людзі, стаянкі якіх даследаваны па берагах Дняпра каля вёсак Каромка Рагачоўскага, Бароўка Быхаўскага і Хвойная Магілёўскага раёнаў.

У выніку даследаванняў гэтых стаянак сабраны тысячы крамянёвых вырабаў, звязаных з паляўнічай і гаспадарчай дзейнасцю тагачасных людзей. З паляўнічай зброі захаваліся своеасаблівыя крамянёвыя наканечнікі стрэл з крутой рэтушшу на адным боку і выемкай на другім. Яны былі асіметрычныя ў плане і атрымалі ў археолагаў назву наканечнікаў «грэнскага тыпу». Менавіта гэтыя рэчы сталі вызначальнымі для грэнскай археалагічнай культуры, якую даследаваў і вылучыў у асобную культуру У. Дз. Будзько; у цяперашні час даследуюць В. Ф. Капыцін і У. П. Ксяндзоў. Прыладамі для разбірання мяса, зняцця і рэзкі шкур дзікіх жывёл служылі скрабкі, вастрыі са скошаным канцом, праколкі, нажы з нерэгулярнай рэтушшу. Дрэва, косць і рог найчасцей апрацоўвалі авальнымі сякерамі, сякерамі з перахватам, рэтушнымі разцамі. Паўфабрыкатамі для вырабу такіх прылад былі адшчэпы і пласціны, якія адбівалі ўдарным спосабам са спецыяльна падрыхтаваных крамянёвых ядрышчаў з дапамогай каменных адбойнікаў.

Асеўшы на Дняпры, насельніцтва грэнскай культуры на позніх этапах свайго існавання рассялілася па берагах Друці, Бярэзіны, Сажа, Дзясны, дзе таксама выяўлены стаянкі чалавека: каля вёсак Чыгірынка Кіраўскага, Гута Бярэзінскага раёнаў, г. Магілёва і інш. Храналагічныя межы і этапы развіцця гэтай культуры даследчыкі ацэньваюць па-рознаму: ад 14—10-га тысячагоддзяў да н. э. да 10—6-га тысячагоддзяў да н. э. Паходжанне грэнскай культуры звязваюць з больш старажытнымі на ўзросце культурамі позняга палеаліту суседніх тэрыторый Украіны і Расіі або з арэнбургскай культурай, насельніцтва якой мігрыравала ў Падняпроўе з тэрыторыі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы.

На тэрыторыі Клічаўшчыны помнікі эпохі мезаліту таксама не выяўлены, хоць

ПОМНІКІ АРХЕАЛОГІІ НА ТЭРЫТОРЫІ КЛІЧАЎСКАГА РАЁНА



ёсць усе падставы сцвярджаць, што археалагічныя знаходкі ў сумежных раёнах маюць прамое дачыненне і да гэтага рэгіёна, тэрыторыя якога, несумненна, была асвоена насельніцтвам каменнага веку і выкарыстоўвалася як паляўнічыя ўгоддзі.

Другой археалагічнай культурай, арэал якой перакрывае тэрыторыю цяперашняга Клічаўскага раёна, з'яўляецца днепрадзяснінская культура, што існавала ў 10—6-м тысячагоддзях да н. э. Найбліжэйшыя да тэрыторыі раёна даследаваныя помнікі гэтай культуры размешчаны каля вёсак Чыжаха Бярэзінскага, Чырвонае і Коссе Асіновіцкага, Стасеўка Бабруйскага раёнаў. Наканечнікі стрэл гэтай культуры адрозніваюцца ад грэнскіх: яны сіметрычныя па форме, часцей маюць на краях не адну, а дзве выемкі, апрацаваны, як правіла, двухбаковай рэтушшу. Дрэва, косць і рог апрацоўваліся як рэтушнымі, так і сярэдзіннымі і вуглавымі разцамі або авальнымі сякерамі. Сярод прылад для апрацоўкі шкур побач з канцавымі скрабкамі выкарыстоўваліся круглаватыя скрабкі і праколкі. Больш часта пачалі выкарыстоўвацца састаўныя прылады працы, укладышамі да якіх служылі невялікія пласцінкі і трапецыі. Пры раскопках стаянкі Стасеўка выяўлены рэшткі жытлаў днепра-дзяснінскай культуры. Гэта былі наземныя пабудовы круглай у плане формы (верагодна, у выглядзе чума паўночных народаў). Побач з жытламі знойдзены сляды агнішчаў, вакол якіх канцэнтраваліся расшчэпленыя крамяні. На думку У. П. Ксяндзова, які вылучыў гэту культуру, яна вядзе паходжанне ад свідэрскай археалагічнай культуры, носьбіты якой у 11—10-м тысячагоддзях да н. э. прыйшлі ў Падняпроўе з Заходне-Палескай і Польскай нізін.

Пераход да неаліту на тэр. Беларусі пачаўся ў 6-м тысячагоддзі да н. э., калі тут усталяваўся больш цёплы і вільготны клімат, які выклікаў забалочанне сушы ў яе цэнтральных і паўднёвых частках. Ад-

Каменныя прылады працы, знойдзеныя ў в. Заполле.

метнымі прыкметамі эпохі неаліту лічацца з'яўленне глінянага посуду і новых спосабаў апрацоўкі камянёў. У тую эпоху ў Верхнім Падняпроўі склалася верхнедняпроўская археалагічная культура (4—2-е тысячагоддзі да н. э.), якая вызначаецца наяўнасцю посуду з ямкава-грабеньчатым арнаментам. Арэал названай вышэй культуры ахоплівае басейны рэк Бярэзіны, Друці, Дняпра, Сажа, Беседзі і Іпуці, тэрыторыю Магілёўскай, часткі Мінскай, Гомельскай, Смаленскай і Бранскай абласцей, дзе выяўлена каля 300 паселішчаў. Матэрыялы гэтай культуры шырока вядомы ў суседніх раёнах: на Друці каля ст. Друць, вёсак Цяхцін, Прыбар Бялыніцкага раёна, каля в. Падсёлы Кіраўскага раёна; на Бярэзіне каля вёсак Чыжаха, Чырвоны Бераг, Святліца Бярэзінскага, в. Коссе Асіновіцкага, в. Сяліба Бабруйскага раёнаў і інш. Адзінкавыя знаходкі гэтага перыяду ёсць і на Клічаўшчыне каля вёсак Дзмітраўка, Заполле, Калічонка, Ядраная Слабада, аднак раскопкі там не праводзіліся.

Насельніцтва верхнедняпроўскай культуры жыло ў паўзямлянках круглай у плане формы, заглыбленых у зямлю да 0,8 м, з агнішчамі і гаспадарчымі ямамі ўнутры. Яно вырабляла вастрадонныя гаршкі з прамымі сценкамі, прамымі або адагнутымі вонкі венчыкамі, паверхню гаршкоў суцэльна арнаментавала глыбокімі ямкамі і адбіткамі грабеньчатага штампа, якія ўтваралі складаныя кампазіцыі; у гліну звычайна дабаўляла раслінныя дамешкі, пясок, жарству. Для палявання выкарыстоўваліся лук і стрэлы з рамбічнымі, трохвугольнымі, вербалістымі наканечнікамі. Выкарыстоўваліся таксама невялікія авальныя сякеркі, разцы, вастрыі, скрабкі, праколкі, свердлы, нажы серпападобнай формы і інш. Паходжанне верхнедняпроўскай культуры звязваюць з днепра-дзясніянскай або сожскай культурамі.

У эпоху бронзы (2-е тысячагоддзе да н. э.) людзі навучыліся здабываць з руды медзь, волава і вынлаўляць з іх бронзу, рабіць з яе прылады працы, зброю і ўпрыгожанні. Гэта значна паскорыла развіццё прадукцыйных сіл, спрыяла складванню шматгаліновай гаспадаркі, якая сумяшчала паляўніцтва і рыбалоўства з жывёлагадоўляй і земляробствам. У Верхнім Падняпроўі, у т. л. на Клічаўшчыне, у пачатку 2-га тысячагоддзя да н. э. сфарміравалася сярэднедняпроўская археалагічная культура (вылучыў І. І. Арцёменка), адметнай асаблівасцю якой былі добра апрацаваныя каменныя сякеры. Такія сякеры знойдзены на Клічаўшчыне жыхарамі вёсак Заполле, Дуброва, Калічонка, Асінаўка, Юзафін і г. п. Клічаў. Сякеры бронзавага веку, у адрозненне ад папярэдніх эпох, былі больш разнастайныя па форме, часцей прасвідраваныя для насадкі на тапарышча, з адшліфаванай паверхняй. Паселішчы гэтай культуры даследаваны каля вёсак Косцюшава і Калясы Рагачоўскага, Лубяны, Малая Арава і пас. Зарэчча Бялыніцкага раёнаў і інш. Пры раскопках паселішча Ксяндзова Гара паблізу Быхава знойдзены рэшткі наземных жытлаў і разнастайныя крамянёвыя прылады: скрэблы, скрабкі, нажы, клінападобныя сякеры, наканечнікі стрэл, фрагменты 20 ляпных гаршкоў. Гаршкі гэтай культуры пласкадонныя з шарападобным тулавам і з прамой вонкі адагнутай шыйкай, арнаментаваныя (заштрыхаваныя трохвугольнікі, хваінкавыя кампазіцыі, гарызантальныя і дыяганальныя рады) толькі ў верхняй частцы. Арнамент наносілі перавітай вяровачкай, лінейным ці зубчастым штампам, палачкай, абматанай тонкім шнуром. Пахавальныя абрады — трупапалажэнне ў ямах пад курганамі і трупаспаленне. На месцы будучай магільнай ямы распальвалі вогнішча і спраўлялі трызну. Дно магілы насыпалі попелам ці чырвонай вохрай, высцілалі чаротам і бяростай. Нябожчыка клалі на баку ў скурчаным становішчы, мужчын галавой на поўнач, жанчын — на поўдзень. Магільныя ямы найчасцей накрывалі драўляным насцілам і насыпалі пяўсферычны курган. Сустракаюцца «багатыя» пахаванні з мноствам крамянёвых (наканечнікі стрэл, нажы) і металічных рэчаў (сякеры, дроцікі, шылы, бранзалеты, скроневыя кольцы і інш.). Паводле абраду трунаспалення нябожчыкаў хавалі ў бескурганных магільных ямах.

Сярэднедняпроўская культура спыніла сваё існаванне ў сярэдзіне 2-га тысячагоддзя да н. э., калі на гэтай тэрыторыі яе змяніла сосніцкая культура. Асноўныя адрозненні гэтых культур у форме і арнаментацыі посуду.

Жалезны век пачаўся з асваення людзьмі спосабаў атрымання жалеза, што ўнесла сур'ёзныя змены ў іх гаспадарку. Жалеза выплаўлялі з балотных або азёрных руд, якіх было шмат у лясной зоне Усх. Еўропы. Выкарыстанне жалезнага рала спрыяла ўзнікненню сістэмы ляднага земляробства, што паўплывала на развіццё жывёлагадоўлі, на ўзнікненне прадзіва і ткацтва. На Беларусі першыя вырабы з жалеза зафіксаваны ў 7 ст. да н. э. на помніках мілаградскай культуры, паўночная і паўночна-ўсходняя межы якой дасягалі тэрыторыі Быхаўскага і Бабруйскага раёнаў. На поўначы гэта культура межавала з днепра-дзвінскай, а на паўночным захадзе — з культурай штрыхаванай керамікі, якая існавала ў цэнтральнай паласе Беларусі ў 7 ст. да н. э.— 5 ст. н. э. Назва культуры штрыхаванай керамікі звязана з вырабам яе насельніцтвам своеасаблівага посуду, вонкавая і ўнутраная паверхні якога былі ўкрыты хаатычнымі штрыхамі, што наносіліся пучкамі саломы, сушанай травы, тонкіх пруткоў. У Клічаўскім раёне такая кераміка знойдзена каля былой в. Палесціна ва ўрочышчы Чарапова на левым беразе р. Бярэзіны. Вядома яна таксама і на тэр. Асіповіцкага, Бярэзінскага, Барысаўскага і Бялыніцкага раёнаў. Верхняе цячэнне Друці ў 8 ст. да н. э.— 5 ст. н. э. было заселена плямёнамі днепра-дзвінскай культуры.

Плямёны культуры штрыхаванай керамікі найчасцей жылі на ўмацаваных паселішчах-гарадзішчах, якія спачатку не мелі земляных умацаванняў, а пазней пачалі ўмацоўвацца валамі і ярамі. Жылыя і гаспадарчыя пабудовы на гарадзішчах размяшчаліся на пляцоўках паблізу насыпных валоў. Жытлы былі двух тыпаў — слупавыя і зрубныя. Апрача ляднага земляробства і жывёлагадоўлі насельніцтва займалася паляваннем, а таксама рыбалоўствам і збіральніцтвам.

З хатніх промыслаў галоўная роля належала металургіі жалеза. Яго апрацоўка ажыццяўлялася амаль на кожным паселішчы, аб чым сведчаць масавыя знаходкі жалезных шлакаў, крыц, абломкаў домніц, жалезных загатовак і інш. Асартымент жалезных рэчаў налічвае каля 20 назваў.

Гліняны посуд выраблялі спосабам стужачна-кальцавога налепу. У межах арэала культуры вылучаюць 4 тыпы посуду. У басейне Бярэзіны часцей сустракаюцца гаршкі з пляскатым дном, злёгку адагнутым венчыкам, невысокай шыйкай, выразным плечуком, які плаўна пераходзіць у пукатае тулава. Найбольш пашыраны посуд з вострым рабром у верхняй частцы, нахіленым унутр венчыкам і прамымі сценкамі, якія конусападобна звужаюцца да пляскатага дна. У невялікай колькасці трапляецца посуд слоікападобнай формы і міскі з глянцаванай паверхняй. Большасць даследчыкаў лічыць, што культура штрыхаванай керамікі пакінута балтамоўнымі плямёнамі. У раннім жалезным веку на тэрыторыі Клічаўскага раёна жылі плямёны зарубінецкай культуры, аб чым сведчаць знаходкі аднаведнай керамікі каля вёсак Дулебна і Палесціна, бронзавай фібулы з эмаллю каля в. Альхоўка. Гэтыя рэчы датуюцца 2—5 ст. н. э. Археалагічныя помнікі позняга этапа зарубінецкай культуры, які, на думку Л. Д. Побаля, прадаўжаўся да 9 ст. н. э., даследаваны ў суседніх Бярэзінскім, Бабруйскім, Быхаўскім, Кіраўскім і Бялыніцкім раёнах.

На ўсёй тэрыторыі, дзе жылі позназарубінецкія плямёны (басейны Прыпяці, Пасожжа, смаленскае Падняпроўе і частка Браншчыны), асноўнымі іх помнікамі з'яўляюцца селішчы і бескурганныя могільнікі з трупаспаленнем. Іх жытлы мелі наземную слупавую канструкцыю (на больш нізкіх месцах) або паўзямлянкавую з адкрытымі агнішчамі ў сярэдзіне. На селішчах былі таксама гаспадарчыя і вытворчыя збудаванні і ямы-скляны. Нябожчыкаў спальвалі па-за межамі пахавання, рэшткі іх хавалі ў круглыя і падоўжаныя ямы. У адных выпадках у яму высыпалі толькі косці, у другіх — косці разам з попелам і вуголлем. У пахавальных ямах знойдзены гаршкі, красіцы, пацеркі, жалезныя ўпрыгожанні, неабпаленныя косці свойскіх жывёл. Ёсць падставы лічыць, што на позніх этапе гэтай культуры ляднае земляробства саступіла месца ворнаму, пра што сведчаць вялікія памеры жалезных сярпоў, знаходкі жорнаў і інш. На ўсіх паселішчах выяўлены прыкметы кавальскай і бронзаліцейнай спраў, прадзення, ткацтва, ганчарства, апрацоўкі каменю, косці, рогу, дрэва і інш.

Масіўныя грубаляпныя гаршкі найчасцей аздабляліся грабеньчатымі прачосамі. У якасці ўпрыгожанняў насельніцтва карысталася разнастайнымі рэчамі з выемчатай эмаллю. Рымскае ўпрыгожанне з эмаллю — ажурная фібула - рамбічнай формы — выяўлена ў Клічаўскім раёне ў 1892 г. каля в. Альхоўка. На этнічную прыналежнасць плямён, якія пакінулі помнікі позняга этапа зарубінецкай культуры, у навуцы існуюць два погляды:

адны вучоныя звязваюць іх з балтамі, другія — са славянамі.

У 9—10 ст. на тэр. Клічаўскага раёна рассяліліся плямёны дрыгавічоў. З летапісаў вядома, што яны жылі паміж Прыпяццю і Зах. Дзвіной на вільготнай балоцістай мясцовасці — дрыгве (адсюль і назва дрыгавічы). Гэтыя плямёны мелі сваю палітычную арганізацыю «княжанне» да ўваходжання ў склад Кіеўскай Русі. Па-

Прадметы з курганоў дрыгавічоў: 1—5 — Ігуменскі павет (месца невядома); 6—31, 33, 34, 37 — з курганоў, раскапаных У. З. Завітневічам; 32 — Пуцілкавічы; 35 — Няжараўскія хутары; 36 — Красны Бераг; 1—34, 36, 37 — каляровы метал; 35 — гліна.

водле археалагічных звестак, паўднёвая мяжа дрыгавічоў праходзіла па Прыпяці, усходняя — па Дняпры, паўночная — па лініі Барысаў — Заслаўе, паўночна-усходняя — па водападзеле Друці і Бярэзіны, заходняя — па Выганаўскіх балотах. Даследчык дрыгавіцкіх курганоў У. З. Завітневіч вёў раскопкі і на тэр. Клічаўскага раёна — курганных могільнікаў каля вёсак Віркаў, Заполле, Лянёўка, Нясята, Пярэкаль, Вялікая Вольса. Найбольш старажытныя дрыгавіцкія курганы (9 ст.) на Клічаўшчыне былі ва ўрочышчы Сомік каля в. Вялікая Вольса. Пад насыпам аднаго з іх выяўлены рэшткі спаленага чатырохвугольнага драўлянага зруба. Гэта сляды рытуальнага вогнішча, на якім спальвалі нябожчыка, а насля рэшткі збіралі ў грудок і насыпалі над ім курган. Рэчаў пасля такога абраду заставалася мала, таму дайшлі да нас пераважна сплавы — камякі шкла ці бронзы.

У 9—11 ст. у дрыгавічоў пашырыўся абрад пахавання «на гарызонце». На паверхню зямлі клалі нябожчыка, яго абкладвалі з бакоў і накрывалі дошкамі. У некаторых курганах нябожчыкаў хавалі ў зрубах або надмагільных «церамках», складзеных з бярвён на вышыню 0,3—0,8 м і накрытых двухсхільным дахам. Нябожчыкаў клалі звычайна на спіну, галавой на захад. Зафіксаваны і пахаванні ў ямах, якія накрывалі камянямі. Звычайна ў курганах дрыгавічоў сустракаецца адно пахаванне, зрэдку — два. Сціпласць славян пацвярджаецца сцінласцю рэчаў у пахаваннях. У мужчынскіх магілах часцей сустракаюцца нажніцы для стрыжкі авечак, сярпы, сякеры і г. д., у жаночых — упрыгожані (кольцы з сярэбранага ці бронзавага дроту з неалітаванымі канцамі, медальёны, завушніцы ў выглядзе драцянага кольца з металічнымі пацеркамі, сярэбраныя, бронзавыя, сердалікавыя пацеркі, пакрытыя тонкімі залатымі ці сярэбранымі пласцінамі). Этнавызначальная рэч дрыгавічоў — буйныя металічныя пацеркі, пакрытыя зеляю, звычайна ў складзе караляў. Свой гліняны посуд дрыгавічы выраблялі на ганчарным крузе, добра абпальвалі яго ў печах. Венчык гаршка звычайна быў адагнуты вонкі, адразу за шыйкай пачыналася яго пукатая частка, што паступова звужалася да дна. Арнаментаваўся посуд ніткападобнымі гарызантальнымі лініямі, якія густымі радамі ўкрывалі верхнюю частку, або адбіткамі прамой ці хвалістай вяроўкі. У пахавальным абрадзе выкарыстоўвалі пасудзіны (відаць для падкурвання травой), якія ставілі каля ног нябожчыка. Часам такія пасудзіны былі драўляныя (у курганах ад іх захаваліся жалезныя абручы, а таксама дужкі ад вядзерцаў). Паселішчы дрыгавічоў на тэрыторыі раёна не выяўлены.

Антрапалагічнае вывучэнне дрыгавічоў дае падставы сцвярджаць, што значная частка іх насельніцтва ў паўночнай частцы Прыпяцкага Палесся і басейне Бярэзіны належала да даліхакраннага, адносна шыракатварага тыпу. У паўднёвых рэгіёнах яны былі больш доўгагаловага сярэднятварага тыпу.

Археолагі Беларусі, якія працягваюць карпатлівую работу па вывучэнні старажытных помнікаў, звяртаюцца да чытачоў «Памяці», у т. л. да жыхароў Клічаўшчыны, аказваць у гэтым пасільную дапамогу: па-першае, усямерна ахоўваць помнікі; па-другое, праз мясцовых краязнаўцаў паведамляць вучоным пра археалагічныя знаходкі. Ніжэй мы змяшчаем пералік археалагічных помнікаў і месцаў выпадковых знаходак старажытных прадметаў на тэрыторыі Клічаўшчыны.

Вёскі Клічаўскага раёна, каля якіх даследаваны або зафіксаваны і ўзяты на ўлік археалагічныя помнікі (курганныя могільнікі) 9—13 ст.: Арэхаўка, Бацэвічы,

Месцы выпадковых знаходак эпох неаліту, бронзы, ранняга жалезнага веку на тэрыторыі Клічаўскага раёна

Назва вёскі	Узрост знаходак	Тып знаходак
Дзмітраўка Заполле Калічонка Ядраная Слабада	Усе 4—3-е тысячагоддзе да н. э.	Кераміка Каменныя сякеры Кераміка Кераміка
Асінаўка Вялікая Вольса Дуброва Калічонка Клічаў Любічы Максімавічы Малая Вольса Перамога Хадэчын Юзафін	Усе 2—1-е тысячагоддзе да н. э.	Каменныя сякеры
Палесціна	7-е ст. да н. э.— 5-е ст. н. э.	Кераміка
Альхоўка	2—5-е ст. н. э.	Фібула

Бёрда, Віркаў, Вялікая Вольса, Ганаратаў, Доўгае, Драні, Заполле, Зарэчча, Каўбчанская Слабодка, Коўбча, Лаззё, Лянёўка, Малая Вольса, Нясята, Орліна, Патока, Пярэкаль, Перасопня, Станлава, Суша, Усакіна, Чырвоны Бераг, Ядраная Слабада.

Як жылі ў сярэднявеччы

З глыбокай старажытнасці асноўным заняткам мясцовага насельніцтва было паляванне, земляробства і жывёлагадоўля. Пазней сяляне займаліся таксама нарыхтоўкай і сплавам лесу, выраблялі клёпкі, колы для павозак, гвазды для ботаў, распрацоўвалі паклады вапняку, гліны і інш. Умовы жыцця сялян у пачатку 16 ст. можна прасачыць на прыкладзе Бабруйскага староства — тыповага феадальнага ўладання, у склад якога ўваходзілі сяло і двор Вольса, вёскі Бацэвічы, Бёрда і інш. населеныя пункты Клічаўшчыны.

Двор Вольса да 1662 г. належаў пану Мікалаю Заршынскаму, а пасля яго смерці за грашовы-выкуп перайшоў да Бабруйскага старосты. На час правядзення зямельнай рэформы, якая ўвайшла ў гісторыю Беларусі як «Валочная памера», Бабруйскае староства поўнасцю знаходзілася ва ўладанні старосты Пётры Трызны і яго жонкі Ганны Масальскай.

Валочная памера спрыяла ўзнікненню гандлёвага капіталу ў землеўладальнікаў, а за грошы яны маглі пашыраць свае землі. Дзеля гэтага яны бралі пазыкі, але рабілі ўсялякія захады, каб выплаціць свае даўгі за кошт сялян. Таму ў землеўладальнікаў усё больш павялічваўся гандлёвы капітал. Яны ахвотна давалі пазыку нават самому вялікаму князю, за што ад яго атрымлівалі маёнткі і засноўвалі новыя фальваркі.

З развіццём таварна-грашовых адносін збор натуральных і грашовых падаткаў ужо не задавальняў землеўладальніка. Ён разумеў, што калі стварыць свой двор і фальварак, то можна істотна павялічыць даходы. Таму ў канцы 16 — пачатку 17 ст. пачала нараджацца новая форма панскай гаспадаркі — панскія двары і фальваркі. Для гэтага патрэбна была не толькі зямля, а і пастаянна замацаваная за ёй рабочая сіла. У красавіку 1557 г. вялікі князь Жыгімонт II Аўгуст зацвердзіў «Уставу на валокі» — закон аб правядзенні валочнай памеры. У яго аснове ляжаў абмер зямель на стандартныя зямельныя ўчасткі — валокі (21,35 га). Гэтым мелася на мэце зрабіць дакладны ўлік зямель, вызначыць іх якасць, пашырыць фальварковую гаспадарку, упарадкаваць павіннасці сялян і яшчэ больш іх запрыгоніць. Ва ўсходняй і цэнтральнай Беларусі валочная памера праводзілася з канца 16 да сярэдзіны 17 ст. Плошча валокі павінна была мець форму чатырохвугольніка і дзяліцца на 3 палі (для стабільнага трохпольнага севазвароту). Валока лічылася абкладной адзінкай, і з яе налічваліся ўсе павіннасці сялян. Як прыклад такога «чатырохвугольнага» падзелу зямлі захаваліся чарцяжы больш позняга часу (1913) хутарскіх участкаў з маёнтка Вольса ўрочышча Дуброва (уладанне памешчыка Фон-Грандзідзье ў Бабруйскім павеце Мінскай губ.).

На час правядзення валочнай памеры названы двор Вольса налічваў 4 валокі і 14 маргоў ворнай зямлі, 35 валок і 15 маргоў сенажацяў. Сам двор з фальваркам размяшчаўся ў канцы вісковых палетак в. Вольса. Збудаванні двара падзяляліся на жылую, фальваркова-гаспадарчую і спецыяльную часткі.

Жыллё складалася з вялікага і двух малых дамоў. У малых дамах вокны былі са смалянымі абалонямі. Абсталяванне пакояў: вакол сцен — лавы і ўслоны, шафы з верхнімі і ніжнімі сховамі (4 у вялікім доме), 6 вялікіх і малых сталоў, 3 зэдлікі і адно крэсла. Усё жыллё было абгароджана плотам. Вядомы дадатковыя фальварковыя будынкі: хата для наглядчыцы (гаспадыні), якая назірала за дворнай жывёлай; піўніца для малочных прадуктаў; сырніца для сушкі сыроў; свірны для збожжа; тры куратнікі ці гусятнікі; далей стаялі абора для буйной рагатай жывёлы і 4 хлявы. Усе фальварковыя будынкі былі накрыты дранцамі, аборы — саломай, абгароджаны плотам. Гумно размяшчалася воддаль ад двара. У Вольсе яно складалася з 2 стадол і 2 асецяў для сушкі, свірна з засекамі для збожжа і павеццю для саломы. Асобна над р. Ольсай стаяў бровар для вырабу гарэлкі і піва. Яго абсталяванне: 4 чаны, 2 кваснікі, 10 піўных бочак, 6 варыўных дзежак, 3 цэбры, бочка для мерання збожжа і чвэрць. Пад адным дахам знаходзіліся пякарня, памяшканне для вырабу соладу і лазня.

На кожную валоку дворнай раллі ў Вольсе прыпадала 19,5 сялянскіх валок, з іх — 7,5 залюдненых (астатнія не заселены). Дворная гаспадарка была цалкам

забяспечана працоўнай сілай: нры ўмове раздачы сялянам усіх вымераных валок двор мог мець 176 дзён паншчыны на тыдзень, а фактычна абыходзіўся толькі 68 днямі.

Вёскі мелі дапаможныя галіны гаспадаркі (ужыткоўнасці) — бортніцтва, рыбныя ловы і бабровыя гоны. Так, сяло Вольса мела рыбныя ловы на азёрах Гліншча і Ціхан (па адной тоні), на р. Ольса; бабровыя гоны на р. Ольса, на Старой Бярозе каля воз. Ветка і вакол яго.

Валочная памера, як вынік развіцця гандлёвага капіталу, была пачаткам глыбокіх змен у жыцці сялянства, закранула і арганізацыю вёскі. Яна замацоўвала трохпольны севазварот, рэкамендавала займаць пад сялібы другое (сярэдняе) поле, з чаго часам узнікала неабходнасць перасялення вёсак. Напрыклад, в. Бёрда была перанесена на новае месца і пабудавана па-новаму: хаты пастаўлены ў адзін рад, гумны аднесены насупраць.

Валочная памера замацоўвала падпарадкаванне сялянскай гаспадаркі ўладальніку двара, вызначала і новы аб'ект падаткаабкладання — валоку (замест старых службаў). Паводле «Уставы на валокі» грашовыя падаткі залежалі ад якасці глебы: з валокі добрага грунту — 21 грош, сярэдняга — 12, дрэннага — 8, найгоршага (пескаватага, балотнага) — 5 грошаў. Бабруйская устава вызначала грашовы падатак з валокі добрага грунту 2 капы, сярэдняга — 1,5 і дрэннага — 1 капу (60) грошаў. Амаль усе гаспадаркі, незалежна ад якасці грунту, былі абкладзены падаткам на 2 капы грошаў з валокі, а ў паасобных месцах і больш. Што датычыць засценкаў, то бабруйская устава не вызначала пэўных норм. Напрыклад, у в. Бёрда засценкі найгоршага грунту былі аддадзены за 15 літоўскіх грошаў.

Асноўнай формай феадальнай павіннасці (падаткам) стаў чынш (грашовая рэнта), які павялічваўся амаль у 6 разоў. Апрача таго спаганяліся і натуральныя падаткі, з якіх на першае месца ставілася «мядовая дань». Норма гэтай даніны ў розных вёсках была розная. Напрыклад, у в. Бёрда з аселай валокі бралі «па аднаму каменю мёду». Апрача таго з валокі селянін павінен быў даваць па бочцы жыта і аўса, 10 жмень лёну, 1 гусь, 2 курыцы, 20 яец, 10 вазоў дроў і воз сена. Да таго ж пры плаце падаткаў трэба было даваць «бірчага» па 3 грошы польскіх з кожнай валокі, падаткі на валасную адміністрацыю і інш. Былі і іншыя паборы. Напрыклад, калі жанчына ці дзеўка выходзіла замуж у «чужую» воласць, то яна плаціла выкуп: жанчына — 30 грошаў, дзеўка — 12 грошаў і 4 грошы «насадкі».

Да асноўных павіннасцей належалі і работы на фальварак. З аселай валокі селянін павінен быў адпрацаваць 2 дні прыгону ў тыдзень (на сваім хлебе), воласць абавязана была адпрацаваць 12 талон у год, даваць вартаўнікоў у фальварак, з кожных 3 валок раз на год выдзяляць падводу за 60 вёрст.

Насельніцтва абавязана было рамантаваць масты, дарогі, грэблі пры млынах. Малоць сваё збожжа лепш было на «сваіх» млынах, інакш браўся вялікі памольны збор: адна частка — млынару, 2 часткі — старосце. Падданыя воласці не маглі заводзіць шынкі і корчмы ў вёсках, бо права на гэта мелі толькі паны. За спагнаннем падаткаў і выкананнем павіннасцей спраўна сачыла валасная адміністрацыя.

Істотныя сацыяльныя зрухі на вёсцы можна прасачыць па інвентары Бабруйскага староства за 1765 г., паводле якога насельніцтва падзялялася на 6 груп. У 1-й групе (без рабочай жывёлы) налічвалася 128 гаспадарак (13,8 % гаспадарак староства), 465 асоб (8,1 % членаў сялянскіх сямей). У 2-й групе (з адным валом) было 45 гаспадарак (4,5 % сялянскіх сямей, 3,4 % членаў сялянскіх сямей; у 17 ст. доля такіх гаспадарак складала 10,3 %, у 1765 г.— 18,3 %). У 3-й групе (з адной галавой рабочай жывёлы; пераважна — канём) былі 232 гаспадаркі, 1153 асобы (у 17 ст. гэта група складала 10,8 %, у 1765 г.— 25,1 % гаспадарак). У 4-й групе, якая мела па 2 галавы рабочай жывёлы, у 1765 г. былі

Сялянская хата дауніх часоў (з экспазіцыі раённага музея).

кушанья и отдыха, свободных от работы; с 15 сентября по 1 апреля приходить на работу ровно с утреннею зарею, отходить с работы с вечернею зарею и полтора часа имеют отдыха.

11. Изменение недельной повинности последовать может от убыли или прибыли рабочих рук в семействах крестьян.

12. При посылке крестьян с продуктами господскими или за другими надобностями, полагается в зимнее время на одну лошадь 22 пуда тяжести, в летнее время 18 пудов и за всякие 50 верст в оба пути засчитается день рабочий, но если бы посылка случилась далее расстоянием, как сто верст, в таком случае сверх зачета дня рабочего на всякие пятьдесят верст помощник принимает на себя все издержки.

13. Предоставляет, наконец, помещик все права и преимущества над крестьянами государственными законами ему дарованные. К такому инвентарному описанию с приложением гербовой печати руку свою приложил Игнатий Михайлов Забелло.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Мн. 1940. Т. 2. С. 187—189.

Дакумент яскрава сведчыць пра тое, што ўстоі прыгонніцтва на той час былі даволі моцныя. Але пад уплывам рынку і таварна-грашовых адносін тут пачалі з'яўляцца і парасткі новага ўкладу жыцця: выкарыстоўваліся сельскагаспадарчыя машыны, узнікалі прадпрыемствы па перапрацоўцы прадукцыі земляробства і жывёлагадоўлі. Ёсць звесткі, што ў 1844 г. Ольскую прыстань і суднаходную частку ракі абслугоўвалі 288 рабочых, па р. Ольса прайшлі 82 плыты. На лёгкіх рачных суднах тут перавозілі соль, сала, пяньку, лён, табаку і інш. тавары. Агульны кошт перавезеных грузаў склаў 27 154 руб.

Адбываліся істотныя сацыяльныя змены, паглыблялася расслаенне сялянства. Так, у маёнтку Вольса ўзніклі 2 чыншавыя гаспадаркі (у адной 9 членаў сям'і, у другой — 10), якія істотна адрозніваліся ад сялянскіх. Яны займаліся рамяством, апрацоўвалі свой зямельны надзел і арандавалі зямлю ў пана, за што плацілі яму чыншу па 30 руб. серабром. Яны мелі па 1 дзесяціне пад сядзібай, па 15 дзесяцін ворнай зямлі і па 5 дзесяцін сенажацяў. Вылучаліся яны і па колькасці жывёлы: адна гаспадарка мела 5 коней, другая 12, валоў — адпаведна 2 і 5, кароў — 6 і 9, падцёлкаў — 5 і 6, авечак — 12 і 17, свіней — 7 і 12, курэй — па 10, пчаліных вулляў — 26 і 50.

Але доля чыншавых гаспадарак маёнтка Вольска складала толькі 3,1 % ад сялянскіх гаспадарак. На 2 чыншавыя гаспадаркі прыпадала 2,2 % сялібнай зямлі, 3,8 % ворнай, 3,4 % сенажацяў, 24,3 % коней (што ў 8 разоў перавышала працэнт гаспадарак), 7,1 % валоў, 18,4 % кароў (у 6 разоў перавышала долю сялянскіх гаспадарак), 8,9 % маладняку, 12 % авечак, 8,3 % свіней, 5 % курэй, 5,7 % гусей, 7,1 % пчол.

У той жа час у маёнтку Вольса было 18,5 % бабыльскіх гаспадарак, якія фактычна парвалі з сельскагаспадарчай вытворчасцю і зараблялі на жыццё іншымі заняткамі. Яны не мелі ворнай зямлі, а толькі па 3 дзесяціны сялібнай і па 2,5 дзесяціны сенажацяў. Кожны з такіх гаспадароў быў навучаны пэўнаму рамяству. Былі сярод іх кавалі, ткачы, муляры, калеснікі, краўцы, шаўцы і інш. Замест прыгону бабылі працавалі ў двары па сваёй набытай прафесіі, а за зямлю адпрацоўвалі ў пана па 12 дзён. Выплачвалі яны і грашовыя падаткі. Сем'і іх былі невялікія, пераважна з 4 асоб. На 12 гаспадарак прыпадалі 2 кані і 2 валы, па 1—2 каровы на гаспадарку, столькі ж маладняку, па 3—4 авечкі, па 4 свінні, па 2—3 гусі, па 5—6 курэй. Так жылі рамеснікі, якія задавальнялі пэўныя патрэбы маёнтка і за сваю працу атрымлівалі невялікую плошчу сялібнай зямлі і сенажаці.

Паводле звестак за 1848 г. усе прыгонныя сяляне маёнтка Вольса былі ў кабале ў пана, пазычыўшы ў яго 2025 руб. 75 кап. на набыццё ў асноўным рабочай жывёлы.

50 прыгонных гаспадарак маёнтка з рабочай жывёлы мелі па 1 каню і па 2 валы; у кожнай сям'і было па 6—7 чалавек. Сялібнай зямлі прыпадала па 1 дзесяціне, ворнай — па 15, сенажацяў — па 10 дзесяцін, па 3 авечкі, па 3 свінні, па 5 гусей, па 6 курэй на двор; пчол трымалі толькі некаторыя гаспадары.

Асобна ў інвентары стаіць адна гаспадарка, у якой былі 4 мужчыны і 8 жанчын, зямлі 21 дзесяціна, з рабочай жывёлы конь і 2 валы; з іншай жывёлы 2 каровы, 10 галоў маладняку, 10 авечак, 2 свінні, а таксама 4 гусі і 8 курэй.

Доля ўсіх (65) прыгонных гаспадарак у двары Вольса складала 96,9 %, доля коней у іх — 75,7 %, кароў — 81,6 %, пчол — 29 %. Без кароў было 19 гаспадарак (30,2 %), з 1 каровай — 24 (38,2 %), з 2 каровамі — 18 (28,5 %), а 3 і больш каровамі — 2 гаспадаркі (3,2 %).

Інвентары фіксуюць, што ў 1837 г. сяляне плацілі пану 60 кап. чыншу, 1 руб. 50 кап. падарожнага і 30 кап. невадавага падатку. Дзяржаўныя падаткі на кожную рэвізскую душу складалі па 4 руб. 65 кап.

Але паколькі спаганяўся падатак і за тых, хто адсутнічаў, і за тых, хто не мог яго заплаціць, то фактычна з кожнай рэвізскай душы спаганялася па 5 руб. 50 кап. У маёнтку Вольса агароднікі плацілі па 1 руб. 50 кап. Паводле інвентара пана Забелы, усе павіннасці і падаткі яго прыгонных складалі 28 руб. 35 кап. Былі і натуральныя падаткі. Кожная гаспадарка павінна была даваць па 2 чацверыкі жыта, ячменю і аўса, па 9 гарцаў хмелю, па адной гусі і курыцы, 10 штук яец, 60 штук грыбоў. Акрамя гэтага, сяляне павінны былі засыпаць збожжа ў запасны сялянскі магазін (па 5 гарцаў азімага і яравога збожжа з кожнай рэвізскай душы). З гэтага магазіна выдавалася пэўная колькасць пану, прычтам (штату свяшчэннаслужыцеляў і царкоўных служкаў) і бальніцы.

Сялянства, вядома ж, знаходзілася ў сацыяльна-эканамічнай залежнасці ад пана. Ён аддаваў сялян у рэкруты, караў рознымі штрафамі, распараджаўся нават сялянскім набыткам (прадаць збожжа, салому ці сена селянін не мог без дазволу пана). У маёнтку Вольса ўсе сяляне былі ў кабале ў пана Забелы за пазычаныя на жывёлу грошы. Раслі нядоімкі, якія раскладаліся на тых, хто яшчэ мог плаціць.

Вось так, як А. І. Белізор, пралі і ў даўнія часы (з экспазіцыі раённага музея).

Усё гэта вяло да заняпаду слабых гаспадарак. Было ўсё больш відавочна, што прыгонная праца (па 12 дзён для сялянскай сям'і на тыдзень) ужо не задавальняла патрэбы таварызаванай гаспадаркі памешчыка ў рабочай сіле. Патрэбна была больш прадукцыйная вольнанаёмная праца.

Пасля прыгону

У 1861 г. былі выдадзены «Палажэнні» пра ўмовы вызвалення сялян. На іх падставе ў Мінскай губ. за большасцю сялянскіх гаспадарак прызнаваўся дарэформенны надзел зямлі. Аднак мясцовыя «Палажэнні» пазбавілі сялян права карыстацца лясамі і пашамі. Выкупная плата за сядзібы і надзелы была завышана: плацілі грашыма з душавога надзелу пры 6 % гадавых. Дваровыя сяляне, каб выкупіць зямлю, павінны былі працаваць на памешчыка яшчэ 2 гады пасля адмены прыгону. Сяляне, якія працавалі на фабрыках памешчыкаў і не мелі сядзібы, прыраўноўваліся да дваровых. Пасесійныя рабочыя атрымлівалі зямельны надзел за павіннасці на фабрыцы, але ён не пераходзіў ім ва ўласнасць.

Былыя стараверы, панцырныя баяры, чыншавікі, аднадворцы і інш. саслоўі «вольных людзей» станавіліся або арандатарамі, або адыходзілі на заробкі, у тым ліку ў прамысловасць. Былыя агароднікі, бабылі, дваровая і дробная шляхта ў выніку рэформы ў большасці выпадкаў таксама засталіся без зямлі.

Такая рэформа сялянам не спадабалася, пачаліся хваляванні. Міністэрства ўнутраных спраў у аглядзе, прадстаўленым Аляксандру II, характарызавала адносіны сялян да рэформы так: «Спадзяванні сялян былі ўвогуле і паўсюдна да крайнасці перабольшаныя і таму за агульнай радасцю амаль усюды настала расчараванне. У думках сялян доўгі час не магло сумясціцца паняцце аб асабістай свабодзе з паняццем аб абавязковых павіннасцях на карысць памешчыкаў за аддадзеную сялянам у пастаяннае карыстанне зямлю».

У гэтай сітуацыі актывізаваўся нацыянальна-вызваленчы рух у Польшчы, Літве і на Беларусі. У пачатку 1860-х гадоў пачалося паўстанне, якое ўскалыхнула і Беларусь. Маніфестацыі і спяванне польскіх гімнаў у гарадах і мястэчках хутка змяніліся арганізацыяй паўстанцкіх атрадаў. Варшаўскі рэвалюцыйны камітэт прызначыў у губерні і паветы ваявод, надзеленых тут цывільнай і ваеннай уладай, якія займаліся фарміраваннем атрадаў, выбарамі іх кіраўнікоў.

Аб характары паўстання на Клічаўшчыне, як і наогул на Беларусі, можна

меркаваць па справаздачы III аддзялення за 1863 год: «Характар уласна ваенных дзеянняў мяцежнікаў у Пауночна-Заходнім краі быў часта партызанскім... Лясныя нетры хавалі іх ад праследавання войск, а падводы жыхароў з'яўляліся дапамогай і нават сродкам для шпаркіх перамяшчэнняў... Пры няўдачах шайкі раздраблялiся і разбягаліся па наваколнай мясцовасці, дамовіўшыся адносна зборных пунктаў. ... сяляне ў большасці выпадкаў трымалі гэта ў строгай тайне і хавалі пад страхам смерці сляды мяцежнікаў. Войскі стамляліся ад марнага праследавання, але кожная сустрэча з шайкамі, пры самай нязначнай спробе супраціўлення, заканчвалася разбіццём іх».

Ёсць некалькі дакументальных сведчанняў і пра паўстанне непасрэдна на Клічаўшчыне. У лютым 1863 г. палкоўнік Рэйхарт даносіў у III аддзяленне шэфу жандараў князю Даўгарукаму: «Паводле атрыманых звестак выяўляецца, што рэвалюцыйны дух на Мінскай губерні распаўсюдзіўся і што варожыя інтрыгі ксяндзоў гэтаму спрыяюць. Больш за ўсё выяўляецца гэты дух у паветах Слуцкім, Навагрудскім і Мінскім, менш — у Бабруйскім, Ігуменскім і Барысаўскім». Але на 2 мая 1863 г. становішча змянілася, і ён пісаў: «Мяцежныя шайкі, што выйшлі з Мінска і яго павета, а таксама Барысаўскага і Ігуменскага, канцэнтруюцца ў Ігуменскім павеце; супраць іх дзейнічае вайсковы старшына Ціто ў з ротай пяхоты і 60 казакамі; мяцежнікі нападаюць на сялян і праваслаўных святароў, 21 красавіка мяцежнікі Ігуменскага павета ў вёсцы Навасёлкі забілі 3 і ранілі 8 сялян. Шайкі складаюцца з памешчыкаў, дробнай шляхты, чыноўнікаў, гімназістаў, дваровай чэлядзі і іншых разначынцаў».

Захаваўся рапарт Ігуменскага ваеннага начальніка Ф. І. Русінава пра знаходжанне ў чэрвені 1863 г. ў наваколлі в. Слабодка запасаў харчавання і адзення: «Рота капітана Падгарэцкага... прайшоўшы вёску Слабодку... знайшла ў жыце на адлегласці не больш як паўвярсты ад гэтай вёскі мяшкі з сухарамі, чамаданы, куфры і рознае адзенне... Затым... на адлегласці ад вёскі Слабодка не больш як за вярсту па патрульным авангардзе з правага боку ад лесу зроблена было некалькі стрэлаў (...). Гэтая шляхецкая вёска падазраецца ў садзейнічанні шайцы, якая павесіла селяніна Кірыяна, а шайка, што схавалася ў яе наваколлі, дае падставу падазраваць, што жыхары гэтай і іншых шляхецкіх вёсак забяспечваюць мяцежнікаў харчаваннем».

Але кіраўнікі паўстання не здолелі папаўднаму ўзняць сялян на барацьбу, бо тыя бачылі сярод паўстанцаў пераважна паноў, сваіх былых прыгнятальнікаў. Гэта і стала адной з галоўных прычын яго паражэння: да восені 1864 г. паўстанне на Беларусі было задушана.

Але яно вымусіла царскі ўрад пайсці на некаторыя ўступкі сялянам заходніх губерняў: былі павялічаны надзелы, зменшаны плацяжы, захаваны сервітуты. Аднак і пасля гэтага каля 40 % былых прыгонных сялян атрымалі недастатковыя надзелы і вымушаны былі за адработкі арандаваць зямлю ў памешчыкаў. Да гэтага трэба дадаць вялікую колькасць плацяжоў і павіннасцей сялян: выкупныя плацяжы, мірскія зборы, дарожныя, падводныя, паліцэйскія, кватэрныя і іншыя павіннасці. Увесь цяжар гэтых павіннасцей клаўся на сялян. Так, на Клічаўшчыне, як і ва ўсёй Мінскай губ., толькі дарожная павіннасць у канцы 19 ст. складала 5,2 кап. з дзесяціны сялянскай зямлі і 0,9 кап.— з памешчыцкай.

Усё гэта вяло да расслаення вёскі. У 19 ст. бяднейшыя сялянскія гаспадаркі на Беларусі складалі 60—61 % усіх двароў, серадняцкія — 30 %, а кулацкія — 10—11 %. Таму памешчыкі мелі магчымасць весці сваю гаспадарку, шырока выкарыстоўваючы працу наёмных рабочых, бо збяднелыя сяляне папаўнялі армію парабкаў. Газета «Минский листок» у 1896 г. пісала: «Колькасць батракоў цяпер вельмі павялічылася і іх можна знайсці па некалькі сем'яў у адной вёсцы, якія жывуць дзе-небудзь у старэнькай і лядашчай хаціне або групуюцца каля памешчыкаў, ад яніх яны атрымліваюць асобную хату, агарод і ардынарыю. За гэта батрак з сям'ёй сваёй быў абавязаны працаваць бязвыхадна ў памешчыка».

Колькасць парабкаў папаўнялася за кошт аднадворцаў, бабылёў і кутнікаў, якіх было шмат на Клічаўшчыне. У пагоні за таннай рабочай сілай памешчыкі наймалі парабкаў з іншых губерняў. Так, на Клічаўшчыне ў канцы 1880-х гадоў сярод парабкаў былі выхадцы з Магілёўскай, Гродзенскай і нават Чарнігаўскай і Валынскай губ.

Наём гадавых і часовых парабкаў быў ліхвярскім. Рабілася гэта звычайна загадзя, зімою і нават восенню, з выдачаю задаткаў ад $^1/_3$ да $^1/_2$ будучага заробку. Часам на перыяд уборкі збажыны наймалі здзельных і падзённых рабочых. У большасці выпадкаў ім таксама зімой выдаваўся задатак збожжам, дрывамі, лясnымі матэрыяламі і да т. п.

Памешчыкі марудна пераходзілі да капіталістычнай формы гаспадарання, мно-

Фрагмент карты з «Вялікага сусветнага настольнага атласа Маркса» (Санкт-Пецярбург, 1910 г.), павялічаны ў 1,7 раза.

гія з іх перажывалі заняпад, здавалі свае землі ў арэнду шляхце ці, нават, сялянам. У 1870-я гады ў 35 % маёнткаў Мінскай губ. гаспадарылі арандатары і аканомы. Там, дзе памешчыкі самі вялі гаспадарку, выкарыстоўваліся наёмныя рабочыя. Плацілі ім па 40—45 руб. у год (з гаспадарскімі харчамі). Казённыя павіннасці і арэндная плата за зямлю былі даволі высокімі і разаральнымі. Збор нядоімак часта суправаджаўся трагічнымі падзеямі. Нават самі жандары разумелі, што падобныя з'явы вядуць да дрэнных вынікаў. Начальнік Магілёўскага жандарскага ўпраўлення, даносячы свайму шэфу пра злачынствы пры зборы нядоімак у Магілёўскай губерні ў 1876 г., пісаў, што нельга не звярнуць увагі на спосаб збірання нядоімак. Звычайна гэта рабілася так: у вёску прыязджаў валасны старшыня з паліцэйскім тысяцкім, бралі старасту і некалькі сялян, ішлі да нядоімшчыка і патрабавалі тэрміновага грашовага ўзносу. Нягледзячы на тое, што селянін у гэты час грошай не меў і прасіў адтэрміноўкі, старшыня з тысяцкім паўтаралі свае патрабаванні і пагражалі, што маёмасць нядоімшчыка будзе прададзена. Дарэчы, разам са старшынёй у вёску прыязджалі яўрэі-гандляры. І вельмі часта селянін здаваўся, тым больш, што тысяцкія пускалі ў ход кулакі, а часам і розгі. Такі спосаб збору нядоімак прыводзіў сялян да канчатковай галечы. У выніку такіх бясчынстваў у дзвюх вёсках Магілёўскага павета сяляне, страціўшы цярпенне, не падпарадкаваліся старшыні і не дазволілі прадаць жывёлу.

Незадавальненне сялян было выкліканa і тым, што ўвесь лес належаў памешчыкам і казне. Жыхары вёскі не маглі нават нарыхтаваць сабе дроў у наваколькіх лясах.

Галоўнай жа прычынай спрэчак паміж памешчыкамі і сялянамі было, безумоўна, малазямелле апошніх. У 1913 г. ўдзельная

вага надзельнай зямлі ў Магілёўскай губ. складала 39 %, у той час як доля сялян сярод усяго насельніцтва губерні дасягала 89 %; 11 % насельніцтва (пераважна памешчыкі) валодалі 61 % усёй зямлі. Малазямелле гнала сялян у наёмныя рабочыя да памешчыка.

Але капіталістычныя адносіны развіваліся. Важнай крыніцай даходаў быў гандаль збожжам. У 1890-я гады ў час аграрнага крызісу, калі цэны на збожжа знізіліся ўдвая, памешчыкі вымушаны былі шукаць іншыя крыніцы даходаў — у жывёлагадоўлі, прамысловым садаводстве і вырошчванні тэхнічных культур.

Рэформа 1861 г. паскорыла пераход ад адыходных і дамашніх промыслаў да рамёстваў, а ад іх — да мануфактуры і фабрыкі. Да рэформы сяляне Беларусі не вельмі актыўна займаліся адыходнымі промысламі. Пасля рэформы павялічылася нарыхтоўка і сплаў драўніны. Дарожнае будаўніцтва і нашырэнне рамізніцтва вялі да росту колькасці адыходнікаў, сялян, якія ішлі ў заробкі. Сяляне Клічаўшчыны, напрыклад, хадзілі працаваць на чыгунку, займаліся нарыхтоўкай і сплавам лесу па Дняпры і Заходняй Дзвіне, рамізніцтвам. Найбольш пашыраны з адыходных заняткаў былі лесанарыхтоўкі, на якія наймаліся цэлымі вёскамі. У былым Бабруйскім павеце, на Клічаўшчыне, лесанарыхтоўкай у 1897 г. займаліся 2,7 тыс. чалавек. Пачыналіся лесанарыхтоўкі ў снежні і працягваліся да канца сакавіка. Спярша валілі лес, а ў сакавіку перавозілі яго да прыстані. Улетку сяляне на продаж і на ўласныя патрэбы дралі кару з ліпы, вольхі, лазы і дуба.

Адным з самых старажытных заняткаў вяскоўцаў было смалакурэнне, выганка дзёгцю і выраб драўлянага вугалю. Займаліся таксама дрэваапрацоўкай, тканнем ільняной, пяньковай пражы і вырабаў з яе. У Мінскай губ. былі саматужнікі, якія займаліся фарбаваннем тканіны; у Бабруйскім павеце жыло шмат краўцоў. Пашыранай была і саматужная мукамольная вытворчасць. Працавалі млыны ў вёсках Ядраная Слабада, Люціна, Усохі, Асавы, Максімавічы, Чаравач, Доўгае, Нясята, Коўбча, Кабылянка, Турэц, Арэхаўка, Куцін, Старыя і Новыя Набаркі, Закуцце, Каўбчанская Слабада. Былі на Клічаўшчыне і кузні — у Закупленні, Новым Сяле, Старым Востраве. У Закупленні ў 1880-я гады быў кравец, у Новай Слабодцы — сталяр, у Ядранай Слабадзе — 2 сталяры і бондар. У Ігуменскім павеце сяляне гандлявалі вапнай і мелам, якія мелі попыт на гутах, а таксама ў насельніцтва (для пабелкі), многія займаліся рамонтна-будаўнічымі работамі.

Імкнучыся перабудаваць сваю гаспадарку на капіталістычны лад, памешчыкі стваралі ў маёнтках невялікія прадпрыемствы. Такія ж прадпрыемствы ўзнікалі і ў вёсках, але належалі яны пераважна местачковым яўрэям. Так, у 1881 г. ў в. Боркі існаваў дзягцярны завод, які належаў Арону Бруку. Тут працавалі 4 рабочыя, 1 майстар, а валавы даход завода складаў 3 тыс. руб. у год. У 1895 г. вінакурны завод у в. Кабылянка (заснаваны ў 1850 г.) даваў прадукцыі на 6 тыс. руб. у год. Тут працавалі 6 рабочых, быў паравы рухавік. У в. Смалярня быў смалакурны, у фальварку Доўгае — смалярна-шкіпінарны завод. У маёнтку Нясята працаваў вінакурны завод памешчыка І. М. Паўліноўскага (заснаваны ў 1904 г.). Напярэдадні 1-й сусветнай вайны тут працавалі 8 рабочых, а вытворчасць складала 1500 руб.; на заводзе дзейнічаў паравы рухавік магутнасцю ў 8 конскіх сіл. У маёнтку Востраў быў вінакурны завод; у маёнтку К. Незабытоўскага ў в. Бацэвічы дзейнічалі вінакурны і лесапільны заводы. У 1892 г. тут устаноўлены паравы рухавік магутнасцю 23 конскія сілы і 2 помпы магутнасцю 3 конскія сілы; у 1895 г. працавалі 13 рабочых, выраблена снірту і дошак на 10,2 тыс. руб. З 1905 г. ў в. Чырвоны Бераг у маёнтку памешчыка М. М. Козеля дзейнічаў вінакурны завод з паравым рухавіком у 12 конскіх сіл; працавалі 9 рабочых, выраблялася прадукцыі на 20 тыс. руб. у год. У 1913 г. вялікая гута дзейнічала ў Клічаве, належала Х. З. Грынгаўзу, на ёй працавалі 90 рабочых.

У 1897 г. на хутары Куцін наладжана лесапільная вытворчасць. У 1900 г. тут працавалі 35 рабочых, дзейнічаў паравы рухавік. У 1896 г. вінакурны завод аснаваны ў в. Альхоўка, дзе працавалі 4 рабочыя, завод вырабляў прадукцыі на 9 тыс. руб. у год. У 1849 г. ў фальварку Асавы была наладжана цукровая вытворчасць, у 1860 г. працавалі 42 рабочыя, у год выраблялася 0,6 тыс. пудоў цукру на 4,8 тыс. руб. У 1890 г. ў маёнтку Пад'яблынька (Падблонь) існавала вытворчасць мукі і круп, з 1895 г. тут быў паравы рухавік. У 1889 г. заснавана вінакурня ў маёнтку Юзафін, тут працавалі 6 рабочых, устаноўлены паравы рухавік. Завод даваў прадукцыі на 2 тыс. руб. у год.

Пашыраўся рознічны гандаль. Звычайна сяляне прывозілі на таргі і кірмашы збожжа, жывёлу, драўляны і гліняны посуд, гародніну, дровы. На Клічаўшчыне кірмашы праводзіліся: у снежні ў в. Заполле, у маі ў вёсках Турэц і Арэхаўка, у чэрвені ў вёсках Дулебна, Бацэвічы, у жніўні ў в. Нясята, у верасні ў вёсках Гонча і Буднева, у кастрычніку і на Тройцу ў в. Чаравач, у лістападзе ў в. Дранi.

З 1880-х гадоў тут пачаў пашырацца сталы крамны гандаль. З 1879 да 1896 г. ў Мінскай губ. колькасць дакументаў на права гандлю выросла з 4656 да 15 837. Невялікія крамы былі ў вёсках Чаравач, Коўбча, Міхалоў, Віркаў, Пярэкаль. Апрача таго, дробным разносна-развозным гандлем займалася частка малазямельных сялян.

Як ужо адзначалася, у найгоршым становішчы знаходзіліся сяляне. Таму менавіта яны найбольш пратэставалі супраць існуючых парадкаў. Так, у 1906 г. сяляне в. Калічанка спрабавалі зняць з працы рабочых у маёнтку памешчыка Рудзецкага, а потым падпалілі лес. 2 сакавіка 1906 г. сяляне вёсак Стаялы, Паплавы і мяст. Клічаў разбурылі плаціну ў маёнтку Беразіна графа Патоцкага і нават аказалі супраціўленне паліцыі пры арышце зачыншчыкаў. У лютым 1906 г. ў вёсках Бацэвічы і Заполле барацьбу ўзначаліў селянін Якаў Сушко. У Заполлі ён заклікаў сялян да разгрому маёнтка, а 27 лютага зняў рабочых з лясных работ у маёнтку Бацэвічы і агітаваў сялян выступіць супраць памешчыкаў.

Мясцовае кіраванне. У канцы 19 ст. на Клічаўшчыне было 96 населеных пунктаў, у якіх жыло каля 21 тыс. чалавек. Уся Мінская губ. падзялялася на паветы і паліцэйскія станы, на чале кожнага з якіх быў станавы прыстаў. Станавое праўленне складалася з прыстава, пісьмавадзіцеля і чыноўнікаў канцылярыі. Пры станах знаходзіліся і земскія суды (спраўнік, засядацелі і чыноўнікі канцылярыі). З 1861 г. ўведзена пасада судовага следчага па крымінальных злачынствах, вызначаны раёны судовых следчых (у Бабруйскім павеце такіх раёнаў было 2, у Ігуменскім — 1). Апрача таго, паветы былі падзелены на воласці. Назву «воласць» мелі і адміністрацыйная інстанцыя саслоўнага сялянскага кіравання і пазямельная адзінка — сельская грамада, якая прадстаўляла абшчыну. Воласцю кіраваў валасны старшыня, якога выбіраў валасны сход на 3 гады і зацвярджаў земскі начальнік. Валасны старшыня, сельскія старасты, іх памочнікі і зборшчыкі падаткаў складалі валасное



Чарцёж хутарскіх участкаў урочышча Дуброва маёнтка Вольса, зроблены ў 1913.

праўленне, якое вяло расходы, зацвярджаныя валасным сходам, збірала падаткі, засведчвала духоўныя завяшчанні, выдавала пашпарты, вяло паштовыя аперацыі. Нагляд за валасным праўленнем напачатку ажыццяўлялі міравыя пасрэднікі, з 1874 г.— павятовыя па сялянскіх справах установы, а з 1911 г.— земскія начальнікі.

Валасны сход складаўся з выбарных (1 ад 10 двароў), збіраўся ў тэрміны, вызначаныя земскім начальнікам. Ён ведаў выбарамі службовых асоб, кантраляваў іх дзейнасць, прызначаў сходы, займаўся апекай над сіротамі, выбіраў валасных суддзяў (ад 4 да 12 чалавек), якія абмяжоўваліся толькі разглядам маёмасных спраў. Сяляне Клічаўшчыны падпарадкоўваліся 5 валасным праўленням — Бацэвіцкаму, Свіслацкаму, Брадзецкаму, Даўжанскаму і Якшыцкаму.

Вось некалькі прыкладаў таго, якія пытанні і як разглядаліся валасной адміністрацыяй.

«По книге приговоров № 3

1884 года Августа 5 дня, мы нижеподписавшиеся Минской губернии, Бобруйского уезда, Бацевичской волости, должностные лица Волостного правления и десятидворные выборные на Волостной сход от 402 дворов из числа 65 человек имеющих право голоса на Волостном сходе в числе 45 человек, сего числа, И. д. Бацевичского Волостного Старшины Семеном Шатухою были собраны на Волостной сход на основании разрешения Бобруйского уездного по Крестьянским Делам Присутствия от 24 истекшего июля за № 673, на котором был предъявлен наш приговор, крестьян Воевичского Сельского схода, состоявшийся 15 мая под № ст 18. Для рассмотрения и утверждения такового относительно выселения в Сибирь крестьянина Воевичского общества, д. Пересопни, Мартина Евсеева Матлаха 31 года, за дурное поведение и дерзкий характер его, о чем имели между собою совещание и единогласно приговорили; приговор крестьян Воевичского Сельского схода, состоявшийся 15 мая сего года под № от 18, утвердить, крестьянина Мартина Евсеева Матлаха 31 года выслать в Сибирь и отдать в полное распоряжение правительства; жену его Грипину Иванову 30 лет и малолетних детей Тита 11 лет, Михаила 9 лет, Артема 7 лет и Антона 4 лет, и дочь Феодосию 3 лет оставить на призрении отца Мартина, Евсея Миронова Матлаха, так как он наделен участком земли в д. Пересопне и в состоянии удержать на своем призрении малолетних детей. Настоящий приговор вместе с приговором сельского схода крестьян Воевичского Сельского общества представить в Бобруйское уездное по Крестьянским делам Присутствие на зависящее распоряжение, а копию из оного записать в книгу приговоров Волостного схода.— Сей приговор составляли и к оному руки приложили

И. д. Волостного Старшины Семен Шатуха.

Сельские старосты: Яков Белокурский, Василий Шатуха, Григорий Рудый, Наум Долгий, Николай Горох.

Волостные Судьи: Матвей Костян, Савелий Якимовец, Данило Белозор, Кастан Адамович, Дмитрий Пирожник, Юрий Абразевич».

«По книге приговоров...

Смотрители магазинов: Михаил Пац, Василий Марков, Онуфрий Рудый; выборные на Волостной Сход: Юстин Анцюх, Илья Воронич, Леон Довбня, Прокоп Арцимович, Карп Тарелка, Адам Жлукта, Прохор Сушко, Адам Пац, Андрей Гонацевич, Константин Лыза, Устин Дыда, Михаил Шумский, Аникей Ременок, Петр Бабарика, Федор Мычко, Тимофей Данильчик, Николай Бабарика, Устин Шапка, Макей Мычка, Логвин Михненок, Андрей Островский, Федор Михненок, Яким Вирковац, Филип Кушнер, Федор Дрень, Константин Заблоцкий, Иван Федоров, Харлап и Иван Харлап, а запись неграмотных по просьбе их и за себя расписался Дмитрий Пирожник».

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 242, воп. 1, спр. 13 677, л. 2—4.

«В Минское Губернское по крестьянским делам Присутствие Содержащегося в Люблинской тюрьме Ивана Русецкого

ПРОШЕНИЕ

Окончивши срок наказания определенного мне Судебным приговором, я вследствие общественного приговора крестьян Долгской волости, дер. Кличева Игуменского уезда, о нежелании им иметь в среду свою,— должен следовать в Сибирь на поселение.

Имея в виду недобросовестность общества, которое без всякой причины заставило меня лишиться родины своей, так как до поступления моего в военную службу, я не был вреден обществу своему и ничем оного не отягощал,— очевидно, что отказной общественный крестьянский приговор составлен по подстрекательству моих братьев с целью завладеть ими принадлежащею мне частью землею, домом и всем остальным движимым хозяйственным имуществом.

Но так как я еще не лишен всех прав состояния, а только всех особенных прав, и не по приговору суда ссылаюсь в Сибирь, а по одному только общественному негодованию, то собственностью моею никто завладеть не имеет права,— а как я лишен возможности лично ходатайствовать об этом,— то покорнейше прошу Губернское по крестьянским делам Присутствие, поручить участковому Мировому Посреднику, учинить правильный семейный раздел между мною и братьями моими, с тем» чтобы часть моя была обращена чрез посредство продажи в наличные деньги и сколько причтётся, выслать таковыя ко мне через г. Смотрителя Люблинской тюрьмы.

Очень прошу оное Присутствие удостоить меня по сему предмету объявлением.

«14» апреля 1880 г.

Иван Русецкий, а за него неграмотного по его личной просьбе расписался содержащийся в Люблинской тюрьме Д. Кучков».

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 242, воп. 1, спр. 13 908, л. 4—6.

«В Минское Губернское по крестьянским делам Присутствие

АРЕСТ

Уездное Присутствие имеет честь представить при сем в Губернское Присутствие на рассмотрение копию приговора сельского схода крестьян Кличевского общества, Должанской волости от 29 Ноября 1879 года за № 36, по делу о непринятии ими в свою среду арестанта-крестьянина Ивана Русецкого, приговор Должанского волостного схода от 24 Января сего 1880 г., копию ревизской сказки о семействе поименованного Русецкого, сведения о количестве земли его Русецкого, записанной по выкупным документам под № 30, ... Кличеве, на имя покойного отца его Леона Русецкого, ныне состоящей во владении родных братьев Ивана, Алексея и Карпа Русецких, а также и свидетельство, выданное сказанному арестанту Ивану Русецкому, смотрителем Люблинского тюремного замка от 16 Октября 1879 г. за № 3849».

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 242, воп. 1, спр. 13 908, л. 1.

Мясцовымі судова-адміністрацыйнымі справамі займаліся земскія пастарункавыя начальнікі. Земскі начальнік дзейнічаў на частцы тэрыторыі павета, якая называлася земскі пастарунак. Так, вёскі Клічаўшчыны, што знаходзіліся на тэрыторыі Даўжанскай, Якшыцкай і Брадзецкай валасцей Ігуменскага павета складалі 1 земскі пастарунак, а так званая «камера» земскага начальніка знаходзілася ў вёсцы Якшыцы, казённыя пісьмы прыходзілі ў Багушэвічы, а тэлеграмы — у Свіслач; а вёскі былой Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета ўваходзілі ў земскі пастарунак з камерай у Бабруйску. Земскія начальнікі маглі выбірацца толькі з мясцовага патомнага дваранства. Акрамя таго існавалі павятовыя (і губернскія) з'езды над старшынствам павятовага прадвадзіцеля дваранства. З'езд падзяляўся на адміністрацыйную і судовую установы.

Такім чынам, судова-адміністрацыйную ўладу ў павеце ажыццяўлялі прадвадзіцель дваранства, павятовыя з'езды земскіх начальнікаў і земскія начальнікі, а гаспадарчымі пытаннямі займаліся земскія сходы.

Паводле Палажэння ад 1 студзеня 1864 г. быў прыняты закон аб земскіх установах (павятовых і губернскіх). Яны складаліся з земскіх сходаў (распараджальная ўлада і нагляд за выканаўчымі органамі) і земскіх управаў, што непасрэдна займаліся гаспадарчай дзейнасцю — земскімі павіннасцямі, упарадкаваннем дарог, лячэбнымі і дабрачыннымі ўстановамі, народнай адукацыяй і інш. Трэба адзначыць, што землеўладальнікі не імкнуліся ўдзельнічаць у кіраванні паветамі, думаць аб паляпшэнні гаспадаркі і вырашэнні складаных праблем. Так, у журналах пасяджэнняў Мінскага губернскага, Ігуменскага і Бабруйскага павятовых камітэтаў «о нуждах сельскохозяйственной промышленности» ў 1902/03 годзе мы сустракаем імёны толькі двух буйных землеўладальнікаў, што жылі ў той час на тэрыторыі сучаснай Клічаўшчыны: І. Каржанеўскі, К. Незабытоўскі, якія былі запрошаны ў склад камітэта самім Мінскім губернатарам графам А. Мусіным-Пушкіным.

Саслоўны падзел. Адным з самых буйных землеўласнікаў на Клічаўшчыне была Настасся Фёдараўна Паўліноўская, жонка стацкага саветніка. У яе маёнтках Нясята і Турэц было 4270 дзес. зямлі, млын, сукнавальня, якая давала даход 200 руб. за год.

Маёнткі Дуброва, Заполле і Калатычы (1456 дзес.) належалі Альгерду Абуховічу. Вялікі свой маёнтак разам з 2 млынамі (даход 900 руб. у год) і карчмой (400 руб. у год) ён здаваў у арэнду.

Маёнтак Бацэвічы належаў Канстанціну Незабытоўскаму (9500 дзес.). Тут былі 3 шынкі, 3 вадзяныя млыны; маёнтак таксама здаваўся ў арэнду. Маёнткі Дамавіцк, Новыя Валокі і Красны Бераг (8029 дзес. зямлі) былі ўласнасцю брату Каржанеўскіх, Віктара і Івана. Маёнтак Кабылянка (цяпер в. Акцябрск; 3647 дзес.) належаў Вацлаву Есьміну. Вёска Міхалава ўваходзіла ў маёнтак (1275 дзес.) Рудольфа Грушніцкага. Штаб-ротмістру Васілю Паўлавічу Васькову, які валодаў маёнткам Плосы (Палосы), належалі 5140 дзес. зямлі, карчма, што давала 100 руб. даходу ў год, і валовы млын (250 руб. гадавога даходу). Надворны саветнік Іван Пятровіч Александровіч валодаў 46 900 дзес. зямлі (у тым ліку і маёнткам Восава). Графу Забеле належаў маёнтак Вольса, у якім быў фальварак пад такой самай назвай, вёскі Вольса, Заполле, Ігнатаўка.

Існавалі і дваране, якія валодалі незаселенымі землямі, і такія, якія валодалі сялянамі без зямлі. Была значная колькасць дваран, што арандавалі ў памешчыкаў зямлю; у сярэдзіне 19 ст. на кожнага

памешчыка прыпадалі 3—4 такія дваранскія сям'і. Амаль усе дваране, што валодалі незаселенымі землямі і жылі на памешчыцкіх, выконвалі ўсе гаспадарчыя работы самі, часам з дапамогай парабкаў. Ладам жыцця, адукацыяй, звычаямі і нават адзеннем яны не адрозніваліся ад сялян; значная частка іх была неінсьменнай.

У сельскія саслоўі ўваходзілі розныя катэгорыі сялян і частка былой шляхты. Сяляне жылі звычайна ў вёсках, сёлах, на хутарах і фальварках. У 2-й палове 19 ст. на Клічаўшчыне сёламі лічыліся Доўгае, Нясята, Коўбча, Кабылянка (цяпер в. Акцябрск), Стары Востраў, Бацэвічы, Заполле. Гэта былі даволі буйныя на той час населеныя пункты. Так, у сяле Доўгае ў 1885 г. было 67 двароў, 566 жыхароў, тут знаходзіліся валасное праўленне, млын, школа, прыходская царква; у 1897 г.— шынок, хлебазапасны магазін, 904 жыхары, а ў 1917 г.—1001 жыхар. У 1863 г. тут адкрыта народнае вучылішча, у 1892 г. пабудавана царква. У 1891/92 навучальным годзе школу наведвалі 20 хлопчыкаў і 3 дзяўчынкі, у 1905/06—41 хлопчык і 11 дзяўчынак.

У сяле Нясята ў 1885 г. было 200 жыхароў, у 1917 г.—472.

У Коўбчы ў 1885 г. было 608 жыхароў, у 1917—1089. Тут, як і ў с. Доўгае, у 1863 г. адкрыта народнае вучылішча, у якім у 1891/92 навучальным годзе было 47 хлопчыкаў.

У сяле Кабылянка ў 1897 г. было 400 жыхароў, прыходская царква, хлебазапасны магазін і адзіная на ўсю Клічаўшчыну царкоўнапрыходская школа.

Вялікім сялом лічыліся Бацэвічы, дзе знаходзіліся валасное праўленне, адзіны на ўсю Клічаўшчыну прыёмны пакой бальніцы (у 1915 г. на яго базе створана земская бальніца), заезны дом, хлебазапасны магазін; у 1865 г. тут адкрыта 1-класнае народнае вучылішча (з 1916 г. 2-класнае).

Што датычыцца аднадворцаў, то ў зборы законаў Расійскай імперыі пра іх гаварылася так: «Усе асобы былой шляхты, што пражываюць у сёлах, вернутых ад Польшчы губерняў, якія не зацверджаны ў дваранстве і не пранусцілі прызначаных для выбару роду жыцця тэрмінаў, складаюць вольных вясковых абывацеляў, пад назвай аднадворцаў заходніх губерняў».

Неабходна адзначыць, што, напрыклад, у Ігуменскім павеце ў 1857 г. $^3/_5$ сельскага саслоўя складалі аднадворцы. Спосаб землеўладання ў іх быў дзялянкавы. Толькі час ад часу лугі і лясы заставаліся ў агульным карыстанні. У такім выпадку ў час сенакосу кожны ўласнік выстаўляў колькасць рабочых у залежнасці ад памеру зямлі. Аднадворцы, як і безмаянтковая шляхта, жылі ў асноўным асобнымі дварамі, у так званых засценках ці аколіцах, дзе звычайна было 2—3 дзесяткі двароў, якія належалі асобам з адным імем; гэтыя людзі складалі як бы адну сям'ю. Хатні побыт, адукацыя і адзенне аднадворцаў амаль нічым не адрозніваліся ад простага селяніна. Сярод іх былі людзі пісьменныя, але непісьменных было больш.

Засценкамі былі Чырвоны Бераг, Бабоўка, Смалярня, Чырвоны Лес, Мілажня, Казлы, Масніцкае, Аляксееўка, Патока, Міхалоўка, Пад'яблынька, Любічы, Вяленік, Максімавічы, Закуцце, Палам, Таценка 1-я. Яшчэ больш было аколіц.

Аднадворцы былі дбайнымі гаспадарамі. Старшыня Магілёўскага губернскага статыстычнага камітэта А. С. Дэмбавецкі адзначаў, што жывёла ў іх пераважна дагледжаная і таму на выгляд лепшая за сялянскую. Наогул шляхціцы-ўласнікі жылі заможна і мелі магчымасць нават «накапіць капейку».

Інакш жыла шляхта беззямельная. Працуючы на чужой арэндная зямлі, яна імкнулася да таго, каб з найменшымі выдаткамі выручыць арэндную плату і пракарміць сябе і сям'ю. Тая шляхта, якая на арэндная зямлі стварала дробныя пасёлкі (больш за 7 двароў), жыла не зусім бедна, таму што землеўладальнікі яе менш прыгняталі. А шляхта, што жыла разрознена (па адной хатцы або па дзве) на зямлі памешчыка, сярод сялянскіх надзелаў або на невялікіх адрэзках, знаходзілася ў большай частцы ў незайздросным стане. Зямлю ёй давалі горшую, таму нават за некалькі гадоў гаспадарання яе нельга было палепшыць. А землеўладальнік тым часам або павышаў арэндную плату, або зусім адбіраў надзел і прапаноўваў яго іншаму за больш высокую плату ці адработку на сваім полі.

Аснову гарадскога саслоўя складалі мяшчане. Яны аддзяліліся ад насельніцтва і сталі саслоўем у 14—15 ст., калі ў Вялікім княстве Літоўскім пачалі уводзіць магдэбургскае права, паводле якога жыхары гарадоў атрымалі асабістую свабоду. Пазней мяшчане пачалі сяліцца ў мястэчках, дзе даволі часта наладжваліся кірмашы і таргі. Падпалкоўнік генеральнага штаба І. Зяленскі пісаў з гэтай нагоды, што ў выніку правядзення такіх кірмашоў і атрымалі свой пачатак тыя населеныя мясцовасці, якія з цягам часу сталі называцца мястэчкамі, дзе акрамя вясковых абывацеляў, што займаліся выключна

хлебаробствам, жыло і мяшчанства, пераважна яўрэі. Мяшчане займаліся дробным гандлем, рамёствамі, промысламі, падзённай працай, рамізніцтвам, працавалі на фабрыках і заводах...

Мястэчкам і самым вялікім населеным пунктам на Клічаўшчыне ў 2-й палове 19 ст. з'яўляўся Клічаў. У 1897 г. тут было 828 жыхароў. Частка яго належала сялянскай грамадзе (Клічаўскай) і кіравалася валасным праўленнем Даўжанскай воласці; у гэтым сялянскім паселішчы было 77 двароў, 528 жыхароў. Другая частка тагачаснага Клічава падпарадкоўвалася мяшчанскай управе і называлася мястэчкам, жылі тут мяшчане, усяго 360 чалавек. У Клічаве былі народнае вучылішча, прыходская царква, яўрэйскі малітоўны дом, хлебазапасны магазін, 4 крамы дробнага гандлю, шынок, адзін вадзяны і тры ветраныя млыны. 2 разы на год тут праводзіліся кірмашы. Побач з мястэчкам знаходзіўся фальварак гр. Патоцкага з той жа назвай — Клічаў, дзе жыло 30 чалавек.

Народная асвета. На ўсёй Клічаўшчыне да 1917 г. былі 22 школы. Старэйшая з іх заснавана ў 1816 г. ў в. Віркаў як аднакласнае народнае вучылішча. У 2-й палове 19 ст. школы ўтвораны ў вёсках Доўгае, Нясята, Коўбча, Кабылянка, Востраў, Бацэвічы, Дубна, Максімавічы, Усакіна, Новая Слабодка, Ядраная Слабада, Загацце; у 1913—16 гадах — у вёсках Новае Сяло, Стаялава, Заполле, Закупленне, Баркі, Драні, Арэхаўка, Дулебна, Закуцце. На Клічаўшчыне існавала толькі адна царкоўнапрыходская школа ў в. Кабылянка. Школы граматы звычайна размяшчаліся ў дамах дзячкоў, святароў ці сялян. Выкладчыкамі ў іх былі святары ці проста сяляне, якія ўмелі пісаць (найчасцей гэта былі адстаўныя салдаты). Грошай ці падтрымкі ад казны школы не атрымлівалі: субсідыі абмяжоўваліся найчасцей мізэрнымі, добраахвотнымі ўзносамі бацькоў вучняў. У такіх умовах не ўзнікала пытанне, як і чаму навучаць дзяцей, а стаяла праблема, хто і дзе іх будзе вучыць. Дзяцей вучылі хто як умеў і як яны вучыліся самі. Вядома, у такіх школах не ўсе дзеці нават авалодвалі элементарнай граматай. Але развіццё гаспадаркі, змены ў грамадскім жыцці ўносілі новыя рысы і ў сістэму пачатковага навучання. З 1860-х гадоў школы граматы пачалі атрымліваць пэўную дапамогу ад казны, для аднагадовых народных вучылішчаў распрацоўваліся агульныя праграмы, ствараліся нават дырэкцыі народных вучылішчаў, якія займаліся пытаннямі народнай асветы. Галоўная мэта вучылішчаў была «не ў тым толькі, каб навучыць дзяцей рускай грамаце, але ў тым, каб... пабудзіць і ўмацаваць у іх пачуццё прыхільнасці да веры, якую яны вызнаюць, і да рускай народнасці... Таму пры выкладанні прадметаў... першым правілам устаноўлена, каб навучэнцы зразумелі ўсё, што гаворыць ім настаўнік і каб не завучвалі нічога яны на памяць машынальна, без разумення таго, што завучваюць».

Асноўнымі прадметамі ў такіх школах былі: закон Божы (кароткі катэхізіс і свяшчэнная гісторыя); руская мова, чытанне па кнігах грамадзянскай і царкоўнай граматы і пісьмо; першыя 4 дзеянні арыфметыкі; царкоўныя спевы. Усе прадметы павінны былі выкладацца па падручніках, зацверджаных Міністэрствам народнай асветы ці Духоўным ведамствам. Дзецям рымска-каталіцкага набажэнства закон Божы дазвалялася выкладаць на «местном наречии».

Вучні часта займаліся ў верхняй вопратцы, часам стоячы, бо парт на ўсіх не хапала. Падручнікаў не хапала, часта на ўвесь клас была адна кніга. Сшыткаў вучні не мелі, пісьмовыя працы яны выконвалі грыфелем на аспідных дошках.

У царкоўнапрыходскай школе, што існавала ў в. Кабылянка, навучанне было крыху лепшым. Тут выкладчыкамі былі святары, якія скончылі духоўную семінарыю ці вучылішча, і гэтыя школы атрымлівалі пэўныя субсідыі ад епархіі. Аднак і тут святары-выкладчыкі часта вымушаны былі купляць школьныя прылады на царкоўны, а часам і на свой уласны кошт. Зімой дзеці з далёкіх вёсак часта заставаліся тут начаваць, і святару даводзілася іх карміць за свой кошт. Сталага раскладу ўрокаў не было, выкладанне прадметаў і час заняткаў залежалі толькі ад настаўніка. Навучанне пачыналася са славянскай граматы; вывучыўшы алфавіт, прыступалі да вывучэння складоў. Потым пачыналася чытанне «по верхам», а пасля вучыліся пісаць. Што датычыць матэматыкі, то вывучалі толькі асноўныя арыфметычныя дзеянні, нікіх задач не рашалі. Наогул, ва ўсіх тагачасных пачатковых школах праграма была аднолькавая і вельмі простая: малітва, свяшчэнная гісторыя і катэхізіс, славянскае і грамадзянскае пісьмо, лік, царкоўныя спевы. Усе гэтыя школы не вырашалі праблему нават пачатковай сялянскай адукацыі. Стварэнне народных вучылішчаў ішло марудна, нягледзячы на імкненне ўлад дабіцца больш высокага ўзроўню пісьменнасці сярод сялян. Сяляне не заўсёды ахвотна аддавалі дзяцей у навучанне, бо былі ўпэўнены, што ўсе хлопчыкі, якія вывучаць грамату, будуць

потым абавязкова аддадзены ў салдаты («маскалі»). Асноўнай жа перашкодай уладкаванню першапачатковых школ было тое, што сяляне павінны былі даваць асноўныя сродкі для іх утрымання. Так, у 1900 г. сяляне Магілёўскай губ. давалі $^{2}/_{3}$ сродкаў на школы, а ў Мінскай губ. ў 1881 г. на ўтрыманне школ з дзяржаўнага казначэйства паступіла 98 420 руб., а ад сельскай грамады 66 859 руб. Усё гэта прыводзіла да таго, што ўзровень народнай асветы і колькасць пісьменнага насельніцтва заставаліся нізкімі. На Клічаўшчыне пісьменных было менш за 15 %.

Рэлігія, царква. У 2-й палове 19 ст. на Клічаўшчыне, як і на ўсёй Беларусі, жылі людзі розных веравызнанняў: католікі, праваслаўныя, іудзеі. Пануючай была дзяржаўная рэлігія — праваслаўе. Мінская праваслаўная епархія была заснавана пасля 1793 г., калі паводле другога падзелу Рэчы Паспалітай частка цэнтральнай Беларусі адышла да Расіі. У Бабруйскім павеце былі ўтвораны 4 благачынныя акругі, а ў Ігуменскім — 3. Благачынныя акругі падзяляліся на прыходы. На тэрыторыі сучаснай Клічаўшчыны было 7 прыходаў. Сродкамі на ўтрыманне цэркваў у 19 ст. былі: царкоўныя маёнткі (з рознымі льготамі), дзесяціна штогадовая, штогадовы ўзнос грошай з кожнага двара, грошы ад продажу мёду і інш. ў храмавыя святы, дабрачынныя ўзносы, скарбоначныя зборы, збор грошай у час кірмашоў і хрэсных ходаў, штатнае жалаванне. У залежнасці ад сумы грошай, якія цэрквы атрымлівалі ад епархіі, яны падзяляліся на 6 класаў (звесткі пра цэрквы гл. ў раздзеле «Ці была Клічаўшчына бязбожнай?»).

Першая сусветная вайна. Летам 1914 г. беларускія губерні былі аб'яўлены на ваенным становішчы. Нягледзячы на жорсткі ваенна-паліцэйскі рэжым, тут узнікалі стыхійныя выступленні прызыўнікоў, якія сталі выражэннем глыбокага незадавальнення ўладай, пратэстам супраць вайны.

У ліпені 1914 г. ў Мінскай губ. было разгромлена 12 памешчыцкіх маёнткаў. За падпал маёнтка Юзафін да судовай адказнасці было прыцягнута 20 сялян: 6 чалавек паводле прыгавору Мінскага ваенна-палявога суда былі пакараны смерцю.

Паражэнне на франтах, адступленне вялі да павелічэння прытоку бежанцаў, частка якіх асядала на Клічаўшчыне. Масавыя ўцёкі мірнага насельніцтва, галоўным чынам жанчын, старых і дзяцей з прыфрантавых раёнаў, набылі катастрафічныя памеры. Памешчык Станкевіч у пісьме на імя старшыні Савета Міністраў 8 верасня 1915 г. пісаў: «У маім двары, у садах месціцца 30—40 тысяч няшчаснага народу, халоднага, галоднага, халера забірае штодзённа масу ахвяр, ляжыць мярцвячына, якую ніхто не прыбірае, у флігелі месяцца дзесяткі хворых на халеру, санітарнай дапамогі ніякай, паветра страшэннае, народ ад'язджае, а тыя, хто прыязджаюць, займаюць іх месцы ў брудзе і тут жа паміраюць».

Вайна цяжка адбілася на гаспадарцы Беларусі. На фронт было адпраўлена больш за палову ўсіх працаздольных мужчын. У выніку многія гаспадаркі засталіся зусім без работнікаў; да таго ж насельніцтва прыцягвалася на абарончыя работы, мабілізоўвалася на уборку ўраджаю ў маёнтках памешчыкаў. Галоўнакамандуючы фронту генерал Эверт у сваім дакладзе старшыні Савета Міністраў 26 студзеня 1917 г. пісаў: «Каб забяспечыць паспяховую рэалізацыю мінулага ўраджаю траў і збожжа.., я палічыў неабходным летам 1916 г. прымусова прыцягнуць да ўборкі насельніцтва абодвух палоў ва ўзросце ад 15 да 50 гадоў». Цяжкім ярмом для сялян былі масавыя рэквізіцыі жывёлы, фуражу і прадуктаў харчавання. На Клічаўшчыне з 1915 г. да 1917 г. пагалоўе буйной рагатай жывёлы скарацілася на 25 %.

Вайна абвастрыла супярэчнасці тагачаснага жыцця і паскорыла набліжэнне рэвалюцыйных змен у краіне.

А. І. Валаховіч, У. Д. Будзько, М. А. Сакалова.

Дакументы сведчаць

ДАНЯСЕННЕ ПАЛКОЎНІКА РЭЙХАРТА ШЭФУ ЖАНДАРАЎ КНЯЗЮ ДАЛГАРУКАВУ ПРА РАЗГРОМ АТРАДА ДЫБОЎСКАГА КАЛЯ в. ЯЛОЎКА

8 мая 1863 г.

Минувшего апреля 29-го числа, в Игуменском уезде, часть отряда Новоингерманландского полка, преследуя шайку инсургентов под предводительством Свенторжецкого, отбила из их обоза до 40 подвод, сами же мятежники успели скрыться в лесах, пред появлением отряда убили двух солдат, находившихся на работе при землемерах,

потом напали на следовавший этап, но оставили его, узнав о приближении войска. Шайка преследуется по направлению к границе Могилевской губ. На пути из Колбча мятежники увезли с собой православного священника Малевича и после истязаний в лесу отпустили его с поруганием. 2-го мая, того же уезда, 7 рота Новоингерманландского полка, настигла шайку Дыбовского в лесах при д. Яловке. При рассеянии ее убито 12 человек, в том числе сам Дыбовский, 2 взяты в плен и несколько оружия; в роте урону не было. Прежние шайки не перестают усиливаться и бродить по лесам, укрываясь в болотистых местах от постоянного за ними преследования войск.

За продовольствием мятежники приходят в окрестные деревни вооруженные, а крестьяне, безоруженные и устрашенные, не могут им сопротивляться; между тем крестьяне всюду выражают негодование к ним, а поэтому лучший способ подавить в Минской губернии мятеж был бы тот, если вооружить крестьян отбираемым в значительном числе от инсургентов оружием, поставить по деревням небольшие отряды под командой опытных офицеров, как для прекращения способа продовольствия, так и для уничтожения шаек при их появлении; таким образом инсургенты будут, с одной стороны, преследуемы войсками, а с другой — лишены возможности показываться в деревни; в настоящее время это весьма удобно привести в исполнение, потому что мятежники пока собираются лишь в некоторых уездах губернии.

Полковник Рейхарт.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Мн., 1940. Т. 2. С. 519—520.

З ДАНЯСЕННЯ МІНСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ

В Санкт-Петербурге в ночлежном приюте задержаны 21 сего апреля 1877 г. без письменных видов крестьяне Минской губернии Игуменского уезда Должанской волости Григорий Миронов Самец и крестьянин Погожской волости Федор Миронов Цедрик, прибывшие, по объяснению их, в столицу, в качестве уполномоченных от своих односельцев с целью уведомить Государя Императора... всеподданнейшим прошением о назначении комисси для разбора претензии крестьян на неправильный надел их землею, причем у названных крестьян оказалось заявление от некоего Антона Руды о том, что в д. Березино в земле хранится большой склад оружия и пороха в бочонках, стихотворение в рукописи к царю и 6 черновых прошений.

Сделав распоряжение об отправлении крестьян Самца и Цедрика на родину этапным порядком и сообщив об изложенном Вашему Превосходительству, имею честь препроводить при сем отобранные у них бумаги на Ваше распоряжение.

Генерал-адъютант (подпись неразборчива).

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 295, воп. 1, спр. 3017, л. 140.

З АБВІНАВАЎЧАГА АКТА ПА СПРАВЕ СЯЛЯН в. ДУЛЕБНА БАЦЭВІЦКАЙ ВОЛАСЦІ БАБРУЙСКАГА ПАВЕТА МІНСКАЙ ГУБЕРНІ.

30 красавіка 1893 г.

3 марта 1893 г. пристав 4 стана Бобруйского уезда уведомил местного судебного следователя, что 20 февраля крестьяне д. Дулебна Максим Павловский, Яков Стригун, Петр Гавриленок в лесу помещика имения Ореховки Захарова избили лесника его Ивана Шатилло.

На возникшем по сему поводу предварительном следствии лесник Шатилло показал, что 20 февраля помещик Захаров узнал, что крестьяне д. Дулебна самовольно прорубили в его лесу дорогу, послал его закрыть эту дорогу, вследствие чего Шатилло, пригласив понятых Иосифа Понятовского, Семена Лобанка, Андрея Поркалло, отправился в лес и стал поджидать проезда крестьян. Вскоре на этой дороге с возом бревен показался крестьянин Максим Павловский, у которого он, Шатилло, и потребовал топор, но Павловский топора не отдал и, вцепившись ему в бороду, стал его бить; в это время к Павловскому подоспели его односельцы Стригун и Гавриленок, причем, Стригун, подскочив к Шатилло с топором в руках, стал грозить разрубить ему голову, а Гавриленок кричал: «Бейте его на мой ответ».

Такое показание Шатилло подтвердили на следствии и указанные им свидетели Понятовский, Лобанок и Поркалло.

Посему и согласно 200 и 207 статей Устава Уголовного Судопроизводства Императора Александра II, Павловский, Стригун и Гавриленок предаются суду Минского Окружного без участия присяжных заседателей.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 183, оп. 2, спр. 6905, л. 3.

Звесткі
аб колькасці насельніцтва ў Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні на 1918 год

мужчын — 9350
жанчын — 9401

Усяго: — 18 751

Звесткі пра населеныя пункты Бацэвіцкай воласці

	мужчын	жанчын
1. Аляксееўка пасёлак	64	72
2. Анатолеўка пасёлак	58	49
3. Апалінарава засценак	51	53
4. Бацэвічы сяло	390	359
5. Буднева вёска	312	314
6. Бёрда вёска	260	294
7. Баркі пасёлак	265	258
8. Белы Дзед пасёлак	16	20
9. Бабоўка пасёлак	37	41
10. Бацэвічы маёнтак	100	107
11. Бёрда маёнтак	10	9
12. Будзішча урочышча	8	10
13. Бярозавае Балота хутар	37	35
14. Ваевічы вёска	270	279
15. Уладзіміраўка пасёлак	70	84
16. Вязоўка маёнтак	7	9
17. Вялікая Старына засценак	40	35
18. Вандалінава хутар	5	4
19. Вішанька хутар	11	9
20. Вылазка урочышча	22	20
21. Градка пасёлак	58	70
22. Гонча вёска	120	132
23. Гуры пасёлак	38	32
24. Гліняае цагельны завод	4	3
25. Драні вёска	174	185
26. Дулебна вёска	270	254
27. Дзмітраўка вёска	110	90
28. Дзмітраўка вёска	90	120
29. Дубнікі хутар	22	12
30. Дуброва урочышча	60	68
31. Ельніца фальварак	4	3
32. Жэрдзішча пасёлак	72	69
33. Заполле вёска	286	281
34. Зарэчча вёска	135	142
35. Запруддзе маёнтак	15	18
36. Залог фальварак	4	3
37. Заякуб'е фальварак	20	17
38. Жаралескі вёска	129	102
39. Іванаўка фальварак	14	12
40. Ігнацоўка фальварак	4	6
41. Кабылянка сяло	298	274
42. Казлы пасёлак	74	68
43. Клеткі пасёлак	26	29
44. Кладзішча пасёлак	29	32
45. Каршукі хутар	25	30

Філіял ДА РБ Магілёўскай вобласці ў г. Бабруйску, ф. 533, воп. 2, спр. 2, л. 13, 30.

З гісторыі населеных пунктаў

«Мой родны кут, як ты мне мілы...». Са школьнай парты нясем мы па жыцці гэтыя сугучныя нашаму сэрцу словы. І дзе б ні былі, душой і думкамі мы заўжды там — у нашай мілай непаўторнай вёсачцы ці пасёлку. Як добра, што ёсць на свеце гэта святая мясціна — быццам жыватворная гаючая крыніца. Толькі дзе яе выток? Відаць, хвалявала і хвалюе гэта многіх з нас, але ніць пошукаў часцей за ўсё заканчвалася на успамінах нашых дзядоў і бабуль.

Ніжэй мы друкуем «біяграфіі» населеных пунктаў Клічаўшчыны. На вялікі жаль, не пра ўсе з іх давялося адшукаць звесткі, а тыя, што ёсць, часам даволі скупыя. І ўсё ж іх можна прыняць, як кажуць, за аснову «біяграфіі», якая з цягам часу будзе ўдакладняцца і дапаўняцца.

Акцябрск, да 30.7.1964 г. Кабылянка, вёска ў Акцябрскім сельсавеце (з 1965 г.), за 11 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіновічы. Заснавана ў пач. 19 ст. купцом Кабыліным. У 1814 г. пабудавана драўляная царква. У 1885 г. сяло (21 двор, 222 жыхары), у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. Дзейнічаў вінакурны завод. У 1894 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа. У 1897 г. 77 двароў, 408 жыхароў, хлебазапасны магазін, крама, 2 разы на год праводзіліся таржкі. Побач існавалі аднайменныя выселак (7 двароў, 50 жыхароў, пастаялы двор) і маёнтак (46 жыхароў, вінакурны завод). У 1908 г. ў сяле 63 двары, 499 жыхароў, у маёнтку 38 жыхароў; у 1917 у сяле 60 двароў, 344 жыхары, у маёнтку 74 жыхары. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у 1923 г. ў ёй 41 вучань; дзейнічаў вінакурны завод.

У 1925 г. адкрыта хата-чытальня. У 1926 г. 96 двароў, 697 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгас «Іскра». На пачатак 1992 г. 76 падвор'яў, 188 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы, машынны двор, млын, прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, васьмігадовая школа, аддзяленне сувязі, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін. На могілках брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць фашыстаў, у 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Альхоўка, вёска ў Патоцкім сельсавеце (з 1958 г.), за 2 км ад чыгуначнай станцыі Суша на лініі Магілёў — Асіновічы. На заходняй ускраіне цячэ р. Ваданоска (прыток Сушанкі). Заснавана ў пачатку 20 ст. Назва вёскі паходзіць ад былых тут раней зараснікаў вольхі. У 1921 г. хутар (5 двароў, 26 жыхароў) у Даўжанскай воласці Ігуменскага павета. У 1930 г. арганізаваны калгас «Аўрора». У 1940 г. 25 двароў, 89 жыхароў. У жніўні 1942 г. гітлераўцы спалілі вёску, разрабавалі маёмасць, загубілі 4 жыхароў. На пачатак 1992 г. 21 падвор'е, 39 жыхароў. У вёсцы магазін. Радзіма Героя Савецкага Саюза П. А. Крываноса.

Аляксандраўка, вёска ў Ганчанскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Вонічы на лініі Магілёў — Асіповічы. Узнікла ў канцы 19 ст., калі выхадцы з в. Цэйкавічы насяліліся тут на выкуплены ў памешчыка зямлі. Ад імя першага пасяленца Аляксандра Трацэўскага і паходзіць назва вёскі. На хутары Аляксандраўка (ён жа Аўдзюха) Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета ў 1897 г. было 4 двары, 31 жыхар. У пачатку 1920-х гадоў створана таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі, у 1933 г.— калгас імя Р. Люксембург (першы старшыня А. Каспаровіч). У 1934 г. адкрыты дзіцячыя яслі. У Айчынную вайну паблізу вёскі працяглы час базіраваўся партызанскі атрад № 538, вяскоўцы актыўна ўдзельнічалі ў партызанскім руху. Гітлераўцы спалілі вёску, разрабавалі маёмасць. На пачатак 1992 г. 15 падвор'яў, 18 жыхароў.

Аляксееўка, вёска ў Патоцкім сельсавеце (з 1965 г.), за 4 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Турчанка (прыток Нясеты). Заснавана ў канцы 19 ст. перасяленцамі з навакольных вёсак. У 1897 г. засценак (20 двароў, 129 жыхароў) у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1907 г. 11 двароў, 99 жыхароў, у 1917 г. 12 двароў, 93 жыхары. У 1921 г. адкрыта пачатковая школа. У 1926 г. 22 двары, 113 жыхароў. У 1933 г. створаны калгас «Зорка» (цэнтр у в. Дзмітраўка 1-я). На пачатак 1992 г. 18 падвор'яў, 25 жыхароў.

Арэхаўка, да 17.7.1967 г. вёскі Старая Арэхаўка і Новая Арэхаўка, вёска ў Нясіцкім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Нясета (прыток Ольсы). Вядома з 19 ст. У 1838 г. 142 рэвізскія душы, у Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 74 двары, 477 жыхароў, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. Быў хлебазапасны магазін. Штогод 9 мая праводзілася вясковае свята. Побач існавалі аднайменныя маёнтак (1 двор, 38 жыхароў) і фальварак (1 двор 5 жыхароў). У 1908 г. былі 2 вёскі — Старая Арэхаўка (81 двор, 636 жыхароў) і Новая Арэхаўка (32 двары, 218 жыхароў). У 1911 г. ў наёмным памяшканні адкрыта школа. У 1917 г. ў Старой Арэхаўцы 86 двароў, 533 жыхары, у Новай Арэхаўцы 38 двароў, 312 жыхароў. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у 1925 г. 89 вучняў, дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У верасні 1923 г. арганізавана сельгасарцель «Дубрава». У 1926 г. ў Старой Арэхаўцы 128 двароў, 683 жыхары, у Новай Арэхаўцы 64 двары, 357 жыхароў. У 1927 г. пабудавана школа. У 1930-х гадах вяскоўцы аб'яднаны ў калгас. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 110 дамоў, расстралялі 9 жыхароў. У 1967 г. Старая Арэхаўка і Новая Арэхаўка аб'яднаны. На пачатак 1992 г. 433 падвор'і, 1299 жыхароў. У вёсцы размешчаны майстэрні (сталярна-цяслярная і па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі), установа па прыгатаванні вітамінавай мукі, комплекс буйной рагатай жывёлы, магазін, бібліятэка, дзіцячы сад, лазня, прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, музычная школа, аддзяленне ашчаднага банка, бальніца, аддзяленне сувязі, сталовая, крыты плавальны басейн.

Асавы, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіновічы. Побач р. Лень (прыток Бярэзіны). Вядома з 19 ст. У 1897 г. ў вёсцы 29 двароў, 241 жыхар, дзейнічаў ветраны млын; уваходзіла ў Бацэвіцкую воласць Бабруйскага павета. Побач быў фальварак Асавы (ён жа Заякуб'е, 1 двор, 19 жыхароў). У 1908 г. 49 двароў, 340 жыхароў, у 1917 г. ў вёсцы 55 двароў, 434 жыхары, у фальварку 1 двор, 44 жыхары. У 1931 г. вяскоўцы аб'яднаны ў калгас «Чырвоны партызан». У 1940 г. 91 двор, 231 жыхар. На пачатак 1991 г. 52 падвор'і, 75 жыхароў. У вёсцы магазін, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая. На могілках

брацкая магіла партызан, якія загінулі ў баях супраць фашыстаў, у 1973 г. на магіле пастаўлены абеліск. Каля вёскі курганныя могільнікі дрыгавічоў 8 ст.

Асінаўка, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіновічы. Побач р. Нясета (прыток Ольсы). Вёска вядомая з пачатку 20 ст.; назва ад наймення урочышча, дзе яна была заснавана. У 1917 г. 12 двароў, 73 жыхары, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1933 г. тут арганізаваны калгас «Камунар». Працавалі пачатковая школа, хата-чытальня. У Айчынную вайну гітлераўцы разбурылі і спалілі амаль палавіну будынкаў, разрабавалі маёмасць. На пачатак 1992 г. 9 падвор'яў, 15 жыхароў.

Бабоўка, да 1917 г. в. Дварэц, вёска ў Ганчанскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Вонічы на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзіць меліярацыйны канал, злучаны з р. Суша (прыток Ольсы). Назва вёскі ад наймення размешчанага побач урочышча. Узнікла ў 1907 г., калі сяляне з суседніх вёсак выкупілі ў памешчыка Сіпайлава зямлю і пасяліліся тут. У 1908 г.— пасёлак (7 двароў, 49 жыхароў) у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 11 двароў, 63 жыхары. У 1926 г.— вёска (13 двароў, 54 жыхары). У жніўні 1931 г. тут арганізаваны калгас «Барэц» (першы старшыня А. Д. Каралёк). На пачатак 1992 г. 15 падвор'яў, 23 жыхары. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Баркі, вёска ў Ганчанскім сельсавеце, за 14 км ад чыгуначнай станцыі Суша на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Суша (прыток Ольсы). Узнікла ў 2-й палавіне 19 ст., калі выхадцы з Пагосцкай воласці пасяліліся тут на выкупленай у памешчыка зямлі. У 1897 г. 30 двароў, 193 жыхары, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1908 г. 37 двароў, 453 жыхары. У 1911 г. адкрыта земская школа (у наёмным памяшканні). У 1917 г. 41 двор, 242 жыхары. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, якой у 1924 г. перададзены нацыяналізаваны будынак (у 1923 г. 31, у 1925 г. 49 вучняў). У 1926 г. 41 двор, 263 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас «Новы свет». На пачатак 1992 г. 18 падвор'яў, 24 жыхары. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Бацэвічы, вёска, цэнтр сельсавета (з 20.8.1924 г.), на р. Ольса (прыток Бярэзіны) і Нясета (прыток Ольсы). У пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаецца пад 1560 г. як сяло (46 двароў) у Свіслацкай воласці Вялікага княства Літоўскага, было дзяржаўнай уласнасцю. У 1689 г. ў складзе маёнтка Свіслач Мінскага павета. У 1743 г. сяло ў Аршанскім павеце, шляхецкая ўласнасць. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) цэнтр воласці Бабруйскага павета. У 1844 г. 51 двор, 283 жыхары, цэнтр маёнтка, уласнасць памешчыка. У 1865 г. адкрыта школа (народнае вучылішча), у якой у 1891 г. навучалася 47 хлопчыкаў. У 1885 г. дзейнічалі 2 млыны, царква. У 1892 г. у маёнтку заснаваны вінакурны і лесапільны заводы (у 1895 г. 13 рабочых, дзейнічала паравая машына). У 1897 г. 87 двароў, 629 жыхароў, прыёмны пакой, хлебазапасны магазін, 3 крамы, заезны дом, штогод 29 чэрвеня нраводзіўся таржок. У маёнтку ў гэты час было 7 двароў, 57 жыхароў, вінакурны завод. У 1905 г. створана падпольная сацыял-дэмакратычная група (кіраваў рабочы Гарэлік з г. Бабруйска), якая ў хуткім часе была раскрыта, а яе члены Хруцкі, Пятровіч, Гарэлік і інш. арыштаваны. У 1908 г. ў сяле 77 двароў, 668 жыхароў, у маёнтку 64 жыхары. У 1915 г. адкрыта земская бальніца. У 1917 г. ў сяле 139 двароў, 903 жыхары. Усе прадпрыемствы і да 1500 дзесяцін зямлі належалі памешчыку К. Незабытоўскаму. Вялікі зямельны надзел быў у валоданні царквы. Сяляне парабкавалі ў памешчыка і свяшчэнніка, частка жыхароў (пераважна яўрэі) займаліся саматужным промыслам і дробным гандлем.

Беларускі гісторык і этнограф А. К. Ельскі ў «Геаграфічным слоўніку Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краін» (1880. Т. 1. С. 76) так пісаў пра Бацэвічы: «Размешчаныя над ракою Бярэзінаю вялізныя бацэвіцкія ўладанні ўваходзілі спачатку ў склад Свіслацкага княства, якое займала плошчу каля 80 000 га. Гэтыя абшары былі ў той час уласнасцю сям'і Гарабурдаў герба Абданк». Пазней іх набылі Радзівілы. Ад Людвікі Караліны Радзівіл, што была замужам за рэньскім ваяводаю, у 1696 г. Бацэвічы купіў спачатку паводле адвечнага леннага права, а праз некалькі гадоў, за дадатковую плату, паводле неабмежаванага права, Станіслаў Незабытоўскі, за 960 000 залатых. Ва ўласнасці Незабытоўскіх гэты маёнтак заставаўся ажно да першай сусветнай вайны. Апошнім уладальнікам зямель быў Кароль Станіслаў Незабытоўскі (1865—1952), жанаты з Софіяй Лэнскай, восьмы па чарзе ў сваёй сям'і ўладальнік Бацэвічаў. Меў ён найперш пасаду пасла ў Дзяржаўны Савет у Пецярбургу, а ў міжваенны перыяд міністра сельскай гаспадаркі і сенатара ў польскім урадзе. На

пачатку 20 ст. Бацэвічы ахоплівалі абшар з 14 250 маргоў зямлі, сенажацяў і лясоў, добра дагледжаных, з некалькімі фальваркамі, фабрыкамі, млынам, тартаком, броварам, алейняю, запалкаваю фабрыкаю, механічнаю цагельняю, фабрыкаю дрэнажных трубак і мэблі, з уласным шпіталем для рабочых і добра наладжанай медыцынскай дапамогаю.

На працягу 18 і 19 ст. існаваў у Бацэвічах драўляны двор з лістоўніцы, які згарэў каля 1900 г. Засталіся ад яго толькі гаспадарчыя пабудовы, сярод якіх характэрны для літоўскіх і беларускіх земляў лямус. Гэты не вельмі вялікі двух'ярусны будынак у форме квадрата меў галерэйку з слупамі, якія падпіралі нізкі чатырохсхільны гонтавы дах. Падобнага стылю былі таксама іншыя будынкі з дваняга ансамбля. Пазней быў узведзены мураваны палац (гл. арт. Палац Незабытоўскага).

У 1920 г. ў маёнтку створана народная гаспадарка (358 га зямлі); працавалі паравы млын, вінакурны завод, лесапільня. У 1921 г. арганізаваны саўгас імя К. Маркса, палітаддзел якога ў 1930-я гады выпускаў шматтыражку «Сцяг ударніка». У 1922 г. адкрыта хата-чытальня, дзейнічала масларобная арцель. У 1923 г. да вёскі далучаны вялікі ўчастак памешчыцкай зямлі і створана сельгасарцель. У 1926 г. ў сяле 172 двары, 906 жыхароў. Пад час падзелу памешчыцкай і царкоўнай зямель каля Бацэвічаў узніклі насёлкі Культура і Вялікае Ляда, у якіх у 1927 г. створаны таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі, а пазней на іх базе — калгас «Культура» (старшыня П. Белакурскі). У 1928 г. працавалі невялікая электрастанцыя, лакамабіль на тарфяным паліве, млын, вінзавод, маслабойня, бальніца. У 1929 г. створана камуна, рэарганізаваная ў 1930 г. ў калгас імя Леніна, да якога далучаны і калгас «Культура». Устаноўлены лакамабіль і электрагенератар. У 1931 г. ў саўгасе (уваходзіў у Магілёўскі свінагадоўчы трэст) было 14 трактароў, абсталявана стацыянарная кінаўстаноўка, дзіцячая пляцоўка, працавалі пачатковая, 7-гадовая, вячэрняя школы, у 1934 г.— дзіцячыя яслі. У 1937 г. ліквідаваны саўгас, яго зямля перададзена калгасу, а на саўгаснай сядзібе створана МТС (у 1938 г. 15 трактароў), саўгасны цагельны завод і лесацэх перайшлі да райпрамкамбіната. У 1940 г. ў вёсцы 312 двароў, 1214 жыхароў, бібліятэка, клуб, сярэдняя школа, бальніца, аддзяленне райпрамкамбіната, пошта, магазіны сельпо.

У пачатку Айчыннай вайны створана група патрыётаў на чале са старшынёй

Бальніца ў в. Бацэвічы, пабудаваная ў дарэвалюцыйны час.

сельсавета М. І. Александровічам, якая ў студзені 1942 г. стала ядром партызанскага атрада № 620. У пачатку 1942 г. гітлераўцы загубілі 44 вяскоўцаў, стварылі тут гарнізон і камендатуру. У канцы чэрвеня 1944 г. фашысты спалілі 179 двароў і загубілі 71 жыхара. На франтах і ў партызанскай барацьбе загінулі 133 вяскоўцы, 127 расстраляны гітлераўцамі. У 1967 г. да Бацэвічаў далучаны вёскі Вусце і Зарэчча. На пачатак 1992 г. 425 падвор'яў, 1082 жыхары. У вёсцы сярэдняя і музычная школы, Дом культуры, магазін, прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, сталовая, аптэка, бальніца, аддзяленне сувязі і радыёвузел, філіял Клічаўскай раённай бібліятэкі, спортзал, дзіцячы сад, дзейнічаюць лесапільня, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая, майстэрня па рамонце сельгастэхнікі, устаноўкі па сушцы сена і збожжа, па вырабе вітамінавай мукі, сталярны цэх, дарожна-эксплуатацыйны ўчастак, цагельны завод, ветэрынарны пункт. У цэнтры вёскі брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць фашыстаў, у 1964 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна са сцягам. Каля вёскі курганныя могільнікі дрыгавічоў 8—10 ст.

Радзіма першага беларускага прафесара геаграфіі А. А. Смоліча.

Бёрда, вёска ў Клічаўскім пасялковым Савеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ рака Ольса (прыток Бярэзіны). Вядома з 1560 г. як сяло ў Бабруйскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1639 г. 21 двор, 62 жыхары мужчынскага полу,

сяло ў Бабруйскім старостве, у 1647 г. 38 двароў, у Рэчыцкім павеце, шляхецкая уласнасць. У 1846 г. цэнтр маёнтка, 30 двароў, 179 жыхароў, уласнасць памешчыка. З 1860 г. ў Бабруйскім павеце, 30 двароў, 227 жыхароў, у 1897 г. 58 двароў, 447 жыхароў, хлебазапасны магазін; побач з сялом былі аднайменныя маёнтак (1 двор, 18 жыхароў) і выселак (2 двары, 12 жыхароў). У 1907 г. ў вёсцы 62 двары, 521 жыхар, у маёнтку 1 двор, 10 жыхароў. У 1911 г. адкрыта земская школа (у наёмным памяшканні), была карчма. У 1917 г. ў вёсцы 73 двары, 556 жыхароў, у маёнтку 1 двор, 16 жыхароў. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені (у 1925 г. 81 вучань). Дзейнічала масларобная арцель. У 1926 г. ў вёсцы 117 двароў, 720 жыхароў, у фальварку 3 двары, 14 жыхароў, пабудавана новае памяшканне школы. У 1930 г. арганізаваны калгас «Колас». З 1939 г. цэнтр сельсавета. У 1940 г. 73 двары, 219 жыхароў. Восенню 1941 г. партызаны разгромілі нямецка-паліцэйскі гарнізон, размешчаны ў вёсцы, створана група самаабароны. У сакавіку 1943 г. акупанты поўнасцю спалілі вёску, загубілі 37 жыхароў. На пачатак 1992 г. 89 падвор'яў, 212 жыхароў. У вёсцы 8-гадовая школа, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, магазін, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, лесапільня, зернедрабілка, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая.

Брусы, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Развадава на лініі Магілёў — Асіповічы. Узнікла ў 1920 г. ў выніку перасялення сялян з хутароў і в. Доўгае на былыя землі памешчыка, сядзіба якога знаходзілася ва ўрочышчы Церахаў Бор. У навакольных лясах сяляне нарыхтоўвалі на колы і іншыя патрэбы драўляныя брусы, якія штабялямі ляжалі каля дарогі (адсюль назва вёскі). З 20.8.1924 г. вёска ў Доўгаўскім сельсавеце Клічаўскага р-на Бабруйскай акругі, з 20.2.1938 г. ў Магілёўскай вобласці. У 1933 арганізаваны калгас «Брусы», які ў 1937 г. аб'яднаны з калгасам імя Кірава (в. Церахаў Бор). На пачатак 1992 г. 13 падвор'яў, 22 жыхары. У вёсцы магазін, вытворчая паляводчая брыгада.

Брылёўка, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Мілое на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Друць, на поўдні — яе прыток р. Даўжанка. Вядома з 16 ст. як сяло Брылевічы ў Магілёўскім павеце, шляхецкая уласнасць. У 16—17 ст. тут выраблялі шкляны посуд, аб чым сведчаць руіны печаў (гуты) з рэшткамі посуду і бітага каляровага шкла на ўскраіне вёскі. У 1858 г. 26 рэвізскіх душ, у Быхаўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1880 г. 15 двароў, 60 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася адыходным промыслам. У 1897 г. 18 двароў, 143 жыхары, у Гарадзішчанскай воласці Быхаўскага павета. У 1909 г. 19 двароў, 188 жыхароў. У 1938 г. арганізаваны калгас «Чырвоная Друць». На пачатак 1992 г. 27 падвор'яў, 47 жыхароў.

Буднева, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Вядома з 19 ст. У 1847 г. ў вёсцы 30 двароў, 120 жыхароў, у складзе маёнтка Нясята Бабруйскага павета, уласнасць памешчыка. У 1885 г. была царква. У 1907 г. 72 двары, 563 жыхары. У 1908 г. адкрыта земская школа, для якой у 1915 г. пабудавана памяшканне. Паводле перапісу 1917 г., у вёсцы 87 гаспадарак, 553 жыхары. У 1923 г. да вёскі далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені (у 1925 г. 30 вучня). У 1926 г. 85 двароў, 605 жыхароў. У 1932 г. арганізаваны калгас «Будаўнік». На пачатак 1992 г. 138 падвор'яў, 312 жыхароў. У вёсцы размешчаны вытворчы ўчастак племзавода, пачатковая школа, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, лазня, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы, адкормачны свінагадоўчы цэх. Каля вёскі курганны могільнік 8—10 ст.

Бярозаўка, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Нясета. Побач цячэ рака Ольса (прыток Бярэзіны). Узнікла ў пачатку 20 ст. на месцы былога маёнтка. Уздоўж дарогі, што вяла да яго, сяліліся былыя батракі, якія атрымалі памешчыцкую зямлю. У 1926 г. 23 двары, 130 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгас імя Дзяржынскага. Восенню 1942 г. гітлераўцы спалілі 20 дамоў, расстралялі 10 жыхароў. На пачатак 1992 г. 28 падвор'яў, 59 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы, конны двор.

Ваевічы, вёска ў Клічаўскім пасялковым Савеце, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Ольса (прыток Бярэзіны). У пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаецца ў 1560 г. як прыватнае феадальнае ўладанне ў Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета (21 двор, 270 жыхароў), дзейнічала царква. У 1651 г. вёска ў складзе маёнтка Свіслач Мінскага павета Мінскага ваяводства. У 1844 г. 34 двары, 220 жыхароў, у складзе маёнтка Бацэвічы Бабруйскага павета, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 58 двароў, 378 жыхароў, хлебазапасны магазін, 2 крамы. У 1907 г. 65 двароў, 482 жыхары, а ў 1917 г. 69 двароў, 455 жыхароў. У 1926 г. 105 двароў, 535 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Пераможац». Восенню 1941 партызаны разгромілі нямецка-паліцэйскі гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы. Жорсткія баі вялі партызаны летам 1942 за пераправу цераз р. Ольсу. Вёска 3 разы пераходзіла з рук у рукі, тут партызаны прарвалі блакаду. Акупанты поўнасцю знішчылі вёску. На пачатак 1992 г. 49 падвор'яў, 90 жыхароў. У вёсцы пачатковая школа, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы, зернедрабілка.

Веснік, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Мілое на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Даўжанка (прыток Друці). Утворана у 1921 г. сялянамі з вёскі Закупленне, якія пасяліліся на землях былога памешчыцкага маёнтка і арганізавалі калгас «Веснік» (8 гаспадарак). Працавалі вадзяны млын і лесапільня. У 1933 г. калгас «Веснік» аб'яднаны з калгасам «Чапаеў» (в. Закупленне). У 1940 г. 23 двары, 72 жыхары. У верасні 1943 г. поўнасцю спалена фашыстамі, закатавана 7 жыхароў. На пачатак 1992 г. 24 падвор'і, 38 жыхароў.

Віркаў, вёска, цэнтр сельсавета, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Вядома з 17 ст. У 1651 г. ў складзе маёнтка Свіслач Мінскага павета Мінскага ваяводства. У 1838 г. 165 рэвізскіх душ, у 1847 г. 48 двароў, 258 жыхароў, у складзе маёнтка Свіслач Бабруйскага павета, уласнасць памешчыка. У 1884 г. адкрыта школа граматы, якая ў 1916 г. ператворана ў земскую. У 1897 г. 112 двароў, 696 жыхароў, хлебазапасны магазін, пастаялы двор, у Свіслацкай воласці. У 1908 г. 101 двор, 946 жыхароў, у 1917 г. 121 двор, 807 жыхароў. У 1923 на базе дарэвалюцыйнай пачала дзейнічаць працоўная школа 1-й ступені (49 вучняў), для якой у 1927 г. пабудаваны новы будынак. 20.11.1922 г. створана сельскагаспадарчая арцель «Прагрэс», пераўтвораная ў 1930 г. ў калгас імя Молатава (аб'ядноўваў 7 гаспадарак). У 1940 г. ў вёсцы 23 гаспадаркі, 72 жыхары. У пачатку 1942 г. ў вёсцы партызаны разгромілі нямецка-паліцэйскі гарнізон, быў адноўлены сельсавет, створана група самаабароны. У час карных аперацый 1942—43 гг. карнікі поўнасцю разрабавалі маёмасць вяскоўцаў, спалілі вёску, забілі 5 жыхароў. У партызанскіх атрадах і на франтах загінулі 82 вяскоўцы. На пачатак 1992 г. 205 падвор'яў, 488 жыхароў. У вёсцы 8-гадовая школа, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, ветэрынарны пункт, аддзяленне сувязі, камбінат бытавога абслугоўвання насельніцтва, магазін. Дзейнічаюць майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, лесапільня, зернедрабілка, ферма буйной рагатай жывёлы. У цэнтры вёскі брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць фашыстаў. У 1959 г. на магіле пастаўлена скульптурная кампазіцыя: воін у жалобе і дзяўчына. Каля вёскі захаваліся курганныя могільнікі дрыгавічоў 8—9 ст.

Віпнёўка, да 1938 г. Ужывец, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Мілое на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Даўжанка (прыток Друці). Утворана ў канцы 19 ст. У 1897 г. сядзіба Ужывец (2 двары, 24 жыхары) у Доўжанскай воласці Ігуменскага павета. У 1908 г. 2 двары, 13 жыхароў. Паводле перапісу 1917 г. 4 гаспадаркі, 38 жыхароў. Вяскоўцы працавалі не толькі на сваіх гаспадарках, але і на смалакурні, што знаходзілася за 1 км ад вёскі і выпускала шкіпінар. У 1932 г. арганізаваны калгас «Чырвоная Зорка». У 1940 г. 18 двароў, 47 жыхароў. У верасні 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загу-

Помнік на брацкай магіле воінаў і партызан у вёсцы Віркаў.

білі 11 жыхароў. На пачатак 1992 10 падвор'яў, 16 жыхароў. Каля вёскі захаваўся курганны могільнік дрыгавічоў 8 ст.

Вонічы, да 1940 г. Мяжное, вёска і чыгуначная станцыя ў Патоцкім сельсавеце на лініі Магілёў — Асіповічы. Утворана ў 1927 г. перасяленцамі з суседніх вёсак. На пачатак 1992 г. 12 двароў, 25 жыхароў.

Восаў, вёска ў Клічаўскім пасялковым Савеце, за 15 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Перасека (прыток Перасопенкі). Вядома з 19 ст. У 1857 г. вёска ў Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. Паводле перапісу 1917 г. 15 двароў, 109 жыхароў, побач знаходзіўся хутар (3 двары, 21 жыхар). У 1926 г. да вёскі далучаны былыя памешчыцкія землі. У 1931 г. арганізаваны калгас. У 1940 г. 8 двароў, 27 жыхароў. У час карнай аперацыі «Арол» восенню 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 3 жыхароў. На пачатак 1992 г. 4 падвор'і, 7 жыхароў.

Вяленік, вёска ў Каўбчанскім сельсавеце, за 15 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Узнікла ў 2-й палавіне 19 ст. У 1897 г. засценак Брадзецкай воласці Ігуменскага павета, 14 двароў, 81 жыхар, у 1908 г. 13 двароў, 80 жыхароў, у 1917 г. 19 двароў, 104 жыхары. У 1926 г. 21 двор, 117 жыхароў. У 1929 г. ўтворaны калгас «Чырвоны маяк». На пачатак 1992 г. 12 падвор'яў, 28 жыхароў.

Вялікая Старына, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце, за 14 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Вядома з 19 ст. У 1897 г. хутар, 12 двароў, 77 жыхароў, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. Паводле перапісу 1917 г. ў вёсцы 12 гаспадарак, 64 жыхары. У 1926 г. 44 двары, 209 жыхароў. У 1931 г. створаны калгас «Прамзара». У 1940 г. 40 гаспадарак, 158 жыхароў, начатковая школа. У Айчынную вайну ў вёсцы і паблізу яе базіраваўся партызанскі атрад. Летам 1942 г. ў час карнай аперацыі «Майскі жук» тут вёў цяжкі бой з карнікамі 760-ы партызанскі атрад, а ў верасні 1943 г. акупанты поўнасцю спалілі вёску і загубілі 26 жыхароў. На вясковых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць фашыстаў пры вызваленні раёна, у 1977 г. на магіле пастаўлена стэла. На пачатак 1992 г. 11 падвор'яў, 22 жыхары.

Ганаратаў, вёска ў Каўбчанскім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Стаялава на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Ольса (прыток Бярэзіны). Вядома з 19 ст. У 1897 г. 17 двароў, 115 жыхароў, у Брадзецкай воласці Ігуменскага павета. У 1908 г. 16 двароў, 118 жыхароў. У 1926 г. 24 двары, 108 жыхароў. У 1929—30 гг. створаны калгас «Новы шлях», у 1967 г. да Ганаратава далучана вёска Галішчына. На пачатак 1992 г. 53 падвор'і, 112 жыхароў. У вёсцы пачатковая школа, магазін, свінагадоўчая ферма.

Ганчанскі, да 21.1.1969 г. пасёлак торфапрадпрыемства «Ганчанскае», пасёлак, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Вонічы на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзіць меліярацыйны канал, злучаны з р. Суша (прыток Ольсы). У 1869 г. выхадцы з суседняй вёскі Гонча заснавалі тут на купленых у памешчыка землях вёску Гуры. У 1930-я гады быў створаны калгас, а ў 1939 г. амаль усе жыхары перасяліліся ў суседнюю вёску Рагі. У 1954 г. пачалася забудова пасёлка торфапрадпрыемства, якое ў 1957 г. атрымала назву «Ганчанскае», таму і пасёлак стаў называцца Ганчанскі. На пачатак 1992 г. 176 падвор'яў, 437 жыхароў. У пасёлку сярэдняя і музычная школы, клуб, бібліятэка, дзіцячы сад-яслі, сельская участковая бальніца, прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, лазня, аддзяленне сувязі, сталовая.

Гонча, вёска, цэнтр сельсавета, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Вонічы на лініі Магілёў — Асіповічы. На поўночнай ускраіне р. Ганчанка (прыток Ольсы). Вядома з 16 ст. У 1589 сяло ў Свіслацкай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1651 г. ў складзе маёнтка Свіслач у Мінскім павеце. У 1847 г. 9 двароў, 46 жыхароў мужчынскага полу, у складзе маёнтка Драні Бабруйскага павета, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 16 двароў, 136 жыхароў, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. Кожны год 8 верасня ў вёсцы праводзілася свята. У 1908 г. 21 двор, 201 жыхар, у 1917 г. 23 двары. У 1926 г. 30 двароў, 213 жыхароў, адкрыта школа, для якой у 1927 г. пабудавана новае памяшканне, дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці для дарослых. У 1933 г. арганізаваны калгас «Шлях Кастрычніка». У 1940 г. 66 двароў, 310 жыхароў. З самага пачатку акупацыі вёскі нямецка-фашысцкімі захопнікамі тут пачала дзейнічаць патрыятычная група на чале са старшынёй сельсавета П. Б. Букатым, якая ў жніўні 1941 г. ўлілася ў Клічаўскі партызанскі атрад. У кастрычніку партызанамі быў разгромлены нямецка-паліцэйскі гарнізон у вёсцы, пачаў дзейнічаць

сельсавет, створана група самаабароны. У жніўні 1942 г. ў час карнай аперацыі «Арол» гітлераўцы спалілі 59 двароў, загубілі 9 жыхароў. На пачатак 1992 г. 110 падвор'яў, 271 жыхар. У вёсцы 8-гадовая школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, сталовая, магазін, майстэрні па рамонце сельгастэхнікі, ферма буйной рагатай жывёлы, лесапільня, установка па прыгатаванні вітаміннай мукі. На заходняй ускраіне вёскі брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць фашыстаў, у 1959 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Градкі, вёска ў Акцябрскім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзіць меліярацыйны канал, злучаны з р. Нясета (прыток Ольсы). Вёска вядома з канца 19 ст. У 1989 г. маёнтак Градкі (Марыянполь) Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, 1 двор, 9 жыхароў. У 1917 г. 15 двароў, 103 жыхары. У 1926 г. 20 двароў, 102 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас «1 Мая». На пачатак 1992 г. 14 падвор'яў, 26 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

Гулы, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Друць на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Друць. Заснавана сялянамі Г. Ф. Макаравым, З. і Ф. Цімашковымі — выхадцамі з вёскі Калічонка, якія ў 1932 г. тут пасяліліся. У 1933 г. створаны калгас імя Свярдлова. На пачатак 1992 г. 13 падвор'яў, 20 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

Даўжанка, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце, за 15 км ад чыгуначнай станцыі Мілое на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Друць, на поўначы — яе прыток р. Даўжанка (адсюль назва вёскі). Вядома з 1857 г. як вёска ў Быхаўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 27 двароў, 186 жыхароў, шынок, у Гарадзішчанскай воласці Быхаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 55 двароў, 208 жыхароў. У 1920 г. адкрыта школа па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоная Друць» (цэнтр у в. Брылёўка). У 1940 г. 76 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 15 жыхароў. На пачатак 1992 г. 15 падвор'яў, 23 жыхары, магазін.

Дзмітраўка 1-я, вёска ў Патоцкім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Турчанка (прыток Нясеты). Вядома з 2-й чвэрці 19 ст. як уладанне Радзівіла, адносілася да Бабруйскага павета, існавала царква. У 1908 г. 16 двароў, 158 жыхароў, частка вяскоўцаў займалася нарыхтоўкай і сплавам лесу. Паводле перапісу 1917 г., 21 двор, 128 жыхароў. У 1919 г. адкрыта школа (у 1925 г. 64 вучні). У 1926 г. 21 двор, 121 жыхар. У лінені 1941 г. вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Партызаны восенню 1941 г. разгромілі варожы гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы; аднавіў работу сельсавет, створаны атрад самаабароны. У 1942—43 гг. карнікамі разрабавана маёмасць калгаса і вяскоўцаў. На пачатак 1992 г. 10 падвор'яў, 16 жыхароў, бібліятэка.

Дзмітраўка 2-я, вёска ў Клічаўскім пасялковым Савеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзіць меліярацыйны канал, злучаны з р. Нясета (прыток Ольсы). Заснавана ў канцы 19 ст. выхадцамі з Клічава і суседніх вёсак. У 1897 г. засценак Дзмітраўка Бабруйскага павета, 24 двары, 232 жыхары. У 1907 г. вёска, 16 двароў, 194 жыхары, у 1917 г. 28 двароў, 216 жыхароў. У 1919 г. ў вясковай хаце арганізавана школа (у 1923 г. 33 вучні). У 1926 г. 38 двароў, 242 жыхары. У 1921 г. створана таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі, а ў 1930 г. калгас «Пяцігодка». У снежні 1941 г. партызаны разгромілі гарнізон акупантаў, аднавіў дзейнасць сельсавет, створана група са-

Помнік на брацкай магіле воінаў і партызан каля вёскі Гонча.

маабароны. На пачатак 1992 г. 299 падвор'яў, 871 жыхар. У вёсцы сярэдняя і музычная школы, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, філіял Клічаўскага камбіната бытавога абслугоўвання насельніцтва, магазін. Дзейнічаюць ферма буйной рагатай жывёлы, установка па прыгатаванні вітамінаў мукі. У цэнтры вёскі брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць фашыстаў пры вызваленні раёна. У 1960 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура жанчыны са сцягам.

Радзіма беларускага пісьменніка Л. М. Дайнекі.

Доўгае, вёска, цэнтр сельсавета, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Мілое на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Даўжанка (прыток Друці). Вядома з 1560 г. як сяло ў Любашанскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1738 г. 10 гаспадарак; у 1775 г. сяло Доўга, 35 двароў. У 1863 г. адкрыта школа (народнае вучылішча, у 1891 г. навучалася 20 хлопчыкаў і 3 дзяўчынкі). У 1885 г. 67 двароў, 566 жыхароў, царква, вадзяны млын. У 1892 г. пабудавана новая царква. У 1897 г. 109 двароў, 904 жыхары, хлебазапасны магазін, ніцейны дом, побач існавалі фальварак (2 двары, 13 жыхароў) і смалярна-шкіпінарны завод. У 1908 г. ў сяле 146 двароў, у маёнтку 1 двор, 8 жыхароў, у 1917 г. 179 двароў, 1101 жыхар. Сяляне займаліся земляробствам, зімой тралявалі да ракі лес, а вясной сплаўлялі яго. На Даўжанцы працаваў вадзяны млын, дзейнічалі сукнавальня і ваўначоска. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у 1938 г. пачатковая школа пераўтворана ў сямігодку, у 1939 г. — у дзесяцігодку. У 1925 г. адкрыта хата-чытальня. У 1930 г. арганізаваны калгасы імя Калініна і «Ударнік». У 1940 г. 199 двароў. У канцы 1941 г. партызаны разграмілі гарнізон акупантаў, аднавілася дзейнасць сельсавета, арганізавана група самаабароны. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 97 жыхароў. На пачатак 1992 г. 260 падвор'яў, 542 жыхары. У вёсцы сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячыя яслі-сад, бальніца, аддзяленне сувязі, аддзяленне ашчаднага банка, прыёмны пункт камбіната бытавога абслугоўвання насельніцтва, лазня з басейнам, сталовая, прамтаварны і прадуктовы магазіны. Дзейнічаюць майстэрні па рамонце сельгастэхнікі, ферма буйной рагатай жывёлы, млын, лесапільня.

Драні, вёска ў Ганчанскім сельсавеце, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Суша на лініі Магілёў — Асіповічы. Праз вёску цячэ р. Ганчанка (прыток Ольсы). Вёска вядома з 19 ст. У 1847 г. цэнтр маёнтка, уласнасць памешчыка, 12 двароў, 91 жыхар. У 1897 г. 25 двароў, 212 жыхароў, хлебазапасны магазін. Побач быў аднайменны выселак (1 двор, 10 жыхароў). У 1908 г. 34 двары, 300 жыхароў. У 1911 г. адкрыта школа (1-класнае народнае вучылішча). У 1917 г. 37 двароў, 321 жыхар. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені (у 1923 г. 28 вучняў). У 1926 г. 50 двароў, 340 жыхароў. Непадалёку ў лесе працавала смалакурня; арганізавана таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі, пераўтворанае ў 1931 г. ў калгас «Новае жыццё». У 1940 г. 66 двароў, 310 жыхароў. З пачатку акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі створана група самаабароны. 23 жыхары загінулі ў час карных аперацый акупантаў. У жніўні 1942 г. фашысты спалілі 59 двароў, забілі 9 жыхароў. На пачатак 1992 г. 31 падвор'е, 50 жыхароў. У вёсцы магазін, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая. Каля вёскі курганныя могільнікі 8—10 ст.

Дубно, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Мілое на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Даўжанка (прыток Друці), на поўдні — яе прыток Лічынка. Назва ад мясцовасці, дзе было шмат дубовых лясоў. Вядома з 1738 г. як сяло (7 гаспадарак) у Любашанскім старостве Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1884 г. адкрыта школа граматы. У 1897 г. 76 двароў, 561 жыхар, хлебазапасны магазін, царква. У 1917 г. 114 двароў, 638 жыхароў. Апрача земляробства, вяскоўцы займаліся гандлем, рамёствамі, працавалі на смалакурным заводзе, сплаўлялі лес па р. Даўжанцы. З 20.8.1924 г. цэнтр Клічаўскага раёна Бабруйскай акругі. У 1932 г. вяскоўцы аб'яднаны ў калгас «Чырвоная Ніва». Непадалёку дзейнічала смалакурня. У 1940 г. 117 двароў, 293 жыхары. У пачатку 1942 г. партызаны разграмілі паліцэйскі ўчастак, які размяшчаўся ў вёсцы, а 3.5.1942 г. тут аднавіў работу сельсавет. У жніўні 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 120 жыхароў. На пачатак 1992 г. 81 падвор'е, 140 жыхароў. У вёсцы фельчарска-акушэрскі пункт, аптэка, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Дубраўка, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Каля вёскі цячэ р. Турчанка (прыток Нясеты). Вядома з 19 ст. У 1897 г. хутар (2 двары, 39 жыхароў) у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. Побач быў аднайменны хутар (2 двары, 16 жыхароў). У 1908 г на хутары 3 двары, 34 жыхары, у 1917 г. 10 двароў, 90 жыхароў, ва урочышчы Дубраўка 8 двароў, 51 жыхар. У 1920 г. адкрыта школа, у 1922 г. для яе пабудавана памяшканне, у 1928 г. было 99 вучняў. У 1926 г. на хутары Дубраўка 1-я было 8 двароў, 68 жыхароў, Дубраўка 2-я — 12 двароў, 70 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас імя Варашылава (цэнтр у в. Хадэчын), адкрыта хата-чытальня. У Айчынную вайну вёска разрабавана, дамы спалены. На пачатак 1992 г. 1 падвор'е, 2 жыхары.

Дуброва, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце, за 17 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Кастрычка (каналізаваны прыток Ольсы). Вядома з пачатку 20 ст. У 1917 г. хутар (2 двары, 26 жыхароў) у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. 4.9.1923 г. створана сельгасарцель, якая ў 1925 г. аб'ядноўвала 15 гаспадарак. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоная Дуброва». Працавала кузня. У 1930-я гады адкрыта пачатковая школа. На пачатак 1992 г. 48 падвор'яў, 73 жыхары. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Дуброва, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Вядома з 19 ст. У 1907 г. засценак Дуброва-Вольгіна і хутар Дуброва. У 1917 г. ў засценку 12 двароў, 79 жыхароў, на хутары 2 двары, 26 жыхароў, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У гэтым годзе засценак і хутар былі аб'яднаны. У 1923 г. вёска атрымала вялікі ўчастак памешчыцкай зямлі. У 1926 г. створана сельгасарцель, адкрыта пачатковая школа і хата-чытальня. У Айчынную вайну ў вёсцы дзейнічала падпольная група, якая затым улілася ў партызанскі атрад. Гітлераўцы разрабавалі маёмасць вяскоўцаў і калгаса, частку вёскі спалілі, а частку выкарысталі для будаўніцтва ваенных умацаванняў. На пачатак 1992 г. 45 падвор'яў, 90 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Дулебна, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Гарадзечанка (прыток Нясеты). Вядома з 18 ст. У 1738 г. сяло Дулебы (11 двароў) у Любашанскім старостве. У 1847 г. 28 двароў, 248 жыхароў, у складзе маёнтка Арэхаўка Бабруйскага павета. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у 1923 г. 48, у 1925 г. 63 вучні. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны Барэц», адкрыта хата-чытальня. Летам 1942 г. паблізу вёскі базіраваўся партызанскі атрад № 208 і атрад Лівенцава; працавала друкарня, выпускаліся лістоўкі. Гітлераўцы спалілі вёску, разрабавалі маёмасць. На пачатак 1992 г. 69 падвор'яў, 126 жыхароў. У вёсцы клуб, магазін, аддзяленне сувязі, бібліятэка, ферма буйной рагатай жывёлы, Дом жывёлавода.

Жэрдзішча, вёска ў Ганчанскім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Вонічы на лініі Магілёў — Асіповічы. Заснавана ў 1900 г. выхадцамі з в. Суша. У 1908 г. 11 двароў, 88 жыхароў, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, у 1917 г. 34 двары, 121 жыхар. У 1926 г. 23 двары, 119 жыхароў, дзейнічаў пункт па ліквідацыі непісьменнасці. У 1933 г. арганізаваны калгас «Камунар» (першы старшыня Р. Заяц). На пачатак 1992 г. 2 падвор'і, 3 жыхары.

Загацце, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце (з 20.9.1944 г.), за 2 км ад чыгуначнай станцыі Мілое на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Гудка (прыток Даўжанкі). Паводле мясцовага падання, заснавана ў 1708—09 гг. жыхарамі в. Подліны, якія ў час Паўночнай вайны ратаваліся ў балоцістай мясцовасці за р. Гаткай (адсюль назва). У 1738 г. сяло Загайцы (5 гаспадарак) у Любашанскім старостве Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1775 г. сяло Загацце (18 двароў) у Падзевіцкім войтаўстве Любашынскага староства. У другой чвэрці 19 ст. 471 жыхар, знаходзілася ва ўладанні Радзівіла. У 1847 г. пабудавана царква, у 1885 г. адкрыта школа. У 1897 г. 61 двор, 501 жыхар, у 1908 г. 69 двароў, 569 жыхароў, у 1917 г. 85 двароў, 591 жыхар. Праз вёску праходзіла дарога з в. Дубна ў в. Ядраная Слабада, Гарадзішча і Быхаў. Паўднёвая частка вёскі ад дарогі мела назву Быхаўская, тут размяшчаліся карчма, хаты рамеснікаў і гандляроў. У 1932 г. арганізаваны калгас імя Молатава, пачатковая школа пераўтворана ў 7-гадовую. На пачатак 1992 г. 95 падвор'яў, 142 жыхары. У вёсцы лясніцтва, прамтаварны і прадуктовы магазіны, клуб, бібліятэка, ферма буйной рагатай жывёлы.

Закоркі 1-я, вёска ў Акцябрскім сельсавеце, за 24 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка, на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзяць меліярацыйныя каналы, злучаныя з р. Бярэзіна. Узнікла ў 1914 г. ў выніку падзелу вёскі Закоркі. У 1897 г. 69 двароў, 416 жыхароў, у 1908 г. 98 двароў, 474 жыхары, у 1917 г. 5 двароў, 30 жыхароў, у Якшыцкай воласці Ігуменскага павета. У 1930 г. арганізаваны калгас «Абуджэнне» (старшыня

М. А. Койніш). Калгас быў сярод перадавых у Клічаўскім раёне, дзейнічалі электрастанцыя, воўначасальня, крупадзёрка, маслабойня. На пачатак 1992 г. 16 падвор'яў, 35 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Закоркі 2-я, вёска ў Акцябрскім сельсавеце, за 22 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзіць меліярацыйны канал, злучаны з р. Бярэзіна. Узнікла ў 1914 г. у выніку падзелу вёскі Закоркі. У 1917 г. 62 двары, 424 жыхары. У 1930 г. арганізаваны калгас «Авангард» (першы старшыня Д. М. Вікторчык). На пачатак 1992 г. 16 падвор'яў, 25 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

Закупленне, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Мілое на лініі Магілёў — Асіповічы. На ўскраіне цячэ р. Даўжанка (прыток Друці). Вядома з 18 ст. У 1745 г. ў Быхаўскім графстве, шляхецкая ўласнасць. У 1758 г. 22 двары, 56 жыхароў мужчынскага полу, карчма, млын. У 1858 г. ў вёсцы 164 жыхары мужчынскага полу. Побач быў аднайменны фальварак, гаспадар якога меў у 1873 г. 1980 дзесяцін зямлі і 2 млыны. У 1880 г. ў вёсцы 59 двароў, 380 жыхароў. Апрача земляробства, вяскоўцы займаліся кравецкім і кавальскім промысламі, сплавам лесу. Дзейнічала царква. У 1897 г. 83 двары, 555 жыхароў, школа граматы, у Гарадзішчанскай воласці Быхаўскага павета. У фальварку ў гэты час было 7 двароў, 18 жыхароў, вадзяны млын. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці. У красавіку 1921 г. створана сельгасарцель «Веснік», у 1931 г.— калгас «Перамога» (старшыня Н. С. Краўцоў). У 1940 г. 143 двары, 170 жыхароў. У жніўні 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 64 жыхары. На пачатак 1992 г. 106 падвор'яў, 149 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Закуцкі Дварок, вёска ў Каўбчанскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Стаялава на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Ольса (прыток Бярэзіны). Вядома з 19 ст. У 1897 г. сядзіба Закуцце (26 жыхароў), вятрак і засценак (9 двароў, 59 жыхароў), у 1917 г. фальварак Закуцце (13 двароў, 105 жыхароў). У кастрычніку 1930 г. арганізаваны калгас «Іскра камуны». На пачатак 1992 г. 18 падвор'яў, 29 жыхароў.

Закуцце, вёска ў Каўбчанскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Стаялава на лініі Магілёў — Асіповічы. На ўсход ад вёскі цячэ р. Ольса (прыток Бярэзіны), на поўдзень — р. Цімень (прыток Ольсы). Вядома з 19 ст. У 1890 г. ў вёсцы адкрыта школа граматы, якая ў 1912 пераўтворана ў земскую. У 1897 г. 39 двароў, 267 жыхароў, у Гарадзецкай воласці Ігуменскага павета, дзейнічалі вятрак, хлебазапасны магазін. У 1908 г. 40 двароў, 270 жыхароў. Апрача земляробства, вяскоўцы займаліся вырабам розных бытавых рэчаў, працавалі на лесараспрацоўках. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у 1925 г. 70 вучняў, дзейнічаў драматычны гурток. У 1926 г. хутары (23 двары, 123 жыхары). У кастрычніку 1930 г. арганізаваны калгас «Іскра камуны». У 1939—40 гг. з хутароў у вёску пераселена 87 двароў. На пачатак 1992 г. 66 падвор'яў, 122 жыхары. У вёсцы 8-гадовая школа, магазін, клуб, аддзяленне сувязі, бібліятэка. фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, зернедрабілка.

Залічынка, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Мілое на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Даўжанка (прыток Друці). Заснавана ў 1920-я гады перасяленцамі з вёскі Дубна. У 1932 г. арганізаваны калгас «Чырвоная Ніва». У 1940 г. 32 двары, 81 жыхар. У Айчынную вайну наблізу вёскі базіраваўся партызанскі атрад № 113. Восенню 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 17 жыхароў. На пачатак 1992 г. 14 падвор'яў, 19 жыхароў.

Залаг, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіновічы. Побач праходзяць меліярацыйныя каналы, злучаныя з р. Нясета (прыток Ольсы). Заснавана ў 19 ст. выхадцамі з суседніх вёсак. У 1897 г. хутар (26 жыхароў), у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. На пачатак 1992 г. 6 падвор'яў, 8 жыхароў.

Замікітка, вёска ў Патоцкім сельсавеце, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Вонічы на лініі Магілёў — Асіновічы. Каля вёскі цячэ р. Сушанка (прыток Ольсы). Заснавана ў 1920-я гады выхадцамі з суседніх вёсак. У 1931 г. арганізаваны калгас «Прамень Саветаў», які ў 1935 г. аб'яднаны з калгасам імя Тэльмана (в. Усакіна). На пачатак 1992 г. 25 падвор'яў, 43 жыхары.

Заполле, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка

Від на в. Заполле з боку р. Ольса.

на лініі Магілёў — Асіповічы. На ўсходняй ускраіне цячэ р. Ольса (прыток Бярэзіны). У гістарычных крыніцах упершыню ўпамінаецца пад 1560 г. як сяло ў Бабруйскай воласці (27 двароў, 274 жыхары), дзяржаўная ўласнасць, дзейнічалі праваслаўная царква, касцёл. У 1639 г. 45 двароў, млын, паблізу быў фальварак. У 1738 г. 17 двароў, у 1773 г. 34 двары. У 1845 г. 26 двароў, 191 жыхар, у складзе маёнтка Ольса Бабруйскага павета, уласнасць памешчыка. З інвентара ўладання Ольса за 1845 г., куды ўваходзіла і вёска Заполле, вынікае, што мужчыны працавалі на памешчыка 238, жанчыны — 182 дні ў год. У 1897 г. ў вёсцы Заполле (яна ж Вялікая Ольса) было 65 двароў, 481 жыхар, царква, пастаялы двор, крама. У 1909 г. адкрыта земская школа, для якой у 1912 г. пабудавана памяшканне. У 1917 г. 97 двароў, 635 жыхароў. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у 1925 г. было 115 вучняў. дзейнічаў драматычны гурток. 2.2.1925 г. арганізавана рыбалоўная арцель, потым меліярацыйнае таварыства, адкрыта хата-чытальня. У 1926 г. 122 двары, 762 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас «Парыжская камуна» (першы старшыня Б. Канойка). У Айчынную вайну гітлераўцы загубілі больш за 50 мірных жыхароў вёскі. На пачатак 1992 г. 215 падвор'яў, 599 жыхароў. У вёсцы сярэдняя школа, Дом культуры, магазін, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка, дзіцячы сад-яслі, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, лесапільня, зернедрабілка, ферма буйной рагатай жывёлы. У 1957—59 гг. выдавалася шматтыражка калгаса імя Будзённага «За высокі ўраджай» (№ 1—15.3.1957). Каля вёскі курганныя могільнікі дрыгавічоў 8—10 ст.

Звальня, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Мілое на лініі Магілёў — Асіповічы. Заснавана ў сярэдзіне 19 ст. стараабрадцамі, якія перасяліліся сюды з Расіі. У 1917 г. хутар Звальніца (12 двароў, 58 жыхароў). У 1933 г. арганізаваны калгас «Чырвоны калеснік». Працавала пачатковая школа. Сярод вяскоўцаў быў пашыраны выраб колаў для калёс. У 1940 г. 20 двароў, 47 жыхароў. Восенню 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 16 жыхароў. На пачатак 1992 г. 5 падвор'яў, 8 жыхароў.

Земляніца, вёска ў Віркаўскім сельсавеце, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Заснавана ў 1923 г. на памешчыцкіх землях у асноўным былымі батракамі і малазямельнымі сялянамі з вёсак Віркава, Лянёўкі, Міхалова. У 1931 г. арганізаваны калгас «Свабодная праца» (цэнтр в. Лянёўка). На пачатак 1992 г. 14 падвор'яў, 21 жыхар.

Іванаўка, вёска ў Клічаўскім пасялковым Савеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач з вёскай меліярацыйны канал, злучаны з р. Нясета (прыток Ольсы). Вядома з 19 ст. У 1897 г. засценак (20 двароў, 129 жыхароў), у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1921 г. 6 двароў, 40 жыхароў. У 1924 г. да засценка далучаны былыя памешчыцкія землі. У 1926 г. хутары, 27 двароў, 58 жыхароў. У 1936 г. арганізаваны калгас «VIII з'езд Саветаў». На пачатак 1992 г. 24 падвор'і, 41 жыхар, магазін.

Кавяза, вёска ў Клічаўскім пасялковым Савеце, за 13 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Каля вёскі цячэ р. Перасека (прыток Перасопенкі). Заснавана ў 1918 г. выхадцамі з в. Бёрда. У 1931 г. арганізаваны калгас «Камунар». У 1940 г. 26 двароў, 73 жыхары. У жніўні 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску і расстралялі 11 жыхароў. На пачатак 1992 г. 14 падвор'яў, 29 жыхароў. За 1 км ад вёскі на вайсковых могілках брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі пры вызваленні раёна; пахаваны таксама Герой Савецкага Саюза партызан П. І. Кавалёў. У 1977 г. на магіле пастаўлена стэла.

Казлы, вёска ў Акцябрскім сельсавеце, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіновічы. Побач праходзіць меліярацыйны канал,

злучаны з р. Нясета (прыток Ольсы). Вядома з канца 19 ст. У 1897 г. засценак (7 двароў, 51 жыхар), у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1908 г. 9 двароў, 97 жыхароў, у 1917 г. вёска (19 двароў, 129 жыхароў). У 1920 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у 1923 г. 30 вучняў. У 1926 г. 25 двароў, 142 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас «Колас» (старшыня А. П. Хруцкі). На пачатак 1992 г. 36 падвор'яў, 75 жыхароў, магазін.

Калінаўка, вёска ў Віркаўскім сельсавеце, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзіць меліярацыйны канал, злучаны з р. Бярэзіна. Заснавана ў 1923 г. на месцы былога фальварка (78 жыхароў) і хутара Басін, у Свіслацкай воласці Бабруйскага павета. Працавалі пачатковая школа і гурток па ліквідацыі непісьменнасці. У 1934 г. арганізаваны калгас «Калінаўка». У Айчынную вайну загінуў кожны чацвёрты жыхар вёскі. У 1967 г. да Калінаўкі далучаны вёскі Басін і Свабода. На пачатак 1992 г. 76 падвор'яў, 149 жыхароў. У вёсцы зернедрабілка, ферма буйной рагатай жывёлы.

Калічонка, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце, за 1 км ад чыгуначнай станцыі Друць на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Друць. Вёска вядома з 18 ст. У 1747 г. 27 двароў, у Быхаўскім графстве, шляхецкая ўласнасць. У 1858 г. 107 жыхароў мужчынскага полу. У 1880 г. 54 двары, 355 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася адыходнымі промысламі. У 1897 г. 77 двароў, 570 жыхароў, у Гарадзішчанскай воласці Быхаўскага павета; адкрыта школа граматы, існаваў піцейны дом. У 1909 г. 81 двор, 636 жыхароў. У 1911 г. адкрыта земская школа. Пасля рэвалюцыі створана працоўная школа 1-й ступені, у 1925 г. было 48 вучняў. 18.7.1920 г. адкрыта школа па ліквідацыі непісьменнасці (23 навучэнцы). У 1933 г. арганізаваны калгас імя Свярдлова. У Айчынную вайну каля вёскі базіраваўся 113-ы партызанскі атрад. На пачатак 1992 г. 115 падвор'яў, 154 жыхары. У вёсцы пачатковая школа, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Канстантоў, вёска ў Клічаўскім пасялковым Савеце, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Узнікла на месцы фальварка Канстанцінава. У 1897 г. 34, у 1907 г. 30 жыхароў, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1926 г. 7 двароў, 48 жыхароў. У 1930 арганізаваны калгас «Зорка». У снежні 1941 г. партызанскім атрадам у вёсцы быў разгромлены варожы гарнізон. На пачатак 1992 г. 35 падвор'яў, 58 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Каўбчанская Слабодка, вёска ў Каўбчанскім сельсавеце, за 13 км ад чыгуначнай станцыі Стаялава на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Ольса (прыток Бярэзіны). Вёска вядома з 1850 г. Памешчык Ванковіч купіў у памешчыка з в. Азярышча Сенніцкай воласці 6 прыгонных сялян-майстроў і пасяліў іх на лясной паляне правага берага р. Ольса. Майстры з дапамогай сялян з бліжэйшых вёсак пабудавалі вятрак, гарбарню, кузню, жылыя дамы. Сюды перасялілася частка сялян з в. Коўбча. Новае пасяленне атрымала назву Слабада Каўбчанская. Апрача земляробства, вяскоўцы займаліся лесараспрацоўкамі, сплавам лесу. У 1897 г. 15 двароў, 152 жыхары, у Брадзецкай воласці Ігуменскага павета. Дзейнічалі вятрак і вадзяны млын. У 1908 г. 16 двароў, 192 жыхары, у 1917 г. 26 двароў, 150 жыхароў. У 1926 г. 34 двары, 212 жыхароў. У 1927 г. арганізаваны калгас «Чырвоная Слабада». На пачатак 1992 г. 41 падвор'е, 84 жыхары. У вёсцы магазін. Каля вёскі размешчаны старажытны курган, які застаўся ад вялікага курганнага могільніка дрыгавічоў 8—10 ст.

Клічаў, гарадскі пасёлак (з 27.9. 1938 г.), цэнтр раёна, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы, на р. Ольса (прыток Бярэзіны). Знаходкі крамянёвых прылад працы і каменных сякер сведчаць аб тым, што першабытны чалавек быў на гэтай тэрыторыі яшчэ ў эпоху каменнага веку. Як ужо адзначалася, ёсць меркаванне, што ўпершыню Клічаў як сяло ўпамінаецца ў рукапісным акце пад 1592 г. У 1738 г. 20 гаспадарак, у Любашанскім старостве Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. З 1775 г. мястэчка (25 двароў) у Мацеевіцкім войтаўстве Любашанскага старостваа Аршанскага павета. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793 г.) у складзе Расійскай імперыі. У 1801 г. ў Ігуменскім павеце. У Айчынную вайну 1812 г. жыхары Клічава актыўна ўдзельнічалі ў партызанскай барацьбе. Асабліва вызначыўся партызанскі атрад пад кіраўніцтвам селяніна Тараса. У 1865 г. 79 двароў, 427 жыхароў, праваслаўная царква. У 1875 г. адкрыта школа (народнае вучылішча), у якой у 1891 г. было 29, у 1894 г.— 37 хлопчыкаў. У 1886 г. 50 двароў, 390 жыхароў, праваслаўная царква, капліца, сінагога, школа, крама, вадзяны млын, у Даўжанскай воласці. У 1894 г. пабудаваны новы драўляны будынак царквы. У 1897 г. 53 двары, 360 жыхароў, вадзяны млын і 2 ветракі, школа (народнае вучылішча), царква, піцейны дом, 4 крамы, 2 разы на год праводзіліся кірмашы. У мястэчку 79 двароў, 539 жыхароў, хлебазапасны магазін, у фальварку 3 двары, 36 жыхароў. У 1901 г. заснаваны шклозавод. У 1917 г. ў сяле 117 двароў, 2550 жыхароў, у фальварку 1 двор, 55 жыхароў, у мястэчку 238 двароў, 1130 жыхароў, у маёнтку 1 двор, 81 жыхар. У 1917 г. створаны атрад Чырвонай гвардыі. З 17.7.1924 г. раённы цэнтр у Бабруйскай акрузе. 8.12. 1924 г. створана сельскагаспадарчае крэдытнае таварыства «Чырвоная Беларусь», дзейнічаў народны дом. На базе дарэвалюцыйнай адкрыта працоўная школа 2-й ступені, для якой у 1927 г. пабудавана памяшканне. У 1927 г. пачала дзейнічаць метэаралагічная станцыя. У 1930 г. на базе дробных прадпрыемстваў створаны райпрамкамбінат, у які ўваходзілі Клічаўская піларама, цэх ганчарных вырабаў у Бацэвічах, паравы і вадзяны млыны ў Доўгім і інш.; з 1933 г. і торфазавод «1 Мая». У 1930 г. арганізаваны калгас «Наша праца». У 1931 г. адкрыта вячэрняя школа для дарослых і дзіцячая пляцоўка. У 1940 г. працавалі маслазавод, 2 хлебазаводы, райпрамкамбінат, шавецкая, кравецкая і кандытарская арцелі, завод безалкагольных напіткаў, тэлефонна-тэлеграфная станцыя, пошта, радыёвузел, Дом культуры, раённая бібліятэка. леспрамгас, лясгас, сталовая, сярэдняя школа, паліклініка. 20.3.1942 г. партызаны разгромілі варожы гарнізон у Клічаве. Была створана Клічаўская партызанская зона, арганізаваны Клічаўскі аператыўны цэнтр. 27.9.1942 г. выйшаў першы нумар газеты «Голас партызана». Дзейнічаў партызанскі аэрадром. Гітлераўцы поўнасцю спалілі раённы цэнтр, загубілі 504 жыхароў. У 1968 г. ў склад гарадскога пасёлка ўвайшлі вёскі Яўсташына і Маркаўшчына.

На пачатак 1992 г. 8100 жыхароў. У гарадскім пасёлку размешчаны хлебазавод, маслазавод, харчовы цэх Бабруйскага кансервава-вінаробнага завода, дрэваапрацоўчы камбінат, лясгас, лесаўчастак Бабруйскага доследнага леспрамгаса, Магілёўскі саўгас-тэхнікум, 2 сярэднія, вячэрняя, музычная і дзіцяча-юнацкая спартыўная школы, 5 дашкольных устаноў, міжшкольны вучэбна-вытворчы камбінат, Дом піянераў і школьнікаў, 2 бібліятэкі, музей народнай славы, бальніца, паліклініка, аддзяленне Дзяржбанка, гасцініца, аптэка, камбінат бытавога абслугоўвання, Дом культуры, 2 інтэрнаты, універмаг. Выдаецца раённая газета «Сцяг Саветаў», дзейнічае раённая рэдакцыя радыёвяшчання. У скверы брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні Клічава ад нямецка-фашысцкіх акупантаў; у 1958 г. на магіле пастаўлены помнік. На могілках: магіла ахвяр фашызму, дзе пахавана каля 300 мірных жыхароў пасёлка, закатаваных нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1942 г.; магіла 5 жанчын-медработнікаў, якіх 10.10. 1941 г. закатавалі нямецка-фашысцкія акупанты, у 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск; магіла чырвонаармейцаў, што загінулі ў 1920 г. ў баі супраць польскіх інтэрвентаў, у 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск; на паўночна-ўсходняй ускраіне пасёлка, каля дарогі на в. Чачэвічы насыпаны курган Славы ў гонар партызан і савецкіх воінаў, якія ўдзельнічалі ў вызваленні раёна, у 1967 г. на вяршыні яго пастаўлены стэла і скуль-

Вуліца Крыванося ў Клічаве.

птуры воіна, партызана і дзяўчыны; каля будынка райваенкамата на месцы прызямлення самалёта з Вялікай зямлі, які даставіў партызанам боепрыпасы і прадукты, у 1977 г. пастаўлена стэла; на плошчы помнік у гонар баявых дзеянняў партызан, у 1952 г. пастаўлена стэла; каля будынка сярэдняй школы № 1 помнік Герою Савецкага Саюза П. А. Крываносу, у 1986 г. пастаўлены партрэтны бюст.

Радзіма беларускай пісьменніцы Г. А. Васілеўскай.

Клічаўскія Пасёлкі, вёска ў Клічаўскім пасялковым Савеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Ольса (прыток Бярэзіны). Узнікла ў пачатку 1920-х гадоў у выніку перасялення сялян з Клічава і бліжэйшых вёсак на былыя памешчыцкія землі. У 1926 г. 36 двароў, 205 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Новы быт». На пачатак 1992 г. 38 падвор'яў, 101 жыхар. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Коўбча, вёска, цэнтр сельсавета (з 20.8. 1924 г.), за 15 км ад чыгуначнай станцыі Стаялава на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Ольса (прыток Бярэзіны). Вядома з 1513 г. як сяло Кабла (37 гаспадарак), у Свіслацкай воласці Вялікага княства Літоўскага. У 1563 г. 30 гаспадарак, у часовым карыстанні полацкага шляхціца. У 1589 г. сяло Кобча, дзяржаўная ўласнасць, з 1794 г. ў Брадзецкай воласці Ігуменскага павета. У 1806 г. пабудавана драўляная царква, у 1863 г. ў наёмным памяшканні адкрыта школа (народнае вучылішча), у 1891 г. навучалася 47 хлопчыкаў. У 1870 г. 60 двароў (дзве вуліцы), царква, крама, карчма. У 1885 г. 73 двары, 608 жыхароў, вятрак, школа, царква. У 1897 г. 144 двары, 941 жыхар, 2 ветракі, хлебазапасны магазін, крама, піцейны дом, у 1908 г. 140 двароў, 930 жыхароў, у 1917 г. 165 двароў, 1089 жыхароў. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, якой у 1924 г. перададзены царкоўны будынак (у 1925 г. 124 вучні, бібліятэка). У 1926 г. 230 двароў, 1309 жыхароў; працаваў пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас «Беларусь», у 1931 г. 57 гаспадарак, кузня. У 1939—40 гг. да вёскі далучаны 187 хутароў, пасёлкі Крушыннік і Пагарэлае. Пачатковая школа рэарганізавана спачатку ў 7-гадовую, потым у сярэднюю, пастаўлены новы будынак. У 1942 г. партызаны разгромілі нямецка-паліцэйскі гарнізон у вёсцы, у чэрвені 1942 г. аднавіў сваю дзейнасць сельсавет, арганізавана група самаабароны. У час карных аперацый 1942—43 гг. вёска разбурана і разрабавана акупантамі.

Адна з вуліц в. Коўбча.

На пачатак 1992 г. 205 падвор'яў, 568 жыхароў. У вёсцы сярэдняя школа, магазін, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, комплексна-прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, аддаленне сувязі, дзіцячы сад, лесапільня, майстэрні па рамонце сельгастэхнікі, ферма буйной рагатай жывёлы, установка па прыгатаванні вітамінаў мукі, ветэрынарны пункт. У цэнтры вёскі брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, у 1959 г. пастаўлены абеліск; на могілках пахавана разведчыца 25-га асобнага партызанскага атрада Ж. П. Кардымон, схопленая ў час выканання баявога задання і закатаваная фашыстамі ў маі 1942 г., у 1975 г. на магіле пастаўлены абеліск. Каля вёскі курганны могільнік дрыгавічоў 6—8 ст.

Радзіма доктара медыцынскіх навук М. П. Кнігі.

Куцін, вёска ў Каўбчанскім сельсавеце, за 22 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Нясета (прыток Ольсы). Вядома з 19 ст. У 1857 г. вёска (51 жыхар мужчынскага полу), у Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 30 двароў, 197 жыхароў, у Брадзецкай воласці Ігуменскага павета. Дзейнічалі вятрак, хлебазапасны магазін. У 1908 г. ў в. Куцін 1-ы 29 двароў, 197 жыхароў, у в. Уложжа (яна ж Куцін 2-і) 12 двароў, 66 жыхароў. У 1917 г. ў в. Куцін 1-ы 20 двароў, 129 жыхароў, у в. Куцін 2-і 26 двароў, 193 жыхары. У 1926 г. ў в. Куцін 1-ы 32 дварыі, 187 жыхароў, у в. Куцін 2-і 29 двароў, 170 жыхароў. У 1920-я гады перасяленцы з гэтых вёсак стварылі побач невялікую вёску Куцін 3-і. У 1933 г. арганізаваны калгас «Новае жыццё». Працавалі пачатковая школа, хата-чытальня, гурток па ліквідацыі непісьменнасці. У час карных аперацый 1942—44 гг. вёскі спалены гітлераўцамі, а маёмасць разрабавана. У 1967 г. вёскі Куцін 1-ы, Куцін 2-і і Куцін 3-і аб'яднаны. На пачатак 1992 г. 24 падвор'і, 66 жыхароў. У вёсцы пачатковая школа, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Лаззё, вёска ў Клічаўскім пасялковым Савеце, за 13 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Ольса (прыток Бярэзіны). Заснавана ў 1925 г. выхадцамі з в. Бёрда, якія пасяліліся тут на былых памешчыцкіх землях. У 1930 г. арганізаваны калгас «Колас». У 1940 г. 21 двор, 63 жыхары. У жніўні 1942 г. гітлераўцы спалілі вёску, загубілі 9 жыхароў. На пачатак 1992 г. 13 падвор'яў, 39 жыхароў. На захад ад вёскі курганны могільнік крывічоў.

Ліпніца, да 7.3.1975 г. вёскі Старая Ліпніца і Новая Ліпніца, вёска ў Каўбчанскім сельсавеце (з 1958 г.), за 17 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Нясета (прыток Бярэзіны). Вядома з 19 ст. У 1885 г. 25 двароў, 255 жыхароў, царква, у Брадзецкай воласці Ігуменскага павета. У 1897 г. 54 дварыі, 372 жыхары, хлебазапасны магазін. Побач з вёскай была аднайменная ферма (1 двор, 7 жыхароў). У 1908 г. 57 двароў, 372 жыхары, у 1917 г. 76 двароў, 484 жыхары. На месцы былога маёнтка ўзнік хутар Новая Ліпніца, яні быў пазней ператвораны ў вёску. У 1932 г. арганізаваны калгас «Вольная праца». Працавалі хата-чытальня і пачатковая школа. У час карных аперацый 1942—44 гг. гітлераўцы спалілі вёскі, разрабавалі маёмасць. У 1975 г. Старая Ліпніца і Новая Ліпніца аб'яднаны. На пачатак 1992 г. 36 падвор'яў, 80 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Любічы, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзіць меліярацыйны канал, злучаны з р. Ольса (прыток Бярэзіны). Узнікла ў канцы 19 ст. на ўчастку выкарчаванага лесу, які памешчык аддаў у арэнду сялянам. У 1897 г. засценак Любічы (ён жа Брыцалавічы), 10 двароў, 62 жыхары, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1908 г. 7 двароў, 73 жыхары, у 1917 г. 13 двароў, 104 жыхары. У 1926 г. 26 двароў, 124 жыхары. На пачатак 1992 г. 38 падвор'яў, 53 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

Люціна, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце (з 1924 г.), за 8 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Праз вёску цячэ р. Лень (прыток Бярэзіны). Вядома з 17 ст. У 1684 г. 30 двароў, у Бабруйскім старостве, дзяржаўная ўласнасць, пасесія. У 1689 г. в. Луцін — Слабада ў складзе прыватнага ўладання Свіслач, у Мінскім павеце. У 1838 г. 68 рэвізскіх душ, у Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1844 г. 19 двароў, 145 жыхароў, у складзе маёнтка Бацэвічы Бабруйскага павета. Гаспадар маёнтка меў у 1850 г. 595,5 дзесяціны зямлі. У 1897 г. в. Люцін 58 двароў, 395 жыхароў, вадзяны млын, хлебазапасны магазін, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1908 г. 72 дварыі, у 1917 г. 77 двароў, 399 жыхароў. У 1910 г. адкрыта земская школа (у наёмным памяшканні). На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у 1923 г. было 36 вучняў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Гігант». У 1936 г. для школы пабудавана новае памяшканне. У 1940 г. 95 двароў, 312 жыхароў. Летам 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску і 79 жыхароў. На пачатак 1992 г. 64 падвор'і, 93 жыхары. У вёсцы размешчаны 8-гадовая школа, магазін, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, ферма буйной рагатай жывёлы. Каля вёскі магіла ахвяр фашызму, дзе пахаваны жыхары вёскі, у 1967 г. на магіле пастаўлены стэла і пліта з надпісам-прысвячэннем.

Лянёўка, вёска ў Віркаўскім сельсавеце, чыгуначная станцыя Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Вядома з 17 ст. У 1651 г. ў складзе прыватнага ўладання Свіслач Мінскага павета. У 1857 г. 142 жыхары, у 1897 г. 51 двор, 341 жыхар, у Свіслацкай воласці Бабруйскага павета. У 1908 г. 59 двароў, 455 жыхароў, у 1917 г. 86 двароў, 520 жыхароў. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені. У 1932 г. арганізаваны калгас «Свабодная праца». У 1930-я гады працавала смалакурня. На пачатак 1992 г. 85 падвор'яў, 149 жыхароў. У вёсцы магазін, бібліятэка. Каля вёскі 2 курганныя могільнікі 6—8 ст.

Малая Вольса, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце (з 1924 г.), за 12 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Каля вёскі цячэ р. Ольса (прыток Бярэзіны). Вядома з 17 ст. У 1621 г. сяло (3 гаспадарскія і 45 сялянскіх двароў, млын), паблізу існаваў аднайменны фальварак. У 1647 г. 57 двароў, у Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства, шляхецкая ўласнасць. У 1684 г. 25 двароў, у Бабруйскім старостве, дзяржаўная ўласнасць,

пасесія. У 1765 г. 22 двары, карчма. У 1897 г. 53 двары, 405 жыхароў, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета, быў хлебазапасны магазін, у суседнім маёнтку 1 двор, 12 жыхароў. У 1908 г. ў вёсцы 64 двары, 457 жыхароў, у маёнтку 16 жыхароў, у 1917 г. ў вёсцы 81 двор, 499 жыхароў, у фальварку 97 жыхароў. 6.2.1925 г. створана рыбалавецкая прамысловая арцель. У 1926 г. 89 двароў, 638 жыхароў. У 1934 г. арганізаваны калгас «VII з'езд Саветаў». На пачатак 1992 г. 106 падвор'яў, 180 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы. Каля вёскі курганны могільнік дрыгавічоў 8—10 ст.

Малінава, да 30.7.1964 г. в. Язвы, вёска ў Патоцкім сельсавеце (з 19.8. 1966 г.), за 6 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Турчанка (прыток Нясеты), меліярацыйны канал, злучаны з р. Ольса (прыток Бярэзіны). Вядома з пачатку 20 ст. Паводле перапісу 1917 г. хутар Маліннік, -13 гаспадарак, 81 жыхар. У 1930 г. сюды перасяліліся 6 гаспадарак з іншых хутароў і хутар Маліннік ператвораны ў вёску. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны маяк». На пачатак 1992 г. 36 падвор'яў, 75 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Малінне, вёска ў Ганчанскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Развадава на лініі Магілёў — Асіновічы. Узнікла ў 1908 г. ў выніку перасялення сюды сялян з Качэрыцкай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. 13 двароў, 81 жыхар, у Даўжанскай воласці Ігуменскага павета. На пачатак 1992 г. 11 падвор'яў, 19 жыхароў.

Масніцкае, вёска ў Акцябрскім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзяць меліярацыйныя каналы, злучаныя з р. Нясета (прыток Ольсы). Заснавана ў канцы 19 ст. выхадцамі з суседніх вёсак. У 1897 г. засценак (12 двароў, 93 жыхары), у Якшыцкай воласці Ігуменскага павета. У 1917 г. вёска (14 двароў, 112 жыхароў). У 1931 г. арганізаваны калгас імя О. Ю. Шміта. На пачатак 1992 г. 12 падвор'яў, 24 жыхары.

Масное, вёска ў Акцябрскім сельсавеце (з 10.9.1964 г.), за 12 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзяць меліярацыйныя каналы, злучаныя з р. Бярэзіна. Утворана ў 1914 г. жыхарамі навакольных вёсак і хутароў. У 1917 г. ўрочышча Масное (11 двароў, 79 жыхароў), у Якшыцкай воласці Ігуменскага павета. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвонаармеец», які ў 1935 г. аб'яднаўся з калгасам «Авангард». На пачатак 1992 г. 13 падвор'яў, 25 жыхароў, магазін.

Мілажань, вёска ў Акцябрскім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Нясета (прыток Ольсы). Вядома з 19 ст. У 1857 г. засценак Мілошына ў Бабруйскім павеце. У 1897 г. засценак Мілажня (11 двароў, 85 жыхароў), у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага навета. У 1917 г. засценак Мілажня Старая (5 двароў, 27 жыхароў), в. Мілажня Новая (37 двароў, 169 жыхароў). У сярэдзіне 1920-х гадоў засценак і вёска аб'яднаны. У 1926 г. 43 двары, 188 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны лістапад». На пачатак 1992 г. 9 падвор'яў, 15 жыхароў. У вёсцы авечкагадоўчая ферма.

Мілое, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце, чыгуначная станцыя на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Гутка (прыток Даўжанкі). Узнікла ў 1928 г. ў сувязі з будаўніцтвам чыгункі. На пачатак 1992 г. 40 падвор'яў, 70 жыхароў. У вёсцы магазін, аддзяленне сувязі. Каля вёскі брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць фашыстаў, у 1957 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна са сцягам.

Міхалоў, вёска ў Віркаўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіновічы. Вядома з 19 ст. У 1857 г. в. Міхалова, уласнасць памешчыка. У 1897 г. в. Міхалова (яна ж Міжвострае), 32 двары, 232 жыхары, крама, у Свіслацкай воласці Бабруйскага павета; у 1917 г. 48 двароў, 328 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоная Бярэзіна». На пачатак 1992 г. 14 падвор'яў, 22 жыхары.

Міхалоўка, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце, за 15 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіновічы. Побач р. Ольса (прыток Бярэзіны). Вядома з 18 ст. У 1772 г. вёска ў Кажуховіцкім старостве Мсціслаўскага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць, быў шынок. У 1838 г. 26 рэвізскіх душ, у Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. Паводле перапісу 1917 г. 4 двары, 37 жыхароў, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1926 г. 10 двароў, 69 жыхароў. На пачатак 1992 г. 9 падвор'яў, 14 жыхароў.

Мяжное, вёска ў Ганчанскім сельсавеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Вонічы на лініі Магілёў — Асіповічы. Утворана ў 1901 г. перасяленцамі з в. Гонча. У 1917 г.

31 двор, 193 жыхары, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1926 г. 34 двары, 190 жыхароў, створана таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі, на базе якога ў 1930 г. арганізаваны калгас «Сталінскі шлях» (першы старшыня К. К. Буракоўскі). Працавалі пачатковая школа, гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1940 г. 45 двароў, 154 жыхары. У жніўні 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 8 жыхароў. На пачатак 1992 г. 17 падвор'яў, 23 жыхары. У вёсцы магазін.

Новае Сяло, вёска ў Акцябрскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіновічы. Побач праходзяць меліярацыйныя каналы, злучаныя з р. Нясета і Бярэзінай. Вядома з 19 ст. У 1897 г. вёска Новае Сяло (яна ж Людское), 67 двароў, 365 жыхароў, кузня, карчма, у Якшыцкай воласці Ігуменскага павета. У 1908 г. 76 двароў, 510 жыхароў. У 1913 г. адкрыта народнае вучылішча. У 1917 г. 83 двары, 492 жыхары. У 1928 г. арганізаваны калгас «Усход». На пачатак 1992 г. 43 падвор'і, 80 жыхароў. У вёсцы магазін.

Новая Слабодка, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Мілое на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Друць. Вядома з 19 ст. У 1858 г. 90 рэвізскіх душ, у Быхаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1880 г. 36 двароў, 263 жыхары. У 1897 г. 58 двароў, 411 жыхароў, царква, школа граматы, піцейны дом. У 1909 г. 74 двары, 474 жыхары. У 1920-я гады адкрыта 4-гадовая школа, дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1933 арганізаваны калгас «Ленінскі шлях» (першы старшыня М. Пінчукоў, закатаваны гітлераўцамі ў 1942 г.). Па пачатак 1992 г. 73 падвор'і, 129 жыхароў. У вёсцы пачатковая школа, магазін, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, ферма буйной рагатай жывёлы.

Новы Востраў, вёска ў Акцябрскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзіць меліярацыйны канал, злучаны з р. Бярэзіна. Вядома з пачатку 20 ст. У 1917 г. вёска Востраў Новы (22 двары, 151 жыхар), у Якшыцкай воласці Ігуменскага павета. У 1930 г. арганізаваны калгас «Світанне». У 1967 г. да Новага Вострава далучаны вёскі Запрудзе і Галубок. На пачатак 1992 г. 94 падвор'і, 205 жыхароў. У вёсцы пачатковая школа, магазін, зернедрабілка, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая.

Радзіма беларускай паэтэсы М. С. Шаўчонак.

Новы Спор, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце, за 15 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзяць меліярацыйныя каналы, злучаныя з р. Ольса (прыток Бярэзіны). Узнікла ў 1920-я гады ў выніку перасялення сялян на былыя памешчыцкія землі з вёсак Стары Спор, Дуброва. На пачатак 1992 г. 10 падвор'яў, 21 жыхар.

Новыя Максімавічы, вёска ў Каўбчанскім сельсавеце, за 15 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзяць меліярацыйныя каналы, злучаныя з р. Нясета (прыток Ольсы). Заснавана ў 1-й палове 19 ст. ў выніку перасялення сялян са Случчыны. У 1897 г. засценак Максімавічы (29 двароў, 205 жыхароў), у Брадзецкай воласці Ігуменскага павета, у 1907 г. 30 двароў, 205 жыхароў. У 1908 г. адкрыта школа. У 1917 г. вёска Максімавічы Новыя (36 двароў, 245 жыхароў). На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у 1925 г. былі 72 вучні. У 1926 г. 47 двароў, 309 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны маяк». У 1935 г. для школы пабудавана новае памяшканне, у 1940 г. пачатковая школа пераўтворана ў сямігодку. Існавалі паравы млын, кузня. На пачатак 1992 г. 113 падвор'яў, 396 жыхароў. У вёсцы сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, комплексна-прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, гаспадарчы двор. Непадалёку ад вясковых могілак брацкая магіла воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць фашыстаў, у 1964 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна са сцягам.

Новыя Набаркі, вёска ў Каўбчанскім сельсавеце, за 17 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіновічы. Побач цячэ р. Нясета (прыток Ольсы). Заснавана ў 2-й палове 19 ст. сялянамі з в. Старыя Набаркі. У 1897 г. засценак Набаркі (20 двароў, 158 жыхароў, вятрак), у Брадзецкай воласці Ігуменскага павета. У 1917 г. вёска Набаркі Новыя (23 двары, 153 жыхары). У 1926 г. 29 двароў, 143 жыхары. У 1930 г. арганізаваны калгас «Праўда». У 1935 г. для пачатковай школы пабудавана новае памяшканне. У Айчынную вайну спалена і разрабавана акупантамі. На пачатак 1992 г. 8 падвор'яў, 19 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

Дом культуры ў в. Нясята.

Нясета, пасёлак у Нясяцкім сельсавеце, чыгуначная станцыя на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Турчанка (прыток Нясеты). Заснавана ў 1927 г. ў сувязі з будаўніцтвам чыгункі Клічаў — Асіповічы. На пачатак 1992 г. 120 падвор'яў, 254 жыхары. У пасёлку 2 магазіны, сталовая, аддзяленне сувязі.

Нясята, вёска цэнтр сельсавета, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Нясета (прыток Ольсы). Вядома з 16 ст. У 1650 г. сяло Нясята, шляхецкая ўласнасць. У 2-й палове 18 ст. пабудавана царква. У 1839 г. 94 рэвізскія душы, у Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка, існаваў хлебазапасны магазін. У 1885 г. 200 жыхароў, гарбарны завод, царква, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1897 г. 52 двары, 376 жыхароў, царкоўнапрыходская школа, хлебазапасны магазін, раз у год праводзіўся кірмаш. Побач існавалі аднайменныя выселкі (6 двароў, 41 жыхар, вадзяны млын, пастаялы двор) і маёнтак (3 двары, 18 жыхароў). У 1904 г. заснаваны вінакурны завод. У 1908 г. ў сяле 61 двор, 395 жыхароў, у маёнтку 41 жыхар. У 1916 г. адкрыта школа (1-класнае народнае вучылішча). У 1917 г. ў сяле 73 двары, 462 жыхары.

Беларускі гісторык і этнограф А. К. Ельскі ў «Геаграфічным слоўніку Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краін» (1886. Т. 7. С. 112) паведамляў, што ў Нясяце 20 двароў з поўнымі надзеламі, а тутэйшыя землі (больш за 212 валок) — даўняя спадчына Паўлікоўскіх; дзейнічала царква (каля 2 валок зямлі), даход ад млыноў складаў каля 300 руб. У другім томе (1881) таго ж самага «Слоўніка...» змешчаны ўспаміны пра Нясяту Евы Фялінскай (с. 350).

У 1919 г. ў былым панскім маёнтку створана народная гаспадарка «Нясята», якая мела 358 га зямлі, вінакурны завод. У 1922 г. адкрыта хата-чытальня. Працавалі паравы млын і сукнавальня. 1.10.1924 г. адкрыта 4-гадовая школа, у 1925 г. 65 вучняў, працавалі драматычны і харавы гурткі. У 1931 г. арганізаваны калгас імя Ф. Энгельса, адкрыта дзіцячая пляцоўка. Побач з вёскай, ва ўрочышчы Кладзішча, у 1934 г. арганізавана Нясяцкая МТС. У 1938 г. ў майстэрні МТС зманціравана электраўстаноўка, якая дала святло вёсцы. У лютым 1942 г. гітлераўцы расстралялі 10 мірных жыхароў. У 1945 г. адкрыты дзіцячы дом (дзейнічаў да 1969 г.). На пачатак 1992 г. 312 падвор'яў, 816 жыхароў. У вёсцы сярэдняя школа, дзіцячы сад, фельчарска-акушэрскі пункт, Дом культуры, бібліятэка, прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, аддзяленне сувязі, 3 магазіны, сталовая, лазня, аддзяленне ашчаднага банка, філіял музычнай школы. Дзейнічаюць майстэрні па рамонце сельгастэхнікі, лесанарыхтоўчы пункт, ферма буйной рагатай жывёлы, жывёлагадоўчы комплекс, спіртзавод, піларама. У вёсцы брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць фашыстаў, у 1964 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна са сцягам. На могілках магіла ахвяр фашызму, у 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск; магіла партызана 277-га палка М. А. Астроўскага, у 1969 г. пастаўлены абеліск. Каля вёскі курганны могільнік дрыгавічоў 8—10 ст.

Орліна, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзіць меліярацыйны канал, злучаны з р. Ольса (прыток Бярэзіны). Вядома з 1513 г. як сяло ў Свіслацкай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1560 г. 20 двароў. У 1797 г. вёска Арлова (41 жыхар мужчынскага полу), у Бабруйскім павеце, уладанне Д. Радзівіла. У 1838 г. вёска Орлін (87 рэвізскіх душ), у Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1844 г. 67 двароў, 456 жыхароў, хлебазапасны магазін, вінная крама, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1908 г. 79 двароў, 532 жыхары, у 1917 г. 100 двароў, 677 жыхароў. 26.11.1924 г. адкрыта школа (у наёмным памяшканні; у 1925 г. 59 вучняў). У 1926 г. 129 двароў, 707 жыхароў. У 1932 г. арганізаваны калгас «Орліна». У 1940 г. 176 двароў, 598 жыхароў. Восенню 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 3 жыхароў, маёмасць разрабавалі. На пачатак 1992 г. 93 падвор'і, 171 жыхар. У вёсцы магазін, клуб, аддзяленне сувязі, камбінат бытавога абслугоўвання насельніцтва, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая. Каля вёскі курганны могільнік 8—10 ст.

Падгор'е, вёска ў Патоцкім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Вонічы на лініі Магілёў — Асіповічы. Вядома з пачатку 20 ст. Паводле перапісу 1917 г. 10 гаспадарак, 90 жыхароў, у Даўжанскай воласці Ігуменскага павета. З 1922 г. ў складзе саўгаса імя Л. Б. Красіна. У 1926 г. 16 двароў, 114 жыхароў. У 1937 г. ў складзе калгаса імя Э. Тэльмана. У 1940 г. 24 двары, 110 жыхароў. Восенню 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, разрабавалі маёмасць, расстралялі 16 жыхароў. На пачатак 1992 г. 16 падвор'яў, 24 жыхары. Каля вёскі брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць фашыстаў, у 1970 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Падстружжа, вёска ў Ганчанскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Вонічы на лініі Магілёў — Асіповічы. Заснавана ў канцы 19 ст. перасяленцамі з в. Зарэчча Даўжанскай воласці Ігуменскага павета. На пачатку мела назву Застарынне. У 1908 г. вёска (16 двароў, 116 жыхароў) у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. Паводле перапісу у 1917 г. 23 двары, 142 жыхары, працаваў невялікі завод па вырабе гонты. У пачатку 1925 г. адкрыта школа (58 вучняў). У 1926 г. 28 двароў, 158 жыхароў. У 1928 г. для школы пабудавана памяшканне, дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1933 г. арганізаваны калгас імя Варашылава. У 1940 г. 35 двароў, 122 жыхары. Восенню 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 9 жыхароў. На пачатак 1992 г. 17 падвор'яў, 29 жыхароў.

Пад'яблынька, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Заснавана ў канцы 19 ст. перасяленцамі з суседніх вёсак. У 1897 г. засценак Пад'яблыняй (6 двароў, 34 жыхары), у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1923 г. да пасёлка далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі. У 1926 г. 10 двароў, 43 жыхары. На пачатак 1992 г. 4 падвор'і, 8 жыхароў.

Палам, вёска ў Каўбчанскім сельсавеце, за 17 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Заснавана ў пачатку 19 ст. перасяленцамі з в. Тальчык Кліноцкай воласці Ігуменскага павета. У 1811 г. вёска (18 двароў, 68 жыхароў мужчынскага полу), уласнасць памешчыка. У 1897 г. засценак Палом (ён жа Ліпніца), 20 двароў, 158 жыхароў, у Брадзецкай воласці Ігуменскага павета. У 1908 г. 21 двор, у 1917 г. 32 двары, 243 жыхары, у 1926 г. 40 двароў, 208 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгас імя М. М. Галадзеда. Працавалі пачатковая школа, хата-чытальня. На пачатак 1992 г. 17 падвор'яў, 28 жыхароў.

Палосы, вёска ў Клічаўскім пасялковым Савеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Ольса (прыток Бярэзіны). Заснавана ў сярэдзіне 1920-х гадоў выхадцамі з в. Бёрда. У 1929 г. арганізаваны калгас «Наперад». У 1940 г. 20 двароў, 65 жыхароў. У жніўні 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 14 жыхароў. На пачатак 1992 г. 18 падвор'яў, 31 жыхар.

Паплавы, вёска ў Клічаўскім пасялковым Савеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Ольса (прыток Бярэзіны). Вядома з 1579 г. як сяло Паплаўцы, уладанне Ю. Хадкевіча. У 1738 г. 8 двароў, у Любашанскім старостве, дзяржаўная ўласнасць. У 1857 г. сяло ў Ігуменскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 47 двароў, 380 жыхароў, у Даўжанскай воласці Ігуменскага павета. У 1907 г. 65 двароў, 469 жыхароў. З 1916 г. працавала земская школа. У 1917 г. 67 двароў, 461 жыхар. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені (у 1925 г. 52 вучні). У 1926 г. 67 двароў, 447 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны араты», дзейнічала смалакурня. 14.11.1941 г. гітлераўцы расстралялі ва ўрочышчы Лясное 300 жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці, у снежні пры актыўным удзеле вяскоўцаў партызаны разграмілі нямецка-паліцэйскі гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы. На пачатак 1992 г. 95 падвор'яў, 236 жыхароў. У вёсцы пачатковая школа, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы. Ва ўрочышчы Лясное магіла ахвяр фашызму, у 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск; на ўскраіне вёскі, каля дарогі Клічаў — Чачэвічы, помнік на месцы злучэння партызан з часцямі Чырвонай Арміі, у 1975 г. пастаўлена стэла.

Патока, вёска, цэнтр сельсавета, за 1 км ад чыгуначнай станцыі Стаялава на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Ольса (прыток Бярэзіны). Вядома з 19 ст. У 1897 г. сядзіба Патокі (1 двор, 6 жы-

хароў) у Даўжанскай воласці Ігуменскага павета. У 1908 г. засценак (1 двор, 5 жыхароў) і аднайменны хутар (12 двароў, 60 жыхароў). З 1922 г. вёска ў складзе саўгаса імя Л. Б. Красіна. У 1926 г. 6 двароў, 20 жыхароў. У 1937 г. на базе саўгаса створана МТС імя Л. Б. Красіна. У Айчынную вайну гітлераўцы загубілі 8 жыхароў, разрабавалі маёмасць МТС, разбурылі будынкі. У 1948 г. адноўлена Красінская МТС, у 1958 г. створаны саўгас «Красінскі». На пачатак 1992 г. 49 падвор'яў, 123 жыхары. У вёсцы пачатковая школа, магазін, сталовая, аддзяленне сувязі, Дом культуры, бібліятэка, урачэбная амбулаторыя, лазня, майстэрні па рамонце сельгастэхнікі. Каля вёскі курганны могільнік 8—11 ст.

Перамога, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце (з 1924 г.), за 12 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзіць меліярацыйны канал, злучаны з р. Ольса (прыток Бярэзіны). Заснавана ў пачатку 1920-х гадоў выхадцамі з навакольных хутароў і вёсак. У 1934 г. арганізаваны калгас «Дружба». На пачатак 1992 г. 11 падвор'яў, 18 жыхароў.

Перасопня, вёска ў Клічаўскім пасялковым Савеце, за 15 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Каля вёскі цячэ р. Суша і яе прыток р. Перасопенка. Вядома з 19 ст. У 1846 г. вёска (30 жыхароў), у Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1857 г. засценак Перасопжа, у Ігуменскім павеце. У 1897 г. 20 двароў, 164 жыхары, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. Побач існаваў аднайменны выселак (1 двор, 9 жыхароў). У 1907 г. 23 двары, у 1917 г. 28 двароў, 167 жыхароў, у 1926 г. 37 двароў, 165 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Араты». У 1940 г. 29 двароў, 89 жыхароў. У верасні 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 10 жыхароў. На пачатак 1992 г. 11 падвор'яў, 25 жыхароў.

Плоскае, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач з вёскай праходзяць меліярацыйныя каналы, злучаныя з р. Нясета (прыток Ольсы). Вядома з 19 ст. У 1897 г. засценак (14 двароў, 89 жыхароў), у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1916 г. 5 двароў, 44 жыхары. З 1922 г. ў складзе саўгаса «Нясята», з 1937 г.— калгаса «VIII з'езд Саветаў». На пачатак 1992 г. 3 падвор'і, 4 жыхары.

Пярэкаль, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзіць меліярацыйны канал, злучаны з р. Нясета (прыток Ольсы). Вядома з 1-й паловы 19 ст. У 1838 г. вёска (27 рэвізскіх душ), у Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 23 двары, 182 жыхары, хлебазапасны магазін, крама, у Свіслацкай воласці Бабруйскага павета. Побач існавалі аднайменны маёнтак (2 двары, 16 жыхароў) і выселак (2 двары, 5 жыхароў). У 1908 г. ў вёсцы 28 двароў, 259 жыхароў, у маёнтку 26 жыхароў, у 1917 г. ў вёсцы 39 двароў, 236 жыхароў, у маёнтку 34 жыхары; працавала школа 1-й ступені. 14.8.1923 г. на землях маёнтка створана сельгасарцель «Чырвоны араты», пераўтвораная ў 1929 г. ў калгас «Новае жыццё». На пачатак 1992 г. 89 падвор'яў, 173 жыхары. У вёсцы сярэдняя школа, магазін, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая. Каля вёскі курганны могільнік дрыгавічоў 8—10 ст.

Равок, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзіць меліярацыйны канал, злучаны з р. Нясета (прыток Ольсы). Утворана ў 1925 г. на былых паменчыцкіх землях ва ўрочышчы Равок перасяленцамі з навакольных вёсак; напачатку былі пасёлкі Равок 1-ы, Равок 2-і, Равок 3-і, потым яны аб'ядналіся ў вёску. У 1930 г. арганізаваны калгас. Працавалі пачатковая школа, хата-чытальня. У 1940 г. 35 двароў, 118 жыхароў. У красавіку 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 2 жыхароў, маёмасць разрабавалі. На пачатак 1992 г. 1 падвор'е, 3 жыхары.

Рагі, вёска ў Ганчанскім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Вонічы на лініі Магілёў — Асіповічы. Вядома з 19 ст. У 1897 г. хутар (3 двары, 18 жыхароў), у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1908 г. пасёлак (19 двароў, 86 жыхароў), у 1917 г. вёска (20 двароў, 123 жыхары). У 1926 г. 20 двароў, 135 жыхароў. У 1932 г. арганізаваны калгас «Чырвоны Востраў» (перны старшыня П. Г. Канапліцкі); працавалі пачатковая школа і пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. Восенню 1941 г. ў вёсцы размяшчаўся нямецка-паліцэйскі гарнізон, які ў хуткім часе быў разгромлены партызанамі. Паблізу вёскі базіраваўся партызанскі атрад № 538. На пачатак 1992 г. 34 падвор'і, 71 жыхар. Каля вёскі курганныя могільнікі.

Развадава, вёска ў Патоцкім сельсавеце, чыгуначная станцыя на лініі Магілёў — Асіповічы. Праз вёску цячэ р. Сушанка (прыток Ольсы). Вядома з 19 ст.

У 1895 г. сядзіба (13 двароў, 85 жыхароў), у Даўжанскай воласці Ігуменскага павета. У 1908 г. засценак (15 двароў, 75 жыхароў), у 1917 г. вёска Развадаў (12 двароў, 71 жыхар). У 1922 г. арганізаваны саўгас імя Л. Б. Красіна. У 1926 г. 17 двароў, 112 жыхароў, у 1937 г. ў складзе калгаса імя Э. Тэльмана. У 1940 г. 38 двароў, 152 жыхары. Восенню 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 60 жыхароў, маёмасць разрабавалі. На пачатак 1992 г. 14 падвор'яў, 19 жыхароў. У вёсцы магазін.

Рубеж, вёска ў Клічаўскім пасялковым Савеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Ольса (прыток Бярэзіны). Заснавана ў 1926 г. выхадцамі з в. Бёрда. У 1929 г. арганізавалі калгас. У 1940 г. 15 двароў, 45 жыхароў. У жніўні 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 5 жыхароў. На пачатак 1992 г. 11 падвор'яў, 30 жыхароў.

Рэнішча, вёска ў Каўбчанскім сельсавеце, за 15 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Заснавана ў 2-й палове 1920-х гадоў у выніку перасялення сялян з бліжэйшых хутароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Новы шлях». На пачатак 1992 г. 18 падвор'яў, 30 жыхароў.

Свабода, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіновічы. Заснавана ў 1923 г. на былых памешчыцкіх землях перасяленцамі з вёсак Таценка 1-я, Таценка 2-я. У 1920-я гады ў складзе саўгаса «Нясята», з 1937 г.— калгаса «Камінтэрн». На пачатак 1992 г. 1 падвор'е, 2 жыхары.

Свёкрава, вёска ў Ганчанскім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Вонічы на лініі Магілёў — Асіповічы. Заснавана ў 1921 г. выхадцамі з в. Доўгае. У 1933 г. арганізаваны калгас «Вепрынка». У 1940 г. 19 двароў, 78 жыхароў. Восенню 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 2 жыхароў. На пачатак 1992 г. 10 падвор'яў, 16 жыхароў. У вёсцы магазін.

Селішча, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Гарадзечанка (прыток Нясеты). Вядома з 19 ст. У 1844 г. вёска (6 двароў, 46 жыхароў), у складзе маёнтка Качарыцы Бабруйскага павета, уласнасць памешчыка. Паводле перапісу 1917 г. 37 двароў, 258 жыхароў. У 1919 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені (у 1925 г. 67 вучняў). У 1926 г. 62 двары, 379 жыхароў, працавала хата-чытальня. У красавіку 1944 г. вёску поўнасцю спалілі гітлераўцы. На пачатак 1992 г. 7 падвор'яў, 17 жыхароў.

Сыманаўка, вёска ў Ганчанскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Вонічы на лініі Магілёў — Асіповічы. Заснавана ў 1912 г. ў сувязі з работай нрадпрыемства па вырабе даёгцю ва ўрочышчы Байдан. У 1917 г. 12 двароў, 82 жыхары, у Даўжанскай воласці Ігуменскага павета. У 1930 г. арганізаваны калгас «2-я пяцігодка». У Айчынную вайну каля вёскі базіраваўся партызанскі атрад № 538. На пачатак 1992 г. 7 падвор'яў, 9 жыхароў.

Слабодка, да 1936 г. Дубраўка, вёска ў Патоцкім сельсавеце, за 3 км ад чыгуначнай станцыі Стаялава на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Ольса (прыток Бярэзіны). Вядома з 19 ст. У 1897 г. 24 двары, 215 жыхароў, у Даўжанскай воласці Ігуменскага павета. У 1908 г. 26 двароў, 260 жыхароў, у 1917 г. 37 двароў, 247 жыхароў. У 1936 г. арганізаваны калгас «Свабода». На пачатак 1992 г. 98 падвор'яў, 221 жыхар. У вёсцы 8-гадовая школа, магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Смалярня, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзіць меліярацыйны канал, злучаны з р. Нясета (прыток Ольсы). Заснавана ў канцы 19 ст. выхадцамі з навакольных вёсак. У 1897 г. засценак (15 двароў, 109 жыхароў), у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. Побач існавалі аднайменныя хутар (2 двары, 17 жыхароў) і смалярны завод (1 двор, 11 жыхароў). У 1926 г. хутары Старая Смалярня (7 двароў, 44 жыхары) і Смалярня (8 двароў, 52 жыхары). У 1932 г. арганізаваны калгас «Светлы шлях». У снежні 1941 г. партызаны разграмілі нямецка-паліцэйскі гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы. У час карных аперацый 1942—44 гг. гітлераўцы разрабавалі маёмасць, спалілі большасць будынкаў. На пачатак 1992 г. 14 падвор'яў, 22 жыхары, саўгасны пчальнік.

Старое Курганне, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Гарадзечанка (прыток Нясеты). Вядома з пачатку 20 ст. Паводле перапісу 1917 г. вёскі Старое Курганне (25 двароў, 159 жыхароў) і Новае Курганне (34 двары, 179 жыхароў). У 1926 г. ў в. Старое Курганне 39 двароў, 213 жыхароў, у в. Новае Курганне 39 двароў, 213 жыхароў, у 1935 г. вёскі аб'яднаны. У 1929 г. арганізаваны калгас «Авангард», працавалі пачатковая школа, хата-

Помнік на магіле ахвяр фашызму ў вёсцы Стары Востраў.

чытальня. На пачатак 1992 г. 11 падвор'яў, 11 жыхароў, участковая бальніца. Каля вёскі захаваліся курганныя могільнікі 10—12 ст.

Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы Г. М. Кудзін.

Старое Сяло, вёска ў Віркаўскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Бярэзіна. Заснавана ў 1920-я гады. У 1931 г. арганізаваны калгас «Прагрэс». У 1967 г. да Старога Сяла далучана вёска Вольніцкі Бор. На пачатак 1992 г. 5 падвор'яў, 12 жыхароў.

Стары Востраў, вёска, цэнтр Акцябрскага сельсавета, за 18 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Бярэзіна. Вядома з 1499 г. як сяло ў Свіслацкай воласці Вялікага княства Літоўскага, дзяржаўная ўласнасць. У 1560 г. 33 гаспадаркі. У 1561 г. перададзена ў валоданне шляхціцу. У 1802 г. пабудавана драўляная царква. У 1885 г. сяло Востраў (42 двары, 340 жыхароў, вінакурны завод, вадзяны млын, школа), у Якшыцкай воласці Ігуменскага павета. У 1897 г. 107 двароў, 608 жыхароў, кузня, хлебазапасны магазін. Побач былі аднайменны маёнтак (35 двароў, 86 жыхароў, вінакурны завод, карчма). У 1917 г. ў сяле 152 двары, 870 жыхароў, у маёнтку 61 жыхар. Першым старшынёй сельсавета быў В. А. Каўко, затым П. М. Віктарчык — актыўны ўдзельнік і арганізатар партызанскага руху ў Вялікую Айчынную вайну на Клічаўшчыне. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоны Востраў». У пачатку 1942 г. партызаны разграмілі нямецка-паліцэйскі гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы, была адноўлена работа сельсавета (старшыня С. І Заяц). На пачатак 1992 г. 180 падвор'яў, 465 жыхароў. У вёсцы сярэдняя школа, магазін, сталовая, Дом культуры, бібліятэка, прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, фельчарска-акушэрскі пункт, аўтаматычная тэлефонная станцыя, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, дзіцячы сад, лесапільня, ферма буйной рагатай жывёлы, майстэрні па рамонце сельгастэхнікі, установа па прыгатаванні вітаміннай мукі, зернедрабілка. У цэнтры вёскі помнік на ўшанаванне памяці землякоў, што загінулі на франтах Айчыннай вайны, у 1969 г. пастаўлены абеліск.

Стары Спор, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце, за 18 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Кастрычка (прыток Ольсы). Вядома з пачатку 20 ст. Паводле перапісу 1917 г. хутар Спор Стары (7 гаспадарак, 42 жыхары), у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1926 г. хутары (17 двароў, 103 жыхары). У 1930 г. арганізаваны саўгас «Стары Спор», у 1931 г.— калгас «Прамзара». У 1934 г. адкрыты дзіцячыя яслі. У 1940 г. 25 двароў. Восенню 1942 г. гітлераўцы ноччу спалілі вёску, загубілі 10 жыхароў, маёмасць разрабавалі. На пачатак 1992 г. 10 падвор'яў, 10 жыхароў.

Радзіма доктара юрыдычных навук І. В. Гушчына.

Старыя Максімавічы, вёска ў Каўбчанскім сельсавеце, за 13 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Нясета (прыток Ольсы). Вядома з 1499 г. як сяло, шляхецкая ўласнасць. У 1560 г. ў Свіслацкай воласці. У 1885 г. адкрыта школа граматы, якая ў 1910 г. пераўтворана ў земскую (у наёмным памяшканні). У 1897 г. вёска Максімавічы (96 двароў, 628 жыхароў), царква, дзейнічалі 2 ветракі, хлебазапасны магазін. У 1917 г. в. Максімавічы Старыя (92 двары, 560 жыхароў). На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені (у 1925 г. 95 вучняў). У 1926 г. 95 двароў, 536 жыхароў. У 1932 г. арганізаваны калгас «Камуніст». У час карных аперацый 1942—44 гг. маёмасць разрабавана, многія будынкі спалены акупантамі. На пачатак 1992 г. 67 падвор'яў, 150 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Старыя Набаркі, вёска ў Каўбчанскім сельсавеце, за 18 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзіць меліярацыйны канал, злучаны з р. Нясета (прыток Ольсы). Вядома з 19 ст. У 1885 г. вёска Набаркі (15 двароў, 165 жыхароў, царква), у Брадзецкай воласці Ігуменскага павета, у 1897 г. 25 двароў, 203 жыхары, 2 ветракі. хлебазапасны магазін. У 1917 г. в. Набаркі Старыя (35 двароў, 231 жыхар). У 1926 г. 47 двароў, 240 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоны Кастрычнік». Працавала пачатковая школа. У Айчынную вайну вёска спалена, маёмасць разрабавана акупантамі. На пачатак 1992 г. 12 падвор'яў, 20 жыхароў.

Стаялава, вёска ў Клічаўскім пасялковым Савеце, чыгуначная станцыя на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Ольса (прыток Бярэзіны). Вядома з 1500 г. як сяло Стаялы, у Любашанскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1738 г. 20 двароў, у 1775 г. 25 двароў, у Мацеевіцкім войтаўстве Любашанскага старостава Аршанскага павета. У 1897 г. 77 двароў, 676 жыхароў, хлебазапасны магазін. У 1907 г. 108 двароў, 892 жыхары. У 1912 г. адкрыта школа (народнае вучылішча). У 1917 г. 117 двароў, 843 жыхары. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у 1925 г. было 59 вучняў. У 1929 г. арганізаваны калгас «Асвета». У 1940 г. 104 двары. У снежні 1941 г. партызаны разграмілі нямецка-паліцэйскі гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы. У жніўні 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, расстралялі 80 жыхароў. На пачатак 1992 г. 157 падвор'яў, 326 жыхароў. У вёсцы пачатковая школа, магазін, клуб, бібліятэка, ферма буйной рагатай жывёлы.

Суша, вёска ў Патоцкім сельсавеце, чыгуначная станцыя на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Сушанка (прыток Ольсы). Вядома з 15 ст. У 1500 г. сяло ў Любашанскай воласці. У 1738 г. 9 двароў, дзяржаўная ўласнасць. У 1775 г. 20 двароў, у Мацеевіцкім ваяводстве Любашанскага старостава Аршанскага навета. У 1897 г. 66 двароў, 561 жыхар, царква, у Даўжанскай воласці Ігуменскага павета. У 1903 г. адкрыта школа, для якой у 1914 г. пабудавана памяшканне. У 1908 г. 78 двароў, 657 жыхароў. У 1917 г. 76 двароў, 575 жыхароў, вадзяны млын. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені (у 1925 г. 42 вучні), адкрыта хата-чытальня. У 1926 г. 98 двароў, 676 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Аўрора». У 1940 г. 98 двароў, 509 жыхароў. У снежні 1941 г. партызаны разграмілі нямецка-паліцэйскі гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы. У жніўні 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску і расстралялі 53 жыхароў. На пачатак 1992 г. 93 падвор'і, 203 жыхары. У вёсцы пачатковая школа, магазін, клуб, бібліятэка, метэаралагічная станцыя, ферма буйной рагатай жывёлы.

Таценка 1-я, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Нясета (прыток Ольсы). Вядома з 19 ст. У 1897 г. засценак Таценка (ён жа Залессе), 13 двароў, 107 жыхароў, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1908 г. 24 двары, 226 жыхароў; у 1917 г. ў вёсцы 12 двароў, 88 жыхароў, у аднайменным фальварку 9 двароў, 64 жыхары. У 1924 г. арганізавана масларобчая арцель. У 1926 г. 18 двароў, 111 жыхароў, пачатковая школа і хата-чытальня. На пачатак 1992 г. 42 надвор'і, 103 жыхары. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы. Каля вёскі брацкая магіла чырвонаармейцаў, якія загінулі ў грамадзянскую вайну, у 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск; на могілках магіла партызана 278-га асобнага атрада У. С. Харлапа, у 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Таценка 2-я, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. На р. Нясета (прыток Ольсы). Вядома з 19 ст. У 1897 г. вёска Таценка 2-я (яна ж Янкаўшчына, Печкуры), 4 двары, 37 жыхароў, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1908 г. 8 двароў, 71 жыхар, у 1917 г. 10 двароў, 57 жыхароў, у 1926 г. 7 двароў, 76 жыхароў. У Айчынную вайну гітлераўцы загубілі 9 жыхароў. На пачатак 1992 г. 8 падвор'яў, 14 жыхароў.

Тачышча, вёска ў Ганчанскім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Вонічы на лініі Магілёў — Асіповічы. Вядома з пачатку 20 ст. У 1908 г. 25 двароў, 219 жыхароў, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага навета, у 1917 г. 30 двароў, 197 жыхароў. У 1926 г. 42 двары, 230 жыхароў. У 1933 г. арганізаваны калгас «Баявік» (першы старшыня А. В. Новік). На пачатак 1992 г. 19 падвор'яў, 60 жыхароў. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы.

Турчанка, вёска ў Нясяцкім сельсаве-

це, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Турчанка (прыток Нясеты). Вядома з пачатку 20 ст. У 1917 г. хутар (2 двары, 14 жыхароў), у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1929 г. створаны калгас «Барацьбіт» (цэнтр — в. Турэц). На пачатак 1992 г. 6 падвор'яў, 12 жыхароў.

Турчылоў, вёска ў Патоцкім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач цячэ р. Турчанка (прыток Нясеты). Вядома з 19 ст. У 1897 г. сядзіба Турчылава (19 двароў, 112 жыхароў), у Даўжанскай воласці Ігуменскага павета. У 1908 г. засценак (20 двароў). У 1926 г. хутары (16 двароў, 77 жыхароў). У 1933 г. арганізаваны калгас «Калектывіст», працавала сямігадовая школа. У пачатку 1942 г. ў вёсцы адноўлена дзейнасць сельсавета (старшыня П. А. Кушнер), арганізавана група самаабароны. На пачатак 1992 г. 50 падвор'яў, 122 жыхары. У вёсцы магазін, клуб, бібліятэка, свінагадоўчая ферма.

Турэц, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 1 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Турчанка (прыток Нясеты). Вядома з 19 ст. У 1838 г. вёска (90 рэвізскіх душ) у Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 55 двароў, 315 жыхароў, вятрак, пастаялы двор, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. Раз у год (9 мая) праводзіўся кірмаш. У 1918 г. 47 двароў, 369 жыхароў. У 1913 г. адкрыта школа (у наёмным памяшканні). У 1917 г. 53 гаспадаркі, 309 жыхароў. У 1926 г. для школы пабудавана новае памяшканне. У 1932 г. арганізаваны калгас «Кастрычнік», працавала хата-чытальня. На пачатак 1992 г. 75 падвор'яў, 147 жыхароў. У вёсцы магазін.

Убалацце, вёска ў Ганчанскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Стаялава на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзяць меліярацыйныя каналы, злучаныя з р. Перасопенка (прыток Сушы). Заснавана ў 19 ст. выхадцамі з вёсак Брадзец, Капланец Ігуменскага павета і в. Бёрда Бабруйскага павета. У 1897 г. 22 двары, 146 жыхароў, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1917 г. былі 2 аднайменныя вёскі (22 двары, 143 жыхары і 12 двароў, 83 жыхары). У 1926 г. 43 двары, 219 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Ударнік», дзейнічала лесапільнае прадпрыемства. У кастрычніку 1941 г. партызаны разгромілі нямецка-паліцэйскі гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы. У маі 1942 г. аднавіў работу сельсавет (старшыня П. Е. Стукальскі), створана група самаабароны. У карных аперацыях 1942—44 гг. маёмасць разрабавана, большасць будынкаў спалена. На пачатак 1992 г. 9 падвор'яў, 12 жыхароў. У вёсцы магазін, аддзяленне сувязі. На вясковых могілках пахаваны разведчыцы 277-га партызанскага атрада У. Бандарчык і Н. Сай, якія былі схоплены пры выкананні баявога задання і закатаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1942 г., у 1977 г. на магілах пастаўлены абеліскі; пахаваны таксама ўрач Кіраўскага партызанскага спецатрада В. Д. Пянькоўскі, які загінуў у 1942 г. ў баі супраць фашыстаў, у 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Уладзіміраўка, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Праз вёску цячэ р. Гарадзечанка (прыток Нясеты). Вядома з 19 ст. У 1897 г. вёска Уладзіміраўка, 7 двароў, 73 жыхары, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1904 г. адкрыта школа (у 1923 г. 22, у 1925 г. 60 вучняў). У 1918 г. 20 двароў, 111 жыхароў. У 1926 г. 26 двароў, 154 жыхары. У 1930 арганізаваны калгас «Уладзіміраўка». У 1967 г. да Уладзіміраўкі далучаны вёскі Новае Курганне, Вожава. На пачатак 1992 г. 53 падвор'і, 72 жыхары. У вёсцы магазін, клуб, фельчарска-акушэрскі пункт, ферма буйной рагатай жывёлы. На могілках брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць фашыстаў, у 1959 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Усакіна, вёска ў Патоцкім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Вонічы на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Ваданоска (прыток Сушанкі). Вядома з 18 ст. У 1738 сяло (11 гаспадарак), у Любашанскім старостве Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1775 г. 14 двароў, у Мацеевіцкім войтаўстве Любашанскага староства. Да 1861 г. ўласнасць графа Патоцкага. У 1886 г. адкрыта школа граматы. У 1897 г. 41 двор, 334 жыхары, царква, хлебазапасны магазін. У 1908 г. 50 двароў, 458 жыхароў. У 1917 г. 64 двары, 452 жыхары. У 1924—27 гг. пабудаваны лесапільны завод (30 рабочых), у 1928 г.— новае памяшканне школы, дзе працавалі гурткі драматычны і па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. 75 двароў, 312 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгас імя Э. Тэльмана, працавала смалакурня (12 рабочых). У 1940 г. 107 двароў, 314 жыхароў. У пачатку 1942 г. партызаны разгромілі нямецка-паліцэйскі гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы. Аднавіў дзейнасць сельсавет (старшыня С. І. Заяц), створаны атрад самаабароны. 20.3.1942 г. ў мясцовай школе адбыўся сход Клічаўскай раённай партыйнай арганізацыі, на якім выбраны падпольны райком КП(б)Б. Усакінскія лясы былі цэнтрам партызанскага руху на Клічаўшчыне. Тут базіраваліся Магілёўскі падпольны абком КП(б)Б і кіраўніцтва Клічаўскай ваенна-аператыўнай групы. У жніўні 1942 г. гітлераўцы спалілі 104 двары, загубілі 80 жыхароў. Каля вёскі дзейнічаў партызанскі аэрадром. У доме сялянкі М. В. Шагойка размяшчаўся партызанскі шпіталь, працавала друкарня. На пачатак 1992 г. 116 падвор'яў, 236 жыхароў. У вёсцы лясніцтва, 8-гадовая школа, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, комплексна-прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, фельчарска-акушэрскі пункт, ферма буйной рагатай жывёлы. Каля вёскі вайсковыя могілкі, дзе пахаваны воіны і партызаны, якія загінулі ў баях супраць фашыстаў, у 1985 г. на могілках узведзена мемарыяльная сцяна; за 400 м на паўночны ўсход ад вёскі помнік у гонар Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б і Клічаўскай ваенна-аператыўнай групы.

Усохі, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце, за 16 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Кастрычка (прыток Ольсы). Вядома з 17 ст. У 1689 г. ў складзе маёнтка Свіслач Мінскага павета Мінскага ваяводства, прыватнафеадальнае ўладанне. У 1844 г. вёска Усох (24 двары, 165 жыхароў), у складзе маёнтка Бацэвічы Бабруйскага павета, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 57 двароў, 477 жыхароў. Побач аднайменны хутар (1 двор), вадзяны млын. У 1908 г. 64 двары, 458 жыхароў, у 1917 г. 74 двары, 557 жыхароў, у 1922 г. створана сельскагаспадарчая арцель, у 1992 г.— кааператыўнае таварыства. У 1923 г. да вёскі далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі. У 1926 г. арганізавана кааператыўная лесапрамысловая арцель, дзейнічала смалакурня. У 1926 г. 104 двары, 543 жыхары. У 1927 г. пабудавана школа. У 1931 г. арганізаваны калгас «Шлях сацыялізму». У 1940 г. 107 гаспадарак, 314 жыхароў. У пачатку 1942 г. партызаны разгромілі гарнізон акупантаў, была адноўлена дзейнасць Усохскага сельсавета (старшыня С. Г. Пірожнік), створана група самаабароны. У красавіку 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, расстралялі 26 жыхароў, маёмасць разрабавалі. На пачатак 1992 г. 140 падвор'яў, 375 жыхароў. У вёсцы 8-гадовая школа, магазін, прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, клуб, фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка, ферма буйной рагатай жывёлы.

Хадэчын, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзяць меліярацыйныя каналы, злучаныя з р. Нясета (прыток Ольсы). Вядома з 19 ст. У 1897 г. засценак (14 двароў, 32 жыхары), у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1908 г. пасёлак (13 двароў, 122 жыхары), у 1917 г. вёска (16 двароў, 143 жыхары). У 1922 г. адкрыта школа (у 1925 г. 43 вучні). У 1926 г. 30 двароў, 171 жыхар. Працавала пачатковая школа, для якой у 1927 г. пабудавана новае памяшканне. У 1930 г. арганізаваны калгас імя Варашылава. На пачатак 1992 г. 16 падвор'яў, 23 жыхары.

Хрэлева, вёска ў Ганчанскім сельсавеце, за 15 км ад чыгуначнай станцыі Вонічы на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Суша (прыток Ольсы). Вядома з 18 ст. У 1762 г. ў Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. У 1897 г. 5 двароў, 25 жыхароў, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1908 г. пасёлак Хралёва 1-е (11 двароў, 83 жыхары) і ўрочышча (2 двары, 14 жыхароў). У 1917 г. ў пасёлку Хралёва 1-е і ўрочышчы 14 двароў, 102 жыхары, на хутары Хралёва 2-е 1 двор, 9 жыхароў. У 1926 г. 7 двароў, 109 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Новы шлях» (першы старшыня В. Ф. Гарачоў). У 1939 г. з хутароў у вёску было пераселена 14 гаспадарак. У Айчынную вайну каля вёскі базіраваўся партызанскі атрад. На пачатак 1992 г. 5 падвор'яў, 6 жыхароў.

Церахаў Бор, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Развадава на лініі Магілёў — Асіповічы. Заснавана ў пачатку 20 ст. на месцы памешчыцкага фальварка. Паводле перапісу 1917 г. хутар Бор Церахаў (23 гаспадаркі, 132 жыхары), у Даўжанскай воласці Ігуменскага павета. У 1931 г. арганізаваны калгас імя Кірава. На пачатак 1992 г. 17 падвор'яў, 29 жыхароў. У вёсцы саўгасны пчальнік.

Чаравач, вёска ў Нясяцкім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Нясета (прыток Ольсы). Вядома з 17 ст. У 1664 г. сяло ў Аршанскім павеце, шляхецкая ўласнасць. У 1838 г. сяло Чаравачы (139 жыхароў мужчынскага полу), у Бабруйскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 82 двары, 377 жыхароў; вятрак, крама, 2 разы ў год праводзілася вясковае свята, у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1908 г.

80 двароў, 647 жыхароў, у 1917 г. 109 двароў, 643 жыхары, царкоўнапрыходская школа. У 1920 г. на базе дарэвалюцыйнай адкрыта працоўная школа 1-й ступені, для якой у 1924 г. пабудавана памяшканне (у 1925 г. 50 вучняў). У снежні 1941 г. партызаны разграмілі нямецка-паліцэйскі гарнізон, які размяшчаўся ў вёсцы. У час карных аперацый 1942—44 гг. вёска спалена, маёмасць разрабавана акупантамі. На пачатак 1992 г. 72 падвор'і, 156 жыхароў. У вёсцы магазін, клуб, ферма буйной рагатай жывёлы.

Чырвоная Ніва, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Заснавана ў пачатку 1920-х гадоў перасяленцамі з в. Віркаў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоная Ніва». У 1940 г. 40 двароў, 143 жыхары. Восенню 1942 г. гітлераўцы спалілі 40 двароў і загубілі 3 жыхароў. У сакавіку 1944 г. тут фашысты стварылі лагер па перасылцы насельніцтва ў Азарыцкі лагер смерці. На пачатак 1992 г. 20 падвор'яў, 26 жыхароў. У вёсцы магазін.

Чырвоны Бераг, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце, за 9 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Нясета (прыток Ольсы). Вядома з 19 ст. У 1897 г. засценак (10 двароў, 74 жыхары), у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1908 г. 14 двароў, 76 жыхароў. У 1916 г. адкрыта паштова-тэлеграфнае аддзяленне. У 1926 г. 13 двароў, 35 жыхароў. У 1931 г. аргашізаваны калгас «Бальшавік» (цэнтр — в. Вусце). У 1940 г. 22 двары, 81 жыхар. Восенню 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, расстралялі 3 жыхароў. На пачатак 1992 г. 6 падвор'яў, 10 жыхароў.

Чырвоны Лес, вёска ў Каўбчанскім сельсавеце, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Стаялава на лініі Магілёў — Асіповічы. Праз вёску цячэ р. Гарадзечанка (прыток Нясеты). Заснавана ў пачатку 19 ст. намешчыкам Гіжгайлам, які пасяліў тут 4 сялян-майстроў. Пад кіраўніцтвам гэтых майстроў прыгонныя будавалі тут вятрак, кузню, жылыя дамы. У 1897 г. засценак Гіжгайлава (6 двароў, 35 жыхароў), у Брадзецкай воласці Ігуменскага павета. У 1908 г. 6 двароў, 35 жыхароў. Паводле перапісу 1917 г. акалодак (23 двары, 156 жыхароў), побач быў хутар Гіжгайлава (2 двары, 17 жыхароў). 20.10. 1921 г. адкрыта школа (у 1925 г. 57 вучняў). У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны прамень». Дзейнічалі паравы млын, кузня. У 2-й палове 1930-х гадоў вёска павялічылася за кошт перасяленцаў з бліжэйшых хутароў і атрымала назву Чырвоны Лес. На пачатак 1992 г. 32 падвор'і, 59 жыхароў. У вёсцы магазін, ферма буйной рагатай жывёлы.

Юзафін, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце, за 14 км ад чыгуначнай станцыі Тачанка на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзіць меліярацыйны канал, злучаны з р. Ольса. Вядома з 19 ст. У 1897 г. фальварак (1 двор, 10 жыхароў), у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1908 г. 20 жыхароў, у 1917 г. 14 жыхароў. У 1923 г. да хутара далучаны вялікі ўчастак былой памешчыцкай зямлі. У 1926 г. 9 двароў, 53 жыхары. У 1934 г. арганізаваны калгас. На пачатак 1992 г. 19 падвор'яў, 33 жыхары. У вёсцы ферма буйной рагатай жывёлы, магазін.

Ядраная Слабада, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Друць на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач р. Друць. Вядома з 19 ст. У 1848 г. 25 двароў, у Быхаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1858 г. 133 жыхары мужчынскага полу, млын, карчма, уласнасць памешчыка. Частка вяскоўцаў займалася калёсным, сталярным, бандарным і адыходным промысламі. У 1880 г. 61 двор, 434 жыхары. У 1897 г. 74 двары, 473 жыхары, вадзяны млын, школа граматы, хлебазапасны магазін, піцейны дом, у Гарадзішчанскай воласці Быхаўскага павета. У 1909 г. 77 двароў, 534 жыхары. У 1910 г. адкрыта земская школа. У 1924 г. побач з вёскай, ва ўрочышчы Лысая Гара, пабудаваны завод, дзе выраблялася чарапіца, дымаходы, кольцы для калодзежаў, блокі. У 1930 г. арганізаваны калгас «Перамога». У 1933 г. на базе пачатковай створана 7-гадовая школа. З восені 1941 г. вёска знаходзілася пад кантролем партызан, дзейнічаў сельсавет (старшыня П. С. Манёнак). У час карнай аперацыі 1942 г. гітлераўцы жывымі закапалі жонку і 2 дзяцей старшыні сельсавета. На пачатак 1992 г. 100 падвор'яў, 146 жыхароў. У вёсцы 8-гадовая школа, магазін, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, жывёлагадоўчы комплекс і гаспадарчы двор. Каля вёскі курганны могільнік.

Якімава Ляда, вёска ў Бацэвіцкім сельсавеце, за 8 км ад чыгуначнай станцыі Нясета на лініі Магілёў — Асіповічы. Побач праходзяць меліярацыйныя каналы, злучаныя з р. Ольса (прыток Бярэзіны). Вядома з 19 ст. У 1897 г. хутар Лазовае Ляда (2 двары, 20 жыхароў), у Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета. У 1908 г. 1 двор, у 1917 г. 2 двары, 9 жыхароў. У 1924 г. тут, ва ўрочышчы Якімава Ляда, на былых памешчыцкіх землях пасяліліся выхадцы з в. Вусце, пачалася забудова вёскі з назвай Якімава Ляда. У 1931 г. арганізаваны калгас. У 1940 г. 23 двары, 86 жыхароў. У жніўні 1942 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. На пачатак 1992 г. 11 падвор'яў, 17 жыхароў.

Ялоўка, вёска ў Доўгаўскім сельсавеце, за 6 км ад чыгуначнай станцыі Мілое на лініі Магілёў — Асіповічы. Заснавана ў пачатку 1920-х гадоў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Трэці рашаючы». У 1940 г. 22 двары, 67 жыхароў. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 6 жыхароў. На пачатак 1992 г. 14 падвор'яў, 25 жыхароў.

«Лёс асудзіў мяне на раннюю гібель»

І. Я. Грынявіцкі.

Ён быў перакананы ў тым, што «дрэва свабоды вымагае чалавечых ахвяраванняў, як яму здавалася, за светлую будучыню людзей, зрабіўшы замах на самаго цара. Чалавек гэты — рэвалюцыянер-нарадаволец Ігнат Якімавіч Грынявіцкі; нарадзіўся ў 1856 г. (дакладная дата невядома) ў маёнтку Басін былога Бабруйскага павета Мінскай губ. ў сям'і дробнамаянтковых дваран. У гэтым маёнтку бацька Ігната Якім Грынявіцкі служыў аканомам.

Але карані роду Грынявіцкіх вядуць у Гродзенскую губ. Некалі даўным-даўно на беразе ракі Белай, амаль што ў сутоку з Арлянкай, адзін з вялікіх князёў літоўскіх пасяліў тут беларускага баярына Грыня ці Грыневіча, які павінен быў несці вайсковую службу ў Бельскім замку. І пайшлі з таго часу на Падляшшы сяліцца ўсё новыя і новыя пакаленні Грыневічаў, якіх пазней сталі запісваць Грынявіцкімі. Таму ў Грыневічах Вялікіх і Малых здаўна пераважаюць Грынявіцкія. Сюды, у Вялікія Грыневічы, што знаходзіліся ў Бельскім павеце Гродзенскай губ. (цяпер Беластоцкае ваяводства, Польшча), пасля таго як аціхла паўстанне 1863—64 гг. пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага, і пераехалі з Басіна Грынявіцкія. Яны жылі ў добрым суседстве з навакольнымі сялянамі.

Пан Якім, хоць і меў характар рашучы і цвёрды, быў чалавек добры і чулы. Любіў гасцей. У яго нябагатым доме збіралася мясцовая шляхта. Напэўна, у часы такіх сяброўскіх вечарын у доме гучалі размовы пра паўстанне на чале з Каліноўскім, былі ўспаміны пра паўстанне 1830—31 гг.— тым больш, як сведчаць архіўныя дакументы, сярод інсургентаў былі і Грынявіцкія.

Маці Ігната, Бальбіна, з роду Дамброўскіх, мела яшчэ шасцярых дзяцей. Характар у яе быў мяккі і ласкавы, вольны час аддавала выхаванню дзяцей. Найбольш уплывала яна на Ігната, які таксама вылучаўся дабрынёй, мяккасцю і набожнасцю. Вясёлы і рухавы хлопчык не любіў гульняў у вайну і паляванне. За мяккі, ласкавы характар сябры ў гімназіі далі яму мянушку «Коцік», якая захавалася пазней і ў асяроддзі нарадавольцаў. Сям'я аднолькава адносілася і да рускіх, і да яўрэяў, паважала іх рэлігійнае веравызнанне. Ігнат на ўсё жыццё захаваў выхаваную ў маленстве талерантнасць.

Будучы рэвалюцыянер з дзяцінства ведаў нялёгкае сялянскае жыццё. Сям'я, хоць і мела невялікі маёнтак, многа працавала на сваіх палетках разам з парабкамі. У час навучання ў Беластоцкай рэальнай гімназіі Ігнат, калі вучыўся ў старэйшых класах, ужо зарабляў сабе на жыццё прыватнымі ўрокамі і рэпетытарствам. А правінцыяльны Беласток у мінулым стагоддзі не раз прычыняў царскім уладам вялікія клопаты. У 1-й чвэрці стагоддзя ў горадзе дзейнічала рэвалюцыйнае таварыства «Вайскавыя сябры», удзельнікамі якога былі пераважна афіцэры Літоўскага асобнага корпуса. Мэтай таварыства было змаганне за «вольнасць і ўсеагульны дабрабыт». У снежні 1825 г. «Вайскавыя сябры» сарвалі прыняцце прысягі Мікалаю I у размешчаных вакол Беластока палках, за што катаргу і высылку адбывалі разам з дзекабрыстамі.

Нямала жыхароў горада і ваколіц бралі ўдзел у паўстаннях супраць царызму. Ігнат напэўна ведаў імёны кіраўнікоў і найбольш актыўных удзельнікаў гэтых паўстанняў. Не выключана, што ў рукі Грынявіцкага-гімназіста траплялі і нумары першай нелегальнай беларускай газеты «Мужыцкая праўда», у якой К. Каліноўскі пад псеўданімам «Яська — гаспадар з-над Вільні» пісаў: «Падумайце добра да, памаліўшыся Богу, станьма дружна разам за нашу вольнасць! Нас цар ніц не падмане — не падвядуць маскалі: няма для іх у нашых сёлах ні вады, ні хлеба, для іх мы глухія і нямыя — нічога не бачылі і не чулі. А пакуль яшчэ пара, трэба нашым хлопцам спяшыць з вiламі да з косамі, там, дзе бабіваюцца волі да праўды, а мы, іх бацькі да жонкі нашы, сцерагчы будзем да ўведамляць, адкуль на іх сцягне нячыстая маскоўская сіла, да ад душы памагаць усялякімі спосабамі дзецюкам нашым, што за нас пойдуць біцца. А будзе ў нас вольнасць, якой не было нашым дзядам да бацькам».

Ідэі нацыянальнага вызвалення знаходзілі падтрымку і ў некаторых выкладчыкаў вучылішча. Дзякуючы шырока разгорнутай ва ўсёй краіне рэвалюцыйнай прапагандзе, сацыялістычныя ідэі, заклікі да служэння народу праніклі і сюды — у асяроддзе навучэнцаў. Менавіта там, у гімназіі. быў закладзены падмурак рэвалюцыйных поглядаў юнага Грынявіцкага, мара аб справядлівым пераўтварэнні грамадства.

Скончыўшы гімназію ў ліку лепшых вучняў, Ігнат у 1875 г. паспяхова вытрымаў уступныя экзамены і стаў студэнтам Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута. Больш таго, яго, як аднаго з лепшых абітурыентаў, на пасяджэнні вучэбнага камітэта інстытута вырашылі прызначыць бясплатным студэнтам.

Вялікія здольнасці Грынявіцкага да вучобы, яго працавітасць маглі забяспечыць яму паспяховае атрыманне дыплома, матэрыяльны дабрабыт, бліскучую кар'еру. Але ён выбраў іншы шлях...

У студэнцкія гады Ігнат удзельнічаў у польска-літоўска-беларускіх і рускіх рэвалюцыйных гуртках, актыўна вёў прапаганду сярод рабочых, збіраў грошы на дапамогу палітычным вязням, рабіў пашпарты рэвалюцыянерам-нелегалам. З 1879 г. ён член партыі «Народная воля» і адзін з заснавальнікаў беларускай фракцыі, нацыянальная праграма якой надрукавана ў часопісе «Гомон» (1884. № 2). На старонках гэтага падпольнага гектаграфічнага часопіса з рэвалюцыйна-дэмакратычных пазіцый гаварылася пра існаванне беларускай нацыі і гучала патрабаванне яе федэратыўнай самастойнасці пасля знішчэння царызму. Менавіта «гоманаўцы» называлі «адным з гарачых заснавальнікаў» сваёй фракцыі Ігната Грынявіцкага. Як вядома, і па сённяшні дзень існуе прыкрая, часам несумленнанаўмысная блытаніна пра нацыянальную прыналежнасць нашага славутага суайчынніка. Адны маюць яго за паляка, другія — за рускага, а нарадаволец Леў Ціхаміраў успамінаў: «Палякі ўпарта называлі яго «Грынявецкі» і прылічылі да сваіх. Аднак сам ён звaў сябе літвінам...» Як вядома, літвінамі звaліся тады жыхары заходняй і цэнтральнай Беларусі. «Гомон» жа засведчыў: нацыянальная свядомасць Грынявіцкага была якасна вышэйшая за краёвы патрыятызм.

У 1880 г. разам з А. І. Жалябавым, С. Л. Пяроўскай і іншымі рэвалюцыянерамі Грынявіцкі ўвайшоў у цэнтральны нарадавольскі гурток прапагандыстаў. Існавала тры разрады рабочых гурткоў. У гуртках першага разраду (ніжэйшых) рабочых навучалі элементарнай грамаце — пісаць, чытаць, лічыць. Надзейныя студэнты, якія вялі гэту работу, спакваля, у агульных рысах даводзілі слухачам рэвалюцыйныя ідэі. Адукаваныя такім шляхам рабочыя збіраліся ў гурткі другога разраду, дзе ўжо чыталіся лекцыі па гісторыі, ішло тлумачэнне вучэння аб сацыялізме... Урэшце, з прайшоўшых гэтыя два этапы падрыхтоўкі складвалася «цэнтральная агітацыйная група». Такой групай на Выбаргскай старане кіраваў агент «Народнай волі» Ігнат Грынявіцкі.

Нямала бяссонных начэй правёў ён у кватэрах рабочых. Вытрымаў многа дыскусій. І на ўсё, нават на самыя складаныя пытанні, слухачы атрымлівалі адказы і тлумачэнні. У вольны час юнак перачытваў тэарэтыкаў таго часу — Лаўрова, Ткачова, Бакуніна, Берві-Фляроўскага, падбіраўся да складанай тэорыі Маркса.

Бачачы, што ў барацьбу ўключаецца ўсё большая колькасць працоўных, А. Жалябаў прапанаваў стварыць «Рабочую газету». Яго горача падтрымаў І. Грынявіцкі і выказаў думку, што газета рабочым патрэбна як паветра і што яна будзе пашыраць і ўмацоўваць сувязі паміж рабочымі і кіраўніцтвам. Ён таксама пажадаў быць пры газеце на любой ролі: ад карэспандэнта і наборшчыка да прыбіральшчыка ля друкарскага станка. Па прапанове Грынявіцкага наборшчыкам у газету прынялі Антона Барэйшу.

Адначасова Грынявіцкі як рашучы прыхільнік крайніх метадаў барацьбы ўваходзіў у склад групы, якая рыхтавала замах на цара. Усю зіму 1880/81 гг. група сачыла за выездамі Аляксандра II. Арышты і рэпрэсіі з боку ўлад паскорылі здзяйсненне замаху. 26 лютага 1881 г. на кватэры Грынявіцкага, дзе ён жыў пад прозвішчам віленскага мешчаніна Ельнікава, прайшло апошняе пасяджэнне загаворшчыкаў. З шматлікіх добраахвотнікаў, што жадалі ахвяраваць сваім жыццём у імя свабоды, кіраўніцтва выбрала чатырох, сярод іх быў Ігнат Грынявіцкі. І ён не падвёў таварышаў па партыі і барацьбе. 1 сакавіка 1881 г. бомбай, кіпутай Грынявіцкім, быў забіты цар Аляксандр II. Але выбухам бомбы таксама быў смяротна паранены і Грынявіцкі. Пісьменнік Уладзімір Караткевіч, які прысвяціў Ігнату свой верш «Смяротная страта (1 сакавіка 1881 г.)», меркаваў што Грынявіцкі «сваім выбухам адпомсціў Аляксандру II за 1863 год»...

Прысуд выканаў невядомы

Урыўкі з нарыса Уладзіміра Арлова

...Распрацаваны Выканаўчым камітэтам план прадугледжваў, што ў выпадку няўдачы на Малой Садовай імператар будзе забіты бомбавым выбухам, калі ж і гэта не атрымаецца, забіць Аляксандра II кінжалам узяўся А. Жалябаў. Ён жа амаль з пяцідзесяці рэвалюцыянераў, згодных ахвяраваць жыццём, выбраў чатырох.

Гэта былі рабочыя Цімафей Міхайлаў і Іван Емяльянаў, былыя студэнты Мікалай Рысакоў і Ігнат Грынявіцкі.

У той час, у студзені — лютым 1881 года, Ігнат здолеў на кароткі час вырвацца з Пецярбурга, каб наведаць Вялікія Грыневічы. Ён ехаў развітацца з сям'ёй, з радзімаю. У бацькоўскім доме пражыў тры дні. Свой раптоўны прыезд растлумачыў «справамі». Прыехаў у добрым гуморы, вясёлы і ласкавы — такі, якім яго ведалі з дзяцінства. Сястра Юлія прыгадвала сваю сустрэчу з Ігнатам так: «Ён быў у дыхтоўным гарнітуры, які шчыгульна аблягаў ягоную стройную, вышэй сярэдняга росту постаць. Недаўгія цёмна-русыя кучаравыя спераду валасы, мяккая бародка і вусы аблямоўвалі твар з глыбокімі ўдумлівымі вачыма. З ім была акуратна наладаваная дарожная валізка...

— Хто табе так акуратна запакаваў рэчы ў валізку?.. Відаць, нейкая паненка?

— Але, паненка... У мяне шмат добрых паненак ёсць,— жартам адказаў ён.

Ігнат наведаў магілу маці, якая памерла за колькі месяцаў перад тым. Ён гуляў па ваколіцах маёнтка, чытаў, слухаў бацькаву скрыпку, спакойна і дасціпна гутарыў з сямейнікамі.

Для блізкіх ён па-ранейшаму заставаўся пецярбургскім студэнтам, гонарам і надзеяю роду Грынявіцкіх. У свеце, дзе ён, па ўяўленнях сям'і, жыў, былі лекцыі знакамітых прафесараў, сталічныя тэатры, бібліятэкі і музеі. У тым свеце не было месца нелегальным друкарням, арыштам, пакаранню смерцю на досвітку. Ніхто з родных, вядома, не думаў, што бачыць Ігната апошні раз. Ён не выдаў сябе ніводным неасцярожным словам або рухам.

Вярнуўшыся ў Пецярбург, а мажліва, яшчэ напярэдадні паездкі на радзіму, ён пад імем Мікалая Ельнікава наняў пакой на Выбаргскай старане, у доме № 59 на Сімбірскай вуліцы.

Гаспадыня кватэры № 22, дзе пасяліўся Грынявіцкі, ураднікава дачка Ганна Артамонава і яе прыслуга, салдацкая ўдава Акуліна Смялкова, на судовым працэсе царазабойцаў апавядалі пра ціхае і самотнае жыццё кватаранта, пра ягоную беднасць і сціпласць.

Калі гаспадыня пацікавілася, чым ён зарабляе на жыццё, Ігнат адказаў, што займаецца пісьмоваю работаю ў канторы. У ягоным пакоі былі толькі самыя неабходныя рэчы. адсутнічаў нават намёк на нейкую ўтульнасць.

На пытанне суддзі, хто з дзяржаўных злачынцаў наведваў Ельнікава, прыслуга Смялкова пакажа на Мікалая Рысакова, Андрэя Жалябава, Соф'ю Пяроўскую і Гесю Гельфман.

Грынявіцкі звычайна выходзіў з дому а дзесятай гадзіне раніцы, а вяртаўся аб адзінаццатай вечара. Апрача сачэння за царом у гэты час ён слухаў лекцыі М. Кібальчыча пра механізм і сілу выбуховых прыладаў, удзельнічаў у іх выпрабаваннях.

Лекцыі чыталіся на новай канспіратыўнай кватэры ў доме № 5 на вуліцы Цялежнай. Там адбылося і асабістае знаёмства чатырох бомбакідальнікаў. Гаспадыняю кватэры была Геся Гельфман.

Рэвалюцыянеры спяшаліся. У рукі паліцыі ўжо трапілі людзі, якія ведалі пра

падрыхтоўку забойства імператара. Нягледзячы на ўсе засцярогі, па сталіцы лёталі чуткі пра зроблены тэрарыстамі падкоп.

Адно з апошніх пасяджэнняў змоўшчыкаў адбылося ў Грынявіцкага на Сімбірскай. 26 лютага ўвечары Жалябаў, Пяроўская і кідальнікі бомбаў яшчэ раз падрабязна абмяркоўвалі план будучай акцыі.

Падзеі разгортваліся надзвычай імкліва.

27 лютага паліцыя ўзяла Андрэя Жалябава. Зробленая ў ягонай кватэры засада павінна была затрымліваць любога наведніка. Паведамляючы пра арышт аднаго з галоўных рэвалюцыянераў імператару, усцешаны Лорыс-Мелікаў пісаў: «Назіранне за астатнімі асобамі доўжыцца, і можна спадзявацца, што арышты будуць працягвацца».

У дзень арышту Жалябава Ігнат сустрэўся ў рэстаўрацыі з Рысаковым, Міхайлавым і Емяльянавым. Яны дамовіліся пра заўтрашнюю паездку ў пецярбургскія ваколіцы на выпрабаванне бомбы. У вечары Грынявіцкі не пайшоў дахаты. Магчыма, у гэтую ноч ён быў на Малой Садовай, дзе сканчвалася апошняя падрыхтоўка ў падкопе.

28 лютага М. Кібальчыч і кідальнікі бомбаў выпрабоўваюць за Смольным манастыром выбуховы прыстас. Высветлілася, што бомба са смяротным змесцівам — серная кіслата, сумесь берталетавай солі з цукрам, грымучы міркіль і г. д.— дзейнічае на 15 сажняў (прыблізна 32 метры). Пра арышт кіраўніка акцыі тэрарысты яшчэ не ведалі.

Таго ж дня ўлады робяць агляд у краме на Малой Садовай. Рэвалюцыянерам пашанцавала, але адтэрміноўваць аперацыю яны ўжо не маглі.

На сваім надзвычайным пасяджэнні Выканаўчы камітэт «Народнай волі» прызначае замах на 1 сакавіка. Кіраўніцтва тэрарыстамі бярэ на сябе Соф'я Пяроўская.

Рыгор Ісаеў атрымаў заданне ўначы закласці ў падкоп міну. Мікалай Кібальчыч, Мікалай Суханаў і Міхаіл Грачэўскі за адну ноч зрабілі чатыры бомбы.

Грынявіцкі вярнуўся дахаты ўвечары. Ноч на 1 сакавіка была ў ягоным жыцці апошняя. Магчыма, якраз тады, прадчуваючы хуткую гібель, ён і напісаў свой запавет:

«Аляксандр II павінен памерці. Дні ягоныя злічаныя.

Недалёкая будучыня пакажа: мне або іншаму давядзецца зрабіць апошні ўдар, водгулле якога разнясецца па ўсёй Расеі і адгукнецца ў самых далёкіх яе кутках.

Ён намрэ, а разам з ім памрэм і мы, яго ворагі, яго забойцы.

Гэта неабходна дзеля свабоды, бо ў выніку значна пахіснецца тое, што хітрыя людзі называюць кіраваннем — манархічным, неабмежаваным, а мы — дэспатызмам...

Што будзе далей?

Ці шмат яшчэ ахвяр запатрабуе наша няшчасная, але дарагая радзіма ад сваіх сыноў дзеля свайго вызвалення? Я баюся... Мяне, асуджанага на смерць, чалавека, які адной нагой стаіць у магіле, палохае думка, што напарадзе барацьба забярэ яшчэ шмат дарагіх ахвяр, а яшчэ болей — апошняя смяротная бітва з дэспатызмам, якая, я перакананы, ужо не вельмі далёка і якая залье крывёю палі і нівы нашае радзімы, бо — на жаль! — гісторыя паказвае, што раскошнае дрэва свабоды вымагае чалавечых ахвяр.

Мне давядзецца ўдзельнічаць у апошняй барацьбе. Лёс асудзіў мяне на ранюю гібель, і я не ўбачу перамогі, не буду жыць ні дня, ні гадзіны ў светлы час перамогі, але лічу, што сваёй смерцю зраблю ўсё, што павінен быў зрабіць, і большага ад мяне ніхто, ніхто на свеце патрабаваць не можа.

Задача рэвалюцыйнай партыі — запаліць ужо назапашаны гаручы матэрыял, кінуць іскру ў порах і потым зрабіць усё дзеля таго, каб пачаты рух скончыўся перамогаю, а не павальным вынішчэннем лепшых людзей краіны».

Тае раніцы Ігнат Грынявіцкі падняўся раней звычайнага. Ён спяшаўся на Цялежную, дзе а восьмай гадзіне ў кватэры Гесі Гельфман збіраліся тэрарысты.

Прыкладна праз гадзіну туды прыйшла Соф'я Пяроўская, якая паведаміла пра арышт Жалябава. У яе клунку ляжалі дзве бомбы, яшчэ дзве прынёс Кібальчыч. Гэта былі бляшанкі цыліндрычнай формы вагою 5—6 фунтаў. Запасных прыстасаў для абароны і на выпадак няўдачы тэрарысты не мелі. Кідаць бомбу трэба было не болей чым з пяці крокаў.

Апоўдні тэрарысты з бомбамі былі на сваіх месцах. Рысакоў і Емяльянаў занялі пазіцыі ля помніка Кацярыне II і на рагу Неўскага і Малой Садовай. Грынявіцкага як найбольш вытрыманага і надзейнага Пяроўская наставіла разам з Ц. Міхайлавым у канцы вуліцы, над якой у падкопе ляжала два пуды дынаміту. У тым выпадку, калі міна не спрацуе, ініцыятыву павінен быў браць на сябе Ігнат. Пяроўская падавала сігналы насоўкаю.

Імператар у апошні дзень свайго жыцця ўстаў на пачатку дзевятай гадзіны. Вядома, што ён доўга гуляў па Зімовым палацы з княгіняй Юр'еўскай і з дзецьмі, катаўся са сваім улюбёнцам-сынам на горках у адной з залаў. Пасля малітвы ў палацавай царкве ён снедаў з прыдворнымі і ўразіў усіх вясёлым настроем.

Яшчэ да снедання Аляксандр II адправіў прыдворнага скарахода да хворага графа Лорыс-Мелікава. Цар меўся ехаць да міністра, але неўзабаве той з'явіўся сам.

Прыкладна ў той самы час, калі тэрарысты займалі свае месцы, імператар выслухаў даклад Лорыс-Мелікава і падпісаў дакумент пра дзяржаўную рэформу. 4 сакавіка праект выносіўся на зацвярджэнне саветам міністраў.

З даклада цар даведаўся пра агляд падазронай крамы на Малой Садовай. Міністр сказаў, што чуткі пра падкоп не спраўдзіліся, трывога аказалася дарэмнай.

Пасля даклада Аляксандр II збіраўся ехаць у Міхайлаўскі манеж на развод лейб-гвардзейскага Ізмайлаўскага палка. Жонка, княгіня Юр'еўская, і Лорыс-Мелікаў адгаворвалі цара, але той адказаў, што ён у сваёй сталіцы, а не ў вотчыне рэвалюцыянераў.

Карэта і канвой чакалі ў прыбудаванай да царскага пад'езда дзеля бяспекі даўгой галерэі. Цароў фурман умеў з месца пускаць коней наўскач. Загадаўшы на выездзе з галерэі кіравацца ў манеж не па Малой Садовай (відаць, паведамленне міністра ўнутраных спраў наконт падкопу ўсё ж насцярожыла Аляксандра II), а па набярэжнай Кацярынінскага канала, імператар істотна зблытаў планы рэвалюцыянераў.

Узмахам хусцінкі Пяроўская апавясціла тэрарыстаў, што ўступае ў сілу запасны варыянт і ім трэба ісці на Кацярынінскі канал (цяпер канал імя Грыбаедава). Перад гэтым Пяроўская, Грынявіцкі і Рысакоў сустрэліся ў кандытарскай Андрэева, што мясцілася на Неўскім праспекце ў падвальным паверсе насупраць Гасціннага двара. Ігнат, адзіны сярод таварышаў, здолеў з'есці замоўленую порцыю.

Імператар прымаў развод гвардзейскага сапёрнага батальёна. Калі верыць відавочцам, у той дзень ён — у мундзіры таго ж батальёна — быў асабліва вясёлы і прыгожы.

Тэрарысты на адлегласці трыццаці крокаў адзін ад аднаго занялі новыя пазіцыі на набярэжнай. З другога берага канала, перайшоўшы яго па Казанскім мосце, за ім напружана сачыла Пяроўская.

Першы з таго боку, адкуль чакалі царскі экіпаж, стаяў Рысакоў, другі — Грынявіцкі, далей — Емяльянаў. Чацвёрты, Цімафей Міхайлаў, чалавек вялікай асабістай мужнасці (ён засведчыць гэта сваімі паводзінамі на судзе і на эшафоце), у той дзень не вытрымаў і, пакінуўшы сваё месца, пайшоў дадому.

Заехаўшы пасля разводу ў манежы да вялікай княгіні Кацярыны Міхайлаўны ў Міхайлаўскі палац, імператар па Інжынернай вуліцы накіраваўся на Кацярынінскі канал. На беразе царская запрэжка пайшла буйной рыссю, і казакі з эскорта пусцілі коней наўскапыт. Каля паловы на трэцюю экіпаж параўняўся з чалавекам у дэмісезонным паліто з тоўстага драпу.

Гэта быў Рысакоў. Ён кінуў загорнутую ў сурвэтку бомбу (па ўспамінах сведкаў, яна была падобная да камяка снегу) услед карэце.

Выбух нагадваў адначасовы залп некалькіх гарматаў. Трое казакоў упалі з коней. Зазвінела шкло з разбітых выбуховаю хваляю вокнаў палацавай стайні на другім баку канала. З усіх бакоў свісталі гарадавыя і збягаліся людзі.

Праз колькі імгненняў дым развеяўся. Стагналі, лежачы на бруку, параненыя з ліку ахоўнікаў і выпадковых прахожых. Сам імператар быў жывы і цэлы. «Ці схоплены злачынца?» — пацікавіўся ён, выходзячы з пашчапанага выбухам экіпажа.

Паліцмайстар Дваржыцкі ўгаварваў Аляксандра II хутчэй ехаць у Зімовы палац, але той захацеў аглядзець месца выбуху.

У імператара запыталіся, ці не паранены ён.

«Дзякую Богу, я ацалеў.»

«Яшчэ невядома, ці дзякую Богу»,— злавесна прамовіў Рысакоў.

Да імператара ішоў Ігнат Грынявіцкі. Наблізіўшыся амаль усутыч (паводле сведкаў, на адлегласць не болей за два аршыны, або 1,5 метра), ён ускінуў рукі з бомбаю за галавой...

Гэты выбух, што прагучаў праз 4—5 хвілін пасля першага, чамусьці атрымаўся мацнейшым. Хвіліны дзве нічога не было відаць, толькі чуліся крыкі новых ахвяраў. Потым вачам адкрылася страшнае відовішча.

Аляксандр II і ягоны забойца амаль поруч сядзелі на снезе, прыхінуўшыся плячыма да парэнчаў над каналам. (На месцы забойства Аляксандра II збудаваны храм-помнік Спаса на крыві. Недалёка ад яго, на Грыбаедаўскім канале, цяпер знаходзіцца мост імя І. Грынявіцкага). Вакол, сярод параненых, ляжалі рэшткі

адзенне, адарваныя эпалеты, зброя, шматкі чалавечых целаў. Ёсць сведчанні, што трэці тэрарыст, Емяльянаў, схаваўшы бомбу, спрабаваў дапамагчы цару.

Смяротна параненага імператара павезлі ў Зімовы палац. Шматтысячны людскі натоўп хутка ўбачыў, як цароў штандар паўзе долу.

Дваццаціпяцігадовае царства Аляксандра II скончалася.

У гэты час у прыдворным Канюшынным шпіталі пакутліва канаў цараза-бойца.

Медычны акт сведчыць: «Дастаўлены ў поўным непрытомным стане... На лобе і на твары шмат крывавых ранак, абодва павекі пабітыя з кровазліццём пад злучальную абалонку... правае вока неадчувальнае да святла... Правая галёнка пакрыта дваццаццю ранамі... Косці правай галёнкі раздробленыя ў сярэдняй і ніжняй частках, прычым раны буйных памераў ад 1 да $2^1/_2$ сантыметра, з кровападцёкам... На тыльнай паверхні правай ступні каля злучэння пальцаў з плюснявымі касцямі заўважаецца папярочная рана памерам на 7 см, якая пранікае ў суставы. Верхняя частка левай галёнкі пакрытая ранамі скуры... Усяго на целе звыш пяцідзесяці ранаў... Дыханне паверхневае. Пульсу няма.»

Пры царазабойцу неадлучна сядзеў следчы. За гадзіну перад смерцю да Ігната вярнулася прытомнасць. «Як ваша імя?» — запытаў следчы. «Не ведаю», — адрывіста адказаў тэрарыст.

Гэта былі апошнія Ігнатавы словы. А палове адзінаццатай вечара дактары канстатавалі смерць.

* * *

Сама гісторыя засведчыла: любыя спробы стварыць «новага чалавека», змяніць свет да лепшага праз сілу — асуджаныя на няўдачу, што аплочваецца нязмернымі чалавечымі пакутамі.

Ігнат Грынявіцкі і ягоныя паплечнікі былі ахвярамі аблуднага вучэння. Яны трагічна памыляліся, але яны вартыя нашай памяці.

Памяці, якая перасцерагае.

Полымя. 1992. № 1.

ДАНЯСЕННЕ НАЧАЛЬНІКА С.-ПЕЦЯРБУРГСКАЙ ГУБЕРНСКАЙ ЖАНДАРСКАЙ УПРАВЫ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІЦЫІ № 2768

23 красавіка 1881 года
Сакрэтна

При дальнейших розысках по обнаружении настоящего звания, умершего 1-го Марта сего года в придворном конюшенном госпитале, проживавшего, как оказалось впоследствии под именем Ельникова, возникшее предположение, основанное на поразительном сходстве Ельникова с бывшим студентом С.-Петербургского Технологического Института механического отделения (католического вероисповедания) Игнатием Гриневицким, вполне подтвердилось как предъявлением его фотографической карточки, старшему наблюдателю при учащихся в С.-Петербургском Технологическом Институте Надворному Советнику Момбелю, так и студенту того же Института Антону Гавронскому, которые в карточке, снятой с Ельникова, признали Игнатия Гриневицкого, уволенного из Института в июне 1880 г.

Кроме того, фотографическая карточка именовавшегося Ельникова была предъявлена на месте родины Гриневицкого в Гродненскую губернию Бельского уезда, в имение Гриневичи Большие как родным Гриневицкого так и лицам, знавшим его, причем все эти лица, за исключением отца Гриневицкого, давшего уклончивый ответ, заявили, что предъявленная карточка изображает Игнатия Гриневицкого.

О чем имею честь донести.

Начальник управления Генерал-майор
подпись

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі ў Маскве, ф. 102, воп. Д-3, спр. 79, л. 94.

ДАНЯСЕННЕ ВІЛЕНСКАГА, КОВЕНСКАГА І ГРОДЗЕНСКАГА ГЕНЕРАЛ-ГУБЕРНАТАРА ПАНУ МІНІСТРУ УНУТРАНЫХ СПРАЎ № 337

2 мая 1881 года
Сакрэтна
г. Вільна

Гродненский Губернатор довел до моего сведения, что 6 апреля сего года начальник Гродненского Губернского Жандармского Управления получил от начальника С.-Петербургского Губернского Жандармского Управления фотографическую карточку, снятую с личности, бросившей 1 марта разрывной снаряд. смертельно ранивший в бозе почившего Государя Императора Александра II, и оказавшейся бывшим студентом С.-Петербургского Технологического института, из уроженцев Гродненской губернии, Гриневицким. По предъявлению карточки Гриневицкого его родственникам он был признан за сына владельца имения «Большие Гриневичи» Бельского уезда Иоакима Михайлова Гриневицкого, Игнатия, о котором отец не имел известий уже два года. Затем собранными сведениями о семействе Гриневицкого выяснено, что у этого земледельца есть другой сын Иван, который был студентом Петровской земледельческой и лесной Академии и исключенный из сего заведения в 1880 году, служил военноопределяющимся в Лейб-гвардии 2 артиллерийской бригады, откуда также был уволен за неблагонадежность, без наименования воинским званием, в начале текущего года, в настоящее же время Иван Гриневицкий проживает у сестры своей, состоящей в замужестве за Начальником станции С.-Петербургско-Варшавской железной дороги Пылаевым.

Ввиду этих сведений признать наобходимым учредить тщательное, но секретное наблюдение за Иваном Гриневицким на избранном им месте жительства, на станции Олькеники Виленской губернии, а равно собрать более подробные сведения о причинах, по которым Гриневицкий был уволен из Петровской земледельческой и лесной Академии и исключен из военной службы, я предложил о том, для исполнения, Виленскому и Гродненскому Губернаторам.

О вышеизложенном имею честь сообщить Вашему сиятельству.

Генерал-Адъютант.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі ў Маскве, ф. 102, воп. Д-3, спр. 79, ч. 2, л. 187.

Ці была Клічаўшчына бязбожнай!

У савецкі час Клічаўскі раён належаў да ліку самых «атэістычных»: ніводнай царквы больш як на 140 населеных пунктаў. Нават закрадвалася крамольная думка: а можа зямля гэта спрадвеку была бязбожнай? Можа таму менавіта яна спарадзіла Ігната Грынявіцкага, забойцу цара Аляксандра II, які, як і ўсе іншыя манархі, лічыўся стаўленікам божым на зямлі.

Але гістарычныя крыніцы даюць іншыя звесткі: на Клічаўскай зямлі было калісьці нямала цэркваў, якія не толькі выхоўвалі ў насельніцтва высокія маральныя ўстоі, а і давалі адукацыю, назапашвалі статыстычныя і іншыя каштоўныя матэрыялы аб жыцці мясцовага насельніцтва. Цікава, што сярод служыцеляў царквы значыцца Антон Смоліч — бацька знакамітага прафесара геаграфіі А. А. Смоліча.

Ніжэй друкуюцца матэрыялы (з захаваннем іх стылю) пра цэрквы, што даейнічалі на тэр. Клічаўскага раёна. Звесткі гэтыя ўзяты з двух архіўных дакументаў: «Описание церквей и приходов Минской епархии, составленное по официально затребованным от причтов сведениям» (Мн., 1878—79) и «Отчёт о церковно-приходских школах и школах грамоты Минской епархии за 1890—91 учебный год» (Мн., 1894).

ЦЭРКВЫ

БАЦЕВИЧИ

I. **Местность.** Село Бацевичи находится в Бобруйском уезде, в 4-м благочинническом округе, при речках Ольсе и Несяте. От губернского города отстоит в 140 верст., от уездного города и Ландварово-Ромерской железной дороги в 35 верст. и от почтовой станции Свислочь в 20 верст. Никаких особенных преданий о сей местности и памятников древности в Бацевичском приходе не сохранилось.

II. **Церковь.** Приходскою церковию прежде была — ныне приписная, находящаяся в деревне Заполье-Олесском; но когда именно сия церковь переименована из самостоятельной в приписную неизвестно, по неимению о том сведений в церковных делах. Настоящая приходская церковь, расположенная в самом селении, построена владелицею имения Бацевичи, Варварою Забелловою, но о стоимости постройки и времени построения ея неизвестно. Зданием деревянная, обыкновенной костельной архитектуры, т. е., представляет форму продолговатого здания, без куполов, с крестом над алтарем и колокольными башнями на фронте. Наружный вид, в основании и стенах, имеет форму продолговатого четырехугольника; крыша на всем здании гонтовая, входные двери одне, окна расположены в один ярус и снабжены железными решетками; вообще здание в настоящее время находится в прочном состоянии.

Внутренность представляет квадратное пространство, заключающее 16 арш. в длину и 14 арш. в ширину; потолок во всей церкви настлан на балках досками, пол деревянный, стены в средней части храма выбелены, а в алтаре покрашены в светло-голубой цвет; солея возвышена на $^1/_4$ арш., клиросы устроены на солее; к отоплению церковь не приспособлена; вместимость алтаря заключает четыре квадратныя сажени. Иконостас дощатый, новаго устройства, состоит из семи икон академического письма, расположенных в одном ярусе. Престол в сей церкви один — во имя святых апостолов Петра и Павла. Из утварных принадлежностей имеется один прибор литургийных сосудов — серебряно-вызолоченный; а прочие предметы дешевые из аплике и не в полном количестве,— нет сборнаго блюда и водосвятной чаши. Ризница помещается в шкафах и состоит из пяти приборов новых священнических облачений, дешовой мишурной парчи, и трех ветхих Евангелий, употребляемых при богослужении: а) два в лист, одно, старое, в пунцовом бархатном переплете, с серебряными изображениями Воскресения Христова и Евангелистов, и другое, новое, с медными позолоченными досками и таковыми же украшениями, и б) два в $^1/_4$ листа, с верхними апликовыми досками; прочия богослужебныя книги имеются, недостает только месячной минеи. В церковном архиве хранятся визитныя книги на польском языке, копии метрических книг с 1823 г. и исповедные списки прихожан с 1840 года. Погост церковный огорожен простым деревянным забором; в колокольне, с фронта церкви, имеются три колокола: в три, два и один пуд. В приходе девять кладбищ; все расположены вблизи селения и на каждом имеется часовня для постановки тел. Приписных церквей две, каковыя находятся в деревнях: Запольи-Олесском и Воевичах.

III. Приход. В состав прихода, кроме села Бацевич, входят девять следующих деревень: Заречье, Усоха, Устье, Воевичи, Ольса, Заполье, Люцино, Осовье и Орлины; самыя дальния деревни — Люцино и Воевичи — находятся в расстоянии от церкви в 10 в. Прихожан числится мужескаго пола 1262 души и женскаго 1248 душ, все они крестьянскаго сословия и занимаются летом земледелием, а зимою лесными заработками. Прихожане вообще довольно религиозны; как на проявление их религиознаго чувства, можно указать на существующие у них обычаи: освящение полей, домов и скота, что в большей части прихода совершается ежегодно.

IV. Причт. Причт одноклирный, состоящий из настоятеля и псаломщика. В настоящее время настоятелем священник Алексей Смолич, окончил курс наук в семинарии, священствует с 1854 года.

V. Владения, принадлежащия церкви и причту. Ежегоднаго дохода деньгами, от продажи свеч и кружечнаго сбора, поступает в пользу церкви до 137 рублей; других источников дохода церковь не имеет. Причт, кроме штатнаго жалованья и братской кружки, пользуется церковною землею и помещением. Усадьбы находятся при церкви, а пахатная и сенокосная земля расположена в шести участках; сколько именно имеется церковной земли неизвестно, так как таковая неизмерена, а плана и межевой книги нет. Дома для причта имеются: для священника хотя новый, но неоконченный и не прочный, а для псаломщика и просфирни совершенно ветхие; прочия постройки хотя имеются, но очень ветхия. Коммиссия несколько раз производила осмотр причтовых помещений, но о постройке таковых до сего времени не сделано распоряжения.

VI. Церковныя и приходския учреждения. При церкви существует церковно-приходское попечительство и штатное народное училище в с. Бацевичах; однако процент грамотности между прихожанами очень незначителен, не более одного. Богадельни в приходе нет.

КОБЫЛЯНКА

I. Местность. Село Кобылянка находится в четвертом благочинническом округе Бобруйского уезда; местность уединенная; расстоянием от гор. Минска — в 160 вер., от Бобруйска и железной — Либаво-Роменской — дороги в 60 вер., и от почтовой станции, в 20 вер. В местности прихода не сохранилось ни сказаний, ни каких либо памятников.

II. Церковь. Настоящая приходская Покровская церковь, в 100 саж. от села, построена в 1814 г. на средства помещика Эсьмана и прихожан. Зданием деревянная, на каменном фундаменте, в виде квадрата; с одним глухим куполом и колокольней во фронтонной части. Кровля деревянная, некрашенная, как и вся церковь. Вообще корпус церкви прочен. Внутренняя площадь заключает 35 квадр. саженей вместимости, крестообразнаго расположения; потолок и пол деревянные; первый поддерживается четырьмя столбами; печей нет. Солея, с клиросами на ней, возвышена на одну ступень. Иконостас новаго устройства, с пилястрами и колоннами, в один ярус, с пятью иконами, из коих четыре московской живописи; карнизы и рамы золочены, при общем белом фоне. Примечательных икон нет. Утварныя вещи, низкаго достоинства, имеются в очень умеренном количестве, и даже не все. Евангелий два, одно из них большое в медных позолоченных досках. Из богослужебных книг недостает месячных миней и обихода. Метрическия книги имеются с 1831 г. в архиве есть также визитные записи. Ризница в посредственном состоянии — всех священ. облачений пять, из них одна риза парчевая, три ветхи. Погост церковный обнесен простой деревянной оградой. Колоколов два — в 2 и $1^1/_2$ пуда. В приходе есть две часовни. Кладбищ пять: одно для церкви, остальныя в 2, 8 и 6 вер. расстоянии.

III. Приход. В состав прихода входят шесть деревень: Чаравачь, Куранья, Селище, Михалов и Перепаль,— последняя самая дальняя — в 8 верстах. Прихожан муж. пола 636, женск. 600. Все — крестьяне и занимаются преимущественно хлебопашеством и отчасти пчеловодством. Религиозно-нравственное состояние прихожан посредственное, но усердия к храму Божию замечается мало, если исключить крестные ходы, которыя совершает каждая деревня для освящения полей, домов и скота. Резко выдающихся обычьев не заметно.

IV. Причт — составляют настоятель и псаломщик. Настоятелем состоит священник Николай Кулаковский, окончил курс наук в Полоцкой дух. семинарии, священствует с 1838 года, имеет набедренник.

V. Содержание причта, владения церкви и причта. Доход церковный простирается до 25 руб. в год. Причт, кроме штатнаго жалованья, пользуется церковною землею, которая в 6 отдельных кусках составляет двадцать шесть десятин: из них 3 усадебной, около 17 пахатной, около 6 сенокосной. Плана на нее нет, но владение ведется бесспорно. Строения для причта все ветхия и требуют капитальной перестройки. Осмотра их коммиссиею не было и предположония об улучшении также не сделано.

VI. Церковныя и приходския учреждения. При церкви есть церковно-приходское попечительство и училище, которое дает, однако, очень мало грамотных приходу. Богадельни нет.

НЕСЯТА

I. Местность. Село Несята, состоящее в четвертом благочинническом округе, Бобруйского уезда, расположено при реке Несятке. От губернскаго города отстоит в 142, от уезднаго в 45, от почтовой станции в 20 верстах.

II. Церковь. Приходская, Преображенская церковь расположенная в селении, построена в 1874 году на средства казны и прихожан, обошлась в 4000 рублей. Зданием деревянная на каменном фундаменте; устроена продолговатым крестом с одним открытым куполом и колокольнею во фронтонной части. Кровля железная, окна расположены в два ряда, дверей трое; стены и крыша окрашены масляною краскою. В техническом отношение церковное здание крепко и благовидно. Внутренняя площадь вместительности заключает в себе около 40 квадр. сажен. Потолок подшит тесом и поддерживается четырьмя столбами; пол деревянный; стены и потолок покрашены масляною краскою; к отоплению не приспособлена. Солея возвышена на пять вершков,— на ней устроены и клиросы. Новаго устройства, с пилястрами, иконостас, покрашенный в белый цвет, с золочеными карнизами и рамами, состоит из четырех только икон. Утварныя вещи имеются в достаточном количестве,— в том числе один серебряный прибор литургийных сосудов. Риз мишурных целых 4, ветхих 7 и одна полубархатная траурная. Евангелий богослужебных четыре, из них два в сплошных металлических окладах и в бархатных переплетах; из прочих богослужебных книг недостает только месячных миней. Метрическия книги хранятся с 1823 года. Колоколов имеется три: в 2, $1^1/_2$ и 1 пуд. Погост обнесен простым деревянным забором. Кладбищ в приходе шесть и одна, в деревне Будневе, кладбищенская церковь.

III. Приход. В состав прихода, кроме села Несяты, входят селения: Буднево, Ореховка, Турец, Думбна и Ожово; самый отдаленный пункт прихода находится в 10 верстах. Прихожан числится мужескаго пола 722, а женскаго 784 души; все они крестьянскаго сословия и занимаются только хлебопашеством. Желательно, чтобы религиозное состояние прихожан было выше.

IV. Причт — составляют настоятель и псаломщик. Настоятелем состоит священник Андрей Самойлович, студент семинарии, рукоположен во священника в 1850 году.

V. Владения церкви и причта. Церковнаго дохода в год поступает до 30 рублей. Причт, кроме штатнаго жалованья, пользуется церковною землею и помещением. Церковной земли считается: усадебной 2, пахатной 40, сенокосной 5 десятин. Расположена оная в трех разных участках; усадьба при церкви. Плана и межевой книги нет. Из строений имеются: для священника — дом, амбар, варивня, два скотских сарая, гумно и сеновал; для причетника — один дом. Все эти постройки ветхи; проэкта на приведение их в порядок не составлено.

VI. Учреждения церковныя и приходския. При церкви учреждено церковно-приходское попечительство и существует церковно-приходская школа. Грамотных в приходе мало. Богадельни нет.

ДОЛГОЕ

I. Местность. Село Долгое расположено в Игуменском уезде, в 1-м благочинническом округе при реке Должанке и проселочной дороге. От губернскаго города отстоит в 200 верстах, от уезднаго в 140, от почтовой станции в 12 и от железной дороги в 65. Никаких исторических памятников в сей местности не сохранилось; неизвестно также и время учреждения здесь перваго православнаго храма.

II. Церковь. Настоящая приходская церковь, во имя Рождества Пресвятыя Богородицы, построена в самом селении, в 1740 году; но на какия средства и во что обошлась неизвестно. Зданием деревянная, устроена неправильным квадратом, с двумя глухими куполами, гонтовою крышею, одним рядом окон и одною входною дверью; вообще находится в крайне ветхом состоянии. Внутреннее пространство заключает в себе около 25 квадратных сажен; пол деревянный, потолок в алтарной части настлан досками; стены выбелены; к отоплению церковь не приспособлена. Дощатый иконостас покрашен в красный цвет, а карнизы и рамы частию тоже покрашены, а частию золочены,— устроен в два яруса и состоит из 14 различной величины и живописи икон. Клиросы устроены на солее, возвышенной на одну ступень. Утварью достаточна; но все имеющияся утварныя вещи малоценны. Евангелие одно, в бронзовом окладе,— богослужебных книг имеется полный круг. Ризница помещается в алтаре. Священнических облачений годных к употреблению пять,— все они малоценны. В архиве церковном хранятся метрическия книги с

1826 года, а исповедныя ведомости с 1840 года. Вокруг церкви устроена простая деревянная ограда. В колокольне, устроенной отдельно от церкви, помещается четыре колокола: в 7 1/2, 5, и два по 2 пуда. В приходе существует пять кладбищ и на оных три кладбищенских деревянных церкви.

III. Приход. В состав прихода входят: село Долгое и деревни: Дубно, Загатье, Брощевичи и Усакин — самый отдаленный пункт прихода 15 верст. Прихожан числится мужескаго пола 909, а женскаго 921 душа; все они крестьянскаго сословия, занимаются земледелием, вывозкою и сплавом сосноваго леса и выделкою клепки. Религиозность развита в средней степени; из молитвословий известно совершение молебнов и акафистов.

IV. Причт. Причт при сей церкви состоит из настоятеля и псаломщика. Настоятелем состоит священник Симеон Кушлянский, окончил курс наук в духовной семинарии, священствует с 1857 года, награжден скуфьею.

V. Владения церкви и причта. Церковнаго дохода в течении года бывает до 100 рублей; особых статей, приносящих доход церкви или причту, нет. Причт, кроме штатнаго жалованья и незначительнаго кружечнаго дохода, пользуется церковным помещением и землею. Всей церковной земли числится 67 десятин и 256 сажен; пахатная земля расположена в двух участках, недалеко от церкви, а сенокосная находится в 5 верстах; усадьба расположена вблизи церкви. План на означенную землю находится при церкви, а межевая книга в Игуменском уездном суде. Все причтовыя строения, как жилыя, так и холодныя, находятся в чрезвычайно ветхом состоянии. Взамен обветшалых строений, коммиссия признала необходимым возвести вновь все строения для причта, но к исполнению сего не приступлено.

VI. Церковныя и приходския учреждения. При церкви существует церковно-приходское попечительство и штатное народное училище. Число грамотных не превышает 10 %. Богадельни в приходе нет.

КЛИЧЕВ

I. Местность. Село Кличев расположено в Игуменском уезде, в третьем благочинническом округе, при реке Ольсе и проселочной дороге. От губернскаго города отстоит в 154 верстах, от уезднаго в 98, от железной дороги в 75 верстах и от почтовой станции в 35 верстах.

II. Церковь. Настоящая приходская Свято-Троицкая церковь, расположенная в центре селения, починена в 1839 году на средства прихожан, а когда и кем была построена неизвестно. Зданием церковь деревянная, устроена продолговатым прямоугольником, с тремя глухими куполами, гонтовою крышею, одним рядом окон и одною входною дверью; вообще здание церкви находится в столь ветхом состоянии, что почти не годно к исправлению. Внутреннее пространство заключает в себе около десяти квадратных сажен; пол деревянный, потолок настлан досками; стены выбелены; к отоплению церковь не приспособлена. Клиросы на солее, возвышенной на 3 вершка. Дощатый иконостас, весь покрашенный в тёмно-синий цвет, состоит из 10 икон, расположенных в два яруса. Необходимыя утварныя вещи, кроме купели, имеются, но все оне малоценны, за исключением трех серебряных приборов литургийных сосудов. Облачений священнических имеется пять приборов, но вполне годных к употреблению три, и все малоценны. Евангелий богослужебных имеется два,— оба в лист, в апликовом окладе, с финифтяными изображениями; из прочих богослужебных книг недостает только месячных миней и акафистника. В архиве церковном хранятся метрические книги с 1822 года, а исповедныя ведомости с 1842 года. Вокруг погоста церковнаго устроена простая деревянная ограда. В колокольне, устроенной отдельно от церкви, имеется пять колоколен; в 10, 9, 3, 2 и около 1 пуда. Всех кладбищ в приходе пять, на одном из них, в деревне Суше, находится кладбищенская церковь,— часовень нет.

III. Приход. В состав прихода входят: село Кличев и деревни: Стояны, Поплавы Бердо, Пересопня, Дрени, Суша, Гонча и Дубровка;— самый отдаленный пункт прихода 14 верст. Прихожан числится мужескаго пола 1113, а женскаго 1185 души; большинство крестьянского сословия; занимаются земледелием и, в весеннее время, сплавом леса по реке Ольсе. Степень религиозности прихожан посредственная,— хотя впрочем более заметно в них холодности к церкви, чем усердия; в редких случаях, по просьбам прихожан, совершаются молебны и крестные ходы.

IV. Причт. По штату при сей церкви положены настоятель и псаломщик. Настоятелем состоит священник Фадей Шафалович, студент семинарии, священствует с 1847 года, награжден скуфьею.

V. Владения церкви и причта. Церковнаго дохода в течении года бывает до 20 рублей; особых статей приносящих доход церкви нет. Причт, кроме штатнаго жалованья, пользуется церковным помещением и землею. Церковной земли считается: 2 десятины усадебной; 40 пахатной и 10 сенокосной; усадебная земля расположена при церкви, а пахатная и сенокосная между крестьянскими полосами, в трех участках, вблизи церкви. План и межевая книга на сию землю находятся в Березинской администрации графа Маврикия Потоцкого. Землею причт владеет безспорно. Из причтовых строений имеются: дом, гумно и два сарая, для священника,— и для псаломщика также — дом, гумно, и два сарая. Коммиссиею, осматривавшею сии строения в 1877 году, постановлено, в течение трех лет, одни из сих строений починить, а вместо других возвести новыя.

VI. Церковныя и приходския учреждения. При церкви существует церковно-приходское попечительство и штатное народное училище. Грамотных между прихожанами не более 4 %. Богадельни в приходе нет.

КОЛБЧА

I. Местность. Село Колбча расположено в Игуменском уезде, в третьем благочинническом округе, при реке Ольсе и проселочной дороге; от губернскаго города отстоит в 133 верстах, от уезднаго в 72, от железной дороги в 75 и от почтовой станции в 45 верстах. В районе прихода находится не мало побоищ и курганов, преданием приписываемых войне шведов с поляками, и кладбищенский римско-католический костел.

II. Церковь. Настоящая приходская Крести-Воздвиженская церковь, расположенная среди селения, построена в 1806 году на средства прихожан и помещика Клечновскаго. Зданием церковь деревянная, устроена квадратом, с одним глухим куполом, гонтовою крышею, одним рядом окон и двумя входными дверями; вообще церковное здание довольно еще прочно. Внутреннее пространство церкви заключает в себе менее 20 квадратных сажен; пол деревянный; потолок настлан досками; стены выбелены; к отоплению церковь не приспособлена. Солея возвышена на одну ступень, клиросы устроены отдельно,— вне солеи. Дощатый иконостас, стараго устройства, весь покрашенный в разные цвета,— состоит из 6 икон, расположенных в один ряд. Ризница помещается в отдельной части алтаря. Необходимыя утварныя вещи имеются, но все оне малоценны, за исключением одного серебрянаго прибора литургийны сосудов. Малоценных священнических облачений имеется шесть приборов, но вполне годных к употреблению только четыре. Евангелие одно, в лист, в бархатном переплете, с золоченными иконками четырех Евангелистов и Спасителя. Круг богослужебных книг имеется, за исключением только месячных миней. В архиве церковном хранятся метрическия книги с 1816 года, а исповедныя ведомости с 1840 года. Вокруг церковнаго погоста устроена простая деревянная ограда; колокольня отдельно от церкви, в ней четыре колокола; из которых самый больший весом 3 пуда. В приходе существует шесть отдельных кладбищ;— на трех из них устроены кладбищенския церкви, а кроме того в приходе находится одна часовня и приписная церковь,— в деревне Мацеевичах.

III. Приход. В состав прихода входят: село Колбча и деревни: Слободка, Закутье, Липница, Гежгайлово, Мацеевичи и Дулебы; — самый дальний пункт прихода 15 верст. Прихожан числится мужескаго пола 1015, а женскаго 1020 душ; все они крестьянскаго сословия, занимаются исключительно земледелием. В религиозно-нравственном отношении прихожане не развиты; молебнов и акафистов служить не приглашают священника, а с крестным ходом — просят только в храмовые праздники.

IV. Причт. По штату при сей церкви положен одноклирный причт, состоящий из настоятеля и псаломщика. Настоятелем состоит священник Феодор Квачевский, окончил курс наук в духовной семинарии, священствует с 1860 года, награжден набедренником.

V. Владения церкви и причта. Церковнаго дохода в течении года бывает до 40 рублей. Причт, кроме штатнаго жалованья, пользуется церковным помещерием и землею. Церковной усадебной земли считается 2 десятины, пахатной 20, сенокосной 9 и много под лесом и зарослями, а кроме того, пахатная и сенокосная земля находится при приписной Мацеевичской церкви. Усадьба расположена при церкви, а остальная земля находится в нескольких участках. Плана и межевой книги не имеется, но причт владеет землею безспорно. Из причтовых строений имеются: два овина, две варивни, скотский сарай, сенный сарай и дом — для священника,— и два дома, пять скотских сараев и хлебный сарай для причетников; все сии строения находятся в крайне ветхом состоянии. Коммиссиею постановлено для священника и псаломщика домы построить вновь, а все холодныя постройки капитально ремонтировать; но к приведению сего в исполнение еще не приступлено.

VI. Церковныя и приходския учреждения. При церкви существует церковно-приходское попечительство, штатное народное училище и два отделения онаго. Процент грамотности между прихожанами не велик. Богадельни в приходе нет.

ОСТРОВ

I. Местность. Село Остров расположено в Игуменском уезде, в третьем благочинническом округе, при реке Березине и проселочной дороге; от губернскаго города отстоит в 110 верстах, от уезднаго в 45, от железной дороги в 38 и от почтовой станции в 18 верстах.

II. Церковь. Известная древнейшая церковь, разрушенная по ветхости в 1859 году, построена была в 1716 г. Настоящая приходская церковь, расположенная в самом селении, построена в 1802 году на средства местнаго владельца и прихожан; зданием деревянная, устроена продолговатым крестом, с одним глухим куполом и колокольнею во фронтонной части. Крыша на церкви гонтовая, а на колокольне железная; окна расположены в один ряд; входных дверей двое; вообще здание церкви, по крепости, находится в неудовлетворительном состоянии. Внутреннее пространство заключает в себе около 33 квадратных сажен. Потолок настлан досками, не подштукатурен; пол деревянный; внутренния стены окрашены голубою краскою; к отоплению церковь не приспособлена. Ризница помещается в алтаре. Клиросы устроены на солее, возвышенной на одну ступень. Иконостас, новейшего устройства, покрашенный в светло-розовый цвет, с золоченными рамами и карнизами, состоит из 10 икон, расположенными в три яруса. Необходимыя утварныя вещи имеются в достаточном количестве; к ценным из них относятся: серебряный прибор литургийных сосудов, серебряный вызолоченный напрестольный крест и серебряная золоченая дарохранительница. Священнических облачений, годных к употреблению, имеется восемь, а ветхих — два. Евангелие в лист,

в красном бархатном окладе, с золотым образом и с чеканными изображениями Спасителя и Евангелистов. Богослужебных книг имеется полный круг. В архиве церковном метрические книги хранятся с 1823 года, а приходские реестры с 1827 года. Вокруг церкви устроена деревянная бревенчатая ограда. В колокольне находится семь колоколов: первый весом 11 пудов, второй 2 пуда, третий и четвертый по $1^1/_2$ пуда, пятый и шестой по 1 пуду и седьмой 30 фунтов. В приходе существует шесть отдельных кладбищ и одна совершенно ветхая кладбищенская часовня;— приписных церквей нет.

III. Приход. В состтв прихода входят следующия селения: Остров, Закорки, Перевоз, Притерна, Запрудье, Новое-село, Пуцьков, Селиба, Барсукова-града и Жалин;— самый отдаленный пункт прихода 6 верст. Прихожан числится мужескаго пола 777, а женскаго 790 душ; все они крестьянскаго сословия; занимаются только земледелием. Степень религиозности прихожан не высокая. Крестные ходы по селениям и служения молебнов бывают очень редко.

IV. Причт. По штату при сей церкви положен шоклирный причт, состоящий из настоятеля и псаломщика. Настоятелем состоит священник Фома Кляевский, студент семинарии, священствует с 1857 года, награжден набедренником.

V. Владения церкви и причта. Церковнаго дохода в течении года бывает до 150 рублей. Причт, кроме штатнаго жалованья и 40 рублей, получаемых за землю при б. Баратической церкви, пользуется церковным помещением и земельным участком при приходской церкви, который состоит из 2 десятин усадебной, 23 пахатной, 9 сенокосной и 2 неудобной; земля сия расположена в 9 участках находится большею частию в отдаленном разстоянии от церкви;— усадьба расположена вблизи церкви. Плана и межевой книги нет. Из причтовых строений имеются: два дома, амбар, гумно, два сарая и варивня; дом для священника требует капитальной починки, а для причетника нужно возвесть новый. Осмотра строений коммиссиею не было.

VI. Церковныя и приходския учреждения. При церкви существует церковно-приходское попечительство и штатное народное училище. Грамотных прихожан очень мало. Богадельни в приходе нет.

ЦАРКОЎНАПРЫХОДСКІЯ ШКОЛЫ

В **Долгском приходе,** Игуменского уезда (1260 муж. и 1321 ж. п.),— четыре школы грамоты для мальчиков: 1) в дер. Дубно с октября 1884 года, переименованная из ц.-приходской школы. Дубенская школа помещается в наемной удобной квартире. Обучением в школе в отч. году занимался окончивший курс народного училища крест. Н. И. Клебча с вознаграждением от общества в количестве 20 р. за учебное время. Учащихся в школе было 30 мальчиков. 2) в дер. Загатьи, с ноября 1885 г.; школа помещается в наемной неудобной квартире. Обучением в школе с 1890 г. занимается ок. курс нар. училища крест. Ив. В. Дойнеко, с вознаграждением 15 руб. за учебное время. В отч. году учащихся в школе было 21 мальчик. 3) в деревне Бросневичи, с ноября 1889 года. Школа помещается в наемной удобной квартире; обучением с 1889 года занимается ок. курс ц.-приходской школы крест. Кир. Ант. Романович, с вознаграждением 10 р. за учебное время. Учащихся в отч. году было 25 мальчиков. 4) в дер. Усакино, с ноября 1886 г. Школа помещается в наемной неудобной квартире; обучением в школе занимался в отч. году ок. курс нар. училища крест. Герасим П. Бородич, с жалованьем 10 руб. за учебное время. Учащихся было 7 мальчиков. Законоучителем во всех четырех школах состоял местный свящ. Симеон Кушлянский.

В **Осовецком приходе** (1332 м. п. и 1400 ж. п.) — школа грамоты для мальчиков в заст. Рубежи, подвижная. Обучением в школе занимается ок. к. нар. уч. крест. П. Шпаковский, с вознаграждением 10 р. за учебное время. Учащихся в школе 8 мальчиков.

Школа грамоты в дер. Костешах в отч. г. закрылась за отказом крестьян ассигновать нужные средства на жалованье учителю, наем квартиры для школы и т. д.

В **Баценичском приходе** (1809 м. и 1811 ж. и.) — вновь открытая школа грамоты для мальчиков в д. Ольса, школа имеет свое собственное, но неудобное помещение. Обучением в школе занимается ок. к. нар. уч. крест. Тимофей Созонович, с жалованьем от общества в количестве 25 р. в зиму, а Закон Божий преподает местный свящ. Алексей Смолич, ок. к. Минской д. семинарии.

Существовавшая прежде школа грамоты в д. Устье в отчетном году закрылась, но в отчете по приходу об этом ничего не сказано.

В **Кличевском приходе** (1487 м. и 1557 ж.) — две школы грамоты для мальчиков: 1) Сушанская, открытая в 1884 году; школа имеет свое собственное, но неудобное для учебных занятий помещение. Обучением в школе занимается ок. к. нар. учил. крест. Василий Марков Дрень, с жалованьем 10 р. в зиму. Учащихся в школе 11 мал. 2) Бердская,— открытая в отчетн. году; школа помещается в наемной квартире. Обучением в школе занимается ок. к. нар. учил. крест. Сила Леон. Изох, с вознаграждением 6 р. в зиму. Учащихся в школе 2 мальчика (при населении дер. Бердо в 374 души!).

Существовавшая прежде в Кличевском приходе Стояльская школа грамоты совсем не упоминается в отчете свящ. Рункевича,— очевидно, она закрылась по каким-либо причинам.

В **Кобылянском приходе** (871 м. и 830 ж.) — церковно-приходская школа в сел. Кобылянка, открытая в 1884 году. Школа помещается в частной неудобной квартире. Обучением в школе занимается местный священник при помощи вольнонаемного учителя Семена Жуковского, получающего в год 20 р. вознаграждения. Учащихся в школе 28 мальчиков.

З легенд і паданняў Клічаўшчыны

Каганец Карусь. Пад гэтым псеўданімам тварыў Кастравіцкі Казімір Карлавіч, беларускі пісьменнік, перакладчык, мастак і скульптар. Нарадзіўся 29.1(10.2). 1868 г. у Габольску, куды бацька быў высланы за ўдзел у паўстанні 1863 года. У 1874 годзе бацькі Каганца вярнуліся на радзіму, пасяліліся ў вёсцы Засулле каля Стаўбцоў. Бацька неўзабаве памёр. З 6 да 11 гадоў Казімір быў пастушком. Калі маці выйшла замуж за селяніна, пераехалі ў Прымагілле (Яцкі) каля Койданава. У 1899 годзе, ажаніўшыся, Каганец асеў у Лісіных Норах каля Прымагілля. Тут і памёр 20.5.1918 г. Пахаваны недалёка — у Навасёлках.

Каганец вучыўся ў Мінскім гарадскім вучылішчы, у Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства. Навуку не закончыў. Служыў у чайной у Мінску, у мастацкай майстэрні ў Рызе, у Мінскім таварыстве дабрачыннасці, працаваў на будаўніцтве чыгункі ў Лідзе, быў лесніком на Ігуменшчыне (каля Клічава), настаўнікам маляванн ў Вільні, аканомам фальварка на Барысаўшчыне.

Прычына яго тулянняў — палітычная актыўнасць (быў адным з арганізатараў Беларускай сацыялістычнай грамады) і цяга да мастацтва. За агітацыю сярод сялян двойчы (у 1905—06 і 1910—11 гг.) сядзеў у мінскай турме (апошні раз у адной камеры з Якубам Коласам).

Каганец быў чалавекам шырокіх творчых інтарэсаў: пісаў вершы і апавяданні, п'есы, збіраў народную лексіку, маляваў, ляпіў з гліны, выразаў з дрва і косці. Ён прымаў удзел у стварэнні «Беларускага лемантара», напісаў «Беларускую граматыку» (не друкавалася), рабіў ілюстрацыі да кніг (вокладка да кнігі Я. Коласа «Другое чытанне для дзяцей беларусаў», 1909).

Паэзія Каганца моцна спалучана з народнымі песнямі, найперш рэкруцкімі і антырыгонніцкімі, прасякнута грамадскімі і нацыянальнымі матывамі (вершы «Кабзар», галоўны вобраз якога стаў цэнтральным у лірыцы аўтара, «На мабілізацыю», «Наша доля маладзецка», «Наш покліч», «Плач беларуса»). Ён апрацоўваў легенды і паданні, казкі, пісаў для дзяцей навукова-папулярныя нарысы.

Творы Каганца адлюстроўвалі найважнейшыя моманты гісторыі беларускага народа: дні старажытнага Полацка (апавяданне «Прылукі»); бітву на Нямізе славутага полацкага князя Усяслава Чарадзея (п'еса «Сын Даніла»); барацьбу палачанаў з крыжакамі (верш «Нёман»); змаганне з татара-мангаламі (драма «Старажовы курган»); вайну са шведамі («Вітаўка»); часы 17—18 стагоддзяў, калі «усё беларускае пайшло на здзек і паругу» з-за здрады паноў («Парада»). Мужнасць беларускага паўстанца ўславіў у вершы «Згадка пра Галубка». Героі твораў Каганца — людзі гордыя, моцныя духам. Такімі хацеў бачыць Каганец суайчыннікаў у пачатку 20 стагоддзя, калі пішло змаганне за права «людзьмі звацца». Актуальна гучаць гэтыя матывы ў яго творах і сёння.

Карусь Каганец.

Ніжэй змешчана некалькі яго твораў, сюжаты якіх навеяны пачутым на Клічаўшчыне. Яны друкуюцца па кнізе: Каганец К. Творы. Мн., 1979.

Забойства ў Пушчы

Па пушчы Дулебскай, у ясны дзень, калі млявае лісце на лесе пыша свежасцю і пахам, наводзячы чалавеку столькі гадак усялякіх, і цёплы веснавы воздух размарае яго шлункі прыятнаю млявасцю, і хочацца расцягнуцца дзе на галу на зялёнай мураўцы,— прабіраецца вядомыі яму сцежкамі дулеб, высокага росту, стройны, каравокі, з невялікаю чарняваю барадою, у белым летнім дулебскім насоўчыку, у сіняй з зялёным кантам шапцы, з гербам і бляхаю на рэмені торбы з лазовых лапак, катора вісіць у яго з левага боку, з калітою і нажом пры поясе і са стрэльбаю за плячыма. То ідзе стралец Жыцінскага абходу Дулебскага аб'езду, лясоў графа Патоцкага — Даніла Цадрык. Ён верна спаўняе сваю службу, да і на злосці нікога не падасць, як то часта у другіх стральцоў вядзецца, дый перад ляснічым падлізнікам не будзе.

Вот ён прабраўся праз балота на кладках, па каторых умеюць хадзіць адно палешукі, і выйшаў на голы бор, за каторым зачыналася цёмная старына, як бездна яка. Выбраў ён сабе месца на галу над векавым сталам, падзівіўся на муху божую, катора дужа іскавала ля дубовае сіці, што злева ўверсе, выняў з торбы хлеб і сала і расцягнуўся ў верасе, палажыўшы поплеч сябе стрэльбу, стаў рэзаць і спажываці. Перакусіўшы крыху, рэшту хлеба схаваў у торбу і, падпёршы ліцо рукамі, задзівіўся на пушчу. А у пушчы ціха-ціха ў палудзённу пору, спакойна так і велічава, і чуеш сябе панам у гэтае пушчы, дзе няма табе нрызначанае дарогі, ні платоў, ні абмежкаў. Чуеш поўну слабоду і здаецца б так і не выходзіў

з пушчы. Хіба згадаеш пра сям'ю, катора дома есці захоча, а як прыйдзе зіма, то і самога з пушчы холадам да голадам выжане. Так і Данілу думаецца аб дзецях, каторых ён так любіць. Мае ён сына Міхалку, падростка, і двух дачок яшчэ малых. Хацелася б яму падвучыць сына граматы, да нельга: раз — што ў Дулебах, у глухім сяле сярод пушчы, школы няма; другое — работу дома некаму рабіць, а тут і годы трудныя насталі...

І думкі яго панясліся ад будучага назад у прошлае. Прадсталі перад ім усе радасці і гора яго, і моладасць, і дзіцячыя годы яго. І мыслі яго так шыбалі і шыбалі што далей і далей, аж у той свет паляцелі, і вочы яго заплюшчыліся, і галава апусцілася да зямлі. І сняцца яму дзівы дзіўныя: як бы то ён перад сваім графам-пакойнікам стаіць, да і граф той як бы не граф, а якісь пан. І зіяе той пан якімсь светам дзіўным і ўвесь як бы празрысты, так што праз яго ён сваё сэрца бачыць, са ўсімі праграшэннямі, каторыя, пахадзя на тоненькія гадзючкі, і стараюцца джалам тое сэрца ўкалоць. І не можа ніяк згадаць, дзе ён пана таго бачыў, хоць здаецца, знаёмы. Дый то здаецца, не толькі вачыма яго бачыць, а чуе яго ўсімі шлункамі, і перапаўняецца яго душа невядомым дагэтуль чуццём — не то страх які, не то радасць,— і ад гэтага сільнага пачуцця праханіўся ён, а сэрца яго, як не выскачыць, так калоціцца.

Бачыць, і сонца ўжо дужа к заходу схілілася.І хацеў іці ён да хаты, да штось яго ў пушчу цягне, у тую старану, што за галам ляжыць і, здаецца ўніз дзесь зыходзіць. І хоць не хочацца яму туды іці, а ідзе.

Ідзе ён у подар, дзе ліпнёг слауны падняўся, і любуецца ён, расхінаючы высокія гладкія лінкі, каторыя мяккім сваім лісцем ласкочуць яго па ліцы. І такі душа яго дулебская не вытрывала, і супыніўся перад самым гладкім, папаўшымся яму ў вочы, лутком і ўжо ўзяўся за нож, штобы яго зрэзаць, як чуе з глыбі падару ціхі мяккі, знаёмы ўсім палешукам трэск, як бы хто лісце абшморгіваў. Забыў ён свайго лутка і, замкнуўшы нож, нячутнаю, спорнаю ступою пакраўся ў падар, бо пазнаў, што хтось лыкі дзярэ.

Прабраўся ён па гнілому калоддзі, па кранівах ды папаратніках, у каторых мясцамі ён утапаў з галавою, і, дайшоўшы старога дуба, з пакрыўленым падкуром, стаў і настаражыў вушы. Чуе — вот, вот за балоцінаю, паросшаю плюшчаем, касачамі і мячаўнікам, лыкі дзяруць. Ён акружыў балоціну і кінуўся ў гушчар, адкуль чуваць быў трэск.

Зараз падняўся гоман, затым хтось дзікім голасам крыкнуў, потым начуўся стогнат, а далей усё сціхла, толькі чутно было шэрах і трэск, як бы ўцякала двух або трох чалавек, да і то скора заціхла. І пушча зноў стаіць панява і маўчыць, як бы нічога не сталася там.

А сонца шораз ніжэй і ніжэй клоніцца — ухадзілася, бач, беднае, за ўвесь веснавы доўгі дзень, і яму пара спачыць. Вот прыляцеў глушэц на агромністу асіну і стаў набіваць сабе гарляк сочным асовым лісцем. Вот запішчала рабка, склікаючы сваіх куранятак, а вот ад рэчкі Жыцянкі пайшоў посвіст салаўя. А вот і сонейка, укутаўшыся чырвоным пакрывалам, зайшло на спачынак у сваю спачывальню. А дома Даніліха жджэ з вячэраю мужа. Жджэ і не дажджэцца, і думкі благія яе душу штось трывожаць. Забег позна вечарам да Даніліхі другі стралец дулебскага абходу, Сцяпан Слабко, і, пачуўшы ад яе, што Даніла яшчэ з лесу не прыходзіў, папытаўся яе супакоіць словамі: «Вот науда! Знаць, засеў на каго..., чы то пяршына стральцу ў лесе начаваць?» І пабег дадому.

Прайшла для Даніліхі трывожная ноч, а Данілы няма. Прайшла трывога к аб'ездчыку, к ляснічаму, к прыставу. Сабралі стральцоў, паліцыю, пагналі народу, пайшлі розыскі, а Данілы як няма, так няма. І не знайшлі яго тады, а толькі, як раз'ехалася паліцыя, арыштаваўшы некалькіх дулебцаў, пастух дулебскі знячэўку набрыў на безгаловага мярца, надбітага пад гнілую калоду, у каторым прызналі Данілу.

Прыехаў следавацель, доктар, паліцыя: саставілі пратакол і паехалі. Данілу пахавалі, арыштаваных павыпушчалі. Адміністрацыя тае меснасці назначыла дажывотную дапамогу Даніліне па 3 рублі ў месяц, а вінаватага такі не знайшлі.

Потым праз гадоў два на трэці як бы аказаўся вінаваты. За Маціевічамі жывуць шляхты Цвіркі, і раз, як падраліся, то адна Цвірчыха, выскачыўшы з хаты, уцякаючы ад мужняга брата, закрычала: «Што? Ты і мяне хочаш забіць, як Данілу?». Суседзі пачулі, падказалі: тых Цвіркаў пабралі, да нічога не дайшоўшы, бо тая Цвірчыха стаілася, адпусцілі іх. Так яно і засталося.

Забойства Захаркі

У пагодны асенні дзень пад вечар вярталіся сяляне сяла Усакіна з гораду, куды вазілі лапаты ад купца Бермана. Якраз то было перад пакровамі.

Не даяджаючы дому, прыпыніліся ў суседнім сяле Суша, ля Абрама... Выпілі па чарцы, закурылі люлькі і давай ганяць друг дружка ехаць, штобы за сонцам дома стаць. Забавіўся адзін толькі Захарка з роду Шалойкаў, заклятых ворагаў другога роду ўсакіньскага, па прозвішчы Зайцоў. Быў то чалавек вялікага росту, рабаліцы, з рэдкаю русаю бародкаю, на нагах падгалы, у плячах шырокі і крыху прыгнуўшыся, быў ён трохі выпіўшы, і хоч брат яго Марка, чалавек відны, каравокі, з шырокаю чмараю барадою, з ліца гарны, хоч крыху рабаваты і ганяў ехаць, та ён не паслухаў і застаўся з сушскімі сялянамі набалакаць і з Абраміхаю паспірацца. Не паслухаў ён брата і не вярнуўся болей да хаты, хоч з Сушы да Усакінь усяго пяць вёрстаў. Толькі ўжо добрым сумаркам усакіньскі смоляр чуў, як у бродзі, што Вязнем завецца, як бы хтось прасіўся і называў па імені.

Назаўтра ў рэчцы Ваданосцы, чы бок, як тамашнія сяляне яе называюць, Гэньцы, у памяць адной яўрэйкі Гэнькі, знайшлі усакіньскія дулебы каняшыну з цялежкамі стаячую, скубучы траву на беразе, і пад перавернутаю драбінаю цела мёртвага Захаркі з перакручаным каркам і адну бутэльку гарэлкі занячатану, а другую да палавіны выпіту. Пайшло следства: прыехаў станавы са стражнікамі і ўраднікам, доктар і п'яны следавацель.

Рэзалі Захарку, нічога ў ім не знайшлі, адно доктар, дзівячыся на Захаркаву печань і лёгкія, сказаў:

— Колькі жыў на свеце і што перарэзаў мярцоў, а такога здаровага чалавека не бачыў.

Арыштавалі двох Зайцоў — Амельяна і Есіпа, быўшых стральцоў графа Патоцкага, адно па старанню знамянітага атамана канакрадаў Яникеля, што жыве ў тым жа сяле, іх у скорым часе выпусцілі пад залог, і ўсё сціхла.

Раз толькі доўскі ўраднік, спаткаўшы стральца Андрэя ў варотах аб'ездчыка хаты, засмяяўся і кажа:

— Ну што, Андрэй, прапаў Захарка? І дзела яго прапала? Але і грошай багата прапала!

Засмяяўся і паехаў.

1909 г.

Сцяты камень

Засвітала раніца
После веснавое ночы,
Князь дулебаў, сам Кумар,
Праціраe сосну вочы.
І, накінуўшы кажух,
У поле выйшаў падзівіцца,
Свежым ветрам веснавым
Сосну крыху асвяжыцца.
Разам стаў
І знак даў,—
Баярына клікнуў:
— Хадзі сам,
Глянь во там!
І на тор падмігнуў:
— Пазнай, вою дазпаны,
Хто тут след вось той пакінуў,
Дзе ён сам, той чужанін?
Дакуль з'ехаў, дзе ён згінуў?
Неспакоен гэтым я:
Ці не вораг нас цікуе,
Ды знячэўку хіба нас,
Наляцеўшы, збіць мяркуе?..
Прайшоў ветах,
Маладзік,
Повен месяц засвяціў.
Ясна, цёпла;
Вецярок
У полі пылам закурыў.
Страх дулебаў ціхіх зняў,
Бо шчэ ўбачылі здалёку,
Што падняў бой люты Гуд,
Сам наперад з агнём у воку.
Добра сэрца меў Кумар:
Смерць ад люду каб звярнуці,
Выйшаў к Гуду сам адзін,
Штобы Гуда супыніці.
Бой прыняў
Сам-насам
З Гудам дый на грудзе:
У мечы тнуць,
Іскры б'юць.
Чый той верх там будзе?
Ой, заўзяты бой вядуць,
Князям рукі ўжо памлелі,
Сабе спуску не даюць,
Хоць з труду саўсім счарнелі.
Славы траціць Гуд не хоча,
З нічым да хаты ад'яджаць.
За другіх Кумар баіцца,
Каб іх у палон не аддаць.
Чуць жывуць,
А ўсё тнуць,
Той махнуў, той шахнуў;
Гуд сабраў
Усю моц
І мячом узмахнуў.
Кумарова галава
На зямлю пакаціласа
Ды праява дзіўная
Над імі прылучылася:
З заўзятасці абодвы
Зысці з месца не маглі,—
Пазастылі бо князі
Як першы, так другі
І Кумар
Ды і Гуд
Разам скамянелі.
Многа лет,
Знае свет,
З тых пор праляцелі.
Ольса-рэка, як тады,
І цяпер там працякае
Ды ў Бярозу, у раку,
Сіву ваду заганяе;
Кучаравы лес стары
Звесіў галаву і ціха
Малітву шэпча за іх,
Як дзед... А нам друго ліха.
.....
1907 г.

ВЯЛІКІ ПЕРАЛОМ

У трывогах і надзеях пачыналася 20 стагоддзе. Але параўнальна імклівае эканамічнае развіццё Беларусі ў пачатку стагоддзя мала закранула жыхароў лясіста-балотнага Клічаўскага краю і амаль не змяніла да лепшага становішча сялян. Былі, вядома, заможныя гаспадаркі, якія за кошт выкарыстання простых машын і лепшай агратэхнікі набіралі моцы. Павялічвалася і багацела ад бізнесу новая праслойка дробных прамыслоўцаў, гандляроў, пазыкоўцаў. Доля ж пераважнай большасці вяскоўцаў заставалася гаротнай. Вузкія палоскі зямлі-няўдобніцы давалі такія мізэрныя ўраджаі, што сялянскім сем'ям свайго хлеба не хапала да вясны. Невыпадкова на Клічаўшчыне бытавала сумная прыказка: «Прыехаў у Гончу — хлеб кончыў, прыехаў у Драні — хлеба ані». Галеча тутэйшых жыхароў кінулася ў вочы члену Дзяржаўнай думы К. Т. Мрачкоўскаму. «У Ігуменскім павеце,— адзначаў ён,— сяляне паўжабрацкія, галодныя. Хаты з саламянымі стрэхамі, ёсць нават накрытыя мохам і травой. Сялянскія хаткі нічым не адрозніваюцца ад хлявоў для жывёлы, хіба што толькі некалькімі адтулінамі ў сценах, што называюць вокнамі, але яны ў большасці без шкла, закрытыя старымі анучамі». 82 % мясцовага насельніцтва ў 1913 г. не ўмела чытаць і нісаць.

Подых рэвалюцыі

Недзе там, па Еўропе, ужо даўно блукаў прывід камунізму. Пад канец 19 стагоддзя ён перасягнуў межы Расіі і ўпэўнена узяў крок па яе тэрыторыі. На Клічаўшчыне, радзіме Ігната Грынявіцкага, дзе яшчэ чулася рэха таго векапомнага царазабойнага выбуху, ідэі свабоды, роўнасці і братэрства знаходзілі спрыяльны водгук у сэрцах людзей. Невыпадкова, калі на Беларусі пачалі стварацца сацыял-дэмакратычныя арганізацыі і гурткі, узнік такі гурток у 1905 г. і ў Бацэвічах. Кіраваў ім рабочы з Бабруйска Гарэлік. Гурткоўцы прапагандавалі сацыял-дэмакратычныя ідэі і рыхтавалі сялян да барацьбы супраць памешчыкаў. У 1906 г. гурток быў выкрыты, а яго члены (вядомы толькі Васіль Прорвіч і Якаў Хруцкі) арыштаваны.

Актыўна ўдзельнічалі нашы землякі і ў першай рускай рэвалюцыі 1905—07 гг. Нават пасля яе паражэння ў цяжкія гады рэакцыі на Клічаўшчыне барацьба працягвалася. Сяляне адмаўляліся ўдзельнічаць у выбарах у 2-ю Дзяржаўную думу, падпальвалі памешчыцкія будынкі, пасвілі жывёлу на угоддзях памешчыкаў. У верасні 1908 г. у данясенні начальніка Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення засведчана, што ў памесці Усохі інжынера Доманцава згарэла збажына ў снапах, але падпальшчыкі не злоўлены. Зімой 1912 г. жыхары в. Віркі падпалілі будыніну з неабмалочанымі снапамі памешчыка Незабытоўскага, сяляне в. Бярозавае Балота захапілі землі памешчыка з суседняй Любоніцкай воласці, у Клічаве ўзламалі замкі на свірнах памешчыка Рабіновіча і забралі муку, разбілі плаціну вадзянога млына памешчыка Патоцкага, спалілі шклозавод.

Гэта пазней, праз 7 з лішнім дзесяцігоддзяў, калі на нашым шляху, высвечаным прывідам камунізму, пачаліся крызісныя выпрабаванні, у многіх узніклі пытанні: а ці правільна рабілі з самага

пачатку? Ці трэба было наогул такая ачышчальна-спусташальная віхура — рэвалюцыя? Чаму аб'явілі вайну палацам і мір хібарынам? Можа, як заўважыў паэней Ф. Шалянін, трэба было наадварот — руйнаваць не палацы, а хібарыны і на іх месцы ствараць дастойныя чалавека жыццёвыя ўмовы? І, нарэшце, ці патрэбна была такая непрымірымая класавая варожасць, што ўзняла брата супраць брата, бацьку супраць сына, народ супраць народа? Вядома, зараз наконт гэтага можна спрачацца, рабіць аналізы, прыводзіць аналогіі. Тады ж панаваў адзіны парыў, спароджаны адзіным усведамленнем, што варта знішчыць эксплуататараў-крывасмокаў — і настане царства свабоды, адчыняцца дзверы ў казачнае ўсеагульнае працвітанне. З гэтай верай у сэрцах натхнёна спявалі: «Увесь свет насілля мы зруйнуем да аснавання, а затым...» І неадольна ішлі да мэты.

Вестка, што ў лютым 1917 г. ў Петраградзе скінута самадзяржаўе ў Расіі, была з уздымам сустрэта на Клічаўшчыне. У знак падтрымкі рэвалюцыі ў Клічаве адбыўся мітынг працоўных. Гэта падзея акрыліла людзей, надала ўпэўненасці, натхніла на новыя рашучыя дзеянні. Вядома, напрыклад, што крыху пазней — у жніўні 1917 г.— сяляне Даўжанскай воласці рэквізавалі вадзяны млын у графа Патоцкага.

Так што зерні Кастрычніцкай рэвалюцыі ўпалі тут не на абложную, а на падрыхтаваную глебу. Пра гэта сведчыць і вынік сходу ў Клічаве, дзе вырашалася пытанне аб устанаўленні Савецкай улады. За спіс бальшавікоў прагаласавалі 443 чалавекі, за эсэраў — 37, за кадэтаў — 13. У хуткім часе тут быў створаны атрад Чырвонай гвардыі. Пад канец лістапада 1917 г. паўсюдна на тэрыторыі раёна дзейнічалі Саветы сялянскіх дэпутатаў.

У вёсках Бацэвіцкай, Свіслацкай, Бродзецкай і Даўжанскай валасцей былі створаны рэўкомы. У Бацэвіцкі ВРК, напрыклад, увайшлі Кніга (старшыня), члены камітэта Белакурскі, Мікуліч, Пінчук, Шадура. Рэўком адразу ж пачаў дзейнічаць. Частку зямель памешчыка Незабытоўскага, а таксама зямлю царквы падзялілі паміж бацэвіцкімі сялянамі. На астатняй зямлі стварылі саўгас імя К. Маркса, якому перадаваліся цагельны і лесапільны заводы. Першым дырэктарам саўгаса стаў Каршуноў. У час падзелу зямель памешчыкаў і царквы каля Бацэвічаў узніклі невялікія пасёлкі Культура і Вялікае Ляда.

У снежні 1917 г. Бацэвіцкі, Свіслацкі, Бродзецкі і Даўжанскі ВРК падрыхтавалі

Удзельнікі грамадзянскай вайны М. П. Курыльчык (злева) і У. А. Карнееў, узнагароджаныя ордэнам Чырвонага Сцяга.

і правялі выбары ў Саветы сялянскіх і рабочых дэпутатаў і перадалі ўладу іх выканкомам. Саветы, як найвышэйшы орган гаспадарчага і адміністрацыйнага кіравання ў валасцях праводзілі значную работу: бралі на ўлік маёнткі і сядзібы памешчыкаў, землі памешчыкаў перадавалі беднякам і батракам, вялі рашучую барацьбу супраць спекулянтаў, марадзёраў, пагромшчыкаў. Устанаўленне рэвалюцыйнага парадку ўмацоўвала давер насельніцтва да Савецкай улады. Да таго ж у валасцях было ўведзена бясплатнае навучанне. Усё гэта падтрымлівалі шырокія масы працоўнага сялянства. Напрыклад, у снежні 1917 г. сяляне Даўжанскай воласці на сваім сходзе выказалі падтрымку Савецкай уладзе і гатоўнасць абараняць яе заваёвы.

Але першыя крокі Савецкай улады былі прыпынены кайзераўскай Германіяй, якая 18 лютага 1918 г., парушыўшы дагавор аб перамір'і, пачала наступленне і заняла Беларусь аж да Дняпра. Маленькі лясны пятачок зямлі Беларусі — Клічаўшчына — перажываў даволі цяжкія дні. Хоць у сакавіку 1918 г. патрыятычнымі сіламі дэмакратычнага кірунку і была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка, акупацыйныя сілы дыктавалі свае жорсткія правілы паводзін і жыцця.

Нарэшце, восенню 1918 г. захопнік быў выгнаны з нашай зямлі. За час кароткай перадышкі адбылося шмат важных падзей. 1 студзеня 1919 г. створана Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка. Былі скасаваны рэўкомы. Саветы зліліся з камітэтамі беднаты і сталі паўнаўладным органам кіравання. Апіраючыся на падтрымку шырокіх мас, яны паспяхова вырашалі складаныя задачы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Але мірнае стваральнае жыццё зноў

было перапынена — на гэты раз інтэрвенцыяй з боку Польшчы, войскі якой у жніўні 1919 г. занялі тэрыторыю Беларусі да Бярэзіны. Тэрыторыя Клічаўшчыны апынулася ў франтавой зоне, тут ішлі ўпорныя баі паміж 16-й арміяй Заходняга фронту і 4-й польскай арміяй. У маі 1920 г. войскі Заходняга фронту перайшлі ў наступленне, і польскія акупанты адступілі. На вызваленай тэрыторыі Беларусі пачалося адраджэнне Савецкай улады. Праўда, працягвала шугаць полымя грамадзянскай вайны. Жыхары Клічаўскага раёна помняць імёны сваіх землякоў, што прымалі ўдзел у гэтай вайне, а таксама ў барацьбе супраць замежнай інтэрвенцыі. Гэта М. Ф. Ананіч з в. Люціна, П. А. Арбузаў з в. Ядраная Слабада, І. В. Вавілаў, А. В. Данільчык і М. А. Койпіш з в. Нясята, М. К. Доўгі з с. Кабылянка, П. Р. Ізмер з в. Коўбча, М. К. Ільінчык і П. І. Ільінчык з в. Асавы, І. Н. Кавалёў і М. Ф. Кавалёў з в. Віркаў, Р. В. Касцюкевіч з в. Дуброва, Е. С. Марычаў і В. П. Шэх з в. Доўгае, І. І. Саўчанка з в. Пад'яблынька, І. Г. Сазанавец з в. Малая Вольса, В. Ф. Харлап з в. Зарэчча, І. А. Чарэйчык з в. Вусце, М. М. Шамаль з в. Маркаўшчына і многія іншыя. А жыхары Клічаўшчыны У. А. Карнееў з в. Новы Куцін і М. П. Курыльчык з в. Новае Сяло ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

На новы лад

Скончылася вайна. Многія з жыхароў Клічаўшчыны загінулі на яе вогненных дарогах. А тыя, хто застаўся жывы, вярталіся да родных хат, каб неадкладна ўзяцца за справу. Клопату было многа. За перыяд вайны і ваеннай інтэрвенцыі плошча пад пасевамі значна скарацілася, меншай стала і ўраджайнасць. Вёскі былі разрабаваны акупантамі. У сялян не хапала самага неабходнага — хлеба, солі, абутку, вопраткі. Але трэба было не толькі аднаўляць разбуранае, а і адначасова пераходзіць на новы лад жыцця, перабудоўваць, псіхалагічна пераадольваць саміх сябе.

У канцы 1920 г. Бацэвіцкі, Свіслацкі, Бродзецкі і Даўжанскі рэўкомы былі пераўтвораны ў валасныя выканкомы, у склад якіх уваходзілі сельсаветы. Апіраючыся на мясцовы актыў, сельскія Саветы спрыялі ўсталяванню новых адносін у вёсцы, праўда, звестак пра гэта ўсталяванне захавалася мала.

У Клічаўскім музеі знаходзіцца абкладны ліст № 1575 на харчпадатак селяніну С. Ф. Сямашку з в. Анатольеўка Бацэвіцкай воласці на 1922—23 гг. У яго зарэгістравана 4 дзесяціны ворнай зямлі, 1,5 дзесяціны сенажаці, 2 галавы буйной рагатай жывёлы, 2 авечкі. За ўсё належала здаць у лік харчпадатку 26 пудоў 29 фунтаў збожжа. Гэта адносна невялікі падатак.

На свае вельмі абмежаваныя сродкі новая ўлада пашырала сетку аховы здароўя. У 1922 г. у Клічаве быў адкрыты фельчарска-акушэрскі пункт. Ёўдакія Піліпаўна Шамко з в. Рэчкі Ігуменскага павета, якая тады працавала тут, пісала пазней у сваіх успамінах:

«Мне даводзілася абслугоўваць не толькі клічаўчан, але і жыхароў навакольных вёсак. Цяжкі гэта быў час, працаваць даводзілася амаль кругласутачна. Ратавала мяне толькі тое, што была я маладая, энергічная, поўная жадання дапамагчы людзям. Клічаўшчыну я вельмі добра вывучыла, бо давялося бываць у кожнай вёсцы, дзе на конях, а дзе і пехатой. А выклікалі мяне толькі ў самых складаных выпадках, калі мясцовыя «лекары-самавукі» нічога не маглі зрабіць.

У 1924 г., калі быў створаны раён, стала крыху лягчэй, бо ў Клічаве паводле рашэння выканкома адкрылі ўрачэбны пункт, куды прыслалі доктара. Хворых, якім патрабавалася стацыянарнае лячэнне, мы дастаўлялі ў Бацэвіцкую бальніцу. Гэта не так проста было зрабіць, бо моста цераз раку Ольса не было.

Памятаю, як часта даводзілася дабірацца да якой-небудзь вёсачкі ноччу, праз лес, у непагадзь, па бездарожжы. Самае страшнае, што ў той час у лясах дзейнічалі банды, быў нават выпадак нападзення на міліцыянераў. Дарэчы, ніводнага разу за ўсе дзевяць гадоў, што я ездзіла па раёне, мяне ніхто не спыніў у дарозе. Але на ўсякі выпадак вазніцы бралі з сабой сякеры, а некаторыя — зброю. На шчасце ўсё гэта не спатрэбілася, хаця страху я нацярпелася... Працавала я тады і за медэксперта, калі міліцыя знаходзіла трупы».

Так, вялікая вайна скончылася, але вайна мясцовая прадаўжалася — вайна былога, усталяванага стагоддзямі,— з новым, што насаджалася цвёрда і бязлітасна, часам без уліку жадання і волі людзей. Адны падтрымлівалі новую ўладу. Другія, хоць і нехаця, але пакорліва падпарадкоўваліся, а трэція не хацелі мірыцца і браліся за зброю, змагаліся за сваё. І над афіцыйна мірнай Клічаўскай зямлёй гучалі стрэлы, адбываліся дывэрсіі, гінулі людзі.

Рэвалюцыйны рэжым бязлітасна караў бунтароў — «ворагаў працоўных», рашуча наводзіў парадак, адначасова ажыццяўляючы свой наступ бадай што ва ўсіх сферах жыцця. Найперш барацьба вялася за душы людзей, і ў ёй найбольшае значэнне надавалася адукацыі. Побач з пашырэннем сеткі школ стваралася сістэма пунктаў ліквідацыі непісьменнасці. Вось што паведамлялася ў справаздачы аб рабоце Ваевіцкага лікпункта ад 28 снежня 1924 г.: «Праведзена рэгістрацыя няграматнага насельніцтва, колькасць якога складае 45 чалавек. Рэгулярна наведваюць школу 25—30 чалавек ва ўзросце 15—22 гадоў. Заняткі пачаліся 25 лістапада бягучага года. За кошт навучэнцаў нанята памяшканне, ацяпленне і асвятленне якога таксама робіцца за іх кошт. Імі зроблены 9 лавак. Заняткі вядуцца кожны вечар па чытанню, пісьму і арыфметыцы, адна гадзіна прысвячаецца палітыцы. Акрамя гэтага пры лікпункце створаны палітгурток, заняткі на якім вядуцца па палітграмаце Яраслаўскага. Арганізавана ячэйка МОПРА, якая налічвае 15 чалавек. Бацэвіцкая хата-чытальня выдала нашай бібліятэцы 60 брашур і 5 часопісаў, якія выдаюцца чытачам на рукі дахаты. Арганізавана таксама ячэйка камсамола ў складзе 8 чалавек. На студзень для ячэйкі выпісаны газеты: «Звязда», «Беларуская вёска», «Малады араты», «Чырвоная змена» і «Беднота». Ячэйка адзначыла 6-ю гадавіну камсамола Беларусі».

Акрамя лікпунктаў, дзейнічалі хаты-чытальні, чырвоныя куткі, сельскагаспадарчыя гурткі, камсамольскія ячэйкі. У барацьбе за «новага чалавека» душылася ці пад корань знішчалася ўсё, што перашкаджала гэтай справе. У першую чаргу тут даставалася «опіуму народа»: руйнаваліся храмы, прыцясняліся вернікі, ганьбіліся народныя абрады, звычаі і г. д. І, вядома ж, ухваляліся, уздымаліся на шчыт славы стойкія, нязломныя барацьбіты, для якіх класавыя інтарэсы вышэй за ўсё самае святое, нават сваіх бацькоў. Так, і на Клічаўшчыне былі свае «Паўлікі Марозавы». Ніжэй ва успамінах былога актывіста вы можаце прачытаць пра камсорга, які атэістычную кампанію ў раёне распачаў з крытычнага допісу ў газету на сваю родную маці за тое, што яна адзначала дзяды.

Што ж, гэта быў час вялікага сацыяльнага рамантызму. Думалася, што адным махам можна перакроіць, перайначыць усё, што складвалася, набывалася стагоддзямі.. Толькі вось зараз на той жа клічаўскай зямлі зноў адбудоўваюцца храмы, ствараюцца этнаграфічныя ансамблі, адбываецца вяртанне да абрадаў і традыцый сваіх продкаў. Але, на вялікі жаль, многае з бясцэнных скарбаў рарода назаўжды страчана пад няўмольным наступам дыктатуры пралетарыяту.

Тым не менш новы лад жыцця ўсё глыбей пускаў карані, пераўтвараючы рэчаіснасць.

ШТО НІСАЛА ПРА КЛІЧАЎСКІ РАЁН БАБРУЙСКАЯ АКРУГОВАЯ ГАЗЕТА «КАМУНІСТ» У 1925 ГОДЗЕ

ПРАЦУЕ... ТРАКТАР!

Саўгас імя Карла Маркса Клічаўскага раёна набыў новы трактар. Прыехалі на ім з чыгуначнай станцыі і спынілі на плошчы у саўгасе. Дзень быў святочны. З самай раніцы тоўпіліся тут людзі, заглядвалі пад колы, у матор, спрабавалі рукамі сталёвага каня.

І пайшлі здагадкі. Адны сцвярджалі, што ён дзесяць пудоў газы спаліць у суткі, другія — што ён зусім не будзе араць, трэція — што з трактара хлеба не есці і г. д.

Прыйшлі паглядзець на дзіва і сяляне з суседніх вёсак. Іх водгукі былі яшчэ горшыя, чым мясцовых жыхароў. Але вось настаў час, і механік накіраваўся араць у поле.

Мясцовы механік быў мала знаёмы з трактарам, і той працаваў няўдала: то спыніцца, калі плуг зойдзе глыбока, або колы у зямлі завязнуць, ці то ў маторы няспраўнасць. Многія сяляне не хавалі радасці, што іх сцвярджэнні апраўдваюцца.

Але вось прыехаў трактарыст. Паглядзеў рукавік і ўсміхнуўся. Дзе змазаў, дзе падцягнуў гайку, разагрэў матор і пайшоў гуляць на трактары па саўгаснай плошчы. А потым загадаў паказаць самую цвёрдую глебу.

Яму паказалі. І пайшоў працаваць трактар, толькі дым хмарай ды барозны мільгаюць.

Зараз трактар за 8 гадзін узорвае 3 дзесяціны глебы з адным чалавекам, спальваючы пры гэтым каля 3 пудоў газы. У дзень, такім чынам, ён замяняе 9 чалавек і 9 пар коней.

Вось цяпер сяляне і паверылі, што трактарам можна араць добра, на любой глебе і з эканоміяй.

Селянін.

24 чэрвеня.

БАТРАКІ АРГАНІЗОЎВАЮЦЦА

26 ліпеня ў Клічаве адбылася раённая канферэнцыя батракоў. На канферэнцыю прыбыло 60 дэлегатаў. У іх ліку было 14 дзяўчат-батрачак. Канферэнцыя праходзіла з уздымам і вялікім ажыўленнем. Многія дэлегаты выказаліся па справаздачнаму дакладу батрачкома. У словах выступленняў бачна было жаданне выказаць удзячнасць Савецкай уладзе і Камуністычнай партыі

за клопаты аб батраках. Праведзены перавыбары батрачкома. Выбраны 5 чалавек, з іх 3 мужчыны і 2 жанчыны. Пасля канферэнцыі быў арганізаваны абед з музыкай і фатаграфаваннем. Па месцах жыхарства батракі разышліся з добрым настроем, адчуваючы, што ўсюды ім цёплы прыём. Дзякуючы паспяховай рабоце раённага камітэта партыі і прафарганізацыі сярод батракоў, у гэтым годзе назіраецца рост іх актыўнасці. Раней жа, яшчэ летась, батракі нават пазбягалі рэгістрацыі. Зараз гэта з'яўляецца рэдкім выпадкам.

Селькор.

9 жніўня.

ПАДРЫХТОЎКА НАСТАЎНІЦТВА

Вечарам 6 жніўня пачалі працаваць раённыя курсы настаўнікаў, на якія з'ехаліся 44 слухачы. На курсах існуе некалькі гурткоў. Пры курсах працуюць дзве групы практычнай школы. Да завяршэння курсаў кожны слухач можа даць практычную лекцыю. Усе слухачы добра адносяцца да працы на курсах. Ёсць вялікая зацікаўленасць да комплекснай сістэмы, беларусазнаўства, грамадазнаўства.

У наступным вучэбным годзе наша настаўніцтва будзе лепш падрыхтавана, чым у мінулым.

30 жніўня.

У новай улады было ўсё больш прыхільнікаў, асабліва сярод моладзі. Пашыралася спаборніцтва. Працоўны энтузіязм ператвараўся ў адзін з магутных эканамічных фактараў. Як і ўся Беларусь, Клічаўскі раён, створаны ў 1924 г., паступова пераадольваў разруху. У сярэдзіне 1929 г. на базе дробных, раскіданых па раёне вытворчых прадпрыемстваў быў арганізаваны райкамбінат, у які ўвайшлі піларама ў Клічаве, цэх ганчарных вырабаў у Бацэвічах, паравы і вадзяны млыны ў в. Доўгае і інш. У 1930 г. на іх працавала да 25 чалавек, усе работы выконваліся ўручную. У 1936 г. ў склад камбіната ўключылі торфазавод імя 1 Мая ва ўрочышчы Розвань паблізу Клічава. У гэтым жа годзе на камбінаце ўстанавілі электрагенератар, які даў электрычнае святло камбінату і Клічаўскаму раёну. Асобныя вытворчыя аперацыі, што выконваліся раней уручную, былі механізаваны.

У 1932 г. на базе Бацэвіцкага, Даўжанскага, Каўбчанскага, Таценскага і Убалацкага лесапунктаў быў створаны леспрамгас з цэнтрам у Клічаве. Валка дрэў і іх апрацоўка вяліся ўручную, на гужавым транспарце лес падвозілі да чыгункі, а таксама да сплаўных рэк Бярэзіны і Ольсы. У 1935—38 гг. на лесанарыхтоўцы з'явіліся аўтамабілі.

У 1931 г. каля Клічава пралажылі чыгунку Асіповічы — Магілёў. На тэрыторыі раёна пачалі дзейнічаць станцыі Тачанка, Нясета, Стаялава, Вонічы, Мілое.

Да пачатку масавай калектывізацыі ў раёне хоць і не вялікі, але быў вопыт арганізацыі калектыўных гаспадарак. У 1919 у былым панскім маёнтку в. Бацэвічы была створана сельскагаспадарчая арцель батракоў. Такія ж батрацкія арцелі ў в. Нясяты, Пярэкаль і інш. Пазней на базе гэтых арцелей у Бацэвічах і Нясяце арганізаваны першыя саўгасы. У 1924 у раёне былі створаны таксама 4 калгасы: у вёсках Бацэвічы (15 гаспадарак), Кабылянка (3), Максімавічы (8), Дуброва (16). У 1927 г. ў пасёлках Культура і Вялікае Ляда ўтворана таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі, якое праз 2 гады пераўтворана ў калгас «Культура».

Масавая калектывізацыя пачалася ўвосень 1929 г. Гэта быў, як трапна падмеціў пісьменнік Платон Галавач, сапраўдны «сполах над загонамі», кульмінацыйны пункт таго вялікага сацыяльнага пералому, на які адважыліся бальшавікі. Да гэтага пасля Кастрычніка экспрапрыраваліся «буржуйскія», памешчыцкія і царкоўныя набыткі. З арганізацыяй калгасаў трэба было развітацца са сваім, здабытым крывёй і потам — з конікам, кароўкай, інвентаром, насеннем. Было тваё, а сабралі ўсё на агульны двор — і ўжо не тваё, наша. Пайсці селяніну на такое было неверагодна цяжка. Але калі меркаваць па тэмпах калектывізацыі, то сяляне «зразумелі» мудрую сталінскую палітыку сацыяльнай перабудовы вёскі і падтрымалі яе актыўным уступленнем у калгасы.

Так, на пачатку было і добраахвотнае аб'яднанне вяскоўцаў, пераважна збяднелых, у сельскагаспадарчыя арцелі. Але ў асноўным жа каапераванне вёскі адбывалася пад вялікім прымусам. Тых, хто вагаўся ці ўпарціўся, абкладалі непамерна вялікім падаткам, страшылі зброяй, арыштамі. Ну, а самых няскораных разам з «кулацкімі элементамі» аб'яўлялі ворагамі народа і рэпрэсіравалі. Цяпер мы ведаем, што ў Сібір і на Салаўкі выслалі самых руплівых, самых дбайных гаспадароў. Ведаем і тое, што на чале многіх калгасаў сталі людзі, якія не мелі аніякага гаспадарскага вопыту. Таму і калгасы былі розныя паводле эканамічнага ўзроўню: адны — на мяжы развалу, а іншыя — набіралі моц, дасягалі нядрэнных на той час вынікаў.

Дзеля справядлівасці варта зазначыць, што дзяржава актыўна дапамагала калгасам тэхнікай, спецыялістамі, насеннем, нлемянной жывёлай. Але адначасова і абдзірала іх, як ліпку, вымятаючы са свірнаў нават насенны фонд.

Усё гэта перажыла і Клічаўшчына. Адным з першых у раёне восенню 1929 г. у в. Вусце створаны калгас «Бальшавік» (першы старшыня П. Д. Коўрык). Затым арганізаваны калектыўныя гаспадаркі ў вёсках Ельніца (старшыня П. П. Кірылёнак) і Клічаўскія Пасёлкі (старшыня Ф. Русецкі), калгас «Абуджэнне» ў в. Заборкі і інш. Усяго ў 1929 г. ў раёне было створана 25, у 1930 г.— 35, у 1931 г.— 29, у 1932 г.— 16, у 1933 г.— 10, у 1934 г.— 8 калгасаў. На пачатак Вялікай Айчыннай вайны ў раёне было 99 калгасаў.

Ствараліся і саўгасы. Адзін з іх, як ужо адзначалася, дзейнічаў у Бацэвічах, астатнія — у вёсках Нясята, Развадава, Падгор'е, Аляксандраўка і Востраў.

Што ж сабой уяўлялі калектыўныя гаспадаркі таго часу?

Вядома, напрыклад, што ў в. Вусце першы надаў заяву ў калгас І. Петрукевіч. За ім пайшлі яшчэ 14 сем'яў. Сваё існаванне калгас пачынаў з 20 кароў, 50 авечак і 10 коней. А напярэдадні Айчыннай вайны тут было 115 кароў і 130 коней.

Ладзіліся справы ў калгасе «Абуджэнне», пра які ведалі і за межамі раёна. У 1935 г. гэтай сельгасарцелі першай на Клічаўшчыне ўручаны «Акт на вечнае карыстанне зямлёй». Тут актыўна вялося будаўніцтва, працавалі электрастанцыя, грамадская лазня. Ды і ўраджай збіралі нядрэнны, было што даваць і на працадні. (Гл. таксама асобны артыкул «І назвалі калгас «Абуджэнне»).

Многае для ўмацавання эканомікі калгаса рабілася ў Наталоўскім нацыянальным польскім сельсавеце. У справаздачы за 1933 г. адзначалася: «У калгасе «Чырвоны май» пабудаваны 2 скацінныя двары, канюшня, свіран; у калгасе «Калектывіст» пабудаваны 2 хлявы, 3 жыллёвыя памяшканні; у калгасе «Кастрычнік» уведзена ў строй канюшня; у калгасе «Анатольеўка» пабудавана памяшканне для жывёлы... У асобных калгасах («Калектывіст», імя Мархлеўскага) на працадзень выходзіць зерневых на 7 кілаграмаў, бульбы — 17 кілаграмаў. З маючыхся па сельскаму Савету 20 бескароўных калгаснікаў 17 надзелены каровамі».

Але большасць калгасаў былі эканамічна слабымі. Не было воныту калектыўнай работы, не хапала кваліфікаваных кадраў. Таму нярэдка гаспадаркі распадаліся, а няўмелая работа спецыялістаў расцэньвалася як шкодніцтва. Прыкладам можа быць гісторыя калгаса ў в. Гонча «Шлях Кастрычніка», які з першых дзён узначаліў Васіль Мікалаевіч Кардымон. Праіснаваўшы зусім нядоўга, калгас распаўся. Пачалося расследаванне. Ноччу прыехала спецыяльная машына, забрала каля 20 былых калгаснікаў з вёсак Гонча, Халадок, Драні. Толькі адзін з іх праз многа гадоў вярнуўся дадому, астатнія загінулі дзесьці ў Сібіры.

А вось звесткі са справаздач пра дзей-

Камсамольская арганізацыя Клічава. 1926.

1-ы выпуск Нясяцкай сямігадовай школы. 1933.

насць саўгасаў. У саўгасе імя К. Маркса, створаным у Бацэвічах на землях памешчыка Незабытоўскага, у 1920 г. было 580 га зямлі, з іх 400 ворнай. У 1931 г. зямельная плошча саўгаса павялічана да 1000 га за кошт далучэння да яго калгаса «Культура» і арганізацыі фермы на хутары Новы Спор Усохскага сельсавета. З 1930 г. ён спецыялізаваўся на свінагадоўлі. «Ёсць 302 свінні і 6 кныроў (завезены з Германіі), 46 коней, 93 каровы, 3 быкі-вытворнікі і інш. Большасць буйной рагатай жывёлы непародная. Надой малака ад каровы — 6—7 л, а ад некаторых па 4—6 л у дзень. Корм слабы, пераважна брага з вінзавода. Штатных рабочых у саўгасе 115. Сярэдні заробак рабочага 40 руб. Працуюць вінакурны завод, паравы млын і лесапілка».

У саўгасе «Нясята» у 1926 г. было амаль 272 га ворнай зямлі, 145 га сенажацяў. Працавала 17 рабочых і 5 служачых. З жывёлы саўгас меў 13 рабочых коней і 44 каровы. У сярэднім за год ад кожнай каровы надоена 860 л малака. Сярэдні ўраджай з дзесяціны склаў: жыта 737 кг, пшаніцы 275 кг, аўса 750 кг, бульбы 6500 кг, капусты 11 000 кг.

Як на вялікае дзіва збіраліся людзі паглядзець на першыя трактары, што 1 мая 1930 г. прыбылі ў калгас імя Красіна (вёскі Развадава — Падгор'е). З гэтай нагоды адбыўся мнагалюдны мітынг. Трактароў напачатку не хапала на ўвесь калгасны палетак, але іх станавілася ўсё болей, асабліва з верасня 1935 г., калі пачала дзейнічаць Нясяцкая МТС. У хуткім часе яна атрымала 20 трактароў маркі ХТЗ, тут адкрыліся чатырохмесячныя курсы падрыхтоўкі трактарыстаў. Вясной 1936 г. у раёне арганізавана ўжо 8 трактарных брыгад. У Нясяцкай МТС дзейнічала жаночая камсамольска-маладзёжная брыгада на чале з А. Бондар. У 1937 г. на месцы саўгасаў, рэарганізаваных з-за нізкай рэнтабельнасці, створаны яшчэ дзве МТС — Бацэвіцкая і Красінская.

Негледзячы на цяжкасці і няўдачы, у працоўных калектывах панаваў уздым, пашыралася сацыялістычнае спаборніцтва. Гэтаму спрыялі створаныя ў 1924 г. райком партыі і райвыканком, а з 1931 г. — раённая газета «Сталінскі шлях». Па выніках Усесаюзнага конкурсу на лепшы сельсавет, што праводзіўся ў 1933 г., ЦВК СССР у ліку 6 лепшых сельсаветаў Беларусі адзначыў Наталоўскі нацыянальны польскі Савет Клічаўскага раёна. За поспехі ў вытворчасці прадукцыі земляробства і жывёлагадоўлі ў 1939 і 1940 гг. 49 перадавікоў калгасаў Клічаўшчыны занесены ў Кнігу Гонару Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, а 4 з іх удастоены Малога залатога медаля УСГВ.

Чорны цень рэпрэсій

Знешне навокал пульсавала жыццё, кіпела напружаная праца, з рэпрадуктараў ракой ліліся маршы, патрыятычныя песні, рапарты перамог. Было ў гэтым многа і непадробнага патрыятызму, энтузіязму, веры ў светлую будучыню. Але ў той светлы парыў арганічна ўплятаўся чорны цень рэпрэсій. Сёння мы

ведаем праўду і называем рэпрэсіі сваім імем. Тады ж «барацьба з ворагамі народа» выдавалася за высокапатрыятычную справу. На сходах, на старонках газет, у тайных даносах на ўсе лады кляйміліся і выкрываліся «здраднікі», «іуды», «адшчаненцы». Відаць, не ўсе тады ўяўлялі, якім страшным д'ябальскім жнівам завяршалася гэта выкрывальніцтва. Ні ў чым не вінаватых людзей кідалі ў «чорныя варанкі», саджалі за краты, дзе спецы-следчыя выбівалі ў сваіх ахвяр патрэбныя прызнанні, на падставе якіх сумна вядомыя «тройкі» тварылі самасуд: каго — над расстрэл, каго — на высылку.

Ніжэй мы друкуем дакументы і успаміны пра тыя нялёгкія часы на Клічаўскай зямлі. А яшчэ змяшчаем спіс ахвяр рэпрэсій, ад якога дранцвее сэрца: столькі паклёпу на людзей, столькі нявінных загубленых жыццяў!

Ахвярай «класавай пільнасці» і бязлітаснай барацьбы з «ворагамі народа» стаў старшыня Клічаўскага райвыканкома Дзмітрый Барысавіч Найдун. Нават па скупых радках дакументаў можна прасачыць, як «ламалі» гэтага чалавека. 15 ліпеня 1937 г. на раённым партыйным сходзе ў адрас Найдуна былі выказаны сур'ёзныя абвінавачванні ў палітычнай слепаце, у тым, што старшыня «нічога не робіць для ачысткі апарата ад класава-варожых элементаў». У віну Найдуну ставілася і тое, што ён не прымаў падобныя папрокі ў свой адрас, а на прапановы аб выкрыцці ворагаў адказваў: «Я з пляча рубіць не буду». На тым пасаджэнні ніхто з выступаючых не стаў на абарону старшыні райвыканкома. Усе прыйшлі да адной высновы: «Старшыня РВК не зразумеў рашэнняў з'езда ў справе ліквідацыі рэшткаў ворагаў. Працуе па-старому». 15 лістапада 1937 г. Д. Б. Найдун быў арыштаваны, а праз месяц расстраляны ў Бабруйску.

Спрабаваў пярэчыць існуючай сістэме і загадчык райана Рыгор Васілевіч Шакун. Негледзячы на тое, што ён вымушаны быў здымаць з работы «настаўнікаў-трацкістаў», выступленні на пасяджэннях і сходах сведчаць, што Шакун пачаў абараняць лепшых настаўнікаў ад беспадстаўнага абвінавачвання ў шкодніцтве і варожай дзейнасці. Гэта не магло не прывесці да разгляду яго асабістай справы. Загадчыка райана абвінавацілі ў «правядзенні лініі па засмечванню настаўніцкіх калектываў класава-варожымі элементамі». У віну Р. В. Шакуну ставілася і тое, што ён абараняў настаўнікаў Кудзіна, Цмыга і Мезяна, якім прыпісалі контррэвалюцыйную дзейнасць. А калі знялі з работы В. І. Мезяна як прыхільніка Бухарына, Шакун паехаў у міністэрства і дамогся аднаўлення яго на рабоце. За антыпартыйныя дзеянні Рыгор Васілевіч Шакун быў выключаны з партыі і зняты з работы, яго справу перадалі органам НКУС. Далейшы лёс былога загадчыка райана пакуль невядомы.

Восенню 1937 г. у газеце «Звязда» быў надрукаваны артыкул «Хто кіруе Клічаўскім раёнам». Толькі ва ўрадавай бібліятэцы Беларусі захаваўся той нумар газеты, але гэты артыкул там выразаны. Па падзеях, якія адбываліся ў канцы 1937 г., можна меркаваць, што агонь крытыкі рэспубліканскай газеты быў скіраваны на першага сакратара райкома партыі, які нібыта не прымаў рашучых мер па ліквідацыі ворагаў народа. На разбор справы ў Клічаў прыбыў інструктар ЦК КП(б)Б. Першы сакратар райкома У. В. Цішкевіч быў вызвалены ад насады і арыштаваны. Далейшы лёс яго пакуль невядомы.

А жыццё прадаўжалася ў рэчышчы таго самага сацыяльнага пералому, што быў наканаваны Кастрычнікам. І на гэтым шляху, нягледзячы на страты і перашкоды, былі атрыманы важныя і прыкметныя здабыткі, аб чым сведчаць наступныя статыстычныя звесткі.

Эканоміка раёна напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны

(звесткі з архіўных матэрыялаў і дакументаў па стану на 1.1.1940 г.)

Напярэдадні вайны ў раёне было 170 населеных пунктаў, больш за 46 тыс. жыхароў; плошча раёна 1800 км². У прамысловасці працавала 727 чалавек, у трох МТС — 193, на чыгунцы — 72, у гандлёва-нарыхтоўчай сферы — 327, грамадскім харчаванні — 27, адукацыі — 607, ахове

Прамысловыя вырабы (1939 г.)

Торф паліўны	11 589 т
Цэгла	78 тыс. шт.
Дзелавая драўніна	64 тыс. м³
Нарыхтоўка дроў	65 тыс. м³
Абутак розны	2441 пара
Перапрацоўка збожжа	33 634 ц
Алей	1 т
Хлебабулачныя вырабы	3750 т

Землеўладальнікі

Гаспадаркі	на 1.7. 1939 г.	на 1.7. 1940 г.
Калгасы	99	100
Сялянскія гаспадаркі	9212	9146
у т. л. аднаасобныя	1476	1312

Зямельныя плошчы калгасаў

Пад чым занятыя	Плошча, га
Усяго зямель	164 009
у т. л. ворных	36 526
Агароды і сады	4025
Сенажаці	14 834
Пашы	7984
Лясы	72 485
Балоты	28 175

Пасяўныя плошчы
(ва ўсіх катэгорыях гаспадарак)

Культуры	Плошча, га
Жыта	8739
Пшаніца азімая	144
Пшаніца яравая	1232
Ячмень	2389
Авёс	3498
Грэчка	2437
Лён	1195
Каноплі	239
Бульба	6557

Тэхнічная аснашчанасць калгасаў

Віды тэхнікі, спажыванне электраэнергіі	Колькасць
Трактары	104
Аўтамашыны	30
Камбайны	18
Плугі трактарныя	104
Снажыта электраэнергіі	73 кВт. гадз.

Пагалоўе жывёлы

Віды жывёл	Усяго	у т. л. у калгасах
Коні	5181	4336
Буйная рагатая жывёла	17 827	6848
у т. л. каровы	10 544	2255
Свінні	14 618	1289
Авечкі	12 753	3916

Кадры калгасаў

Пасады, прафесіі	Колькасць чалавек
Старшыні	99
Нам. старшынь	53
Брыгадзіры паляводчых брыгад	221
Бухгалтары і рахункаводы	87
Загадчыкі ферм	99
Пастухі	297
Даяркі	396
Свінаркі	87
Шафёры	32

Кадры МТС

МТС	Усяго работнікаў	у тым ліку: агранамаў	механікаў	брыгадзіраў трактарных брыгад	трактарыстаў	камбайнераў	шафёраў
Бацэвіцкая	79	4	4	7	56	5	3
Красінская	42	2	3	5	30	—	2
Нясяцкая	102	4	3	9	81	2	3

Нарыхтоўка сельскагаспадарчай прадукцыі (1939 г.)

Віды прадукцыі	Усяго	у тым ліку: калгасы	калгаснікі	аднаасобнікі
Бульба, т	6662	3806	2047	260
Агародніна, т	117	117	—	—
Сена, т	690	690	—	—
Салома, т	55	55	—	—
Малако, гекталітраў	11 258	9339	1488	390
Мяса, ц	385,2	1709	1680	463
Воўна, кг	1961	1266	659	37

Сувязь

Установы, кадры	Колькасць
Радыётрансляцыйныя кропкі	273
Паштова-тэлеграфныя ўстановы	17
Пашталёны	8
Тэлефанізавана сельсаветаў	18

Культура

Установы, кніжны фонд	Колькасць
Клубы (разам з хатамі-чытальнямі)	26
Кінаўстаноўкі	7
Бібліятэкі	33
Кніжны фонд	21,7 тыс. экз.

Народная асвета

Установы, кадры	Колькасць
Школы:	
сярэднія	6
сямігадовыя	22
пачатковыя	63
Дзіцячыя дашкольныя ўстановы	2
Настаўнікі	366
Вучні	9890

Медыцынскае абслугоўванне

Установы, кадры	Колькасць
Бальніцы	2 (48 ложкаў)
Фельчарска-акушэрскія пункты	17
Паліклінікі	1
Кабінеты і амбулаторыі	2
Урачы	11
Сярэдні медыцынскі персанал	54

Гандаль

Установы, тавараабарот	Усяго	У тым ліку: дзяржгандаль	каапер.
Магазіны	63	2	61
Ларкі і гандлёвыя палаткі	11	2	9
Прадпрыемствы грамадскага харчавання	6	2	4
Тавараабарот, руб.	16 598	1414	15 184

здароўя — 123, дзяржаўным і кааператыўным апараце — 159 чалавек; 10 інжынераў і 10 аграномаў.

Працавалі райпрамкамбінат, 2 хлебазаводы, маслазавод, завод безалкагольных напіткаў, 2 спіртзаводы, арцелі па вытворчасці кандытарскіх вырабаў, шавецкая і кравецкая друкарня, леспрамгас, 3 паравыя і 3 ветраныя млыны і інш.

Здавалася, няма такой сілы, якая можа спыніць ці затрымаць гэты імклівы паравоз, што поўным ходам нясецца ў камуну — да свайго жаданага прыпынку. Хоць, праўда, на захадзе ўжо згушчаліся навальнічныя хмары, а на савецка-фінляндскім фронце ішлі баі, у якіх гінулі і жыхары Клічаўшчыны.

Л. Л. Ачыновіч, А. І. Валаховіч, У. А. Салановіч.

Дзьмуў вецер перамен

З успамінаў І. П. Лук'яновіча з в. Бацэвічы.

Аўтар успамінаў у даваенны час працаваў намеснікам рэдактара ўсебеларускай радыёгазеты «Калгасны заклік», уласным карэспандэнтам «Правды» па Беларусі, інструктарам ЦК КПБ, а пасля вайны — на выдавецкай рабоце.

Гэта невялікая кніжачка да нас у Бацэвічы трапіла недзе ў 1920-м г. Не ведаю, хто і адкуль яе прынёс, але яна зацікавіла ўсю вясковую моладзь. То была прамова У. І. Леніна «Задачы саюзаў моладзі», з якой ён выступіў на III з'ездзе камсамола. Гэтай брашуры абавязана сваім нараджэннем і наша Бацэвіцкая камсамольская ячэйка. Сын беднякa Іван Белакурскі, добра вывучыўшы яе сам, сабраў аднойчы на сход моладзь і прачытаў брашуру хлопцам і дзяўчатам. У канцы сходу Іван прапанаваў стварыць у Бацэвічах камсамольскую ячэйку. Яго прапанову падтрымалі.

Праца Леніна была і маёй першай палітграматай. На некалькі дзён мне дау яе Іван, строга наказаўшы не згубіць і адразу ж, як пачытаю, вярнуць назад. Я назаўтра ж прынёс брашуру. Разгаварыліся. Іван узбуджана хадзіў па пакоі. «Разумееш,— гаварыў ён,— яшчэ многія лічаць камсамол дзіцячай арганізацыяй. А мы павінны даказаць, што камсамольцы — гэта свядомыя і актыўныя барацьбіты, што мы арганізацыя палітычная. І табе, Іване, мая парада — падавайся да нас».

Першай практычнай справай, якую мне даручылі камсамольцы, была праца ў камітэце ўзаемадапамогі. Беднякоў у вёсцы было многа, і дзверы ў нашым камітэце не зачыняліся. Уявіце сабе, як да мяне, 18-гадовага хлопца, ішлі за парадай сівабародыя дзяды: «Дапамажы, сынок». Але камітэт часам быў бяссільны дапамагчы селяніну. Раней не было ў яго ні зямлі, ні каня, цяпер жа зямля ёсць, а дзе ўзяць каня? Што, зноў здымаць шапку перад багацеем, зноў у кабалу? А кулакі адкрыта пасмейваліся з сялян: маўляў, дзе вам, галоце, з зямлёй управіцца.

Камітэты ўзаемадапамогі сказалі кулацкай хлусні сваё рашучае «не». Яны вучылі сялян не палохацца першых цяжкасцей, не ісці на паклон да багацеяў, а шукаць сілу ў згуртаванасці. Камітэты дапамагалі сялянам-беднякам атрымаць лепшую зямлю, набыць насенны фонд, цяглавую сілу, каб апрацаваць зямлю.

Нарэшце, забуяла збажына на сялянскіх палетках. Яна нібыта гаварыла: «Глядзіце, як могуць працаваць беднякі». Але радавацца было яшчэ рана. Ураджай трэба было ўбраць з поля, а рабочых рук не хапала. Кулакі зноў пачалі насміхацца: маўляў, усё роўна без нас не абысціся. А камсамольцы сказалі: «Абыдземся». Ячэйка тэрмінова сабрала пасяджэнне. На ім размова ішла аб арганізацыі суботнікаў і нядзельнікаў. Тут галасы прысутных раздзяліліся. Былі і такія, што не згаджаліся працаваць у нядзелю або суботу. Па сутнасці задума камсамольскай ячэйкі зрывалася.

Але не такі Іван Белакурскі, каб адступіцца ад свайго. Я заўсёды захапляўся яго вытрымкай, ідэйнай перакананасцю, уменнем знайсці выйсце з самага цяжкага становішча. Знайшоў яго Іван і на гэты раз. Ён пераканаў усіх, што камсамол павінен быць ударнай групай, якая ва ўсякай працы аказвае сваю дапамогу, праяўляе ініцыятыву, пачын. Хіба можна моладзі ў самы гарачы час адседжвацца ў цяньку? Каб не пакрыўдзіць нікога, Іван прапанаваў працаваць і ў суботу, і ў нядзелю. На гэтым і пагадзіліся.

Не салодкім быў хлеб ураджаю 1922 г. Барацьба за яго вялася да сёмага поту. Але гэта быў часовы выйгрыш — не ўсё ж браць суботнікамі ды нядзельнікамі. Трэба было шукаць нейкае іншае, стабільнае выйсце. І мы шукалі. Днём завіхаліся ў полі, затое ночы былі пашы. Завесіўшы пасцілкай вокны, каб не пальнуў хто з абрэза, мы пры святле лучыны ці газніčкі да раніцы сядзелі над газетамі і кнігамі, вучыліся, шукалі парад, як будаваць сацыялізм у вёсцы. І знаходзілі іх, часцей за ўсё ў працах Леніна.

Сапраўды, беднаму селяніну цяжка было цягацца з багацеем. Але ж беднякоў многа, і калі іх згуртаваць ды на першым часе дапамагчы... Тады па ўсёй краіне ствараліся сельскагаспадарчыя крэдытныя таварыствы, у якіх бядняк мог узяць пазыку на выгадных для яго ўмовах. Мы, камсамольцы, у гэтай справе і выступалі пасрэднікамі. Набывалі сельскагаспадарчую тэхніку і за нязначную плату або зусім бясплатна давалі яе беднякам. Дапамагалі мы і кааперацыі, якая неўзабаве была створана ў нашай вёсцы. У кааперацыі былі два канкурэнты — крамнікі Лейба і Моўша. Яны ўмела змагаліся супраць першага савецкага пункта гандлю ў вёсцы. Каб завабіць да сябе пакупнікоў, яны іншы раз прадавалі тавары па ніжэйшай цане, чым у кааперацыі. А мы ставілі задачу накіраваць усіх пакупнікоў у кааперацыю. Адразу скажу: нялёгкая гэта справа ўгаварыць селяніна купляць даражэйшыя тавары, калі побач прапануюць дзешавейшыя. Але ў гэтай барацьбе мы перамагалі. Вёска ўпэўнена выходзіла на дарогу сацыялістычнага будаўніцтва.

Мы вельмі верылі ў сваю ідэю, ідэю новага жыцця, і вялі за яе барацьбу нават са сваімі бацькамі. Успамінаецца такі выпадак. Я быў рэдактарам насценнай газеты «Наша вока». Аднойчы вырашылі прысвяціць нумар антырэлігійнай барацьбе. Параіўся з Іванам Белакурскім. Ён ухваліў маю задуму і сказаў, што сам напіша заметку. Назаўтра Іван прынёс яе. І каго, вы думаеце, Іван крытыкаваў? Сваю маці, якая святкавала дзяды. Я нават здзівіўся смеласці і прынцыповасці камсамольскага важака. А ён заўсёды заставаўся такім: чыста-крыштальным і непахісным. І нас гэтаму вучыў.

Можна многа расказваць пра падзеі 1922 г., пра сваіх сяброў, з якімі разам давялося працаваць і вучыцца. Але ў мяне ж была задума спыніцца толькі на некаторых справах нашай камсамольскай ячэйкі. Не трэба думаць, што мы былі занадта асцярожныя, што дзейнічалі мы заўсёды правільна і ўсё нам лёгка давалася. Наадварот, мы былі занадта гарачыя, былі ў нас цяжкасці, няўдачы і памылкі. Але ў нашы ветразі дзьмуў вецер вялікіх перамен, і мы свядома будавалі новае жыццё».

Клічаўскае раённае таварыства краязнаўства

Клічаўскае раённае таварыства краязнаўства ўтварылася 11 кастрычніка 1925 г., калі на агульным сходзе настаўнікаў раёна было абрана часовае праўленне, якому даручылі далейшую арганізацыю працы.

Уцягнуць у працу спачатку ўдалося толькі настаўнікаў. Другі агульны сход таварыства быў таксама дапасаваны да раённай настаўніцкай канферэнцыі і адбыўся 31 кастрычніка. Усіх членаў таварыства ўжо налічвалася 52.

Каб уцягнуць у працу шырокія колы мясцовага насельніцтва, таварыства распаўсюдзіла па ўсіх сельсаветах, лясніцтвах, школах і савецкіх гаспадарках адпаведную анкету; з мэтай аховы помнікаў старасветчыны па ўсіх кутках раёна была разаслана асабістая адозва з лозунгам: «Шукай сваю старасветчыну!».

Апрача таго, члены таварыства зрабілі рэкагнасцыровачнае абследаванне тэрыторыі раёна ў ваколіцах Клічава і вёсак Стаялава, Патока, Суша. Пры гэтым знойдзены старыя могільнікі, паасобныя курганы, курганныя групы, камяні з надпісамі, шэраг неалітычных прылад і г. д.

У мясцовых цэрквах таварыствам выяўлены каштоўныя старасвецкія абразы ды іншыя царкоўныя рэчы і кнігі.

У глухім бездарожным Клічаўскім раёне, багатым на лясы і балоты, дзе быт насельніцтва не адчуваў гарадскіх уплываў да апошняга часу, і ў мове, у поглядах сялянства захавана нямала старасветчыны. Краязнаўству хапае матэрыялу для працы, і толькі перагружанасць членаў таварыства перашкаджае шырокаму разгортванню справы.

Наш край. 1925. № 2. С. 57—58.

Клічаўскі кірмаш

Краязнаўцы гуртка пры Клічаўскай сярэдняй школе зрабілі спробу прааналізаваць сутнасць кірмашу, што адбыўся ў Клічаве 19 студзеня 1928 г. Высновы, да якіх яны прыйшлі, былі апублікаваны ў штомесячніку Цэнтральнага бюро краязнаўства «Наш край»

(1928. № 4). На іх аснове і зроблены гэты матэрыял.

Раённым цэнтрам, мястэчкам Клічаў фактычна стаў толькі ў 1924 г. Да таго часу — гэта звычайнае сяло, са слабымі адзнакамі саматужнай прамысловасці і дробнага гандлю, хоць некалі тут была шкляная гута. Выгляду звычайнага беларускага мястэчка з яго жвавым гандлем, перыядычнымі кірмашамі Клічаў не меў. Пра гэта нават сведчыць летапіс Клічаўскай царквы за 1869 г., дзе сказана, што «в Кличеве не было и теперь нет не только утвержденных правительственных ярмарок, купцов, ремесленных цехов, лавок и проч., но даже нет обыкновенных по местечкам торгов».

Дый не дзіва. Знаходзячыся воддаль ад буйных шляхоў зносін, Клічаў не мог развіваць бойкі гандаль, не мог быць тым асяродкам, дзе б сутыкаўся ў абмене тавараў і прадуктаў горад з вёскай. Кірмашы, якія адбываліся ў Клічаве штогод 19 студзеня і на сёмуху, не мелі эканамічнага значэння, а былі выключна прысвечаныя дню свята данае царквы.

У першыя гады існавання Клічава як цэнтра раёна можна было наглядаць тое самае. Але, з цягам часу, калі Клічаў пачаў узбуйняцца як раённы асяродак, пачало ўзрастаць і яго эканамічнае значэнне. Павялічваецца колькасць саматужнікаў, развіваецца гандаль і сяло ператвараецца паступова ў мястэчка, святочныя кірмашы пачынаюць набываць эканамічны характар. Пра гэта сведчаць вынікі абследавання кірмашу, які адбыўся ў м. Клічаве 19 студзеня 1928 г.

Продаж тавараў

Назвы тавараў	Колькі	Прасілі	Давалі	На якую суму было прывезена тавару
1	2	3	4	5
Вырабы з дрэва				
Цэбры малыя	3 шт.	1-50	1-50	4-50
Рэшаты	40	0-50	0-50	20-00
Каробкі (сявачкі)	70	1-30	1-20	91-00
Сіты	30	1-10	1-00	33-00
Начоўкі малыя	2	0-35	0-30	0-70
Калаўроты (самапралкі)	55	3-50	3-00	202-50
Сані простыя	2	3-50	3-00	7-00
Сані «кары»	2	3-00	2-50	6-00
Табурэткі	4	0-75	0-65	3-00
Дугі	5	0-50	0-50	2-50
Верацёны	80	0-05	0-05	4-00
Бёрды	220	1-10	1-10	242-00
Лыжкі сярэднія	310	0-03	0-03	9-30
» малыя	50	0-03	0-02½	1-50
Апалонікі	55	0-10	0-10	5-50
Канапы	1	7-00	6-00	7-00
Куфры	2	22-00	20-00	44-00
Шпулі з вілачкамі	150	0-70	0-60	105-00
				788-50
Вырабы з жалеза				
Сякеры	135	2-50	2-50	337-50
Свярдзёлкі вялікія	60	1-50	1-30	90-00
» сярэднія	40	0-50	0-40	20-00
» малыя	28	0-30	0-25	8-40
Стругі	13	1-00	1-00	13-00
Чапёлы	15	0-20	0-20	3-00
Секачы	20	0-45	0-40	9-00
				480-90
Гліняны посуд				
Гладышы	80 шт.	0-30	0-20	24-00
Гаршкі	160	0-10	0-08	16-00

Працяг таблицы

1	2	3	4	5
Мясы	120	0-25	0-20	30-00
Глякі	100	0-10	0-10	10-00
				80-00
Адзенне, абутак, матэрыялы				
Аўчыны	25 шт.	4-00	3-00	100-00
Воўна	4 фунт.	1-50	1-25	6-00
Сукно	35 арш.	2-00	1-80	70-00
Боты	2 пары	19-00	18-00	38-00
Лыка	60 пуд.	3-20	3-00	192-00
Шчаціна	2,5 ф.	1-20	1-00	3-00
				409-00
Вырабы са скуры				
Аброці	2 шт.	3-00	2-50	6-00
Гужы	1 пар.	4-00	3-00	4-00
				10-00
Мясныя прадукты				
Каўбасы	60 ф.	0-35	0-15	21-00
				21-00
Коні				
Коні лепшыя	1	250-00	215-00	250-00
» сярэднія	1	160-00	130-00	160-00
» горшыя	1	70-00	50-00	70-00
				480-00
Збожжа				
Жыта	105 пуд.	2-10	2-00	220-00
Авёс	25	2-20	2-00	55-00
Ячмень	22	2-00	1-80	44-00
				319-50
Іншыя тавары				
Цукеркі, пернікі	на 10 століках			150-00
				150-00

Такім чынам, зарэгістравана тавараў на суму 2 738—90. Вядома, такая колькасць тавару не можа задаволіць запатрабаванняў насельніцтва, але важна, што святочны кірмаш пачынае ператварацца ў кірмаш эканамічнага значэння.

Цікава, што крамы як прыватныя, так і каапаратыўныя мелі ў гэты дзень меншы абарот, чым чакалася. Увага насельніцтва, што з'ехалася сюды, была адцягнута самім кірмашом як з'явай.

На кірмашы было каля 2400 чалавек. Са звестак, прыведзеных у таблицы, відаць, што галоўныя тавары на кірмашы — вырабы з дрэва і жалеза. Кірмаш быў сялянска-саматужніцкі.

Жывёлы амаль што не было. Гэта тлумачыцца, мусіць, тым, што на коні ёсць асобны кірмаш, які заўсёды адбываецца ў мяст. Свіслач, або сяляне ездзяць купляць коні на Случчыну. Неабходна зазначыць, што на кірмаш былі прывезены не толькі тавары мясцовага вырабу, але і з іншых мясцін. Так, гліняны посуд быў прывезены са Шклова, лыка — з-пад Рагачова.

І назвалі калгас «Абуджэнне»

Увосень 1921 г. Мікалай Койпіш зноў вярнуўся ў родныя Закоркі. За шэсць з лішнім гадоў ён многае перажыў і шмат набачыў. З лета 1915 г. капаў акопы ў імнерыялістычную, удзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях, а з лета 1919 г. ваяваў у дывізіі Чапаева, узначальваў аддзяленне палкавой разведкі. Так што землякі ставіліся да яго паважліва, сур'ёзна.

Якраз знайшлася для яго новая справа — разам з Пятром Мацвеевічам Віктаровым пачалі арганізоўваць крэдытнае таварыства. З недаверам спачатку паставіліся да гэтага сяляне. Але калі крэдытнае таварыства пачало напракат даваць сяля-

М. А. Койпіш.

нам за невялікую плату плугі, малацілкі, іншы інвентар, надзяляць малазямельных зямлёй на выгадных умовах, павага да Вікторчыка і Койпіша, цікавасць да іх справы значна набольшала.

Гэтыя адносіны ў людзей захаваліся і тады, калі Мікалай Апанасавіч разам з Вікторчыкам пачалі арганізоўваць работу сельскага Савета. Чатыры гады працавалі яны разам у Савеце, а калі паўстала пытанне аб стварэнні калгаса, Пётр Мацвеевіч Вікторчык не бачыў лепшай кандыдатуры на насаду старшыні, як Койпіш.

На сходзе, які склікаў сельсавет, першым запісаўся ў калгас Кірыла Койпіш. Услед за ім, павагаўшыся, папрасіўся бядняк Шварц. Пасля далі згоду і некаторыя сераднякі. Але далей шаснаццатага чалавека спіс калгаснікаў не пайшоў.

Ніхто з сялян не стаў пярэчыць адносна кандыдатуры старшыні калгаса. Праўленне выбралі з пяці чалавек. Акрамя самаго Койпіша, у яго увайшлі Пятро Вікторчык, Іван Казачонак, Трафім Віліткевіч, Даніла Князік. Гэта былі паважаныя людзі, якія вызначаліся працавітасцю і гаспадарчай кемлівасцю.

Пачалі думаць, як назваць калгас. Койпіш прапанаваў: «А што, калі «Абуджэнне»? Добрая назва». Так і назвалі.

Спрэчнай і нялёгкай была гаворка па самым галоўным пытанні — пра абагульненне маёмасці. Спрадвеку ж вялося: «маё», «тваё». А тут — «наша», «агульнае». У рэшце рэшт дамовіліся, што заўтра ўсе, хто ўступіў у калгас, прывядуць у арцельны хлеў па адной карове, здадуць усё наяўнае цягло і сельгасінвентар, а таксама лішак насення.

Дамоў сабраліся апоўначы. Калі выйшлі на двор, пачулі, як у начной цішыні то там, то тут раўлі каровы, вішчэлі свінні, бляялі авечкі. Гэта па хутарах пускалі пад нож жывёлу. Мікалай прыспешыў крок: «А можа, там бацька таксама?» А стары і сапраўды тачыў аб загнетку нож. «Трэба,— кажа,— хоць авечку зарэзаць. Хто ведае, як у тым калгасе...»

Ледзьве адгаварыў бацьку Мікалай.

На досвітку запрог старшыня каня, нагрузіў калёсы усялякім інвентаром. Бацька і маці стаялі моўчкі збоку і з дакорам глядзелі то на воз, то на сына. А калі ён вывеў з хлева карову, маці не ўтрывала і загаласіла. А стары, крактануўшы, стаў набіваць тытунём люльку. Убачыўшы гэта, міжволі расчуліўся і сам Мікалай. Каб хутчэй знікнуць з вачэй, ён тузануў каня за лейцы і выехаў са двара.

Але мала, зусім мала было ў калгасе і сіл, і сродкаў. Між тым набліжалася вясна. Работ наперадзе мора, а калгаснікаў — жменька.

І зноў склікаліся сялянскія сходы, зноў агітавалі за калектыўную гаспадарку, даказвалі яе перавагу. Хутаране круціліся на лаўках, як на цвіках, упарціліся. І ўсё ж той-сёй падыходзіў да стала, пісаў заяву, і спіс калгаснікаў з кожным разам даўжэў. Вясной, перад выхадам у поле, у сельгасарцелі ўжо налічвалася за няцьдзесят двароў. На сяўбу выйшлі ўсёй арцеллю, у час управіліся. З'явіліся дружныя ўсходы. Лета выдалася з дажджамі і сонечнымі прыпарамі, і збажына была буйная, абяцаючы добры ўраджай.

І тут здарылася непрадбачанае. Калі старшыня аднойчы затрымаўся ў канторы, у памяшканне шумным гуртам увaліліся калгаснікі. Яны з парога заявілі, што выходзяць з сельгасарцелі, і запатрабавалі назад свой інвентар і жывёлу. А пад вечар на стале ў старшыні ляжалі дзесяткі заяў. У калгасе засталіся толькі праўленцы і іншыя актывісты. Сабраўшыся разам, яны вырашылі неадкладна ўзяць пад замок увесь інвентар, не спускаць вачэй з коней.

Сенакосная пара ўжо клікала на лугі. А тых рук у калгасе — раз, два — і ўсё. Спахмурнеў Койпіш — трэба было тэрмінова шукаць выйсце. Нехта падказаў: памогуць калгаснікі, што за Бярэзінай: у іх не такія багатыя ўраджаі, яны згодзяцца выручыць. І мужыкі з таго боку амаль што пагалоўна перабраліся з косамі на процілеглы бераг, а за імі — і жанкі з граблямі.

І раслі над рэчкай стагі, як грыбы пасля дажджу. Праўда, кожны трэці з іх прызначаўся забярэзінцам. Але што было рабіць? Затое суседзі з-за ракі выручылі і яшчэ раз — калі надышоў час малаціць збажыну, яны пазычылі малатарню, трактар.

Пасля гэтага, глыбокай восенню, ледзь не ўсе хутарскія мужыкі вярнуліся ў арцель. А калі ў калгасе стала больш людзей, то і справы пачалі ладзіцца. Павесялеў старшыня. З'явіліся ў сельгасарцелі маслабойка, потым крупадзёрка. Асабліва людна было на млыне, які паставілі пазней на безыменнай рачулцы. Сюды з'язджаліся падводы з усяго навакольля.

За ўсе паслугі бралі з людзей толькі грашыма. І калгасная каса патроху паўнела. Неўзабаве Койпіш прыдбаў піларраму і ўжо меўся пабудаваць дзіцячы сад, лазню. Але перш за ўсё трэба было сцягнуць усе хутары ў адно паселішча. Бо выходзіла: працавалі разам, а жылі паасобку.

Месца для забудовы вёскі выбралі панад рачулкай, якая вілася змейкай па шырокім логу. Звозілі дварыспакваля і ставілі паводле плана, зацверджанага праўленнем. На кожнай вуліцы, абапал дарог, адразу ж садзілі бярозы і ліпы, а дзе-нідзе і елкі. Мясцовасць была бязлесная вёрст па дваццаць навкол, і былыя хутаране клапаціліся пра зялёную аздобу.

Адразу ж назвалі вёску Закоркамі. У памяць пра колішнюю, што была з такой назвай. Неўзабаве ў вёсцы набралася двароў за паўсотню. І цяпер узяліся за лазню, пры якой абсталявалі і цырульню. Трохі пазней расчынілі дзверы дзіцячыя сад-яслі і хата-чытальня.

Даўно ўжо выношвалі праўленцы мару збудаваць электрастанцыю ў калгасе. Але толькі цяпер, калі ў касе з'явілся грошы, можна было гэту мару ажыццявіць. З вялікімі цяжкасцямі, але ўсё ж здабылі ўсё неабходнае.

Нарэшце доўгачаканы дзень — 20 кастрычніка 1935 г. Запуск электрастанцыі прымеркавалі да другой, не менш важнай падзеі,— уручэння калгасу акта на вечнае карыстанне зямлёй.

На ўрачыстасць у Закоркі наехала шмат гасцей з усіх калгасаў і сельсаветаў раёна, прыбыў палкавы аркестр з шэфскай вайсковай часці. Вёска была прыбрана, як на вялікае свята.

І вось успыхнула лямпачка на слупе перад канторай калгаса, дзе на пляцы сабраліся ўсе закоркаўцы. Убачылі, як у вокнах іх хат запалілася яркае святло і задаволена пляскалі ў далоні, радасна ўсміхаліся.

Так сам на сабе пачаўся мітынг. Койпіш, не гаворачы доўга, даў слова прадстаўніку райкома партыі Катлінскаму.

«Сімвалічна,— пачаў прыезджы,— што я ўручаю вам акт на вечнае карыстанне зямлёй пад святлом гэтай лямпачкі. Значыць, ісці вам уперад светлай, шчаслівай дарогай...»

І сапраўды, успамінае Мікалай Апанасавіч, зажылі тады як людзі. Былі гады, калі намалочвалі па 130 пудоў жыта з гектара, збіралі па паўтары тысячы пудоў бульбы...

Але непакоіла старшыню іншае: на кожнай раённай нарадзе ўсё часцей сталі гаварыць пра нейкіх шкоднікаў у сельскай гаспадарцы. З 1937 г. раённая газета амаль у кожным нумары паведамляла аб выкрыцці ворагаў народа. Асабліва збянтэжыла Койпіша чутка пра выключэнне з партыі загадчыка райземаддзела Рыгора Рыгоравіча Сінькевіча. Няўжо і ён вораг? Не можа быць. Але як жа тады разумець гэтыя словы: «...праводзіў праваапартуністычную практыку ў кіраўніцтве сельскай гаспадаркай, не вёў ніякай барацьбы з шкодніцтвам у калгасах». Вельмі цяжка было разабрацца ў гэтым.

Успомніў Мікалай Апанасавіч, як пасля адной з нарад да яго надышоў Дубіна, начальнік раённага аддзела НКУС, і, хітра гледзячы ў вочы, спытаў:

— Ну вось, таварыш Койпіш, выяўляем у гаспадарках шкоднікаў, трацкістаў. Чыталі ў раёнцы — у Бацэвічах нават контррэвалюцыйнае выступленне было, калі паведамілі аб судзе над ворагамі народа Убарэвічам і Тухачэўскім. Будзем разбірацца. А ў вас як справы наконт гэтага?

— Няма ў нас шкоднікаў. Калгас перадавы, усе працуюць добра,— рашуча адказаў Мікалай Апанасавіч.

За сваіх калгаснікаў гарой стаяў старшыня. Ды і ў раёне яго паважалі. Можа, таму абыходзіла пакуль што бяда закорцаў. Закранула яна толькі аднаасобнікаў. У адну з летніх начэй забралі 5 чалавек з вёскі, і згінулі яны невядома дзе.

Страх агарнуў сэрцы, скоўваў людзей, вымушаў гаварыць з аглядкай, угойваць думкі. Не стрымаўся аднойчы дырэктар Востраўскай сямігодкі Шыдлоўскі, калі калгаснікі, радуючыся добраму ўраджаю, надлічвалі будучыя прыбыткі. Тады ён спачувальна сказаў:

— У нашым калгасе добра, а кругом паглядзіце — есці нечага. Што гэта за жыццё.

Забыўся пра гэту размову Койпіш. А ў верасні 1937 г., калі Мікалай Апанасавіч ужо працаваў у райцэнтры, выклікалі яго ў пракуратуру. Следчы, які вёў справу, дабіваўся, каб Койпіш падпісаў данос на дырэктара школы Шыдлоўскага. Восем месяцаў цягнулася выпрабаванне — доўгія допыты, вочныя стаўкі, пагрозы. Праз

некаторы час адбыўся суд, які за недахопам кампраметуючага матэрыялу прызнаў Шыдлоўскага невінаватым.

Шмат на якіх участках давялося працаваць пазней Мікалаю Апанасавічу. Многае паспеў ён зрабіць у жыцці. Але, бадай, самае галоўнае — калгас «Абуджэнне». Не, яму не соромна за тую першую арцельную гаспадарку. Шмат чаго было зроблена для людзей. Ну, а калі што і не так было — хай даруюць.

Л. Ачыновіч, В. Лепікаў.

АБ ЧЫМ ПІСАЛА РАЁННАЯ ГАЗЕТА «СТАЛІНСКІ ШЛЯХ» У 1938 ГОДЗЕ

РАСЦЕ ДАБРАБЫТ ПРАЦОЎНЫХ

Яркім паказчыкам росту дабрабыту працоўных з'яўляецца рост укладаў у ашчадкасы. За I квартал 1938 года сума ўкладаў у ашчадных касах раёна ўзрасла на 14300 рублёў, а за II квартал сума ўкладаў павялічылася на 74000 рублёў.

28 ліпеня.

ПЕРШЫЯ ПА СЕЛЬСАВЕТУ

Першым па Ядрана-Слабодскаму сельсавету здаў зерне дзяржаве ў колькасці 15 цэнтнераў і 94 кілаграмы калгас імя Свярдлова. Астатняя колькасць збожжа будзе здадзена не пазней 12 жніўня гэтага года.

11 жніўня. *Максімкоў Н. Ф.*

ПА РАЁНУ

Па лініі камсамольскага аддзела распачат капітальны рамонт Клічаўскай амбулаторыі і гасцініцы, які будзе закончан да 25 жніўня. План па капітальнаму рамонту зараз выканан на 70 працэнтаў. Капітальна адрамантаваны 3 калодзежы, на якія затрачана 7409 руб.

* * *

У Даўжанскім сельсавеце будуецца новая бальніца на 10 стацыянарных месц, на якую асігнавана 67 тысяч рублёў. Да кастрычніцкіх свят узвядзенне бальніцы будзе закончана і будынак здадзен у эксплуатацыю.

У м. Клічаве будуецца санітарная станцыя, якая будзе здадзена ў эксплуатацыю 1 верасня гэтага года.

Будзе таксама закончана будаўніцтва раздзільнага дома на 7 стацыянарных месц. Распачаты капітальны рамонт Бацэвіцкай бальніцы, на які адпушчана 42 тысячы рублёў.

Прыступілі да будаўніцтва інфекцыйнага корпуса, на які асігнавана 215 тысяч рублёў.

* * *

На раёну налічваецца 87 школ. З іх поўнасцю падрыхтаваны да новага навучальнага года 67. Будуюцца дзве новыя школы, з якіх адна НСШ на 160 вучнёўскіх месц і адна пачатковая.

* * *

Увесь час стваралася вялікая чарга калгаснікаў на млыне з-за слабай магутнасці машыны. Зараз прывезены другі, больш моцны лакамабіль, які днямі будзе ўстаноўлены.

* * *

Распачата будаўніцтва 6 кароўнікаў на 440 стойлавых месц, 8 канюшань на 340 коней, 5 свінарнікаў, дзвюх аўчарняў, 4 амшанікаў на 400 вулляў, 3 цялятнікаў і аднаго птушніка.

21 жніўня.

ВЫКАНАН ПЛАН ЗДАЧЫ ГАРОДНІНЫ

Выканаў план здачы гародніны дзяржаве калгас імя Энгельса Нясяцкага сельсавета. Капусты здадзена 700 кілаграмаў замест плана 200 кілаграмаў. Гуркоў па плану патрабавалася здаць 500 кілаграмаў, здадзена першым гатункам 5 тон і 1 тона другім гатункам.

Калгаснікам выдадзена на працадзень па 800 грамаў гародніны. *Стрыгун.*

28 жніўня.

ЗНОЙДЗЕН СКАРБ

Капаючы сіласную яму, калгаснікі калгаса «Чырвоны Востраў» Востраўскага сельсавета знайшлі гліняны жбан з сярэбранымі старадаўнімі манетамі. Усе манеты — рублёвай вартасці. На іх выразна бачны літары, лічбы і дзяржаўны герб. Грошы з'яўляюцца рускага паходжання і былі выпушчаны ў 1802—1815 гг. *І. Новікаў.*

11 верасня.

ПРАЦАВАЛІ ПА-СТАХАНАЎСКУ

Увесь час многія калгаснікі брыгады № 3 калгаса імя Леніна Бацэвіцкага сельсавета працавалі па-стаханаўску на палявых работах. Баразна Мар'я Захараўна, Баразна Ганна Рыгораўна, Белакурская Мар'я Міхайлаўна і Альховік Алеся Міхайлаўна перавыконвалі нормы ў 2—3 разы. На абіванні лёну замест 120 скапоў па норме яны абівалі па 400. У час рассцілу саломкі рассцілалі за дзень па 1 гектару пры норме 0,17 гектара.

Па-стаханаўску працаваў і калгаснік Кузьмінскі Мікалай, які на баранаванні ў два сляды за дзень забараноўваў па 15 гектараў. Кузьмінскі на сённяшні дзень выпрацаваў ужо 700 працадзён. *Кніга Ф.*

ДРУЖНА ІДЗЕ МАЛАЦЬБА

Арганізавана праходзіць малацьба ў калгасе «Камінтэрн» Нясяцкага сельсавета. Дасланая з Бацэвіцкай МТС малатарня, якую абслугоўваюць трактарыст Варакса Іван і машыніст Ананіч Несцер, працуе без перабояў. За дзень намалочваюць да 10 тон збожжа, а за 3 дні тут намалочана 28 тон.

Гэтая брыгада МТС правяла малацьбу збожжа ўжо ў пяці калгасах. *Коўрык.*

15 верасня.

ПА РАЁНУ

Днямі клічаўская кравецкая саматужная арцель «Чырвоная ігла» перамясцілася ў новы будынак, на ўзвядзенне якога затрачана 24 тысячы рублёў. Тут 2 аддзяленні для пашыву мужчынскай і жаночай вопраткі, прасторная прыёмная. З пераходам арцелі ў чысты, светлы, утульны будынак палепшыліся ўмовы работы яе членаў.

ДАПАМОГА МНАГАДЗЕТНЫМ

Ажыццяўляючы на справе клопаты аб людзях, Савецкая ўлада адпускае вялікія сродкі на дапамогу мнагадзетным сем'ям. З дня выдання закону аб дзяржаўнай дапамозе ў нашым Клічаўскім раёне 194 сям'і атрымалі 723 тысячы рублёў. Толькі ў гэтым годзе мнагадзетным сем'ям выдадзена ўжо 236 тысяч рублёў.

ПАБУДАВАЛІ НОВУЮ КРАМУ

Каб стварыць належныя ўмовы для разгортвання гандлю, Клічаўскае сельпо пабудавала сёлета ў в. Убалацце новую краму. Крама мае культурны і прыгожы выгляд.

2 кастрычніка.

2600 РУБЛЁЎ ЧЫСТАГА ПРЫБЫТКУ

У жніўні гэтага года ў калгасе імя Калініна Клічаўскага сельсавета пабудавалі новы цагельны завод, які з першай закладкі печы поўнасцю апраўдаў затрачаную суму на яго будаўніцтва.

12 кастрычніка зроблена другая закладка печы цэглай, якая ўжо дасць калгасу 2600 рублёў чыстага прыбытку.

16 кастрычніка.

1400 КІЛАГРАМАЎ ЖЫТА НА ПРАЦАДНІ

Калгаснікі калгаса «VIII з'езд Саветаў» Нясяцкага сельсавета Пенцюх Даня са сваім сынам Мішам выпрацавалі 1000 працадзён. Пры размеркаванні авансаў на працадні яны атрымалі 1400 кілаграмаў жыта.

У гэтым годзе ў калгасе «VIII з'езд Саветаў» будзе атрымана на працадзень не менш як па 5 кілаграмаў бульбы. Пенцюх Даня на свае працадні атрымае 6—7 тон бульбы.

20 кастрычніка.

ЗАМОЖНАЕ ЖЫЦЦЁ Ў КАЛГАСЕ

З кожным годам нашы калгасы становяцца сапраўды бальшавіцкімі, а калгаснікі заможнымі. Нядрэнны ўраджай на сваіх палях атрымаў калгас «Зара» Усохскага сельсавета. Калгаснікі добрасумленна працуюць, заваёўваюць сабе сапраўды заможнае і культурнае жыццё. Вось калгаснік Крыскавец Осіп П. У гэтым годзе яго сям'я выпрацавала 990 працадзён. Сам Крыскавец выпрацаваў 365 працадзён, жонка яго — 300 працадзён і два астатнія члены сям'і — ад 95 да 230 працадзён. На свае працадні сям'я атрымала вялікую колькасць збожжа, іншых прадуктаў і грошай. Збожжа атрымана 1188 кілаграмаў, бульбы — 6000 кілаграмаў і грошай па 1 рублю на працадзень, а ўсяго каля тысячы рублёў.

Сям'я Осіпа Крыскаўца не адзіная заможная ў калгасе. Тры працаздольныя члены сям'і калгасніка Сушко Міхася выпрацавалі 998 працадзён і на іх атрымалі збожжа 1187 кілаграмаў, бульбы — 6000 кілаграмаў і грошай 998 рублёў.

Калгаснік Каранкевіч Іван выпрацаваў адзін 434 працадні, на якія атрымаў збожжа 530 кілаграмаў, бульбы 2604 кілаграмы і грошай 434 рубл.

Так жывуць заможна і шчасліва нашы калгаснікі. *М. Д. Комар.*

15 снежня.

САЛОДКАЕ СЛОВА — ВОЛЯ!

Гісторыя без «белых плям»

Сялянскі хлопец Іван Ліпай з вёскі Курганне па волі лёсу апынуўся ў горадзе, а затым стаў актывістам калектывізацыі на сваёй радзіме. Яму было наканавана прайсці праз пекла лжывых абвінавачванняў, допытаў, турэмных катаванняў. Падзеі тых дзён ён апісаў у дзевяці сшытках свайго дзённіка, на аснове якіх журналіст А. Тоўсцік падрыхтаваў гэты матэрыял для газеты «Чырвоная змена». Змяшчаем яго першую частку — аб калектывізацыі ў в. Курганне.

Працуючы ў горадзе, я тым не менш не парываў сувязі з сям'ёй: ледзь толькі выдавалася магчымасць, ехаў да бацькоў. І вось неяк восенню 1929 года, у адзін з маіх прыездаў у Курганне, прыняў удзел у справе, якая карэнным чынам перавярнула маё жыццё: разам з вясковымі хлопцамі склалі спісы жадаючых уступіць у калгас. Рабілі гэта мы не па ўласнаму жаданню, а па даручэнню райвыканкома пры актыўнай дапамозе сельсавета. І ў выніку нарадзіўся калгас «Авангард». А старшынёй нечакана выбралі ... мяне.

Такі рэзкі паварот у лёсе і радаваў, і разам з тым палохаў. З аднаго боку, падабалася ранейшая работа ў райвыкан-

коме, было шкада кідаць яе, з другога — цягнула рамантыка чагосьці нязведанага, вялікага і значнага. Не ведаю, магчыма, я хутка б адмовіўся ад такой пашаны, але маё абранне віталі ў райвыканкоме і райкоме партыі. Бо, як высветлілася, мы ў Курганні апярэдзілі развіццё падзей — стварэнне калгаса ў раёне — аж на паўгода.

Так я стаў старшынёй калгаса «Авангард». Хіба мог я тады, малады, зялёны, уявіць, што зрабіў першы, але галоўны крок да сваіх пакут?!

Спачатку, вядома, калгас той працаваў фармальна, выключна толькі на паперы. Да таго ж далёка не ўсе жыхары вёскі ўступілі ў яго. У прыватнасці, многія сем'і падзяліліся: маладыя заявы падалі, а бацькі іх — не. Мае старыя таксама не жадалі ўступаць у калгас. У нашай хаце з гэтай нагоды было шмат і спрэчак, і лаянак, справа да скандалу даходзіла. «Так ці інакш, а калгас будзе,— пераконваў я сваіх,— і яму аддадзім самую лепшую, калі не ўсю зямлю. Што ж вы будзеце рабіць пасля гэтага? (Аб высяленні на Поўнач мы ў той час нават і ўявіць не маглі).

Як працаваць, з чаго пачаць — ні ў мяне, ні ў маіх памочнікаў ніякага ўяўлення не было. Не мелі мы ні інструкцый, ні ўказанняў «зверху». Нават Статут сельскагаспадарчай арцелі адсутнічаў. Безумоўна, не сядзелі склаўшы рукі — засядалі, спрачаліся, шукалі. І першае, што вырашылі і неадкладна ажыццявілі,— абагулілі насенны фонд яравых. Колькасць насення розных культур здавалася строга па разліку, выходзячы ад наяўнасці зямлі, якую апрацоўваў кожны двор. Ніякай бухгалтэрыі ў нас не існавала, не вялося ніякіх прыходна-расходных дакументаў. План-разлік склаў я, прымаў насенне хто-небудзь з праўлення, часцей — Іван Міськевіч. Ён жа запісваў, хто што здаў, такім жа чынам фіксаваў і расход...

Жывёлу мы вырашылі абагуліць вясной, а да таго часу пабудаваць жывёльныя двары. Нарыхтавалі матэрыял для будаўніцтва — лес у калгасе быў свой. Коні ж яшчэ заставаліся ў сваіх гаспадароў, і тыя па парадах выязджалі самі або давалі коней іншым.

Усё гэта было не так проста, як можа здацца. Як высветлілася, не адны мы ў сваім «Авангардзе» тапталіся ў цемры. Многія кіраўнікі самых розных рангаў таксама не разумелі, што да чаго. Большасць з іх лічыла: калі ёсць загад, інструкцыя — справа сама па сабе пойдзе.

А што ж самі людзі, народ?

А людзі згаджаліся (стары прынцып: начальству лепш відаць), галасавалі. І толькі потым ужо пачыналі думаць. А самая сапраўдная бітва розумаў пачыналася пасля сходу на вуліцы, па хатах.

Былі і ў нас спрэчкі, сумненні, але мы ўсё ж знаходзілі з людзьмі агульную мову, не прыбягалі да пагроз і прымусаў.

Так адбывалася да вясны 1931 г. А той вясной грымнула суцэльная калектывізацыя сельскай гаспадаркі і, адпаведна, ліквідацыя кулацтва. І ўсё наша жыццё ў калгасе, ужо больш-менш адладжанае, паляцела дагары нагамі.

Кампаніі суцэльнай калектывізацыі папярэднічала кампанія абмежавання кулацтва. З гэтай нагоды, як у першыя гады пасля рэвалюцыі, ствараліся камбеды. Але, бывала, ніякіх выбараў у іх не праводзілася — запрашаліся ў камбед не самыя бедныя, а часцей — паслухмяныя людзі.

Вось пры дапамозе такіх «работнікаў» праводзілася індывідуальная апрацоўка асобных заможных сялян.

На здачу прадукцыі дзяржаве ўстанаўлівалі нормы і тэрміны. Калі хто ў той тэрмін не паспеў справіцца, то літаральна на наступны дзень яго чакаў суд і прысуд — не менш як 5 гадоў.

Калі ж норму выканаў — на наступны раз яе павялічвалі. І так да той нары, пакуль ён не мог асіліць. Вынік — прысуд. Так, напрыклад, Белячонак вярнуўся да нас з Амерыкі ў 1927 г. Грошы меў. І вось ён, купляючы на долары збожжа, 3 разы выконваў заданне. А ў чацвёрты раз зразумеў: усё дарэмна і добраахвотна пайшоў у суд «за тэрмінам».

Такія закупкі насення «кулакамі» ўзвінцілі цэны на рынку. Калі ў 1924—28 гадах восенню цэны на жыта не перавышалі 50 капеек за пуд, то восенню 1929 г. яны скокнулі ўдвая — да 1 рубля за пуд. І гэта было выкарыстана для агітацыі. Усюды крычалі: «Кулак хоча задушыць голадам вясковую беднату!»

Памятаю, у спажывецкую кааперацыю паступіла мука, якую прадавалі па спісках камбеда па 1 рублю. А калі «кулак» Карабановіч стаў прадаваць такую ж муку ўдвая танней — яго аддалі пад суд за ...эканамічную контррэвалюцыю.

У канцы зімы 1930 г. пачалася кампанія па суцэльнай калектывізацыі. Праводзілі яе камандзіраваныя з горада рабочыя брыгады ды мясцовыя актывісты. Збіраліся ўсе звычайна ў хаты і гутарылі да пеўняў. Якую толькі лухту ні неслі тыя прадстаўнікі, і аб якіх толькі глупствах ні пыталіся ў іх сяляне... Жыццё

будучае малявалася ў чароўных фарбах (рэдка хто разважаў разумна).

Гэта былі метады, пры дапамозе якіх знаходзіліся шляхі да сялянскага сэрца. Бо кожны такі брыгадзір з горада атрымліваў заданне стварыць калгас, чаго б гэта ні каштавала. Калі не ўдавалася адразу, то сходы вяліся бясконца.

Калі ж хто з сераднякоў вагаўся — уступаць ці не, камбеды дасылалі такім паведамленне аб індывідуальным абкладанні падаткам. Так што серадняку доўга разважаць не прыходзілася, яны ўступалі ў калгас ледзь не першыя. Раскошу на разважанне маглі сабе дазволіць толькі беднякі, большасць з якіх уступіла ў калгас апошнімі.

Але як бы там ні было, да канца зімы суцэльная калектывізацыя ў раёне была завершана. Многія вечарамі запісваліся ў калгас, а раніцай прасілі выкрасліць. І гэтак кожны дзень кагосьці запісвалі, а кагосьці выкрэслівалі.

Увогуле справа ад такой беганіны не цярпела — фармальна ўсё было ў ажуры: пратаколы складаліся, назвы калгасам нададзены, праўленні і іх старшыні абраны, усе ў райвыканкоме зарэгістраваны. Калектывізацыя праведзена «на ўсе 100».

У наш «Авангард» спачатку ўвайшлі не ўсе жыхары вёскі. Некаторыя не рашаліся на такі крок. І ў нас пайшлі сходы з самымі палымянымі прамовамі да самай раніцы...

Потым, калі «ліквідоўвалі кулакоў як клас», ранняй вясной 5 сем'яў з Кургання, з усім скарбам, пад канвоем накіраваліся на Поўнач. Цяжка было без слёз глядзець на пакуты людзей. Я адвярнуўся. Мне было іх шкада, бо не бачыў прычыны для такой жорсткай расправы: ехалі з дарослымі і дзеці. Усе высяленцы — і старыя, і малыя — плакалі, але ішлі пакорліва насустрач лёсу.

У Курганні гэта працэдура ў параўнанні з іншымі вёскамі раёна прайшла, аднак, спакойна. І тут варта аддаць належнае брыгадзіру брыгады, якая прыехала да нас. Гэта быў рабочы з Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната, спакойны і гуманны чалавек. Толькі дзякуючы яму ў нас не адбылося грабяжоў маёмасці выселеных. Іх маёмасць, жывёла, інвентар, дамы былі канфіскаваны. Мы склалі адпаведныя дакументы, сачылі за парадкам у вёсцы. Услед за імі выселілі ўсіх «дызерціраў», хаця яны прыжыліся і ніякай шкоды нікому не рабілі.

У выніну гэтых падзей быў закладзены ў нейкім сэнсе эканамічны фундамент стварэння калгаса. Сяляне мелі магчымасць паразважаць: што лепш — быць выселеным ці ўступіць у калгас.

Неўзабаве скліналі сход, дзе рашалі пытанне пра абагульненне ўсіх гаспадарак, жывёлы, аж да курэй. Сход быў бурным і ішоў амаль суткі. Большасць удзельнікаў, і я таксама, выступалі супраць такой авантуры. Я даказваў, што мы не падрыхтаваны да такога абагульнення, а прапанаваў зрабіць гэта пасля пабудовы гаспадарчых двароў, бо не было дзе размясціць нават канфіскаваную ў кулакоў жывёлу.

Шмат якіх доказаў прыводзілі, але раённае кіраўніцтва не згаджалася. Сход зацягваўся, і калі большая частка прысутных раз'ехалася дадому, астатнія, каб хутчэй разысціся, вырашылі — усё абагуліць. Вось тады пачаліся нашы сапраўдныя мукі. Жывёле, якую здавалі ў калгас, стаяць было недзе. Гаспадары плакалі, гледзячы, як каровы стаялі пад адкрытым небам. Людзі, якія вечарам здавалі жывёлу ў калгас, раніцай забіралі яе дадому. Агульны сход у выніку рашыў не прызнаваць пастанову па абагульненню.

А то, памятаю, прыехаў да нас упаўнаважаны ГПУ Аўсянкін і патрабуе склікаць сход. Добра. Сабраўся народ, я — старшынствую. Даю слова Аўсянкіну. Той падняўся, дастае з кабуры рэвальвер, кладзе на стол і пачынае сваё выступленне. «Хвілінку,— спыняю яго і кажу гучна: Таварышы,, грамадзянін Аўсянкін незаслужана абразіў нас. Каму трэба, той даўно выехаў у Польшчу, а мы, беларусы, жывём і будзем жыць на сваёй Радзіме. І таму прапаную пазбавіць таварыша Аўсянкіна слова!» Мяне падтрымалі. Аўсянкін, як шалёны, дрыжачымі рукамі нешта піша ў блакноце. Сход ідзе. Аўсянкін падсоўвае мне паперу. Чытаю: «Падпіска. Я, Ліпай Іван, даю слова такога-та чысла прыйсці ў ГПУ да ўпаўнаважанага Аўсянкіна». Разрываю падпіску і кажу: «Грамадзянін Аўсянкін, прашу пакінуць сход і нашу вёску, а то звяжам і завязем у Бабруйск».

Так я наклікаў на сваю галаву навальніцу, аб чым нават і не падазраваў. Але на пэўны час нас зноў пакінулі ў спакоі.

А тым часам Сталін рашыў, што сяляне не павінны ні піць, ні есці, ні апранацца — я хачу сказаць аб кошце працы

калгасніка, таварнай прадукцыі калгасаў. На здачу таварнай прадукцыі складаўся дагавор — кантрактацыя. Спецыялістаў у нас не было, усе складалі і падлічвалі самі. Разлік аб'ёму таварнай прадукцыі на 1930 г. я зрабіў больш-менш правільна. І ў адносінах аб'ёму ў нас з інспекцыяй, з якой заключалі дагавор, спрэчак не было. Яе прадстаўнік падпісаў ужо паперу, а я ўсё пералічыў — і мне стала дрэнна. «Браточкі,— кажу,— вы ж нас абрабаваць хочаце! Як можна 30 капеек за цэнтнер жыта плаціць! Яно ж у нас — галоўны прадукт. Галоднымі застанемся!» Мне ў адказ: «Цэны дзяржаўныя, спрачацца няма пра што!»

Карацей, адмовіўся я падпісваць дакумент і паставіў пытанне аб правільнасці сваіх дзеянняў на агульным сходзе. Усе мяне падтрымалі.

Наступная размова — у кабінеце старшыні райвыканкома. Доўга ён пераконваў мяне ў неабходнасці надпісаць дагавор: «Згодзен я з табой — цэны нізкія, але ж нічога нельга тут зрабіць, падпісвай!»

Я стаю на сваім: «Абутак жа нам ніхто не прадае ніжэй сабекошту? Значыць, і мы не можам прадаваць свой таварны хлеб за паўцаны. Падпісаць такі дагавор для мяне — здрада сваім жа калгаснікам».

Потым маім субяседнікам стаў ... Аўсянкін. Ён адразу заявіў без лірыкі: «Ты арганізаваў кулацкі калгас, і сам ты падкулачнік!» У адказ на яго пагрозы я ўстаў і пайшоў да дзвярэй, не звяртаючы ўвагі на пагрозы: «Арыштую». Бо быў перакананы ў сваёй праваце і нікога і нічога не баяўся.

Кіраўніцтва раёна вырашыла ад мяне пазбавіцца, каб не падаваў «дрэнны» прыклад. А для гэтага патрэбна была зачэпка. Яе знайшлі — неўзабаве чытаю ў пастанове Бабруйскага акруговага выканкома: «Пазбавіць Ліпая І. П. выбарчых правоў як злоснага элемента і залічыць у тылаапалчэнне» (Прызыўная камісія залічыла мяне ў тэрытарыяльныя часці). Яўнае парушэнне Канстытуцыі СССР, але пратэставаць я ўжо не мог, бо сіла і ўлада былі не на маім баку...

Жнівень трыццатага быў для мяне сумным — я ўжо не старшыня, нават не член калгаса, а «лішэнец», якога з шумам і грукатам вытурылі з «Авангарда». Няма чаго граха таіць, многія аднавяскоўцы радаваліся гэтаму. Яны, наіўныя, думалі: «Так яму і трэба, таму Ліпаю! Калі б не ён, то і ніякага калгаса ў Курганні не было б. А то, бачыш, выслужыцца хацеў. Вось і атрымаў!»

Хтосьці і шкадаваў, але не столькі мяне, колькі калгас: усе ведалі — Іван Кашкан, выбраны замест мяне «па рэкамендацыі» улад, наўрад ці здолее настаяць не тое што за гаспадарку, але нават і за сябе, быў ён адным з самых адсталых, забітых у нашай вёсцы. І круцілі ім у любы бок.

І. Ліпай.

Чырвоная змена. 1989. 18—19 крас.

Бацэвіцкі пан — Міністр Польшчы

Пра пана Незабытоўскага з Бацэвічаў хадзіла нямала добрых чутак. Калі заводзілі пра яго гаворку, мой дзед Васіль, помню, заўжды сцвярджаў: «О, гэта быў чалавек... Адукаваны... Гаспадарлівы... Сумленны...» І тут жа для доказу прыводзіў прыклады.

Завітаў неяк Незабытоўскі да кавалёў у кузню і кажа: «Мужчынкі, зрабіце вядзерца. Я пасля абеду забяру». І пайшоў. Да сёмага поту завіхаліся кавалі — нічога не выходзіць. Калі ўбачыў усё гэта пан, усміхнуўся і сам узяўся за справу: раскроіў бляху, замацаваў палудай швы, накінуў почапку. «Вось бачыце, мужчынкі, гэта ж так проста...»

А пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пайшла пагалоска, што Незабытоўскі ад'язджае ў Польшчу і прадае збожжа. Дзед мой да яго. Калі пан даведаўся, што прыйшлі купляць збожжа, пашкадаваў: «Пазнавата. Збожжа ўжо на станцыі. Але калі паспееце — прадам». Узяў задатак. А ранкам мужыкі нагрузілі падводы збожжам, ехалі і хвалілі пана: «Грошы за збожжа былі ў яго ў кішэні, мог бы і ехаць у Польшчу. А ён, бач, не паквапіўся».

А пазней, калі я ўжо быў журналістам і па заданні рэдакцыі прыехаў у Клічаў на насяджэнне савета ветэранаў калгасаў — тады ў модзе былі розныя начыны,— мне захацелася сустрэцца з кім-небудзь з Бацэвічаў, хто ведаў таго самага пана Незабытоўскага. Даволі ветлівы чалавек (не памятаю прозвішча) сумеўся трохі і адказаў: «Вам жа пра пана трэба нешта дрэннае. А я дрэннага пра Незабытоўскага (ды не толькі я) нічога сказаць не магу».

Белакаменны палац Незабытоўскага стаяў на высокім беразе Ольсы і быў відаць (я гэта помню) далёка навокал. У час Вялікай Айчыннай вайны яго разбамбіла нямецкая авіяцыя. А пасля вызвалення рэшткі палаца разабралі на цэглу.

У час работы над гэтай кнігай з дапамогай навукоўцаў і супрацоўнікаў пасольства Рэспублікі Польшча ў Мінску нам пашанцавала адшукаць цікавыя звесткі і пра Незабытоўскага, і пра яго палац у Бацэвічах.

У. Салановіч.

Незабытоўскі Караль Станіслаў (1865—1952), дзеяч земскіх арганізацый, член расійскага Дзяржаўнага савета, міністр земляробства і сенатар Рэчы Паспалітай. Нарадзіўся 4 лістапада ў Аляшэвічах Гродзенскага павета (паводле некаторых крыніц, у Гродне), сын Канстанціна і Цэлесціны з Каменскіх. У 1879 г. разам са старэйшым братам Стафанам паступіў у 4-ы клас класічнай гімназіі ў Вільні (у тым самым класе вучыліся Юзаф і Браніслаў Пілсудскія). Пасля атрымання атэстата сталасці ў 1884 г. Незабытоўскі паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Пецярбургскага універсітэта, які скончыў у 1889 г. Потым заняўся сямейнымі маёнткамі (з цэнтрам у Бацэвічах) у Мінскай і Гродзенскай губернях, у валоданне якімі ўступіў пасля смерці бацькі. Кіраваў тады маёнткамі маці, братоў і сясцёр і сваім уласным; заснаваў і пашырыў 27 прадпрыемстваў харчовай і дрэваапрацоўчай прамысловасці. Браў удзел у рабоце Мінскага сельскагаспадарчага таварыства і Таварыства вінакурaў, дапамагаў польскім памешчыкам, якім пагражала банкруцтва. Быў таксама з 1897 г. міравым суддзёй у Бабруйску. У 1911 г., пасля адмовы Рамана Скірмунта ад мандата члена Дзяржаўнага савета, увайшоў у склад Савета, замяніўшы яго па даручэнні памешчыкаў Мінскай губерні, і заставаўся ў Савеце да заканчэння тэрміну яго паўнамоцтваў у 1912 г. У час 1-й сусветнай вайны Незабытоўскі, верагодна, па-ранейшаму знаходзіўся на Мішчыне. 30 красавіка 1918 г. камандзір 1-га польскага корпуса генерал Юзаф Доўбар-Мусніцкі нрызначыў Незабытоўскага членам Камісіі па ліквідацыі маёмасці корпуса. Ён уваходзіў таксама ў Бабруйскую грамадзянскую управу, якая дзейнічала на занятых корпусам тэрыторыях, і арганізаваў у Бабруйску польскую гімназію.

У чэрвені 1918 г. на 2-м польскім з'ездзе ў Мінску Незабытоўскі ўвайшоў у склад камітэта Польскага савета зямлі Мінскай. Позняй восенню 1918 г. ён апынуўся ў Варшаве. Стаў дзеячам Саюза мінскіх памешчыкаў. 18 студзеня 1919 г. ў якасці прадстаўніка Саюза разам з Эдвардам Вайніловічам удзельнічаў у размове з кіраўніком амерыканскай ваенна-палітычнай місіі, прадстаўляючы патрабаванні мінскіх памешчыкаў аб прызнанні Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. У студзені 1919 г. разам з Міхалам Ястжэмбскім Незабытоўскі быў прадстаўніком Саюза мінскіх памешчыкаў і Савета Мінскага сельскагаспадарчага таварыства на пасяджэннях, скліканых па ініцыятыве старшыні Цэнтральнага сельскагаспадарчага таварыства Мар'яна Кінёрскага і выступаў супраць зямельнай рэформы без кампенсацыі. Вясной 1919 г. Незабытоўскі прызначаны ўпаўнаважаным польскага Чырвонага Крыжа на Беларускім фронце. Пасля заняцця Мінска польскімі атрадамі ў жніўні 1919 г. Незабытоўскі атрымаў у арэнду склады Сельскагаспадарчага сіндыката (Гандлёвага аддзела пры Мінскім сельскагаспадарчым таварыстве) і займаўся сваёй дзейнасцю пад эгідай Мінскага памешчыцкага сіндыката да таго часу, пакуль у ліпені 1920 г. Мінск не заняла Чырвоная Армія. На сходзе Мінскага сельскагаспадарчага таварыства 1 мая 1921 г. ў Варшаве быў сярод 54 чалавек, якія падпісалі пратэст Савета таварыства супраць ратыфікацыі Рыжскага дагавора. У выніку дэлімітацыі ўсходняй граніцы Незабытоўскі страціў усе свае маёнткі і прадпрыемствы на Беларусі. На польскім баку засталіся маёнткі, што належалі яго жонцы: Хотаў (2300 маргоў) непадалёку ад Стопліц, Глыбокае і Аляшэвічы (разам 2360 маргоў) у Гродзенскім павеце. Ён купіў участак (84 маргі) у Аркушэве пад Гнезнам і гаспадарыў на ім да майскага пераварота 1926 г.

У маі 1926 г. Незабытоўскі прыехаў у Варшаву і 31 мая праз 37 гадоў спаткаўся з Пілсудскім. У час размовы выказаў яму свае крытычныя заўвагі пра атрыманую ў спадчыну ад Уладзіслава Грабскага гаспадарчую палітыку, накіраваную на паніжэнне цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю. Погляды Незабытоўскага, як і перакананне Пілсудскага, што Незабытоўскі «разбіраецца» ў сельскагаспадарчых справах, а таксама даўняе гімназічнае сяброўства вызначылі далейшы палітычны шлях Незабытоўскага. Важную ролю адыграў таксама факт, што Незабытоўскі належаў, разам з Аляксандрам Мейштовічам, Яўстахам Сапегам, Альфонсам Парчэўскім, Мар'янам Здзяхоўскім, Янам Тышкевічам і Станіславам Мацкевічам, да вядучых дзеячаў створанай у ліпені 1926 г. ў Вільні кансерватыўнай групоўкі Арганізацыя дзяржаўнай кансерватыўнай працы (АДКП) і, верагодна, разам з Мейштовічам прыйшоў да падтрымкі АДКП палітыкі супрацоўніцтва з Пілсудскім. Выкліканы да яго Незабытоўскі ў верасні 1926 г. атрымаў прапанову прыняць партфель міністра земляробства і дзяржаўнай маёмасці ва ўрадзе, які стварaў Пілсудскі. Незабытоўскі, у сваю чаргу, прапанаваў кандыдатуру Мейштовіча на пост міністра юстыцыі, з чым Пілсудскі пага-

дзіўся. Новы ўрад быў прыведзены да прысягі 2 кастрычніка 1926 г. Прысутнасць у ім Незабытоўскага, Мейштовіча і Енджэя Марачэўскага маршалак сейма Мацей Ратай назваў «сапраўднай сенсацыяй». Хутка потым абодва кансерватыўныя міністры, Незабытоўскі і Мейштовіч, суправаджалі Пілсудскага ў час яго спаткання ў Нясвіжы (26 кастрычніка) з кіраўнікамі кансерватыўнага лагера ў Польшчы.

Прыступіўшы да выканання службовых абавязкаў, Незабытоўскі распачаў кампанію па павышэнні цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю і ліквідацыі пошлін на экспарт. Выкарыстанне кан'юнктуры на сельскагаспадарчую прадукцыю за мяжой і большы прыліў замежнай валюты ў Польшчу, павышэнне цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю павінна было, на думку Незабытоўскага, палепшыць гаспадарчую сітуацыю краіны і матэрыяльную — грамадства. Але віцэ-прэм'ер Казімеж Бартэль быў нрыхільнікам палітыкі нізкіх цэн на хлеб у Польшчы, і Незабытоўскі вымушаны быў спрыяць дзеянням, якія супярэчылі яго поглядам. 26 лістапада 1926 г. Незабытоўскі ўвайшоў у камісію Савета Міністраў для распрацоўкі падрабязных нрапаноў у справе зніжэння цаны на жыта на ўнутраным рынку. Ад імя камісіі Савету Міністраў быў прапанаваны праект забароны вывазу жыта або ўвядзення пошліны на вываз жыта. 5 студзеня 1927 г. Савет Міністраў прыняў рашэнне ўстанавіць экспартную плату на жыта. Прапановы Незабытоўскага мелі невялікія шанцы быць рэалізаванымі, улічваючы, што ў пастаўках для войска сельскагаспадарчай прадукцыі па нізкіх цэнах быў зацікаўлены і сам прэм'ер Пілсудскі як міністр па вайсковых справах. Незычліва ставіўся да Незабытоўскага і Мейштовіча віцэ-прэм'ер К. Бартэль, а міністр прамысловасці і гандлю Эўгеніюш Кваткоўскі быў не згодны з увядзеннем пошліны на сельскагаспадарчыя прадукты, імпартаваныя ў Польшчу, напрыклад на рыс. Свае ідэі Незабытоўскі выклаў у артыкуле «Прычыны заняпаду эканомікі ў Польшчы і як іх ліквідаваць», які быў надрукаваны 7—8 лістапада 1926 г. ў кансерватыўнай газеце «Słowo» («Слова»), дзе паміж іншым звяртаў увагу на празмерную забюракратызаванасць дзяржаўнай адміністрацыі, крадзяжы і злоўжыванні, слабасць крэдытнай палітыкі. Крытыкаваў таксама празмерна шырокую грамадскую апеку і выказваўся супраць сельскагаспадарчай рэформы, а сродак для паляпшэння сітуацыі бачыў у эміграцыі. 26 лістапада 1926 г. ён дамогся пастановы Савета Міністраў пра змену закону ад 17 сакавіка 1925 г. аб Дзяржаўным сельскагаспадарчым савеце, адмяняючы абавязак яго склікання міністрам земляробства і дзяржаўнай маёмасці. З яго ўдзелам ухвалена пастанова Савета Міністраў ад 5 студзеня 1927 г. аб парцэляцыйным плане на 1928 г. і прыняты спіс маёнткаў, якія падлягалі парцэляцыі ў 1927 г. Сейм 22 сакавіка 1927 г. галасамі правых і цэнтра адхіліў прапанову Польскай сялянскай партыі (ПСП) «Вызваленне» аб вотуме недаверу Незабытоўскаму і Мейштовічу. У новым урадзе К. Бартэля Незабытоўскі застаўся на сваёй ранейшай пасадзе (з 13 красавіка 1927 г. афіцыйная назва «міністр сельскай гаспадаркі»), магчыма, па прапанове Ю. Пілсудскага.

У сувязі з неспрыяльнай сітуацыяй у сельскай гаспадарцы дзяржава спрабавала ў 1927 г. ўмяшацца ва ўнутраны сельскагаспадарчы рынак шляхам стварэння праекта, які датычыў рэзерваў збожжа і разглядаўся ў маі таго ж года Эканамічным камітэтам міністраў. Незабытоўскі выказаўся супраць гэтай акцыі і зазначыў, што важнейшай справай з'яўляюцца дзеянні ў кірунку павелічэння сельскагаспадарчай прадукцыі. Ён патрабаваў зніжэння тэмпу сельскагаспадарчай рэформы і абмежавання парцэляцыі, што, на яго думку, змяншала вытворчасць збожжа. У сакавіку 1928 г. Незабытоўскі абраны ў Сенат Рэчы Паспалітай па спісе № 1 (беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам) у Палескім ваяводстве і засядаў у ім у якасці аднаго з лідэраў кансерватыўнага крыла разам са Здзіславам Тарноўскім. Улетку 1928 г. ён неафіцыйна наведаў Прагу і па запрашэнні прэзідэнта Чэхаславакіі Т. Масарыка меў з ім размову на тэму нольска-чэхаславацкіх стасункаў. У сакавіку 1929 г. Незабытоўскаму ўдалося дамагчыся, нягледзячы на апазіцыю ПСП «Вызваленне» і Сялянскай партыі, уз'яднання Саюза сельскагаспадарчых суполак з Цэнтральным сельскагаспадарчым таварыствам. Незабытоўскі па-ранейшаму ўваходзіў у якасці міністра сельскай гаспадаркі ў склад новага ўрада Казімежа Світальскага, утворанага 14 красавіка 1929 г. Па парадзе Незабытоўскага ўрад адмяніў вясной 1929 г. экспартную пошліну на збожжа, захавалася толькі экспартная пошліна на пшаніцу да 1 жніўня 1929 г. У канцы ліпеня 1929 г. ў час адсутнасці прэм'ера К. Світальскага ўзнік канфлікт паміж міністрам фінансаў І. Матушэўскім, Э. Кваткоўскім, намеснікам Світальскага Феліцыянам Складкоўскім і Незабытоўскім у пытанні нрадаўжэння экспартных пошлін на пшаніцу да 1 лістапада 1929 г. Увосень 1929 г. Незабытоўскі зноў выказаўся супраць стварэння рэзерву збожжа, не прызнаючы ролі рэзерваў як сродку для стабілізацыі цэн.

Незабытоўскі пайшоў у адстаўку 7 снежня 1929 г. разам з усім кабінетам Світальскага і не ўвайшоў у новы ўрад К. Бартэля. Пасля заканчэння тэрміну паўнамоцтваў Сената Незабытоўскі заняўся выключна кіраваннем маёнтка Хотаў. Друкаваўся ў прэсе. З пачатку верасня 1939 г. ён быў у эміграцыі ў Францыі, потым у Англіі. Надрукаваў цыкл успамінаў з перыяду сваёй дзейнасці ў якасці міністра пад назвай «Ад школьнай парты з Пілсудскім» («Wiadomości». 1952. № 3, 7, 13, 19). Памёр 26 лістапада 1952 г. ў Бэкенхэме ў графстве Кент, у доме «Антокаль», які ўтрымліваў Грамадзянскі камітэт для пажылой інтэлігенцыі. Пахаваны на Элмерс Энд Цэметэры. Ад шлюбу з Зоф'яй Юзэфай Марыяй Ленскай меў тры дачкі: Марыю, Гелену і Ірэну.

Пераклад са скарачэннямі з кн.: Polski słownik biograficzny. Wrocław etc., 1978. T. 23, z. 96. C. 105—107.

Палац Незабытоўскага ў Бацэвічах

У 1909 г. месца старога драўлянага дома заняў мураваны, двухпавярховы палац, зроблены ў неарэнесансавым стылі. Гэты будынак, дзевяцівосевы, з падвалам, зроблены ў форме шырокага прамавугольніка, меў у пярэднім фасадзе тры не вельмі адрозныя рызаліты. Найбольш выразны быў трохвосевы сярэдні рызаліт у форме трохаркадавай і двух'яруснай лоджыі, якую вянчала выдатная прамавугольная атыкавая сценка з упісаным у яе трохвугольным карнізным франтонам. Аднавосевыя ж крайнія рызаліты падкрэсліваліся значна меншымі атыкавымі сценкамі. Іншы, чым пярэдні, быў фасад тыльны, падзелены гарызантальна на тры адрэзкі. На трохвосевым сярэднім адрэзку выступала шырокая тэраса, якая ахоплівала ўвесь садовы бок і нават заходзіла на часткі бакавых фасадаў. З-за няроўнасці ландшафту апіраўся ён на высокія слупы квадратнай формы. Псеўдарызаліты ў тыльным фасадзе крайніх восяў завяршаліся трохвугольнымі вяршынямі, прабітымі акруглым акном. Падобныя неглыбокія трохвосевыя рызаліты мелі таксама абодва бакавыя фасады. Усе нарожнікі рызалітаў у ніжнім ярусе пакрывалі падпоркі, іншыя ж дэкаратыўныя элементы былі ў выглядзе гарызантальных вальмаў, якія вянчалі прамавугольныя дзверы і вокны. Абодва фасады аддзяляў выдатна прафіляваны карніз і падобны вянчаў ярус. Палац быў накрыты не вельмі высокім вальмавым дахам.

Пра ўнутраныя памяшканні палаца мы ведаем нямнога. Здаецца, аднак, што мелі яны вельмі багатае ўбранне. На падставе фатаграфіі, апублікаванай Урбанскім, можам сцвярджаць, што скляпенне вестыбюля, відаць, у абодвух паверхах апіралася на магутныя прамавугольныя калоны з багата аздобленымі галоўкамі. У пакоі вялі адтуль дзверы, узятыя ў жалабкаваныя парталы з багата прафіляванымі вершнікамі і алебастравымі, апрацаванымі пад мармур фігурнымі барэльефамі. Палац быў запоўнены стылізаванай мэбляй, абразамі, мініяцюрамі і іншымі творамі мастацтва. Вылучаліся сярод іх калекцыя старых гадзіннікаў, урэцкага шкла, сеўраскага фарфору, старога саскага фарфору, польскага і 500 штук венскага, паводле сямейнай традыцыі заказанага ў канцы 18 ст. на пасаг Ізабелы з Райскіх Незабытоўскай з гербамі абедзвюх сем'яў.

Асаблівасцю палаца ў Бацэвічах быў зімовы сад вышынёю на абодва паверхі, зроблены пасярод садовай дарогі пры тэрасе, у месцы, дзе звычайна размяшчаўся салон або бальная зала. Зрэшты сад гэты выконваў таксама функцыю салона. Зімою памяшканне гэтае абагравалася з дапамогаю цэнтральнага ацяплення, зробленага на ўсім доме. Сярод шматлікіх гатункаў эҳзатычных раслін вырошчвалі велізарныя фінікавыя пальмы, з якіх кожная мела каля 60 лістоў даўжынёю чатыры з паловаю метры. Палац стаяў пасярод шырокага старога парку, маляўнічасць якога падкрэслівала размяшчэнне над шырокім разлівам ракі Ольсы. Па баках палаца раслі групы старых дрэў і дэкаратыўных кустоў. З фронту і з тылу цягнуліся газоны, а шырокі, адкрыты праєтор адкрываў від на раку і надрэчныя сенажаці.

Пераклад з кн.: Aftanazy R. Materiały do dziejów rezydencji. Warszawa, 1986. T. 1a. C. 138—140.

Першы прафесар геаграфіі на Беларусі

Як сапраўдны патрыёт сваёй Радзімы Аркадзь Антонавіч Смоліч рабіў усё магчымае, «каб Беларусь перастала быць краем, невядомым самім беларусам...». Ён выдаў у 1919 г. ў Вільні «Геаграфію Беларусі», якая некалькі разоў перавыдавалася. Сваю Бацькаўшчыну ён разглядаў як асобную геаграфічную і этнічную краіну, межы якой намнога шырэй за сучасную тэрыторыю рэспублікі. З захапленнем ён апісаў прыроду краю, глыбока прааналізаваў пытанні яго эканамічнага і культурнага жыцця, гісторыі і краязнаўства. Падручнік даваў поўную сістэму ведаў, выхоўваў любоў да роднай Беларусі. Гэта кніга — своеасаблівая народная чытанка, яна стаіць поруч з кнігамі В. Ластоўскага, Б. Тарашкевіча, У. Ігнатоўскага, на якіх выхоўваліся пакаленні беларусаў. Імя аўтара ў той час называлася ў адным шэрагу з імёнамі Янкі Купалы і Якуба Коласа, поруч з людзьмі, што станлі каля вытокаў беларускай дзяржаўнасці.

Аркадзь Антонавіч Смоліч, першы ў нашай рэспубліцы прафесар геаграфіі, правадзейны сябар Інстытута беларускай культуры, пасля акадэмік Акадэміі навук Беларусі, а таксама адзін з лідэраў Беларускай Сацыялістычнай Грамады, член урада Беларускай Народнай Рэспублікі, нарадзіўся 27 верасня 1891 г. ў вёсцы Бацэвічы ў сям'і псаломшчыка мясцовай царквы. Неўзабаве бацьку, Антона Аляксеевіча, перавялі ў вёску Саламерычы Мінскага павета, куды пераехала і сям'я.

Спачатку Аркадзь пайшоў па слядах бацькі: у 1901—05 гг. вучыўся ў Мінскім духоўным вучылішчы, у 1905—09 гг.— у Мінскай духоўнай семінарыі. Аднак у 1909 г. юнак змяніў свае намеры і пасля заканчэння агульнаадукацыйных курсаў семінарыі пакінуў яе. Ён стаў студэнтам Кіеўскага політэхнічнага інстытута, адкуль перавёўся ў Нова-Аляксандрыйскі інстытут сельскай гаспадаркі і лесаводства ў Пулавах (Польшча). Гэта была адна са старэйшых сельскагаспадарчых навучальных устаноў у Еўропе і другая пасля Пятроўскай (цяпер Ціміразеўская) акадэміі ў Расіі. Дарэчы, яшчэ ў 1892 г. па ініцыятыве вядомага вучонага В. В. Дакучаева, які тады быў дырэктарам інстытута, гэта ўстанова была прыраўнавана да універсітэта. Менавіта тут В. В. Дакучаевым была створана першая ў свеце кафедра глебазнаўства, студэнтам якой і стаў Аркадзь Смоліч.

Матэрыяльныя складанасці, недахоп сродкаў для існавання прымушалі юнака адначасова з вучобай клапаціцца пра кавалак хлеба, і ён зарабляў курсамі, землямернай і чарцёжнай працай. У той жа час ён актыўна ўключыўся ў грамадскае жыццё, удзельнічаў у рэвалюцыйных і студэнцкіх гуртках. а ў 1910 г. уступіў у партыю Беларуская Сацыялістычная Грамада. Палітычная дзейнасць першакурсніка стала вядома кіраўніцтву інстытута. У лютым 1910 г. за ўдзел у забастоўцы яму аб'яўлена вымова, а ў кастрычніку таго ж года па пастанове прафесарскай рады ён выключаны з ліку студэнтаў. Яшчэ больш сур'ёзнае пакаранне вынес варшаўскі генерал-губернатар, забараніўшы Смолічу жыхарства ў Варшаўскай і Люблінскай губернях.

У лістападзе 1910 г. А. Смоліч вярнуўся ў бацькоўскі дом у в. Саламерычы. Нібы падводзячы вынікі гэтага перыяду свайго жыцця, ён пісаў у дзённіку: «Яшчэ ў бытнасць сваю ў Пулавах розныя ўспаміны — дзіцячыя, натуральная любоў да роднай прыроды і да ўсяго роднага нарадзілі пачуццё патрыятызму Беларускага. Ён падтрымаўся і шмат умацаваўся беларускай літаратурай». Тут, напэўна, былі і успаміны пра роднае гняздо ў Бацэвічах, дзе прайшлі гады маленства. Любоў да геаграфіі ў А. Смоліча, відаць, і пачалася з любові да Бацькаўшчыны, з тых цудоўных бацэвіцкіх краявідаў, якія так шчодра адораны прыгажосцю, дзе, зліваючыся, цякуць дзве рачулкі з паэтычнымі назвамі Несята і Ольса.

А. Смоліч пачаў паглыблена вывучаць родны край, каб раскрыць яго харство беларускаму народу. У яго працах асветлена не толькі геаграфія Беларусі, але і гісторыя, культура, мова народа. Яго артыкулы і кнігі раскрылі вочы кожнаму чытачу на навакольны свет, выхоўвалі любоў да ўсяго роднага.

Да восені 1912 г. ён працаваў у розных мясцінах беларускага краю тапографам, каморнікам, паглыблена вывучаў родны край і жыццё народа, зблізіўся з прагрэсіўнай моладдзю, якая адыграла вялікую ролю ў палітычных падзеях 1917—20 гг. Восенню 1912 г. А. Смолічу ўдалося паступіць на Пецярбургскія вышэйшыя сельскагаспадарчыя курсы, дзе ён вучыўся да 1913 г., калі яму дазволілі аднавіць вучобу ў Нова-Аляксандрыйскім інстытуце. Зноў адначасова з вучобай А. Смоліч працаваў лабарантам у хімічнай лабараторыі Лібава-Роменскай чыгункі, каб зарабіць сабе на жыццё. Але праз тры месяцы яго звольнілі адтуль па патрабаванню жандарскага ўпраўлення як палітычна ненадзейнага. Крыніцай існавання засталося толькі рэпетытарства. Аднак вучобу ў інстытуце ён не пакінуў, узмоцнена вывучаў глебазнаўства і сельскагаспадарчую геаграфію. Тады ж у будучага вучонага ўзнікла думка працаваць над фізічнай і эканамічнай геаграфіяй Беларусі, ён пачаў збіраць для гэтага матэрыялы.

Восенню 1914 г. інстытут быў эвакуіраваны ў Харкаў. Зімой 1914—15 г. А. Смоліча як здольнага студэнта запрасілі ў навуковую экспедыцыю па бюджэтным даследаванні сялянскіх гаспадарак у розных раёнах поўдня Расіі і Украіны, якую арганізаваў камітэт па перагляду рускагерманскага дагавора. Гэту экспедыцыю ўзначальваў прафесар А. Чалінцаў, які зрабіў вялікі ўплыў на навуковую работу маладога вучонага і ў далейшым. А. Смоліч разам з будучым дацэнтам Харкаўскага сельскагаспадарчага інстытута І. Каратковым правёў экспедыцыйнае даследаванне і сабраў каштоўны навуковы матэрыял у дзесяці губернях Украіны. Атрыманы вопыт хутка спатрэбіўся маладому вучонаму для стварэння геаграфіі Беларусі, для якой ён праводзіў аналагічныя даследаванні ў 1916—18 гг.

У 1916 г. А. Смоліч скончыў тэарэтычны курс інстытута і некаторы час практыкаваўся на Энгельгартаўскай доследнай станцыі ў в. Бацішчава Смаленскай губ. Восенню 1916 г. А. Смоліч вярнуўся на Беларусь і працаваў участковым аграномам у Ігуменскім земстве, пасля — земскім статыстыкам у Мінскай земскай губернскай управе, намеснікам загадчыка статыстычнага бюро (да кастрычніка 1918 г.). На гэтай пасадзе маладому спецыялісту даверыл распрацоўку навуковых тэм, у 1917 г.— кіраўніцтва Усерасійскім перапісам насельніцтва і гаспадаркі ў Мінскай губ., а ў 1918 г., у час нямецкай акупацыі, ён кіраваў распрацоўкай матэрыялаў перапісу.

Палітычныя падзеі, што разгарнуліся ў гэты час у краіне, цалкам захапілі маладога вучонага. Ён стаяў каля вытокаў утварэння БНР. Менавіта ён выступаў з дакладам, паводле якога Рада БНР ухваліла III Устаўную грамату аб незалежнасці Беларусі. Ва урадах БНР А. Смоліч займаў пасады народнага сакратара асветы, народнага сакратара земляробства, віцэ-прэм'ера, з'яўляўся надзвычайным паслом пры Украінскім урадзе. На думку маскоўскага вучонага А. К. Каўкі, А. Смоліч — аўтар брашуры «Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя, яе мэты і задачы» (1920), у якой увасоблены погляды прагрэсіўных дзеячаў Беларусі, іх найбольш актуальныя ідэі ў тагачасны перыяд эканамічнага жыцця Беларусі. Аднак Смоліч не бачыў карысці сваёй палітычнай дзейнасці для

А. А. Смоліч.

беларускага народа, таму ў пачатку 1920-х гадоў ён пісаў аднаму з лідэраў БНР Б. Тарашкевічу: «З палітыкі выходжу, і то ў днях найбліжэйшых...»

У тыя ж бурныя (1917—22) гады А. Смоліч пачаў сваю педагагічную дзейнасць — выкладаў геаграфію на розных курсах і ў навучальных установах Мінска, Гродна, Вільні, працаваў у Цэнтральнай беларускай школьнай радзе, у 1919 г. разам з іншымі прадстаўнікамі беларускай інтэлігенцыі спрабаваў стварыць Беларускі універсітэт у Мінску.

У 1919 г. ў Берліне і Вільні выйшлі дзве карты Беларусі, складзеныя А. Смолічам. У той самы год у Вільні выйшла яго славутая «Геаграфія Беларусі», пра якую згадвалася ў пачатку артыкула. Гэта кніга — жывое апавяданне аб родным краі, яго культуры і жыхарах, аб яго прыродзе і гаспадарцы. У ёй знайшлі адлюстраванне думкі яго лепшых сяброў — беларускіх паэтаў Зоські Верас і Максіма Багдановіча, якія яшчэ ў 1917 г. марылі стварыць падручнік пра беларускі край. А. Смоліч браў на сябе геаграфію, гісторыю і пераклады з рускай мовы, а яго сябры — літаратуру, мастацтва і г. д. Але гэтыя мары тады так і не збыліся.



Мемарыяльная дошка на будынку Бацэвіцкай сярэдняй школы.

Вокладка «Геаграфіі Беларусі» А. Смоліча. 2-е выданне. Вільня. 1922.

Толькі часткова ідэі сваіх сяброу А. А. Смоліч ажыццявіу у «Геаграфіі Беларусі». Газеѓа «Звязда» назвала «Геаграфію Беларусі» лепшым падручнікам, напісаным для вучняў нашай беларускай школы.

Аднак неузабаве падручнік быў забыты, як і сам яго аўтар. Асноўнай надставай для нападкаў на падручнік было тое, што ў ім Беларусь разглядалася ў яе этнічных межах. Не улічвалася, што А. Смоліч пісаў яго на заказ урада БССР. Паказ Беларусі ў этнічных межах павінен быў, паводле меркавання урада, садзейнічаць фарміраванню больш дакладных адміністрацыйна-палітычных межаў Беларускай Рэспублікі. Гэта быў сацыяльны заказ, і А. Смоліч яго з гонарам выканаў. Дарэчы, у 20-я гады ён браў непасрэдны ўдзел у экспедыцыях і распрацоўцы абгрунтавання па устанаўленню новых межаў БССР.

У 1921—22 гг. А. Смоліч працаваў у Вільні тэхнічным кіраўніком Беларускага выдавецкага таварыства (па складанні надручнікаў), вёў інструктарскі аддзел Віленскага саюза кааператараў і перакладаў падручнікі па кааперацыі, але і гэту працу пакінуў з-за праследавання польскіх улад. Параўноўваючы палітыку Польшчы ў адносінах да беларускага народа (амаль непрыхаванай паланізацыі) і тагачасную савецкую, якая ў хуткім часе атрымала назву палітыкі беларусізацыі, ён прыйшоў да высновы, што менавіта апошняя больш адпавядае ідэалам беларускага адраджэння. І зрабіў свой выбар.

У жніўні 1922 г., атрымаўшы дазвол урада БССР (афіцыйную амністыю і права вяртацца ў БССР лідэры БНР атрымалі толькі ў 1923 г.), А. Смоліч пераехаў у Мінск (у 1920 г. ён, няхай усяго і паўгода, але працаваў у Савецкай Беларусі — у Гродзенскім губваенрэўкоме).

Пасля вяртання ў Мінск А. Смоліча накіравалі ў Наркамат земляробства БССР, дзе да 1925 г. ён працаваў аграномам-эканамістам і загадчыкам аддзела сельскагаспадарчай эканомікі і статыстыкі. За гэты час як вядучы спецыяліст апублікаваў шэраг артыкулаў па зямельных пытаннях, правёў экспедыцыйнае абследаванне асобных уласных і калектыўных гаспадарак рэспублікі. Матэрыялы адной з паездак былі выкарыстаны ў працы «Арганізацыя сялянскай гаспадаркі ў раёнах Цэнтральнай Беларусі». Гэта была дыпломная работа А. Смоліча, бо да рэвалюцыі яму так і не ўдалося завяршыць вышэйшую адукацыю. Толькі ў 1923—24 гг. ён здаў экзамены па недаздадзеных раней дысцыплінах, абараніў названую вышэй работу з адзнакай «выдатна» і рэкамендацыяй да друку (апублікавана ў 1926 г.). У 1924 г. Смоліч стаў сакратаром камісіі Дзяржплана БССР па раяніраванні. За гэту работу спецыяльнай пастановай СНК БССР яму была абвешчана «рэвалюцыйная падзяка». Аднак А. Смоліч не парваў і з Наркамземам БССР — у 1926 г. ён увайшоў у склад адной з яго калегій.

А. Смоліч працягваў і педагагічную дзейнасць: спачатку на агульнаадукацыйных курсах Галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі, а ў 1921 г.— ва універсітэце, дзе арганізаваў кафедру краязнаўства і чытаў лекцыі па геаграфіі рэспублікі і краіны. У 1925 г., паспяхова абараніўшы на радзе факультэта работу «Тыпы геаграфічных краявідаў Беларусі», А. Смоліч стаў дацэнтам кафедры геаграфіі. Распрацоўваючы пытанні ландшафтазнаўства, вучоны выказаў шэраг цікавых ідэй, правёў ландшафтнае раяніраванне рэспублікі і апісаў асаблівасці кожнага віду ландшафту. У тым жа годзе ў сааўтарстве з М. В. Азбукіным ён выдаў падручнік «Геаграфія пазаеўрапейскіх краёў» — адно з першых выданняў

Ад рэдакцыі.

Школьная камісія Беларускага Навуковага Таварыства, перагледзеўшы кнігу А. Смоліча *„Геаграфія Беларусі"*, думае, што яна будзе вельмі карыснай і патрэбнай як для вучняў у школе так і для шырокіх кругоў чытачоў Беларусі, і найбалей для вучыцялёў, ад каторых цяпер новая працоўная школа вымагае, каб яны навучылі дзяцей ня толькі пісаць і чытаць, але і добра працаваць. Скончыўшы школу, прыдзецца перш-на-перш працаваць у сваім краі. А каб магчы працаваць шчырэй і лепей, трэба яго любіць. Старая школа ўсіх тыпаў не навучыла нас любіць працу і наўмысьля адварочвала нашыя здольнасьці ад вучэньня свайго роднага: ад веды гісторыі, географіі, літэратуры і мовы беларускага народу. І мы, канчаючы нават сярэднюю школу, болей ведалі аб далёкай чужыне, чымся аб сваім родным. Дык вось цяпер прышла пара ўсім больш-менш цікаўлівым беларусам і наперад вучыцялём папоўніць вялікія нястачы старое школы і звярнуцца да свайго краю, да таго, што і як у ім было і што і як цяпер у ім ёсьць. *„Геаграфія Беларусі"* А. Смоліча дае магчымасьць папоўніць нястачу ў веданьні географіі роднага краю.

Як першая спроба, кніжка А. Смоліча павінна выклікаць да сябе цікавасьць памiж усіх добрых грамадзян Беларусі, не вытруціўшых у сабе пад цяжкім уціскам чужынцоў любоў да нашага вельмі прыгожага краю і нашага працавітага народу.

Няхай-жа чытачы гэтае кніжкі і — болей за ўсіх — вучыцялі вясковых і месскіх школ, азнаёміўшыся з *„Геаграфіяй Беларусі"* А. Смоліча, не адмовяцца паказаць нам і тое, што ім здаецца зробленым ня так, або не дароблена. Усе паўныя недахваты будуць прыняты пад увагу пры другім выданьні гэтае кніжкі.

Школьная Камісія Бел. Нав. Т-ва.
Вільня, Вастрабрамская, № 9.

1919 г. Сакавік.

Колькасьць народу Беларусі.

На Беларусі ў цяперашнім часе жыве каля *15½ міліёнаў* людзей.

На Беларускай Зямлі найбалей, ведама, жыве беларусоў. На кожную сотню чалавек прыходзіцца ў сярэднім 77 чалавек беларусоў. Значыцца *ўсіх беларусоў у Беларусі* жывець 12 *міліёнаў*.

Пасьля беларусоў найбалей жыве ў Беларусі жыдоў. З 100 чалавек жыдоў будзе *11*. А значыць ўсіх *жыдоў* у Беларусі троху балей за 2 *міліёны*.

Палякоў і маскоўцаў жыве на нашай зямлі *па 600 тысячаў* адных і другіх — значыцца з кожнае сотні будзе чатыры палякі і чатыры маскоўцы.

Жывуць у нас і іншыя народы—немцы, латышы, літоўцы, украінцы, татары, але кожнага з гэтых народаў жыве ня шмат. Немцаў ліх 50 тысячаў, іншых народаў на 30 тысячаў і так меней.

Беларусы.

Беларусы жывуць масай па усім краі. На вёсках і дварох яны займаюцца гаспадаркаю. Местачковыя беларусы займаюцца таксама найбалей гаспадаркаю, але шмат хто есьць хлеб і з майстроўкі. У мястох беларусы займаюцца рамяслом і дробным гандлем і навет гаспадаркаю. Але ня меншая частка, а ў вялікіх мястох у некалькі разоў вялікшая частка працуе рабочымі на хвабрыках, у майстроў-рамесьнікаў і ў прыватных багацейшых людзей. Апроч таго, значная частка месскіх беларусоў займаецца службаю ува ўсякіх урадах, так званай інтэлігэнцкай працай і ўрэшце належыць да тае клясы народу, якая жыве з капіталаў.

Ня усе беларусы яшчэ аразумелі хто яны і дзеля гэтага шмат хто можа і не прызнаецца, што ён беларус. Непісьменны, цёмны чалавек не прызнаецца таму, што ён ня ведае, ніхто яго не навучыў; але ёсьць шмат і добра вучаных беларусоў, якія прызнаюць сябе палякамі або маскоўцамі. Гэта таму, што іхнія дзяды і прадзеды, а можа і яны самі, здрадзілі свайму народу, вырэкліся роднае мовы і самога імя беларускага. Дык цяпер, хоць яны і ведаюць другі раз, што яны беларусы, але ўжо ня хочуць адступаць ад сваё прывычкі, ад прывычайнае мовы і ад чужога народу, да якога яны альбо дзяды іхныя прылучыліся. Ведама гэта толькі зьява пераходнага часу. Сьвядомасьць беларуская гэтак расьце, што за некалькі гадоў вернуцца да народу беларускага ўсе яго зблажучаныя сыны.

У кніжцы поўне знайдзецца шмат памылак і недахватаў. Пісана яна і выдана ў такім часе, які найменш спрые навуковай выдавецтву рабоце. Асабліва трудна было дастаць, навет у больших нашых гарадох, больш менш сьвежых, а так сама рэдкіх матэр'ялаў да географіі Беларусі. Дый трэба сказаць, што матэр'ялаў гэтых есьць наагул нягуста, навука-ж беларускай географіі, нават яе бібліографія саўсім не распрацованы. Кніга яшчэ на жаль, выдана без дагляду аўтара і гэта можа быць прычынаю розных драбнейшых недахватаў.

Але з другога боку адкладаць працу гэтую далей было нельга. Беларуская школа і курсы беларусазнаўства ня маюць ніякіх падручнікаў па географіі Бацькаўшчыны. Нацыянальны рух, шырокай ракою разьліўшыся па Беларусі за апошнія два гады, ўжо шмат цярпіць ад таго, што ня толькі шырокая публіка, а навет шмат хто з маладых беларускіх працаўнікоў, ня маюць аб родным краі найпатрэбнейшых ведамасьцяў і часта навет ня ведаюць скуль іх могуць узяць.

Урэшце масы беларусоў, прайшоўшы расейскія і іншыя школы яшчэ і дагэтуль глядзяць на родны край вачамі казённых вучэбнікаў. З аўтароў гэтых вучэбнікаў здаецца ні адзін не разумеў і не хацеў разумець, што наша Бацькаўшчына, якая подлуг іх апісаньняў, ёсьць самым бедным і няшчасным краем, сталася такою толькі дзякуючы Маскоўскаму Ураду, яго сыстэме цэнтралістычнай і русфікацыйнай. Беларуская моладзеж даведавалася ў школе толькі аб тым, што яе Бацькаўшчына—гэта якоесь адно балота, самае важнае у ёй-гэта хвароба „каўтун", а па-за-тым больш няма нічога цікаўнага.

Атручаная такою расейскаю „навукаю" беларуская маладзёж, як толькі станавілася на ўласныя ногі, старалася як найхутчэй уцякаць куды небудзь з Бацькаўшчыны ў Маскоўшчыну, Польшчу, Сыбір. А і тыя, якія заставаліся ў краю, працавалі найбольш для свайго толькі кутка, бо бачылі, які ён пекны, які багаты, як непадобен да расейскіх апісаньняў. Для ўсяго-ж краю працаваць баяліся, бо не маглі паверыць, успамінаючы школьнаю навуку, што гэты край можа быць здольным да самаістнага жыцьця.

Вось-жа калі-б тыя беларусы, што прачытаюць гэтую кніжку зацікавіліся сваей Бацькаўшчынай, каб узяліся самі за глыбейшае навуковае пазнаньне яе, ці асобных праяваў яе жыцьця, каб заахвоціліся шукаць і бачыць яе арыгінальнае харастпо, дык-бы аўтар лічыў сваю працу дайшоўшай мэты. А калі-б у іх хоць крыху пабольшала захапленьне у свае родный многапакутнай старане, такой простай і разам цудоўнай, навет у часы заняпаду свайго поўнай вялічы і схаваных сілаў, каб яны паверылі у яе вялікую будучыну і дзеля будучыны гэтай шчыра працаваць і змагацца пачалі, тады-б аўтар быў папраўдзе шчасьлівы.

Сярод рысункаў гэтай кнігі, большая частка узяты са збораў Таварыства Краёзнаўчага ў Варшаве. Паміж іх шмат ёсьць фатаграфіяў вядомага нашага земляка артысты-фотографа Яна Булгака з Вільні.

Вынятка з «Геаграфіі Беларусі» А. Смоліча

на геаграфіі мацерыкоў на беларускай мове.

Вялікая заслуга А. Смоліча ў развіцці краязнаўства Беларусі. У 1924—25 гг. ён удзельнічаў у стварэнні і стаў першым старшынёй Цэнтральнага бюро краязнаўства, якое павінна было каардынаваць дзейнасць краязнаўчых арганізацый і асобных краязнаўцаў Беларусі. Задачы краязнаўства А. Смоліч сфармуляваў наступным чынам: «...Краязнаўчая праца, аб'ядноўваючы вучонага-даследчыка і маладзенькага піянера-збіральніка калекцый, ёсць адзіная галоўная гарантыя таго, што Беларусь перастае быць краем, невядомым для саміх беларусаў, а ў выніку гэтага зменіцца выгляд усяе нашае гаспадаркі, ды і ўсяе беларускае культуры».

У 1926 г. рэктар БДУ Пічэта рэкамендаваў А. Смоліча на пасаду прафесара, адзначаючы, што «Смоліч працуе ва універсітэце на працягу 4 год з вялікім поспехам, і, акрамя гэтага, мае цэлы шэраг прац геаграфічна-гістарычнага характару, якія вылучылі дацэнта Смоліча як выдатнага даследчыка геаграфіі і эканомікі Беларусі». Паводле пастановы Народнага камісарыята адукацыі БССР 1.2.1927 г. А. Смоліч быў прызначаны на пасаду прафесара.

Гады жыцця і працы А. А. Смоліча

ў Мінску непарыўна звязаны з Інстытутам беларускай культуры (ІБК), ператвораным у 1929 г. ў Акадэмію навук БССР. Сюды ён быў запрошаны ў 1923 г. для стварэння этнаграфічнай секцыі, а пазней стаў яе старшынёй. Акрамя таго, на працягу 1925—26 гг. ён быў галоўным рэдактарам выданняў ІБК, кіраваў дзейнасцю сельскагаспадарчай секцыі і камісіі па раяніраванню, а пасля рэарганізацыі ІБК узначальваў аддзел прыроды і гаспадаркі. У 1926 г. А. Смоліч уступіў у Дзяржаўнае рускае геаграфічнае таварыства. За працы «Размяшчэнне насельніцтва па тэрыторыі БССР» і «Сельскагаспадарчыя раёны Беларускае Сав. Сац. рэспублікі ў 1927—1928 гг.: Папярэдняя схема і метадалагічныя ўвагі» у 1930 г. яму прысуджаны Малы залаты медаль гэтага таварыства. У водгуку на тыя кнігі П. П. Сямёнаў-Цян-Шанскі пісаў: «Абедзве кнігі прафесара Смоліча павінны парадаваць кожнага сапраўднага географа, т. ш. ў абедзвюх кнігах у аснову эканамічнага вывучэння краю пакладзены геаграфічныя прыкметы... Прысуджэнне Малога залатога медаля абедзвюм кнігам з'яўляецца не толькі заслужанай узнагародай паважанаму аўтару гэтых кніг, але і заахвочваннем будучым даследчыкам, якія жадаюць стаць на прапанаваны прафесарам Смолічам шлях, які уводзіць эканамічную геаграфію ў кола геаграфічных навук».

У 1928 г. А. Смоліч разам з У. Ігнатоўскім, С. Некрашэвічам, В. Ластоўскім распрацаваў першы статут Беларускай акадэміі навук, створанай 1 студзеня 1929 г., і быў прызначаны ў ёй загадчыкам кафедры геаграфіі.

Пасля 1919 г. А. Смоліч апублікаваў больш за 30 навуковых прац, якія закраналі праблемы ландшафтазнаўства, раяніравання, картаграфіі, эканомікі, навуковай беларускай тэрміналогіі. Ён працаваў над складаннем атласа Беларусі.

У сваіх працах ён не толькі зрабіў аналіз прыроды і гаспадаркі Беларусі, але і прапанаваў эфектыўныя шляхі іх развіцця. Вучоны раіў стварыць аграіндустрыяльныя камбінаты, даў схему рацыянальнага размяшчэння сельскагаспадарчых культур на тэрыторыі Беларусі. Прырода — чалавек — гаспадарка ў яго працах цесна звязаны. Вялікую ўвагу вучоных краіны тады прыцягнула ізадаліметрычная карта Беларусі, у аснову якой пакладзены суадносіны інчыльнасці насельніцтва з глебамі, што лічыцца найбольш яскравай прыкметай ландшафту. Адносна прынцыпаў складання такіх карт А. Смоліч распачаў дыскусію з пачынальнікам ізадаліметрычнага метаду П. П. Сямёнавым-Цян-Шанскім.

У 1920-я гады А. Смоліч вёў вялікую работу па стварэнні беларускай навуковай тэрміналогіі. Ён з'яўляўся рэдактарам шэрага тэрміналагічных зборнікаў, удзельнічаў у складанні батанічнага і сельскагаспадарчага выпускаў.

1930 год быў апошнім у навуковай дзейнасці А. Смоліча. У той час ужо другі год вялася кампанія па разгроме так званага нацыянал-дэмакратызму, ці як яго абразліва называлі, «нацдэмаўшчыны». Агентамі АДПУ была сфабрыкавана «справа» контррэвалюцыйнай, антысавецкай арганізацыі «Саюз вызваленя Беларусі», па якой арыштавана і асуджана калегіяй АДПУ больш за 90 чалавек — цвет беларускай інтэлігенцыі. 27 чэрвеня 1930 г. вучоны апынуўся ў Мінскай следчай турме. Разам з іншымі дзеячамі беларускай навукі яго абвінавацілі ў стварэнні нацыяналістычнай арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі».

З лістоў А. Смоліча да жонкі вядома, што і ў турме вучоны працягваў удасканальваць свае веды па замежных мовах, пісаў навуковыя працы, у тым ліку артыкул для маскоўскага картаграфічнага часопіса, навуковую працу «Да метадалогіі абласных карт насельніцтва». Але ніводная з іх так і не ўбачыла свет. Пастановай судовай калегіі АДПУ БССР ад 10.4.1931 г. А. Смоліч быў высланы ва Уральскую вобласць. 12.6.1931 г. ён ужо ў маскоўскай Бутырскай турме, потым высланы ў г. Аса (цяпер Пермская вобл.). Сюды пераехала яго сям'я — жонка і трое дзяцей. Тут А. Смоліч да 1932 г. працаваў планавіком-эканамістам у Асінскім леспрамгасе і райспажыўсаюзе. А. Смоліча па яго просьбе перавялі ў г. Ішым Омскай (цяпер Цюменская) вобл., дзе ён да 1937 г. працаваў у райкалгассаюзе (1932 г.), Саюзхарчгандлі (1933—34 гг.), выкладаў у жывёлагадоўчым тэхнікуме (1932 г.), педтэхнікуме (1933—37 гг.), чытаў таксама лекцыі на абласных курсах удасканалення настаўнікаў. Яго былая навучэнка А. Янушэўская пісала ў газеце «Ишимская правда»: «Хоць прайшло 50 гадоў, я добра памятаю Аркадзя Антонавіча Смоліча... Тое, што ён нам даў, усё ў галаве трымаецца да гэтага часу...» (2.8.1989).

2.8.1935 г. А. Смоліч атрымаў даведку аб вызваленні ад ссылкі, але «без права проживания в Москве, Ленинграде, во всех столицах союзных республик и погранполосе». Быць палітвязень імкнуўся вярнуцца да актыўнага навуковага жыцця, прапанаваў свае паслугі Варонежскаму універсітэту, але атрымаў адмову і застаўся ў Ішыме, дзе правёў шэраг экспедыцый са студэнтамі. Вынікам іх стала апошняя навуковая праца вучонага — «Зона лісцевых лясоў і займішчаў Заходняй Сібіры», якая так і засталася ў рукапісе.

У 1937 г. новы арышт. Спачатку родным абвясцілі, што А. Смоліч прыгавораны «к 10 годам без права переписки». Яго жонка, Аляксандра Ігнатаўна, усё астатняе жыццё шукала свайго мужа. І толькі ў 1957 г. яна атрымала даведку аб яго смерці: «...17.3.1943 г. в местах заключения от миокардита». У тым жа годзе прыйшло паведамленне з Цюмені: «дело по обвинению Смолича А. А., 1891 г. р., рассмотрено Президиумом Тюменского областного суда 9 февраля 1957 г. Решение тройки УНКВД от 10 июня 1938 г. отменено и делопроизводство прекращено». Аднак поўная рэабілітацыя затрымлівалася. У 1988 г. пасля запытання беларускага нісьменніка В. Быкава прыйшоў адказ: «Дело по обвинению Смолича А. А. пересмотрено судебной коллегией Верховного Суда БССР 10 июня 1988 г. Постановление коллегии ОГПУ БССР от 10 апреля 1931 в отношении Смолича А. А. отменено и дело прекращено за отсутствием в его действиях состава преступлений». І толькі ў 1990 г. на запытанне прэзідэнта Геаграфічнага таварыства Беларусі В. Аношкі прыйшоў адказ ад намесніка начальніка КДБ па Уральскай вобласці, дзе гаварылася аб канчатковым лёсе вучонага: «...по решению тройки УНКВД Омской области от 10.06.1938 г. приговорен к расстрелу. 17.06.1938 г. приговор приведен в исполнение. Место захоронения неизвестно».

Доўгія гады імя А. Смоліча выкрэслівалася з нацыянальнай гісторыі. У сувязі са 100-годдзем з дня нараджэння піянера беларускай геаграфіі ў 1991 г. ў многіх перыядычных выданнях з'явіліся артыкулы, прысвечаныя яго жыццю і творчасці, палітычнай і грамадскай самаахвярнасці ў адраджэнскай дзейнасці. На радзіме А. Смоліча ў в. Бацэвічы на будынку школы адкрыта мемарыяльная дошка. На ўрачыстым пасяджэнні выступілі вучоныя, выкладчыкі, літаратары, сяльчане, дачка вучонага. Яны адзначылі, што вялікі навуковы подзвіг заснавальніка беларускага краязнаўства, яго навуковая, палітычная, дзяржаўная, грамадская дзейнасць, само жыццё былі падначалены адной мэце — Беларусь павінна стаць краем, вядомым самім беларусам. Адзін з выдатных дзеячаў на ніве адраджэння глядзеў далёка, жыў верай у Беларускую дзяржаву. Яшчэ зусім нядаўна пра А. Смоліча памяталі ў яго родных мясцінах нямногія. Цяпер імя вядомага земляка вернута з небыцця. У гэтым пераконвае і экспазіцыя ў Клічаўскім музеі.

«НІЗАЛЕЖНАСЬЦЬ БЕЛАРУСІ»

У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа Акадэміі навук Беларусі ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў захоўваецца рукапіс артыкула А. Смоліча, які быў надрукаваны ў газеце «Беларускі шлях» 28 сакавіка 1918 г. на першай старонцы. Друкуем гэты артыкул у адпаведнасці з рукапісным тэкстам, захаваўшы граматыку і стыль таго часу.

25 сакавіка Рада Беларускай Рэспублікі абвясціла нізалежнасць Беларусі. Ня гледзячы на страшную аппазіцыю нібеларускіх элементаў Рады, беларуская частка яе на гэты раз аказалася нязломнаю. Тоя бязвыхаднае палажэнне, у якім знаходзіцца цяпер наша Бацькаўшчына, скасавало усе розніцы погляду між беларусамі. Хто беларус, той за нізалежнасць.

Нізалежнай дзяржаві Беларускай ні усьміхаецца будучыня. Прывыкшы да няволі, і пакорны народ беларускі ні стварыў моцных арганізацыяў, і цяперака, як і ўперад, можа толькі больш ці менш голасна протэставаць, але ні можа сам браць, сам тварыць свае жыцьце. Бязсільны і безабаронны ён, як і заўседы залежыць ад чужой волі і міласьці.

Зямля Беларусі апусташоная вайной падзелена на часткі. Вырастаючыя дзяржаўныя суседзі — Польшча, Літва, Украіна так сама хочуць адарваць — і поўне ім гэта удасца — значныя кавалкі беларускай тэрыторыі. Але калі пры найгоршым раздзелі, хаця кавалак зямлі беларускай атрымае рэальную волю і нізалежнасць, дык усе роўна гэтым будзе забеспечана наша нацыянальная будучыня. Усякі раздзел грозны тым, што у аддзяляемых часцінах, дзякуючы штучным перагародкам, будзе разьвівацца культура, асобнымі дарогамі будуць безкарысна траціцца сілы народные на адну і тую ж працу. Пры гэтых варунках культурнае разьвіцьце усе ж мажліва, ня гледзячы на усе перашкоды. Вось жа аглядаючыся на сучасны момант, мы з усёй пэўнасьцей можам сказаць: «калі ні згінулі да гэтага часу, дык цяпер ні згінем».

Каб абараніць сваю зямлю ад ворагаў, каб наладзіць эканомічнае і дзяржаўнае жыцьце Беларускай Дзяржаві прыдзецца

абаперціся на дужэйшага суседа. Трудна цяпер сказаць на каторага с суседзяў сваіх абапрэцца маладая рэспубліка. Мінскае Беларускае прэдстаўніцтва ясна паказуе на Гэрманію, мейсцовыя самоуправы, выбраныя ў час расейскай рэвалюцыі, пры панавальні на Беларусі усякіх «земгусарскіх» расейскіх партый, катэгарычна патрабуюць фэдэрацыі з Расеяй. Асобныя палітычныя группы выказуюцца за хаўрус з Украінай, Літвою, Польшчаю. А большасць Рады Рэспублікі стаіць на грунце поўнай нізалежнасці Беларусі. Апошняя дарога мусіць такі найлепшая. У справі дзяржаўных адносін ні патрэбна ані прынцыпіяльнасьці, ані пачуцьця. Трэба добра агледзіцца, трэба патаргавацца і трэба ісьці ў такім хаурусі, ад якога найбольш карысці іменна для свайго народу, для яго нацыянальнай і эканомічнай справы. Сьпешацца німа чаго. Трэба памятаць, што абавязкам усіх добрых беларусаў цяпер есьць — выйграць для беларускага народу максімум карысьці. А ў ігры самае галоўнае — спакойнасьць і вытрываласьць.

*Л. Б.**

Лёс Наталоўскага польскага сельсавета

У справах па абвінавачванні большасці нашых землякоў ёсць адна агульная рыса — многім прынісвалася «шпіёнская дзейнасць на карысць Польшчы». Можна лічыць, што адной з прычын такога абвінавачвання стала існаванне ў Клічаўскім раёне польскага нацыянальнага сельскага Савета.

Паводле рашэння ЦКВ БССР у рэспубліцы ў той час былі створаны Дзяржынскі нацыянальны (польскі) раён і 18 польскіх сельскіх Саветаў. Гэта выдавалася як заваёва нацыянальнай палітыкі. У іх ліку быў і Наталоўскі сельскі Савет, арганізаваны ў час перавыбараў кіраўніцтва сельсаветаў у 1927 г. (паводле іншых крыніц — у 1926 г.) з 15 населеных пунктаў Клічаўскага, Уладзіміраўскага і Каўбчанскага сельсаветаў (аб'яднаў 254 падвор'і). На працягу трох гадоў сакратаром, а затым старшынёй Наталоўскага сельсавета працаваў Р. І. Суднік. У сваіх успамінах ён пісаў: «Сельскі Савет размяшчаўся ў вёсцы Анатольеўка ў хаце Станіслава Сямашкі. Тут жа была адкрыта хата-чытальня, якую ўзначаліў Павел Сушынскі. Партыйнай і камсамольскай ячэек яшчэ не было. Затое актыўна дзейнічаў пры сельсавеце камітэт беднаты на чале з Антонам Сушыцкім. Вялікую цікавасць выклікаў кожны нумар руканіснай газеты, якую выпускалі пры Савеце. Газету перадавалі з рук у рукі, з хаты ў хату. Актыўныя селькоры — Павел і Антон Сушыцкія і Пётр Сушынскі — імкнуліся зрабіць газету цікавай і змястоўнай».

Ішоў 1927 год. Вёска рыхтавалася зрабіць першыя крокі ў калектывізацыі. Паводле сведчання Р. І. Судніка, у 1929 г. быў створаны першы ў сельсавеце калгас у в. Дубраўка. Першымі ў яго запісаліся сем'і Івана Судніка, Пятра Сушыцкага, Антона Сакалоўскага, Пятра Рыдзеўскага. Калгас назвалі імем дзеяча польскага рабочага руху Юліяна Мархлеўскага.

Так склалася, што ў вёсках і на хутарах, якія аб'яднаў польскі сельсавет, было шмат заможных сялян, многія гаспадаркі былі моцныя эканамічна. Гэта пацвярджаецца фактамі з афіцыйнай справаздачы: «Асобныя эканамічна моцныя гаспадаркі прадаюць у год па 8 свіней, на прыкладных даных 70 працэнтаў гаспадарак прадаюць па 1 свінні... Маюцца асобныя серадняцкія гаспадаркі, якія прадаюць да 150 пудоў бульбы ў год, а асобныя кулацкія — да 500 пудоў, у сярэднім па Савету кожная гаспадарка збывае 25 пудоў...»

У справаздачы за 1927 г. адзначалася: «Наталоўскі Савет у эканамічных адносінах з'яўляецца самым моцным па раёну, і гэта стварае меркаванне сярод большасці насельніцтва суседніх беларускіх вёсак, часта эканамічна не слабейшых, як аб кулацкім Савеце агульна».

Пэўна вось гэта памылковае сцвярджэнне аб польскім кулацкім Савеце таксама адыграла значную ролю ў далейшым развіцці падзей. У той жа справаздачы ёсць раздзел, які быў абавязковым для дакументаў таго часу. Вось некалькі радкоў з яго: «Праведзена самаачышчэнне калгасаў ад класава чужых элементаў, у выніку чаго выключана з калгасаў 4 чалавекі, кладаўшчыкоў 4 чалавекі, брыгадзіраў — 1. Самаачышчэнне калгасаў праводзіцца кожны тыдзень...» Гэты дакумент паднісаны старшынёй Наталоўскага сельсавета Пятром Антонавічам Зембай, які ў 1937 г. сам быў арыштаваны і выключаны з партыі як вораг народа. Земба абвінавачваўся ў тым, што ў 1935 г. быў завербаваны для шпіёнскай работы на карысць Польшчы, збіраў звесткі шпіёнскага характару аб Савецкім Саюзе, праводзіў варожую дзейнасць у сельскай гаспадарцы, каб выклікаць незадаволенасць Савецкай уладай. 28 лютага 1938 г. П. А. Земба расстраляны. У справе былога старшыні Наталоўскага сельсавета падкрэслівалася яго прыналежнасць да контрэвалюцыйнай фашысцкай арганізацыі.

Летам 1937 г. на Беларусі пачалася падрыхтоўка да III пленума ЦК КП(б)Б, які павінен быў абмеркаваць стан работы па барацьбе з замежнымі агентамі. У сувязі з гэтым з'явілася дакладная запіска Клічаўскага райкома партыі для ЦК КП(б)Б, датаваная 23.7.1937 г.

«У Клічаўскім раёне быў арганізаваны Наталоўскі нацыянальна-польскі сельсавет, у якім пераважная колькасць польскага насельніцтва. У сапраўднасці ж справа абстаіць зусім інакш. На сённяшні дзень у гэтым сельсавеце налічваецца 5 калгасаў, у іх гаспадарак 321, адпаасобных гаспадарак 21, рабочых і служачых 8 сямействаў. Усяго насельніцтва па сельсавету 1679 чалавек. Маецца 5 школ, у тым ліку 3 беларускія (адна аднакамплектная, адна — двухкамплектная), 2 польскія школы (з іх адна — НСШ). У канцы 1935 г. і пачатку 1936 г. пры ўзбуйненні калгасаў 2 калгасы Наталоўскага сельсавета зліліся з былым калгасам «Чырвоны Беларус» і калгас «Октябрь» зліўся з калгасам «Іскра камуны», яны адышлі пад Каўбчанскі сельсавет, а калгас імя Варашылава зліўся з былым калгасам імя Мархлеўскага і адышоў пад Наталоўскі сельсавет. З 1679 чалавек лічаць сябе палякамі 624, украінцаў — 8, немцаў — 4, прычым з 624 чалавек ужываюць польскую мову толькі 10 гаспадарак, а ўсе астатнія, як дарослыя, так і дзеці, ужываюць выключна беларускую мову. Дзеці гаспадароў лічаць сябе палякамі, але пры паступленні ў школу сустракаюць вялікія цяжкасці. Бо яны з самага маленькага ўзросту гаварылі толькі на беларускай мове. Маюцца выпадкі, калі беларусы пасылаюць сваіх дзяцей у польскую школу. Выходзячы з гэтага, райком партыі разглядае арганізацыю Наталоўскага сельскага Савета як апалячванне беларускага насельніцтва і просіць ЦК разгледзець гэта пытанне і перайменаваць Наталоўскі нацыянальна-польскі Савет у беларускі.

Сакратар Клічаўскага райкома КП(б) Беларусі У. Цішкевіч».

29.7.1937 г. адбыўся III пленум ЦК КП(б)Б, які абмеркаваў пытанне аб «выкрыцці ў Беларусі агентаў, завербаваных іншаземнай разведкай». На Пленуме было прынята рашэнне аб ліквідацыі Дзяржынскага (польскага) нацыянальнага раёна і польскіх сельсаветаў Беларусі. Так закончыў сваё існаванне Наталоўскі польскі сельскі Савет. У вёсцы, што ўваходзілі ў яго склад, зачасціў «чорны воран». Ён вывез шмат «польскіх агентаў», большасць з якіх так і не вярнулася назад.

Л. Ачыновіч.

Жыў-быў кулак Антон

— Вось тут і была сядзіба кулака Антона, майго свёкра,— і Вольга Фёдараўна Касцян, пажылая, прыемная з твару жанчына, якая прывяла мяне на адну з вуліц Дубровы, кіўнула на несамавіты сялянскі двор,— Бачыце, палавіна дома яшчэ ацалела.

Хата як хата — аршынаў пяць на пяць, не болей. Тоўстае ўчарнелае ад часу бярвенне. Дах з гонтаў даўно збуцвеў, і зверху быў насцелены толь, які таксама страціў сваю трываласць. Да хаты прымыкала даўгаватае памяшканне з дробнага лесу. Гэта былі сені і, пэўна, варыўня, скінутыя ў не такі далёкі час.

— Майго свёкра забралі хутчэй за ўсё не як кулака, а за багамолле,— выказвала меркаванне Вольга Фёдараўна.— Гаварылі, вельмі ён вераваў у Бога. А зямлі той у яго было якіх сем гектараў. На сям'ю ў дзесяць душ. Ну, вядома, яшчэ цягло, гавяда, веялка, якую сам зрабіў... На вялікую сям'ю быў збудаваны і дом з дзвюх хат, якія злучаліся паміж сабой сенямі. На падворку адзін да аднаго стаялі аборы, у якіх трымалася розная жывёла. Была і стайня для коней, варыўня, лазня. Усё патрабавала да сябе ўвагі, клопату і працы. А таму ўся Антонава сям'я, хто як мог, завіхаліся на гаспадарцы.

Тон у працы, вядома ж, задаваў Антон Цярэнцьевіч. Патомнаму селяніну, яму не хапала дня, каб управіцца з усімі справамі. У доўгія зімовыя вечары браўся за шытво — шыў шапкі-вушанкі. Матэрыялам для яго было тое, што прыносілі з сабой заказчыкі. І гэта ў асноўным былі сяляне з Дубровы і навакольных вёсак. Антон рэдка браў з каго якую плату. Хіба што з багацейшага селяніна.

Гэта была тая часіна, калі, каб займець рубель, трэба было прадаць што-небудзь з гаспадаркі. Асабліва ўзнікала патрэба ў грашах перад школай. Як купіць без іх

---

* Машынапісны тэкст артыкула «Нізалежнасьць Беларусі», падпісаны Л. Б. (Лаўрэн Будзіловіч, Сымон Бортнік — псеўданімы А. Смоліча).

тыя ж кніжкі для вучобы? І вось аднойчы Антон змушаны быў пайсці на кірмаш з пеўнем-пераэімкам, каб, прадаўшы яго, заплаціць там жа за падручнік па алгебры. Дзеці яго, асабліва хлопцы, цягнуліся да ведаў, і ён не чыніў ім перашкоды. Адно прасіў не забываць Бога, зямлі.

А тым часам вёску перайначвалі на іншы лад. Спачатку арганізоўваліся саўгасы, потым — калгасы. Людзі ў калектыўную гаспадарку, дзе ўсё абагульнялі, ішлі неахвотна. Асабліва тыя, хто жыў заможна. Але іх прыціскалі, абяцалі яшчэ лепшае жыццё. Сялян, хто меў асабістую нядрэнную гаспадарку, раскулачвалі — пазбаўлялі зямлі і сродкаў вытворчасці. А саміх гаспадароў — на высылку.

Дык і як было Антону, рупліваму земляробу, паспяшацца ў калгас, калі ў ім, як згадваў праз гады яго сын Уладзімір, працавалі амаль на голы працадзень. Гаспадарлівы, разважлівы чалавек не мог пабегчы ў такі калгас. Заўпарціўся, зразумела, і Антон. Узялі яго на заметку, паведамілі куды трэба, і як ні пярэчылі дуброўцы, абараняючы Антона, НКУСаўцы настаялі, каб «збавіць вёску ад сацыяльна небяспечнага элемента»...

Старажылы-дуброўцы часта распавядалі пра той страшны дзень, калі сумленнага працавітага чалавека адарвалі ад зямлі і сям'і, сілай пасадзілі на фурманку і павезлі ў свет. А ў яго жонкі Агаф'і засталося сямёра дзяцей, з іх адно грудное. Амаль увесь набытак канфіскавалі. Сям'я «ворага народа» фактычна была пакінута на самавыжыванне. Але не зачэзла, выстаяла здаровае Антонава племя, «падняла» Агаф'я і вывела ў людзі чатырох сваіх сыноў і трох дачок. Старэйшы сын Уладзімір быў адным з лепшых у раёне рахункаводаў. Усю Айчынную вайну, як кажуць, ад званка да званка быў на фронце. Вярнуўся дадому з дванаццаццю баявымі ўзнагародамі. Знакамі воінскай доблесці адзначаны і яго малодшыя браты: Валянцін (палкоўнік у адстаўцы) і Павел (доўгі час працаваў сакратаром Усохскага сельсавета). Да падпалкоўніка ракетных войск і артылерыі даслужыўся сын Пятро (цяпер у адстаўцы). У час мінулай вайны партызанскай сувязной была дачка Марыя (працавала і жыве ў Бабруйску, пенсіянерка). Дочкі Надзея і Ніна увесь час працавалі ў Дуброве. Паважаная сям'я, што і казаць.

...Развітаўшыся з гаспадыняй, я выйшаў з падворку і міжволі азірнуўся. Старая, даваенная хаціна, якую ставіў некалі Антон Касцян, сумна глядзела невялікімі вокнамі на дарогу. А ззаду, за сядзібай, прасціралася поле. Недзе там, за дваром, хадзіў з плугам руплівы гаспадар Антон Цярэнцьевіч Касцян. Ён не ўяўляў сабе жыцця без поля, і вучыў сялянскай справе сваіх дзяцей, спадзеючыся, што і яны таксама будуць земляробамі. Але тут гвалтоўная сіла скруціла яму рукі і, адарваўшы ад зямлі, сям'і і роднага ачага, пагнала яго некуды на край свету, адкуль амаль што нікому не было зваротнай дарогі.

А ён, Антон, тым і правініўся, што любіў зямлю і верыў у Бога.

* * *

Калі гэты матэрыял быў падрыхтаваны ўжо да друку, прыйшло пісьмо ад Галі Казлоўскай у адказ на просьбу дапамагчы ў зборы звестак пра яе дзеда. Вось што яна паведамляла:

«На жаль, дома ў нас зараз няма ніякіх дакументаў, што датычаць майго дзядулі. З архіва нам асабіста нічога не прыслалі. Фатаграфій таксама амаль няма. Маёй цёткі прыслалі дзве, адну яна і перадала нам. Яе мая мама і выслала вам пасля вашага прыезду...

У майго дзеда было шмат кніг, часопісаў. Ён быў пісьменны чалавек. Але яны былі знішчаны тадышняй сістэмай. Ёй не патрэбны былі пісьменныя, працавітыя, сумленныя людзі, бо такія хутка зразумеюць, дзе праўда.

Я зусім мала ведаю пра дзеда. Але і з тых крупіц я зразумела, што дзед быў вялікі ўмелец. Ён сам мог рабіць і посуд, і печ, і адзенне пашыць, і многае-многае іншае. За сваю работу ёй ніколі не браў грошай, бо лічыў сваім абавязкам дапамагчы людзям. Ён да апошняй хвіліны верыў у справядлівасць.

Былі ў нас лісты ад яго з турмы, але і яны прапалі ў час вайны...» *В. Лепікаў.*

Салодкае слова — воля!

Гісторыя без «белых плям»

Гэты матэрыял — працяг дзённікавых нататкаў Івана Ліпая з вёскі Курганне. Іх першая частка аб калектывізацыі на Клічаўшчыне (надрукавана вышэй) скончылася тым, што малады старшыня за свае незалежныя погляды трапіў у лік «злосных элементаў» і быў пазбаўлены выбарчых правоў. Далей яго чакалі лжывыя абвінавачванні, ганебнае кляймо «ворага народа», допыты, следства, турэмныя краты. Івану Ліпаю пашчасціла: як ён сам мяркуе, відаць, з-за памылкі следства ён вырваўся на волю і застаўся жыць, пакінуўшы для нас яскравыя абразкі, як дзейнічала тая жудасная машына сталінскага тэрору.

* * *

...Калі шчыра, то я не надта доўга перажываў — напісаў ліст у ЦВК рэспублікі і чакаў адказу. А пакуль — рабіў у суседнім калгасе, будаваў свіран. Звычайна я днём ніколі не спаў, а тут стаміўся, прылёг дома і заснуў. Толькі заплюшчыў вейкі, як чую: «Ваня, Ваня, уставай, міліцыя»,— трасе маці за плячо. Сеў на лаўку — стаяць перада мной міліцыянеры і паняты наш, вясковец Глушак.

— Здавай рэвальвер,— патрабаваў старшы з іх, Кручкоў.

— Вам патрэбна, дык самі і шукайце,— адказваю.

Вобыск цягнуўся доўга. Рэвальвер знайсці не маглі, хоць хадзілі літаральна побач ад яго — разам з патронамі ён ляжаў у патайной скрыні майго стала.

Нарэшце, селі складаць пратакол, а потым аб'явілі: «Ты — арыштаваны». Але сам факт арышту мяне не палохаў. «Ну што ж,— усклікнуў я — наведаем Сібір! Там таксама людзі жывуць. І відаць, не самыя горшыя». Аб чым Кручкоў напісаў рапарт начальству, які і далучылі пазней да абвінаваўчай справы.

Выйшлі з хаты. Міліцыянеры — конныя. А мне да горада трэба пятнаццаць кіламетраў дабірацца пешшу.

— Сваім ходам нікуды не пайду,— кажу ім.— Хочаце — вязіце!

Пачухалі яны патыліцы і загадалі майму сваяку, таксама Івану Ліпаю (малодшаму), узяць надводу. Той так і зрабіў, але цішком прыхапіў з хаты наган і ружжо, запіхаў іх пад сядзенне, зробленае з сена. Ён, добрая душа, цвёрда вырашыў адбіць мяне ў канваіраў і потым разам са мной пайсці куды падалей ад родных мясцін. Думаў, што на волі мне лепш будзе дабіцца справядлівасці. Аб чым Іван і прашаптаў, калі дапамагаў забрацца на воз. Але я адмовіўся ад яго-нага плана, верыў у сваю правату, што несправядлівасць будзе выяўлена, што ў горадзе суддзі ва ўсім разбяруцца. Мы паехалі.

У Клічаве мяне тут жа пасадзілі ў камеру. У камерах райміліцыі грошай на ўтрыманне зняволеных не адпускалася. Кожны еў са свайго «сідара». А ў каго не было — пераходзіў на ўтрыманне зэкаў.

Ніякага расследавання па маёй справе ў Клічаве не вялося. Не прад'явілі мне таксама ніякага абвінавачвання, а проста праз некалькі дзён адправілі ў Бабруйскае ГПУ. Прасядзеў там да цемры ў дзяжурцы. Нарэшце, павялі ў падвал. Спускаемся па змрочнай лесвіцы некуды ўніз, пад зямлю. Паварот, дзверы. Яны адчыняюцца — і далей калідор-труба, па баках якога дзверы, дзверы, дзверы...

Жудасна бразгаюць замкі, і дзверы, масіўныя, вечныя, павольна расчыняюцца.

У дзвярах тых — акенцы для падачы ежы і яшчэ «ваўчкі». Праз іх сочаць за зняволенымі. Нячутна, па дывановых дарожках у калідоры, падыходзяць у мяккіх тапачках назіральнікі і адкрываюць бязгучнае вечка «ваўчка»... Пастаянна адчуваеш, што за табою, за кожным тваім рухам нехта ўважліва сочыць. Страшнае псіхічнае катаванне!

У камеры знайшоўся брудны незаняты тапчан. Кінуўся на яго і заплюшчыў вочы — вельмі стаміўся, ноч не спаў. Было крыўдна і па-дзіцячаму хацелася заплакаць. Але баяўся выдаць сябе, сваю слабінку — я ж ужо дарослы, мужчына, не хлапчанё якое! І таму да болю закусіў губу.

У камеры сядзелі яшчэ тры чалавекі. Яны падышлі да мяне і, бачачы мой стан, стараліся хоць нечым дапамагчы, суцешыць.

— За што цябе, сынок, сюды? — спытаў адзін.

А я маўчу ў адказ, баюся расплакацца. Хоць мне і было дваццаць два гады, але я быў такім маленькім, худым, што ўпаўне мог сысці за падлетка...

..Вось, нарэшце, і першы допыт.

Следчы, здаровы, высокі, з будзёнаўскімі вусамі, у форме ГПУ. Позірк галоднага звера. Ён не назваў мяне сынком, для яго я — небяспечны элемент, здольны падарваць усе асновы дзяржавы.

— Сядай вось сюды, контра,— кіўнуў ён на табурэтку ля сцяны ў двух метрах ад яго стала.

— Сам ты контра,— злосна кінуў я ў адказ.

— Ах вось як? Ты яшчэ зубасты, аказваецца? — здзівіўся ён.— Мы з цябе кулацкі дух выб'ем.

Гутарка ў нас спачатку не атрымалася: мне пагражалі, а я — маўчаў. Следчаму гэта не спадабалася, і ён змяніў «музыку» — пачаў дружалюбна ўсміхацца, прапанаваў перасесці мне да стала і напісаць аўтабіяграфію. Але толькі — друкаванымі літарамі.

Тое, што патрабуюць аўтабіяграфію, лічыў натуральным, але вось навошта яе

пісаць па-друкаванаму? Відаць, такі тут, у ГПУ, парадак, не ўсе добра могуць разбіраць почыркі.

Праз два ці тры тыдні мне ўпершыню прад'явілі абвінавачванне: арганізаваў кулацкі калгас, адмовіўся паднісаць абавязацельствы на здачу прадукцыі дзяржаве — сабатажнік, вёў контррэвалюцыйную агітацыю сярод калгаснікаў і ў раёне, удзельнічаў у тэрарыстычным акце супраць старшыні суседняга сельсавета (той хацеў правесці на танцавальным вечары вобыск, шукалі зброю, а моладзь Кургання аказала супраціўленне. Мяне абвясцілі арганізатарам).

А галоўнае ў абвінавачванні супраць мяне — ліст на імя Сталіна (!), які нехта напісаў друкаванымі літарамі. Што ў ім было — я так ніколі і не даведаўся, бо яго мне толькі аднойчы паказалі і спыталі: «Ты пісаў?» А прачытаць так і не далі.

Аказваецца, нягоднікі з судовай экспертызы «даказалі»: ліст «правадыру» пісаў я. Нягоднікі ґаму, што потым яны ж даказалі: яго напісаў Нядбайнік. І следчы дапоўніў: пад маю дыктоўку!

І пацяклі бясконцыя допыты. Як правіла, выклікалі на іх ноччу. Гэта быў аблюбаваны метад — цягаць людзей ноччу. Следчы сходзіць дамоў, павячэрае, адпачне, падыхае свежым паветрам, кіно паглядзіць і апоўначы вяртаецца на работу — выцягваць душу з чарговай ахвяры: адбой у турме ў дваццаць дзве гадзіны, толькі заснеш — цябе на допыт. Следчы — бадзёры, поўны сіл і энтузіязму, ды яшчэ часам «пад мухай», а ты — кволы са сну і галадухі. Вось і пачынае ён з табою смяротную гульню ў «кошкі-мышкі», імкнецца спытаць як мага больш закавырыста, а пасля падлавіць на слове... Даводзілася пастаянна быць у напружанні, каб не «заляцець», не ляпнуць чаго, каб абвергнуць чарговы бязглузды «аргумент», падтасаванне фактаў... З кожнага допыту, які працягваўся не адну гадзіну, я вяртаўся знясілены, ледзьве валачыў ногі і тым не менш не мог заснуць да раніцы. А днём, як правіла, допыты ўзнаўляліся.

Следчы дабіваўся ад мяне прызнання па ўсіх пунктах абвінавачвання. Але я вінаватым сябе ні ў чым не прызнаваў.

Толькі днём у камеры, сярод «сваіх», мог крыху адпачыць, правесці спакойна некалькі гадзін. А ноччу пачыналіся кашмары ў маіх суседзяў — следчыя іх «справы» закончылі і накіравалі ў калегію ГПУ. І вось гэтыя бедныя людзі не спалі кожную ноч, не маглі спаць — чакалі выканання пастановы калегіі. А яна, як правіла, выносіла рашэнні завочна, і амаль заўсёды прысуд адзін — расстрэл.

За смерцю ж выклікалі абавязкова ноччу. Вось зашумеў на дварэ матор аўтамашыны — і ўсе імгненна напружыліся, услухоўваюцца, чакаюць вырашэння свайго лёсу. Вось чутны і шум у калідоры-трубе: кагосьці выклікаюць, кагосьці валакуць. Чуваць крыкі — бойка недзе пачалася, развітальныя выкрыкі...

І са «сваёй» камеры мне даводзілася праводзіць людзей на смерць. Цяжка, немагчыма перадаць тыя трагічныя мінуты, тое, што рабілася ў камеры. Вось яны, здаровыя людзі, развітваюцца назаўсёды з табой і праз некалькі мінут стануць крывавай здабычай бязлітасных катаў. Мы тыднямі, месяцамі спалі разам, елі з адной міскі, расказвалі пра сябе адзін аднаму. І натуральна, вельмі пасябравалі... Я праводзіў чалавек дзесяць. Прозвішчы іх ужо, на жаль, сцёрліся з памяці.

Жыхары камеры мяняліся. Рэдка каго забіралі днём — толькі, калі давалі тэрмін. Днём жа прыводзілі новых няшчасных — як правіла, пажылых сялян не з беднякоў. І ўжо адно гэта з'яўлялася тады ў вачах ГПУ самым страшным злачынствам.

Тэхніка знішчэння людзей у той час была ўжо больш-менш адпрацавана,— чалавека звязвалі дротам ззаду за пальцы рук. Калі хто спрабаваў крычаць — надзявалі на галаву гумавы мяшок. Супраціўляўся — білі, каб зваліць з ног, а потым ужо вязалі і валаклі ў машыну. Вывозілі за горад, у сасновы гай. Стралялі на хаду, ва ўпор, потым у спешцы закопвалі ў неглыбокія ямы, так што іншы раз заставаліся тырчаць зверху рукі ці ногі. Страшная карціна смерці...

Менавіта такім чынам былі расстраляны і пахаваны сяляне з вёскі Капусціна. Іх абвінавацілі... у паўстанні супраць Савецкай улады. А справа была так: выведзеныя з цярпення самадурствам кіраўнікоў мясцовага сельсавета, сяляне кінуліся на іх з коллем. Хтосьці залез на званіцу і ўдарыў у набат. Сельсавет разграмілі, але кіраўніцтва разбеглася і пахавалася хто дзе. Прычым адзін з іх упаў з даху і зламаў нагу.

За гэта расстралялі чалавек дваццаць, у тым ліку і двух папоў. Аднавяскоўцы іх адкапалі, павезлі хаваць на свае могілкі. Пахавальная працэсія перарасла ў грандыёзную дэманстрацыю. Не было на ёй ні прамоў, ні сцягоў, ні плакатаў. Працэсія ў многа соцень людзей рухалася моўчкі сорак кіламетраў. У вачах людзей стаялі слёзы. Спыніць гэты грозны,

магутны паток, які ўсё павялічваўся, ніхто не мог, ды і не асмельваўся.

Але затое потым...

Потым практычна ўсіх удзельнікаў пахавання арыштавалі. Адных — расстралялі, другіх — судзілі і далі тэрмін, трэціх выслалі на пасяленне ў зусім не цёплыя мясціны...

Праз пяць месяцаў мне нарэшце аб'явілі: следства завершана і справа мая накіравана ў калегію ГПУ. Я не ведаў, што маю права азнаёміцца з ёю — следчы нічога пра гэта не казаў.

Ужо была сярэдзіна зімы. Глыбокі, свежы снег іскрыўся на сонцы. Я ішоў, правальваючыся ў яго па калена, па дарозе на Бабруйск. Ззаду раздаваліся каманды канваіра: «Направа, налева, прыбавіць крок!» Але я не надта спяшаўся — навошта? Турма ж нікуды не дзенецца. Наадварот, непрыкметна запаволіў рух, імкнуўся глынуць як мага больш чыстага паветра, атрымаць асалоду ад яго — на мінулым месцы майго жыхарства, у падвале ГПУ, яго вельмі нестава ла, а прагулак там практычна не было.

Тут мяне, як і належыць, пасадзілі спачатку ў каранцін, дзе не было ні ложкаў, ні нараў — ляжалі мы ўсе проста на падлозе. У той жа дзень — радасць: атрымаў першую перадачу ад бацькі. Першую таму, што ў час следства ў падвал ГПУ ніякіх перадач для нас не прымалі і прыходзілася існаваць выключна на адной баландзе. Праўда, некаторых гэпэўшнікі падкормлівалі — «за добрыя паслугі». Што ж, нягоднікаў хапае і на волі, і за кратамі. А смерць пачынае пільна глядзець у твае вочы, слабыя душонкі прадаюцца за апалонік баланды.

У камеры акрамя мяне знаходзіліся яшчэ пяцёра (адзін з іх уцёк з Салаўкоў). Хоць я быў страшна галодны, усё ж падзяліў атрыманую перадачу — шматок сала і бохан хлеба — на ўсіх, бо суседзі мае, акрамя баланды, нічога не мелі. У турме нельга быць індывідуалістам, неабходна дзяліцца аношнім з суседам: па-першае, кавалак хлеба не лезе ў горла, калі на цябе глядзяць некалькі галодных вачэй. А па-другое, таму, хто гроб толькі пад сябе, даводзілася цяжка, яго зневажалі. І як правіла, прадукты, перадачы ў такіх зняволеных проста забіралі «на карысць грамадства». (Баланда ў Бабруйскай турме была яшчэ горшай, чым у падвале Клічаўскага ГПУ).

Падсілкаваўшыся бацькавай перадачай, мы значна павесялелі, і салавецкі ўцякач спеў нам лагерную песню пра трох уцекачоў, якіх забіла звар'яцелая ахова. Яна настолькі ўразіла мяне, што прымусіла задумацца пра многае...

Неўзабаве мяне перавялі ў камеру, дзе сядзелі «палітыкі». Невялікая па памеры, метраў трыццаць, яна была бітком набіта людзьмі. З абодвух бакоў — суцэльныя аднапавярховыя нары. Спалі на іх толькі на баку, патыліца ў патыліцу. Пераварочваліся на другі бок па камандзе. Усе разам. Вузкі праход — таксама заселены. І толькі пад нарамі было адносна прасторна: залазіць пад іх нязручна (яны віселі нізка над падлогай), на халодным і сырым цэменце ляжаць няўтульна.

Мне трэба было выбіраць сваё месца: або ля парашы, або пад нарамі.

У турэмнай камеры ў кожнага навічка абавязкова пытаюць: хто, адкуль, за што трапіў? У першы ж дзень я адразу ж далажыў новым суседзям пра сябе ўсё. Але ў памяшканні знаходзілася чалавек семдзесят, і не ўсе, відаць, чулі мой голас. А таму дзён праз пяць мне прыйшлося паўтарыць інфармацыю пра сябе ў кутку камеры, дзе я жыў. І трэба ж — сярод маіх слухачоў знайшліся землякі з майго раёна! Адзін з іх расказваў: «Быў я на раённым з'ездзе калгаснага актыву (арыштавалі яго пазней за мяне), на якім упаўнаважаны ГПУ зачытаў абвінавачвае заключэнне па табе. І з'езд наш зацвердзіў прапанаваную ім рэзалюцыю: прасіць вышэйшую меру пакарання — расстрэл».

Выслухаў я свайго субяседніка і зразумеў з сумам: справы мае дрэнныя. Я дакладна ведаў — калегія ГПУ начынала прыгаворваць людзей ужо да расстрэлу. Але я ніяк не мог уявіць, што мне таксама могуць даць «вышку». Аднак, відаць, не я адзін так думаў, а ўсе, хто чакаў вызначэння свайго лёсу. Фактычна ні ў каго з нас не было хоць колькі-небудзь сур'ёзнага саставу злачынства. І тым не менш такіх бязвінных стралялі. Усё ж у мяне недзе там у глыбіні душы тлела надзея: жыць буду, дадуць гадоў дзесяць, але жыць буду.

Пасля той нярадаснай размовы з земляком я пазнаёміўся з астатнімі клічаўцамі. Пераносіць турэмныя цяжкасці стала лягчэй: як-ніяк, а блізкія людзі побач ёсць, з адных з табой мясцін. Да таго ж яны здолелі неяк пацясніцца і вызваліць мне месца на нарах. Адсюль я ўжо бачыў акно, дзённае святло. А што значыць акно, нават акенца,— няхай яно і з кратамі і выходзіць на рог іншай сцяны турэмнага двара? Гэта зразумее той, хто прасядзеў колькі часу ў цемры або пры электрычным асвятленні. Дзень і ноч, раніца і вечар — усё зліваецца

ў адно, і толькі па падачах ежы можна вызначыць, які ж, урэшце, час сутак у роднай краіне.

Рэжым у папраўчым доме (так тады «гуманна» называліся турмы) — больш мяккі, чым у падвале Клічаўскага ГПУ. Дазвалялася гарланіць, спяваць, біцца, лаяцца, чытаць хоць цэлыя суткі. Функцыяніравала турэмная бібліятэка, некаторыя выпісвалі газеты (на камеру), атрымлівалі кнігі (пэўныя) з дому. А самае галоўнае — прагулка (па імператарскаму яшчэ статуту) аж цэлую гадзіну! (Пазней яе і тут урэзалі да пятнаццаці мінут).

Я наваліўся на чытанне. Хапаў усё падрад, без разбору. Імкнуўся праз кнігі спасцігнуць дабро і зло, праўду і крыўду. «Пароў» з той жа мэтай усе газеты. Наіўнае хлапчанё — тады я яшчэ верыў многаму, калі не ўсяму, што пісалася ў друку.

З дому мне перадалі шасцітомнік Леніна на беларускай мове. Пачаў вывучаць англійскую, эсперанта і яшчэ бог ведае што, каб толькі нечым заняць час і пазбавіцца ад змрочных думак. Заўважу, мае веды, кругагляд пашыраўся галоўным чынам у турмах, у якіх правёў дастаткова часу, каб скончыць два-тры факультэты. Але ўсё ж сістэматызаванай, грунтоўнай адукацыі ў мяне няма і мне гэтага вельмі і вельмі недаставала.

У першую ж нядзелю выклікалі на спатканне.

Агромністая камера падзелена густымі металічнымі сеткамі на тры часткі. У сярэдзіне неслі службу наглядчыкі. З аднаго боку ад іх сядзелі зэкі, з другога — іхнія родныя. Народу было столькі, што да сеткі амаль немагчыма прабрацца і таму кожны імкнуўся перакрычаць суседзяў. Ад такога гвалту ў выніку нічога не было чуваць.

Я не ведаў, хто да мяне прыйшоў — гвалт аглушыў мяне, і я доўга не мог адшукаць вачамі свайго наведвальніка.

А бацька, мой бедны бацька, стаяў за двайной агароджай і плакаў. Маленькі, старэнькі, увесь раздаўлены горам... Мне так стала шкада яго, што першы час не мог сказаць ні слова. Толькі цяпер да мяне дайшло, колькі няшчасця і гора прынёс яму з маці — я ж быў іх адзіны сынок, іх надзея і любоў, і раптам... Сябе не шкадаваў, а вось бацькоў — вельмі.

Пасля першых імгненняў аслупянення я сабраўся і ўсміхнуўся тату, хутчэй гэта была грымаса, але мне неяк хацелася супакоіць і суцешыць старога. Хацелася здацца вясёлым, бадзёрым, а не разгубленым. І таму смех скрозь слёзы быў неабходным зараз. Таксама, як і ўсе навокал, пачаў крычаць: «У мяне ўсё добра, хутка вызваляць». І бацька, хоць ён нічога не зразумеў, супакоіўся і крыху павесялеў — бачыць, што сын жывы, рухаецца, размаўляе. Перадаў мне пакунак і благаславіў.

...Кармленне. Тут на нас моцна эканомілі. Давалі раз на суткі паўлітра нейкай вадзіцы і дзвесце грамаў такой жа кашы-размазні. Плюс пяцьсот грамаў хлеба раніцай і вечарам. А з новага, 1931 года норму хлеба скарацілі да 300 грамаў: па сталінскай дыялектыцы мы ж «непрацоўныя элементы»...

А вось прагулкі дастаўлялі асалоду. Гэта ж сапраўдная, ні з чым не параўнальная раскоша — цэлая гадзіна чыстага, здаровага паветра пасля спёртай турэмнай атмасферы.

Двор для «выпасу» — вялікі. Пасярод яго — своеасаблівая пародыя на клумбу без кветак. Маршрут для вандравання — па каменнях вакол яе. Зусім забыўся: адзінае ўпрыгажэнне на той «клумбе» — наглядчык, які пільна сочыць за намі — каб чаго не атрымалася. Хадзіць дазвалялася як хочацца: павольна, хутка, абганяць іншых, размахваць рукамі. Словам, выпраўдом Наркамата юстыцыі (да гэтай установы адносіцца наш «санаторый») адрозніваўся ад засценкаў ГПУ. У канцы двара размяшчаліся розныя майстэрні, у якіх пыхцелі каротказтэрміноўнікі і тыя, хто чакаў адпраўкі ў лагеры. Іх кармілі лепш, а галоўнае — цэлы дзень знаходзіліся на свежым паветры. А вакол усяго гэтага — высокая трохметровая гладкая сцяна. Па вуглах вежы з электрасігналізацыяй і ўзброенымі стралкамі.

Вельмі дрэннымі былі санітарныя ўмовы. Ды і адкуль ім узяцца пры такой цеснаце? Хто не меў перадач — не меў адзення. А потым спаў на чым мог — бялізны ж нам не выдавалі, як і вопраткі. Толькі пры накіраванні зімой па этапе поўнасцю распранутым выдавалі акрываўленыя рэчы, знятыя з расстраляных...

Лазню мы наведвалі раз у месяц. На кожнага — тры грамы мыла і адна балея. Адзенне не дэзінфіцыравалася.

Асноўная маса зняволеных былі сяляне. Іх віна якраз і заключалася ў тым, што нарадзіліся яны земляробамі, усё жыццё вырошчвалі хлеб. Быць селянінам па тагачасных мерках — страшнае злачынства.

Сядзела і некалькі педагогаў. Іх абвінавацілі ў беларускім нацыяналізме (нацдэмаўшчыне). Але вось самае цікавае: даведаліся яны аб нацдэмаўшчыне, што гэта такое, толькі пасля арышту, у турме. Калі шчыра, гэта былі хутчэй за ўсё

сапраўдныя савецкія патрыёты. Яны і ў камеры адпаведна сябе паводзілі: вы, маўляў, контра, а мы — патрыёты.

Сядзелі ў нашай камеры прадстаўнікі і іншых слаёў грамадства — служачыя, рабочыя, нават два салдаты-масквічы, якія служылі ў Бабруйску. Адзін інжынер, ветлівы такі, культурны, абавязкова дзякаваў сто разоў, калі хто з ім падзеліцца сухарыкам.

— Ліпай! Ліпай! — раве наглядчык на ўсю турму.— Хутчэй ў канцылярыю. (Гэта пазней ужо пыталі ціхенька ў такіх выпадках: «Хто тут ёсць на такую вось літару?»

Як ні рыхтуеш сябе да непазбежнага, як ні настройваешся, але сцягнуць усе нервы ў адзін вузел, каб перамагчы страх, амаль немагчыма. Я ўздрыгануў, кроў крыніцай забіла ў скронях, нервовыя дрыжыкі праціналі ўсё цела. Ускочыў, іду, мяне суцяшаюць: «За тэрмінам, не палохайся, жыць, значыць, будзеш!»

Шлях да канцылярыі кароткі. «Што б азначаў гэты выклік? — мільганула ў галаве.— Допыту не можа быць, справа ўжо ў калегіі ГПУ. Спатканняў у канцылярыі не даюць... Тэрмін аб'яўляюць пры адпраўцы, а на расстрэл выклікаюць не днём, а ноччу...» Загадка, ды і ўсё.

— Вось ваш Лінай,— пачуў, калі зайшоў у канцылярыю. Агледзеўся — перада мной нейкі незнаёмы.

— Добры дзень,— кажа ён мне.

— Добры,— адказваю і думаю: «Хто гэта — следчы? Не, той ніколі не вітаецца».

— Я карэспандэнт газеты «Звязда»,— і называе сваё прозвішча. У свой час да арышту я некалькі разоў друкаваў свае заметкі ў мінскай «Звяздзе» і бабруйскім «Камунісце».— Раскажыце пра сябе і коратка пра сваю справу.

Я так расхваляваўся ад нечаканасці, што нават не ведаў, з чаго пачаць. Хацелася даведацца, як і чаго журналіст прыйшоў да мяне, але пытацца не адважыўся. «Калі спатрэбіцца,— думаю,—сам скажа».

Нарэшце пачаў расказваць. Што, як і аб чым — не памятаю (размова адбывалася ў кабінеце следчага без сведак). Маналог мой быў імклівы, цягнуўся мінут пятнаццаць—дваццаць. Пытанні мне не задаваліся, мяне проста выслухалі і пайшлі. Толькі калі апынуўся ў камеры, схамянуўся і пачаў разважаць: што я нагаварыў? Здавалася, зусім не тое, аб чым хацеў. Апанавалі сум і адчай: «Чаму так мала сказаў, куды спяшаўся? Во, дурны, нічога не спытаў у карэспандэнта. І той прамаўчаў, значыць, усё дарма».

Але не! Тыдні праз два—тры мне аб'явілі: па патрабаванні пракуратуры рэспублікі маю справу з калегіі ГПУ вярнулі і перадалі на даследаванне судоваму следчаму.

І ўсё пачалося спачатку, але ўжо не ў ГПУ. Следчы на мяне не крычаў, «контрай», «кулаком» і «падкулачнікам» не называў. Проста ветліва задаваў пытанні, і я, калі хацеў, адказваў.

Следчы адразу ж пытанне аб замаху на старшыню сельсавета выдзеліў з агульнай справы і перадаў у міліцыю як крымінальную справу.

Засталіся на мне вісець толькі «палітыка», антысавецкая агітацыя, сабатаж і ліст да Сталіна (!). Зноў пачалася валтузня. У міліцыі быў прыкладна такі дыялог:

— На вечарынцы быў?

— Быў.

— У двары страляў?

— Не.

— А хто страляў?

— Не ведаю, ніякіх стрэлаў не чуў.

— Хацелі зрабіць вобыск?

— Так.

— Чаму не дазволіў?

— Лічу, што права на гэта мае міліцыя, а не старшыня сельсавета.

— Ты аказаў супраціўленне, значыць, меў зброю. А твайму прыкладу паследавалі астатнія.

— Уяўленне — не доказ.

— Не, гэта і ёсць доказ. Старшыню нехта піхнуў, яблычным агрызкам у твар заляпіў — і ўсё гэта арганізаваў ты. Назваць прозвішчы іншых не хочаш — значыць, за ўсё будзеш адказваць адзін. Што кваліфікуецца па двух артыкулах крымінальнага кодэкса: аказанне супраціўлення органам улады і хуліганства... І табе яшчэ пашчасціла, што за цябе газета заступілася, а то загрымеў бы за замах на прадстаўніка ўлады!

І вось — дзень суда. Дзе ён адбудзецца: у Клічаве ці Бабруйску? Выпіхваюць на вуліцу за вароты турмы, дзе чакаюць ужо два нашы міліцыянеры.

Вакол — рыхлы снег, ззяе амаль па-веснавому сонца, але яшчэ не грэе.

— Куды павезяце?

— У Клічаў.

— Пешшу не пайду. Мне па такой дарозе шэсцьдзесят кіламетраў не прайсці.

— Мы цябе толькі да станцыі давядзем, там на цягніку дабярэшся. І пайшлі. Горада я не ведаў і дзе тая станцыя — ўяўлення не меў. Толькі калі выйшлі ў чыстае поле — усё зразумеў: пешшу павядуць! Сеў на дарозе ў снег:

— Не пайду!

— Пойдзеш!

Крычаць, коней на мяне кіруюць:

— Раздавім, контра кулацкая!

— Давіце! — а сам ні з месца.

Налаяліся, але перакаталіся: буду стаяць на сваім.

— Ну, сядзі, мерзні. Здохнеш, дык труп даставім куды трэба.

Рабіць няма чаго — не памераць жа да суда. Пайшоў — шлёп-шлёп. А за мной коні: топ-топ. Кіламетраў праз дзесяць сядзячую забастоўку наладзіў. Аднак і на гэты раз канваіры дамагліся свайго — рушыў наперад, яны за мной. Калі ж канчаткова выбіўся з сіл і амаль страціў прытомнасць, знайшлі яны для мяне ў вёсачцы, што сустрэлася па дарозе, гаспадара з канём і санямі і за мой жа кошт давезлі да месца прызначэння. І зноў, глыбокай ноччу, апынуўся я ў камеры, у клапіным царстве... Суд, імклівы і міласцівы, адбыўся назаўтра ж. Нават у судовую залу не завялі, а ўпіхнулі ў кабінет да суддзі. Сведкаў — ніякіх, адзін пацярпеўшы, чён жа абвінаваўца. Усе яго доказы суд прыняў безагаворачна. Нашы доказы (акрамя мяне быў яшчэ адзін бедалага) проста праігнаравалі. Паўтарылася тое ж, што і на следстве. У выніку нас прыгаварылі: мяне — за супраціўленне ўладам — да двух гадоў пазбаўлення волі, Івана Міскевіча, майго «падзельшчыка», — да 1,5 года.

...І зноў турма, камера, толькі ўжо — другая, «рабочая»: я ж вярнуўся з тэрмінам і абавязаны быў працаваць, хоць следства па першапачатковай справе яшчэ працягвалася.

На работу ішоў з задавальненнем. Калі шчыра, то ўсе зэкі ў турмах ірваліся працаваць. Прычым выкладваліся да таго, пакуль праца і баланда не ператвараліся іх у шкілеты.

Нарэшце, праз восем месяцаў, атрымліваю вялікае абвінаваўчае заключэнне, з якога даведаўся, што разам са мной да суда прыцягваецца мой аднавясковец Канстанцін Нядбайнік. І што ліст Сталіну нанісаны яго рукой пад маю дыктоўку...

Судзіла мяне выязная сесія акружнога суда. Гэта быў нейкі кашмар: сведкі, чалавек каля дваццаці, нешта дружна паказвалі супраць мяне. Трэба неяк абараняцца, а то такога прыпішуць... (Адваката ў мяне не было). Нарэшце вось яно, выратаванне: суддзя пытае ў мяне:

— Ёсць хадайніцтва перад судом?

— Ёсць, — адказваю.

— Якое?

— Хачу азнаёміцца са сваёй судовай справай.

— А хіба вас следчы не знаёміў?

— Не.

Нямая сцэна з «Рэвізора»: суддзя з пракурорам моўчкі глядзяць адзін на аднаго.

— Колькі вам на азнаямленне з ім спатрэбіцца часу?

— Не ведаю, мо гадзіна, а мо дзве. Заводзяць мяне ў нейкі пакойчык за сцэнай, даюць папку з паперамі ў два пальцы таўшчынёй.

Чытаю. Амаль гадзіна мінула. «Хутчэй, хутчэй, — падганяюць пастаянна. — Колькі яшчэ цябе чакаць?»

Вяртаю папку. Што ж, прачытаць мала што паспеў, але паказанні двух галоўных сведкаў зафіксаваў.

Суд працягваецца. Вінаватымі сябе не прызнаём, групоўку з дваіх абвяргаем, але абараняемся кожны паасобку. Нарэшце пайшлі сведкі. Блытаюцца, нешта мармычуць. Гэта і зразумела: адна справа падтакваць следчаму ў яго кабінеце, і зусім другая — адказваць на судзе перад народам. Але суддзі прыходзілі на дапамогу сведкам, калі бачылі, што тыя «плывуць». Толькі і гэта не выратавала — судовы разгляд нашай справы (а мяне ж яшчэ абвінавачвалі, што... чакаў прыходу палякаў і калгас арганізаваў па іх (!) заданні) адклалі з-за недахопу ўлік і справу перадалі на дадатковае даследаванне.

А нас павялі зноў да «родных пенатаў» — у «слаўную» бабруйскую турму, лёс па-ранейшаму быў нялітасцівым.

Адзінаццатае мая 1931 года. Дзень гэты пачаўся, як звычайна. У шэсць раніцы свісток наглядчыка падняў нас на ногі. Далей, як звычайна: паверка ў страі, сняданне, работа ў цэху. Справа гэта здавалася мне лёгкай і прыемнай, давала магчымасць часцей у думках вяртацца ў родны дом — амаль усю мэблю ў хаце я зрабіў уласнымі рукамі (пазней яе канфіскавалі). Пасля атрымання двухгадовага тэрміну я рабіў у цяслярным цэху.

Тут раптам з'явіўся наглядчык і выклікаў:

— Ліпай! З рэчамі!

Цяжка перадаць недасведчанаму, што я адчуў у гэты момант: і разгубленасць, і страх, і радасць — усё адначасова. Хвалі пачуццяў накочваліся адна за адной. Памятаю, імкнуўся сабрацца, неяк засяродзіцца, каб не выдаць слабіны, якая раптоўна мяне ахапіла.

«Хутчэй, давай не цягні!» — прыспешваў наглядчык. Дзіўная гэта ўстанова — турма, — гадамі людзі сядзяць без справы, ніхто не лічыць час. А тут раптам — хутчэй, хутчэй! Нават з суседзямі развітацца не даюць, нібыта на пажар спяшаюцца.

Прывялі ў канцылярыю, там — звычайная працэдура: хто, адкуль, год нараджэння, тэрмін, потым даюць даведку дзяжурнаму (не мне!) за вароты, на волю!

Вартаўнік зірнуў у маю паперку, якую яму сунуў суправаджаючы-дзяжурны, вярнуў яе мне, адчыніў дзверцы і...

ВОЛЯ!!! Куляй выскачыў, а ў вочы сонца, яркае-яркае! Да гэтага я не зауважаў яго нібыта.

Разгарнуў сваю даведку. Чытаю: «...вызваляецца згодна з тэлеграфным распараджэннем... Пракуратуры БССР...»

І тут я усё зразумеў. Размова ішла аб першай, «палітычнай справе». А другую турэмшчыкі праміргалі! Яны не павінны былі мяне выпускаць!

Шчаслівая памылка цэрберaў дазволіла мне вырвацца з-за кратаў — на дзень, тыдзень, месяц, год — яшчэ не ведаю, але вось дапамагаць ім выпраўляць яе зусім не збіраюся!

Не адказваючы на распытванні цікаўных, ірвануў я наперад, па вуліцы. Навокал зазяла вясна, а я ляцеў, як птушка, і захлёбваўся воляй. І гатовы быў пайсці на што хочаш, каб адляцець як мага хутчэй ад гэтага праклятага месца... *І. Ліпай*

Да друку падрыхтаваў А. Тоўсцік.

Чырвоная змена. 1989. 19—20 крас.

Блуканне па пакутах

З успамінаў Марыі Лявонаўны Кушнер

Сям'я наша была вялікая: бацька — Міхейчык Лявон Паўлавіч, маці — Алена Арцёмаўна і дзевяць дзяцей. Гаспадарка таксама была немалая: 10 га зямлі, 5 кароў, 2 кані, 7 свіней, 20 авечак, куры, качкі, гусі; мелі малатарню, два гумны, добрую хату. Працавалі на гаспадарцы ўсёй сям'ёй і толькі летам наймалі аднаго работніка.

У 1930 г. нас раскулачылі. Маёмасць перадалі ў калгас, які стварыўся ў в. Арэхаўка. Потым, у кастрычніку, нас рэпрэсіравалі як «ворагаў народа» (па III катэгорыі), выслалі ўсю сям'ю, акрамя аднаго сына, які жыў асобна ў Магілёве і працаваў на шаўковай фабрыцы.

Павезлі нас з Магілёва таварным цягніком. З сабой паспелі ўзяць толькі 2 мяхі мукі, сала і пасцель. Паехалі нават у летняй вопратцы, і калі праз 22 дні прыехалі ў Чыцінскую вобласць, шмат хто абмарозіўся.

Жылі ў зямлянках. Шмат малалетніх дзяцей памірала (штодзень 20—40 чалавек). Каб іх пахаваць, разаграваліся зямлю, потым капалі ямы. Штодзень дыміліся вогнішчы каля пасёлка.

Калі ў каго застаўся які харч у багажы, яго забіралі на склад і гатавалі на ўсіх адзін абед.

Вясной нас перавезлі ў г. Зэя Чыцінскай вобласці, а там раскідалі па розных мясцінах. Мы трапілі на прыіск «Праточны», дзе працавалі на земляных работах; жылі ў палатках. Золата на «Праточным» не знайшлі, і таму ўвосень нас павезлі ўверх па рацэ Зэя. Хацелі адаслаць працаваць на дальнія прыскі, але, улічваючы, што ёсць малалетнія дзеці і старыя, накіравалі на прыіск «Уган», дзе мы і працавалі ўвесь астатні час. Капалі земляныя шахты глыбінёй 6—8 метраў, шукалі золата. Летам працавалі, зімой — вучыліся. Там я скончыла пяты, шосты, сёмы класы. Жылі ў драўляных бараках па 4 сям'і. За работу нам плацілі бонамі (1 бон — 10 рублёў). Спачатку нам выдавалі пайкі, і харчу не хапала, а потым увялі «вольнае старанне», плацілі ад выпрацоўкі: чым больш золата намыў, тым больш заплацяць. Аднойчы я знайшла самародак, які важыў 18 грамаў. Усё золата здавалі брыгадзіру.

У гады вайны працавалі без выхадных дзён: за буднія дні атрымлівалі плату, а ў выхадныя дні працавалі на «франтавое» (бясплатна). Працаваць на агародах не было калі, таму бульбу хадзілі купляць за 80 кіламетраў.

На фронт прызывалі толькі маладых мужчын — да 30 гадоў. На больш старэйшых была бронь — яны лічыліся байцамі працоўнага фронту.

Замуж я выйшла ў 1937 г. за Кушнера Аляксандра Яўціхавіча, які быў высланы разам з бацькамі з в. Новая Арэхаўка Клічаўскага раёна. Пабудавалі мы сваю хату (лесу было дастаткова), лазню; купілі карову, пасадзілі невялічкі сад. Зямля там вельмі камяністая, вада надта далёка. Там жа, на Далёкім Усходзе, пахавалі маіх бацькоў і брата.

Золата на «Угане» скончылася, прыіск закрылі. Тады мы прадалі сваю карову, кінулі хату — забралі толькі набытак і ў 1947 г. вярнуліся на радзіму.

У грамадзянскіх правах нас аднавілі, але канфіскаваную маёмасць не вярнулі, таму будаваць гаспадарку давялося нанава: за выручаныя ад продажу каровы грошы купілі хату, потым абзавяліся і жывёлай.

Вернутыя імёны

Жыхары Клічаўскага раёна, беспадстаўна рэпрэсіраваныя і рэабілітаваныя. Спіс складзены паводле звестак рэабілітацыі на 1.4.1993 г. На вялікі жаль, яшчэ не ўсім, хто пацярпеў, вернута добрае імя, не пра ўсіх, хто рэабілітаваны, знойдзены поўныя звесткі. Наш святы абавязак давесці гэту справу да канца — у імя справядлівасці, у імя будучыні, каб падобная інквізіцыя больш ніколі не магла паўтарыцца!

АБРАМОВІЧ Антаніна Міхайлаўна, н. ў 1908 на хутары Баран-Навіна, дзе і жыла, працавала на асабістай гаспадарцы. Рэпрэсіравана 27.8.1933. Рэабілітавана 14.9.1962.

АБРАМОВІЧ Юльян Баляслававіч, н. ў 1906 на хутары Баран-Навіна, дзе і жыў, працаваў на асабістай гаспадарцы. Рэпрэсіраваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

АДАМОВІЧ Іван Данілавіч, н. ў 1889 у в. Малая Вольса. Калгаснік. Арыштаваны 12.9.1937. Расстраляны, пахаваны ў г. Бабруйску. Рэабілітаваны 20.1.1989.

АДАМОВІЧ Іван Казіміравіч, н. ў 1905 у в. Малая Вольса. Працаваў кладаўшчыком у калгасе імя Калініна. Арыштаваны 27.1.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 7.5.1958.

АДАМОВІЧ Пётр Сцяпанавіч, н. ў 1901 у в. Раманава, жыў там жа. Калгаснік. Арыштаваны 17.12.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.2.1959.

АКУЛІЧ Іван Іосіфавіч, н. ў 1909 у в. Ясень. Рабочы шклозавода «Кастрычнік». Арыштаваны 18.7.1937. Рэабілітаваны 8.9.1956.

АКУЛІЧ Софія Уладзіміраўна, н. ў 1913 у в. Ожава. Цеставод хлебапякарні № 1 г. Бабруйска. Арыштавана 24.12.1944. Рэабілітавана 9.3.1945.

АЛЕКСАНДРОВІЧ Васіль Іванавіч, н. ў 1878 у в. Старыя Максімавічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 27.4.1989.

АЛІЗНЮК Фёдар Сцяпанавіч, н. ў 1875 у в. Цэгаў (Заходняя Украіна). Свяшчэннік. Жыў у в. Бацэвічы Клічаўскага раёна. Арыштаваны 16.5.1932. Рэабілітаваны 31.10.1989.

АЛЬХОВІК Пётр Цітавіч, н. ў 1884 у в. Брыцалавічы Асіповіцкага раёна. Жыў у в. Любічы Клічаўскага раёна. Аднаасобнік. Арыштаваны 28.12.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 26.7.1965.

АНАНІЧ Іван Сцяпанавіч, н. ў 1887 у в. Люціна. Аднаасобнік. Арыштаваны 9.8.1937. Рэабілітаваны 22.5.1959.

АНАНІЧ Максім Ільіч, н. ў 1895 у в. Орліна. Старшыня калгаса «Перамога» Запольскага сельсавета. Рэпрэсіраваны 13.1.1938. Расстраляны 25.3.1938. Рэабілітаваны ў 1969. Гл. ўспаміны яго сына «Каб больш не было Курапатаў».

АНАНІЧ Фёдар Іванавіч, н. ў 1905 у в. Любічы. Рахункавод торфаканторы. Арыштаваны 19.3.1933. Рэабілітаваны 25.5.1933.

АНДРУШКЕВІЧ Ніфодзій Фадзеевіч, н. ў 1889 у в. Слабада. Арыштаваны 3.1.1945. Рэабілітаваны 6.10.1945.

АНІФЕР Васіль Канстанцінавіч, н. ў 1895 у в. Максімавічы. Жыў у в. Сталбун Свяцілавіцкага раёна. Настаўнік. Арыштаваны 20.7.1938. Рэабілітаваны 1.1.1939.

АРЦІМОВІЧ Мікіта Уладзіміравіч, н. ў 1892 у в. Бацэвічы. Калгаснік. Арыштаваны 18.7.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Памёр у лагеры 15.9.1942. Рэабілітаваны 18.5.1957.

АРЦІШЭЎСКІ Антон Станіслававіч, н. ў 1902 у в. Аляксандраўка. Калгаснік. Арыштаваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

АСЕЦКІ Іпаліт Мартынавіч, н. ў 1901 у в. Убалацце. Арыштаваны 27.8.1931. Рэабілітаваны.

АСЕЦКІ Іналіт Мартынавіч, н. ў 1901 у в. Колацце. Жыў у пас. Колас. Працаваў брыгадзірам у калгасе імя Будзённага. Арыштаваны 23.8.1937. Рэабілітаваны 26.1.1959.

АСОЎСКІ Уладзімір Вячаслававіч, н. ў 1898 у в. Коўбча. Калгаснік. Арыштаваны 15.1.1938. Рэабілітаваны 9.6.1962.

АСТРОЎСКІ Іосіф Андрэевіч, н. ў 1894 у в. Ужэйкавічы Бабруйскага раёна. Жыў і працаваў на асабістай гаспадарцы ў в. Апалінарава. Арыштаваны 26.3.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 5.9.1959.

АХРАМОВІЧ Браніслаў Вікенцьевіч, н. ў 1892 на хутары Варацень Бярэзінскага раёна. Аднаасобнік. Жыў у в. Чырвоны Бераг Клічаўскага раёна. Арыштаваны 16.11.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 26.6.1989.

АХРАМОВІЧ Іван Аляксандравіч, н. ў 1884 на хутары Баран-Навіна. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3.1930. Рэабілітаваны 5.9.1959.

АХРАМОВІЧ Ігнат Браніслававіч, н. ў 1914 у в. Закуцце. Аднаасобнік. Арыштаваны 4.1.1933. Рэабілітаваны 19.5.1933.

АХРАМОВІЧ Фабіян Аляксандравіч, н. ў 1886 на хутары Баран-Навіна. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.8.1934. Рэабілітаваны 14.9. 1962.

АЧЫНОВІЧ Аляксей Сямёнавіч, н. ў 1877 у в. Суша. Працаваў прыёмшчыкам у леспрамгасе. Арыштаваны 25.5.1931. Рэабілітаваны 23.7.1931.

АЧЫНОВІЧ Андрэй Нракопавіч, н. ў 1902 у в. Жэрдзішча. Працаваў рабочым у Гомелі. Арыштаваны 26.6.1931. Рэабілітаваны 21.6. 1963.

АЧЫНОВІЧ Арцём Максімавіч, н. ў 1893. Калгаснік. Жыў у в. Суша. Арыштаваны 23.5.1933. Рэабілітаваны 1.6.1962.

АЧЫНОВІЧ Васіль Мацвеевіч, н. ў 1875 у в. Суша. Цясляр. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 2.6. 1956.

АЧЫНОВІЧ Захар Васілевіч, н. ў 1897 у Клічаве. Выдаімальшчык шкла. Арыштаваны 25.9.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 29.5. 1959.

АЧЫНОВІЧ Іван Кандратавіч, н. ў 1890 у в. Суша. Пчаляр. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 2.6. 1956.

АЧЫНОВІЧ Іван Кандратавіч, н. ў 1892 у в. Суша. Калгаснік. Арыштаваны 18.11.1932. Рэабілітаваны 20.12.1958.

АЧЫНОВІЧ Ігнат Кандратавіч, н. ў 1879 у в. Альхоўка. Калгаснік. Арыштаваны 13.11. 1932. Рэабілітаваны 20.12.1958.

АЧЫНОВІЧ Кузьма Максімавіч, н. ў 1913 у в. Суша. Калгаснік. Арыштаваны 16.3.1932. Рэабілітаваны 28.8.1965.

АЧЫНОВІЧ Максім Рыгоравіч, н. ў 1867 у в. Суша. Калгаснік. Арыштаваны 16.3. 1932. Рэабілітаваны 28.8.1965.

АЧЫНОВІЧ Максім Рыгоравіч, н. ў 1867 у в. Суша. Аднаасобнік. Арыштаваны 5.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 2.6. 1956.

АЧЫНОВІЧ Мірон Максімавіч, н. ў 1902 у в. Суша. Калгаснік. Арыштаваны 16.3.1932. Асуджаны 23.5.1932. Рэабілітаваны 28.8.1965.

АЧЫНОВІЧ Міхей Васілевіч, н. ў 1902 у Клічаве. Рабочы. Працаваў у Бабруйску. Арыштаваны 2.6.1937. Расстраляны 9.9.1937. Рэабілітаваны 18.8.1989.

АЧЫНОВІЧ Якаў Васілевіч, н. ў 1903 у в. Суша. Цясляр. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 2.6.1956.

АЧЫНОВІЧ Яфім Кандратавіч, н. ў 1893 у в. Суша. Земляроб. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 2.6. 1956.

АЧЫНОВІЧ Яфім Кандратавіч, н. ў 1893 у в. Суша. Жыў у в. Альхоўка. Калгаснік. Арыштаваны 18.11.1932. Рэабілітаваны 20. 12.1958.

БАБІЦКІ Міхаіл Іванавіч, н. ў 1897 у в. Усакіна. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 24.4.1989.

БАГРЫЦЭВІЧ Мікалай Міхайлавіч, н. ў 1885 у в. Новае Курганне. Шавец шавецкай арцелі. Арыштаваны 22.12.1937. Расстраляны 15.3.1938 у г. Мінску. Рэабілітаваны 16.1. 1989.

БАЖКО Аркадзь Дзмітрыевіч, н. ў 1901 у в. Кшчы Віленскай губ. Жыў у в. Суша Клічаўскага раёна. Арыштаваны 10.11.1933. Рэабілітаваны 27.2.1934.

БАНДАРЧЫК Адам, жыў у в. Убалацце. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны. Пакончыў жыццё самагубствам. Рэабілітаваны 27.7. 1992.

БАНДАРЧЫК Алена Іванаўна, БАНДАРЧЫК Вольга Мацвееўна, БАНДАРЧЫК Ганна Мацвееўна, БАНДАРЧЫК Мацвей Адамавіч, БАНДАРЧЫК Ульяна Мацвееўна. Жылі ў в. Убалацце. Арыштаваны ў 1930. Высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 14.7.1992.

БАНДАРЧЫК Аляксандр Адамавіч, жыў у в. Убалацце. Арыштаваны ў 1930. Высланы ў Зейскі раён Амурскай вобл. Рэабілітаваны 22.7.1992.

БАНДРАЖЭЎСКІ Рыгор Паўлавіч, н. ў 1896. Працаваў у в. Старая Арэхаўка. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны. Рэабілітаваны 16.4.1992.

БАРАЗНА Андрэй Касьянавіч, жыў у в. Халадок. Арыштаваны ў 1931. Раскулачаны. Рэабілітаваны 3.6.1992.

БАРАЗНА Іван Андрэевіч і **ЗАБЛОЦКАЯ Аляксандра Андрэеўна** — муж і жонка. Арыштаваны ў 1931. Рэабілітаваны 3.6. 1992 г.

БАРАЗНА Трафім Емяльянавіч, н. ў 1894 у в. Любічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 25.12. 1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 26.7.1965.

БАРАЗНА Якаў Рыгоравіч, н. ў 1883 у в. Брыцалавічы Асіповіцкага раёна. Жыў у в. Любічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.12. 1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 26.7.1965.

БАРСУК Алесь Мікалаевіч, н. ў 1899 у в. Хонава Кіраўскага раёна. Жыў у в. Нясята. Каваль. Арыштаваны 15.11.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 27.11.1951.

БАРЫСЁНАК Васіль Анісімавіч, н. ў 1902 у в. Іванаўка. Чырвонаармеец 554-га стралковага палка. Арыштаваны 26.8.1940. Рэабілітаваны 14.8.1958.

БАХАНОВІЧ Сідар Ігнатавіч, н. ў 1903 на хутары Дубнякі. Млынар калгаса «Чырвоны маяк». Арыштаваны 22.12.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 26.2.1959.

БАЯРЧУК Уладзімір Вікенцьевіч, н. ў 1911 на хутары Паляды. Жыў у в. Патока. Працаваў грузчыкам на чыгуначнай станцыі Стаялава. Арыштаваны 6.12.1937. Расстраляны 25.2.1938. Рэабілітаваны 2.8.1966.

БАЯРЭНКА Уладзімір Пятровіч, н. ў 1915 у в. Калічонка. Працаваў рахункаводам у вайсковай часці ў г. Орша. Арыштаваны 13.8. 1938. Рэабілітаваны 21.3.1939.

БЕЛАБАРОДЫ Піліп Мікітавіч, н. ў 1889 у в. Максімавічы. Калгаснік. Арыштаваны 2.4.1933. Асуджаны на 3 гады ўмоўна. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БЕЛАКУРСКАЯ Фядора Гаўрылаўна, н. ў 1906 у в. Бацэвічы. Аднаасобніца. Арыштавана 24.9.1932. Выслана ў Казахстан. Рэабілітавана 27.11.1989.

БЕЛАКУРСКІ Васіль Максімавіч, н. ў 1906 у в. Бацэвічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 25.9.1932. Высланы ў Казахстан. Рэабілітаваны 27.11.1989.

БЕЛАКУРСКІ Пётр Фядосавіч, н. ў 1900 у в. Зарэчча. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.4.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 5.9.1959.

БІБІК Аляксандр Сцяпанавіч, н. ў 1905 у в. Новае Сяло. Земляроб. Арыштаваны 17.5. 1932. Рэабілітаваны 26.3.1992.

БОНДАР Алена, жыла ў в. Чаравач. Арыштавана ў 1929. Раскулачана. Рэабілітавана 16.3.1992.

БОНДАР Алеся Захараўна, жыла ў в. Чаравач. Арыштавана ў 1929. Раскулачана. Рэабілітавана 16.4.1992.

БОНДАР Афанасій Захаравіч, н. ў 1904 у в. Чаравач. Аднаасобнік. Арыштаваны 30.5. 1930. Рэабілітаваны 31.8.1989.

БОНДАР Захар Платонавіч, жыў у в. Чаравач. Арыштаваны ў 1929. Раскулачаны. Рэабілітаваны 16.4.1992.

БОНДАР Мікалай Дзям'янавіч, н. ў в. Чаравач. Каваль. Арыштаваны 27.11.1937. Рэабілітаваны 30.12.1939.

БОНДАР Яфім Захаравіч, жыў у в. Чаравач. Арыштаваны ў 1929. Раскулачаны. Рэабілітаваны 16.3.1992.

БОХАН Баляслаў Андрэевіч, н. ў 1887 у в. Селішча Полацкага раёна. Працаваў ст. бухгалтарам саўгаса імя Кірава Клічаўскага раёна. Арыштаваны 5.8.1935. Рэабілітаваны 7.7.1936.

БРЫЛЕЎСКІ Ануфрый, н. ў 1905 у в. Масніцкае. Жыў у в. Вяленік. Працаваў у калгасе «Чырвоны маяк». Арыштаваны

16.8.1938. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 19.2.1959.

БРЫЛЕЎСКІ Іван Ігнатавіч, н. ў 1900 у в. Вяленік. Брыгадзір калгаса «Чырвоны маяк». Арыштаваны 27.12.1932. Рэабілітаваны 31.8.1989.

БРЫЛЕЎСКІ Канстанцін Вінцэсевіч, н. ў 1876 у в. Асавок Пухавіцкага раёна. Жыў у в. Градкі. Калгаснік. Арыштаваны 17.8.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 27.2.1957.

БРЫЛЕЎСКІ Франц Ігнатавіч, н. ў 1907 у в. Масніцкае. Жыў у в. Вяленік. Працаваў у калгасе «Чырвоны маяк». Арыштаваны 16.8.1938. Асуджаны на 8 гадоў. Рэабілітаваны 19.2.1959.

БУЦАНЕЦ Мікалай Савельевіч, н. ў 1913 у в. Закуцце. Кравец. Жыў у в. Дзеравянка Прыанежскага раёна. Арыштаваны 2.10.1947. Рэабілітаваны 29.1.1948.

БЯГАНСКІ Баляслаў Антонавіч, н. ў 1887 у в. Закуцце. Працаваў у калгасе «Іскра камуны». Арыштаваны 17.11.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БЯГАНСКІ Людвіг Антонавіч, н. ў 1880 у в. Закуцце. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 5.9.1959.

БЯЛЯК Ілья Сяргеевіч, жыў у в. Стаялава. Арыштаваны ў 1933. Не высылаўся. Рэабілітаваны 21.7.1992.

БЯЛЯЎСКАЯ Ванда Ульянаўна, н. ў 1928 у в. Бацэвічы. Працавала швачкай. Жыла ў Бабруйску. Арыштавана 27.12.1944. Рэабілітавана 11.9.1945.

БЯЛЯЎСКІ Аўгусцін Адамавіч, н. ў г. Мінску. Жыў у в. Аляксандраўка. Працаваў у калгасе «Роза Люксембург». Арыштаваны 27.1.1937. Асуджаны на 6 гадоў. Вызвалены ў верасні 1938. Рэабілітаваны 15.2.1938.

БЯЛЯЎСКІ Канстанцін Аўгусцінавіч, н. ў 1907 у в. Нясята. Жыў у в. Аляксандраўка. Калгаснік. Арыштаваны 26.1.1938. Расстраляны 25.3.1938. Рэабілітаваны 4.9.1958.

БЯЛЯЎСКІ Мікалай Аўгусцінавіч, н. ў 1905 у в. Нясята. Жыў у в. Аляксандраўка. Аднаасобнік. Арыштаваны 28.1.1938. Расстраляны 25.3.1938. Рэабілітаваны 4.9.1958.

БЯНЬКО Вацлаў Паўлавіч, н. ў 1905 у в. Чарнасубава Капыльскага раёна. Настаўнік. Жыў у в. Гіжгайлава Клічаўскага раёна. Арыштаваны 11.9.1937. Расстраляны 6.12.1937. Рэабілітаваны 10.8.1980.

БЯРЭЗІНСКІ Сільвестр Андрэевіч, н. ў 1905 у в. Наталоў. Сталяр-цясляр. Жыў у в. Прыцерна Асіповіцкага раёна. Арыштаваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 13.9.1957.

ВАЛОВІК Андрэй Ігнатавіч, жыў у в. Галішчына. Арыштаваны ў 1929. Раскулачаны. Адбываў пакаранне ў Пермскай вобл. Рэабілітаваны 10.2.1992.

ВАЛОВІК Марыя Андрэеўна, жыла ў в. Галішчына. Арыштавана ў 1929. Раскулачана. Адбывала пакаранне ў Пермскай вобл. Рэабілітавана 10.2.1992.

ВАЛОВІК Софія Андрэеўна, жыла ў в. Галішчына. Арыштавана ў 1929. Раскулачана. Адбывала пакаранне ў Пермскай вобл. Рэабілітавана 10.2.1992.

ВАЛОВІК Яўген Андрэевіч, жыў у в. Галішчына. Арыштаваны ў 1929. Раскулачаны. Адбываў пакаранне ў Пермскай вобл. Рэабілітаваны 10.2.1992.

ВАЛЬКЕВІЧ Сідар Ільіч, н. ў 1885 у в. Жарноўка. Жыў у в. Баркі. Калгаснік. Арыштаваны 19.1.1933. Рэабілітаваны 18.3.1961.

ВАРАКСА Дзяніс Рыгоравіч, н. ў 1906 у в. Любічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 25.12.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Вызвалены 17.11.1947. Рэабілітаваны 26.7.1965.

ВАРАКСА Дзяніс Рыгоравіч, н. ў 1906 у в. Любічы. Сталяр райпрамкамбіната ў в. Бацэвічы. Арыштаваны 19.7.1949. Высланы ў Паўночны Казахстан. Рэабілітаваны 26.7.1965.

ВАРОНІЧ Нестар Васілевіч, н. ў в. Орліна. Кравец. Арыштаваны 20.8.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 22.5.1959.

ВАСІЛЕЎСКІ Апалінарый Міхайлавіч, н. ў 1885 у в. Закуцце. Жыў у в. Наталоў. Вартаўнік калгаса. Арыштаваны 5.8.1938. Расстраляны 19.11.1938. Рэабілітаваны 19.4.1965.

ВАСІЛЕЎСКІ Іван Антонавіч, н. ў 1883 у в. Закуцце. Працаваў у калгасе «Чырвоны сцяг». Арыштаваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

ВАСІЛЕЎСКІ Іосіф Міхайлавіч, н. ў 1873 у в. Закуцце. Жыў у в. Наталоў. Вартаўнік. Арыштаваны 4.8.1938. Рэабілітаваны ў лістападзе 1938.

ВАСІЛЕЎСКІ Кліменцій Уладзіміравіч, н. ў 1896 у маёнтку Няганічы Бярэзінскага раёна. Жыў у нас. Басін. Аднаасобнік. Арыштаваны 10.8.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 25.1.1960.

ВЕРНІКОЎСКІ Адам Адамавіч, н. ў 1897 у в. Хадэчын. Жыў на хутары Турчылоў. Калгаснік калгаса «Калектывіст». Арыштаваны 5.8.1938. Расстраляны 20.11.1938. Рэабілітаваны 7.9.1965.

ВЕРНІКОЎСКІ Адам Ігнатавіч, н. ў 1897 у в. Міхайлаўка. Калгаснік. Арыштаваны 9.11.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 27.11.1958.

ВЕРНІКОЎСКІ Аляксандр Адамавіч, н. ў 1904 у в. Аляксандраўка. Рамонтны рабочы чыгункі. Арыштаваны 27.8.1931. Расстраляны. Рэабілітаваны 17.8.1960.

ВЕРНІКОЎСКІ Іосіф Вінжоравіч, н. ў 1904 у в. Хадэчын. Жыў на хутары Аляксандраўка. Калгаснік. Арыштаваны 5.8.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 15.9.1958.

ВЕРНІКОЎСКІ Казімір Ігнатавіч, н. ў 1884 у в. Міхайлаўка. Калгаснік. Арыштаваны 9.11.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 27.11.1958.

ВІТКОЎСКІ Антон Казіміравіч, н. ў 1895 у в. Парня. Жыў у в. Новае Курганне. Калгаснік калгаса «Авангард». Арыштаваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

ВІТКОЎСКІ Віненцій Антонавіч, н. ў в. Ясірец. Працаваў у калгасе «Чырвоны сцяг». Арыштаваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

ВІТКОЎСКІ Віталій Ігнатавіч, н. ў 1902 у в. Турчылоў. Калгаснік. Арыштаваны 22.12.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 30.11.1959.

ВІТКОЎСКІ Вячаслаў Вінцэсевіч (Вацлаў Вікенцьевіч), н. ў 1910 у в. Наталоў. Калгаснік. Арыштаваны 11.6.1938. Расстраляны 28.11.1938. Рэабілітаваны 2.6.1960.

ВІТКОЎСКІ Іван Вікенцьевіч, н. ў 1905 у в. Наталоў. Працаваў у калгасе «Чырвоны сцяг». Арыштаваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

ВІТКОЎСКІ Іван Казіміравіч, н. ў 1889 у в. Парня Бярэзінскага раёна. Жыў у в. Курганне Клічаўскага раёна. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3.1930. Рэабілітаваны 5.9.1959.

ВІТКОЎСКІ Іосіф Казіміравіч, н. ў 1897 у в. Парня Бярэзінскага раёна. Жыў у в. Новае Курганне. Токар. Арыштаваны 26.3.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 5.9.1959.

ВІТКОЎСКІ Іосіф Уладзіслававіч, н. ў 1887 у в. Турчылоў. Калгаснік. Арыштаваны 15.11.1937. Рэабілітаваны 28.12.1959.

ВІТКОЎСКІ Казімір Уладзіслававіч, н. ў 1904 у в. Турчылоў. Калгаснік калгаса «Калектывіст». Арыштаваны 5.8.1938. Расстраляны 23.10.1938. Рэабілітаваны 28.1.1958.

З успамінаў дачкі, Віткоўскай (Гняздзілавай) Людмілы Казіміраўны

Калі арыштавалі нашага бацьку, мне было 11 гадоў. Гэту страшную ноч я запомніла на ўсё жыццё. Прыйшлі якіясьці людзі, неразумелі ўсё ў хаце, нічога не знайшлі, забралі з сабою бацьку. Да гэтага часу ён працаваў у калгасе, працаваў добра, людзі цанілі яго за «залатыя рукі» цесляра. Ад цямна да цямна прападаў у калгасе, бо будаваць тады ў вёсцы патрэбна было шмат чаго. А калі пачыналася касьба, тады яго зусім не бывала дома, абед я насіла яму ў поле. Вечарам прыходзіў дадому і засынаў без сіл, бывала, і не павячэраўшы. Помню, казаў, што за дзень скошваў уручную гектар канюшыны.

З той жнівеньскай ночы засталася маці з намі адна, а было нас у яе пяцёра. Пасірацелі ў вёсцы і іншыя сем'і — Віткоўскіх, Вернікоўскіх, Шабуневых.

І сталі мы ўсе — дзеці «ворагаў народа». Што гэта за страшнае кляймо, зведалі на сабе адразу. І ў школе па-іншаму неяк сталі да нас адносіцца. Помню, на Новы год усім дзецям далі на адной цукерцы, а нас абышлі, бо «не палагалась».

Пра маці і гаварыць, і ўспамінаць цяжка. У калгасе ёй не давалі каня, каб прывезці дроў ці сена для каровы. Добра, што ля вёскі было балота, куды мы ўсе хадзілі збіраць карчы і цягалі на сабе дадому, каб крышку сагрэцца. Помню, усю зіму ў нас у хаце быў страшэнны холад, замярзала вада на прыпечку.

Але самае страшнае — гэта людская злоснасць, ад якой мы шмат цярпелі. Быў у калгасе Мялешка Мацвей, не ведаю, кім працаваў, але многае залежала ад яго. Ён здзекаваўся з нашай сям'і як мог, называў ворагамі і ўвесь час кантраляваў, чым мы кормім карову, відаць, хацеў знайсці ў нас калгасныя кармы. А карова засталася ў нас адна, не было для яе корму. Тады маці сцягвала са страхі салому, секла, аблівала кіпенем і так трымала нашу адзіную карміцельку, якая выратавала нас ад галоднай смерці.

Не вытрымала маці. Аднойчы зімовым вечарам 1940 г. мы назаўсёды выехалі з Турчылова. Пазней мы даведаліся, што бацька быў расстраляны ў 1938 г.

ВІТКОЎСКІ Людвіг Казіміравіч, н. ў 1891 у в. Парня Бярэзінскага раёна. Аднаасобнік. Жыў на хутары Застар'е. Арыштаваны 28.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

ВІТКОЎСКІ Пётр Іосіфавіч, н. ў 1902 на хутары Гіжгайлава. Калгаснік. Арыштаваны 11.6.1938. Расстраляны 29.10.1938. Рэабілітаваны 20.9.1988.

ВІТКОЎСКІ Раймунд Уладзіслававіч, н. ў 1904 у в. Турчылоў. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.4.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 5.9.1959.

ВІТКОЎСКІ Тадэвуш Ігнатавіч, н. ў 1894 у в. Турчылоў. Калгаснік калгаса «Калектывіст». Арыштаваны 5.8.1938. Расстраляны 29.10.1938. Рэабілітаваны 11.1.1958.

З успамінаў дачкі, Віткоўскай Людмілы Фёдараўны (Тадэвушаўны)

Калісьці, у 1920-х гадах, цяперашняя вёска Турчылоў была раскідана па хутарах, дзе людзі жылі і працавалі на арандаванай зямлі. Былі сярод іх родныя і стрыечныя браты і сёстры Віткоўскія, Шабуні, Вернікоўскія, Меляшкевічы і іншыя. Усіх іх вылучала працавітасць, старанне.

У 1930 г. з хутароў быў арганізаваны калгас «Калектывіст». Абагулілі сяляне хто што меў, дружна працавалі ў калектыўнай гаспадарцы. У ліку самых заўзятых калгаснікаў былі мой бацька Тадэвуш Ігнатавіч Віткоўскі і яго родны брат Віктар. Бацька выконваў розныя работы. Узімку даглядаў коней, а вясной актыўна ўдзельнічаў у пасяўной кампаніі. Сеяў ён звычайна дзвюма рукамі, а ўслед за ім баранавалі 3—4 паркі коней. Усё тады ў полі рабілі ўручную.

А калі ў краіне пачаўся стаханаўскі рух, бацька быў у ліку першых стаханаўцаў у вёсцы.

На ўсё жыццё запомніўся адзін летні дзень. Было гэта ў сенакос. Сабраліся лепшыя касцы і дамовіліся паспаборнічаць, хто больш і лепш за іншых скосіць луг. І вось раніцай, калі яшчэ не ўзышло сонца, яны выйшлі на сенажаць. Хваляваліся дарослыя і дзеці: хто будзе першым?

Пасля адбылося сапраўднае свята, на якім падвялі вынікі спаборніцтва і ўшанавалі пераможцаў.

Такое ж свята было, калі калгаснікам уручылі акт на вечнае карыстанне зямлёй. У вялікім старым садзе, абсаджаным стогадовымі ліпамі, расставілі сталы, па якія вынеслі багата розных страў. Людзі весяліліся, спявалі, танцавалі. Чаму ж не павесяліцца? Бацькі не мелі ўласнай зямлі, арандавалі яе ў пана, а цяпер яна аддадзена ім на вечнае карыстанне. Жыві, працуй на карысць Радзіме.

Калгас багацеў, заможней пачыналі жыць і людзі. Не ведалі яны тады, якую бяду нясе ім 1937 год.

А ў гэты год у вёсцы раптам пачаліся арышты. Ноччу прыязджалі ўзброеныя людзі на крытай машыне, якую называлі «чорным воранам», забіралі мужа ад жонкі, бацьку ад дзяцей і ўвозілі назаўсёды, прыклеіўшы ім ярлык «ворага народа». А ён, селянін, і не ведаў, што ж такое благое зрабіў. Усё сваё жыццё толькі і знаў, што араў зямлю, сеяў і убіраў хлеб. Было ім, усім арыштаваным, па 35—40 гадоў. Колькі дзяцей засталося сіротамі! А сем'і ў асноўным былі мнагадзетнымі.

Вельмі жудасны быў час. Людзі хадзілі панурыя, маўклівыя. Баяліся гаварыць адзін аднаму пра недахопы, бо да кожнага слова маглі прычапіцца. Клаліся ўвечары спаць і не ведалі, ці давядзецца заўтра бачыць сваіх дзяцей, хадзіць па ўласным падворку. Страх ахапіў усю акругу. Ноччу з 4-га на 5-га жніўня 1938 г. «чорныя вораны» з'явіліся ў вёсках Наталоў, Анатольеўка, Язвы, Турчылоў. У Турчылове тады забралі 6 мужчын. Не абмінулі і нашу хату. Помніцца, пастукалі ў дзверы. Усё ў нас у сярэдзіне абарвалася. Няйначай НКУС!

Дзверы адчыніў бацька. Паднялася з пасцелі маці. А мы, дзеці, зашыліся далей пад коўдру. Тым часам людзі з «чорнага ворана» зайшлі ў хату, загадалі тату збірацца, а самі ўзяліся за вобыск. Нічога крамольнага не знайшлі, напісалі нейкую паперу, далі тату на ёй расписацца і ўсё.

Развітаўся бацька моўчкі. Ніхто ў хаце ў голас не плакаў, бо не дазвалялі. Ён, пэўна, ведаў, што назад дарога наўрад ці будзе, бо ніхто, каго забралі раней, не вярнуўся дамоў і не напісаў пісьма. Да нас даходзілі чуткі, што над арыштаванымі вельмі здзекуюцца, пакуль яны не прызнаюць той данос, які напісалі нечыя подлыя рукі.

Развітваючыся з мамай, тата толькі і сказаў два словы: «Глядзі дзяцей».

За 1937 і 1938 гады ў в. Турчылоў, у якой налічвалася каля 40 двароў, было арыштавана 15 мужчын.

Пад той час я скончыла Турчылоўскую сямігодку і падала дакументы ў Магілёўскі педтэхнікум. Вельмі хацелася стаць настаўніцай. Але вучыцца туды я ўжо не паехала. Хто ж без бацькі мог дапамагчы мне матэрыяльна, калі ў сям'і яшчэ чацвёра малодшых братоў, з якіх самаму малому паўтара года? Таму 1 верасня 1938 года я пайшла ў 8-ы клас Клічаўскай сярэдняй школы.

Дзеці «ворагаў народа» ў школе былі маўклівыя, слёз не паказвалі. Са спагадай паглядалі на нас нашы равеснікі, бо чулі ад родных, што нашы бацькі нічога злога не зрабілі, што гэта былі лепшыя працаўнікі калгаса. Ды і яны не маглі быць ўпэўненымі, што не прыдуць заўтра за іх бацькамі. Строгімі прыходзілі настаўнікі ў клас. Не было ў класе жартаў, усмешак. Усе адчувалі сябе скавана.

У школе тады працавала настаўніца Ядвіга Мікалаеўна Сцяпура (родам з Капыльскага раёна). І вось паехала яна дадому на летнія канікулы. Вярнулася ў Турчылоў у канцы жніўня 1938 г., панесла ў райаддзел міліцыі здаваць візу (дакумент-пропуск, па якім ездзіла на радзіму), а яе там і арыштавалі. Гаспадыня Стася Віткоўская, у якой яна жыла, захвалявалася: дзе ж дзелася кватарантка? А назаўтра прыехалі міліцыянеры апісваць яе маёмасць. А якія рэчы ў дзяўчыны? Хіба пісьмы ды фотакарткі, якія берагла. Усё гэта і забралі.

Прабыла Сцяпура пад арыштам 25 дзён, а потым яе адпусцілі. Не захацела яна пасля таго выпадку заставацца працаваць у Турчылове. Ёй было сорамна, крыўдна і страшна. Дзяўчына ў 18 гадоў — і «вораг народа»!

Але тут Ядвігу акружылі клопатам, развеялі яе цяжкія думы. Яна змяніла сваё рашэнне і хутка выйшла замуж за дырэктара школы, нашага земляка Канстанціна Карпавіча Храпко, з якім сябравала. А пазней, у 1941 г., паехала з сынам на родную Капыльшчыну (Канстанцін Карпавіч на той час служыў у Чырвонай Арміі).

А ў 1942 ці 1943 г. Ядвіга Сцяпура разам з сынам і маці была расстраляна фашыстамі за сувязь з партызанамі.

Ужо тады, перад вайной, вёска Турчылоў зусім збяднела на людзей. Не было каму араць поле, сеяць, убіраць ніву. Тагачасны старшыня калгаса Аляксей Нічыпаравіч Самец стаў званць рабочую сілу з іншых вёсак раёна. Так у Турчылове з'явіліся новыя прозвішчы. Сюды пераехалі сем'і Клепчаў Рыгора і Фёдара, Шэхаў Фёдара і Івана, Марозаў. З вёскі Людвікаў прыехалі дзве сям'і Страхаў. Усім ім калгас дапамог трохі абжыцца на новым месцы.

А мы, дзеці «ворагаў народа», раслі галоднымі, хадзілі дрэнна апранутымі. Але вучыліся і працавалі ў калгасе, працавалі і вучыліся. Калі былі малымі, пасвілі калгасную і сваю жывёлу, а як падраслі — баранавалі, акучвалі бульбу, аралі поле. Вучобу ў школе не пакідалі. Гэта вельмі не падабалася нашым злоснікам. Не ўсе шкадавалі дзяцей-сірот. Тыя падонкі, што свядома сірацілі нявінных малалетак, ведалі, што пішуць хлусню, з нянавісцю адносіліся да нас, паказваючы сябе адданымі сталінскімі слугамі. Цяжка было ўдовам і іх дзецям у тых умовах. У калгасе не давалі ім каня прывезці дроў. Дровы яны вазілі на санках, а ўлетку насілі на плячах.

Былі людзі, што не хавалі сваёй варожасці нават да дзяцей, чые бацькі былі рэпрэсіраваны.

У намяці такі выпадак. Акучвалі ў калгасе бульбу. Пайшоў на гэту работу і мой стрыечны брат Валянцін Віткоўскі (зараз ён жыве і працуе ў Мінску). Тады яму было 13 ці 14 гадоў. Сілы ў яго было яшчэ мала. Ды і адкуль яна магла быць, калі жылі на шчаўі, лебядзе, праснаках, што замешваліся на канюшыне. Цяжка было хадзіць за абганялкай. Дзень стаяў спякотны, коні ад аваднёў кідаліся ў запражцы. І вось ён неяк выпусціў з рук плугакучнік і выараў некалькі кустоў бульбы. А побач працаваў дарослы чалавек Стрыгун, па мянушчы «Змагар». Угледзеўшы «шкоду», ён са злосцю секануў пугай хлапчука па плячах, абазваўшы яго агіднымі, крыўднымі словамі. Крывавы ірсяг так і ўскочыў на целе. Валік кінуў каня, прыйшоў са слязамі дахаты. Сабраліся суседзі, раяць, трэба паскардзіцца ў міліцыю. Але маці сказала: «Хто ж нас пашкадуе? Мы ж — «ворагі народа».

Вялікі дзякуй нашым маці, што яны ставілі нас на правільны шлях. Яны нам гаварылі і гэтаму верылі, што Сталін і ўрад у Маскве не ведаюць пра такое самаўпраўства мясцовых улад, што праўда пераможа.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, мы вучыліся, дасягалі сваёй мэты. Я закончыла Настаўніцкі інстытут і 35 гадоў працавала ўшколах (Турчылоўскай, Турэцкай, Дзмітраўскай). Два браты, закончыўшы тэхнікумы, набылі спецыяльнасць бухгалтара, а самыя малодшыя пасля вучобы ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі працуюць на розных пасадах у нашай рэспубліцы.

ГАБРАЛЕЎ Адам Анісімавіч, н. ў 1908 у в. Новая Слабодка. Ваеннаслужачы 294-й стралковай дывізіі, рота хімаховы. Асуджаны 16.4.1942. Рэабілітаваны 19.2.1943.

ГАБРУКОВІЧ Павел Рыгоравіч, н. ў 1887 у мяст. Лебедзева. Жыў у в. Ядраная Слабада. Дырэктар Ядрана-Слабадской школы. Арыштаваны 6.12.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 2.2.1959.

ГАЙКЕВІЧ Захар Данілавіч, н. у 1886 у в. Зарэчча. Аднаасобнік. Арыштаваны 2.3.1932. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ГАЛАЦЭВІЧ Гаўрыла Андрэевіч, н. ў 1885 у в. Люціна. Арыштаваны 8.8.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 22.5.1959.

ГАНЧАРОВА Марыя Герасімаўна, н. ў 1870 у в. Ядраная Слабада. Жыла там жа. Раскулачана ў 1930. Рэабілітавана 11.2.1992.

ГАНЧАРОНАК Марк Мікалаевіч, н. ў 1888 у в. Малаграфні Ігуменскага павета. Старшыня калгаса «Зорка». Жыў у в. Аляксееўка. Арыштаваны. Рэабілітаваны 30.7.1960.

ГАНЧАРОЎ Дзяніс Мікалаевіч, н. ў 1905 у в. Ядраная Слабада. Аднаасобнік. Арыштаваны 23.9.1937. Расстраляны 15.1.1938. Рэабілітаваны 30.7.1960.

ГАНЧАРОЎ Захар Сідаравіч, жыў у в. Брылёўка. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны 10.11.1992.

ГАНЧАРОЎ Пётр Сідаравіч, н. ў 1891 у в. Дожны Клінцоўскага раёна Бранскай вобл. Жыў на станцыі Нясета. Начальнік гэтай станцыі. Арыштаваны 31.8.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.1.1959.

ГАРАДЗЕЦКАЯ Зінаіда Пятроўна. Арыштавана ў 1930. Саслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 6.8.1992.

ГАРАЎСКІ Іосіф Станіслававіч, н. ў 1905 у в. Гіжгайлава. Чырвонаармеец. Жыў у г. Віцебску. Арыштаваны 30.9.1929. Рэабілітаваны 16.3.1930.

ГАРОХ Пётр Сямёнавіч, н. ў 1896 у в. Малая Вольса. Аднаасобнік. Арыштаваны 11.8.1938. Рэабілітаваны 2.3.1939.

ГАЎРЫЛІН Сяргей Іўкавіч, н. ў 1897 у в. Калічонка. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.4.1932. Рэабілітаваны 26.7.1932.

ГРУЗД Кузьма Іванавіч, н. ў 1912 у в. Вожаў. Стрэлачнік ст. Нясета. Арыштаваны 9.8.1940. Рэабілітаваны 9.2.1990.

ГРЫЦУН Сцяпан Сцянанавіч, н. ў 1919 у в. Тупічаны Гродзенскай губерні. Жыў у в. Дзмітраўка Клічаўскага раёна. Загадчык навучальнай часткі Дзмітраўскай НСШ. Арыштаваны 23.1938. Рэабілітаваны 8.5.1939.

ГРЫШАНОВІЧ Ганна Дзмітрыеўна, н. ў 1903 у в. Юзафін. Жыла ў в. Заполле. Загадчыца фермы. Асуджана 15.11.1937. Расстраляна. Рэабілітавана 26.1.1959.

ГРЫШАНОВІЧ Міхаіл Дзмітрыевіч, н. ў 1904 у маёнтку Рафалін Асіповіцкага раёна. Жыў у в. Юзафін. Калгаснік. Арыштаваны 28.8.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 26.1.1959.

ГУБКЕВІЧ Іван Фёдаравіч, н. ў 1892 у в. Коўбча. Жыў у в. Бацэвічы. Працаваў ветфельчарам. Арыштаваны 19.11.1937. Расстраляны ў г. Бабруйску 13.1.1938. Рэабілітаваны 25.4.1969.

ГУЛЬКО Юлія Антонаўна, н. ў 1891 у в. Паташчына Асіповіцкага раёна. Жыла ў

в. Таценка. Калгасніца. Арыштавана 28.12. 1944. Рэабілітавана 13.5.1960.

ГУРЛО Яўмен Іванавіч, н. ў 1902 у в. Малая Вольса. Калгаснік. Асуджаны 15.11.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 4.8.1958.

ГУШЧА Іван Ігнатавіч, н. ў в. Гіжгайлава ў 1881. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

ГУШЧА Леанід Ігнатавіч, н. ў 1883 у в. Гіжгайлава. Арыштаваны 18.5.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

ГУШЧА Людвіг Юльянавіч, н. ў 1895 у в. Коўбча. Жыў у в. Студзенка Бялыніцкага раёна. Калгаснік. Арыштаваны 6.8.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 22.11.1958.

ГУШЧА Рамуальд Канстанцінавіч, н. ў 1916 у в. Гіжгайлава. Жыў у г. Ліда. Арыштаваны 28.5.1945. Рэабілітаваны 23.2.1962.

ГУШЧА Яфім Сямёнавіч, н. ў 1895 у в. Нясята. Асуджаны 5.1.1937. Расстраляны 20.2.1937. Рэабілітаваны 29.5.1958.

ДАЙНЕКА Домна Іванаўна, н. ў 1930 у в. Закупленне. Была арыштавана і выслана на Урал. Рэабілітавана 9.1.1992.

ДАЙНЕКА Мікіта Іванавіч, н. ў 1887 у в. Доўгае. Працаваў загадчыкам млына. Арыштаваны 17.12.1937. Рэабілітаваны 5.7. 1989.

ДАНОЎСКІ Генрых Казіміравіч, н. ў 1907 у в. Яўсташына. Жыў у г. Магілёве. Арыштаваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 23.6.1989.

ДАНОЎСКІ Пётр Піліпавіч, н. ў 1891 у в. Палестын Свіслацкага раёна. Аднаасобнік. Жыў у в. Апалінарава. Арыштараны 23.3. 1930. Рэабілітаваны 5.9.1959.

ДАШКЕВІЧ Васіль Аляксандравіч, н. ў 1884 у в. Грушкава Чавускага раёна. Свяшчэннік. Жыў у в. Бацэвічы Клічаўскага раёна. Арыштаваны 19.2.1932 і 5.8.1937. Расстраляны 11.9.1937 ў Бабруйску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ДЗЕГЦЯРОНАК Мікалай Дзмітрыевіч, н. ў 1902. Калгаснік. Жыў у в. Дубно. Арыштаваны 30.7.1938. Рэабілітаваны 27.11.1939.

ДЗЕГЦЯРОНАК Яфрэм Мацвеевіч, жыў у в. Закуцце. Арыштаваны ў 1933. Раскулачаны. Рэабілітаваны 14.2.1992.

ДЗЕМІДОВІЧ Нічыпар Іванавіч, н. ў 1902 на хутары Астравы. Рабочы. Арыштаваны 22.3.1933. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ДЗЕНІСЕВІЧ Іосіф Сцяпанавіч, н. ў 1906 у в. Азерчын Пухавіцкага раёна. Жыў у в. Закоркі. Аднаасобнік. Арыштаваны 13.8.1937. Расстраляны 9.9.1937. Рэабілітаваны 18.8. 1989.

ДЗЯМЕНЦІС Станіслаў Антонавіч, н. ў 1896 у с. Салтрогі ў Літве. Жыў у в. Развадава. Аднаасобнік. Арыштаваны 23.4.1932. Рэабілітаваны 11.8.1932.

ДЗЯТЛЕНАК Пётр Адамавіч, н. ў 1893 у Пухавіцкім раёне. Рабочы Усакінскага лясгаса. Жыў у в. Стаялава. Арыштаваны 27.5. 1941. Рэабілітаваны 25.11.1961.

ДОЎГІ Ягор Фёдаравіч, н. ў 1907 у в. Чаравач. Калгаснік калгаса імя Кастрычніка. Арыштаваны 28.10.1948. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 27.2.1969.

ДРАЗДОЎ Пётр Яўціхіевіч, н. ў 1892 у в. Калічонка. Аднаасобнік. Арыштаваны 20.7.1935. Рэабілітаваны 13.7.1960.

ДРАКА Сцяпан Іванавіч, н. ў 1906 у в. Ява-Валасень. Радавы 208-й стралковай роты пры ваенным складзе № 3432. Арыштаваны 11.8.1945. Асуджаны на 7 гадоў. Рэабілітаваны 16.6.1966.

ДУБОВІК Браніслаў Іосіфавіч, н. ў 1910 у в. Аляксееўка, ст. бухгалтар канторы «Нарыхтоўка жывёлы» ў Клічаве. Арыштаваны 4.7.1938. Рэабілітаваны 11.9.1989.

ДУБОВІК Вольга Уласаўна, н. ў 1918 у в. Заполле. Калгасніца. Арыштавана 19.11. 1944. Рэабілітавана 20.12.1946.

ДУБОВІК Іван Сцяпанавіч, н. ў 1881 у в. Аляксеўка. Арыштаваны 26.3.1930. Рэабілітаваны 5.9.1959.

ДУБРОЎСКІ Міхаіл Браніслававіч, н. ў 1883 у в. Аляксандраўка. Аднаасобнік. Арыштаваны 3.8.1938. Расстраляны 29.10.1938. Рэабілітаваны 28.2.1958.

ДУДЗЕЛЬ Канстанцін Міхайлавіч, н. ў м. Парычы. Рабочы цагельнага завода. Арыштаваны 5.10.1932. Рэабілітаваны 27.10.1989.

ДУЛЕБЕНЕЦ Марк Назаравіч, н. ў 1903 у в. Турэц. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.4.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 27.4.1989.

ДЫБАЛЬ Іван Андрэевіч, н. ў 1893 у в. Дулебна. Рахункавод калгаса. Арыштаваны 24.8.1937. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 28.11.1959.

ЕРМАЛАЕЎ Аляксандр Сяргеевіч, н. ў 1905 у пас. Навасёлкі Бабруйскага раёна. Аднаасобнік. Жыў у в. Церахаў Бор Клічаўскага раёна. Арыштаваны 29.11.1932. Рэабілітаваны 9.12.1961.

ЕРМАЛОВІЧ Павел Канстанцінавіч, н. ў 1904 у в. Коўбча. Калгаснік. Жыў у в. Стадолішча Бялыніцкага раёна. Арыштаваны 23.6.1938. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ЖАЛТОК Міхаіл Вячаслававіч, н. ў 1905 на хутары Ущешыца Бярэзінскага раёна. Жыў на хутары Крушыннік Клічаўскага раёна. Калгаснік. Арыштаваны 14.1.1938. Расстраляны 29.4.1938. Рэабілітаваны 30.12.1959.

ЖАЛТОК Франц Канстанцінавіч, н. ў 1905 у в. Барсучына Бярэзінскага раёна. Жыў у в. Нясята. Трактарыст Нясяцкай МТС. Арыштаваны 1.11.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 27.11.1958.

ЖАРДЗЕЦКІ Аўгусцін Мікалаевіч, н. ў 1891 у в. Яўсташына. Працаваў у калгасе імя Калініна. Арыштаваны 21.1.1938. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ЖДАНОВІЧ Іван Міхайлавіч, н. ў 1896 у в. Анатолеўка. Жыў у г. Асіповічы, працаваў машыністам. Рэпрэсіраваны 17.11.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЖДАНОВІЧ Іпаліт Іпалітавіч, н. ў 1911 у в. Анатолеўка. Працаваў сакратаром Наталоўскага сельсавета. Арыштаваны 5.12.1937. Расстраляны 21.2.1938. Рэабілітаваны 13.6. 1960.

ЖДАНОВІЧ Іпаліт Міхайлавіч, н. ў 1884 у в. Масніцкае. Калгаснік. Арыштаваны 13.9. 1937. Расстраляны 5.12.1937. Рэабілітаваны 13.6.1960.

З успамінаў дачкі Марыі Іпалітаўны Халадок (Ждановіч)

Сям'я наша, вялікая і дружная, жыла ў в. Анатолеўка. Мы, дзеці, вучыліся ў школе ў Вользінай Дубраўцы, бацькі працавалі. Я з 12 год ужо не была ў вёсцы, бо паехала вучыцца ў Бабруйск, потым — у Ленінград, дзе жыву і цяпер, але тыя дзіцячыя гады запомніліся на ўсё жыццё. Ды і звязаны яны з вельмі страшнымі для нас падзеямі. У 1937 г. мы сталі сям'ёй «ворагаў народа», а бацька і брат, арыштаваныя невядома за што, так і не вярнуліся дадому.

Былі яны звычайнымі людзьмі, як амаль і ўсе астатнія людзі таго часу — працавітыя, сумленныя, гатовыя прыйсці на данамогу іншым. Бацька лічыўся ў вёсцы «ветэрынарам без дыплома». Была ў яго нейкая асаблівая цяга і любоў да жывёлы, ніколі не мог ударыць каня ці карову. Нейкім сялянскім чуццём угадваў, чым яны захворэлі, і часта мог нават вылечыць. На той час ён быў адукаваным чалавекам — скончыў чатыры класы. Вельмі цікавіўся падзеямі, літаратурай, асабліва навінамі сельскай гаспадаркі. Памятаю, што бацьку пасылалі на нейкі з'езд у Мінску ў чэрвені 1929 г. У нашым сямейным архіве захоўвалася фатаграфія дэлегатаў, але верх яе з надпісам абрэзалі — так трэба было ў той страшны час.

Як толькі пачалі стварацца калгасы, бацька адзін з першых здаў сваю гаспадарку і пайшоў працаваць у калгас імя Войкава. Восенню трыццаць сёмага года нашага бацьку забралі. Мы ўсё яшчэ спадзяваліся, што гэта памылка, і хутка наш Іпаліт Міхайлавіч вернецца, бо які ж ён польскі шпіён? Але ішоў час, і надзеі не заставалася. Брат Іпаліт працаваў сакратаром Наталоўскага сельсавета. Ён скончыў чатыры класы, хацеў вучыцца далей, але патрэбна было дапамагаць гаспадарыць бацькам. З работай сакратара ён спраўляўся, людзі ў вёсцы яго паважалі. Арышт бацькі быў для яго моцным ударам. Відаць, ён адчуваў, што пагроза навісла і над ім. Ездзіў кудысьці, хацеў даведацца пра бацьку, дапамагчы яму, але ўсё дарэмна. Ведаю, што маці неаднойчы ўгаворвала яго з'ехаць куды, як чула яе сэрца нейкую бяду. Але застаўся Іпаліт дома, верыў яшчэ, мусіць, у справядлівасць. А ў пачатку зімы трыццаць сёмага забралі і яго.

Колькі слёз выплакала маці, колькі бяссонных начэй правяла. Хацелася ўсё праўды дабіцца. Не ведала, што яны абодва ўжо расстраляны: у тым жа трыццаць сёмым — бацька, а ў пачатку трыццаць восьмага — Іпаліт.

ЖДАНОВІЧ Людвіг Адамавіч, н. ў 1896 у в. Вяленік. Працаваў рахункаводам у калгасе. Арыштаваны 25.12.1932. Рэабілітаваны 31.8.1989.

ЖДАНОВІЧ Сцяпан Міхайлавіч, н. ў 1879 у в. Масніцкае. Арыштаваны 24.5.1931. Рэабілітаваны. Арыштаваны 25.2.1933, пасаджаны ў канцлагер на 5 гадоў. Трэці раз арыштаваны 1.9.1937. Расстраляны ў Бабруйску 5.12. 1937. Рэабілітаваны 17.8.1960.

ЖУКАЎ Павел Мікалаевіч, н. ў 1916 у в. Ядраная Слабодка. Ваеннаслужачы 294-й стралковай дывізіі, роты хімаховы. Асуджаны 16.4.1942. Рэабілітаваны 19.2.1943.

ЖУКОЎСКАЯ Марыя Георгіеўна, н. ў 1871. Жыла ў в. Таценка. Арыштавана ў 1930. Раскулачана. Адбывала пакаранне ў Табарынскім раёне Свярдлоўскай вобл. Рэабілітавана 18.12.1992.

ЖУКОЎСКАЯ Алена Аляксандраўна, н. ў 1910, **ЖУКОЎСКАЯ Лідзія Пятроўна**, н. ў 1928, **ЖУКОЎСКАЯ Марыя Іосіфаўна**, н. ў 1908, **ЖУКОЎСКАЯ Ядвіга Аляксандраўна**, н. ў 1912, **ЖУКОЎСКІ Віталь Пятровіч**, н. ў 1936, **ЖУКОЎСКІ Іосіф Пятровіч**, н. ў 1930, **ЖУКОЎСКІ Пётр Аляксандравіч**, н. ў 1902. Усе жыхары в. Таценка. Раскулачаны, адбывалі пакаранне ў Табарынскім раёне Свярдлоўскай вобл.

ЖУКОЎСКІ Аляксандр Пракопавіч, н. ў 1868. Жыў у в. Таценка Клічаўскага раёна. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны. Адбываў пакаранне ў Табарынскім раёне Свярдлоўскай вобл.

ЖЫБУРТОВІЧ Уладзімір Паўлавіч, н. ў 1897 у в. Градкі. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.4.1929. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 27.4.1989.

ЖЫЛА Марыя Максімаўна, н. ў 1881 у в. Міхалоў. Арыштавана 29.9.1937. Рэабілітавана 29.5.1959.

ЗАБЛОЦКІ Адам Цімафеевіч, жыў у в. Гонча. Арыштаваны ў 1931. Раскулачаны. Рэабілітаваны 3.6.1992. Разам з ім рэабілітаваны члены яго сям'і: **ЗАБЛОЦКІЯ Юлія Мікалаеўна, Ефрасіння Адамаўна, Ульяна Адамаўна, Марфа Адамаўна, Настасся Адамаўна, Вольга Адамаўна, Ніліп Адамавіч, Макар Адамавіч.**

ЗАБЛОЦКІ Васіль Сцяпанавіч, н. ў 1901 у в. Гонча. Арыштаваны 22.9.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 29.5.1959.

ЗАБЛОЦКІ Іван Арцёмавіч, н. ў 1883 у в. Гонча. Аднаасобнік. Арыштаваны 20.11. 1932. Рэабілітаваны 8.6.1989.

ЗАБЛОЦКІ Іван Міхайлавіч. н. ў 1877 у в. Гонча. Калгаснік. Арыштаваны 21.8.1937. Расстраляны 17.9.1937. Рэабілітаваны 29.6. 1963.

ЗАБЛОЦКІ Міхаіл Кірэевіч, н. ў 1877 у в. Гонча. Калгаснік. Арыштаваны 21.8.1937. Расстраляны 17.9.1937. Рэабілітаваны 29.6. 1963.

ЗАБЛОЦКІ Павел Васілевіч, н. ў 1870 у в. Гонча. Аднаасобнік. Жыў на хутары Гуры. Рэпрэсіраваны 7.8.1937. Рэабілітаваны 21.10. 1961.

ЗАБЛОЦКІ Павел Васілевіч, н. ў 1882 у в. Гонча. Аднаасобнік. Арыштаваны 22.11. 1932. Рэабілітаваны 8.6.1989.

ЗАБЛОЦКІ Сямён Цімафеевіч, н. ў 1874 у в. Гонча. Аднаасобнік. Арыштаваны 22.11. 1932. Рэабілітаваны 8.6.1989.

ЗАБЛОЦКІ Яфім Васілевіч, н. ў 1887 у в. Гонча. Аднаасобнік. Жыў на хутары Рэ-

пішча. Арыштаваны 23.9.1937. Рэабілітаваны 29.5.1959.

ЗАГАРОЎСКІ Сцяпан Мартынавіч, н. ў 1908 у в. Татаркавічы Свіслацкага раёна. Аднаасобнік. Жыў у в. Дуброва Клічаўскага раёна. Арыштаваны 29.7.1930. Рэабілітаваны 29.8.1989.

ЗАЙЦАЎ Апанас Юр'евіч, н. ў 1896 у в. Калічонка. Арыштаваны 23.4.1932. Рэабілітаваны 26.7.1932.

ЗАЙЦАЎ Дарафей Мінавіч, н. ў 1904 у в. Усакіна. Калгаснік. Арыштаваны 12.4.1932. Рэабілітаваны 11.8.1932.

ЗАЙЦАЎ Малах Кузьміч, н. ў 1857 у в. Калічонка. Арыштаваны 24.4.1932. Рэабілітаваны 26.7.1932.

ЗАЙЦАЎ Міхаіл Пятровіч, н. ў 1909 у в. Усакіна. Жыў у Ленінградзе. Начальнік санітарнай службы в/ч 90388. Арыштаваны 12.5.1950. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 21.7.1954.

ЗАЙЦАЎ Фадзей Малахавіч, н. ў 1890 у в. Калічонка. Арыштаваны 24.4.1932. Рэабілітаваны 26.7.1932. Арыштаваны 21.8.1935. Рэабілітаваны 13.7.1960.

ЗАЙЦАЎ Юрый Кузьміч, н. ў 1866 у в. Калічонка. Арыштаваны 23.4.1932. Рэабілітаваны.

ЗАЙЦАЎ Яфім Васілевіч, н. ў 1886 у в. Новая Слабодка. Працаваў брыгадзірам 16-й дыстанцыі пуці Беларускай чыгункі на старцы Вендраж. Рэпрэсіраваны 19.5.1937. Рэабілітаваны 27.4.1962.

ЗАЛЕСКІ Генрых Іванавіч, н. ў 1913 у в. Межанка Бярэзінскага раёна. Жыў у в. Малахаўшчына Клічаўскага раёна. Брыгадзір калгаса. Арыштаваны 26.4.1938. Расстраляны 13.11.1939.

ЗАЯЦ Іван Мінавіч, н. ў 1886 у в. Усакіна. Працаваў дзесятнікам у леспрамгасе. Арыштаваны 28.5.1931. Рэабілітаваны 23.6.1938.

ЗАЯЦ Фёдар Сцяпанавіч, н. ў 1902 у в. Слабодка. Жыў у в. Саялава. Участковы інспектар райфінаддзела. Арыштаваны 7.6.1946. Рэабілітаваны 1.8.1946.

ЗЕМБА Пётр Антонавіч, н. ў 1893. Працаваў нарыхтоўшчыкам Клічаўскага раённага аддзела нарыхтовак, старшынёй Наталоўскага сельсавета. Арыштаваны 15.11.1937. Рэабілітаваны 5.9.1989.

ЗІНКАВЕЦ Даніла Іосіфавіч, н. ў 1907 у в. Нясята. Арыштаваны 11.2.1934. Рэабілітаваны 28.12.1954.

ЗІНОВІЧ Іван Андрэевіч, н. ў 1916 у в. Лянёўка. Жыў у в. Ноўгарад. Повар. Арыштаваны 16.5.1938. Рэабілітаваны 30.12.1938.

ЗМАЧЫНСКІ Іван Сігізмундавіч, н. ў 1906 у в. Новыя Набаркі. Калгаснік. Арыштаваны 22.9.1937. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 6.5.1961.

З успамінаў сына, Яўгена Іванавіча Змачынскага

Калі арыштавалі бацьку, я быў маленькім, таму нічога не помню аб гэтым. Але падзеі 1937 г., жорсткасць людская, што раскідала вялікую сям'ю Змачынскіх, ды і іншыя сем'і — усё гэта перадавалася, як страшнае паданне.

У сям'і Змачынскіх было 11 чалавек — усе працавітыя, старанныя. Увесь дабрабыт тады браўся толькі з уласных мазалёў. Мелі дзве хаты, хлявы, свірны, гумны, скаціну, гаспадарчы інвентар. Была свая малатарня, апрацоўвалі 10 гектараў зямлі. Усё гэта даглядалі як добрыя гаспадары, таму даводзілася працаваць ад зары да зары. Абыходзіліся сваімі сіламі, толькі летам наймалі пастуха пасціць скаціну за грошы і натуральную аплату.

Хоць бацька і працаваў у калгасе «Чырвоны Кастрычнік», відаць, моцная гаспадарка Змачынскіх камусьці не давала спакою. Пры раскулачванні забралі ўсё, аддалі ў калгас, хату засялілі. Наша разбуранае гняздо ўжо ніколі не аднавілася. Старыя бацькі памерлі, старэйшы брат бацькі Канстанцін быў высланы ў Сібір раней. Бацьку арыштавалі і расстралялі ў тым жа 1937 г. ў Бабруйску. Праз некаторы час праўленне калгаса злітавалася і прадало маці за тысячу рублёў яе ж хату.

А потым пачаліся жыццёвыя пакуты. Доўга аддавалі даўгі за хату (тысяча рублёў на той час былі вельмі вялікія грошы), у калгасе не давалі «ворагам народа» каня, каб прывезці сена, дровы. Такія ж, як і наша, сем'і на сабе цягалі алешнік, карчы, траву для кароў. Такое нават ворагу цяжка пажадаць.

ЗНАСКЕВІЧ Вацлаў Паўлавіч, н. ў 1896 у в. Сяліба Бярэзінскага раёна. Працаваў у в. Залужжа Клічаўскага раёна. Пуцявы абходчык. Арыштаваны 17.11.1937. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 13.10.1958.

ЗНАСКЕВІЧ Вітольд Іванавіч, н. ў 1890 у в. Дзерці Чэрвенскага раёна. Жыў у в. Залужжа Клічаўскага раёна. Чыгуначнік. Арыштаваны 3.9.1937. Расстраляны. Рэабілітваны 3.8.1959.

ЗУБРЫЦКІ Аляксандр Андрэевіч, н. ў 1906 у в. Орліна. Аднаасобнік. Арыштаваны 6.8.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 22.5.1959.

ІВІНСКІ Станіслаў Людвігавіч, н. ў 1886 у в. Ваевічы. Жыў у Клічаве. Рабочы бандарнай арцелі. Арыштаваны 31.7.1938. Рэабілітаваны 1.2.1941.

ІЗМЕР Васіль Максімавіч, н. ў 1902 у в. Коўбча. Жыў у в. Іванаўка. Працаваў агентам па нарыхтоўках. Арыштаваны 17.11.1944. Рэабілітаваны 31.10.1946.

ІЗМЕР Сямён Рыгоравіч, н. ў 1878 у в. Коўбча. Аднаасобнік. Арыштаваны 11.8.1938. Рэабілітаваны 27.1.1939.

ІЗОХ Аляксей Раманавіч, н. ў 1887 у Клічаве. Жыў у в. Яўсташына. Старшыня калгаса. Арыштаваны 28.12.1944. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 24.11.1967.

ІЗОХ Дзмітрый Іванавіч, н. ў 1910 у Клічаве. Жыў у мястэчку Малая Сазонка Свабодзенскага раёна Амурскай вобл. Камандзір дывізіёна бранякатэраў. Арыштаваны 28.8.1937. Расстраляны 25.3.1938 у г. Хабараўску. Рэабілітаваны 3.10.1957.

ІЗОХ Павел Іванавіч, н. ў 1889 у Клічаве. Калгаснік. Арыштаваны 17.8.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 4.8.1958.

ІСЛЕЎСКІ Фрол Сямёнавіч, н. ў 1896 у в. Даўжанка. Калгаснік. Арыштаваны 19.12.1937. Расстраляны 21.2.1938. Рэабілітаваны 7.6.1961.

КАВАЛЁНАК Ганна Васілеўна, н. ў 1905 у в. Закуцце. Працавала даяркай калгаса «Іскра камуны». Арыштавана ў 1937. Рэабілітавана ў 1948.

З успамінаў дачкі Ганны Васілеўны — Дубіны Н. Г.

Маю маці забралі позна вечарам. Яна была вельмі разгубленая, не разумела, што здарылася. З сабою нічога не дазволілі ўзяць, сказалі, што заўтра яе адпусцяць. Але вярнулася яна толькі праз адзінаццаць гадоў. Мне было тады толькі 7 гадоў. Цяжка было без маці. Жыла ў бабулі, затым у сваякоў. Так перажыла адна вайну. Вярнулася мая маці толькі ў 1948 годзе. Вельмі хвалюючай была наша сустрэча. Раніцай я выйшла на вуліцу і ўбачыла незнаёмую жанчыну, якая сядзела на прызбе нашай хаты. Гэта была мая маці. Я яе адразу не пазнала, а яна ад хвалявання не магла вымавіць ні слова. Вярнулася маці ўся абмарожаная. Доўга балелі абмарожаныя рукі і ногі.

Маці расказвала, што жыццё ў лагеры было вельмі цяжкім, і вярнуцца адтуль здолелі нямногія. Выслалі яе ў Ніжні Тагіл. Спачатку працавала на лесапавале, затым пракладвала Беламорканал. Працавалі па 13—15 гадзін у суткі на любым марозе. Калі пракладвалі Беламорканал, то амаль кожную гадзіну паміралі людзі. Іх ніхто не хаваў, скідалі прама ў канал.

Пражыла мая маці вельмі цяжкае жыццё. Памерла ў 1983 годзе, пражыўшы 78 гадоў.

КАВАЛЁНАК Міхаіл Васілевіч, працаваў старшынёй Каўбчанскага сельсавета. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны.

КАВЕЦКІ Іосіф Якаўлевіч, н. ў 1895 у в. Апалінарава. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 5.9.1959.

КАВЕЦКІ Леапольд Якаўлевіч, н. ў 1886 у в. Казімірава Свіслацкага раёна. Аднаасобнік. Жыў у в. Апалінарава Клічаўскага раёна. Арыштаваны 26.3.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 5.9.1959.

КАВЕЦКІ Эдуард Якаўлевіч, н. ў 1892 у в. Апалінарава. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 5.9.1959.

КАЗАЧОНАК Мікалай Анцінавіч, н. ў 1902 у в. Закоркі. Жыў там жа. Земляроб. Арыштаваны 22.9.1937. Рэабілітаваны 29.5.1959.

КАЗАЧОНАК Фядос Патапавіч, н. ў 1900 у в. Закоркі. Аднаасобнік. Жыў у в. Масное. Арыштаваны 20.6.1937. Расстраляны 9.9.1937. Рэабілітаваны 18.8.1989.

КАЗЕКА Леанід Іванавіч, н. ў 1915 на хутары Дуброва. Жыў у Южскім лагеры НКУС. Служыў у арміі. Арыштаваны 20.8.1940. Рэабілітаваны 19.5.1958.

КАЗЕЛА Іван Васілевіч, н. ў 1873 у Клімавіцкім раёне. Калгаснік. Жыў у в. Курганне. Арыштаваны 29.12.1932. Рэабілітаваны 31.3.1989.

КАЗЛОЎ Уладзімір Міхайлавіч, н. ў 1902 на хутары Ямішча. Жыў у в. Новыя Максімавічы. Брыгадзір калгаса «Чырвоны маяк». Арыштаваны 9.7.1938. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 28.12.1959.

КАЗЛОЎСКІ Іосіф Віктаравіч, н. ў 1907 у в. Асавы. Жыў там жа. Працаваў рахункаводам калгаса «Чырвоны партызан». Арыштаваны 18.9.1945.

КАЛЕСНІК Іван Вікенцьевіч, н. ў 1883 у в. Малая Вольса. Аднаасобнік. Арыштаваны 11.8.1938. Рэабілітаваны 2.3.1939.

КАЛЕСНІК Ігнат Мартынавіч, н. ў 1886 у в. Заполле. Земляроб. Арыштаваны 15.1.1933. Рэабілітаваны 9.2.1933.

КАЛЬЧЫНСКАЯ Ніна Мікалаеўна, н. ў 1928 у в. Лініца. Арыштавана ў 1931. Адбывала пакаранне ў Пермскай вобл. Рэабілітавана 17.12.1992.

КАНАВАЛАЎ Дзмітрый Сцяпанавіч, н. ў 1904. Працаваў у калгасе «Вольная праца». Жыў у в. Лянёўка. Арыштаваны 11.5.1945. Рэабілітаваны 24.8.1953.

КАНДРАЦЬЕЎ Улас Харламавіч, жыў у в. Церахаў Бор. Аднаасобнік. Арыштаваны 23.4.1932. Рэабілітаваны 11.8.1932.

КАНОЙКА Вольга Апанасаўна, н. ў 1928 у в. Заполле. Арыштавана 28.8.1947. Як член сям'і здрадніка Радзімы на 5 гадоў саслана ў Краснаярскі край. Рэабілітавана 24.3.1989.

КАНОЙКА Домна Андрэеўна, н. ў 1890 у в. Орліна. Жыла ў в. Заполле. Хатняя гаспадыня. Арыштавана 28.8.1947. Як член сям'і здрадніка Радзімы на 5 гадоў саслана ў Краснаярскі край. Рэабілітавана 24.3.1989.

КАНОЙКА Марыя Апанасаўна, н. ў 1924 у в. Заполле. Арыштавана 28.8.1947. Як член сям'і здрадніка Радзімы на 5 гадоў саслана ў Краснаярскі край. Рэабілітавана 24.3.1989.

КАРАЛЁК Цімафей Андрэевіч, н. ў 1890 у в. Лянёўка. Працаваў у калгасе «Вольная праца». Арыштаваны 11.5.1945. Рэабілітаваны 24.8.1953.

КАРДЫМОН Васіль Захаравіч, н. ў 1901 у в. Коўбча. Жыў у в. Усакіна. Працаваў настаўнікам ва Усакінскай НСШ. Арыштаваны 23.4.1932. Рэабілітаваны 11.8.1932.

КАРДЫМОН-БАЕК Марыя Адамаўна, н. ў 1910 у в. Мікалаеўка. Аднаасобніца. Арыштавана 18.7.1930. Рэабілітавана 17.7.1989.

КАРЖАНЕЎСКІ Вікенцій Вівенцьевіч, н. ў 1887 у в. Таценка. Повар калгаса «Камінтэрн». Арыштаваны 22.2.1932. Высланы ў Казахстан. Рэабілітаваны 20.11.1989.

КАРЖЭЎСКІ Пётр Іванавіч, н. ў 1871 у в. Таценка. Аднаасобнік. Арыштаваны

15.2.1930. Высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 14.6.1989.

КАРОЛЬ Аляксей Лукіч, н. ў 1888 у в. Вяленка. Калгаснік. Арыштаваны 9.6.1938. Расстраляны 5.10.1938. Рэабілітаваны 2.6.1960.

КАРОТКАЯ Праскоўя Мікалаеўна, н. ў 1905 у в. Новае Сяло. Працавала ў калгасе «2-я пяцігодка». Арыштавана 13.5.1945. Рэабілітавана 28.7.1945.

КАСПЯРОВІЧ Алена Антонаўна, н. ў 1882 у в. Гіжгайлава. Жыла ў в. Аляксандраўка Клічаўскага раёна. Аднаасобніца. Арыштавана 4.6.1929. Саслана на 3 гады ў Сібір. Рэабілітавана 29.11.1988.

КАСПЯРОВІЧ Іосіф Фадзеевіч, н. ў 1904 на хутары Шамоль Бабруйскага раёна. Жыў у в. Аляксандраўка Клічаўскага раёна. Аднаасобнік. Арыштаваны 4.6.1929. Сасланы на 3 гады ў Сібір. Рэабілітаваны 29.11.1988.

КАСПЯРОВІЧ Фадзей Васілевіч, н. ў 1867 на хутары Шамоль Бабруйскага раёна. Жыў у в. Аляксандраўка Клічаўскага раёна. Аднаасобнік. Арыштаваны 20.5.1929. Рэабілітаваны 29.11.1988.

КАСЦЕВІЧ Аляксандр Васілевіч, н. ў 1892 у Чэрвеньскім раёне. Земляроб. Жыў у в. Казлы. Арыштаваны 16.8.1938. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 18.12.1956.

КАСЦЯН Антон Цярэнцьевіч, н. ў 1884 у в. Усохі. Жыў у в. Дуброва. Рабочы саўгаса. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны 22.11.1958 (Гл. пра яго асобны нарыс «Жыў-быў кулак Антон»).

КАСЦЯН Міхаіл Цярэнцьевіч, н. ў 1902 у в. Усохі. Жыў у в. Усохі. Рабочы леспрамгаса. Арыштаваны 18.7.1937. Рэабілітаваны 22.11.1958.

КАЎШЫРКА Макар Архінавіч, н. ў 1899 у в. Стаялава. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3.1930. Рэабілітаваны 27.4.1989.

КАЎШЫРКА Мікіта Васілевіч, н. ў 1884 у в. Стаялава. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.3.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 27.3.1989.

КАЎШЫРКА Пётр Цімафеевіч, н. ў 1907 у в. Стаялава. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3.1930. Вызвалены 15.4.1930.

КАШКАН Макар Аляксеевіч, н. ў 1898. Жыў у в. Новае Курганне Клічаўскага раёна. Арыштаваны ў 1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 26.6.1992.

КВЯТКОЎСКІ Аляксандр Андрэевіч, н. ў 1892 у мястэчку Гарадок Вілейскага раёна. Жыў у в. Звальня Клічаўскага раёна. Аднаасобнік. Арыштаваны 24.7.1935. Рэабілітаваны 17.10.1989.

КЛЕПЧА Дзям'ян Мікітавіч, н. ў 1917. Жыў у в. Загацце. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны. Рэабілітаваны 10.3.1992.

КЛЕПЧА Канстанцін Мікалаевіч, н. ў 1903 у в. Загацце. Жыў у в. Шараеўка Магілёўскага раёна. Аднаасобнік. Арыштаваны 7.1.1933. Рэабілітаваны 24.7.1989.

КЛЕПЧА Мікіта Уласавіч, н. ў 1885. Жыў у в. Загацце. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны. Рэабілітаваны 10.3.1992.

КЛЕПЧА Павел Сцяпанавіч, н. ў 1886 у в. Стаялава Клічаўскага раёна. Цясляр саўгаса «Нясята». Арыштаваны 21.2.1931. Рэабілітаваны 12.9.1989.

КЛЕПЧА Пётр Мікітавіч, н. ў 1912. Жыў у в. Загацце. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны. Рэабілітаваны 10.3.1992.

КЛЕПЧА Радзівон Мікітавіч, н. ў 1906. Жыў у в. Загацце. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны. Рэабілітаваны 10.3.1992.

КЛЕПЧА Фама Яфрэмавіч, н. ў 1904 у в. Загацце. Жыў на станцыі Мілое. Працаваў на чыгунцы. Рэпрэсіраваны 7.6.1945. Рэабілітаваны 26.11.1946.

КЛІНДЗЮК Андрэй Сцяпанавіч, н. ў 1888 у в. Закуцце. Жыў у в. Рагі Клічаўскага раёна. Аднаасобнік. Арыштаваны 5.8.1937. Расстраляны 11.9.1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КЛІНДЗЮК Ігнат Агеевіч, н. ў 1897 у в. Рагі. Аднаасобнік. Арыштаваны 22.9.1937. Рэабілітаваны 22.5.1959.

КНІГА Анісім Лук'янавіч, н. ў 1874 у в. Максімавічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 2.4.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КОЙПІШ Сцяпан Самусевіч, н. ў 1896 у в. Закоркі. Земляроб. Арыштаваны 22.9. 1937. Рэабілітаваны 29.5.1959.

КОЙПІШ Якаў Самуілавіч, н. ў 1901 у в. Закоркі. Аднаасобнік. Арыштаваны 25.3.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 13.8.1990.

КОЎРЫК Лявон Арцёмавіч, н. ў 1887 у в. Вусце. Жыў у в. Іванаўка. Аднаасобнік. Арыштаваны 24.8.1937. Рэабілітаваны.

КРАТКОЎСКІ Стафан Васілевіч, н. ў 1900 у в. Малая Вольса. Працаваў у дарожным аддзеле дзесятнікам у Клічаве. Арыштаваны 17.11.1937. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 8.9.1961.

КРАТКОЎСКІ Уладзімір Максімавіч, н. ў 1889 у в. Вольса. Працаваў электрыкам. Арыштаваны 2.12.1935. Рэабілітаваны 3.3. 1936.

КРАЎЧАНКА Іван Андрэевіч, н. ў 1909 у г. п. Клічаў. Жыў у г. Барысаве, працаваў ваенным тэхнікам. Арыштаваны 30.4.1938. Рэабілітаваны 18.2.1939.

КРЫВАНОС Агаф'я Якаўлеўна, н. ў 1914 у в. Брылёўка. Арыштавана 6.2.1943. Рэабілітавана 13.4.1946.

КРЫВАНОС Васіль Мікалаевіч, н. ў 1904 у в. Закуцце. Жыў у в. Анатолеўка. Земляроб. Арыштаваны 24.12.1932. Рэабілітаваны 19.5. 1933.

КРЫВАНОС Васіль Цімафеевіч, н. ў 1876 у в. Закуцце. Земляроб. Арыштаваны 12.1.1933. Рэабілітаваны 19.5.1933.

КРЫВАНОС Іван Андрэевіч, н. ў 1911 у в. Закуцкі Дварок. Жыў у в. Закуцце. Земляроб. Арыштаваны 8.1.1932. Рэабілітаваны 19.5.1933.

КРЫВАНОС Іван Раманавіч, н. ў 1892 у в. Суша. Старшыня калгаса. Арыштаваны 16.3.1932. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 28.8.1965.

КРЫВАНОС Іван Раманавіч, н. ў 1892 у в. Суша. Працаваў загадчыкам фермы ў калгасе. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 2.6.1956.

КРЫВАНОС Кірыла Андрэевіч, н. ў 1890 у в. Суша. Жыў на хутары Крывіча. Калгаснік. Арыштаваны 23.4.1932. Рэабілітаваны 11.8.1932.

КРЫВАНОС Кірыла Гаўрылавіч, н. ў 1895 у в. Суша. Земляроб. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Высланы ў Хабараўскі край. Рэабілітаваны 2.6.1956.

КРЫВАНОС Пётр Раманавіч, н. ў 1888. Жыў у в. Суша. Калгаснік. Рэпрэсіраваны 23.5.1933. Рэабілітаваны 7.7.1962.

КРЫВАНОС Стафан Дамітрыевіч, н. ў 1904. Жыў у в. Суша. Працаваў кладаўшчыком у калгасе. Арыштаваны 23.5.1933. Рэабілітаваны 1.6.1962.

КРЫВАНОС Сцяпан Цімафеевіч, н. ў 1896 у в. Закуцце. Земляроб. Арыштаваны 28.12. 1932. Рэабілітаваны 19.5.1933.

КРЫВАНОС Фядот Восіпавіч, н. ў 1878 у в. Суша. Жыў у в. Альхоўка. Аднаасобнік. Арыштаваны 20.11.1932. Рэабілітаваны 20.12.1958.

КРЫГШТЭЙН Саул Ісакавіч (Ісаевіч), н. ў 1899. Працаваў старшынёй Бацэвіцкага сельсавета. Арыштаваны 17.12.1937. Расстраляны 4.10.1938. Рэабілітаваны.

КРЫХУН Іван Данілавіч, н. ў 1907 у в. Усохі. Начальнік аддзялення сувязі. Арыштаваны 19.12.1937. Рэабілітаваны 10.7.1938.

КРЭМЕЗ Іван Стафанавіч, жыў у в. Новае Курганне. Арыштаваны ў 1929. Раскулачаны. Высланы на Урал. Рэабілітаваны 23.3.1992.

КУДЗІН Софія Ануфрыеўна, н. ў 1921 у в. Новае Курганне. Працавала ў калгасе «Авангард». Арыштавана 26.10.1947. Як член сям'і здрадніка Радзімы на 5 гадоў саслана ў Краснаярскі край. Рэабілітавана 24.3.1989.

КУНЦЭВІЧ Марк Яфрэмавіч, н. ў 1907 у в. Буднеў. Калгаснік. Арыштаваны 4.12. 1937. У 1938—46 працаваў у Магаданскай вобл. Рэабілітаваны.

КУЧЫНСКІ Аляксандр Сямёнавіч, н. ў 1883 у в. Таценка. Аднаасобнік. Арыштаваны 2.6.1938. Расстраляны 27.11.1938. Рэабілітаваны 27.11.1989.

КУШНЕР Аксіння Севасцьянаўна, н. ў 1898 у в. Дулебна. Аднаасобніца. Жыла ў в. Ліпніца. Арыштавана 14.8.1944. Рэабілітавана.

КУШНЕР Аляксандр Пракопавіч, жыў у в. Перасопня. Арыштаваны ў 1931. Высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 27.7.1992.

КУШНЕР Аляксандр Яўціхіевіч, н. ў 1906 у в. Н. Арэхаўка. Аднаасобнік. Рэпрэсіраваны ў 1930. Разам з бацькам —

КУШНЕР Яўціхіем Андрэевічам, маці **Марыяй Мацвееўнай** і братамі **Фёдарам** і **Пятром** высланы ў Чыцінскую вобл. Рэабілітаваны ў 1945.

КУШНЕР Аляксандра Маркаўна, жыла ў в. Перасопня. Арыштавана ў 1931. Раскулачана. Выслана на Урал. Рэабілітавана 8.4.1992.

КУШНЕР Іван Купрыянавіч, н. ў 1892. Жыў у в. Ліпніца. Аднаасобнік. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны 22.9.1992.

КУШНЕР Марк Пракопавіч, жыў у в. Перасопня. Арыштаваны ў 1931. Раскулачаны. Адбываў пакаранне на Урале. Рэабілітаваны 8.4.1992.

КУШНЕР Марыя Лявонаўна, н. ў 1915 у в. Уладзіміраўка. Працавала на асабістай гаспадарцы бацькоў. Рэпрэсіравана ў кастрычніку 1930 разам з бацькамі **МІХЕЙЧЫКАМ Лявонам Паўлавічам**, маці **Аленай Арцёмаўнай**, меншымі братамі і сёстрамі (усяго 8 дзяцей). Высланы ў Чыцінскую вобл. Рэабілітаваны ў 1945.

Успаміны М. Л. Кушнер гл. ў асобным арт. «Блуканне па пакутах».

КУШНЕР Пракоп Рыгоравіч. Жыў у в. Перасопня. Арыштаваны ў 1931. Высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 27.7.1992.

КУШНЕР Уладзімір Маркавіч, жыў у в. Перасопня. Арыштаваны ў 1931. Раскулачаны. Высланы на Урал. Рэабілітаваны 8.4.1992.

ЛАБАНОВІЧ Вацлаў Леанардавіч, н. ў 1909 у в. Анатолеўка. Настаўнік. Арыштаваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 13.8.1960.

ЛАБАНОВІЧ Франц Дамітрыевіч, н. ў 1918 у в. Анатолеўка. Калгаснік. Арыштаваны 15.12.1937. Рэабілітаваны 15.9.1938.

ЛАПАЦІНА Марыя Міронаўна, н. ў 1924 у в. Віркаў. Рабочая торфазавода. Арыштавана 29.12.1944. Рэабілітавана 4.8.1945.

ЛАПАЦІН-ЛАПАТА Аляксандр Сцяпанавіч, н. ў 1908 у в. Віркаў. Аднаасобнік. Арыштаваны 14.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Пакаранне адбываў у Бурацыі. Рэабілітаваны 28.11.1969.

ЛАПКОВА Марыя Цітаўна, жыла ў в. Закупленне. Раскулачана ў 1930. Выслана на Урал. Рэабілітавана 9.1.1992.

ЛАПКОЎ Іван Канстанцінавіч, жыў у в. Закупленне. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны. Высланы на Урал. Рэабілітаваны 9.1.1992.

ЛАПКОЎ Ігнат Цітавіч, яго жонка **ЛАПКОВА Таццяна Ільінічна**, дзеці **Анфіса**, **Фёдар**, **Ганна** жылі ў в. Закупленне. Працавалі ў калгасе імя Чапаева. У 1930 сям'я выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 25.9.1991.

З успамінаў Ганны Ігнатаўны Лапковай

У нашага бацькі Лапкова Ігната Цітавіча быў вельмі прыгожы хутар, зваўся ён Ігнатавым хутарам. Там і жыла наша сям'я: бацька, маці і трое дзяцей — трох, сямі і дзесяці гадоў. Была ў бацькоў свая гаспадарка: 2 каровы, цёлка, конь, 3 свінні, 5 авечак, добры сад і г. д.

У 1930 г., калі мне было 3 гады, аднойчы ноччу прыйшлі людзі і забралі нашага бацьку. Дзяцей будзіць не сталі, пакінулі разам з маці. На наступны дзень забралі нас з маці і павезлі ў Быхаў. Там мы два тыдні сядзелі ў турме, а затым разам з бацькам нас павезлі ў таварным цягніку. Прывезлі ў Пермскую вобласць. Бацьку накіравалі на распрацоўку лесу, а нас пасялілі ў барак на 7 сямей. Жылі разам з украінцамі. Барак гэты меў толькі 2 аконцы і ацяпляўся «буржуйкай». Замест ложкаў — нары з мохам. Бацьку на лесапавале давалі паёк: 200 г хлеба і крупень. Ежы гэтай на ўсю сям'ю не хапала, таму маці таксама пайшла працаваць на лесанарыхтоўкі. Украінцы ад гэтай работы адмовіліся. Мне было толькі 3 гады, таму мяне пакінулі з маці, а

старэйшых Анфісу і Фёдара адаслалі ў вёску ў школу. Настаўнік іх у школу прыняў, але жыць дзецям не было дзе, а на вуліцы — зіма. Таму начальства дазволіла вярнуць дзяцей на радзіму. За імі прыехаў матчын брат і забраў іх да сябе. Жылі яны бедна, таму Анфіса і Фёдар жылі асобна ў розных сваякоў.

Мы з маці знаходзіліся на Пермшчыне год. Украінцы за зіму памерлі, а маці вырашыла ўцякаць і вярнуцца дамоў. Памятаю, як бацька ў прыцемках нёс мяне на руках, пагладзіў па галаве, потым пасадзіў нас з маці ў лодку і прасіў яе закрываць мне вочы, каб не перапалохалася, калі будзем перапраўляцца праз Каму. Бацька паспяшаўся назад, каб не спазніцца на працу, а я ўвесь час, пакуль плылі праз раку, плакала, бо вельмі баялася такой вялізнай ракі.

Так мы з маці ўцяклі з пасялення і вярнуліся на Клічаўшчыну.

Вярнуліся, а жыць недзе. У нашай хаце ўжо размясціўся сельсавет, жывёлу забраў калгас, усю маёмасць расцягнулі, нават яблынькі ў садзе выкапалі. Мама пайшла ў заработкі на раку, а мяне, як і старэйшых брата і сястру, прытулілі дальнія сваякі. Так і жылі мы па людзях: трое дзяцей — усе ў розных сем'ях. Здолелі сабрацца ўсе разам толькі праз некалькі гадоў. Жылі ў стопцы, якую аддалі нам добрыя людзі. Я пайшла ў школу ў Закупленне і скончыла там 4 класы.

Бацька адпрацаваў на лесапавале 3 гады — голад і яго прымусіў уцячы. Вярнуўся да нас. Праз пяць дзён яго зноў забралі і адаслалі ў Свярдлоўск, у турму. Сядзеў ён там два гады, хварэў, апух, і яго, зусім ужо хворага, прывезлі дамоў. Пражыў ён пасля гэтага каля паўгода і памёр.

Стопка наша згарэла ў вайну. Фёдар не вярнуўся з вайны. Сваю хату я здолела мець толькі ў шасцідзесятых гадах.

ЛАПКОЎ Канстанцін Цітавіч, жыў у в. Закупленне. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны. Адбываў пакаранне на Урале. Рэабілітаваны 9.1.1992.

ЛАПКОЎ Фёдар Іванавіч, жыў у в. Закупленне. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны. Высланы на Урал. Рэабілітаваны 9.1.1992.

ЛЕАНОВІЧ Вікенцій Вікенцьевіч, н. ў 1904 у в. Магілёўшчына Дзяржынскага раёна. Жыў у в. Нясята. Арыштаваны 5.8.1936. Рэабілітаваны 23.11.1940.

ЛЕЖУКОВІЧ Фёдар Іванавіч, н. ў 1896 у в. Новыя Максімавічы. Настаўнік. Арыштаваны 20.10.1937. Рэабілітаваны 9.8.1963.

ЛЕСКАВЕЦ Апанас Васілевіч, н. ў 1902 у в. Суша. Жыў у в. Жэрдзішча. Арыштаваны 27.9.1937. Рэабілітаваны 29.5.1959.

ЛЕСКАВЕЦ Кузьма Іванавіч, н. ў 1905. Жыў у в. Суша. Працаваў кладаўшчыком. Арыштаваны 23.5.1933. Рэабілітаваны 1.6. 1962.

ЛЕСКАВЕЦ Міхаіл Маркавіч, н. ў 1884 у в. Жэрдзішча. Жыў у в. Дуброва. Арыштаваны 4.12.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 6.6.1989.

З успамінаў дачкі, Алены Міхайлаўны Пірожнік (Лескавец)

Бацька мой быў добра вядомым у нашай акрузе. У гады белапольскай акупацыі ён доўгі час ваяваў за Савецкую ўладу ў партызанскім атрадзе. Прыйшоў дадому — голад, разруха. Нажылі сваім мазалём гаспадарку, палепшала крыху жыццё. Калі аб'явілі па вёсках дзяржаўны заём, пасля цяжкіх роздумаў сам завёў у Клічаў двух коней, карову, авечак, узамен атрымаў некалькі аблігацый.

Сям'я была вялікая — шасцёра дзяцей, самы меншы толькі нарадзіўся. У 1933 г. сям'я пераехала ў вёску Дуброва Нясяцкага сельсавета, тут і ўступіла ў калгас, а бацька стаў працаваць будаўніком.

Колькі сіл палажыў на калгаснай будоўлі! Працавалі ж не так, як цяпер. Прыходзіў позна такі стомлены, што часта нават і вячэраць не было сіл. А будаваць у калгасе трэба было шмат чаго.

4 верасня 1937 г. бацьку выклікалі ў праўленне калгаса. Там ужо стаяў «чорны воран». Не растлумачыўшы завошта, упіхнулі ў машыну і павезлі ад нас назаўсёды.

Маці адна засталася на ўсю вялікую сям'ю. Усюды паспявала — і дома, і ў калгасе. А праца калгасная была цяжкая — усё ўручную, ад цямна да цямна. Толькі плацілі за працу так мала, што хлеба мы амаль не бачылі. Памятаю, што нам, дзецям, увесь час хацелася есці, а размовы ўсе нашы канчаліся тым, што смачнае хто калісьці еў. Не дзіва, што чацвёра з нашай сям'і маці пахавала. Засталіся толькі я і сястра.

Пазней даведаліся, што бацька быў высланы ў Мардовію і 14 кастрычніка 1941 г. быў расстраляны.

ЛЕСКАВЕЦ Пётр Васілевіч, н. ў 1891 у в. Суша. Жыў у в. Жэрдзішча. Арыштаваны 22.3.1933. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ЛЕСКАВЕЦ Піліп Фаміч, н. ў 1883 у в. Суша. Арыштаваны 26.3.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 27.4.1989.

ЛЕСКАВЕЦ Рыгор Мінавіч, н. ў 1879 у в. Суша. Арыштаваны 7.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 2.6.1956.

ЛЕСКАВЕЦ Яфім Маркавіч, н. ў 1887 у в. Суша. Калгаснік. Арыштаваны 18.11.1932. Рэабілітаваны 20.12.1958.

ЛІПАЙ Сцяпан Іванавіч, н. ў в. Новае Курганне. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3. 1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 5.9.1959.

ЛІПАЙ Якаў Фёдаравіч, н. ў 1888 у в. Зянькавічы Уздзенскага раёна. Жыў у в. Новае Курганне. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3. 1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 5.9. 1959.

ЛІСАКОВІЧ Уладзімір Мікітавіч, н. ў 1878 у в. Новыя Максімавічы. Калгаснік калгаса «Чырвоны Маяк». Арыштаваны 6.1.1933. Рэабілітаваны 31.7.1991.

ЛОЙКА Станіслаў Іосіфавіч, н. ў 1868 у в. Стаялава. Жыў у в. Гіжгайлава. Арыштаваны 10.5.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

ЛУКОМСКІ Павел Іванавіч, н. ў 1907 у в. Красніца Рагачоўскага раёна. Жыў у в. Бацэвічы. Настаўнік. Арыштаваны 25.7. 1946. Рэабілітаваны 25.3.1948.

ЛУК'ЯНОВІЧ Гаўрыла Міхайлавіч, н. ў 1907 у в. Бацэвічы. Аднаасобніца. Арыштаваны 21.9.1932. Высланы ў Казахстан. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ЛУК'ЯНОВІЧ Гаўрыла Міхайлавіч, н. ў 1873 у в. Бацэвічы. Калгаснік. Арыштаваны 15.9.1932. Высланы ў Казахстан. Рэабілітаваны.

ЛУК'ЯНОВІЧ Іосіф Гаўрылавіч, н. ў 1911 у в. Бацэвічы. Жыў у в. Таценка. Калгаснік калгаса «Камінтэрн». Арыштаваны 15.9.1932. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ЛУК'ЯНОВІЧ Матрона Кірэеўна, н. ў 1877 у в. Слабодка. Аднаасобніца. Арыштавана 22.9.1932. Рэабілітавана 27.2.1989.

ЛУК'ЯНОВІЧ Павел Гаўрылавіч, н. ў 1902 у в. Бацэвічы. Жыў у Клічаве. Касір раймаслапрома. Арыштаваны 16.12.1937. Расстраляны 5.2.1938. Рэабілітаваны 3.1.1959.

ЛУК'ЯНОВІЧ Пётр Арцёмавіч, н. ў 1909 у в. Бацэвічы. Арыштаваны 15.11.1933. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ЛУК'ЯНОВІЧ Раман Міхайлавіч, н. ў 1877 у в. Бацэвічы. Арыштаваны 20.2. 1932. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ЛУК'ЯНОВІЧ Раман Міхайлавіч, н. ў 1877 у в. Бацэвічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 23.8.1937. Расстраляны 28.11.1937. Рэабілітаваны 17.11.1989.

ЛУК'ЯНОВІЧ Софія Арцёмаўна, н. ў 1913 у в. Бацэвічы. Аднаасобніца. Арыштавана 28.10.1932. Выслана ў Казахстан. Рэабілітавана 27.11.1989.

ЛУК'ЯНОВІЧ Таццяна Гаўрылаўна, н. ў 1913 у в. Бацэвічы. Арыштавана 28.10. 1932. Выслана ў Казахстан. Рэабілітавана 27.11.1989.

ЛУК'ЯНОВІЧ Фёдар Арцёмавіч, н. ў 1904 у в. Бацэвічы. Арыштаваны 4.9.1932. Рэабілітаваны 27.9.1989.

ЛУК'ЯНОВІЧ Фёдар Карнеевіч, н. ў 1833 у в. Бацэвічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 16.9.1932. Высланы ў Казахстан. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ЛУК'ЯНОВІЧ Яўгенія Міхайлаўна, н. ў 1889 у в. Бацэвічы. Аднаасобніца. Арыштавана 3.9.1932. Рэабілітавана 27.11.1989.

ЛЫЗО Уладзімір Яфімавіч, н. ў 1926 у в. Асавы. Служыў у 3-м батальёне 307-га стралковага палка. Арыштаваны 3.1.1945. Рэабілітаваны 19.4.1945.

ЛЫЧКОЎСКІ Іосіф Міхайлавіч, н. ў 1887 у в. Гіжгайлава. Арыштаваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

ЛЯШЧЫНСКІ Усцін Адамавіч (Аўгуставіч), н. ў в. Бацэвічы. Калгаснік. Арыштаваны 11.6.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 25.1.1961.

МАЖУГА Пётр Тарасавіч, н. ў 1879 у в. Востраў. Жыў у г. Бабруйску. Пажарнік пажарнай аховы. Арыштаваны 26.7.1937. Рэабілітаваны 5.10.1989.

МАЗІН Фёдар Міхайлавіч, н. ў 1881 у в. Ядраная Слабада. Жыў у в. Даўжанка. Калгаснік. Арыштаваны 28.9.1939. Рэабілітаваны 29.11.1939.

МАКАРЭВІЧ Архіп Цярэнцьевіч, н. ў 1904 у в. Ліпніца. Аднаасобнік. Арыштаваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 18.8.1989.

МАКАРЭВІЧ Марфа Міхалаеўна, н. ў 1899 у в. Астраўкі Бярэзінскага раёна. Жыла ў в. Ліпніца. Працавала на асабістай гаспадарцы. Арыштавана 14.8.1944. Рэабілітавана 27.3. 1945.

МАЛАХАЎ Іван Апанасавіч, н. ў 1917. Жыў у г. Мінску. Рэпрэсіраваны 10.1.1938. Рэабілітаваны 11.6.1957.

МАЛІШЭЎСКІ Аркадзь Вікенцьевіч, н. ў 1906 у пасёлку Стэфанаўка. Працаваў вазчыкам у леспрамгасе. Арыштаваны 16.11. 1937. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 31.3.1958.

МАЛІШЭЎСКІ Віктар Адольфавіч, н. ў 1885 у в. Турчылоў. Калгаснік. Арыштаваны 28.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

МАЛІШЭЎСКІ Іосіф Адольфавіч, н. ў 1904 у в. Турчылоў. Калгаснік калгаса «Калектывіст». Арыштаваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

МАЛІШЭЎСКІ Франц Ігнатавіч, н. ў 1905 у в. Міхалоўка. Калгаснік. Рэпрэсіраваны 18.2.1938. Рэабілітаваны 31.1.1961.

МАЛЯНТОВІЧ Іосіф Аўрамавіч, н. ў 1904 на хутары Забродзе Чэрвеньскага раёна. Жыў у в. Развадава. Арыштаваны 24.8. 1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 11.4.1962.

МАМЧЫЦ Канстанцін Міналаевіч, н. ў 1893 у в. Палужжа Навагрудскага раёна. Жыў у в. Максімавічы. Працаваў настаўнікам Максімавіцкай школы. Арыштаваны 2.4.1933. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 26.1.1989.

МАКЕЕЎ Іван Якаўлевіч, н. ў 1885. Жыў у в. Звальня. Арыштаваны 23.9.1937. Рэабілітаваны 29.5.1959.

МАН Фёдар Паўлавіч, н. ў 1882 у в. Гонча. Аднаасобнік. Арыштаваны 20.11.1932. Рэабілітаваны 8.6.1989.

МАНКЕВІЧ Анатоль Сцяпанавіч, н. ў 1907 у в. Нясята. Ваеннаслужачы. Жыў у г. Каўрове. Арыштаваны 29.4.1938. Рэабілітаваны 5.6.1939.

МАРКАЎ Ілья Карпавіч, н. ў 1912 у в. Вусце. Арыштаваны 27.11.1937. Рэабілітаваны 5.12.1958.

МАРОЗ Барыс Максімавіч, н. ў 1905 у в. Загацце. Жыў на хутары Залічынка. Працаваў рамонтным рабочым на станцыі Мілое. Арыштаваны 5.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Пакаранне адбываў у г. Варкута. Вызвалены ў 1947. Рэабілітаваны 16.9.1964.

МАРУКЕВІЧ Іосіф Андрэевіч, н. ў 1881

у Капыльскім раёне. Жыў у г. Клічаве. Загадчык аддзела аховы здароўя Клічаўскага раёна. Арыштаваны 17.8.1938. Рэабілітаваны 23.7.1939.

МАРУСЕВІЧ Ціхан Іванавіч, н. ў 1912 у Віцебскай вобл. Жыў на станцыі Вонічы. Дарожны майстар. Арыштаваны 26.4.1949. Рэабілітаваны 31.8.1990.

МАРЦІНКЕВІЧ Антон Антонавіч, н. ў 1905 у в. Дубраўка. Калгаснік калгаса «Камінтэрн». Арыштаваны 21.3.1932. Высланы на Поўнач. Рэабілітаваны 20.11.1989.

МАРЦІНКЕВІЧ Вікенцій Антонавіч, жыў на хутары Дубраўка Нясяцкага сельсавета. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1990.

МАРЦІНКЕВІЧ Іосіф Антонавіч, н. ў 1890 у в. Таценка. Калгаснік. Арыштаваны 23.3.1932. Высланы ў Казахстан. Рэабілітаваны 20.11.1989.

МАРЦІНКЕВІЧ Іосіф Іосіфавіч, н. ў 1914 у Круглянскім раёне. Жыў у в. Усакіна. Настаўнік. Арыштаваны 25.8.1938. Асуджаны на 10 гадоў. Высланы ў Казахстан. Рэабілітаваны 28.8.1956.

МАСЛОЎСКІ Мікалай Якаўлевіч, н. ў 1911 у в. Каўбчанская Слабодка. Арыштаваны 29.5.1948. Рэабілітаваны 21.6.1949.

МАСЦІЦКІ Іван Міхайлавіч, н. ў 1905 у в. Плоскае. Жыў у в. Гіжгайлава. Калгаснік. Арыштаваны 25.5.1931. Рэабілітаваны 4.7.1931.

МАТУКЕВІЧ Мечыслаў Іванавіч, н. ў 1896 у в. Косава Гродзенскай губ. Жыў і працаваў у Клічаве. Лесавод. Арыштаваны 22.9.1937. Расстраляны 1.1.1938. Рэабілітаваны 31.3.1958.

МАТУСЕВІЧ Іван Адольфавіч, н. ў 1882 у в. Баркалы Слуцкага раёна. Жыў у в. Таценка. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.3.1933. Рэабілітаваны 22.9.1989.

МАЦЮШОНАК Іван Сцяпанавіч, н. ў 1890 у в. Дамітраўка. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 27.4.1989.

МАЦЮШОНАК Міхаіл Васілевіч, н. ў 1905 у в. Паплавы. Рахункавод калгаса «Зорка». Арыштаваны 23.12.1938. Рэабілітаваны 30.7. 1960.

МАЦЮШОНАК Фёдар Аляксеевіч, н. ў 1913 у в. Паплавы. Бухгалтар Клічаўскага райспажыўсаюза. Арыштаваны 1.11.1948. Рэабілітаваны 21.5.1949.

МАЦЮШОНАК Фёдар Паўлавіч, н. ў 1910 у в. Паплавы. Ваеннаслужачы. Арыштаваны 18.9.1940. Рэабілітаваны 1.12.1956.

МАЦЮШОНАК Фёдар Ціханавіч, н. ў 1923 у в. Паплавы. Бухгалтар Клічаўскага райспажыўсаюза. Арыштаваны 1.11.1948. Рэабілітаваны 2.2.1950.

МАЦЮШОНАК Цімафей Васілевіч, н. ў 1894 у в. Паплавы. Аднаасобнік. Арыштаваны ў сакавіку 1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны ў 1989.

З успамінаў дачкі, Марыі Цімафееўны Мацюшонак

Вясной 1930 г., калі бацька з раніцы рыхтаваў інвертар да выезду ў поле, да нас зайшлі два чалавекі і павялі бацьку з двара. Мы яго больш не бачылі. У калгас забралі ўсё нажытае за апошнія гады: коней, кароў, свіней, авечак, а таксама пабудовы. Нас выгналі з хаты і зачынілі яе на замок.

Бацька адбываў тэрмін у Якуціі — у Алданскай акрузе, працаваў на лесанарыхтоўках, потым здабываў золата. Відаць, цяжкая, непасільная праца падарвала яго сілы. Мы так і не даведаліся, чаму ён памёр і дзе пахаваны.

МАЦЮШОНАК Якаў Арцёмавіч, н. ў 1896 у в. Паплавы. Калгаснік калгаса «Зорка». Арыштаваны 23.12.1932. Рэабілітаваны 30.7.1960.

МЕЛЯШКЕВІЧ Ігар Пятровіч, н. ў в. Новыя Максімавічы. Арыштаваны ў 1930. Саслан у Пермскую вобл. Рэабілітаваны 6.8.1992.

МЕЛЯШКЕВІЧ Лідзія Мікалаеўна, н. ў 1898 у в. Новыя Максімавічы. Арыштавана ў 1930. Саслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 6.8.1992.

МЕЛЯШКЕВІЧ Мікалай Васілевіч, н. ў 1904 у в. Новыя Максімавічы. Арыштаваны, раскулачаны. Адбываў пакаранне ў пас. Булатава Чардынскага раёна Пермскай вобл. Рэабілітаваны 21.5.1922.

МЕЛЯШКЕВІЧ Пётр Васілевіч, н. ў 1898 у в. Новыя Максімавічы. Арыштаваны ў 1930. Саслан у Пермскую вобл. Рэабілітаваны 6.8.1992.

МІКУЛІЧ Пракоп Пятровіч, н. ў 1880 у в. Сасноўка Слонімскага раёна. Жыў у в. Падлессе Клічаўскага раёна. Калгаснік. Арыштаваны 10.9.1937. Расстраляны 5.12.1937. Рэабілітаваны 17.8.1959.

МІЛІШКЕВІЧ Гвідон Францавіч, н. ў 1907 на хутары Турчылоў. Жыў на хутары Язва-Валасень. Калгаснік. Арыштаваны 23.8. 1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 10.5.1958.

МІЛЮТА Іван Іосіфавіч, н. ў 1867 у в. Хадачын. Жыў у в. Каршукі. Працаваў у леспрамгасе. Арыштаваны 20.7.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 25.11. 1988.

МІЛЮТА Іван Іосіфавіч, жыў на хутары Апалінарава. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1988.

МІРАНОВІЧ Караліна Піліпаўна, н. ў 1884 у в. Запруддзе. Жыла на хутары Застар'е. Працавала ў калгасе «Новы шлях». Арыштавана 14.3.1939. Рэабілітавана 27.3. 1939.

МІРАНОВІЧ Самуіл Мікалаевіч, н. ў 1900. Жыў у в. Халадок Клічаўскага раёна. Аднаасобнік. Арыштаваны 22.11.1932. Рэабілітаваны 8.6.1989.

МІХАЛАП Аляксей Яўменавіч, н. ў 1900 у Бабруйскім раёне. Аднаасобнік. Жыў у в. Сыманаўка. Арыштаваны 20.11.1932. Рэабілітаваны 9.12.1961.

МІХАЛАП Фёдар Яўменавіч, н. ў 1890 у Бабруйскім раёне. Аднаасобнік. Жыў у в. Сыманаўка. Арыштаваны 20.11.1932. Рэабілітаваны 9.12.1961.

МІХНЕВІЧ Антон Іосіфавіч, н. ў 1914 у в. Міхалоў. Жыў у в. Наталоў. Аднаасобнік. Арыштаваны 16.11.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 23.6.1989.

МІХНЕВІЧ Галіна Антонаўна, н. ў 1924 у в. Наталоў. Жыла ў г. Івацэвічы Брэсцкай вобл. Бухгалтар. Арыштавана 20.7. 1945. Рэабілітавана 24.1.1946.

МІХНЕВІЧ Іван Людвігавіч, н. ў 1914 у в. Наталоў. Калгаснік. Арыштаваны 5.8. 1938. Рэабілітаваны 22.11.1957.

МІХНЕВІЧ Іван Піліпавіч, н. ў 1879 у в. Запруддзе. Жыў на хутары Заложжа. Аднаасобнік. Асуджаны 21.1.1938. Рэабілітаваны 9.8.1988.

МІХНЕВІЧ Станіслаў Антонавіч, н. ў 1902 у в. Яўсташына. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.3.1932. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 27.5.1989.

МІХНЁНАК Васіль Іванавіч, н. ў 1905 у в. Мілажань. Старшыня Даўжанскага сельпо. Арыштаваны 10.11.1937. Рэабілітаваны 8.4.1958.

МУСЦІЦКІ Людвіг Міхайлавіч, н. ў в. Баран-Навіна. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3. 1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 5.9.1959.

МЫЧКА Андрэй Іванавіч, н. ў 1885 у в. Кабылянка. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3. 1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 5.9. 1959.

МЯЗЯН Віктар Іванавіч, н. ў 1893 у в. Новыя Максімавічы. Жыў у в. Ліпніца. Працаваў настаўнікам Ліпніцкай НСШ. Арыштаваны 12.7.1938. Рэабілітаваны 1.1. 1939.

НАВАДВОРСКІ Іосіф Людвігавіч, н. ў 1906 у в. Закуцце. Працаваў у калгасе «Кастрычнік». Рэпрэсіраваны 27.8.1931 і ў 1937. Рэабілітаваны 14.9.1962.

З успамінаў дачкі, Людмілы Іосіфаўны Навадворскай

Бацьку нашага, памятаю, забіралі двойчы: у 1931 і ў 1937 гг. Першы раз яго хутка адпусцілі. Відаць, разабраліся, што не падыходзіць яму кляймо «кулак», бо жылі мы вельмі бедна. А ў трыццаць сёмым не ўдалося яму вырвацца. Забіралі ноччу, укінулі ў машыну — і прапаў чалавек. Неяк даведаліся, што ён у турме ў Магілёве. Маці ездзіла, але дарэмна, нават не пусцілі да яго. Толькі ў 1962 г. паведамілі, што бацька быў расстраляны і што ён ні ў чым не вінаваты... А мы ж без яго столькі нагараваліся, успамінаць цяжка...

НАВАДВОРСКІ Павел Пятровіч, н. ў 1896 у в. Волма Рубяжэўскай воласці Мінскага ўезда. Жыў у в. Таценка Клічаўскага раёна. Працаваў ляснічым у Свіслацкім і Клічаўскім лясгасах. Арыштаваны 31.7. 1938. Расстраляны 10.10.1938. Рэабілітаваны 25.1.1960.

НАВАДВОРСКІ Станіслаў Людвігавіч, н. ў 1907 у в. Закуцце. Арыштаваны 27.8. 1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

НАВАДВОРСКІ Станіслаў Людвігавіч, н. ў 1908 у в. Закуцце. Арыштаваны 8.1.1933. Рэабілітаваны 19.5.1933.

НАВАШЫНСКІ Сямён Ігнатавіч, н. ў 1911 у в. Вяленік. Калгаснік калгаса «Чырвоны маяк». Арыштаваны 29.12.1932. Рэабілітаваны 31.8.1989.

НАВІЦКІ Адам Антонавіч, н. ў 1905 у в. Койцін. Жыў на хутары Астравы. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

НАВІЦКІ Антон Мацвеевіч, н. ў 1876 у в. Залашымлі. Жыў у в. Курганне. Рэпрэсіраваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

НАВІЦКІ Іосіф Антонавіч, н. ў 1909. Служыў у 294-й стралковай дывізіі у роце хімаховы. Асуджаны 16.4.1942. Рэабілітаваны 19.2.1943.

НАВУМЕНКА Марыя Уладзіміраўна, н. ў 1921 у в. Восаў. Арыштавана. Рэабілітавана 9.3.1945.

НАВУМЧАНКА Антон Пракопавіч, н. ў 1906 у в. Вусце. Чырвонаармеец 1088-га стралковага палка 2-га стралковага батальёна, узвода ПТР. Асуджаны 2.6.1943. Рэабілітаваны 25.6.1943.

НАЙДУН Дамітрый Барысавіч, н. ў 1896 у в. Пятровічы Бабруйскага раёна. Жыў у Клічаве. Старшыня райвыканкома. Арыштаваны 15.11.1937. Расстраляны 15.1.1938. Рэабілітаваны 16.12.1966.

НАРАДОЎСКІ Людвіг Філіцыянавіч, н. ў 1907 у в. Макаўе. Працаваў бондарам у калгасе. Арыштаваны 1.8.1938. Вызвалены і рэабілітаваны 25.9.1938.

НАРКЕВІЧ Адам Іванавіч, н. ў пас. Стэфанаўка. Жыў у Бабруйскім раёне, цясляр. Арыштаваны 20.8.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 8.4.1958.

НАРКЕВІЧ Антон Іванавіч, н. ў 1891 у в. Стэфанаўка. Жыў у Бабруйску. Працаваў цесляром. Арыштаваны 16.12.1937. Расстраляны 8.3.1938. Рэабілітаваны 29.5.1958.

НАРКЕВІЧ Вікенцій Станіслававіч, н. ў 1883 у в. Стэфанаўка. Калгаснік. Арыштаваны 16.11.1937. Расстраляны 20.11.1938. Рэабілітаваны 11.8.1958.

НАРКЕВІЧ Станіслаў Іосіфавіч, н. ў 1889 у в. Стэфанаўка. Арыштаваны 27.8. 1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

НАРКЕВІЧ Станіслаў Восіпавіч, н. ў 1889 у в. Стэфанаўка. Аднаасобнік. Арыштаваны 15.11.1937. Расстраляны 13.1.1938 у Бабруйску. Рэабілітаваны 27.12.1983.

НАРКЕВІЧ Франц Францавіч, н. ў 1885 у в. Стэфанаўка. Аднаасобнік. Арыштаваны 16.11.1937. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 11.8.1958.

НАЦЫЕЎСКІ Міхаіл Францавіч, н. ў 1877 у в. Наталоў. Аднаасобнік. Арыштаваны 11.2.1930. Рэабілітаваны 31.8.1989.

НІКАЛАЙЧУК Сцяпан Антонавіч, н. ў 1893 у в. Дарожкі Беластоцкага павета ў Польшчы. Жыў у Клічаве. Працаваў галоўным бухгалтарам Клічаўскага райспажыўсаюза. Арыштаваны 20.12.1937. Расстраляны 21.12.1938. Рэабілітаваны 24.5.1967.

НОВІК (НОВІКАЎ) Рыгор Рыгоравіч, н. ў 1907 у в. Новае Сяло. Служыў у 211-м палку войск НКУС. Арыштаваны 4.5.1945. Рэабілітаваны 28.6.1945.

НОВІК Харытон Дзям'янавіч, н. ў 1874 у г. Слуцку. Жыў у в. Ваевічы. Арыштаваны ў лютым 1932. Рэабілітаваны 19.5.1932.

НОВІКАЎ Макар Іванавіч, н. ў 1915 у в. Калічонка. Брыгадзір на лесанарыхтоўках на станцыі Друць. Арыштаваны 14.10.1950. Асуджаны 23.11.1951. Рэабілітаваны 14.2. 1952.

ОРГІШ Ігнат Кандратавіч, н. ў 1889 у Бабруйскім раёне. Жыў у в. Баркі. Арыштаваны 19.1.1933. Рэабілітаваны 18.3.1961.

ПАДДУБАЕЎ Міхаіл Рыгоравіч, н. ў 1890 у в. Капліца Бярэзінскага раёна. Жыў у в. Убалацце. Калгаснік калгаса «Ударнік». Асуджаны 7.8.1941. Рэабілітаваны 14.12. 1959.

ПАДДУБСКІ Андрэй Аляксеевіч, н. ў 1904 у в. Суша. Працаваў загадчыкам магазіна. Арыштаваны 16.3.1932. Асуджаны на 3 гады. Рэабілітаваны 28.8.1965.

ПАДДУБСКІ Пётр Аляксеевіч, н. ў 1894 у в. Суша. Калгаснік. Арыштаваны 22.3. 1932. Асуджаны на 3 гады. Рэабілітаваны 28.8.1965.

ПАДЗЯРЭЙ Пётр Данілавіч, н. ў 1887 у в. Ляпянка Златапольскага раёна Кіеўскай вобл. Жыў у в. Убалацце Клічаўскага раёна. Вартаўнік убалацкага лесаўчастка. Арыштаваны 20.7.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 23.11.1988.

ПАРКАЛАЎ Максім Захаравіч, н. ў 1906 у в. Мілажань. Чырвонаармеец (Троіцкі ваенны гарадок, Усурыйская вобл.). Арыштаваны 14.11.1942. Рэабілітаваны 21.6.1960.

ПАРКАЛАЎ Фёдар Віктаравіч, н. ў 1920 у в. Новы Востраў. Чырвонаармеец. Арыштаваны 19.11.1941. Рэабілітаваны 8.10. 1959.

ПАЎЛОВІЧ Антон Уладзіміравіч, н. ў 1894 у в. Іванаўка. Калгаснік. Арыштаваны 16.11.1937. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 20.1.1989.

ПАЎЛОЎСКІ Аляксей Мартынавіч, н. ў 1893 у в. Дулебна. Працаваў у калгасе «Чырвоны баец». Арыштаваны 6.2.1938. Расстраляны 19.4.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 9.8.1988.

ПАЎЛЮЦ Сцяпан Іосіфавіч, н. ў 1898 у пас. Апалінарава. Калгаснік. Арыштаваны 10.1.1938. Расстраляны 25.2.1938.

ПАХВАЛЕНЫ Васіль Гаўрылавіч, н. ў 1913 у в. Ваевічы. Чырвонаармеец. Арыштаваны 20.5.1937. Рэабілітаваны 6.8.1959.

ПЕТЭРСОН Юліян Ігнатавіч, н. ў 1916 у в. Раманаў. Чыгуначнік. Арыштаваны 7.9. 1938. Рэабілітаваны 15.12.1939.

ПІНЧУК Антон Васілевіч, н. ў 1896 у в. Брылёўка. Аднаасобнік. Арыштаваны 12.5. 1932. Рэабілітаваны 26.7.1932.

ПІНЧУК Васіль Амосавіч, н. ў 1896 у в. Брылёўка. Аднаасобнік. Арыштаваны 12.5. 1932. Рэабілітаваны 26.7.1932.

ПІНЧУК Сцяпан Васілевіч, н. ў 1907 у в. Брылёўка. Аднаасобнік. Арыштаваны 12.5. 1932. Рэабілітаваны 26.7.1932.

ПІРОЖНІК Фёдар Аляксеевіч, жыў у в. Хадачын. Працаваў у саўгасе «Астравок». Арыштаваны ў 1934. Рэабілітаваны.

ПЛІСКО Рыгор Герасімавіч, н. ў 1906 у в. Куцін. Калгаснік. Арыштаваны 6.3.1950. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ПОРСІК Васіль Рыгоравіч, н. ў 1899 у в. Усакіка. Аднаасобнік. Арыштаваны 23.4. 1932. Рэабілітаваны 11.8.1932.

ПРАКАПОВІЧ Адольф Сцяпанавіч, н. ў 1889 у в. Чырвоны Бераг. Жыў у в. Паўлавічы Асіповіцкага раёна. Калгаснік. Арыштаваны 16.6.1950. Рэабілітаваны 15.12.1954.

ПРАКАПОВІЧ Пётр Ульянавіч, н. ў 1882 у в. Таценка. Жыў у мяст. Свіслач Асіповіцкага раёна. Рабочы. Арыштаваны 30.4.1938. Рэабілітаваны 2.4.1939.

ПРАХАРЭНКА Канстанцін Аляксеевіч, н. ў 1908 у в. Таценка. Жыў у мяст. Свіслач Асіповіцкага раёна. Рабочы. Арыштаваны 30.4. 1938. Рэабілітаваны 2.4.1939.

ПРАХАРЭНКА Канстанцін Аляксеевіч, н. ў 1908 у в. Закупленне. Калгаснік. Арыштаваны 10.12.1934. Рэабілітаваны 26.6.1990.

ПУГАЧ Агафія Сямёнаўна, н. ў 1892 у в. Коўбча. Аднаасобніца. Арыштавана 14.8.1944. Рэабілітавана 27.3.1945.

ПУГАЧОЎ Ігнат Арцёмавіч, н. ў 1908 у в. Горкі Клімавіцкага раёна. Працаваў у Клічаўскім раёне. Арыштаваны 19.9.1937. Расстраляны 22.10.1937. Рэабілітаваны 23. 2.1963.

ПУТАН Пётр Хрыстафоравіч, н. ў 1902 у Латвіі. Дарожны майстар станцыі Вонічы. Арыштаваны 19.8.1938. Расстраляны 17.10. 1938. Рэабілітаваны 7.3.1960.

ПЯТКЕВІЧ Іосіф Антонавіч, н. ў 1902 у в. Таценка. Калгаснік. Арыштаваны 23.3.1932. Высланы ў Заходнюю Сібір. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ПЯТРОВІЧ Іван Казіміравіч, н. ў 1885 на хутары Яўсташына. Працаваў у калгасе імя Калікіка. Арыштаваны 18.5.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

ПЯТРОЎСКІ Іван Эдуардавіч, н. ў 1908 у в. Дубраўка, калгаснік. Арыштаваны 10.6. 1938. Рэабілітаваны 2.6.1960.

ПЯТРОЎСКІ Іосіф Эдуардавіч, н. ў 1903 у в. Дубраўка. Жыў на хутары Стары Спор. Працаваў цесляром у калгасе «Прамысловая зара». Рэпрэсіраваны 15.9.1938. Рэабілітаваны 4.7.1962.

РАБІНОВІЧ Пётр Аўгусцінавіч, н. ў 1882 на хутары Язва-Валасень. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 5.9.1959.

РАБЧОНАК Андрэй Макаравіч, н. ў 1910 у в. Гліннае. Служыў у 294-й стралковай дывізіі ў роце хімаховы. Асуджаны 16.4.1942. Рэабілітаваны.

РАГАЛІНСКІ Сігізмунд Вацлававіч, н. ў 1901 у Кустанскай воласці (Польшча). Жыў у г. Клічаве. Працаваў у Клічаўскім лясгасе. Арыштаваны 24.4.1932. Рэабілітаваны 11.8. 1932.

РАДЗЕЎСКІ Пётр Алаізавіч, н. ў 1873 на хутары Бярозаўка. Жыў на хутары Вольчына Дубраўка. Працаваў у калгасе імя Варашылава. Арыштаваны 10.9.1937. Расстраляны 5.12.1937 у г. Бабруйску. Рэабілітаваны 21.1.1958.

РАДЗІМОВІЧ Ігнат Паўлавіч, н. ў 1889 у в. Беладзед. Жыў у в. Ямпаль Асіновіцкага раёна. Калгаснік. Арыштаваны 13.1.1933. Рэабілітаваны 26.9.1989.

РАМАНОВІЧ Дзям'ян Антонавіч, н. ў 1900. Жыў у в. Дубно. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны. Высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 4.6.1992.

РАМНЁНАК Антон Кірылавіч, н. ў 1892 у в. Дулебна. Аднаасобнік. Арыштаваны 6.8. 1937. Рэабілітаваны 14.6.1960.

РАНЦАН Іван Мацвеевіч, н. ў 1888 у в. Ласінскае Ілукскага павета Курлянскай губерні. Жыў і працаваў машыністам вадакачкі на станцыі Нясята. Арыштаваны 15.1.1938. Расстраляны 31.3.1938. Рэабілітаваны 2.4.1959.

РУДЫ (РУДОЙ) Анісім Яфімавіч, н. ў в. Орліна. Аднаасобнік. Арыштаваны 22.9. 1937. Памёр 11.9.1943 у папраўча-працоўным лагеры. Рэабілітавары 9.1.1960.

РУДЫ (РУДОЙ) Платон Мартынавіч, н. ў 1898 у в. Орліна. Аднаасобнік. Арыштаваны 22.9.1937. Рэабілітаваны 9.1.1960.

РУСЕЦКІ Сяргей Гаўрылавіч, н. ў 1892 у в. Стаялава. Калгаснік калгаса «Асвета». Арыштаваны 11.8.1938. Рэабілітаваны 13.3. 1939.

РУТКОЎСКАЯ Амалія Сільвестраўна, н. ў 1882 у в. Гіжгайлава. Хатняя гаспадыня. Арыштавана 22.2.1931. Выслана ў Сібір. Рэабілітавана 17.11.1989.

РУТКОЎСКІ Іосіф Пятровіч, н. ў 1878 у в. Усохі Пухавіцкай воласці. Жыў у в. Гіжгайлава. Рахункавод калгаса «Чырвоны прамень». Арыштаваны 29.12.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 17.11.1989.

РЫДЗЕЎСКІ Антон Ігнатавіч, н. ў 1908 у в. Вольчына Дубраўка. Працаваў у калгасе імя Варашылава. Арыштаваны 30.7.1938. Рэабілітаваны 28.9.1938.

РЫЖКОВІЧ Матруна Міхайлаўна, н. ў 1895 у в. Пераколь. Арыштавана 8.12.1937. Рэабілітавана 22.9.1938.

РЭЙНЕРТ Рамуальд Аляксандравіч, н. ў 1911 у в. Доўгае. Жыў у Ленінградзе. Камандзір узвода в/ч 4915. Арыштаваны 9.7.1938. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 13.5.1940.

САДОЎСКІ Антон Генрыхавіч, н. ў 1880 у в. Глыбокае. Жыў у в. Гіжгайлава. Калгаснік. Арыштаваны 24.5.1931. Рэабілітаваны 4.8.1931.

САДОЎСКІ Іван Феліксавіч, н. ў 1914 на хутары Баран-Навіна. Калгаснік. Арыштаваны 5.8.1938. Рэабілітаваны 23.9.1938.

САЗАНАВЕЦ Гаўрыіл Іванавіч, н. ў 1885 у в. Заполле. Жыў у в. Юзафін. Аднаасобнік. Арыштаваны 17.3.1933. Рэабілітаваны 22.9.1989.

САЗАНАВЕЦ Уладзімір Яфімавіч, н. ў 1904 у в. Падстружжа. Калгаснік калгаса імя Варашылава, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Арыштаваны 4.8.1948. Рэабілітаваны 10.8. 1965.

САЗАНАВЕЦ Фёдар Тамашавіч, н. ў 1902 у в. Вольса. Сплаўшчык сплаўканторы. Арыштаваны 8.12.1937. Рэабілітаваны 17.8.1959.

САЗАНАВЕЦ Фядос Іванавіч, н. ў 1899 у в. Малая Вольса. Аднаасобнік. Арыштаваны 31.10.1937. Рэабілітаваны 5.4.1961.

САЗАНАВЕЦ Ціхан Міхайлавіч, н. ў 1893 у в. Вольса. Жыў у в. Бярозкі. Сплаўшчык сплаўканторы. Арыштаваны 6.12.1937. Рэабілітаваны 17.8.1959.

САЗАНОВІЧ Ціхан Аляксандравіч, н. ў 1878 у в. Малая Вольса. Аднаасобнік. Арыштаваны 11.8.1939.

САЙ Аляксандр Нічыпаравіч, жыў у в. Вяленік. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 10.6. 1992.

САЙ Максім Фёдаравіч, н. ў 1884 у в. Асінаўка. Арыштаваны 27.11.1937. Рэабілітаваны 4.4.1939.

САКАЛОЎСКІ Антон Лявонавіч, н. ў 1892 у в. Аноскае. Жыў у в. Вольчына Дубраўка. Рэпрэсіраваны 28.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

САМЕЦ Антон Уласавіч, н. ў 1889 у в. Галішчына. Аднаасобнік. Арыштаваны 17.7. 1937. Рэабілітаваны 24.10.1989.

САМЕЦ Васіль Емяльянавіч, н. ў 1887 у в. Галішчына. Аднаасобнік. Арыштаваны 17.7.1937. Рэабілітаваны 24.10.1989.

САМЕЦ Іван Уласавіч, н. ў 1901 у в. Галішчына. Аднаасобнік. Арыштаваны 17.7. 1937. Рэабілітаваны 24.10.1989.

САМОЙЛЕНКА Ларыён Севасцьянавіч, н. ў 1898 у в. Ядраная Слабада. Аднаасобнік. Арыштаваны 23.9.1937.Рэабілітаваны 30.7. 1960.

САРОКА Васіль Васілевіч, н. ў 1900 у в. Мікалаеўка. Жыў у в. Наталоў. Працаваў у калгасе «Авангард». Арыштаваны 23.3.1933. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 28.8. 1962.

САХАНОВІЧ Юрый Аляксеевіч, н. ў 1878 у в. Малая Вольса. Аднаасобнік. Арыштаваны 11.8.1938. Рэабілітаваны 2.3.1939.

СЕГІН Міхаіл Івтнавіч, н. ў 1886 у г. Гіжгайлава. Жыў у в. Убалацце. Рабочы лесаўчастка. Арыштаваны 20.7.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 25.12.1988.

СІЛІН Іван Фядосавіч, н. ў 1900 у в. Максімавічы. Калгаснік. Арыштаваны 2.4.1933. Асуджаны на 3 гады. Рэабілітаваны 16.1. 1989.

СКАВАРОДКІН Аўсей Раманавіч, н. ў 1898 у в. Ядраная Слабада. Калгаснік калгаса «Чэлюскінец». Арыштаваны 11.6.1938. Рэабілітаваны 23.9.1938.

СЛАВІНСКАЯ Настасся Адамаўна, н. ў 1907 у в. Халадок. Арыштавана 17.3.1931. Рэабілітавана 19.6.1931.

СЛАВІНСКІ Іван Емяльянавіч, н. ў 1898 у в. Халадок. Аднаасобнік. Арыштаваны 17.3.1931. Рэабілітаваны 12.6.1931.

СОЛТАН Архіп Васілевіч, н. ў 1900 у в. Бёрда. Жыў у в. Палосы. Аднаасобнік. Арыштаваны 31.7.1938. Прыгавораны да расстрэлу. Звестак пра расстрэл няма. Рэабілітаваны 15.9.1958.

СОЛТАН Хрысціна Ільінічна, н. ў 1911 у в. Паплавы. Арыштавана 28.12.1944. Рэабілітаваны 25.8.1945.

СТАНЕВІЧ Фелікс Антонавіч, н. ў 1903 у в. Іванаўка. Жыў у г. п. Клічаў. Сталяр райспажыўсаюза. Арыштаваны 15.11.1937. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 30.11. 1959.

СТАНІШЭЎСКІ Адам Ігнатавіч, н. ў 1903 у в. Наталоў. Трактарыст Бацэвіцкай МТС. Арыштаваны 31.7.1938. Расстраляны 23.10. 1938. Рэабілітаваны 28.1.1958.

СТАНКЕВІЧ Іосіф Антонавіч, н. ў 1901 у в. Іванаўка. Сталяр саўгаса «VIII з'езд Са-

ветаў». Арыштаваны 15.11.1937. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 2.9.1989.

СТАНЧЫК Антон Станіслававіч, н. ў 1894 у в. Бёрда. Жыў у в. Равок. Калгаснік. Арыштаваны 9.7.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 13.11.1958.

СТАРАВОЙТАЎ Міхаіл Сямёнавіч, н. ў 1898 у в. Ядраная Слабада. Калгаснік калгаса імя Чэлюскіна. Арыштаваны 21.6.1938. Рэабілітаваны 25.6.1939.

СТАЯНОЎСКІ Іван Францавіч, н. ў 1903 у в. Баркі. Агент Клічаўскага аддзялення «Белпушніна». Арыштаваны 11.6.1938. Расстраляны 20.11.1938. Рэабілітаваны 19.5.1960.

СТАЯНОЎСКІ Томаш Францавіч, н. ў 1907 у в. Баркі. Старшыня калгаса. Арыштаваны 15.12.1937. Расстраляны ў Мінску 9.3.1938. Рэабілітаваны 5.3.1959.

СТАЯНОЎСКІ Хрыстафор Францавіч, н. ў 1910 у в. Баркі. Ляснік Клічаўскага леспрамгаса. Арыштаваны 15.12.1937. Расстраляны ў Мінску 9.3.1938. Рэабілітаваны 5.3. 1959.

СТРАХ Аляксандр Арцёмавіч, н. ў 1914 у в. Новае Сяло. Чырвонаармеец 554-га стралковага палка 138-й стралковай дывізіі. Арыштаваны 28.8.1940. Рэабілітаваны 21.4.1958.

СТЭЛЬМАХ Васіль Майсеевіч, н. ў 1925 у пас. Пабеда. Арыштаваны 28.12.1944. Рэабілітаваны 20.4.1945.

СУДНІК Антон Іосіфавіч, н. ў 1870. Жыў у в. Наталоў. Рэпрэсіраваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 19.9.1962.

СУДНІК Іван Іосіфавіч, н. ў 1875 у в. Вольчына Дубраўка. Аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 24.6.1959.

СУДНІК Міхаіл Антонавіч, н. ў 1905 у в. Анатолеўка. Калгаснік калгаса Войкава. Арыштаваны 6.8.1937. Рэабілітаваны 28.5. 1960.

СУДНІК Рафаіл Іванавіч, н. ў в. Вольчына Дубраўка. Працаваў старшынёй Наталоўскага сельсавета. Рэпрэсіраваны 27.8. 1931. Рэабілітаваны 24.6.1959.

СУШЫНСКІ Антон Ігнатавіч, н. ў 1894 у в. Смалярня. Жыў на хутары Язва-Валасень. Працаваў у калгасе. Арыштаваны 24.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 10.5. 1958.

СУШЫНСКІ Іосіф Сігізмундавіч, н. ў 1884 у в. Іванаўка. Жыў у в. Градкі. Працаваў у калгасе «Першае мая». Арыштаваны 17.8.1938. Расстраляны 19.2.1959.

СУШЫНСКІ Казімір Пятровіч, н. ў 1899 у в. Гулы. Цясляр. Арыштаваны 16.11.1937. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 27.11. 1958.

СУШЫЦКІ Антон Адольфавіч, н. ў 1890 у в. Міхалоўка. Рэпрэсіраваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.8.1962.

СУШЫЦКІ Аўгусцін Пятровіч, н. ў 1909 у Кіраўскім раёне. Жыў у в. Іванаўка. Сталяр. Арыштаваны 15.11.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 17.8.1959.

СУШЫЦКІ Ігнат Вікенцьевіч, н. ў 1896 у в. Міхалоўка. Працаваў у калгасе. Арыштаваны 23.8.1937. Расстраляны 5.12.1937. Рэабілітаваны 26.3.1965.

СУШЫЦКІ Ігнат Вікенцьевіч, н ў 1896. Жыў у в. Міхалоўка. Рэпрэсіраваны 27.8. 1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

СУШЫЦКІ Франц Адольфавіч, н. ў 1898 у в. Міхалоўка. Калгаснік. Арыштаваны 16.11. 1937. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 28.2.1958.

СЫРАМАЛОТАЎ Георгій Ерамеевіч, н. ў 1915 у в. Ядраная Слабада. Арыштаваны ў 1934. Рэабілітаваны ў жніўні 1937.

СЫРАМАЛОТАЎ Назар Яўстрафʼевіч, жыў у в. Ядраная Слабада. Арыштаваны ў 1931. Раскулачаны. Рэабілітаваны 9.1.1992.

СЫРАМАЛОТАЎ Сцяпан Якаўлевіч, н. ў 1886 у в. Язва-Валасень. Цясляр. Арыштаваны 8.1.1933. Рэабілітаваны 11.7.1989.

СЯКЕРСКІ Аляксандр, н. ў 1895 у в. Дулебня. Калгаснік, Арыштаваны 23.8.1937. Рэабілітаваны 3.2.1940.

СЯМАШКА Пётр Іосіфавіч, н. ў 1895 у в. Дамітраўка. Калгаснік калгаса імя Шміта. Арыштаваны 15.12.1939. Рэабілітаваны 19.5. 1960.

ТАРАСЁНАК Марыя Васілеўна, н. ў 1923 у Бярэзінскім раёне. Жыла ў в. Бярозаўка. Арыштавана 30.12.1944. Рэабілітавана 31.7. 1945.

ТАТУР Ігнат Мікалаевіч, н. ў Бабруйску. Жыў у Клічаве. Цясляр. Рэпрэсіраваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1968.

ТАТУР Уладзімір Антонавіч, н. ў 1892 на хутары Застар'е. Калгаснік. Рэпрэсіраваны 27.8.1962.

ТАТУР Юльян Антонавіч, н. ў 1912 на хутары Застар'е. Калгаснік. Рэпрэсіраваны 11.10.1938. Рэабілітаваны 7.6.1963.

ТРАЦЭЎСКІ Альфонс Адамавіч, н. ў 1910 у в. Баркі. Аднаасобнік. Арыштаваны 14.3.1938. Рэабілітаваны 17.3.1960.

ТРАЦЭЎСКІ Іосіф Адамавіч, н. ў 1903 у Кіраўскім раёне. Жыў у в. Баркі. Калгаснік. Арыштаваны 14.3.1938. Расстраляны 4.10.1938. Рэабілітаваны 17.3.1960.

ТРАЦЭЎСКІ Пётр Адамавіч, н. ў 1905 у Кіраўскім раёне. Калгаснік. Жыў у в. Баркі. Арыштаваны 14.3.1938. Расстраляны 4.10. 1938. Рэабілітаваны 17.3.1960.

ТРЫЗНА Аляксандр Юльянавіч, н. ў 1883 у в. Чырвоны Май. Земляроб. Жыў у в. Язва-Валасень. Арыштаваны 8.1.1933. Рэабілітаваны 11.7.1989.

ТРЫЗНА Ігнацій Юльянавіч, н. ў в. Хадэчын. Жыў у Магілёве. Пчалавод доследнай станцыі Буйнічы. Арыштаваны 14.8.1938. Рэабілітаваны 18.4.1962.

ТРЫЗНА Уладзімір Юльянавіч, н. ў 1877 у в. Хадэчын. Аднаасобнік. Арыштаваны 22.12. 1937. Расстраляны 25.3.1938. Рэабілітаваны 20.9.1989.

ТУМІЛОВІЧ Адам Пятровіч, н. ў 1906 у Бярэзінскім раёне. Жыў у в. Аляксандраўка. Настаўнік Даўжанскай школы. Арыштаваны 1.8.1938. Рэабілітаваны 29.5.1958.

ТУМІЛОВІЧ Іван Гіляравіч, н. ў 1869 у Свіслацкім раёне. Жыў на хутары Ліны. Аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

ТУМІЛОВІЧ Пётр Іванавіч, н. ў 1898 у в. Хадэчын. Калгаснік. Арыштаваны 17.11. 1937. Расстраляны 13.1.1937.

ТУМІЛОВІЧ Уладзімір Адамавіч, н. ў 1898 у в. Новыя Набаркі. Аднаасобнік. Арыштаваны 10.2.1930. Рэабілітаваны 18.7. 1989.

УМЕЦКІ Антон Гіляравіч, н. ў 1890 у в. Чырвоны Бераг. Жыў у в. Градкі. Працаваў у калгасе «Першае мая». Арыштаваны 16.8.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 19.2.1959.

УМЕЦКІ Апалінар Мартынавіч, н. ў 1890 у в. Чырвоны Бераг. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 24.4.1989.

УСЦІНОВІЧ Вікенцій Стафанавіч, жыў у в. Вішанька. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны. Высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 8.6.1992. Разам з ім былі высланы, а затым рэабілітаваны **УСЦІНОВІЧ Эвеліна Францаўна** і **УСЦІНОВІЧ Канстанцыя Вікенцьеўна.**

УСЦІНОВІЧ Іосіф Гіляравіч, н. ў 1889 на хутары Баран-Навіна. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

УСЦІНОВІЧ Карл Вітольдавіч, н. ў 1894 у в. Гіжгайлава. Вартаўнік калгаса. Арыштаваны 26.4.1938. Расстраляны 11.10.1938. Рэабілітаваны 27.11.1989.

УСЦІНОВІЧ Карл Вітольдавіч, н. ў 1900 у в. Гіжгайлава. Арыштаваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

УСЦІНОВІЧ Уладзімір Гіналітавіч (Іпалітавіч), н. ў 1908 у пас. Баран-Навіна. Жыў у в. Анатолеўка. Працаваў трактарыстам у Нясцкай МТС. Арыштаваны 31.10. 1937. Расстраляны 5.12.1937. Рэабілітаваны 2.10.1957.

ФІЛОНЧЫК Барыс Васілевіч, н. ў в. Сакаловічы Навагрудскага павета. Жыў у Клічаве. Бухгалтар. Арыштаваны 31.7.1938. Расстраляны 28.1.1938. Рэабілітаваны 28.1.1958.

ХАН-ТУН-ГВІ Мікалай, н. ў 1906 у г. Шань-Дунь (Кітай). Жыў у Клічаве. Саматужнік. Арыштаваны 21.7.1938. Рэабілітаваны 9.9.1938.

ХАРЛАП Мікалай Маркавіч, н. ў 1885 у в. Ваевічы. Арыштаваны ў 1931. Раскулачаны. Высланы ў Чардынскі раён Пермскай вобл. Рэабілітаваны 2.6.1992.

ХАРЛАП Патап Іларыёнавіч, н. ў 1877 у в. Гонча. Аднаасобнік. Арыштаваны 20.11. 1932. Рэабілітаваны 8.6.1989.

ХАРЛАП Цімафей Карнсеевіч, н. ў 1899 у в. Ваевічы. Аднаасобнік. Арыштаваны ў лютым 1932. Рэабілітаваны 19.5.1932.

ЦАЛАДОНАЎ Лазар Апанасавіч, н. ў 1914 у в. Закупленне. Настаўнік. Арыштаваны 10.2.1938. Рэабілітаваны 15.6.1938.

ЦЕЦЕРУКОЎ Сцяпан Васілевіч, н. ў 1905 у в. Закупленне. Гандлёвы работнік. Арыштаваны 23.12.1943. Рэабілітаваны 1.3.1947.

ЦІМАХОВІЧ Антон Эдуардавіч, н. ў 1893 у в. Яўсташына. Калгаснік. Арыштаваны 28.1. 1938. Расстраляны 19.4.1938. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ЦІМАХОВІЧ Дзмітрый Елісеевіч, н. ў 1914 у в. Аляксееўка. Калгаснік. Арыштаваны 23.12.1932. Рэабілітаваны 30.7.1932.

ЦІМАХОВІЧ Елісей Трафімавіч н. ў 1891 у Клічаве. Жыў ў в. Аляксееўка. Арыштаваны 23.12.1932. Рэабілітаваны 30.7.1960.

ЦІМАХОВІЧ Сямён Ігнатавіч, н. ў 1907 у в. Аляксееўка. Калгаснік. Арыштаваны 8.1. 1933. Рэабілітаваны 31.7.1960.

ЦІМАХОВІЧ Яфім Трафімавіч, н. ў 1898 у Клічаве. Жыў у в. Аляксееўка. Калгаснік. Арыштаваны 23.12.1932. Рэабілітаваны 30.7. 1960.

ЦІШКЕВІЧ Іван Купрыянавіч, н. ў 1883 у в. Жорнаўка. Жыў у в. Баркі. Аднаасобнік. Арыштаваны 19.1.1933. Рэабілітаваны 18.3.1961.

ЦМЫГ Рыгор Кірылавіч, н. ў 1877 у в. Жарновічы Бярэзінскага раёна. Жыў у в. Дамітраўка. Вартаўнік калгаса. Арыштаваны 17.7.1937. Рэабілітаваны 8.6.1989.

ЦЭХАНОВІЧ Аляксандр Антонавіч, н. ў 1890 у в. Таценка. Аднаасобнік. Арыштаваны 10.2.1930. Высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 14.5.1989.

ЧАЙКА Павел Іванавіч, н. ў 1891. Жыў у в. Заполле. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны 14.7.1992.

ЧАЙКА Цімафей Фёдаравіч, н. ў 1888 у в. Гута Бабруйскага раёна. Аднаасобнік. Жыў у в. Малінне. Арыштаваны 6.8.1937. Расстраляны 9.9.1937. Рэабілітаваны 18.8.1989.

ЧАРНУШЭВІЧ Бярнард Францавіч, н. ў 1902 у в. Перасека. Сталяр. Арыштаваны 21.2.1937. Расстраляны 17.9.1937. Рэабілітаваны 29.6.1963.

ЧАРНУШЭВІЧ Іван Усцінавіч, н. ў 1903 у в. Перасека. Калгаснік. Жыў у в. Апалінарава. Арыштаваны 16.12.1937. Расстраляны 9.3.1938. Рэабілітаваны 15.9.1958.

ЧАРНЯЎСКІ Уладзімір Францавіч, н. ў 1896 у в. Турчылоў. Жыў на хутары Баран-Навіна. Рэпрэсіраваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

ЧАРНЯЎСКІ Уладзімір Францавіч, н. ў 1896 у в. Турчылоў. Земляроб. Арыштаваны 18.11.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны 23.6.1989.

ЧАРНЯЎСКІ Франц Францавіч, н. ў 1887 у в. Малы Рог Бабруйскага раёна. Жыў у в. Наталоў Клічаўскага раёна. Працаваў у калгасе «Чырвоны сцяг». Арыштаваны 28.3. 1933. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 28.8.1962.

ЧАРЭЙЧЫК Фядора Захараўна, жыла ў в. Чаравач. Арыштавана ў 1929. Раскулачана. Рэабілітавана 16.3.1992.

ЧАСНЮК Антон Іванавіч, н. ў 1904. Працаваў у Клічаве дарожным майстрам. Арыштаваны 24.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 7.4.1945.

ЧМАРА Цімафей Дзянісавіч, н. ў 1906 у в. Язва-Валасень. Земляроб. Арыштаваны 8.1. 1933. Рэабілітаваны 11.7.1989.

ЧЫЖОНАК Антон Герасімавіч, н. ў 1892 у в. Марковічы Любанскага раёна. Жыў у в. Арэхаўка Клічаўскага раёна. Земляроб. Арыштаваны 17.5.1932. Рэабілітаваны 31.10. 1989.

ЧЫЖОНАК Рыгор Герасімавіч, н. ў 1903 у в.Новая Арэхаўка. Цясляр. Арыштаваны 17.5.1932. Рэабілітаваны 13.11.1989.

ЧЫРЭЙЧЫК Піліп Пятровіч, н. ў 1898 у в. Нясята. Аднаасобнік. Арыштаваны 16.5. 1932. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ШАБУНЕВІЧ Ігнат Францавіч, н. ў 1900 у в. Таценка. Калгаснік. Арыштаваны 23.3.1932. Высланы ў Казахстан. Рэабілітаваны 20.11. 1989.

ШАБУНЕВІЧ Ігнат Францавіч, н. ў 1900 у в. Таценка. Жыў у в. Чырвоны Бераг. Кал-

гаснік. Арыштаваны 5.12.1937. Расстраляны 5.3.1938. Рэабілітаваны 7.2.1959.

ШАБУНЯ Аляксандр Эдмундавіч, н. ў 1905 у в. Турчылоў. Чыгуначнік. Арыштаваны 27.8.1937. Расстраляны 6.1.1938. Рэабілітаваны 17.8.1960.

ШАБУНЯ Аляксандр Эдмундавіч, н. ў 1907 у в. Наталоў. Калгаснік. Рэпрэсіраваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

ШАБУНЯ Іван Эдмундавіч, н. ў 1906 у в. Наталоў. Калгаснік. Арыштаваны 27.8. 1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

ШАБУНЯ Станіслаў Эдмундавіч, н. ў 1903 у в. Турчылоў. Працаваў у Турчылоўскай канторы нарказчыкам. Асуджаны 10.1.1938. Расстраляны 25.2.1938. Рэабілітаваны 17.8. 1960.

ШАГОЙКА Антон Рыгоравіч, н. ў 1915 у в. Усакіна. Працаваў ва Усакінскім лесаўчастку. Арыштаваны 15.3.1945. Рэабілітаваны 31.5.1945.

ШАГОЙКА Васіль Маркавіч, н. ў 1907 у в. Усакіна. Калгаснік. Арыштаваны 23.4.1932. Рэабілітаваны 11.8.1932.

ШАГОЙКА Іван Федасеевіч, н. ў 1884 у в. Усакіна. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.3. 1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 27.4. 1989.

ШАЛАЕЎ Рыгор Фёдаравіч, н. ў 1920 у в. Хадзчын. Чырвонаармеец. Арыштаваны 24.8.1942. Рэабілітаваны 24.10.1942.

ШАЛАЙ Іван Іванавіч, н. ў 1926 у в. Маркаўшчына. Служыў у Чырвонай Арміі на тэрыторыі Германіі. Арыштаваны 6.11.1946. Рэабілітаваны 7.8.1956.

ШАЛАЙ Кірыла Карпавіч, н. ў 1885 у в. Стаялава. Цясляр. Арыштаваны 27.5.1941. Рэабілітаваны 25.11.1961.

ШАЛАЙ Фёдар Трафімавіч, н. ў 1898 у в. Стаялава. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.5. 1941. Рэабілітаваны 25.11.1961.

ШАМАЛЬ Агаф'я Елісееўна. Жыла ў в. Драні. Арыштавана ў 1930. Раскулачана. Выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 16.3.1992.

ШАМАЛЬ Апанас Яфімавіч, н. ў 1904 у в. Стаялава. Працаваў у калгасе рахункаводам. Арыштаваны 4.10.1937. Рэабілітаваны 6.5.1961.

З успамінаў дачкі Апанаса Яфімавіча — Соф'і Апанасаўны ШАМАЛЬ

Мой бацька працаваў рахункаводам у калгасе «Асвета». Ён быў сумленны, працавіты, ветлівы. Былі ў яго сябры па месцу жыхарства: Шамаль Атрахім Нічыпаравіч, Русецкі Сяргей Гаўрылавіч, Якшонак Міна Фёдаравіч і іншыя.

Гаспадарка ў нас была добрая. Трымалі 2 каровы, 2 кані, 3 свінні, 4 авечкі, былі добрыя будынкі — пяцісценны дом, хлеў, гумно, лазня, стопка з прыбудовай. Мабыць, гэта ўсё стала прычынай таго, што нас запісалі ў кулакі і ў 1929 г. раскулачылі. Члены сельсавета забралі будынак, жывёлу, нават усё наша адзенне і хатнія дробязі, а таксама бульбу і зерне. Тады папка купіў у Слабодцы хатку і перавёз яе ў Стаялы. У гэтай хатцы мы з маці жылі да вайны і пасля вайны.

Забралі татку ноччу ў 1937 г., калі ён прыйшоў з работы. За што забралі і дзе дзелі — мы з маці не ведалі. Тады разам з ім забралі Якшонак Соф'ю Апалінараўну і Русецкага Сяргея Гаўрылавіча. Гэта былі таксама добрасумленныя людзі. У той час былі людзі і агідныя, гультаі. Нічога не мелі. Ім было зайздросна, што ў бацькі ўсё было, ды ён яшчэ і працаваў. Трэба было такіх людзей знішчыць. А ва ўладзе не было цвёрдага кіраўніцтва, не было праўдзівага дапросу, суда, разбірацельства. Не было праўды. Вось і загінуў ні ў чым не вінаваты чалавек.

Толькі ў снежні 1991 г. я напісала ў камітэт Дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь па Магілёўскай вобласці. Атрымала адказ: «Шамаль А. Я. абвіняўся неабаснавана. Расстраляны ў г. Бабруйску 22 кастрычніка. Судзіўся асобай тройкай суда. У сувязі з вялікім горам выказваем Вам глыбокае спачуванне».

ШАМАЛЬ Архіп Сямёнавіч, н. ў 1893 у в. Стаялава. Вартаўнік леспрамгаса. Арыштаваны 27.5.1941. Рэабілітаваны 25.11.1961.

ШАМАЛЬ Іван Мартынавіч, жыў у в. Зорка Клічаўскага раёна. Арыштаваны ў 1933. Раскулачаны. Рэабілітаваны 28.4.1992.

ШАМАЛЬ Ірына Пятроўна, жыла ў в. Драні. Арыштавана ў 1930. Раскулачана. Выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 16.3. 1992.

ШАМАЛЬ Пётр Несцеравіч, жыў у в. Драні. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны. Адбываў пакаранне ў в. Мікулічы Дабранскага раёна Пермскай вобл. Рэабілітаваны 16.3. 1992.

ШАМАЛЬ Пётр Пятровіч, жыў у в. Драні. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны. Высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 16.3.1992.

ШАМАЛЬ Рыгор Максімавіч, н. ў 1880 у в. Стаялава. Арыштаваны 18.7.1937. Рэабілітаваны 9.6.1989.

ШАМАЛЬ Фёдар Васілевіч, н. ў 1902 у в. Стаялава. Цясляр. Арыштаваны 26.3.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 5.9.1959.

ШАМКО Васіль Сямёнавіч, н. ў 1900 у в. Новыя Максімавічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 29.12.1932. Рэабілітаваны 31.8.1989.

ШАМКО Канстанцін Сямёнавіч, н. ў 1883 у п. Бялынічы. Жыў у в. Ніва Клічаўскага раёна. Калгаснік. Арыштаваны 29.12.1932. Рэабілітаваны 31.8.1989.

ШАМКО Яўген Сямёнавіч, н. ў 1894 у в. Максімавічы. Жыў у в. Сяліба Бярэзінскага раёна. Настаўнік Сялібскай НСШ. Арыштаваны 18.7.1938. Вызвалены 1.1.1939. Рэабілітаваны 1.1.1939.

ШАТУХА Сава (Савелій) Максімавіч, н. ў 1887 у в. Старая Арэхаўка. Калгаснік. Арыштаваны 22.9.1937. Расстраляны 14.11. 1937. Рэабілітаваны 7.10.1967.

ШАЎКУН Сяргей Васілевіч, н. ў 1910 у в. Куцень. Чырвонаармеец 148-га будаўнічага чыгуначнага батальёна 33-й чыгуначнай брыгады. Арыштаваны 8.1.1946. Рэабілітаваны 2.4.1946.

ШАЎЦОЎ Ананій Мікалаевіч, н. ў 1890 у в. Калічонка. Аднаасобнік. Арыштаваны 20.7.1935. Рэабілітаваны 13.7.1960.

ШАЎЧОНАК Даніла Цітавіч, н. ў 1900 у в. Новае Сяло. Аднаасобнік. Арыштаваны 17.5.1932. Рэабілітаваны 26.7.1932.

ШАЎЧОНАК Дзям'ян Аляксеевіч, н. ў 1887 у в. Новае Сяло. Аднаасобнік. Арыштаваны 18.5.1932. Рэабілітаваны 26.7.1932.

ШАЎЧОНАК Іван Дзямідавіч, н. ў 1885 у в. Новае Сяло. Аднаасобнік. Арыштаваны 17.5.1932. Рэабілітаваны 26.7.1932.

ШВАРЦ Якаў Аляксандравіч, н. ў 1889 у в. Востраў. Калгаснік. Арыштаваны 17.11. 1937. Расстраляны 13.12.1937. Рэабілітаваны 20.1.1939.

ШВЕЦ Аўрам Фёдаравіч, н. ў 1900 у в. Збранкі Оўруцкага раёна на Украіне. Жыў у в. Бацэвічы. Аднаасобнік. Арыштаваны 10.12.1934. Рэабілітаваны 13.1.1935.

ШЛАПАК Мікіта Купрэевіч, н. ў 1882 у в. Ваевічы. Аднаасобнік. Арыштаваны ў лютым 1932. Рэабілітаваны 19.5.1932.

ШПАК Вольга Фёдараўна, н. ў 1909 у в. Мацкевічы Бярэзінскага раёна. Аднаасобніца. Жыла ў в. Ліпніца. Арыштавана 14.8.1944. Рэабілітавана 27.3.1945.

ШПАК Міналай Пятровіч, жыў у в. Ліпніца. Арыштаваны ў 1931. Раскулачаны. Адбываў пакаранне ў Пермскай вобл. Рэабілітаваны 17.1.1992.

ШПАК Сцяпан Агеевіч, н. ў 1903 у в. Ліпніца. Аднаасобнік. Арыштаваны 6.8.1937. Расстраляны 9.9.1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны 8.8.1989.

ШПАКОЎСКІ Баляслаў Яфімавіч, н. ў 1872 на хутары Чырвоны Лес. Аднаасобнік. Арыштаваны 25.5.1931. Рэабілітаваны 4.8.1931.

ШПІЛЕЎСКІ Іван Гіляравіч, н. ў 1885 у в. Таценка. Аднаасобнік. Арыштаваны 10.2. 1930. Высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 14.9.1989.

ШПІЛЕЎСКІ Пётр Гіляравіч, н. ў 1900 у в. Таценка. Аднаасобнік. Арыштаваны 10.2.1930. Высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 14.6.1989.

ШЫДЛОЎСКАЯ Таццяна Аляксееўна, ШЫДЛОЎСКІ Аляксандр Ануфрыевіч, ШЫДЛОЎСКІ Антон Ануфрыевіч, жылі ў в. Новае Курганне. Арыштаваны ў 1931. Высланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны 25.6.1992.

ШЫНКЕВІЧ Іосіф Ігнатавіч, н. ў 1882. Жыў у в. Бацэвічы. Служачы. Арыштаваны 23.10.1929. Рэабілітаваны 10.2.1962.

ШЫНКЕВІЧ Яўгенія Іванаўна, н. ў 1890. Жыла ў в. Зарэчча. Санітарка Бацэвіцкай бальніцы. Арыштавана 10.9.1937. Рэабілітавана 21.5.1989.

ШЫЦКО Часлаў Валяр'янавіч, н. ў 1897 у в. Галынка Гродзенскай губерні (Польшча). Слесар. Жыў у г. п. Клічаў. Арыштаваны 11.9.1937. Расстраляны 15.12.1937. Рэабілітаваны 17.9.1958.

ЮДАЎ Міхаіл Фёдаравіч, н. ў 1909 у в. Ала Кіраўскага раёна. Жыў у в. Малінне. Рабочы леспрамгаса. Арыштаваны 18.7. 1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 20.3.1965.

ЮР'ЕВА Надзея Маркаўна, жыла ў в. Перасопня. Арыштавана ў 1931. Раскулачана. Выслана на Урал. Рэабілітавана 8.4.1992.

ЮРКАВЕЦ Алена Пятроўна, н. ў 1917. Жыла ў в. Драні. Арыштавана ў 1930. Раскулачана. Выслана ў Пермскую вобл. Рэабілітавана 16.3.1992.

ЮРКАВЕЦ Іван Сцяпанавіч, н. ў 1872 у в. Бёрда. Земляроб. Арыштаваны 24.2.1932. Рэабілітаваны 18.7.1989.

ЮРКАВЕЦ Кузьма Іванавіч, н ў 1901 у в. Палосы. Рахункавод райкаапсаюза. Арыштаваны 20.2.1932. Рэабілітаваны 18.7.1989.

ЮРКЕВІЧ Браніслаў Войцехавіч, н. ў 1887 у в. Наталоў. Аднаасобнік. Рэпрэсіраваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.9.1962.

ЮХНАВЕЦ Мікіта Лявонавіч, н. ў 1907 у в. Вілы Бабруйскага раёна. Жыў у в. Малінне Клічаўскага раёна. Аднаасобнік. Арыштаваны 20.11.1932. Рэабілітаваны 9.12.1961.

ЯБЛОНСКІ Антон Баляслававіч, н. ў 1887 у в. Каменны Бор Бярэзінскага раёна Мінскай вобл. Жыў у в. Гіжгайлава Клічаўскага раёна. Працаваў у калгасе «Чырвоны прамень». Арыштаваны 18.3.1933. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 28.8.1962.

ЯБЛОНСКІ Баляслаў Феліцыянавіч, н. ў 1882 у в. Гіжгайлава. Аднаасобнік. Рэпрэсіраваны двойчы: 26.3.1930, высланы ў Сібір, рэабілітаваны 9.9.1959 г., затым арыштаваны 22.12.1937, расстраляны 14.3.1938, рэабілітаваны 20.7.1990.

ЯБЛОНСКІ Сігізмунд Баляслававіч, н. ў 1888 у в. Камень-Брок Бярэзінскага раёна. Жыў у в. Наталоў. Калгаснік. Арыштаваны 22.12.1937. Расстраляны 21.2.1938. Рэабілітаваны 8.10.1959.

ЯБЛОНСКІ Станіслаў Адамавіч, н. ў 1882 у в. Апалінарава. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.3.1930. Высланы ў Сібір. Рэабілітаваны 5.9.1959.

ЯГАДЗІНА Лізавета Аляксандраўна, н. ў 1903 у г. п. Клічаў. Повар. Арыштавана у 1937. Расстраляна 11.31.1938. Рэабілітавана 25.5.1989.

ЯКІМАВЕЦ Сава Сямёнавіч, н. ў 1870 у в. Бёрда. Аднаасобнік. Арыштаваны 28.10. 1935. Рэабілітаваны 25.12.1935.

ЯКІМАВЕЦ Фёдар Сямёнавіч, н. ў 1870 у в. Бёрда. Аднаасобнік. Арыштаваны 28.10. 1935. Рэабілітаваны 25.12.1935.

ЯКІМАВЕЦ Фядот Савельевіч, н. ў 1903 у в. Бёрда. Брыгадзір калгаса. Арыштаваны 9.4.1938. Рэабілітаваны 11.9.1938.

ЯКІМАВЕЦ Фядот Савіч, н. ў 1903 у в. Бёрда. Працаваў старшынёй Баевіцкага сельсавета. Арыштаваны 28.10.1935. Рэабілітаваны 25.12.1935.

ЯКУБОЎСКІ Станіслаў Пятровіч, н. ў 1901 у в. Чаравач. Аднаасобнік. Арыштаваны 10.4.1931. Рэабілітаваны 11.7.1989.

ЯКШОНАК-ГАРАЎСКАЯ Софія Апалінараўна, н. ў 1904 у в. Гіжгайлава. Жыла ў в. Стаялава. Працавала настаўніцай у Стаялаўскай школе. Арыштавана 15.12.1937. Рэабілітавана 30.7.1960.

ЯЛЕНСКІ Антон Казіміравіч, н. ў 1900 у в. Турчылоў. Жыў у в. Градкі. Вартаўнік калгаса «Першае мая». Арыштаваны 21.7. 1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 19.2. 1959.

ЯЛОВІК Апанас Сямёнавіч, н. ў 1908 у в. Ядраная Слабада. Калгаснік. Арыштаваны 28.9.1937. Расстраляны 14.11.1937. Рэабілітаваны 30.7.1960.

* * *

Пасля таго, як рукапіс кнігі быў здадзены ў набор, мы атрымалі дадатковыя звесткі аб рэабілітацыі рэпрэсіраваных асоб.

АДАМОВІЧ Адам Іванавіч, н. ў 1925. Жыў у в. Раманоў. Арыштаваны ў 1931. Вызвалены ў 1941. Рэабілітаваны 26.2.1993.

АДАМОВІЧ Іван Сцяпанавіч, н. ў 1894. Жыў у в. Раманоў. Аднаасобнік. Арыштаваны ў 1931. Вызвалены ў 1947 . Рэабілітаваны 26.2.1993.

АКУЛІЧ Іван Іосіфавіч, н. ў 1909 у в. Вяленік. Жыў на хутары Лазовае Ляда. Аднаасобнік. Арыштаваны 9.2.1930. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

АКУЛІЧ Іосіф Іванавіч, н. ў 1874 у в. Падкамень. Жыў на хутары Лазовае Ляда. Арыштаваны 9.2.1930. Расстраляны. Рэабілітаваны 16.1.1989.

АКУЛІЧ Павел Іванавіч, жыў у в. Стаялава. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 4.10. 1993.

АКУЛІЧ Софія Уладзіміраўна, н. ў 1913 у в. Вожава. Цеставод хлебапякарні № 1 г. Бабруйска. Арыштавана 24.12.1944. Рэабілітавана 9.3.1945.

АЛЕКСАНДРОВІЧ Васіль Нічыпаравіч, н. ў 1898 у Клічаве. Жыў на хутары Яўсташына. Калгаснік калгаса імя Калініна. Арыштаваны 17.2.1932. Асуджаны на 3 гады. Рэабілітаваны 16.1.1989.

АЛЬХОВІК Іосіф Іванавіч, н. ў 1896 у в. Любічы. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 21.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

АНАНІЧ Максім Ільіч, н. ў 1895 у в. Орліна. Калгаснік. Арыштаваны 15.1.1938. Рэабілітаваны 25.4.1969.

АНАНІЧ Сямён Міхайлавіч, н. ў 1876 у в. Асавы. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 7.2.1938. Расстраляны. Рэабілітаваны 6.9.1989.

АНТРАПОВІЧ Настасся Лаўрэнаўна, н. ў 1905. Раскулачана ў 1930. Выслана ў Ніжні Тагіл Свярдлоўскай вобласці. Рэабілітавана 21.4.1993.

АРЭШКА Пётр Васілевіч, жыў у в. Новая Арэхаўка. Раскулачаны ў 1932. Рэабілітаваны 20.4.1993.

АСОЎСКІ Карл Ігнатавіч, н. ў 1887 у в. Коўбча. Жыў у в. Заложжа. Калгаснік. Арыштаваны 16.12.1937. Расстраляны 20.2. 1938.

АХРАМОВІЧ Браніслаў Віненцьевіч, н. ў 1892 у в. Варацін Бярэзінскага раёна. Жыў у в. Чырвоны Бераг Клічаўскага раёна. Калгаснік. Арыштаваны 17.3.1933. Рэабілітаваны 11.6.1933.

БАНДАРЖЭЎСКІ Міхаіл Аляксандравіч, н. ў 1896 у в. Старая Арэхаўка. Жыў там жа. Калгаснік. Арыштаваны 31.8.1930. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 6.9.1989.

БАНДАРЧЫК Сяргей Адамавіч, н. ў 1876 у в. Пагост Бярэзінскага раёна. Жыў у в. Убалацце Клічаўскага раёна. Аднаасобнік. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 21.11.1989.

БАРАЗНА Апанас Фёдаравіч, н. ў 1898 у в. Любічы. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 21.9.1937. Асуджаны на 1 год. Рэабілітаваны 16.1.1989.

БАРАЗНА Домна Андрэеўна, н. ў 1889. Жыла ў в. Халадок. Раскулачана ў 1930. Выслана ў Чардынскі раён Пермскай вобласці. Вызвалена ў 1947. Рэабілітавана 21.4. 1993.

БАРАЗНА Іосіф Касьянавіч, н. ў 1896. Жыў у в. Халадок. Раскулачаны ў 1930. Высланы ў Чардынскі раён Пермскай вобласці. Рэабілітаваны 21.4.1993.

БАРАЗНА Рыгор Іосіфавіч, н. ў 1929 у в. Халадок. Рэпрэсіраваны ў 1930. Высланы ў Чардынскі раён Пермскай вобласці. Вызвалены ў 1947. Рэабілітаваны 28.4.1993.

БАРАЗНА Рыгор Раманавіч, н. ў 1886 у в. Любічы. Жыў там жа. Арыштаваны ў 1930. Раскулачаны. Рэабілітаваны 3.1.1994.

БАРАН Міхаіл Ігнатавіч, н. ў 1886 у в. Капланцы Бярэзінскага раёна. Жыў у в. Убалацце Клічаўскага раёна. Рабочы арцелі «Чырвоная зорка». Арыштаваны 23.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 16.1. 1989.

БАРАНАЎ Іван Ігнатавіч, н. ў 1903 у в. Убалацце. Жыў там жа. Калгаснік. Арыштаваны 22.11.1932. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 22.9.1989.

БАХАНОВІЧ Гаўрыіл Антонавіч, н. ў 1902 у в. Земляніца. Жыў у в. Міжрэчча. Працаваў лесніком Убалацкага лясніцтва. Арыштаваны 10.6.1938. Асуджаны на 8 гадоў. Рэабілітаваны 6.10.1989.

БЕЛАКУРСКІ Купрэй Сямёнавіч, н. ў 1867 у в. Бацэвічы. Жыў у в. Яблынька. Аднаасобнік. Арыштаваны 17.3.1933. Рэабілітаваны 11.6.1993.

БОНДАР Афанасій Захаравіч, н. ў в. Чаравач. Арыштаваны ў 1929. Раскулачаны. Рэабілітаваны 16.4.1992.

БРЫЛЕЎСКІ Станіслаў Ігнатавіч, н. ў 1884 у в. Казлы. Жыў там жа. Калгаснік. Арыштаваны 5.12.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны.

БУРАКОЎСКІ Яфім Кандратавіч, н. ў 1901 у в. Востраў. Жыў на ст. Нясета. Працаваў вартаўніком базы Клічаўскага райспажыўсаюза. Арыштаваны 31.10.1937. Расстраляны 13.1.1938 у Бабруйску. Рэабілітаваны 16.1. 1989.

БУЦАНЕЦ Сямён Архіпавіч, н. ў 1870. Жыў у в. Рагі. Раскулачаны ў 1932. Рэабілітаваны 27.5.1993.

БУЧЭЛЬ Станіслаў Ігнатавіч, н. ў 1896 на хутары Роўнае Поле Віленскай губерні. Жыў у в. Стары Спор Клічаўскага раёна. Працаваў галоўным бухгалтарам саўгаса «Бацэвічы». Арыштаваны 17.3.1933. Асуджаны на 3 гады. Рэабілітаваны 20.10.1958 г.

БЯГАНСКІ Баляслаў Антонавіч, н. ў 1887 у в. Закуцце. Жыў там жа. Калгаснік. Арыштаваны 1.11.1937. Расстраляны 5.12.1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны 27.11.1989.

БЯЛЯК Іосіф Аляксеевіч, н. ў 1896 у в. Стаялава. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 5.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 29.9.1989.

БЯЛЯЎСКІ Сямён Раманавіч, н. ў 1901 у Бабруйску. Жыў у в. Басін Клічаўскага раёна. Аднаасобнік. Арыштаваны 17.4.1933. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ВАЛОВІК Марк Фаміч, н. ў 1896 у в. Крушыннік. Жыў у в. Ігар. Працаваў у калгасе. Арыштаваны 23.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны.

ВАЛЬКЕВІЧ Іван Мартынавіч, н. ў 1912 у в. Баркі. Жыў там жа. Арыштаваны 30.12. 1932. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 30.9.1989.

ВАЛЬКЕВІЧ Мартын Ільіч, н. ў 1875 у в. Жарноўка Бярэзінскага раёна. Жыў у в. Баркі Клічаўскага раёна. Аднаасобнік. Арыштаваны 30.12.1932. Высланы з сям'ёй на 3 гады. Рэабілітаваны.

ВАРОНІЧ Лявон Андрэевіч, н. ў 1902 у в. Бацэвічы. Жыў там жа. Аднаасобнік. Асуджаны 21.9.1937 на 10 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ВАСІЛЕЎСКІ Кліменцій Уладзіміравіч, н. ў 1896 у маёнтку Нягновічы Бярэзінскага раёна. Жыў у в. Басін Клічаўскага раёна. Аднаасобнік. Арыштаваны 1.4.1933. Асуджаны на 3 гады. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ВІНГЛІНСКІ Антон Антонавіч, жыў у в. Развадава. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 14.10.1993.

ВІТКОЎСКІ Ігнат Фаміч, н. ў 1900 у в. Казлы. Жыў у в. Градкі. Арыштаваны 15.12.1937. Расстраляны 9.3.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ВІТКОЎСКІ Іосіф Уладзіслававіч, н. ў 1887. Жыў у в. Турчылоў. Арыштаваны. Рэабілітаваны 30.7.1959.

ВІТКОЎСКІ Фелікс Адамавіч, н. ў 1889 у в. Дзмітраўка. Жыў у в. Градкі. Калгаснік. Арыштаваны 5.12.1937. Расстраляны 9.3.1938 у Мінску.

ГАБРЫЛЁЎ Антон Ларыёнавіч, н. ў 1880 у в. Новая Слабодка. Аднаасобнік. Арыштаваны 23.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ГАЛАЦЭВІЧ Іван Віктаравіч. Жыў у в. Люціна. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны 30.12.1993.

ГАНЧАРОЎ Іван Нічыпаравіч, н. ў 1907 у в. Даўжанка. Жыў там жа. Калгаснік. Арыштаваны 22.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 22.9.1989.

ГАНЧАРОЎ Платон Цітавіч, н. ў 1902 у в. Брылёўка. Жыў у в. Ядраная Слабада. Калгаснік. Арыштаваны 11.6.1938. Асуджаны на 8 гадоў. Рэабілітаваны 6.10.1989.

ГАРОХ Апанас Кузьміч, н. ў 1886 у в. Малая Вольса. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 13.12.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ГАЎРЫЛІН Сяргей Іванавіч, н. ў 1893 у в. Калічонка. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 22.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Адбываў пакаранне ў лагеры. Рэабілітаваны 21.11.1989.

ГЛЕБЕЦ Антон Данілавіч, н. ў 1896 у в. Рымцэлі (Польшча). Жыў у в. Чырвоная Ніва. Рабочы. Арыштаваны ў 1938. Расстраляны 28.2.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ГРУЗД Кузьма Іванавіч, н. ў 1912 у в. Вожаў. Працаваў стрэлачнікам на ст. Нясета. Арыштаваны 9.8.1940. Асуджаны на 6 гадоў. Рэабілітаваны 9.2.1990.

ГУРЭЦКІ Віктар Фларыёнавіч, н. ў 1892 у в. Казлы. Жыў там жа. Калгаснік. Арыштаваны 17.8.1938. Расстраляны 29.11.1938. Рэабілітаваны 30.9.1989.

ГУРЭЦКІ Іван Фларыёнавіч, н. ў 1905 у в. Казлы. Жыў там жа. Калгаснік. Арыштаваны 17.8.1938. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 20.8.1989.

ГУРЭЦКІ Франц Фларыёнавіч, н. ў 1903 у в. Казлы. Жыў там жа. Калгаснік. Арыштаваны 17.8.1938. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 20.8.1989.

ГУШЧА Вікенцій Іосіфавіч, н. ў 1900 на хутары Лілы. Брыгадзір калгаса «Новы шлях». Арыштаваны 11.6.1938. Расстраляны 20.11. 1938 у Мінску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ГУШЧА Іпаліт Іванавіч, н. ў 1891 на хутары Яўсташына. Жыў там жа. Калгаснік калгаса імя Калініна. Арыштаваны 17.2.1932. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ГУШЧА Пётр Адольфавіч, н. ў 1907 у в. Таценка. Калгаснік. Арыштаваны 25.3.1933. Рэабілітаваны 11.6.1933.

ГУШЧА Франц Адамавіч, н. ў 1871 у в. Трыцерка Бярэзінскага раёна. Жыў на хутары Крушыннік. Арыштаваны 14.3.1938. Расстраляны 8.10.1938. Рэабілітаваны 22.5.1989.

ГУШЧА Эдмус Васілевіч, н. ў 1887 у в. Ахоцічы Кіраўскага раёна. Жыў у в. Аляксандраўка Клічаўскага раёна. Рабочы лесаўчастка. Арыштаваны 20.6.1938. Асуджаны на 8 гадоў. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ДАЙНЕКА Ісаак Сямёнавіч, н. ў 1884 у Клічаве. Жыў на хутары Яўсташына. Калгаснік калгаса імя Калініна. Арыштаваны 17.2. 1932. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ДАЙНЕКА Мікіта Іванавіч, н. ў 1897 у в. Доўгае. Жыў там жа. Працаваў загадчыкам млына. Арыштаваны 20.11.1937. Расстраляны 15.1.1938 у Бабруйску. Рэабілітаваны 5.9.1989.

ДАНОЎСКІ Казімір Францавіч, н. ў 1871 у в. Масніны. Жыў на хутары Яўсташына. Калгаснік калгаса імя Калініна. Арыштаваны 18. 2.1932. Высланы на 3 гады ў Сібір. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ДАРАШКЕВІЧ Ганна Людвігаўна, жыла ў в. Аколіца. Раскулачана ў 1930. Выслана ў Таборынскі раён Свярдлоўскай вобласці. Рэабілітавана 4.10.1993.

ДАРАШКЕВІЧ Іосіф Баляслававіч, н. ў 1876. Аднаасобнік. Арыштаваны 16.10.1937. Расстраляны 15.1.1938. Рэабілітаваны 16.1. 1989.

ДАРАШКЕВІЧ Людвіг Баляслававіч. Жыў у в. Аколіца. Раскулачаны ў 1930. Высланы ў Таборынскі раён Свярдлоўскай вобласці. Рэабілітаваны 4.10.1993.

ДЗЕНІСЕВІЧ Іосіф Сцяпанавіч, н. ў 1906 у в. Закоркі. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.12.1932. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ДОЎБНЯ Цімафей Дзям'янавіч, н. ў 1884 у в. Бацэвічы. Жыў у Клічаве. Працаваў рахункаводам у калгасе. Арыштаваны 11.9.1937. Расстраляны 5.12.1937. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ЖАДЗЕЦКІ Аўгусцін Мікалаевіч, н. ў 1891 на хутары Яўсташына. Жыў там жа. Калгаснік калгаса імя Калініна. Арыштаваны 17.2.1932. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЖАДЗЕЦКІ Ігнат Мікалаевіч, н. ў 1882 на хутары Яўсташына. Жыў там жа. Працаваў брыгадзірам у калгасе. Арыштаваны 16.12. 1937. Расстраляны 25.2.1938. Рэабілітаваны 3.8.1989.

ЖАДЗЕЦКІ Ігнат Мікалаевіч, н. ў 1884 на хутары Яўсташына. Жыў там жа. Калгаснік калгаса імя Калініна. Арыштаваны 17.2.1932. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.1. 1989.

ЖДАНОВІЧ Іван Міхайлавіч, н. ў 1896 у в. Анатолеўка. Жыў там жа. Працаваў лесарамшчыкам. Арыштаваны 22.10.1937. Расстраляны 5.12.1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ЖУКОЎСКІ Пётр Аляксандравіч, н. ў 1901 у в. Таценка. Жыў у мястэчку Урэчча. Рабочы. Арыштаваны 19.1.1931. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 31.8.1989.

ЖУРКО Антон Аляксандравіч, н. ў 1898 у в. Смалярня. Жыў у в. Турчылоў. Калгаснік. Арыштаваны 5.8.1938. Расстраляны 20.11. 1938. Рэабілітаваны 25.7.1989.

ЖЫВІЦА Ігнат Ігнатавіч, н. ў 1896 у в. Какотава Кіраўскага раёна. Жыў у в. Градкі Клічаўскага раёна. Калгаснік. Арыштаваны 21.7.1938. Расстраляны 20.11.1938. Рэабілітаваны 25.7.1989.

ЗАБАЛОЦКІ Несцер Мікітавіч, н. ў в. Будней. Жыў там жа. Раскулачаны ў 1933. Рэабілітаваны 29.7.1993.

ЗАБЛОЦКІ Цімафей Сямёнавіч, жыў у в. Іванаўка. Раскулачаны ў 1937. Рэабілітаваны 12.8.1993.

ЗАВАЦКІ Якаў Раманавіч, н. ў 1889 у в. Старая Арэхаўка. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 31.8.1930. Рэабілітаваны.

ЗАГАРОЎСКІ Мартын Іванавіч, н. ў 1876 у в. Ліпніца Асіповіцкага раёна. Жыў на хутары Дуброва. Калгаснік. Арыштаваны 18.7.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ЗАЯЦ Мікалай Кузьміч, н. ў 1905 у в. Усакіна. Жыў там жа. Раскулачаны ў 1937. Рэабілітаваны 14.10.1993.

ЗАЯЦ Сідар Андрэевіч, н. ў 1891 у в. Усакіна. Жыў там жа. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 18.5.1993.

ЗЕМБА Пётр Антонавіч, н. ў 1893 у в. Вахадзідор (Польшча). Жыў у Клічаве. Працаваў кавалём у нарыхтоўчай канторы. Арыштаваны 15.11.1937. Расстраляны 28.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 5.9.1989.

ІЎКІНА Аляксандра Васілеўна, н. ў 1923. Жыла ў в. Новае Курганне. Арыштавана ў 1931. Саслана ў пасёлак Булатава Чардынскага раёна Пермскай вобласці. Вызвалена ў 1940. Рэабілітавана 2.9.1992.

КАЗАК Міхаіл Мікалаевіч, н. ў 1906 у в. Віркаў. Жыў там жа. Калгаснік. Арыштаваны 9.1.1935. Рэабілітаваны 7.3.1935.

КАЗАЧОНАК Іван Сяргеевіч, н. ў 1894 у в. Закоркі. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 31.12.1932. Расстраляны 23.3.1933. Рэабілітаваны.

КАЗАЧОНАК Сцяпан Гаўрылавіч, н. ў 1894 у в. Закоркі. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 31.12.1932. Асуджаны на 3 гады. Рэабілітаваны 31.10.1989.

КАЛЕСНІКАЎ Фёдар Антонавіч, н. ў 1907 у в. Малая Вольса. Жыў там жа. Арыштаваны 16.11.1937. Расстраляны 13.1.1938 у Бабруйску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КАРЖАВІЦКАЯ Кацярына Вікенцьеўна, н. ў в. Цеханічы. Жыла там жа. Арыштавана ў 1930. Рэабілітавана 23.3.1993.

КАРЧЭЎСКІ Андрэй Іванавіч, н. ў 1890 у в. Убалацце. Жыў там жа. Калгаснік. Арыштаваны 23.11.1932. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны.

КАШКАН Іван Іванавіч, н. ў 1889 у в. Зелень. Жыў у в. Новае Курганне. Аднаасобнік. Арыштаваны 10.2.1930. Расстраляны. Рэабілітаваны 26.7.1989.

КОЙПІШ Мікалай Канстанцінавіч, н. ў 1903 у в. Закоркі. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.12.1932. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 31.10.1989.

КОЙПІШ Сцяпан Самусавіч, н. ў 1895 у в. Закоркі. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 30.12.1932. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 31.10.1989.

КОРДУС Сцяпан Валянцінавіч, н. ў 1904. Жыў у в. Басін. Аднаасобнік. Арыштаваны 1.1.1933. Асуджаны на 3 гады ўмоўна. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КРЭМЕЗ Стафан Васілевіч, жыў у в. Новае Курганне. Арыштаваны ў 1929. Раскулачаны. Высланы на Урал. Рэабілітаваны 23.3.1992.

КУДЗІН Арцём Уласавіч, н. ў 1888 у в. Курганне. Жыў на хутары Туча. Рабочы лесараспрацовак. Арыштаваны 18.7.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Пакаранне адбываў у Чыстапольскім папраўча-працоўным лагеры. Рэабілітаваны 12.9.1989.

КУНОЎСКІ Франц Фаміч, н. ў 1878 у в. Прыстань Барысаўскага раёна. Працаваў слесарам у саўгасе Бацэвічы. Арыштаваны 10.4.1933. Рэабілітаваны 11.6.1933.

КУШНЕР Андрэй Васілевіч, н. ў 1883. Жыў у в. Заполле. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 2.2.1993.

КУШНЕР Сцяпан Якаўлевіч, жыў у в. Арэхаўка. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны 12.12.1993.

ЛАЗАКОВІЧ Ульян Лявонавіч, н. і жыў у в. Арэхаўка. Арыштаваны ў 1933. Рэабілітаваны 27.12.1993.

ЛАПАЦІН Міхаіл Паўлавіч, н. ў 1904 у в. Віркаў. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 7.1.1935. Асуджаны на 5 гадоў. Пакаранне адбываў у папраўча-працоўным лагеры. Рэабілітаваны 9.10.1989.

ЛІПАЙ Мікалай Аляксеевіч, н. ў 1902 у в. Коўбча. Працаваў грузчыкам беларускага кааператыўнага забеспячэння гандлю. Асуджаны 25.5.1938 як агент польскай разведкі. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 16.1. 1989.

ЛУК'ЯНОВІЧ Матрона Кірэеўна, н. ў 1878 у в. Замосце. Жыла там жа. Аднаасобніца. Арыштавана 22.3.1933. Выслана на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітавана 23.11.1989.

МАКАСЬ Іван Іванавіч, н. ў 1907 у в. Новае Курганне. Чырвонаармеец 78-га асобнага артдывізіёна. Арыштаваны 30.1. 1930. На 3 гады высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны 16.1.1989.

МАЛІНОЎСКІ Іван Уладзіслававіч, н. ў 1889 у г. Кракаў. Працаваў рахункаводам у саўгасе «Стары Спор» Клічаўскага раёна. Арыштаваны 17.3.1933. Асуджаны на 3 гады. Рэабілітаваны 20.10.1958.

МАРКАЎ Павел Канстанцінавіч, н. ў 1923 у г. Беласток (Польшча). Жыў у в. Чырвоны Бераг Клічаўскага раёна. Чырвонаармеец 6-га палка 2-й Беларускай дывізіі. Арыштаваны 22.6.1933. Асуджаны на 3 гады. Пакаранне адбываў у папраўча-працоўным лагеры. Рэабілітаваны 16.1.1989.

МАРЧАНКА Марыя Кліменцьеўна, жыла ў в. Тачышча. Раскулачана ў 1930. Выслана ў Чардынскі раён Пермскай вобласці. Рэабілітавана 1.4.1993.

МЕЛЯШКЕВІЧ Алена Васілеўна, н. ў 1930 у в. Нова-Набаркі. Жыла там жа. У 1930 разам з бацькамі выслана ў Таборынскі раён Свярдлоўскай вобласці. Рэабілітавана 27.10. 1992.

МЕЛЯШКЕВІЧ Васіль Мікалаевіч, н. ў 1895 у в. Нова-Набаркі. Жыў там жа. Арыштаваны ў 1930. Высланы ў Таборынскі раён Свярдлоўскай вобласці. Рэабілітаваны 27.10. 1992.

МЕЛЯШКЕВІЧ Вольга Васілеўна, н. ў 1927 у в. Нова-Набаркі. Жыла там жа. У 1930 разам з бацькамі выслана ў Таборынскі раён Свярдлоўскай вобласці. Вызвалена ў 1944. Рэабілітавана 27.10.1992.

МЕЛЯШКЕВІЧ Ірына Васілеўна, н. ў 1940 у пасёлку Чабаксары Таборынскага раёна Свярдлоўскай вобласці ў час знаходжання бацькоў у ссылцы. Рэабілітавана 27.10. 1992.

МЕЛЯШКЕВІЧ Ларыса Васілеўна, н. ў 1921 у в. Нова-Набаркі. Жыла там жа. У 1930 разам з бацькамі выслана ў Таборынскі раён Свярдлоўскай вобласці. Рэабілітавана 27.10. 1992.

МЕЛЯШКЕВІЧ Лідзія Васілеўна, н. ў 1923 у в. Нова-Набаркі. Жыла там жа. Выслана ў Таборынскі раён Свярдлоўскай вобласці. Рэабілітавана 27.10.1992.

МЕЛЯШКЕВІЧ Софія Дзмітрыеўна, н. ў 1899 у в. Нова-Набаркі. Жыла там жа. Арыштавана ў 1930. Выслана ў Таборынскі раён Свярдлоўскай вобласці. Рэабілітавана 27.10. 1992.

МІЦКЕВІЧ Казіміра Іванаўна, н. ў 1885 у в. Бацэвічы. Працавала ў саўгасе «Навасёлкі» Клічаўскага раёна. Арыштавана ў 1933. Рэабілітавана.

НАРКЕВІЧ Кліменцій Францавіч, н. ў 1873 у пас. Юзафін. Жыў у пас. Стэфанаўка. Рабочы саўгаса «Стары Спор». Арыштаваны 16.11.1937. Рэабілітаваны 24.8.1989.

НОВІКАЎ Раман Рыгоравіч, н. ў 1872 у в. Пуцькава Чавускага раёна. Жыў у в. Асавец. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.9.1932. Асуджаны на 3 гады. Рэабілітаваны 31.8. 1989.

ПАДДУБСКІ Мікалай Рыгоравіч, н. ў 1890 у в. Капланцы Бярэзінскага раёна. Калгаснік. Жыў у в. Убалацце. Арыштаваны 24.11.1932. Высланы ў канцлагер. Рэабілітаваны 22.9.1989.

ПАРКАЛАВА Лукер'я Фёдараўна, жыла ў в. Тачышча. Раскулачана ў 1930. Выслана ў Чардынскі раён Пермскай вобл. Рэабілітавана 1.4.1993.

ПАРКАЛАЎ Іван Клімавіч, жыў у в. Тачышча. Раскулачаны ў 1930. Высланы ў Чардынскі раён Пермскай вобласці. Рэабілітаваны 1.4.1993.

ПАРКАЛАЎ Клім Кірэевіч, жыў у в. Тачышча. Раскулачаны ў 1930. Высланы ў Чардынскі раён Пермскай вобл. Рэабілітаваны 1.4.1993.

ПАРКАЛАЎ Фёдар Клімавіч, жыў у в. Тачышча. Раскулачаны ў 1930. Высланы ў Чардынскі раён Пермскай вобласці. Рэабілітаваны 1.4.1993.

ПАЎЛОЎСКІ Марк Кірылавіч, н. ў 1905 у в. Дулебна. Жыў там жа. Калгаснік калгаса «Чырвоны баец». Арыштаваны 23. 9.1937. Расстраляны 15.1.1938 у Бабруйску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ПАЎЛОЎСКІ Мікіта Гаўрылавіч, жыў у в. Дулебна. Раскулачаны ў 1933. Рэабілітаваны 25.10.1993.

ПЕТРАШКЕВІЧ Раман Вікенцьевіч, н. ў 1869 у в. Грыбавец Кіраўскага раёна. Жыў у в. Убалацце Клічаўскага раёна. Вартаўнік лесазавода. Арыштаваны 18.7.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Адбываў пакаранне ў Краснаярску. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ПЕТРАШКЕВІЧ Феліцыя Аляксандраўна, н. ў 1899 у в. Гіжгайлава. Жыла там жа. Аднаасобніца. Арыштавана 11.9.1937. Асуджана на 10 гадоў. Выслана ў Бамлаг. Рэабілітавана 19.9.1989.

ПЕТЭРСОН Франц Ігнатавіч, н. ў 1906 у г. Асіповічы. Жыў у в. Раманава Клічаўскага раёна. Чырвонаармеец 242-га палка 81-й дывізіі. Арыштаваны 18.2.1930. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ПІНЧУК Нічыпар Цімафеевіч, н. ў 1901 у в. Арэхаўка. Жыў там жа. Арыштаваны ў 1932. Рэабілітаваны 13.1.1994.

ПІНЧУК Павел Патапавіч, н. ў 1888 у в. Ліпніца. Рабочы Клічаўскай бандарнай арцелі. Арыштаваны 28.11.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 10.1.1989.

ПІРОЖНІК Майсей Фаміч, жыў у в. Орліна. Арыштаваны ў 1934. Рэабілітаваны 10. 12.1993.

ПШАНІЧНІК Міхаіл Сяргеевіч, жыў у в. Халадок. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 25.1.1993.

ПШАНІЧНІК Сяргей Максімавіч, жыў у в. Халадок. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 25.1.1993.

ПЯТРОВІЧ Іван Казіміравіч, н. ў 1885 у в. Яўсташына. Калгаснік калгаса імя Варашылава. Арыштаваны 30.8.1937. Расстраляны 5.12.1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны 16.1. 1989.

ПЯТРОЎСКІ Канстанцін Мікалаевіч, н. ў 1877 у в. Новыя Максімавічы. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 17.7.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 12.9.1989.

РАДКЕВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1892 у в. Бярозаўка Чэрвеньскага раёна. Жыў у в. Чырвоны Бераг Клічаўскага раёна. Калгаснік. Арыштаваны ў 1938. Расстраляны 31.7.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

РАМАНОВІЧ Дзям'ян Антонавіч, н. ў 1875. Жыў у в. Дубно. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 12.10.1993.

РАМНЁНАК Ісаак Сяргеевіч, н. ў 1897 у в. Старая Арэхаўка. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 31.8.1930. Асуджаны на 1 год. Рэабілітаваны 6.9.1989.

РУСЕЦКІ Павел Сцяпанавіч, н. ў 1888 у в. Коўбча. Жыў там жа. Свяшчэннік Коўбчанскай царквы. Арыштаваны 30.1.1930. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

РЫБАКОЎ Мікалай Апанасавіч, н. ў 1905 у в. Ядраная Слабада. Жыў на ст. Друць, працаваў вагаўшчыком. Арыштаваны 18.1. 1938. Асуджаны на 3 гады. Рэабілітаваны 6.10.1990.

РЫДЗЕЎСКІ Іван Пятровіч, н. ў 1906 у в. Вольчына Дуброўка. Служыў у 27-м артпалку ў Віцебску. Арыштаваны 10.8.1929. Высланы ў канцлагер. Рэабілітаваны 10.1.1989.

САЗАНАВЕЦ Усцін Іванавіч, н. ў 1902 у в. Малая Вольса. Жыў там жа. Працаваў сплаўшчыкам лесу па рацэ Бярэзіна. Арыштаваны 15.11.1937. Расстраляны 13.1.1938 у Бабруйску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

САЙ Юлія Іванаўна, н. ў 1896, **САЙ Галіна Аляксандраўна**, н. ў 1919, **САЙ Любоў Аляксандраўна**, н. ў 1922, **САЙ Зінаіда Аляксандраўна**, жылі у в. Вяленік. Раскулачаны ў 1930. Высланы ў Свярдлоўскую вобласць. Рэабілітаваны 5.11.1993.

САЛАВЕЙ Іван Барысавіч, н. ў 1907 у в. Віркаў. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 5.1.1935. Рэабілітаваны 26.3.1935.

САМЕЦ Антон Уласавіч, жыў у в. Галішчына. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 17.3. 1993.

САМЕЦ Настасся Антонаўна, н. ў 1926 у в. Галішчына. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 17.3.1993.

САМЕЦ Настасся Васілеўна, жыла ў в. Галішчына. Рэпрэсіравана ў 1930. Рэабілітавана 17.3.1993.

САМЕЦ Сцяпан Антонавіч, н. ў 1914. Жыў у в. Галішчына. Рэпрэсіраваны ў 1930. Рэабілітаваны 17.3.1993.

САМУЙЛЕНКА Клім Савельевіч, н. ў 1890 у в. Ядраная Слабада. Жыў там жа. Арыштаваны 20.7.1938. Расстраляны 30.10.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СВІРЫД Максім Сідаравіч, н. ў 1899 у в. Казулічы Бабруйскага раёна. Жыў у в. Новая Арэхаўка. Аднаасобнік. Арыштаваны 31.8. 1930. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 6.9.1989.

СКРЫПКА Герасім Арцёмавіч, н. ў 1894 у в. Кабылянка. Жыў на хутары Вылазка. Аднаасобнік. Арыштаваны 20.9.1930. Асуджаны на 1 год. Рэабілітаваны 6.9.1989.

СОЛТАН Васіль Цімафеевіч, жыў у в. Лаззё. Аднаасобнік. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны 13.10.1992.

СТАНЧЫК Антон Станіслававіч, н. ў 1894 у в. Бёрда. Жыў у в. Равок. Аднаасобнік. Арыштаваны 24.3.1933. Рэабілітаваны 11.6. 1933.

СТРЫГУН Антон Яўменавіч, н. ў 1876 у в. Дулебна. Жыў там жа. Аднаасобнік. Арыштаваны 10.12.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны.

СТРЫГУН Лявонцій Паўлавіч, н. ў 1886 у в. Дулебна. Жыў у в. Вольчына Дубраўка. Аднаасобнік. Арыштаваны 23.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СТРЫГУН Лявонцій Паўлавіч, н. ў 1888 у в. Дулебна. Жыў у в. Вольчына Дубраўка. Аднаасобнік. Арыштаваны 9.2.1930. Асуджаны на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ТАТУР Юльян Антонавіч, н. ў 1913 на хутары Застар'е. Калгаснік. Рэпрэсіраваны 27.8.1931. Рэабілітаваны 14.8.1962.

УМЕЦ Уладзімір Сцяпанавіч, н. ў 1898 у в. Кабылянка. Жыў у пасёлку Прагрэс. Аднаасобнік. Арыштаваны 7.1.1935. Рэабілітаваны 13.3.1935.

УСЦІНОВІЧ Анэлія Яфімаўна, н. ў 1876 у в. Вішанькі. Раскулачана ў 1931. Выслана ў пас. Булатава Пермскай вобласці. Рэабілітавана 9.7.1993.

УСЦІНОВІЧ Вацлаў Сцяпанавіч, н. ў 1861, **УСЦІНОВІЧ Аляксандр Вацлававіч**, н. ў 1919, **УСЦІНОВІЧ Баляслаў Вацлававіч**, н. ў 1917, **УСЦІНОВІЧ Сцепаніда Вацлаваўна**, н. ў 1924. Усе нарадзіліся і жылі ў в. Вішанькі. Раскулачаны ў 1931. Высланы ў пас. Булатава Пермскай вобласці. Вызвалены ў 1941. Рэабілітаваны 9.7.1993.

УСЦІНОВІЧ Іосіф Гіляравіч, н. ў 1889 у в. Баран-Навіна Клічаўскага раёна. Жыў у Клічаве. Працаваў шаўцом у арцелі «Чырвоны саматужнік». Арыштаваны 16.11.1937. Расстраляны 13.1.1938. Рэабілітаваны 16.1. 1989.

УСЦІНОВІЧ Уладзімір Васілевіч, н. ў 1920 у в. Вішанькі. Жыў там жа. Раскулачаны ў 1931. Высланы ў пас. Булатава Пермскай вобласці. Вызвалены ў 1944. Рэабілітаваны 4.7.1993.

ФЯСЬКО Данііл Майсеевіч, жыў у в. Віркаў. Арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны 29. 9.1992.

ХАРЛАП Раман Фёдаравіч, н. ў 1896 у в. Драні. Аднаасобнік. Арыштаваны 5.12.1937. Высланы ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЦІХАНОВІЧ Вікенцій Антонавіч, ЦІХАНОВІЧ Антон Вікенцьевіч, н. ў 1920, **ЦІХАНОВІЧ Казімір Вікенцьевіч**, н. ў 1927, **ЦІХАНОВІЧ Фабіян Вікенцьевіч**, н. ў 1930, **ЦІХАНОВІЧ Эфця Вікенцьеўна.** Усе жылі ў в. Таценка. Раскулачаны і арыштаваны ў 1930. Рэабілітаваны 23.3.1993.

ЦІХАНОВІЧ Антон Эдуардавіч, н. ў 1899 на хутары Яўсташына. Калгаснік калгаса імя Леніна. Арыштаваны 17.2.1932. Асуджаны на 3 гады. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЦІХАНОВІЧ Міхаіл Эдуардавіч, н. ў 1904 на хутары Яўсташына. Калгаснік калгаса імя Леніна. Арыштаваны 17.2.1932. Асуджаны на 3 гады. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЦІХАНОВІЧ Станіслаў Эдуардавіч, н. ў 1912 на хутары Яўсташына. Калгаснік калгаса імя Леніна. Арыштаваны 17.2.1932. Асуджаны на 3 гады. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЦМЫГ Аляксандр Акулавіч, н. ў 1882 у в. Жарноўка Бярэзінскага раёна. Жыў у в. Баркі. Аднаасобнік. Арыштаваны 30.12.1932. Асуджаны на 3 гады канцлагераў. Рэабілітаваны 30.9.1989.

ЧАРНЯЎСКІ Карл Францавіч, н. ў 1885 у в. Наталоў. Жыў там жа. Калгаснік. Арыштаваны ў 1931. Расстраляны 25.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЧМАРА Марфа Рыгораўна. Нарадзілася і жыла ў в. Дзмітраўка. Раскулачана ў 1930. Рэабілітавана 24.3.1993.

ЧМАРА Сцяпан Міхайлавіч, н. ў 1908 у в. Дзмітраўка. Жыў там жа. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 24.3.1993.

ЧОРНЫ Аляксандр Герасімавіч, н. ў 1900 у в. Тачышча. Жыў там жа. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны 3.8.1993.

ЧЫЖОНАК Антон Герасімавіч, н. ў 1891 у в. Маркавічы Бабруйскага раёна. Жыў у в. Арэхаўка Клічаўскага раёна. Аднаасобнік. Арыштаваны 2.2.1931. Асуджаны на 1 год. Рэабілітаваны 12.10.1989.

ЧЫЖОНАК Іван Герасімавіч, н. ў 1900 у в. Маркавічы Бабруйскага раёна. Жыў у в. Арэхаўка Клічаўскага раёна. Аднаасобнік. Арыштаваны 2.2.1931. Рэабілітаваны 12.10.1989.

ШВАРЦ Аляксандр Уладзіміравіч, н. ў 1886 у в. Таценка. Жыў там жа. Калгаснік. Арыштаваны 17.3.1933. Асуджаны на 5 гадоў. Пакаранне адбываў у папраўча-працоўным лагеры. Рэабілітаваны 20.10.1958.

ШУЛЬЦ Артур Яфрэмавіч, н. ў 1892 у мяст. Пулін Жытомірскай акругі. Жыў у в. Доўгае. Цясляр. Арыштаваны 12.12.1937. Расстраляны 20.2.1938. Рэабілітаваны 26.5.1989.

ШЫДЛОЎСКАЯ Аляксандра Іванаўна, н. ў 1865. Жыла ў в. Новае Курганне. Арыштавана ў 1931. Выслана ў пас. Булатава Чардынскага раёна Пермскай вобласці. Вызвалена ў 1947. Рэабілітавана 2.9.1992.

ШЫДЛОЎСКАЯ Ганна Харытонаўна, н. ў 1905. Жыла ў в. Новае Курганне. Арыштавана ў 1931. Выслана ў пас. Булатава Чардынскага раёна Пермскай вобласці. Вызвалена ў 1947. Рэабілітавана 2.9.1992.

ШЫДЛОЎСКАЯ Софія Трафімаўна, н. ў 1914. Жыла ў в. Новае Курганне. Арыштавана ў 1931. Выслана ў пас. Булатава Чардынскага раёна Пермскай вобласці. Вызвалена ў 1947. Рэабілітавана 2.9.1992.

ШЫДЛОЎСКІ Васіль Трафімавіч, н. ў 1904. Жыў у в. Новае Курганне. Арыштаваны ў 1931. Высланы ў пас. Булатава Чардынскага раёна Пермскай вобласці. Вызвалены ў 1947. Рэабілітаваны 2.9.1992.

ШЫДЛОЎСКІ Георгій Васілевіч, н. ў 1929. Жыў у в. Новае Курганне. Высланы ў пас. Булатава Чардынскага раёна Пермскай вобласці. Вызвалены ў 1945. Рэабілітаваны 2.9. 1992.

ШЭХ Андрэй Рыгоравіч, н. ў 1909 у в. Доўгае. Жыў там жа. Калгаснік. Арыштаваны 4.10.1937. Расстраляны ў лістападзе 1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ШЭХ Рыгор Уласавіч, н. ў 1884 у в. Доўгае. Жыў у в. Загацце. Грузчык леспрамгаса. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны на 8 гадоў. Рэабілітаваны 29.12.1990.

ЮРКЕВІЧ Мікалай Паўлавіч, н. ў 1881 на хутары Заварочча Асіповіцкага раёна. Жыў на хутары Лазовае Ляда. Арыштаваны 9.2.1930. Расстраляны. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЯБЛОНСКАЯ Софія Пятроўна, н. ў 1892 у в. Вяленік. Жыла ў в. Гіжгайлава. Арыштавана 24.8.1937. Асуджана на 10 гадоў. Рэабілітавана 19.9.1989.

ЯБЛОНСКІ Антон Феліцыянавіч, н. ў 1874 на хутары Гіжгайлава. Жыў у в. Заложжа. Аднаасобнік. Арыштаваны 15.1.1938. Расстраляны 14.3.1938. Рэабілітаваны 8.8.1989.

ЯБЛОНСКІ Уладзімір Іосіфавіч, н. ў 1896 у в. Наталоў. Жыў у в. Явва-Валасень. Калгаснік. Арыштаваны 28.1.1938. Расстраляны 27.4.1938. Рэабілітаваны 26.5.1989.

ЯКІМОВІЧ Іван Канстанцінавіч, н. ў 1896 у в. Брадзец Бярэзінскага раёна. Жыў у в. Халадок. Аднаасобнік. Арыштаваны 17.7.1937. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны 13.12. 1989.

ЯЛЕНСКІ Іван Казіміравіч, н. ў 1885 у в. Турчылоў. Жыў у в. Градкі. Калгаснік. Арыштаваны 15.12.1937. Расстраляны 9.3.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЯНКАВЕЦ Афанасій Яфімавіч, н. ў 1887 у в. Малая Вольса. Жыў там жа. Цясляр. Арыштаваны 31.10.1937. Расстраляны 5.12.1937 у Бабруйску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЯЎСЕЕВА Аніся Сяргееўна, н. ў 1919. Жыла ў в. Халадок. Раскулачана ў 1937. Рэабілітавана 29.1.1993.

УДЗЕЛЬНІКІ УСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎКІ, узнагароджаныя малым сярэбраным медалём:

БЕЛАКУРСКАЯ Фядора Малахаўна — даярка калгаса імя Леніна Бацэвіцкага сельсавета, якая надаіла ў 1938 г. 2958 л малака ад фуражнай каровы чырвонанямецкай пароды.

ЯСКЕВІЧ Настасся Лявонаўна — даярка калгаса імя Леніна Бацэвіцкага сельсавета, якая надаіла ў 1938 г. 2897 л малака ад фуражнай каровы мясцовай пароды.

ЯСКЕВІЧ Фёдар Цярэнцьевіч — старшыня калгаса «Чырвоны прамень» Каўбчанскага сельсавета, які ў 1938 г. ўзначальваў звяно і атрымаў ураджай ячменю па 38 ц з гектара.

Узнагароджарыя Малым сярэбраным медалём адначасова атрымліваюць прэміі 500 руб.

(З пастановы Галоўнага камітэта Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ад 15.4.1940 г.)

Зацверджаны ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі з занясеннем у Ганаровую кнігу УСГВ:

КАЛГАС «ЗАРА» Усохскага сельсавета — за высокапрадукцыйнае камплектаванне ферм.

КАЛГАС ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА Заполь-скага сельсавета — за высокапрадукцыйнае камплектаванне ферм.

КАЛГАС «КАМІНТЭРН» Нясяцкага сель-

савета — за высокапрадукцыйнае камплектаванне ферм.

КАЛГАС «ПЯЦІГОДКА» Змітраўскагасельсавета — за высокапрадукцыйнае камплектаванне ферм.

КАЛГАС «VII З'ЕЗД САВЕТАЎ» Запольскага сельсавета — за высокапрадукцыйнае камплектаванне ферм.

КАЛГАС «УПЕРАД» Ваевіцкага сельсавета — за высокапрадукцыйнае камплектаванне ферм.

КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ ВОСТРАЎ» Востраўскага сельсавета — за высокапрадукцыйнае камплектаванне ферм.

АВЕЧКАГАДОЎЧАЯ І МАЛОЧНАТАВАРНАЯ ФЕРМЫ КАЛГАСА «АСВЕТА» Дзмітраўскага сельсавета.

АЛЬХОВІЧ Алена Герасімаўна — трактарыстка Бацэвіцкай МТС.

БАЖКОЎ Міхаіл Дзмітрыевіч — трактарыст Нясяцкай МТС.

БЕДУНКЕВІЧ Вольга Сямёнаўна — цялятніца калгаса «Чырвоны прамень» Каўбчанскага сельсавета.

БЕЛАКУРСКАЯ Сцепаніда Давыдаўна — даярка калгаса імя Леніна Бацэвіцкага сельсавета.

БЕЛАКУРСКАЯ Фядора Малахаўна — даярка калгаса імя Леніна Бацэвіцкага сельсавета.

БЕЛАКУРСКІ Іван Данілавіч — за перавыкананне норм выпрацоўкі і атрыманне высокага ўраджаю бульбы ў калгасе «Стаханавец» Бацэвіцкага сельсавета.

БУСЕЛ Аляксандр Пятровіч — аўчар калгаса «Чырвоны маяк» Максімавіцкага сельсавета.

ВЕРНІКОЎСКІ Лявон Віктаравіч — трактарыст Бацэвіцкай МТС.

ЗАЯЦ Емяльян Лявонавіч — загадчык фермы калгаса «Асвета» Дзмітраўскага сельсавета.

ІВІНСКІ Феліцыян Людвігавіч — майстар па вырабу бочак прамкалгаса «Зара» Усохскага сельсавета.

КАНОЙКА Аксіння Фядосаўна — звеннявая па льну калгаса імя Будзённага Бацэвіцкага сельсавета.

КЕШКА Аляксей Нічыпаравіч — пастух калгаса «Асвета» Дзмітраўскага сельсавета.

КНІГА Васіль Ананьевіч — брыгадзір па вырошчванні азімага жыта калгаса «Чырвоны прамень» Каўбчанскага сельсавета.

КОЙПІШ Сяргей Максімавіч — брыгадзір па вырошчванні азімага жыта калгаса «Прабуджэнне» Востраўскага сельсавета.

КОЎРЫК Васіль Фёдаравіч — конюх калгаса «Бальшавік».

КРЫВАНОС Пелагея Васілеўна — даярка калгаса «Асвета» Дзмітраўскага сельсавета.

КУНЦЭВІЧ Ігнат Аляксандравіч — старшыня калгаса «Чырвоны Востраў» Востраўскага сельсавета.

МАКАРЧАНКА Уладзімір Кірэевіч — трактарыст Нясяцкай МТС.

ПАТУПЧЫК Сяргей Васілевіч — конюх калгаса «Чырвоны Кастрычнік» Максімавіцкага сельсавета.

ПАТУПЧЫК Фёдар Мікітавіч — брыгадзір па вырошчванні махоркі калгаса «Камунар» Максімавіцкага сельсавета.

ПАТУПЧЫК Фёкла Харытонаўна — звеннявая па вырошчванні махоркі калгаса «Камунар» Максімавіцкага сельсавета.

САЗАНАВЕЦ Давыд Дзмітрыевіч — за перавыкананне норм выпрацоўкі і атрыманне высокага ўраджаю бульбы ў калгасе «VII з'езд Саветаў» Запольскага сельсавета.

УМЕЦКІ Іосіф Іванавіч — трактарыст Нясяцкай МТС.

ФІЛОНЧЫК Якаў Ісакавіч — загадчык фермы калгаса імя Даяржынскага Запольскага сельсавета.

ШАЛАЙ Марыя Васілеўна — цялятніца калгаса «Асвета» Дзмітраўскага сельсавета.

ШАМАЛЬ Лявон Ягоравіч — тэхнік па штучным асемяненні ў калгасе «Асвета» Дзмітраўскага сельсавета.

ШАМАЛЬ Марк Сяргеевіч — брыгадзір па вырошчванні збожжавых калгаса імя Варашылава Уладзіміраўскага сельсавета.

ШАМЕЦЬКА Іван Сямёнавіч — брыгадзір калгаса імя Леніна Бацэвіцкага сельсавета, за перавыкананне норм выпрацоўкі і атрыманне высокага ўраджаю бульбы.

ЯСКЕВІЧ Настасся Лявонаўна — даярка калгаса імя Леніна Бацэвіцкага сельсавета.

АБ ЧЫМ ПІСАЛА РАЁННАЯ ГАЗЕТА «СТАЛІНСКІ ШЛЯХ» У 1940 ГОДЗЕ

Месячны заработак 1753 рублі

Прайшоўшыя выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных адзначаны новым вытворчым уздымам сярод лесарубаў і возчыкаў Убалацкага лесаўчастка. За снежань месяц сталы возчык Юркавец Кузьма Фёдаравіч вывез 53 кубаметры лесаматэрыялу і 350 раўметраў дроў, на многа перавыканаўшы норму. Таварыш Юркавец заработаў за месяц: асноўнымі 1275 рублёў 30 кап., прагрэсіўкі і сезоннай надбаўкі 478 рублёў, а ўсяго 1753 рублі 30 кап. Перавыконвае нормы на вывазцы і калгаснік калгаса «Уперад» Ваевіцкага сельсавета Стукальскі Тарас. Па-стаханаўску, як і заўсёды, працуе звяно лесарубаў Каспяровіча Івана, выконваючы нормы на 250 працэнтаў.

Начальнік лесаўчастка *І. Вайтусёнак*,
1 студзеня. Рабачком *Д. Сілін*

Расце культура вёскі

За гады Савецкай улады змяніла сваё аблічча вёска Нясята. Замест нахіліўшыхся халуп узведзены новыя будынкі. Значна падняласа культура калгаснікаў. Раней у вёсцы былі толькі два пісьменныя, а зараз амаль усе. Так, дзеці калгасніка Мікалая Фёдаравіча Дубініна пры Савецкай уладзе атрымалі асвету і зараз працуюць на адказных работах. Сын Лявон працуе загадчыкам камсамольскага і піянерскага аддзела Ломжынскага павета, другі сын Сцяпан — у НКВД, Марка — лейтэнант, Алесь вучыцца ў НСШ. Сам Мікалай Фёдаравіч па-стаханаўску працуе ў калгасе. Ён з дачкой выпрацаваў за год 527 працадзён.

Дзеці Фёдара Ахрэмавіча Зенкаўца таксама пры Савецкай уладзе атрымалі асвету і зараз працуюць у савецкіх установах. Сын Аляксандр — дырэкттр завода, Андрэй, былы пастух, зараз майстар на дарогах, Міша — трактарыст, Цімох — каваль, Вольга — студэнтка педтэхнікума і самая малодшая Маня вучыцца ў няпоўнай сярэдняй школе.

Выраслі ў калгасе новыя людзі, імёны якіх вядомы ўсяму раёну. Вось Сіліна Мар'я — даярка калгаса. Яе калгаснікі выбралі дэпутатам раённага Савета. *Я. Дубінін.*
5 студзеня.

ПА КЛІЧАВУ І РАЁНУ

Будаўніцтва ў гарадскім пасёлку

У 1939 годзе ў гарадскім пасёлку Клічаве пабудаваны два двухпавярховыя дамы. У некаторых дамах зроблен бягучы рамонт. Значна разгорнута будаўніцтва Клічава ў гэтым годзе. Заканчваецца пабудова аднаго двухкватэрнага дома і прадуктовага магазіна. Па Ленінскай вуліцы заканчваецца будаўніцтва артэзіянскага калодзежа глыбінёй скважыны ў 70 метраў. Прабіта ўжо 62 метры. На будаўніцтва яго адпушчана 35 тысяч рублёў. Калодзеж будзе даваць 400 вёдзер вады ў гадзіну. Распачаўся падвоз будаўнічых матэрыялаў для будаўніцтва школы на 400 месц. Ідзе падрыхтоўчая работа для насаджэння сквера. Мяркуецца пабудаваць яшчэ два чатырохпавярховыя дамы і цагляную лазню.

Выплата выйгрышаў

Ашчадкасы раёна ў мінулым годзе выплацілі выйгрышы па ўсіх відах пазык 34 тысячы рублёў.

Рост укладаў

З кожным годам павялічваецца заможнасць працаўнікоў раёна. З ростам заможнасці расце і рост укладаў у ашчадкасу. На 1 студзеня ў ашчадкасах раёна працаўнікі трымаюць на ашчадных кніжках на 167 тысяч рублёў больш, чым у 1938 годзе.
12 студзеня.

* * *

Дастойнае папаўненне ў рады Чырвонай Арміі дасць у гэтым годзе Нясяцкі сельсавет. Прызыўнікі Белазор, Кунцэвіч, Аліпоўскі і іншыя здаюць нормы на чатыры абаронныя значкі. Да дня прызыву ўсе юнакі абавязаліся здаць нормы на чатыры абаронныя значкі. *Осіпаў І. Н.*
2 лютага.

Будаўніцтва ў калгасах

Вялікае будаўніцтва вядуць калгасы Віркаўскага сельсавета. У мінулым годзе калгасы пабудавалі 5 кладовых, 2 канюшні, 2 клубы і інш. Акрамя гэтага, калгаснікі калгаса «Прагрэс» пабудавалі амбар, прасторны клуб, на ўзвядзенне якога затрачана звыш 2 тысяч рублёў.
6 лютага.

Падрыхтоўка калгасных кадраў

Днямі пры зямельным аддзеле пачалі працаваць 15-дзённыя курсы старшынь калгасаў. Старшыні калгасаў вывучаюць агратэхніку, арганізацыю працы і інш. Кіраўнікі перадавых калгасаў імя Кірава Максімаўскага сельсавета тав. Ашэйчык, «Прабуджэнне» Востраўскага сельсавета тав. Князік раскажуць старшыням калгасаў, як яны дабіліся высокіх ураджаяў. Зараз на курсах навучаецца 22 чалавекі. Усяго іх закончаць 99 старшынь калгасаў. Хутка пачнуць працаваць аднамесячныя курсы старшых конюхаў.

У Бацэвіцкім сельсавеце працуюць пяцідзённыя курсы звеннявых. На іх навучаецца 30 чалавек. Такія ж курсы пачнуць працаваць ў Каўбчанскім і іншых сельсаветах. Пры сельсаветах арганізоўваюцца таксама дзесяцідзённыя курсы брыгадзіраў. На гэтых курсах будуць навучацца каля 400 звеннявых і 200 брыгадзіраў.

Даход ад ферм

У сельскагаспадарчай арцелі імя Леніна Бацэвіцкага сельсавета тры жывёлагадоўчыя фермы: малочнатаварная, аўцагадоўчая і свінагадоўчая. Жывёлагадоўлі калгас надае вялікае значэнне, бо яна з'яўляецца даходнейшай часткай сельскагаспадарчай вытворчасці. Даход ад ферм у мінулым годзе склаў больш як 56 тысяч рублёў.
9 лютага.

Поспех звяна

Вясной мінулага года калгасніца калгаса «Камунар» Максімаўскага сельсавета Вольга Анісімаўна Кніга арганізавала звяно па льну. У звяно запісалася 8 калгасніц. Добра рыхтаваліся яны да сяўбы. Ільнаводы абавязаліся атрымаць з кожнага гектара 5 цэнтнераў

ільновалакна. Праводзячы ўсе работы ў тэрмін, выконваючы агратэхнічныя мерапрыемствы, звяно выканала свае абавязацельствы і атрымала па 5,2 цэнтнера ільновалакна з гектара. У гэтым годзе калгасніцы імкнуцца дасягнуць ураджайнасці 7 цэнтнераў.

Кніга.

16 лютага.

ВОІНЫ-ЗЕМЛЯКІ, ЯКІЯ ЗАГІНУЛІ Ў САВЕЦКА-ФІНЛЯНДСКУЮ ВАЙНУ 1939—40 гг.

АКЦЯБРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АКЦЯБРСК

КАРДЫМОН Мікалай Ігнатавіч, н. ў 1905, загінуў у 1940.

ВЁСКА ЗАКОРКІ 1-Я

КІРЫНОВІЧ Ілья Антонавіч, н. ў 1918, загінуў у 1939.

ВЁСКА МАСНОЕ

СТРАХ Аляксандр Арцёмавіч, н. ў 1913, загінуў у 1940.

ВЁСКА НОВАЕ СЯЛО

СТРАХ Іван Самуілавіч, н. ў 1913, загінуў у 1940.

ВЁСКА СТАРЫ ВОСТРАЎ

ПАРКАЛАЎ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1918, загінуў 10.1.1940.

БАЦЭВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВУСЦЕ

МАРКАЎ Павел Восіпавіч, сяржант, памёр ад ран 16.2.1940.

ВЁСКА ЗАПОЛЛЕ

САЗАНАВЕЦ Іван Макаравіч, н. ў 1905.
ФІЛОНЧЫК Іларыён Мінавіч, сяржант, загінуў 25.1.1940.

ВЁСКА ЛЮБІЧЫ

ВАРАКСА Рыгор Маркавіч, н. ў 1910, радавы.

ВЁСКА ЛЮЦІНА

АНАНІЧ Васіль Сцяпанавіч, загінуў 12.3.1940.
ГАЛАЦЭВІЧ Уладзімір Андрэевіч, н. ў 1920.

ВЁСКА ОРЛІНА

КОЗЫР Павел Андрэевіч, н. ў 1907, загінуў 12.2.1940.

ВЁСКА ЧЫРВОНЫ БЕРАГ

МАРКАЎ Павел Іосіфавіч, н. ў 1915, загінуў у 1940.

ВЁСКА ЯКІМАВА ЛЯДА

КОЎРЫК Фёдар Максімавіч, н. ў 1910, радавы, загінуў 9.2.1940.

ВІРКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЛЯНЁЎКА

САЎКО Іван Дзям'янавіч, н. ў 1909, радавы, загінуў у 1940.

ВЁСКА МІХАЛОЎ

САМСОНІК Яфім Міхайлавіч, радавы, памёр ад ран 26.2.1940.

ГАНЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАРКІ

АЎТУХОВІЧ Іосіф Трафімавіч, н. ў 1910, радавы, загінуў 13.2.1940.

ВЁСКА ЖЭРДЗІШЧА

АНАНІЧ Уладзімір Сямёнавіч, н. ў 1910, радавы, загінуў у 1939.
ДРЭНЬ Міхаіл Мітрафанавіч, н. ў 1910, радавы, загінуў 11.2.1940.

ВЁСКА ІЖАР

КРОТ Захар Фёдаравіч, н. ў 1900, радавы, загінуў 11.2.1940.
КРОТ Якаў Фёдаравіч, н. ў 1900, радавы, загінуў 11.1.1940.

ВЁСКА МАЛІННЕ

КАМАРОЎСКІ Арцём Ісакавіч, н. ў 1910, радавы, загінуў у 1939.
САСНОЎСКІ Яўціх Дзмітрыевіч, н. ў 1905, радавы, загінуў у 1939.

ВЁСКА ТАЧЫШЧА

ГАНЧАРЫК Пётр Гаўрылавіч, н. ў 1895, радавы, загінуў 6.2.1940.

ДОЎГАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВІШНЁЎКА

КАРАЎКА Пётр Мікалаевіч, н. ў 1912, радавы, загінуў 11.1.1940.

Н. К. Заяц.

Р. І. Жукаў.

Я. М. Самсонік.

Дз. А. Старавойтаў.

ВЁСКА ДОЎГАЕ

ДАЙНЕКА Пётр Міхайлавіч, радавы, загінуў 11.1.1940.
КЛЕПЧА Павел Васілевіч, н. ў 1915, працаваў лесніком, радавы.
МАРОЗ Анатоль Гаўрылавіч, н. ў 1912, радавы, загінуў 10.3.1940.
РОГАЛЬ Пётр Васілевіч, н. ў 1913, радавы, загінуў 20.1.1940.
СТАНКЕВІЧ Браніслаў Рыгоравіч, радавы, загінуў 10.3.1940.

ВЁСКА ЗАГАЦЦЕ

КЛЕПЧА Васіль Аляксеевіч, н. ў 1912, радавы, загінуў 10.3.1940.
КЛЕПЧА Сцяпан Яфрэмавіч, н. ў 1914, радавы, загінуў 8.3.1940.

ВЁСКА ЗАКУПЛЕННЕ

ДЗІТЧАНКА Ціт Ягоравіч, н. ў 1913, радавы, загінуў у 1940.
ЖАЛЕЗНЯКОЎ Іван Канстанцінавіч, н. ў 1914, загінуў у 1940.

ВЁСКА КАЛІЧОНКА

ЦІМАШКОЎ Канстанцін Ніканавіч, н. ў 1916, радавы, загінуў у 1940.
ЦІМАШКОЎ Пётр Нічыпаравіч, н. ў 1914, радавы, загінуў у 1940.

ВЁСКА НОВАЯ СЛАБОДКА

ГАБРЫЛЁЎ Іван Дзмітрыевіч, н. ў 1913, радавы, загінуў 7.3.1940.
ЖУКАЎ Назар Мікалаевіч, н. ў 1920, радавы, загінуў у 1940.
КАСМОЎСКІ Валянцін Міхайлавіч, радавы, загінуў у 1940.

ВЁСКА ЯДРАНАЯ СЛАБАДА

ДАНІЛЁНАК Фёдар Цітавіч, радавы, загінуў 21.1.1940.
СТАРАВОЙТАЎ Дзяніс Антонавіч, н. ў 1900, радавы,

ВЁСКА ЯЛОЎКА

КЛЕПЧА Міхаіл Міхайлавіч, загінуў у 1940.

КАЎБЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПАСЁЛАК КРУШЫННІК

ЕРМАЛОВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1913, загінуў у 1939.

ВЁСКА РЭПІШЧА

МАСЛОЎСКІ Мікалай Васілевіч, н. ў 1911, прапаў без вестак у лютым 1940.

ВЁСКА СТАРЫЯ МАКСІМАВІЧЫ

БЕЛАБАРОДЫ Сцяпан Пятровіч, н. ў 1911, працаваў брыгадзірам у калгасе, радавы, загінуў у 1940.

КЛІЧАЎСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ВЁСКА БЁРДА

ЖУКАЎ Рыгор Іванавіч, н. ў 1914, прапаў без вестак.
МАЕЎСКІ Аляксей Якаўлевіч, н. ў 1912, загінуў у 1939.
СТУКАЛЬСКІ Макар Карпавіч, н. ў 1912.
ЮРКАВЕЦ Іван Еўдакімавіч, н. ў 1910.

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК КЛІЧАЎ

ДАЙНЕКА Павел Васілевіч, н. ў 1915, радавы, загінуў у 1939 на Ладажскім возеры.

ВЁСКА МАРКАЎШЧЫНА

ВЯРШУК Рыгор Паўлавіч, н. ў 1922.

ВЁСКІ ПЕРАСОПНЯ, ВАЕВІЧЫ

АКУЛІЧ Іван Мікалаевіч, загінуў 12.2.1940.

МАЦЮШОНАК Кузьма Захаравіч, н. ў 1912, загінуў у 1939.

ХАРЛАП Антон Навумавіч, н. ў 1904.

ВЁСКА СТАЯЛАВА

РАМАНОВІЧ Васіль Парфенавіч, н. ў 1906, загінуў у 1940.

НЯСЯЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА НЯСЯТА

БАЛТУШКА Іван Антонавіч, н. ў 1903, радавы, загінуў у 1940.

БАЛТУШКА Ціхан Фёдаравіч, н. ў 1914, працаваў загадчыкам гаспадаркі Нясяцкай школы, радавы, прапаў без вестак у лютым 1940.

ВЁСКА ТУРЭЦ

СУКОРА Сцяпан Іванавіч, радавы, прапаў без вестак 11.2.1940.

ПАТОЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АНАТОЛЕЎКА

ЗАЯЦ Нічыпар Кірылавіч, н. ў 1906, загінуў у 1940.

ВЁСКА НАТАЛОЎ

СТРАХ Міхаіл Мікалаевіч.

ВЁСКА СЛАБОДКА

ДРАКА Пётр Мацвеевіч, загінуў у лютым 1940.

АБ ЧЫМ ПІСАЛА РАЁННАЯ ГАЗЕТА «СТАЛІНСКІ ШЛЯХ» У 1941 ГОДЗЕ

ВЕЧАР САМАДЗЕЙНАСЦІ

16 лютага членамі драматычнага гуртка і харавога калектыву раённага дома культуры быў наладжаны вечар самадзейнасці. Драматычны гурток паставіў п'есу «Дырэктар», а харавы калектыў выканаў некалькі народных песень.

Гледачам асабліва спадабалася песня з кінафільма «Истребители», якую выканаў В. Валенда і песня «Дальняя сторожка» ў выкананні Т. Храбанавай. *Палойка. 19 лютага.*

ВЫКАНАН ПЛАН ТАВАРАЗВАРОТУ

Раней Клічаўскае сельпо не выконвала ўстаноўленых планаў тавараабароту. Так, напрыклад, заданне першага квартала мінулага года было выканана толькі на 77 працэнтаў. Затое план трох месяцаў гэтага года сельпо выканала на 101,8 працэнта, прадаўшы насельніцтву тавараў на 793 500 рублёў.

А. Жэбко, памочнік бухгалтара сельпо. *20 красавіка.*

МЕЛІЯРАЦЫЙНЫЯ РАБОТЫ Ў КАЛГАСЕ

Актыўна працуюць на меліярацыйных работах калгаснікі калгаса «Іскра» Кабылянскага сельсавета. На балоце капаюць магістральны канал, праводзяць расцярабленне хмызняку і драбналесся. Магістральны канал капаецца ад ракі Нясята і будзе праходзіць па забалочаных землях калгасаў «Іскра» і «Кастрычнік». Пракапана ўжо 250 метраў.

Асабліва добра працуюць на будаўніцтве канала калгаснікі Скрыпка Міна, Скрыпка Пётр, Данільчык Міхаіл, якія пры норме 2,5 кубаметра выкопваюць па 12. Па 7 кубаметраў выкопваюць калгасніцы Тоня Шахно, Таня Жукоўская, Лена Якшонак, Соня Скрыпка.

Добра арганізаваў кіраўніцтва брыгадзір Скрыпка М. Уласным прыкладам тав. Скрыпка натхняе калгаснікаў на ўзорную работу. Норму штодзённа ён перавыконвае ў 5 разоў. *І. Мычка. 22 чэрвеня.*

НА АБАРОНУ РАДЗІМЫ

Гневам і абурэннем сустрэў наш народ вестку аб вераломных дзеяннях германскага фашызму. Мы — мірныя людзі, але да абароны заўсёды гатовы. І зараз я станаўлюся на ахову сваёй Радзімы. Гітлераўскія ваякі хутка адчуюць магутнасць і адзінства нашага народа. Ворагу мы спуску не дадзім.

Ідучы ў рады Чырвонай Арміі, я абавязуюся быць да канца адданым свайму народу, сваёй Радзіме. Буду да апошняй кроплі крыві змагацца з ворагам.

Усе, як адзін, станем на абарону сваёй Айчыны.

Паддубскі Васіль. 24 чэрвеня.

У ПОЛЫМІ ВАЙНЫ

Пад чэрвеньскім сонцам, радуючы вока і сэрца хлебароба, каласавала збажына. У ціхай дрымоце стаяла Усакінская пушча. І хто мог падумаць, што гэта квітнеючае раздолле хутка стане арэнай бязлітаснай барацьбы з іншаземнымі акупантамі. Ужо ў самым пачатку ліпеня над Клічаўскім краем апусцілася цёмная ноч акупацыі, а ў хуткім часе ён, гэты край, ператварыўся ў партызанскі. Вось як гэта было...

Партызанскі край

Пад канец чэрвеня 1941 г. баі на заходнім напрамку пачалі перамяшчацца да р. Бярэзіны. У паласу фронту паміж гарадамі Беразіно і Бабруйск вораг кінуў 4 корпусы, у т. л. 46-ы і 24-ы матарызаваныя, 7-ы і 12-ы армейскія. З нашага боку гэтым сілам процістаялі адыходзячыя ад Слоніма і станцыі Лясной абяскроўленыя 3 стралковыя дывізіі (121-я, 155-я і 143-я), 20-ы механізаваны корпус, разрозненыя падраздзяленні і групы воінаў, якія выходзілі на гэтым участку фронту з варожага тылу, а таксама падраздзяленні Бабруйскага аўтатранспартнага ваеннага вучылішча. 20-ы механізаваны корпус фарміраваўся за месяц да пачатку вайны ў Мінску, меў крыху больш за 3 тысячы чалавек, мабілізаваных з запасу, каля 40 танкаў старога ўзору, артылерыю і мінамёты. Ён паспеў пабываць у баях пад Мінскам, але ў аператыўна-тактычных адносінах вялікага значэння не меў. Акрамя таго, уздоўж заходняй граніцы Клічаўскага раёна на беразе Бярэзіны разгортваліся спешна перакінутыя туды войскі 7-й і 8-й парашутна-дэсантных брыгад 4-га корпуса паветрана-дэсантных войск.

Не сустракаючы сур'ёзнага супраціўлення, механізаваныя войскі праціўніка нястрымна ішлі ўперад. Іх падганялі нецярплівыя загады генерал-фельдмаршала Бока, якія патрабавалі хутчэйшага выхаду да водных рубяжоў Дняпра і Заходняй Дзвіны. Для захопу мастоў і пераправ перад сваімі наступаючымі войскамі Гудэрыяну і Готу прадпісвалася стварыць перадавыя танкавыя атрады.

Амаль адначасова савецкія войскі Заходняга фронту атрымалі дырэктыву арганізаваць у часцях і злучэннях рухомыя атрады для барацьбы з нямецкімі танкамі, якія прарывалі абарону. Такі спосаб паспяхова выкарыстоўваўся палкамі 172-й і 187-й стралковых дывізій, якія ў пачатку ліпеня сканцэнтраваліся на дняпроўскім рубяжы ў раёне Магілёва і Быхава. Адсюль іх рухомыя атрады дзейнічалі ўздоўж шашы, патрулявалі дарогі і буйныя масты. Да падыходу галоўных сіл праціўніка яны паспяхова змагаліся з яго перадавымі атрадамі і разведкай, якія прарываліся ў міжрэчча Друці і Дняпра.

З ліпеня нашы войскі атрымалі загад камандуючага Заходняга фронту маршала С. К. Цімашэнкі адысці на ўсходні бераг Друці. Клічаўскі раён апынуўся ў тыле ворага. У адміністрацыйных адносінах ён быў уключаны акупантамі ў тылавы раён групы армій «Цэнтр». Тут усё належала ваенным уладам. Паліцэйская ахова гэтых тэрыторый перадавалася ведамству рэйхсфюрэра Гімлера. Як і ўсюды, акупанты ўстанавілі тут рэжым крывавага тэрору, насілля і рабаў-

ніцтва. Новыя гаспадары падзялілі тэрыторыю Клічаўскага раёна і далучылі яе па частках да Бабруйскага і Асіповіцкага раёнаў. Усю дзяржаўную і калгасна-кааператыўную ўласнасць акупацыйная адміністрацыя аб'явіла ўласнасцю нямецкай дзяржавы. Для яе аховы і бяспекі транспартных перавозак у буйных населеных пунктах, каля дарог і ваенна-прамысловых аб'ектаў былі створаны гарнізоны, а яшчэ ў 19 вёсках — паліцэйскія ўчасткі і валасныя ўправы.

У самым пачатку акупацыі нямецкая ваенная камендатура выдала загад, каб усе людзі вярнуліся на свае рабочыя месцы. Асабліва гэта датычылася сельскіх жыхароў. Немцы імкнуліся як мага хутчэй сабраць ураджай, вывезці ў Германію жывёлу, збожжа, інвентар. Рабаванне мясцовых багацяў прымала ўсё большы размах. Напачатку былі ўстаноўлены грашовыя падаткі, а потым падаткам абкладалася кожная жывёліна, нават сабакі. Ужо ў першыя месяцы гаспадарання акупантаў сяляне аказаліся неплацежаздольнымі. Тады захопнікі пачалі забіраць кароў, пакідаючы адну на некалькі сем'яў. Пры гэтым жорстка караліся любыя непадпарадкаванні ўладам і іх паслугачам. З асаблівай лютасцю распраўляліся фашысты з партыйна-савецкімі работнікамі, актывістамі і іх сем'ямі, грамадзянамі яўрэйскага паходжання.

Людзі ўцякалі ў лясы і там хаваліся. Акупацыйныя ўлады стваралі карныя атрады, якія прачэсвалі навакольныя лясы і балоты: каго знаходзілі — расстрэльвалі на месцы. А каб апраўдаць свае злачынствы, такіх уцекачоў аб'яўлялі бандытамі. Для запалохвання насельніцтва злоўленых уцекачоў прыводзілі ў вёскі і арганізоўвалі паказальныя пакаранні. Так, зімой быў закатаваны Фёдар Іванавіч Ананіч з вёскі Люціна. Параненага і змучанага яго ў трыццацішадусны мароз вадзілі па Клічаве ў ніжняй бялізне і босага. Гэта працэсія спынялася на кожнай вуліцы: паўжывога чалавека білі палкамі, калолі, аблівалі вадой і вялі далей. Перад смерцю ён знайшоў сілы кінуць сваім палачам: «Паміраю за сваю сям'ю, родных, за ўвесь савецкі народ. А вам, палачам, адпомсцяць мае таварышы». Гэтыя словы спраўдзіліся: праз тыдзень партызаны разбілі нямецкі гарнізон у вёсцы Усохі.

Асабліва пакутавалі сем'і партызан. Былі арыштаваны М. І. Заяц, У. М. Бай, А. І. Вінаградава, А. Ачыновіч, В. А. Шчэпетаў, Я. П. Сямак, сем'і Вікторчыка, Белакурскіх і многія іншыя. 15 верасня ў некалькіх вёсках было расстраляна 150 грамадзян, спалены дамы партызанскіх сем'яў, а 14 кастрычніка 1941 г. расстраляна 500 чалавек яўрэйскага паходжання.

Чаша народнага цярпення і гневу была перапоўнена. Людзі ішлі ў лясы і там аб'ядноўваліся для барацьбы з захопнікамі. Партызаны заявілі аб сабе неўзабаве пасля акупацыі раёна. Ужо ў сярэдзіне ліпеня 1941 г. на аэрадроме і на палігоне адбыліся 2 узрывы. Іх зрабілі мясцовы клічаўскі атрад і атрад воінаў на чале з батальённым камісарам Горушкіным. У хуткім часе ва Усакінскім лесе з'явіўся атрад «Макара», у Віркаўскім лесе — падраздзяленне на чале з афіцэрам 121-й стралковай дывізіі (прозвішча не ўстаноўлена) і інш. Атрад «Макара» быў створаны з воінаў 628-га артпалка 161-й стралковай дывізіі. Ва ўзаемадзеянні з батальёнам 100-й стралковай дывізіі гэты полк вёў абарончыя баі ў раёне Астрашыцкага Гарадка, пад Мінскам. Але ў няроўных баях ён меў вялікія страты



Нямецка-паліцэйскі гарнізон у г. п. Клічаў.

і быў акружаны. На чале з камандзірам часці палкоўнікам А. М. Лапшыным група байцоў вырвалася з акружэння, прайшла па тылах ворага да Усакінскіх лясоў і тут разгарнула актыўныя партызанскія дзеянні. Пад восень атрад пайшоў на ўсход, далейшы яго лёс невядомы.

Актыўныя і выніковыя дзеянні на тылавых аб'ектах праціўніка праводзіў атрад Горушкіна (магчыма псеўданім), створаны ў пачатку ліпеня 1941 г. з афіцэраў штаба 17-й стралковай дывізіі, якія не змаглі выйсці з акружэння. Атрад узарваў на палігоне склады з боепрыпасамі, метадам засад знішчаў на бальшаках і прасёлках аўтатранспарт, баявую тэхніку і матэрыяльныя сродкі праціўніка. У жніўні ён разбіў буйны атрад фуражыраў, якія рабавалі калгаснае дабро: забіты 73 нямецкія салдаты, 5 узяты ў палон, захоплены коні з павозкамі, спалены аўтамашыны. Гэты атрад дзейнічаў у Клічаўскім і Кіраўскім раёнах. У сярэдзіне жніўня 1941 г. каля в. Чыгірынка ў сутычцы з карнікамі Горушкін загінуў, атрад асобнымі групамі выйшаў на левабярэжжа Дняпра. Нейкі час групы дзейнічалі самастойна, а пазней уліліся ў іншыя атрады.

У арганізацыю супраціўлення акупантам сваю долю ўнеслі воіны каманды мясцовага артпалігона. За 10 км ад в. Замачулле яны трапілі ў акружэнне і вялі баі на працягу некалькіх дзён. А калі выйшлі з акружэння, воіны працягвалі барацьбу з акупантамі партызанскімі метадамі. У кастрычніку каманда зноў трапіла ў акружэнне. Многія байцы загінулі.

Актыўна дзейнічала група воінаў 121-й стралковай дывізіі, якая адыходзіла з-пад Слоніма і ў сярэдзіне ліпеня яна дасягнула Клічаўскага раёна. Воінам дывізіі не ўдалося вырвацца з варожага тылу, яны перайшлі да партызанскіх дзеянняў: нападалі на невялікія групы нямецкіх салдат у міжрэччы Бярэзіны і Друці. У верасні 1941 г. ў баях з карнікамі яна была разбіта, камандзір і большасць байцоў загінулі, 7 байцоў захоплены ў палон і пакараны на плошчы ў мяст. Студзенка Быхаўскага раёна.

У канцы лета і восенню ў Клічаўскія лясы выйшлі невялікія групы ваеннаслужачых і адзіночныя байцы. Яны імкнуліся вырвацца з акружэння, але пасля няўдалых спроб заставаліся ў мясцовых лясах. Так, каля ст. Мілое атабарылася група, якую ўзначальваў Р. К. Паўлаў, у Віркаўскіх лясах — група на чале са ст. лейтэнантам Р. М. Колбневым і батальённым камісарам Міхайлавым, ва Усакінскім сельсавеце — група ст. лейтэнанта Барадзіна (Бондара) і палітрука Тайчара з 277-га танкавага палка (выйшла сюды з-пад Ваўкавыска). У кастрычніку сюды прыйшоў са Жлобінскага раёна атрад капітана Каленчанкі, які складаўся з воінаў 29-й матарызаванай дывізіі, што ў выніку баёў каля Зэльвы адсталі ад асноўных сіл. У Клічаўскім раёне атрад аб'яднаўся з групай байцоў, што на чале са ст. лейтэнантам Рвачовым прыйшла сюды з-пад Навагрудка. Атрад зімаваў у лесе, праводзіў баявыя аперацыі на шашы Бабруйск — Быхаў.

Асноўным атрадам, які адыграў выключную ролю ў развіцці народнай барацьбы супраць акупантаў у раёне, стаў мясцовы Клічаўскі атрад (пазней 277-ы), утвораны з партыйна-савецкага актыву і патрыётаў раёна.

Напярэдадні акупацыі раёна 3 ліпеня 1941 г., калі прарыў нямецкіх войск стаў відавочным і нашы войскі па загадзе С. К. Цімашэнкі пачалі адыход на левы бераг Бярэзіны, Клічаўскі райком КП(б)Б сабраўся на сваё апошняе пасяджэнне. На ім было сфарміравана 5 груп з партыйных і савецкіх работнікаў, што павінны былі стаць арганізуючым ядром партызанскага руху і падпольнай барацьбы ў раёне. Гэту задачу выканала група, у якую ўваходзілі Я. І. Заяц, П. М. Вікторчык, Я. К. Вітоль. Група наладзіла сувязь з камуністамі, што засталіся на тэрыторыі раёна, і 14 ліпеня правялі адкрыты сход патрыётаў і ваеннаслужачых, на якім ішла размова пра арганізацыю падпольнай барацьбы супраць акупантаў. Паколькі райком КП(б)Б не застаўся ў тыле ворага, для кіраўніцтва раённай партарганізацыяй было ўтворана бюро, сакратаром выбралі былога загадчыка аддзела прапаганды райкома партыі Я. І. Зайца. Па яго прапанове быў створаны партызанскі атрад, які аб'яднаў камуністаў, мясцовых патрыётаў і групу ваеннаслужачых. Камандзірам атрада выбралі ст. лейтэнанта Бародзіна, камісарам — Тайчара; начальнікам штаба — былога дырэктара школы І. З. Ізоха. Атрад называўся Клічаўскім, а вясной 1942 г. яму прысвоены нумар 277-ы. Напачатку ў атрадзе было 30 чалавек. Асноўнай базай яго размяшчэння стала ўрочышча Розвань.

Адразу пасля арганізацыі атрада партызаны разбілі грузавую аўтамашыну ў Клічаве і 2 машыны на дарогах. Потым атрад зрабіў налёт на клічаўскі аэрадром (спалена 45 т бензіну). У пачатку жніўня партызаны праніклі ў Клічаў, дзе ў баі забілі і параніл 9 нямецкіх салдат;

знішчылі 3 легкавыя аўтамабілі. 25 жніўня яны зноў напалі на Клічаўскі гарнізон, спалілі склад, дзе знаходзілася да 45 т мукі і круп, 25 т бензіну.

У данясенні нямецкага каменданта капітана Котлера паведамлялася: «У зоне Клічава, Бацэвіч, Чыгірынкі і сумежных з імі раёнах дзейнічае па меншай меры 32 партызанскія атрады і групы. За другую палову жніўня і першыя дні верасня зарэгістравана 186 выпадкаў забойства нашых афіцэраў, чыноўнікаў і салдат. Акрамя таго, у баях з партызанскімі атрадамі забіта і паранена 217 салдат і афіцэраў. Падпалы матэрыяльных і харчовых складоў не спыняюцца. За апошнія дні былі тры вялікія пажары ў Клічаве і Бацэвічах. Насельніцтва ўтойвае месцы знаходжання партызанскіх атрадаў». Так у Клічаўскім раёне распачыналася барацьба партызан супраць захопнікаў.

Сваімі дзеяннямі партызаны раёна штодзённа скоўвалі рух транспарту праціўніка на аўтадарогах, перашкаджалі гітлераўцам вывозіць ураджай і жывёлу, нападалі на склады, пры магчымасці раздавалі дабро мясцовым жыхарам, а склады спальвалі. Акупацыйныя ўлады пачалі ствараць дадатковыя сілы для аховы нарабаванай маёмасці. Але мясцовых добраахвотнікаў было няшмат. Давялося сілай рэкрутаваць ў паліцыю мясцовую моладзь. Такім чынам у Клічаўскім раёне акупантам да канца года ўдалося стварыць раённую і сельскія ўправы, сетку паліцэйскіх участкаў.

Але партызанская барацьба разгортвалася. У канцы кастрычніка 1941 г. Клічаўскі атрад (яго ўжо ўзначалілі Ізох і Заяц) перайшоў у в. Бёрда і застаўся тут зімаваць. Адсюль ён нападаў на паліцэйскія ўчасткі і сельскія ўправы. Насельніцтва ўсё больш актыўна ўключалася ў барацьбу з акупантамі. Да новага года ў Клічаўскі атрад ўлілося больш за 100 чалавек, а групы М. Ф. Спяранскага, В. М. Сырцова перараслі ў атрады.

Узмоцненыя атрады зімой актывізавалі барацьбу з паліцыяй, нямецкай адміністрацыяй і невялікімі воінскімі гарнізонамі. Напрыклад, у снежні 1941 г. Клічаўскі атрад разбіў паліцэйскія ўчасткі ў вёсках Татарка, Асавы, Бацэвічы, у мяст. Свіслач, разагнаў ахову і спаліў шклозавод «Кастрычнік», раззброіў паліцыю ў в. Убалацце. Пры разгроме гарнізона ў в. Гонча атрад захапіў 27 вінтовак, а ў в. Усохі 14.1.1942 г. ліквідаваў нямецка-паліцэйскі гарнізон. Вялікія страты ворагу былі прычынены ў баі з карным атрадам каля в. Зарэчча 23.2.1942 г. і ў выніку засады на дарозе каля в. Усохі. Каля в. Вусце партызаны зрабілі новую засаду, у выніку праціўнік меў значныя страты, у т. л. быў забіты гарадскі галава, партызанам дасталося 18 вінтовак, аўтамат, кулямёт, пісталеты. Бой з невялікім атрадам ворага адбыўся каля в. Дуброва. Калі 15.3.1942 г. непадалёку ад в. Віркаў зрабіў вымушаную пасадку нямецкі бамбардзіроўшчык «Юнкерс-88», партызаны Клічаўскага атрада знішчылі ахову і спалілі самалёт.

Партызанскія атрады наладжвалі паміж сабой сувязь, аб'ядноўвалі сілы для сумеснай барацьбы. Да сярэдзіны сакавіка агульнымі намаганнямі яны ачысцілі ад валасных управаў і паліцэйскіх участкаў тэрыторыю Клічаўскага раёна і значную частку Бярэзінскага, Бялыніцкага, а таксама 4 сельсаветы Асіповіцкага раёнаў. Да гэтага часу яны ліквідавалі больш за 80 гарнізонаў, паліцэйскіх участкаў і ўпраў, у т. л. ў вёсках Паплавы, Гонча, Убалацце, Бёрда, Ваевічы, Канстантоў, Смалярня Вялікая, Малая Дзмітраўка, Драні, Суша і інш.

Вораг пакуль яшчэ трымаў райцэнтр Клічаў, хоць практычна быў адрэзаны і пазбаўлены падтрымкі. Шматлікія спробы акупантаў разблакіраваць гарнізон не мелі поспеху. Клічаўскі гарнізон заставаўся апошнім сховішчам акупацыйнай адміністрацыі ў раёне. Тут былі сканцэнтраваны буйныя сілы нямецкіх салдат і паліцэйскіх, што ўцяклі з разгромленых партызанамі гарнізонаў і ўчасткаў. У сярэдзіне сакавіка з Палесся ў зону прыбыў атрад палітрука В. І. Лівенцава і Дз. А. Ляпёшкіна, што значна павялічыла сілы партызан. 19.3.1942 г. на нарадзе ў в. Канстантоў сабраліся камандзіры і камісары клічаўскіх партызанскіх атрадаў А. С. Юркаўцава, В. І. Лівенцава, В. М. Сырцова, В. П. Свістунова і прынялі рашэнне разбіць Клічаўскі гарнізон, вызначыўшы час і парадак дзеянняў. Раніцай наступнага дня партызаны з трох бакоў атакавалі гарнізон і разгромілі яго (пра гэты бой гл. асобны артыкул).

З падзеннем Клічаўскага гарнізона закончыўся працэс ачышчэння тэрыторыі раёна ад акупантаў. На вызваленай ад ворага зямлі ўтварылася партызанская зона, а сам Клічаўскі раён стаў набываць значэнне цэнтра кіраўніцтва партызанскім рухам у гэтай зоне. Праціўнік быў дэмаралізаваны і некалькі тыдняў не паказваўся ў раёне.

Тым часам сілы партызан памнажаліся. 31.3.1942 г. ў раён прыбыў 208-ы атрад імя Сталіна на чале з палкоўнікам У. І. Нічыпаровічам, былым камандзірам 208-й матарызаванай дывізіі, разбітай у прыграничных баях. Атрад быў створаны 31.12.1941 г. ў Рудзенскім раёне ў выніку зліцця дробных атрадаў сакратара Рудзенскага падпольнага райкома М. П. Пакроўскага, ст. лейтэнанта А. Дз. Сяргеева і групы камсаставу, што прыбыла з Мінска, на чале з Нічыпаровічам. Атрад аб'ядноўваў 151 чалавека. 18.1.1942 г. ў яго ўліўся невялікі атрад Дз. І. Самсонава. Ён хутка рос і вылучаўся высокай баяздольнасцю. Напачатку савецкія воіны не мелі намеру затрымлівацца ў тыле ворага, рыхтаваліся да выхаду за лінію фронту. З баямі яны дайшлі да клічаўскіх лясоў. Але далейшаму руху наперад у гэтых забалочаных краях перашкаджала веснавая бездараж. 2 красавіка яны спыніліся ў лесе паблізу в. Дуброва і ўстанавілі сувязь з мясцовымі партызанскімі атрадамі і кіраўніцтвам Клічаўскага раёна.

З красавіка 1942 г. ў в. Усакіна адбыўся сход камандзіраў, камісараў атрадаў і камуністаў раёна. На сход былі запрошаны прадстаўнікі суседніх раёнаў, каб вызначыць, як арганізаваць жыццё насельніцтва і баявую дзейнасць партызан. У вызваленым раёне была адноўлена савецкая ўлада, створаны раённы і сельскія выканаўчыя камітэты дэпутатаў працоўных. Райком партыі ўзначаліў Я. І. Заяц, а райвыканком — П. М. Вікторчык. У вёсках і пасёлках аднаўлялася гаспадарчае жыццё: карэннае насельніцтва і бежанцы атрымалі зямельныя надзелы з правам выкарыстання для асабістых патрэб.

Адбыліся змены і ў арганізацыі партызанскіх сіл: 5 асобных атрадаў, што базіраваліся на тэрыторыі раёна, загадам камандзіра 208-га атрада Нічыпаровіча ад 3.4.1942 г. аб'яднаны аператыўным кіраўніцтвам. Атрады атрымалі нумарныя абазначэнні: Клічаўскі — 277-ы, Лівенцава — 752-і, Сырцова — 620-ы, Свістунова — 128-ы, Колбнева — 760-ы; 208-ы атрад увайшоў у склад Клічаўскага злучэння як галаўное падраздзяленне, яго камандаванне і штаб узялі на сябе функцыі кіравання партызанскім злучэннем. У ліпені 1942 г. дзейнасць злучэння санкцыяніраваў Ваенны савет Заходняга фронту. 2.9.1942 г. загадам начальніка ЦШПР П. К. Панамарэнкі орган кіравання злучэннем быў пераўтвораны ў Клічаўскі аператыўны цэнтр. Назва органа кіравання ў хуткім часе пашырылася на ўсё злучэнне. На 10.5.1942 г. Клічаўскае злучэнне налічвала больш за 900 партызан. Камандавалі Клічаўскім аператыўным цэнтрам У. І. Нічыпаровіч (красавік — верасень 1942 г.) і П. В. Яхантаў (верасень 1942 г.— красавік 1943 г.).

Самым вялікім па колькасці і баявым складзе (больш за 450 байцоў) быў 208-ы атрад. Атрадная арганізацыя будавалася на ўзор рэгулярных войск: аддзяленне, узвод, рота. Атрад меў штаб з 4 аддзяленнямі, 3 стралковыя роты, батарэю 76-мм гармат, мінамётны ўзвод, узвод сувязі, узвод разведкі, санчасць, гаспадарчы ўзвод, пякарню. Узначальвалі іх кадравыя афіцэры. У атрадзе выдаваўся часопіс «Народный мститель», выпускаліся баявыя лісткі.

Другім па колькасці партызан быў 277-ы атрад (210 чалавек), амаль цалкам складаўся з цывільных асоб. Ён з'яўляўся галоўным атрадам Клічаўскага раёна, яго асабовы састаў меў вопыт партызанскай барацьбы, быў добра загартаваны ў баях. Яму належала асноўная роля

Група камандзіра саставу 208-га атрада імя Сталіна. Злева направа: П. С. Самсончык, М. І. Якушаў, Я. М. Бяспоясаў, Ц. К. Крук, М. П. Ратушнаў, П. В. Яхантаў, К. А. Арцюшын, Р. І. Шчарбакоў, В. М. Бурцаў, І. Б. Рутман. Май, 1942.

ў ачышчэнні тэрыторыі раёна ад фашысцкіх захопнікаў. На рахунку партызан было шмат значных баёў, у т. л. каля вёсак Усохі, Вусце, Асавы, у г. п. Клічаве і інш.

Раней атрады часта мянялі свае месцы дыслакацыі, але цяпер, у адпаведнасці з загадам камандавання Клічаўскага злучэння ад 11.4.1942 г. яны базіраваліся на тэрыторыі замацаваных за імі сельсаветаў: 208-ы — Усакіна, Доўгае, Дубно, Ядраная Слабада; 620-ы і 720-ы — Коўбча, Максімавічы, Кабылянка, Стары і Новы Востраў; 752-і і 128-ы — Клічаў, Дзмітраўка, Уладзіміраўка, Нясята, Гонча, Ваевічы; 277-ы — Усохі, Бацэвічы, Заполле, Віркаў.

Акрамя таго, Клічаўскаму аператыўнаму цэнтру падпарадкоўваліся і іншыя атрады, у т. л. спецатрады Клічаўскі (278-ы) і Кіраўскі (538-ы), якія знаходзіліся ў прамым падпарадкаванні камандзіра злучэння, але непасрэднае кіраўніцтва імі ажыццяўлялі сакратары райкомаў. Спецатрады пры неабходнасці таксама ўдзельнічалі ў баявых аперацыях партызан.

Характарызуючы стан партызанскага руху ў тыле ворага, палкоўнікі Нічыпаровіч і Якаўлеў у данясеннях Ваеннаму савету Заходняга фронту пісалі, што са студзеня па ліпень 1942 г. партызанскія атрады кантралявалі Клічаўскі, уключаючы г. п. Клічаў, Бярэзінскі, Бабруйскі, Асіповіцкі (акрамя райцэнтраў) раёны.

Дзеянні партызан выклікалі трывогу ў акупантаў, і яны рыхтаваліся да рэваншу. Пасля двухтыднёвага зацішша першы карны атрад прарваўся ў раён 6 красавіка. Праціўнік пранік у в. Развадава, дзе яго сустрэлі (няпоўным саставам) 208-ы, 277-ы, 128-ы, 760-ы і 620-ы атрады. Бой быў зацяжны і цяжкі (гл. арт. Развадаўскі бой). У маі — чэрвені набегі карнікаў пачасціліся. Выкарыстоўваючы аўтатранспарт, танкі, яны праводзілі рэпрэсіі супраць цывільнага насельніцтва. Так, 6, 9 і 11 мая акупанты прарваліся ў раён вёсак Развадава, Суша і Усакіна. Але партызанскія атрады 208-ы, 277-ы, 152-і разгромілі іх. Толькі з дапамогай авіяцыі, якая дзейнічала з Быхаўскага аэрадрома, карнікам удалося спаліць з паветра вёскі Развадава, Сушу, Усакіна, Падгор'е.

Пад аховай партызан сяляне праводзілі палявыя работы. У вёсках, дзе насельніцтва не мела зброі, былі створаны групы апавяшчэння, якія неслі вартавую службу і пры з'яўленні ворага папярэджвалі аднавяскоўцаў, каб тыя маглі схавацца ў дамоўленых месцах. Так, 16.6.1942 г. з боку мяст. Свіслач пачаў свой рух нямецкі атрад. На подступах да вёсак Арэхаўка і Асінаўка групы мясцовай самаабароны пачалі абстрэл калоны, даючы магчымасць насельніцтву схавацца. Праўда, ворагу ўдалося спаліць вёскі, захапіўшы жывёлу і сялянскія набыткі. Але на зваротным шляху карнікаў перахапілі партызаны і разгромілі іх, а жывёлу і маёмасць вярнулі насельніцтву.

У канцы мая праціўнік з Чычэвіцкага гарнізона на аўтамашынах з гарматамі пранік у Клічаўскі раён і акружыў вёскі Падстружжа, Бабоўку, Доўгае, Церахаў Бор і інш. 500 чалавек з гэтых вёсак былі сагнаны ў в. Доўгае. Гітлераўцы разлічвалі адабраць з іх працаздольных для работы ў Германіі і для службы ў паліцыі, а з астатнімі расправіцца. Але за адзін дзень гэта зрабіць не паспелі і, пакінуўшы для аховы каля роты салдат і паліцэйскіх, паехалі ў гарнізон. Арганізаваная Нічыпаровічам баявая група на світанні наступнага дня разграміла ахову, не выпусціўшы жывым ніводнага гітлераўца. Выратаваныя людзі з усёй маёмасцю былі выведзены ў бяспечнае месца і схаваны ў лясах.

Летам пранікненне карных атрадаў у партызанскую зону актывізавалася. Яны рабавалі насельніцтва, забіралі жывёлу, расстрэльвалі людзей. Партызаны, якіх на 26 чэрвеня было 1241 чалавек, пачалі пераходзіць ад пасіўнай абарончай тактыкі да наступальных дзеянняў. Тактыка скоўвання праціўніка ў яго ж гарнізонах аказалася даволі эфектыўнай. І партызаны больш актыўна пачалі разбураць дарогі, блакіраваць гарнізоны, рабіць засады, узрываць масты, учыняць дывэрсіі на чыгунках. Так, 2.5.1942 г. дывэрсійная група з 277-га атрада, што базіраваўся ў раёне в. Бацэвічы, замініравала чыгунку ў раёне ст. Ясень і Татарка. Воінскі эшалон з жывой сілай і тэхнікай, які ішоў у напрамку Жлобіна, пацярпеў крушэнне: 4 вагоны з салдатамі былі разбіты. Праз 3 дні тут жа група падрыўнікоў на чале з В. А. Сіліным узарвала другі эшалон, які ішоў на фронт з салдатамі і тэхнікай; згарэла 11 вагонаў.

6 чэрвеня рота ст. лейтэнанта Анцюха з 277-га атрада, што блакіравала шашу Быхаў — Магілёў, зрабіла каля в. Кабылянка засаду, у якую трапіла нямецкая аўтакалона з лётным саставам і харчам; у баі забіта 47 салдат і афіцэраў, спалены аўтамабіль, узяты 32 адзінкі стралковай зброі, патроны і іншая маёмасць.

У той жа дзень 2-я рота з засады на шашы Бабруйск — Магілёў спаліла 3 аўтамашыны, захапіла 38 адзінак зброі.

Новая тактыка партызан прымусіла праціўніка расцягваць свае сілы ўздоўж транспартных камунікацый і прыкоўвала іх да аб'ектаў аховы. Разбурэнні дарог і засады пазбавілі акупантаў манеўранасці, здольнасці хутка перакідваць карныя атрады ў месцы канцэнтравання партызан. Рух аўтатранспарту на шашы Беразіно — Магілёў і Магілёў — Бабруйск рэзка зменшыўся, а самі дарогі сталі называцца партызанскімі. Акрамя таго, клічаўскія атрады стваралі напружанасць з перавозкамі ваенных грузаў на важнейшых аўтамабільных і чыгуначных артэрыях гітлераўскай арміі ў радыусе Барысаў, Бабруйск, Рагачоў.

Летам 1942 г. была ўстаноўлена радыёсувязь партызан з Вялікай зямлёй. 16 чэрвеня 1-я рота лейтэнанта Рыжковіча з 277-га атрада, вяртаючыся з баявога задання, у в. Стары Спор сустрэлася з дыверсійна-разведвальнай групай лейтэнанта Самойлава, закінутай сюды штабам Заходняга фронту. Дэсантнікі мелі радыёстанцыю і па просьбе партызан паведамілі пра іх у штаб фронту, а таксама пра тое, што ў зоне знаходзіцца былы камандзір 208-й матарызаванай дывізіі палкоўнік Нічыпаровіч. Радыёграма трапіла камандуючаму фронтам Г. К. Жукаву, які добра ведаў Нічыпаровіча па даваеннай службе ў Мінску (Жукаў тады камандаваў дывізіяй, а Нічыпаровіч — палком). Жукаў запатрабаваў неадкладна адшукаць Нічыпаровіча для асабістых перагавораў і, калі радыёсувязь была ўстаноўлена, спытаў: «Што ты там робіш, Нічыпаровіч?» — «Ваюю з немцамі, збіраюся выходзіць у савецкі тыл, шмат параненых байцоў». Жукаў абяцаў прыслаць самалёт за параненымі, падкінуць зброі, боепрыпасаў і загадаў выходзіць у напрамку на Рослаўль.

Гэтым жа летам у партызанскай зоне пачаў дзейнічаць партызанскі аэрадром. А ў канцы чэрвеня вораг распачаў карную аперацыю «Хрушч-1» (больш падрабязна пра яе гл. ў артыкуле Карныя аперацыі).

Да пачатку аперацыі партызан было 2143 чалавекі, аб'яднаных у атрады 208-ы, 277-ы, 620-ы, 152-і, 760-ы, 537-ы, 128-ы, 752-і, клічаўскі спецатрад 278-ы. Партызаны мелі 147 кулямётаў, 78 аўтаматаў, каля 2 тыс. вінтовак, 8 гаўбічных і процітанкавых гармат, 17 мінамётаў, каля 350 пісталетаў і рэвальвераў, 350 тысяч патронаў. Найбольшымі і баяздольнымі атрадамі ў гэтай групоўцы па-ранейшаму былі 208-ы і 277-ы. Яны налічвалі адпаведна 645 і 422 партызаны. Першы складаўся з трох стралковых рот, артбатарэі, мінамётнага ўзвода, на ўзбраенні, акрамя вінтовак, меў 43 ручныя, 9 станковых кулямётаў, 14 мінамётаў, 4 гарматы.

30 чэрвеня карнікі, заблакіраваўшы дарогі, пачалі пранікаць у партызанскую зону. Першыя сутычкі і баі партызан з карнікамі адбыліся каля вёсак Гарадзец, Заполле, Вялікая Старына, Рудня, а таксама на дарозе паміж Усохамі і Кострыцкай Слабадой. Затым батальён гітлераўцаў «Бярэзіна» заняў в. Стары Спор. Раніцай наступнага дня галоўныя сілы праціўніка выйшлі ў напрамку в. Перасопня, а іх штаб з 1-й ротай застаўся на месцы. Партызаны 277-га, 152-га і 537-га атрадаў акружылі в. Стары Спор, знішчылі амаль усю роту і штабное падраздзяленне.

У баях з партызанамі батальён «Бярэзіна» меў вялікія страты, стаў зусім небаяздольным і быў выведзены з аперацыі. Замест яго быў уведзены другі батальён гітлераўскіх паслугачоў «Дняпро», які меў задачу дзейнічаць у напрамку вёсак Гарадзец, Перасопня і Суша, пранікнуць у цэнтр партызанскай зоны і стварыць апорны пункт у г. п. Клічаве. Баявыя парадкі ён фарміраваў сканцэнтраванымі сіламі, нацэленымі на ўчастку партызанскай абароны ў раёне вёсак Заполле, Зарэчча, Макаўе і інш. Каля вёсак Бацэвічы і Ваевічы акупанты правялі тры буйныя баі (9, 14, 18 ліпеня).

Ішлі апошнія баі карнай аперацыі «Хрушч-1». Праціўнік нёс вялікія страты, але поспеху не дамогся. 19 ліпеня каля гадзіны ночы на Клічаўскім аэрадроме прызямліўся самалёт з прадстаўнікамі Штаба партызанскага руху Заходняга фронту [капітан М. С. Канатопскі і прадстаўнік ЦК КП(б)Б М. І. Сарычаў] і прывёз партызанам зброю і боепрыпасы.

20 ліпеня праціўнік падцягнуў войскі з Кіраўска, Свіслачы, Беразіна, Бабруйска і распачаў наступленне на Клічаў. Баі разгарэліся ў раёне вёсак Бацэвічы і Ваевічы. У Ваевічах атакі адбівалі атрады 152-і, 760-ы, 277-ы. Карнікі атакавалі партызан на шырокім участку абароны; у небе з'явіліся бамбардзіроўшчыкі, каля пераправы — танкі. Так пачалася новая карная аперацыя «Арол». Вёска Ваевічы тройчы пераходзіла з рук у рукі. Праціўнік, выкарыстоўваючы тэхніку, займаў вёску ў дзённых баях, а партызаны вярталі яе начнымі налётамі. 22 ліпеня праціўнік увёў у бой свежыя сілы і пачаў адцясняць паўднёвае крыло партызанскай абароны. Над партызанскімі пазіцыямі

пастаянна віселі 7 «юнкерсаў». Ад іх удараў ратунку па-ранейшаму не было. Адзінае выйсце — уцягнуць праціўніка ў глыб лесу.

Пад вечар усе атрады атрымалі загад перайсці ва Усакінскі лес. 25 ліпеня партызаны пакінулі Клічаў. Карнікі акружылі партызан у лесе. Сканцэнтраваўшы артылерыю ў вёсках Суша, Дулебы і Паддуддзе, яны абстрэльвалі акружаных партызан і насельніцтва. Бамбардзіроўшчыкі з авіягрупы «Эдэльвейс», карыстаючыся блізкасцю аэрадрома, часта бамбілі лясны масіў.

На працягу тыдня партызаны заставаліся ў лесе. Харчовыя запасы скончыліся, з'елі коней, апошнія двое сутак сядзелі зусім галодныя. Савецкі самалёт скінуў груз з гранатамі, мінамі, артснарадамі (большая частка трапіла да ворага). Было прынята рашэнне прарывацца ноччу 3 жніўня. Кожны атрад атрымаў сваю задачу. Штурмавую групу ў напрамку в. Суша павёў сам Нічыпаровіч. Непадалёку ад в. Суша партызаны завязалі начны бой, які цягнуўся паўтары гадзіны, потым пайшлі ў атаку. Прарыў адбыўся — усе атрады вырваліся з блакады і рушылі ў бок Убалацця.

Не адолеўшы партызан, карнікі жорстка распраўляліся з мірным насельніцтвам — 22 вёскі былі спалены поўнасцю.

Пасля адыходу партызан у Клічаве зноў была ўтворана камендатура, адноўлены гарнізоны ў Бацэвічах, Ваевічах, Віркаве, Сушы, Нясяце, Ліпаўцы, Заполлі, на раз'ездзе Патока і інш. Цяпер гэта былі сапраўдныя ўмацаванні, абнесеныя 2-метровымі двайнымі парканамі з земляной засыпкай паміж імі і трыма радамі калючага дроту.

Але і ў гэтых яшчэ больш складаных умовах партызаны працягвалі барацьбу, перашкаджалі транспартным перавозкам ворага. Для выканання гэтай задачы Нічыпаровіч загадам ад 25 ліпеня вызначыў атрадам канкрэтныя ўчасткі дзейнасці на дарогах Жлобін — Бабруйск — Асіповічы, Смалявічы — Барысаў — Талачын — Орша, Магілёў — Рагачоў — Жлобін. Адны атрады выйшлі да месцаў новай дыслакацыі адразу ж пасля атрымання загаду, другія — пасля прарыву блакады.

Выконваючы загад камандуючага Заходнім фронтам Жукава і загад начальніка ЦШПР пры Стаўцы ВГК Панамарэнкі ад 1.8.1942 г. «Аб разгортванні дыверсійнай работы на варожых камунікацыях», партызаны Клічаўскай ВАГ са жніўня да сярэдзіны снежня 1942 г. ўзарвалі (па няпоўных звестках) каля 120 эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай ворага. Метадам дыверсій і засад на шашы знішчана 100 аўтамашын, 12 мастоў на чыгунках, 80 на шашы і бальшаках.

У выніку дзеянняў партызан знізілася прапускная здольнасць, парушыўся рэжым руху ваенных грузаў на магістралях у тылавой паласе нямецкай групы армій «Цэнтр». Па-ранейшаму не працаваў участак чыгункі Асіповічы — Магілёў, на якім пачынаючы з лета немцы адрамантавалі масты і ў канцы лістапада збіраліся аднавіць рух паяздоў. Але калі апошні мост на р. Друць рыхтаваўся да здачы ў эксплуатацыю, партызаны вырашылі сарваць намеры акупантаў. Мост ахоўвала афіцэрская рота з дружыны У. У. Гіль-Радыёнава, сфарміраваная ў маі 1942 г. на тэрыторыі Польшчы з савецкіх ваеннапалонных. Гэта рота ноччу перабіла нямецкіх салдат (каля 90 чалавек) і разам з дыверсійна-разведвальнай групай Заходняга фронту, якую ўзначальваў лейтэнант Аўдзеенкаў, узарвала мост і перайшла да партызан у поўным саставе з узбраеннем.

У пачатку верасня ва Усакінскі лес з Кіраўскага раёна вярнуўся Клічаўскі аператыўны цэнтр са штабам 208-га атрада, з яго падраздзяленнямі цяжкай зброі і гаспадарчага забеспячэння. 1-я і 2-я стралковыя роты гэтага атрада дзейнічалі самастойна на лініі Барысаў — Смалявічы — Талачын, а 3-я — паміж Быхавам і Рагачовам.

Паступова ў Клічаўскую зону прыходзілі партызаны з Быхаўскага, Бабруйскага, Рагачоўскага раёнаў, дзе атрады, што дзейнічалі разгрупаванымі сіламі на вялікай прасторы, не маглі паасобку процістаяць карнікам. Таму да сярэдзіны лістапада яны паводле загаду Клічаўскага аператыўнага цэнтра сканцэнтраваліся ў Клічаўскім, Бярэзінскім і часткова Бялыніцкім раёнах.

Напачатку атрады размясціліся ў раёне вёсак Жабаўка, Галынка, Аксенькавічы, Залессе, Казлоў Бераг, Гарадзішчанскі лес, Усакінскі лес, Дулебы, Хімпалігон, Загацінскія балоты, Убалацце, Развадава і інш. Але абставіны патрабавалі ўдасканалення арганізацыі партызанскіх сіл і таму, што партызанскія атрады выраслі колькасна, палепшылася іх узбраенне, ускладнілася структура, і таму, што і праціўнік павялічыў сілы і матэрыяльныя сродкі на ахову камунікацый. Акупанты ўзмацнілі мясцовую паліцыю, стваряючы змешаныя гарнізоны нямецкіх войск і паліцыі аховы парадку.

Для паспяховага вырашэння пастаўленых задач неабходна было сканцэнтраваць вялікія сілы. Таму Клічаўскі аператыўны цэнтр увёў у зоне брыгадную форму арганізацыі партызанскіх сіл. Загадам ад 27.11.1942 г. аператыўны цэнтр утварыў 1-ю, 2-ю, 3-ю, 4-ю, 5-ю і 6-ю брыгады, аб'яднаўшы ў іх 23 атрады. Толькі 210-ы атрад заставаўся самастойным. Брыгады ў асноўным базіраваліся ў Клічаўскім, Бярэзінскім, Бялыніцкім раёнах.

У лістападзе ў в. Жабаўка Бярэзінскага раёна адбылася партканферэнцыя камуністаў Клічаўшчыны, на якой абмяркоўваліся вынікі і задачы барацьбы супраць захопнікаў.

У зімовы час дыверсіі на дарогах амаль прыпыніліся. Ды і праціўнік узмацніў напады на партызан, робячы хуткія рэйды ў іх размяшчэнне. Партызаны прымалі бой толькі ў крайніх выпадках. У асноўным яны ўхіляліся ад баёў з намнога большымі сіламі праціўніка. Па гэтай жа прычыне брыгады і атрады часта мянялі месцы базіравання, былі пастаянна ў руху, адбіваючы сустрэчныя баі, робячы засады каля дарог ці адрываючыся ад наступаючага праціўніка. Да таго ж сталі рэдкімі палёты савецкай авіяцыі ў сувязі з цяжкім становішчам на фронце і неспрыяльным надвор'ем.

Дапамога тылу аднавілася ў сакавіку 1943 г. Ваенны лётчык І. А. Грышанаў 6 разоў імкнуўся прарвацца да клічаўскіх партызан і вяртаўся на базу ні з чым. Паспяховай была толькі сёмая ноч пошукаў — 16 сакавіка. Самалёт даставіў радыстку з радыёстанцыяй, друкароў з палявой друкарні, боепрыпасы. Гэтым рэйсам прыбылі намеснік начальніка БШПР І. П. Ганенка і група на чале з сакратаром легальнага Магілёўскага абкома КБ(б)Б Дз. С. Маўчанскім, якія павінны былі азнаёміцца з аператыўнай абстаноўкай і баявой дзейнасцю партызан.

2.4.1943 г. ўтвораны Магілёўскі падпольны абком КП(б)Б. На працягу вясны і лета праведзена рэарганізацыя партызанскіх сіл: усе брыгады і асобныя атрады былі зведзены ў адно абласное партызанскае злучэнне. Для кіравання ім пры абкоме КП(б)Б 6.4.1943 г. ўтворана ваенна-аператыўная група, у сувязі з чым Клічаўскі аператыўны цэнтр быў скасаваны. На дзень расфарміравання ён налічваў 10 брыгад агульнай колькасцю 6,5 тыс. партызан.

У маі 1943 г. абласная ваенна-аператыўная група распрацавала адзіную арганізацыйна-штатную структуру атрадаў, пазней палкоў. Адначасова ліквідавалася брыгаднае звяно кіравання. У сувязі з тым, што Клічаўскія брыгады (1, 2, 4, 5-я, а потым і 6-я) былі рэарганізаваны, іх атрады сталі самастойна дзеючымі. На першым часе яны непасрэдна падпарадкоўваліся ваенна-аператыўнай групе, а ў ліпені 1943 г. для лепшай сувязі з атрадамі і больш эфектыўнага кіраўніцтва іх дзейнасцю пры Клічаўскім райкоме партыі была арганізавана ваенна-аператыўная група, якая аб'яднала асобныя атрады (277-ы, 278-ы, 115-ы, 25-ы); 208-ы атрад дзейнічаў самастойна. Паводле рашэння Магілёўскага абкома КП(б)Б у ліпені — жніўні 1943 г. створаны ваенна-аператыўныя групы (ВАГ) пры Клічаўскім, Бялыніцкім, Бярэзінскім, Быхаўскім, Кіраўскім, Круглянскім, Магілёўскім, Асіповіцкім і Шклоўскім райкомах партыі.

У пачатку верасня ў складзе Клічаўскай ВАГ 277-ы атрад разгарнуўся ў полк. За тры месяцы актыўных дзеянняў Клічаўскае злучэнне выросла з 861 да 1847 партызан. Густая сетка варожых


Коммунистическая Партия (большевиков)
Белоруссии

МАНДАТ

Тов. Лебедев Иван Ларионович

является делегатом 1-й Районной Партийной Конференции Кличевской Подпольной Районной партийной организации с правом РЕШАЮЩЕГО ГОЛОСА.

Избран партийной организацией Партизанского отряда № Спецотдела

МАНДАТНАЯ КОМИССИЯ

Мандат І. А. Лебедзева.

гарнізонаў абцяжарвала выхад дыверсійных падраздзяленняў да аб'ектаў ворага. У гэтых умовах за 9 месяцаў 1943 г. партызанам Клічаўскай ВАГ удалося ўзарваць 15 эшалонаў.

Адразу пасля арганізацыі Магілёўскай абласной ВАГ яе штаб спланаваў і падрыхтаваў аперацыю адначасовага ўдару па гарнізонах праціўніка ў населеных пунктах Забавы, Бохань, Заполле, Сямікаўка, Макаўка, Глыбокі Брод, Журавок і Дручаны Бялыніцкага раёна. Гэтыя гарнізоны блакіравалі ўваход партызан да шашы Мінск — Магілёў. У ліку іншых у гэтай аперацыі ўдзельнічалі 2-я і 5-я Клічаўскія брыгады. У гэтай аперацыі 2-я Клічаўская брыгада разбіла гарнізоны ў вёсках Сямікаўка, Глыбокі Брод, а 5-я Клічаўская — у вёсцы Дручаны.

Наступная аперацыя па разблакіраванні раёна спланавана ў 2-й палове красавіка. Удар быў нанесены па добра ўмацаваных варожых гарнізонах у Клічаве і Сушы. У в. Суша ён складаўся з 80 чалавек з мінамётамі і кулямётамі, меў 7 дзотаў з развітой сеткай абарончых збудаванняў у выглядзе земляных, драўляных і дрэцяных загарод і равоў. Такі ж быў і гарнізон у Клічаве. Яго ахоўвала каля 70 нямецкіх салдат і 130 паліцэйскіх.

У момант збору партызанскіх атрадаў на зыходных рубяжах у лесе каля Клічава праціўнік выявіў 277-ы атрад і выслаў у напрамку в. Рубеж роту колькасцю да 120 салдат. Партызаны атрада прыціснулі праціўніка да р. Ольса і разбілі яго. У той жа час партызаны 5-й брыгады і 4-й роты з 208-га атрада з боем занялі Клічаў, але ўмацаваны ваенны гарнізон разграміць не змаглі.

Гарнізон у в. Суша быў заблакіраваны сіламі 208-га і 760-га атрадаў. Вораг сустрэў партызан моцным агнём і адчайна абараняўся. Як толькі праціўнік выявіў сябе, ударыла артылерыя партызан. Але гарнізон трымаўся стойка, і партызаны вымушаны былі адысці на зыходныя пазіцыі. У наступную ноч абстрэл паўтарыўся. Пры пажары згарэла казарма і іншыя памяшканні, аўтамашына, радыёстанцыя, разбіты дзоты. Раніцай з Быхава прыбыў узброены канвой і забраў уцалелых гітлераўскіх салдат. Гарнізон у в. Суша перастаў існаваць.

У Цераболькай пушчы. Злева направа: сядзяць Р. К. Паўлаў — камандзір атрада № 61, І. З. Ізох — камандзір палка № 277, І. П. Ганенка — сакратар ЦК КП(б)Б, А. І. Брухаданенка-Сідарэнка — камандзір Магілёўскай ваенна-аператыўнай групы; стаяць М. І. Кнівоенна-аператыўнай групы, В. А. Сілін — інструктар Клічаўскага падпольнага РК КП(б)Б. 1943.



Партызанскі лагер у Цераболі. Дыярама ў раённым музеі.

Хутка такі ж лёс спасціг і гарнізон у в. Пратасы. Яшчэ раней 2-я Клічаўская брыгада разбіла гарнізоны ў в. Усохі, Леўкавічы, Жылічы, Чыгірынка, Падсёлы. Усяго за красавік партызаны Клічаўскай зоны ліквідавалі ці абстралялі каля 15 варожых гарнізонаў, дзякуючы чаму партызанам удалося разблакіраваць раёны сваёй дыслакацыі.

Паколькі Клічаўскі аэрадром знаходзіўся пад пастаянным кантролем нямецкай авіяцыі, партызаны абсталявалі новую пасадачную авіяпляцоўку ў в. Галынка. У красавіку ўсталявалася добрае надвор'е і ажывіліся палёты самалётаў, якія прывозілі боепрыпасы, медыкаменты, забіралі цяжкапараненых партызан. Пачасціліся ўзрывы на чыгунках Магілёў — Жлобін, Асіповічы — Жлобін, ды і дыверсіі сталі больш выніковымі.

У пачатку мая нямецкае камандаванне ліхаманкава рыхтавалася да бітвы на Арлоўска-Курскай дузе, і Магілёўская вобласць з яе транспартнымі артэрыямі набывала для нямецкіх войск выключнае значэнне. Каб забяспечыць бесперапынны рух ваенных грузаў, яны вырашылі правесці буйную карную аперацыю па знішчэнні партызан Клічаўскай зоны ў міжрэччы Бярэзіны і Друці. У раёне Магілёва, Кіраўска, Бераэіна і Бялынічаў праціўнік сканцэнтраваў войскі і, абапіраючыся на мясцовыя гарнізоны, блакіраваў партызанскія брыгады 1-ю, 2-ю, 4-ю, 5-ю Клічаўскія, 3-ю Бярэзінскую і 6-ю Магілёўскую ў раёне паміж вёскамі Дулебы, Усакіна, Пільшычы, павёў наступ на іх лагеры. Гэта была карная аперацыя «Хрушч-2».

Першы ўдар карнікі нанеслі па 1-й і 2-й Клічаўскіх брыгадах. 4 мая праціўнік акружыў тры брыгады і абрушыў на іх артылерыйскі і мінамётны агонь. Артабстрэл і паветраныя атакі працягваліся цэлы дзень. Пачаліся лясныя пажары. Магілёўская ВАГ прыняла рашэнне вывадзіць брыгады з акружэння. 1-я і 2-я Клічаўскія брыгады пасля зацяжнога сустрэчнага бою ноччу 6 мая прарвалі блакаду і выйшлі да в. Убалацце; 3-я Бярэзінская прарывалася каля в. Дулебы і таксама выйшла з акружэння. 4-я і 3-я Клічаўскія і 6-я Магілёўская брыгады пасля няўдалых дзеянняў у напрамку в. Суша выходзілі з акружэння асобнымі падраздзяленнямі. Яны прарваліся праз трайное кальцо акружэння і з Усакінскага лесу выйшлі ў Бялыніцкі раён.

Да канца блакады партызанскія брыгады і атрады вялі манеўраныя дзеянні, ухіляючыся ад сустрэч з карнікамі. Вялікія страты наносілі бомбавыя атакі варожай авіяцыі і лясныя пажары, што ўзнікалі ў сувязі з гэтым.

17 мая праціўнік зняў блакаду, і партызаны з вялікімі стратамі сталі вяртацца на ранейшыя месцы дыслакацыі. Яны ўключаліся ў напружаны рытм падрых-

тоўкі да Курскай бітвы. У адпаведнасці з планамі аперацыі «Рэйкавая вайна» іх чакалі актыўныя дзеянні па масавым разбурэнні чыгуначных камунікацый ворага. 20 чэрвеня ў Клічаўскую зону прыбыў прадстаўнік БШПР С. І. Смальянаў, які правёў інструктыўную нараду з камандным саставам брыгад зоны. Штаб ВАГ замацаваў за брыгадамі і атрадамі вобласці канкрэтныя ўчасткі чыгункі. Ва Усакінскім лесе быў абсталяваны палігон з драўлянай «чыгункай», якая імітавала сапраўдны ўчастак дарогі з усімі аб'ектамі, на якім адпрацоўваліся практычныя дзеянні партызан па масавым разбурэнні дарог.

Адпрацоўка гэтых дзеянняў праводзілася і на дарогах, якія яшчэ дзейнічалі. Так, 26 чэрвеня паміж в. Вонічы і пераездам каля в. Суша 278-ы атрад перабіў 180 рэек. 2 чэрвеня на чыгуначным участку Развадава — Вонічы 152-і атрад перабіў рэльсы на працягу трох кіламетраў.

27 ліпеня паступіў загад начальніка ЦШПР на правядзенне аперацыі «Рэйкавая вайна». Магілёўскім партызанам ставілася задача захапіць усе чыгункі, што праходзілі па тэрыторыі вобласці, і правесці разбурэнне палатна на ўчастках Орша — Магілёў — Рагачоў, Асіповічы — Бабруйск — Жлобін, Магілёў — Крычаў — Рослаўль, Орша — Крычаў — Унеча, Асіповічы — Магілёў. У загадзе штаба Магілёўскай ВАГ падкрэслівалася: «Аператыўная група мае задачу ў ноч з 2 на 3 жніўня нанесці першы раптоўны ўдар па варожых камунікацыях са знішчэннем аховы і поўнасцю разбурыць палатно шляхам перабівання рэек узрывам, парваць тэлефонна-тэлеграфную сувязь, разбурыць вадакачкі і інш. збудаванні, якія маюць ваеннае значэнне. Штурм чыгуначных участкаў пачаць 3.8.1943 г. ў нуль-нуль гадзін».

208-ы атрад (размяшчаўся каля в. Аксенькавічы Бялыніцкага раёна) павінен быў разбурыць участак чыгункі Шклоў — Магілёў; Клічаўская ВАГ (размяшчалася за 7 км на захад ад в. Усакіна), 277-ы, 278-ы, 115-ы атрады — палатно на ўчастку в. Бураковічы і ст. Дашкаўка. Агульная колькасць клічаўскіх партызан разам з 208-м атрадам складала больш за 1,4 тыс. чалавек. Ім патрэбна было непрыкметна для ворага прайсці некалькі дзесяткаў кіламетраў, абыходзячы варожыя гарнізоны і фарсіруючы рэкі.

Падабраўшыся да чыгункі, партызаны разгарнуліся фронтам да яе: 277-ы атрад справа ад чыгуначнага пераезда на в. Пушча і да в. Сялец, 278-ы і 115-ы — злева ад в. Дашкаўка. Забяспечыўшы засады і баявую ахову з боку ад гарнізонаў праціўніка, яны хутка авалодалі чыгункай. Праціўнік без супраціўлення кідаў аб'екты аховы і разбягаўся. Партызаны ўзарвалі на шляху Буйнічы — Гуслішча 1320 рэек, 2 масты, 2 будкі, разбурылі 6,5 км сувязі.

Аперацыя «Рэйкавая вайна» з першых удараў набыла шырокі размах і працягвалася ўсю восень. Толькі на працягу жніўня і 1-й паловы верасня магілёўскія партызаны ўзарвалі 23 601 рэйку, разбурыўшы ўздоўж чыгункі 38 км сувязі, узарвалі масты, разбілі дзоты і інш. аб'екты пуцявога і станцыйнага абсталявання.

Асаблівае значэнне набывала барацьба партызан за выратаванне ўраджаю. Вораг стаў звозіць уборачную сельскагаспадарчую тэхніку, стварацъ рабочыя каманды і рыхтавацца да арганізаванага захопу ўраджаю. Каб сарваць яго намеры, Магілёўскі падпольны абком і яго аператыўная група абавязалі сакратароў райкомаў і камандаванне ВАГ арганізаваць у сваіх раёнах дапамогу сялянам па ўборцы ўраджаю: размеркаваць па вёсках асабовы састаў і транспарт, арганізаваць кругавую баявую ахову населеных пунктаў. Партызаны актыўна ўдзельнічалі ў зборы і абмалоце збожжавых.

Праціўнік канцэнтраваў свае сілы ў ваенных і паліцэйскіх гарнізонах, умацоўваў іх, дадаткова размяшчаў баявыя падраздзяленні, а таксама транспартныя сродкі і ўборачную тэхніку. У в. Мацевічы ён абсталяваў абмалотачны пункт. Пад прыкрыццём сваіх гарнізонаў акупанты пачалі рабаванне сялянскага збожжа. Узброеныя салдаты захоплівалі снапы скошанай збажыны і звозілі іх на абмалотачны пункт. 208-ы і 277-ы партызанскія атрады першымі павялі барацьбу з рабаўнікамі. 17 жніўня яны атакавалі праціўніка каля в. Мацевічы. Начны напад партызан застаў ворага знянацку, і яго батальён быў разбіты. Партызаны знішчылі больш за сотню і ўзялі ў палон 15 салдат, захапілі 2 гарматы, 3 ручныя кулямёты, 99 вінтовак, 230 снарадаў, радыёстанцыю, 58 коней з павозкамі і 21 з сёдламі, 4 аўтамашыны. У 277-м атрадзе было паранена 6 партызан. Абмалотачны пункт у Мацевічах быў ліквідаваны.

Баі за ўраджай не сціхалі ўвесь месяц. 9 жніўня 208-ы атрад напаў на акупантаў, што гаспадарылі ў в. Яромічы. Гарнізон быў разбіты, а нарабаванае дабро вернута жыхарам.

31 жніўня буйны начны бой правяла

Клічаўская ВАГ у вёсках Маркаўшчына і Вішнёва. Дзве маршавыя роты гітлераўцаў прыбылі з Бабруйска на дапамогу Клічаўскаму гарнізону з мэтай захапіць сялянскі ўраджай. 115-ы партызанскі атрад заблакіраваў гарнізон, выставіўшы заслоны з боку магчымага падыходу праціўніка. Затым партызаны 2 ротамі 277-га і 115-га атрадаў абрушыліся на праціўніка, які панёс вялікія страты.

У адказ на паспяховыя дзеянні партызан па захаванні ўраджаю варожыя гарнізоны таксама актывізавалі свае дзеянні. Тады партызаны спланавалі буйную аперацыю адначасовага ўдару па 13 гарнізонах. 26 жніўня было поўнасцю ліквідавана 8 гарнізонаў. У выніку другога такога ўдару па гарнізонах, нанесенага ў ноч на 11 верасня (удзельнічалі 21 партызанскі полк і 26 асобных атрадаў), партызаны разгромілі 10 апорных пунктаў ворага.

З наступленнем зімы 1943—44 гг. аператыўная абстаноўка ўскладнілася, бо Магілёўшчына стала франтавой паласой. Яе тэрыторыю навадніліпалявыя, рэзервовыя, дапаможныя войскі ворага. У гарнізонах размяшчаліся разбітыя часці, выведзеныя сюды для перафарміравання і папаўнення, што значна ўмацавала гарнізоны і актывізавала іх барацьбу з партызанамі. На чыгунках і аўтадарогах узмацніліся грузавыя патокі, ішла інтэнсіўная перагрупоўка нямецкіх войск. Процістаяць ворагу станавілася ўсё цяжэй.

Каб выстаяць і перашкодзіць перагрупоўцы войск праціўніка, партызаны працягвалі масавыя разбурэнні чыгунак і шашэйных дарог, нападалі на яго гарнізоны. Так, 18 кастрычніка на дарозе паміж вёскамі Развадава і Доўгае адбыўся бой 208-га палка з карным атрадам, які прарваўся ў Клічаўскі раён. Бой пачаўся моцным артылерыйскім і мінамётным агнём з боку праціўніка. Аднак партызанскія падраздзяленні на працягу 40 хвілін прымусілі ворага адступіць, захапілі гармату, 2 мінамёты, кулямёт, іншую зброю, дакументы, знішчылі 2 грузавыя аўтамашыны.

31 кастрычніка 208-ы полк выйшаў на чыгуначную лінію паміж станцыямі Талька і Вярэйцы і разбурыў дарожнае палатно і правадную сувязь на адлегласці каля 15 км (спілаваў тэлеграфныя слупы, перабіў 819 рэек). У баях па падаўленні агнявых кропак праціўніка партызаны ліквідавалі гарнізон, узарвалі 21 дзот, спалілі казарму, забілі некалькі дзесяткаў салдат.

Пад канец 1943 г. Усакінскія лясы пакінуў 208-ы полк (пачаў перабазіраванне ў Беластоцкую вобл.). Затое ў раён Каўбчанскай Слабады сталі збірацца разрозненыя групы 15-га палка, разбітага ў блакадных баях з карнікамі ў левабярэжнай частцы Быхаўскага раёна; 13 снежня ён быў уключаны ў Клічаўскую ВАГ. У сувязі з вызваленнем савецкімі войскамі тэрыторыі Гомельскай вобл. ў Клічаўскім раёне ў лістападзе атабарылася 8-я Рагачоўская брыгада, якая аб'ядноўвала больш за 2 тыс. партызан (255-ы полк і 4 асобныя атрады: 252-і, 257-ы, 258-ы і 559-ы).

У сярэдзіне студзеня 1944 г. некаторыя гарнізоны праціўніка пачалі выхо-

Партызанскі аэрадром. Дыярама ў раённым музеі.

дзіць са сваіх сховішчаў на аднаўленне і ахову разбураных партызанамі бальшакоў і шашы. Па заданні штаба Магілёўскай ВАГ Клічаўская ВАГ падрыхтавала план адначасовага ўдару па гарнізонах у вёсках Чарвякі, Люціна і Любічы. Партызаны 277-га палка і 278-га атрада сканцэнтраваліся ў Асаўскім і Люцінскім лясах і апоўначы 12 студзеня напалі на 3 гарнізоны. Аднак налёт не ўдаўся, і яны былі вымушаны адысці (забіта і паранена 26 чалавек).

Пазней 277-ы полк вызначыўся ў разгроме гарнізонаў у вёсках Пацава Слабада і Малінаўка (у ноч на 23 сакавіка), у мяст. Пагост (9 красавіка), у в. Казулічы (6 чэрвеня) Кіраўскага раёна.

Так у баявых перамогах і паражэннях набліжаўся доўгачаканы дзень вызвалення. Перад самым пачаткам аперацыі «Багратіён» партызаны атрымалі загад на правядзенне новага этапу «рэйкавай вайны». Раніцай 16.6.1944 г. палкі і атрады Клічаўскай ВАГ, што базіраваліся ў раёне вёсак Аколіца, Коўбча, Хадэчына, Вяленік і Ніва, паходным маршам рушылі на аперацыю і праз трое сутак разгарнуліся ўздоўж чыгункі на ўчастку Шклоў — Лотва паміж вёскамі Камароўка, Лотва, Альхоўка. Злева і справа дзейнічалі Бялыніцкая і Кіраўская ВАГ. Клічаўскія партызаны ўзарвалі 1452 рэйкі.

А 27—28 чэрвеня войскі 2-га Беларускага фронту фарсіравалі Дняпро, вызвалілі гарады Шклоў, Быхаў, Магілёў і выйшлі ў міжрэчча Дняпра і Друці. Тым часам войскі 1-га Беларускага фронту, наступаючы ў агульным напрамку на Бабруйск, ліквідавалі бабруйскую групоўку нямецкіх войск.

На Клічаўскай зямлі, якая хоць і была партызанскай зонай, у час вызвалення таксама ішлі баі. Іх вялі воіны 380-й асобай стралковай Арлоўскай дывізіі, а таксама 348-й стралковай дывізіі 3-й арміі, якая каля в. Паплавы сустрэлася з партызанамі. На дзень злучэння 28 чэрвеня 1944 г. з рэгулярнымі савецкімі часцямі Клічаўская ВАГ складалася з 277-га, 15-га палкоў і асобных 277-га, 115-га і 25-га атрадаў.

А. Л. Манаенкаў.

Помнік на брацкай магіле воінаў і партызан у вёсцы Нясята.

Помнік на брацкай магіле воінаў і партызан у вёсцы Дзмітраўка 1-я.

Клічаўская партызанская зона

Гэта тэрыторыя Клічаўскага раёна, а таксама частка сумежных з ім Асіповіцкага, Бялыніцкага, Бярэзінскага, Кіраўскага і іншых раёнаў Магілёўскай вобл., якую кантралявалі партызаны. Пачала стварацца з кастрычніка 1941 г. ў ходзе баёў партызан за вызваленне Клічаўскага раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У кастрычніку 1941 г.— сакавіку 1942 г. партызанскія атрады разграмілі больш за 80 варожых гарнізонаў і паліцэйскіх участкаў на тэрыторыі Клічаўскага (у т. л. 20.3.1942 г. ў г. п. Клічаў) і прылеглых да яго раёнаў. 3.4.1942 г. ў в. Усакіна на сходзе камуністаў раёна прынята пастанова аб аднаўленні савецкай улады ў Клічаўскім раёне. Створаны Клічаўскі райком КП(б)Б, райвыканком, Клічаўскі аператыўны цэнтр. На канец 1942 г. вызваленая тэрыторыя склала каля 1,9 тыс. км^2, а на пачатак 1944 г. перавысіла 3 тыс. км^2. Тут знаходзілася больш за 70 тыс. мірных жыхароў, абаранялі яе больш за 18 тыс. партызан.

На тэрыторыі зоны ў жніўні — кастрычніку 1942 г. базіраваліся Бабруйскі падпольны міжрайком КП(б)Б, з красавіка 1943 г. Магілёўскі падпольны абком КП(б)Б, штаб Магілёўскай ВАГ пры ім, Бялыніцкі, Бярэзінскі, Магілёўскі і інш. падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ. Выдаваліся падпольныя газеты абласная «За Радзіму», раённая «Голас партызана» і інш. З чэрвеня 1942 г. падтрымлівалася радыёсувязь, з ліпеня 1942 г.— авіясувязь з Вялікай зямлёй; у Клічаве і в. Галынка Бярэзінскага раёна дзейнічалі партызанскія аэрадромы. Абарона Клічаўскай партызанскай зоны ажыццяўлялася фарміраваннямі Клічаўскага партызанскага злучэння (3.4.1942—6.4.1943) і Магілёўскай ваенна-аператыўнай групай пры Магілёўскім падпольным абкоме КП(б)Б (6.4.1943—28.6.1944) па абарончых рубяжах, што праходзілі па рэках Друць, Ольса, Суша, Бярэзіна, Нясета. Больш за 2 гады партызанскія атрады, палкі і брыгады, атрады самааховы змагаліся з намнога большымі сіламі праціўніка ў акружэнні больш як 20 нямецка-фашысцкіх гарнізонаў, створаных 203-й і 286-й ахоўнымі дывізіямі і паліцэйскімі батальёнамі ўздоўж шашэйных дарог і на асобных участках чыгункі Магілёў — Асіповічы, выстаялі ў час карных аперацый, прычынілі ворагу адчувальныя страты ў жывой сіле і тэхніцы (гл. Баявыя аперацыі). Стойкая абарона зоны забяспечвала партызанам амаль пастаянную сувязь з Вялікай зямлёй, паспяховую баявую дзейнасць на камунікацыях праціўніка, супраць яго гарнізонаў і інш. аб'ектаў. У Клічаве ў гонар партызан, якія вызвалілі ў сакавіку 1942 г. гарадскі пасёлак, насыпаны курган Славы і пастаўлены помнік. Помнік узведзены таксама на месцы прызямлення 1-га самалёта з Вялікай зямлі.

У. С. Пасэ, Э. Ф. Языковіч.

Партызанскія фарміраванні

Лясістая, забалочаная тэрыторыя Клічаўскага раёна стала адным з цэнтраў зараджэння і развіцця партызанскага руху на Беларусі. Пра яе, як і калі ствараліся тут першыя партызанскія атрады, коратка расказана ў нарысе «Партызанскі край». Некаторыя атрады, што ўзніклі на Клічаўшчыне, потым перабазіраваліся ў іншыя раёны, а некаторыя, наадварот, прыбывалі сюды з іншых раёнаў і пэўны час прымалі тут удзел у баявых аперацыях. Гэта атрады 61-ы (камандзір Р. К. Паўлаў), 152-і (камандзір М. Дз. Грыцан), 537-ы імя Кірава (камандзіры С. І. Свірыд, С. Дз. Баркоўскі), 720-ы асобна дзейны (камандзіры Ф. С. Тарасевіч, Г. А. Храмовіч, П. У. Жмуроўскі), 760-ы імя Беразоўскага (камандзіры Г. М. Колбнеў, Р. І. Пярэсценка), 752-і (камандзір В. І. Лівенцаў) і іншыя. Пра гэтыя атрады, іх камандзіраў і пра іх баявыя дзеянні будзе апавядацца ў кнігах «Памяць» тых раёнаў, дзе пераважна дзейнічалі гэтыя атрады, некаторыя з якіх перараслі ў партызанскія палкі і брыгады. У гэтай жа кнізе асобныя артыкулы прысвячаюцца толькі тым атрадам (і іх камандзірам-арганізатарам), якія ўзніклі і пераважна дыслацыраваліся на тэрыторыі Клічаўскага раёна.

КЛІЧАЎСКІ АПЕРАТЫЎНЫ ЦЭНТР

Так называўся орган кіраўніцтва Клічаўскім партызанскім злучэннем, якое дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Магілёўскай вобл. на захад ад Дняпра і ў некаторых суседніх раёнах іншых абласцей.

Складваўся ў ходзе баёў партызан за вызваленне Клічаўскага раёна да нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Арганізацыйнае афармленне пачалося 3.4.1942 г.: ка-

мандаванню партызанскага атрада 208-га імя Сталіна былі падпарадкаваны 128-ы, 277-ы, 620-ы, 752-і і 760-ы атрады і створана Клічаўскае партызанскае злучэнне. У ліпені 1942 г. яго дзейнасць санкцыяніраваў ваенны савет Заходняга фронту, 2.9.1942 г. паводле распараджэння ЦШПР камандаванне злучэння вызначана як Клічаўскі аператыўны цэнтр. Гэта найменне пашырылася і на злучэнне. На працягу 1942 г. ў злучэнне ўключаны атрады, якія раней дзейнічалі асобна, і створаны новыя ў яго складзе: 525-ы, 61, 345, 537, 255, 113, 600, 210, 425, 810-ы, 152-і, 121-ы, 120, 130, 115, 100-ы. У лістападзе 1942 г. атрады зведзены ў 6 брыгад: 1-ю, 2, 4, 5-ю Клічаўскія, 3-ю Бярэзінскую, 6-ю Магілёўскую. У лютым — сакавіку 1943 г. ў склад Клічаўскага злучэння ўключаны партызанскія брыгады: 1-я Асіповіцкая, 8-я Рагачоўская, 9-я Кіраўская, 10-я Журавіцкая. Клічаўскі аператыўны цэнтр на пачатак красавіка 1943 г. ажыццяўляў арганізацыйнае і аператыўнае кіраўніцтва 10 партызанскімі брыгадамі (43 атрады), якія налічвалі каля 6,5 тыс. чалавек.

Камандзіры: У. І. Нічыпаровіч (красавік — верасень 1942), П. В. Яхантаў (верасень 1942— красавік 1943); камісары: К. М. Якаўлеў (красавік — верасень 1942), І. Р. Іваноў (верасень 1942— люты 1943), Р. І. Шчарбакоў (люты — красавік 1943); начальнікі штаба: В. М. Айрапетаў (красавік — верасень 1942), К. А. Арцюшын (верасень 1942— красавік 1943).

Расфарміраваны 6.4.1943 г. ў сувязі з утварэннем ваенна-аператыўнай групы пры Магілёўскім падпольным абкоме КП(б)Б.

ПАРТЫЗАНСКІ ПОЛК 208-ы ІМЯ І. В. СТАЛІНА

Дзейнічаў на акупіраванай тэрыторыі Клічаўскага, Бярэзінскага, Бялыніцкага, Кіраўскага, Быхаўскага, Пухавіцкага, Чэрвеньскага, Барысаўскага, Крупскага, Целяханскага, Лагішынскага, Ганцавіцкага і Пінскага раёнаў. Створаны 30.8.1943 г. на базе атрада 208-га імя Сталіна. З жніўня 1941 г. ў Рудзенскім раёне дзейнічаў атрад М. П. Пакроўскага, у кастрычніку створаны атрад Сяргеева. 31.12.1941 г. атрады Пакроўскага, Сяргеева і група У. І. Нічыпаровіча, што прыбыла з Мінскага падполля, аб'яднаны ў партызанскі атрад 208-ы (з сакавіка 1942 г. атрад 208-ы імя Сталіна). У сакавіку 1942 г. атрад перадыслацыраваўся ў Клічаўскі раён, дзе яго камандаванне стварыла і ўзначаліла Клічаўскі аператыўны цэнтр. 27.11.1942 г. 208-ы атрад пераўтвораны ў брыгаду 1-ю Клічаўскую (камандзіры П. В. Яхантаў, Я. М. Бяспоясаў; камісары І. Р. Іваноў, Р. І. Шчарбакоў; начальнікі штаба К. А. Арцюшын, Ц. К. Крук). 20.5.1943 г. брыгада пераўтворана ў атрад 208-ы імя Сталіна, 30 жніўня — у партызанскі полк 208-ы імя Сталіна. 11.12.1943 г.—30.1.1944 г. полк перабазіраваўся ў Целяханскі раён.

Камандзір палка Бяспоясаў (жнівень 1943— ліпень 1944), камісар Шчарбакоў (жнівень 1943— ліпень 1944), начальнік штаба П. Ф. Бадачэнка (жнівень 1943— ліпень 1944).

Партызаны правялі больш за 400 баявых аперацый. У лютым, сакавіку 1942 г., красавіку і жніўні 1943 г. грамілі варожыя гарнізоны і апорныя пункты ў Пухавічах, Градзянцы Асіповіцкага, Сушы Клічаўскага, Мацевічах Бярэзінскага раёнаў, у Бялынічах. Правялі 17 абарончых аперацый супраць карнікаў, у т. л. Кліноцкі бой 1942 г. У маі 1943 г. прарвалі блакаду. На чыгуначных участках Мінск — Орша, Орша — Жлобін, Мінск — Жлобін, Баранавічы — Лунінец, Лунінец — Пінск знішчылі і пашкодзілі больш за 70 эшалонаў. У жніўні 1943 г. знішчылі больш за 3,5 тыс. рэек. 11.7.1944 г. полк (1422 партызаны, 4 батальёны) злучыўся з Чырвонай Арміяй.

КЛІЧАЎСКАЯ ВАЕННА-АПЕРАТЫЎНАЯ ГРУПА (Клічаўская ВАГ)

Так называлася партызанскае злучэнне пры Клічаўскім падпольным райкоме КП(б)Б, якое дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Клічаўскага, Магілёўскага, Бялыніцкага, Шклоўскага, Кіраўскага, Быхаўскага раёнаў. Такую ж назву меў і орган кіраўніцтва гэтым злучэннем. Уваходзіла ў Магілёўскае партызанскае злучэнне. Створана ў ліпені 1943 г. ў адпаведнасці з пастановай Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б і загадам Магілёўскай (абласной) ВАГ на базе партызанскіх атрадаў 277-га, 278, 115, 25-га, якія да 20.5.1943 г. ўваходзілі ў склад 2-й, 4-й, 5-й Клічаўскіх партызанскіх брыгад. 3.9.1943 г. атрад 277-ы разгорнуты ў партызанскі полк 277-ы. У снежні ўключаны партызанскі полк 15-ы.

Кіраўніцтва ВАГ: сакратары падпольнага РК КП(б)Б Я. І. Заяц (ліпень 1943— май 1944), П. М. Вікторчык (май — чэрвень 1944), камандзіры І. З. Ізох (ліпень 1943— май 1944), М. А. Баранаў (май — чэрвень 1944), начальнік штаба Баранаў (ліпень 1943— май 1944).

28.6.1944 г. ВАГ (2824 партызаны) злучылася з Чырвонай Арміяй.

ПАРТЫЗАНСКІ ПОЛК 277-ы

Дзейнічаў на акупіраванай тэрыторыі Бялыніцкага, Кіраўскага, Клічаўскага, Магілёўскага, Бярэзінскага, Шклоўскага, Быхаўскага і Крупскага раёнаў. Створаны ў 1943 г. на базе 277-га атрада. 5.7.1941 г. ў Клічаўскім раёне пачала дзейнічаць падпольная група камуністаў, пакінутая ў тыле ворага. На яе базе 14.7.1941 г. створаны Клічаўскі партызанскі атрад, які ў красавіку 1942 г. ўвайшоў у Клічаўскі аператыўны цэнтр як атрад 277-ы.

Камандзіры палка: І. З. Ізох (верасень 1943 — май 1944), М. П. Коканцаў (чэрвень 1944); камісары: І. М. Гершовіч (верасень 1943 — люты 1944), М. І. Кніга (люты — чэрвень 1944), А. М. Радзюк (чэрвень 1944); начальнік штаба С. Ц. Токараў (верасень 1943 — чэрвень 1944).

Партызаны ў студзені — сакавіку 1942 г. ўдзельнічалі ў ачышчэнні тэрыторыі Клічаўскага раёна ад акупантаў, 20.3.1942 г.— у разгроме гарнізона ў Клічаве. Вялі баі па абароне і расшырэнні партызанскай зоны, удзельнічалі ў разгроме апорных пунктаў у в. Развадава Клічаўскага (чэрвень 1942), Казулічы (1943, 1944), Пацава Слабада (1943, 1944) Кіраўскага, Пагост (красавік 1944) Бярэзінскага раёнаў. У чэрвені, жніўні 1942 г., маі, жніўні, лістападзе, снежні 1943 г., лютым, маі 1944 г. вялі баі супраць карнікаў. Наносілі ўдары па камунікацыях ворага. У верасні 1942 г. каля чыг. ст. Крупкі захапілі і спалілі эшалон з гаручым, падарвалі чыгуначны мост цераз р. Нача. У жніўні 1943 г. на ўчастках Магілёў — Дашкаўка, Быхаў — Рагачоў, у чэрвені 1944 г. на ўчастку Магілёў — Орша падарвалі каля 2 тыс. рэек. У час наступлення Чырвонай Арміі ўтрымлівалі партызанскую зону. 28.6.1944 полк (1257 партызан, 3 батальёны) злучыўся з Чырвонай Арміяй.

ПАРТЫЗАНСКІ ПОЛК 15-ы

Дзейнічаў на акупіраванай тэрыторыі Прапойскага, Быхаўскага, Чавускага, Кармянскага, Клічаўскага і Бярэзінскага раёнаў. Створаны 3.8.1943 г. на базе 15-га атрада.

Камандзір А. С. Дзямідаў (жнівень 1943 — чэрвень 1944); камісар І. П. Ніжнік (жнівень 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба І. І. Вішнеўскі (жнівень — кастрычнік 1943, загінуў), П. А. Віліткевіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944).

Партызаны наносілі асноўныя ўдары па камунікацыях у тыле 4-й і 9-й нямецкіх армій. У жніўні 1943 г. падарвалі 8 варожых эшалонаў, 46 аўтамашын. Летам 1943 г. ў раёне чыг. ст. Верамейкі перабілі больш за 920 рэек, у чэрвені 1944 г. каля чыг. ст. Лотва — больш за 170 рэек. У кастрычніку 1943 г. вялі цяжкія абарончыя баі ў Прапойскім і Быхаўскім раёнах. У час прарыву блакады полк меў вялікія страты, выйшаў асобнымі групамі ў Клічаўскі раён, дзе перафарміраваны і папоўнены партызанамі 208-га і 425-га палкоў. У складзе Клічаўскай ВАГ удзельнічалі ў разгроме апорнага пункта ў в. Пагост Бярэзінскага раёна. 28.6.1944 полк (311 партызан, 2 батальёны) злучыўся з Чырвонай Арміяй.

ПАРТЫЗАНСКІ АТРАД 278-ы

Дзейнічаў на акупіраванай тэрыторыі Клічаўскага, Кіраўскага, Быхаўскага, Бялыніцкага, Бярэзінскага, Шклоўскага раёнаў. Створаны 9.6.1942 г. З лістапада 1942 г. ў брыгадзе 4-й Клічаўскай, з снежня дзейнічаў самастойна. У красавіку 1943 г. атрад пад № 278 уключаны ў брыгаду 2-ю Клічаўскую, у маі вылучаны ў самастойны, у ліпені ўвайшоў у Клічаўскую ВАГ.

Камандзіры: М. І. Кніга (чэрвень — кастрычнік 1942), В. М. Ананіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944); камісары: А. М. Латышаў (чэрвень — кастрычнік 1942), А. Ц. Курсакоў (красавік 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба: П. А. Кушнер (люты 1943 — май 1944), І. Ф. Рудаў (чэрвень 1944).

Партызаны наносілі ўдары на чыгуначных участках Магілёў — Рагачоў, Магілёў — Шклоў, Бабруйск — Жлобін. У верасні 1942 г. каля ст. Мілое падарвалі мост. У жніўні 1943 г. на ўчастку Магілёў — Дашкаўка каля в. Сялец падарва-

М. Ф. Спяранскі.

А. І. Сафронаў.

П. М. Вікторчык.

Я. К. Вітоль.



Я. І. Заяц.

А. С. Дзямідаў.

лі 360 рэек, разбурылі 500 м тэлефонна-тэлеграфнай лініі. У красавіку, жніўні, кастрычніку 1943 г. ўдзельнічалі ў разгроме варожых гарнізонаў у Клічаве, Мацевічах, Заполлі, Казулічах. У маі і жніўні 1943 г. вялі баі з карнымі экспедыцыямі, утрымлівалі партызанскую зону. 28.6.1944 г. атрад (490 партызан) злучыўся з Чырвонай Арміяй.

ПАРТЫЗАНСКІ АТРАД 115-ы

Дзейнічаў на акупіраванай тэрыторыі Клічаўскага, Бярэзінскага, Бялыніцкага, Кіраўскага і Быхаўскага раёнаў. Створаны 15.9.1942 г. З лістапада ў брыгадзе 4-й Клічаўскай, з мая 1943 г. дзейнічаў самастойна, з ліпеня 1943 г. асобны атрад Клічаўскай ВАГ.

Камандзіры: А. П. Доўгі (верасень 1942 — сакавік 1943, загінуў), І. Ф. Рудаў (чэрвень 1943 — чэрвень 1944), І. Я. Вайтусёнак (чэрвень 1944); камісары: П. М. Вікторчык (верасень 1942 — май 1944), А. Я. Счыслёнак (чэрвень 1944); начальнік штаба Дз. П. Скрыпка (верасень 1942 — чэрвень 1944).

Партызаны вялі баі ў Клічаўскім раёне супраць карнікаў. У красавіку 1944 г. ўдзельнічалі ў разгроме варожага гарнізона ў в. Пагост Бярэзінскага раёна. Разбурылі чыг. палатно на ўчастках Магілёў — Дашкаўка (жнівень 1943), Магілёў — Лотва (чэрвень 1944). Вялі баі за ўтрыманне партызанскай зоны. 28.6.1944 г. атрад (345 партызан) злучыўся з Чырвонай Арміяй.

ПАРТЫЗАНСКІ АТРАД 25-ы

Дзейнічаў на акупіраванай тэрыторыі Клічаўскага, Быхаўскага, Кіраўскага і Бярэзінскага раёнаў. Створаны ў снежні 1942 г., дзейнічаў у складзе 5-й Клічаўскай брыгады, з мая 1943 г. самастойна, з ліпеня асобны атрад Клічаўскай ВАГ.

Камандзіры: С. І. Лосеў (снежань 1942 — 15.3.1943), А. І. Сафронаў (сакавік 1943 — чэрвень 1944), У. Г. Семянішын (чэрвень 1944); камісары: А. М. Латышаў (снежань 1942 — жнівень 1943), В. П. Корабаў (верасень 1943 — красавік 1944), П. М. Сідарэнка (май 1944 — чэрвень 1944); начальнікі штаба: А. Дз. Красноў (студзень 1943— май 1944), П. А. Кушнер (май — чэрвень 1944).

Партызаны ўдзельнічалі ў баях каля в. Палосы, Бярозавае Балота, Бёрда Клічаўскага раёна (люты 1944), каля Клічава (май 1944), у разгроме варожых гарнізонаў у в. Пагост Бярэзінскага раёна, Казулічы (кастрычнік 1943 — май 1944), Пацава Слабада (сакавік 1944) Кіраўскага раёна, у «рэйкавай вайне» на ўчастках Магілёў — Дашкаўка (жнівень 1943), Магілёў — Лотва (чэрвень 1944). 28.6.1944 г. атрад (222 партызаны) злучыўся з Чырвонай Арміяй.

ПАРТЫЗАНСКІ АТРАД 620-ы ІМЯ В. І. ЧАПАЕВА

Дзейнічаў на акупіраванай тэрыторыі Клічаўскага, Кіраўскага, Бярэзінскага, Быхаўскага, Клецкага раёнаў. Створаны ў снежні 1941 г. на базе групы В. М. Сырцова.

Камандзіры: В. М. Сырцоў (снежань 1941 г.— красавік 1942 г., загінуў), М. С. Міхалап (красавік 1942 г.— май 1944 г., загінуў), А. А. Хачатран (май — чэрвень 1944 г.); камісары: М. І. Александровіч (студзень — красавік 1942 г.), М. Ф. Міранавіч (красавік — май 1942 г.), Г. А. Храмовіч (чэрвень — верасень 1942 г.), П. А. Рыняк (верасень 1942 г.— студзень 1943 г.), А. А. Хачатран (сакавік 1943 г.— май 1944 г.), М. Г. Буракоўскі (май — ліпень 1944 г.); начальнікі штаба: Ф. С. Тарасевіч (красавік 1942 г.), І. П. Міхалап (май — ліпень 1942 г.), Ф. К. Сцярлеў (жнівень 1942 г.— ліпень 1944 г.).

Партызаны разам з інш. клічаўскімі атрадамі ў сакавіку — красавіку 1944 г. ачысцілі тэрыторыю раёна ад варожых гарнізонаў, вызвалілі і ўтрымлівалі Клічаў. 24.12.1942 г. з атрадам 113-м разбілі гарнізон, які ахоўваў чыгуначны мост цераз Друць. У маі 1943 г. правялі 10 сустрэчных баёў з карнікамі, разгромілі каля 20 гарнізонаў і ўчасткаў, у т. л. ў рабочым пас. Градзянка Асіповіцкага, в. Кабылянка, Дзяржынск Клічаўскага раёнаў, падарвалі 1,2 тыс. рэек, 47 мастоў. У лістападзе 1943 г.— студзені 1944 г. зрабілі рэйд з Клічаўскага ў Клецкі раён. 4.7.1944 атрад (287 партызан) злучыўся з Чырвонай Арміяй.

І. З. Ізох.



М. І. Кніга.

У. І. Нічыпаровіч.

А. С. Юркаўцаў.

ПАРТЫЗАНСКІ АТРАД 128-ы

Дзейнічаў на акупіраванай тэрыторыі Клічаўскага, Асіповіцкага, Бярэзінскага, Бялыніцкага раёнаў Магілёўскай, Барысаўскага і Крупскага раёнаў Мінскай абласцей. Створаны ў снежні 1941 г. на базе групы М. Ф. Спяранскага.

Камандзіры: М. Ф. Спяранскі (снежань 1941 — студзень 1942), В. П. Свістуноў (студзень — кастрычнік 1942), С. Р. Ялецкі (кастрычнік 1942 — чэрвень 1943), М. І. Чарноў (чэрвень — кастрычнік 1943); камісары: М. Ф. Спяранскі (студзень 1942 — чэрвень 1943), М. С. Серадзюк (чэрвень — кастрычнік 1943); начальнікі штаба: С. Р. Ялецкі (студзень — май 1942), А. В. Кодыч (май — ліпень 1942, загінуў), М. І. Чарноў (кастрычнік 1942 — чэрвень 1943), М. А. Грабянюк (чэрвень — кастрычнік 1943). У красавіку 1942 г. ўключаны ў склад Клічаўскага аператыўнага цэнтра як 128-ы атрад.

1.10.1943 г. атрад (397 партызан) злучыўся з Чырвонай Арміяй.

Арганізатары партызанскага руху

ВІКТОРЧЫК Пётр Мацвеевіч, нарадзіўся ў 1891 г. ў в. Закоркі Клічаўскага р-на. Працоўную дзейнасць пачаў у 1903 г. З 1923 г. сакратар, затым старшыня Кабылянскага сельсавета. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны працаваў загадчыкам аддзела сацыяльнага забеспячэння Клічаўскага райвыканкома. Клічаўскі райком партыі пакінуў яго на акупіраванай тэрыторыі для арганізацыі барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1942 г. на партыйнай канферэнцыі выбраны членам бюро падпольнага райкома партыі. Быў камісарам роты партызанскага атрада 277-га, камісарам партызанскіх атрадаў 278-га і 115-га. У 1942 г. акупанты ўзялі ў заложнікі і расстралялі сям'ю П. М. Вікторчыка — жонку і сямёра дзяцей. З красавіка 1942 г. старшыня Клічаўскага райвыканкома, з мая 1944 г. сакратар Клічаўскага райкома партыі. З 1945 г. на партыйнай і гаспадарчай рабоце. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі. Перажытае ў час Вялікай Айчыннай вайны апісаў у кнізе «Над Ольсайракой» (1966). Памёр 3.3.1974 г.

П. В. Яхантаў.

ВІТОЛЬ Ян Карлавіч, нарадзіўся ў 1906 г. ў в. Матуша Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. Пасля грамадзянскай вайны накіраваны на вучобу ў Маскву. З 1928 г. ў Чырвонай Арміі, служыў на Далёкім Усходзе. Пасля дэмабілізацыі працаваў у органах НКУС у Касцюковіцкім і Клічаўскім р-нах. Перад вайной узначальваў аўтакалону ў Клічаве, адначасова вучыўся ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. 2 ліпеня 1941 г. паводле рашэння Клічаўскага райкома партыі разам з П. М. Вікторчыкам і Я. І. Зайцам увайшоў у склад адной з груп, што павінны былі стаць арганізацыйным ядром партызанскага руху і падпольнай барацьбы на тэрыторыі раёна. Прымаў актыўны ўдзел у выкананні гэтага рашэння, быў камандзірам роты 277-га партызанскага атрада. 20 сакавіка 1942 г. пры разгроме нямецка-паліцэйскага гарнізона ў Клічаве смяротна паранены. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

ДЗЯМІДАЎ Аляксандр Сяргеевіч, нарадзіўся 22.7.1919 г. ў в. Базякова Багульмінскага р-на (Татарстан). З 1939 г. ў Чырвонай Арміі. У 1941 г. скончыў ваеннае пяхотнае вучылішча. У ліпені 1941 г. ўдзельнічаў у абароне Магілёва. Са студзеня 1942 г. ў партызанах: камандзір узвода, роты, атрада, з ліпеня 1943 г. камандзір 15-га партызанскага палка. Пасля вайны на савецкай рабоце ў Гродне. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, медалямі. Аўтар кнігі «У атаку падымаўся першым» (1967).

ЗАЯЦ Якаў Іванавіч, нарадзіўся 19.3.1908 г. ў г. п. Клічаў. З 1928 г. на камсамольскай рабоце, з 1937 г. ў Клічаўскім РК КП(б)Б. З ліпеня 1941 г. ў тыле ворага: з лістапада 1941 г. камісар партызанскага атрада 277-га, партызанскага атрада 278-га. У красавіку 1942 г.— маі 1944 г. сакратар Клічаўскага падпольнага РК КП(б)Б, адначасова ў жніўні — лістападзе 1942 г. член падпольнага Бабруйскага міжрайкома, у красавіку 1943 г.— маі 1944 г. член Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б, у ліпені 1943 г.— маі 1944 г. кіраўнік Клічаўскай ваенна-аператыўнай групы. З 1944 на партыйнай рабоце. Памёр 22.10.1973 г.

ІЗОХ Ігнацій Зіноўевіч, нарадзіўся 24.12.1906 г. ў г. п. Клічаў. Скончыў Вышэйшую камуністычную сельскагаспадарчую школу Беларусі (1936). З 1936 г. на гаспадарчай і педагагічнай рабоце. У партызанах з ліпеня 1941 г.: камандзір, камісар атрада, з лістапада 1942 г. камісар, у снежні 1942 — маі 1943 г. камандзір партызанскай брыгады 2-й Клічаўскай, у верасні 1943 г.— маі 1944 г. камандзір партызанскага палка 277-га, адначасова ў ліпені 1943 г.— маі 1944 г. камандзір Клічаўскай ваенна-аператыўнай групы, член Клічаўскага падпольнага РК КП(б)Б. З 1945 г. на савецкай і гаспадарчай рабоце. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Кутузава II ступені, Айчыннай вайны I і II ступеняў, медалямі. Памёр 9.8.1977 г.

КНІГА Мікалай Іванавіч, нарадзіўся 22.5.1912 г. ў в. Максімавічы Клічаўскага р-на. З 1930 г. сакратар Максімавіцкага сельсавета. Пасля службы ў Чырвонай Арміі старшыня сельсавета ў в. Доўгае, загадчык райфінаддзела ў Клічаве. У партызанах з лютага 1942 г.— палітрук роты, у чэрвені 1942 г.— кастрычніку 1943 г. камандзір 278-га партызанскага атрада, са студзеня 1944 г. камісар 277-й партызанскай брыгады. Пасля вайны на савецкай і гаспадарчай рабоце ў Бабруйску. З 1971 г. на пенсіі. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Памёр 19.4.1987 г.

НІЧЫПАРОВІЧ Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся 2.3.1900 г. ў с. Багародскае Загорскага раёна Маскоўскай вобл. Генералмаёр (1943). Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Маскве. З 1917 г. ў Чырвонай гвардыі, з 1918 г. ў Чырвонай Арміі, удзельнік грамадзянскай вайны. З 1924 г. на камандных пасадах у ВВА. У пачатку Айчыннай вайны на фронце, камандзір дывізіі. Удзельнік Мінскага партыйнага падполля. З канца 1941 г. ў партызанах, адзін з ініцыятараў стварэння і камандзір 208-га партызанскага атрада (гл. Партызанскі полк 208-ы імя І. В. Сталіна). У красавіку — верасні 1942 г. камандзір Клічаўскага аператыўнага цэнтра. У верасні 1942 г. адкліканы ў Маскву і прызначаны намеснікам камандзіра 4-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса. У 1943 г. арыштаваны. Памёр 31.1.1945 г. Рэабілітаваны ў 1952 г. У Пружанах яго імем названа вуліца, устаноўлена мемарыяльная дошка.

ЮРКАЎЦАЎ Андрэй Сцяпанавіч, нарадзіўся 13.7.1908 г. ў в. Бёрда Клічаўскага р-на. Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б (1948). З 1926 г. рабочы. З 1930 г. ў Чырвонай Арміі. У Айчынную вайну на фронце з чэрвеня 1941 г., камандзір батальёна. У партызанах з верасня 1941 г.— камандзір групы, атрада 277-га, начальнік штаба брыгады; з ліпеня 1943 г. камандзір партызанскай брыгады «Беларусь» Мінскай вобласці. Удзельнік вызвалення ад нямецка-фашысцкіх акупантаў Клічава ў сакавіку 1942 г. З 1944 г. працаваў у ЦК КП(б)Б, з 1948 г. сакратар Бярэзінскага РК КП(б)Б Мінскай вобласці. У 1949—58 гг. на гаспадарчай рабоце. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі, ордэнам ЧССР. Памёр 1.5.1991 г.

ЯХАНТАЎ Пётр Валяр'янавіч, нарадзіўся 24.6.1908 г. ў в. Будакова Данілаўскага раёна Яраслаўскай вобл. Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1940). З 1925 г. ў Чырвонай Арміі. З чэрвеня 1941 г. начальнік штаба дывізіі. З верасня 1941 г. член Барысаўскага партыйна-патрыятычнага падполля, у верасні 1942 г.— красавіку 1943 г. камандзір Клічаўскага аператыўнага цэнтра, адначасова з верасня 1942 г. камандзір 208-га партызанскага атрада, з лістапада 1942 г.— 1-й Клічаўскай партызанскай брыгады. У красавіку — жніўні 1943 г. камандзір ваенна-аператыўнай групы пры Магілёўскім падпольным абкоме КП(б)Б, у красавіку — жніўні 1943 г. член Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б. У 1943—53 гг. у арміі. Памёр 26.7.1972 г.

Баявыя аперацыі

Партызанскія фарміраванні, што дыслацыраваліся на Клічаўшчыне, грамілі акупантаў не толькі на тэрыторыі гэтага раёна, а і далёка за яго межамі. Пра гэта сведчыць карта-схема дзеянняў клічаўскіх партызан летам-восенню 1942 г. пасля прарыву варожай блакады ва Усакінскіх лясах, а яшчэ больш — дакументальныя звесткі пра баявыя аперацыі.

Так, 9.9.1942 г. партызаны 277-га атрада ўзарвалі мост цераз р. Нача, які меў стратэгічнае значэнне на чыгуначнай магістралі Мінск — Орша, і ў час аперацыі



Аўтар У.С.Пасэ

нанеслі вялікія страты ворагу. Падрыхтавалі план і кіравалі гэтай аперацыяй камандзір атрада С. А. Мазур і камісар І. З. Ізох. Двойчы — у кастрычніку 1943 г. і ў сакавіку 1944 г.— партызаны гэтага ж 277-га атрада разграмілі гарнізон праціўніка ў в. Пацава Слабада Кіраўскага р-на, а ў кастрычніку 1943 г. і ў чэрвені 1944 г. з удзелам клічаўскіх партызан варожы гарнізон у в. Казулічы Кіраўскага р-на.

Пры актыўным удзеле клічаўскіх партызан у 1943 г. ажыццёўлены Бялыніцкія аперацыі супраць сістэмы нямецка-фашысцкіх гарнізонаў у Бярэзінскім, Быхаўскім, Кіраўскім і Клічаўскім раёнах. Першую аперацыю па адначасовым разгроме гарнізонаў праціўніка ў вёсках Бахані, Глыбокі Брод, Дручаны, Журавок, Забавы, Заполле, Макаўка, Сямікаўка правялі ў ноч на 13.4.1943 г. партызанскія брыгады 2-я і 5-я Клічаўскія, 3-я Бярэзінская, 6-я Магілёўская. Да раніцы 13.4.1943 г. 8 варожых гарнізонаў перасталі існаваць. У ноч на 26.8.1943 г. партызаны (партызанскі полк 208-ы імя Сталіна, асобныя атрады 12-ы, 28, 36, 113, 121-ы, 122-і «За Радзіму», 152-і, 277-ы, 425, 810-ы) правялі ў трохвугольніку в. Паплавы — чыг. ст. Тошчыца (на ўчастку Орша — Жлобін) — г. п. Бялынічы другую аперацыю: разграмілі 8 нямецка-фашысцкіх гарнізонаў у в. Вяшэўка, Гарэнічы, Нясята, Арэшкавічы, Падсёлы, Паплавы, Тошчыца і Шавярнічы, на агульнай плошчы больш за 1500 км². Трэцюю аперацыю партызаны правялі ў ноч на 11.9.1943 г. У ёй удзельнічалі 208-ы партызанскі полк імя Сталіна і 27 атрадаў Бялыніцкай, Бярэзінскай, Быхаўскай, Клічаўскай, Круглянскай, Магілёўскай і Шклоўскай ВАГ, усяго больш за 4 тыс. чалавек. Партызаны адначасова атакавалі нямецка-фашысцкія гарнізоны ў г. п. Бялынічы, вёсках Малая і Вялікая Машчаніца, Дашкаўка, Галоўчын, Алешкавічы, Пушча, на чыгуначным раз'ездзе № 14 на лініі Магілёў — Быхаў, ваенным гарадку ў в. Салтанаўка, а таксама апорныя пункты каля мастоў цераз рэкі Друць і Аслік (Асліўка) на шашы Магілёў — Мінск. Усе гэтыя Бялыніцкія аперацыі ажыццёўлены Магілёўскім партызанскім злучэннем пад кіраўніцтвам Магілёўскага падпольнага абкома партыі і адносяцца да ліку найбольш буйных аперацый партызан Беларусі супраць тылавых гарнізонаў праціўніка ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

На рахунку клічаўскіх партызан нямала іншых удалых баявых аперацый, праведзеных па-за межамі Клічаўскага р-на. Найбольш значныя з іх будуць асветлены ў кнігах «Памяць» тых раёнаў, дзе яны былі ажыццёўлены. А мы змяшчаем успаміны ўдзельнікаў тых баёў, што адбыліся на тэрыторыі Клічаўскага р-на.

Бой за Клічаў

З успамінаў Героя Савецкага Саюза В. І. Лівенцава

...Калі мы прыбылі ў Смалярню, мясцовыя партызаны рыхтаваліся да канчатковага разгрому клічаўскага гарнізона, які быў блакіраваны з усіх бакоў і ўжо каля месяца падтрымліваў сувязь з Бабруйскам толькі з дапамогай самалётаў. За дзень да нашага прыходу гітлераўцам скінулі з самалётаў боепрыпасы і рыштунак. Гэта акалічнасць некалькі занепакоіла партызан.

— Мы здорава прашляпілі з гарнізонам у Клічаве,— у роспачы гаварыў мне Свістуноў.— Нельга было нам марудзіць з яго ліквідацыяй. У іх жа не было нават чым супраціўляцца, а мы ўсё цягнулі, сумняваліся. Заселі там чалавек трыста, можа, і болей...

Кожны партызан разумеў, што знішчыць гэта асінае гняздо неабходна, і чым раней, тым лепш. Гарнізон знаходзіўся ў нас у тыле і скоўваў усе нашы дзеянні. Таму атрады неадкладна пачалі рыхтавацца да штурму.

Мы адразу ж уключыліся ў агульнае баявое жыццё. У іншых атрадах не было цяжкага ўзбраення, а ў нашым — гарматы, мінамёт, станковыя кулямёты. Перад наступленнем мы з Ізохам абмяняліся ўзводамі — каб абодва атрады былі ўзброены амаль аднолькава.

Штурм вырашылі правесці 20 сакавіка 1942 года. 19 сакавіка ўсе атрады рушылі на зыходныя пазіцыі. Наш атрад праз Ольсу павінен быў выйсці да цэнтра пасёлка, а Ізохавы — захапіць мост і замацавацца на левым яго баку. Партызанам Свістунова даручылі абысці Клічаў з поўначы і перакрыць дарогі на Усакіна і Сушу. Атрад Васіля Ігнатавіча Сырцова хаваўся ў засадзе каля вёскі Яўсташына ў якасці рэзерву.

Гарнізон быў заціснуты з усіх бакоў. У белых халатах паверх кажухоў і ватовак людзі нашага атрада бясшумна падышлі да ракі і затаіліся ў прыбярэжных хмызняках. Узвод, прыдадзены Ізоху, узначаліў Ляпёшкін. А вакол мяне знаходзіліся ізохаўскі камандзір роты Іван Карлавіч Вітоль і палітрук Пётр Мацвеевіч Вікторчык. Пётр хваляваўся. Больш чым паўгода не быў ён у Клічаве, дзе заставалася яго сям'я. Можа, нікога ўжо няма ў жывых? А можа, праз некалькі хвілін абдыме маці, сястру, малодшага брата? Колькі радасці будзе!

Іван Вітоль — былы начальнік аўтакалоны, адзін з першых кіраўнікоў партызанскага атрада.

— Я пайду наперад, ведаю тут кожны закутак,— прапанаваў ён.

Пачынала світаць. Пасёлак быццам па прыступках узбіраўся на прыгорак. Удалечыні быў відаць чырвоны дах райвыканкома, цагляныя сцены школы. Вакол — чысценькія жоўтыя і сінія дамкі.

Атрад высунуўся да самага берага ракі і сачыў за гарнізонам. Ззаду падрыхтаваліся да бою гарматы і мінамёт, прыкрытыя пакуль белымі прасцінамі. Мы чакалі сувязных ад Ізоха, каб адначасова пачаць штурм. Але вось прыйшлі і яны: можна пачынаць. Выстрал нашай гарматы павінен быў паслужыць сігналам для агульнага наступлення.

У гэты момант нас непакоілі наступныя акалічнасці: калі мы зробім выстрал і растрывожым гарнізон, то наўрад ці пераадолеем без страт адкрытую прастору паміж узлескам і пасёлкам. Вырашылі падцягнуць атрад бліжэй да раённага цэнтра і толькі тады даць сігнал для атакі.



Герой Савецкага Саюза В. І. Лівенцаў.

Пакінуўшы на агнявой пазіцыі толькі разлікі, мы з Вітолем праз заснежаны луг, схаваныя паўзмрокам і марознай смугой, выйшлі са сваім падраздзяленнем да ўскраінных дамоў. Толькі цяпер пачуўся раскацісты гарматны выстрал. Снарад ударыў па двухпавярховым будынку. Прагучаў другі, трэці выстрал... Ланцугі партызан, хаваючыся за пабудовамі, агароджамі, кінуліся да цэнтра пасёлка. Я дагнаў узводы амаль на цэнтральнай плошчы, дзе ўжо разгараўся бой. З абодвух бакоў застракаталі кулямёты. Як толькі варожыя кулямётчыкі адкрылі агонь па плошчы, іх адразу ж блакіравала група партызан. Гэта дало магчымасць астатнім партызанам хутка ўварвацца ў будынкі, дзе заселі гітлераўцы, паліцыя і раённае начальства.

Узвод Ізоха пад камандаваннем Івана Вітоля хутка заняў будынак райвыканкома, які гітлераўцы ператварылі ў казарму. Тут мы ўзялі ў палон больш за дзесяць фашыстаў. Напаўраздзетыя і ашаломле-

Разгром нямецка-паліцэйскага гарнізона ў Клічаве ў сакавіку 1942. Дыярама ў раённым музеі.

ныя раптоўным нападам партызан, яны былі сагнаны ў асобны пакой. Страціўшы ўвесь свой гонар, заваёўнікі трэсліся ад страху. Тут жа стала вядома, што асноўная частка салдат гарнізона пасля першых выстралаў уцякла на левую ўскраіну пасёлка з намерам прарвацца ў напрамку Бабруйска. Але іх сустрэлі атрад Ізоха і ўзвод Ляпёшкіна. Цяжкі бой, які там пачаўся, сведчыў пра адчайныя спробы гітлераўцаў пазбегнуць расплаты. Аднак гэта ім не ўдалося: пасёлак шчыльным кальцом акружылі партызаны. Толькі на ўчастках Свістунова і Сырцова было адносна спакойна. Аднак у нас, у цэнтры, становішча ўскладнялася.

Трапіўшы ў бязвыхаднае становішча, частка гітлераўцаў паспела схавацца за цагляныя сценамі школы і адчайна абаранялася. Моцны кулямётны агонь адтуль не даваў нам магчымасці дапамагчы Ляпёшкіну і Ізоху, нават прымусіў нас адысці за дамы. Пад абстрэлам трымаліся і ўсе вуліцы, што прылягалі да плошчы.

Трэба было неадкладна ачысціць школу. Імклівы націск аддзялення Мітрафанава пацярпеў няўдачу: два партызаны былі забіты. Спроба партызан Ігара Ільіча Карэлкіна наблізіцца да будынка з іншага боку таксама скончылася трагічна: застракаталі кулямёты, ад паркана, дзе прысеў Карэлкін, паляцелі трэскі. Нехта крыкнуў яму: «Лажыся!» Але было позна: Карэлкін быў забіты. Камандзір аддзялення Мікалай Іванавіч Чайнікаў, які прыкрываў яго, схапіў супрацьтанкавую гранату і з воклічам «За Карэлкіна!» кінуўся наперад. Гэта была непатрэбная храбрасць, азарт, і я скамандаваў:

— Назад!

Але Чайнікаў ужо быў у цэнтры плошчы на адкрытым месцы. На яго абрушыўся ўвесь агонь праціўніка. Наш агонь у адказ па вокнах і дзвярных праёмах аслабіў, але не спыніў супраціўлення гітлераўцаў. Чайнікаў, відаць, зразумеў, у якім вогненным коле ён апынуўся, спрабаваў схавацца за аўтамабільнымі коламі, што ляжалі там. Але яны аказаліся дрэннай абаронай, і яго зрашэцілі кулі.

За некалькі хвілін мы страцілі чатырох чалавек. Занадта дарагая цана. Трэба было хутка падцягнуць гармату і паклікаць на дапамогу партызан Свістунова. Але сувязных ад яго не было і мы не ведалі, у якім становішчы знаходзіцца ўвесь атрад.

У гэты момант з таго боку, адкуль павінен быў падысці Свістуноў, пачулася частая перастрэлка. Яна набліжалася. Потым у бой уступілі адразу некалькі кулямётаў. І вось то тут, то там сталі з'яўляцца нешматлікія групы гітлераўцаў і разбягацца па дварах. Разбітыя Свістуновым, яны напароліся на наш атрад і ў паніцы хаваліся па гарышчах, падвалах і хлявах. Нам не было часу валтузіцца з імі.

Я паслаў сувязных за гарматай і мінамётамі, а сам з узводам застаўся каля школы. Астатнія партызаны на чале з Цвяцінскім рушылі на злучэнне са Свістуновым. Цвяцінскі хутка рушыў наперад і знішчаў на хаду ачагі супраціўлення.

Пасёлак гарэў, яго зацягнула дымам. Рыкалі ў дварах каровы, вішчалі, бегалі па вуліцах свінні, іржалі коні. У гэтым хаосе мы пачулі шум матораў. У паветры з'явіўся варожы самалёт. Відаць, гарнізон па радыё запрасіў дапамогі. Самалёт хутка павярнуў назад і знік у напрамку Бабруйска.

— Запасай, хлопцы, кацялкі! Фашысты рыхтуюць нам закусь,— крыкнуў нехта.

На ганку паліцэйскай управы Мосін раздаваў захопленыя зброю і боепрыпасы. Зброю атрымлівалі і мясцовыя жыхары. Партызаны папоўнілі запас патронаў і гранат і накіраваліся туды, дзе ішоў бой.

Раптам з завулка выскачыў на тачанцы вядомы нам чарнявы кулямётчык Свістунова. За ім паказаліся астатнія партызаны яго атрада, якія гналі да цэнтра каля паўсотні палонных.

— Куды гэтыя трафеі? — спытаў шчуплы хлопчык у даматканай кашулі і кіўнуў галавой на палонных.

Я паказаў на ўправу.

— Ну і справы! Даўно б так,— падбягаючы да мяне, выкрыкнуў Свістуноў і выцер пот з ілба.— Ты тут галоўны? Куды цяпер гнаць?

Я растлумачыў становішча. Свістуноў пакінуў мне частку людзей і ў абход школы рушыў на дапамогу Ізоху і Ляпёшкіну. Не паспеў ён выйсці ў раён сквера, як і яго дагнала варожая куля. Паранены ў шыю, ён хоць і застаўся ў страі, але кіраваць боем больш не мог. Камандаванне атрадам прыняў яго камісар Міхаіл Спяранскі.

У гэты час прыбег сувязны ад артылерыстаў.

— Разлік гарматы толькі што расстраляў групу немцаў, якая спрабавала вырвацца з пасёлка. Гармата знаходзіцца ў дарозе да нас,— далажыў ён.

Хутка з'явілася наша доўгачаканая гармата і прамой наводкай грымнула па школе. Агонь адтуль спыніўся. Мы авалодалі цэнтрам Клічава. Пасля кароткай перадышкі пачалася ачыстка ўскраін. Рэшткі разгромленага гарнізона хаваліся толькі ў асобных будынках. Іх або знішчалі, або прымушалі здавацца ў палон. Сям-там зноў узнікалі кароткія, але шалёныя сутычкі. У адной з іх быў цяжка паранены Іван Вітоль. Яго ўзвод ачышчаў ад праціўніка тэрыторыю, якая прылягала да маслазавода. Завод захапілі даволі хутка. Іван Вітоль праз суткі памёр. Мне назаўсёды запомніўся гэты мужны чалавек. Не ведаю, якой была яго сустрэча з сям'ёй. А можа, ён так і не паспеў забегчы ў бацькоўскую хату, хоць і знаходзіўся зусім побач.

Мы закончылі прачэсваць цэнтральную частку пасёлка, як раптам па нас разануў кулямёт. Партызаны акружылі дом, адкуль стралялі. У хляве знайшлі паліцая.

— Ты страляў? — спытаў у яго.

— Не. У мяне, бачыце, няма кулямёта. Гэта адтуль,— залемантаваў ён і паказаў на дом.

Партызаны кінуліся туды, і па іх адразу ж разануў кулямётна-вінтовачны агонь. Хлопцы заляглі. Каб не рызыкаваць жыццём людзей, вырашылі выкурыць гітлераўцаў з будынка агнём.

— Марш за саломай! — загадаў палоннаму паліцаю.

Паліцай паслухмяна стаў патрашыць снапы і кідаць іх да сцяны хаты.

— Падпаліць! — скамандаваў яму.

Калі салома загарэлася, з хаты пачуліся галасы:

— Не страляйце! Здаёмся! Будзем выходзіць!

З вокнаў у двор паляцела зброя. Калі адзін за адным выйшлі з дзесятак здраднікаў, Мітрафанаў не вытрымаў і даў чаргу з аўтамата. Паліцаі са страхам адскочылі назад.

— Не страляйце! Здаёмся! — пачулася зноў.

Полымя ўжо ахапіла дах. У хаце прагучаў выстрал. З расчыненых дзвярэй зноў з'явіліся паліцаі з паднятымі рукамі. Наперадзе яны неслі забітага начальніка паліцыі і спадзяваліся, відавочна, тым самым заслужыць дараванне за сваю здраду.

— Мы даўно здаліся б у палон, але ён не дазваляў,— гаварылі яны і паказвалі на забітага.

— Як тваё прозвішча? — запыталі мы ў аднаго з маладых паліцаяў.

— Лысенка.

— Ці даўно ў паліцыі?

— Дзевяць дзён. Ноччу падняліі з пасцелі, прывялі ў камендатуру, далі вінтоўку. Гавораць, калі ўцячэш, сям'ю расстраляем. Паверце, я не хацеў. Савецкая ўлада мяне чалавекам зрабіла. Я не мог здрадзіць!

Лысенка аказаўся сапраўды нашым чалавекам, які заставаўся ў паліцыі па заданні партызан. Гэта ён і забіў здрадніка — начальніка паліцыі. На допыце высветлілася, што дзён за восем да пачатку аперацыі акупанты з мэтай папаўнення гарнізона наладзілі паляванне за моладдзю. Партызаны выкарысталі гэту магчымасць для засылкі сваіх людзей у логава ворага. Моладзь папярэдзілі, каб яна не аказвала супраціўлення пры аблавах і не хавалася, а атрыманую зброю павярнула супраць акупантаў пры штурме гарнізона. Гэты манеўр бліскуча ўдаўся. Менавіта таму супраціўленне гітлераўцаў і было зломлена так хутка.

У ліку засланых апынуўся і Валодзя Молеў. У ноч перад аперацыяй яго разам з мацёрым паліцаем паставілі ў дазор. Пасля першых жа выстралаў Валодзя забіў здрадніка і разам з намі прыняў удзел у штурме гарнізона.

Калі мы дабівалі рэшткі гарнізона, Лысенка пад агнём папоўз да Ізоха, але з паўдарогі вярнуўся і папрасіў дазволу забіць бургамістра, які адстрэльваўся з акопчыка. Неўзабаве перада мной ляжала сумка з дакументамі і зброя бургамістра. Лысенка заставаўся ў нашым атрадзе, добра ваяваў, і неўзабаве яго прызначылі камандзірам аддзялення разведкі. Такіх, як Лысенка, у гарнізоне аказалася каля паўсотні. Усе яны баявымі подзвігамі апраўдалі сваё партызанскае званне. Пасля прачэсвання ўскраін гарнізон быў поўнасцю ліквідаваны.

На допыце адзін са здраднікаў расказаў, што не так даўно фашысты вылавілі савецкі парашутны дэсант, які быў скінуты для сувязі з партызанамі, і што ў дэсантнікаў была рацыя. Дэсант высаджваўся ноччу і памылкова трапіў у раён пасёлка, фактычна ў лапы ворага. Гэта сумная вестка хутка абляцела атрады. Партызаны патрабавалі пакараць усіх, хто ўдзельнічаў у той расправе.

Пры разгроме гарнізона чатыры байцы нашага атрада былі забіты, некалькі чалавек паранены, у тым ліку Андрэй Сумбаеў, Сяргей Крамнёў і Рыгор Кустоў.

Заставацца ў пасёлку мы не збіраліся, бо ведалі, што фашысты кожную хвіліну могуць бамбіць Клічаў. Аб гэтым папярэдзілі насельніцтва і прапанавалі ў выпадку небяспекі ісці ў лес пад ахову партызан...

Друкуецца па кн.: Лівенцев В. И. Партизанский край. 4 изд. Мн., 1983. С. 121—127 (у перакладзе на беларускую мову).

* * *

Ва ўспамінах В. І. Лівенцава, што змешчаны вышэй, апісаны бой за вызва-

ленне Клічава ў сакавіку 1942 г. Асноўны ўдар па цэнтры пасёлка разам з атрадам Лівенцава наносіў Клічаўскі атрад (камандзір А. С. Юркаўцаў). У гэтым баі было забіта каля 120 акупантаў, захоплены каля 50 палонных, вялікая колькасць зброі і боепрыпасаў. У баі загінула 11 і паранена 13 партызан. З разгромам гарнізона ў Клічаве завяршылася вызваленне ўсяго Клічаўскага р-на ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, была створана Клічаўская партызанская зона, партызаны атрымалі магчымасць прымаць самалёты з Вялікай зямлі. На працягу 3 месяцаў пасля сакавіцкага бою 1942 г. партызаны ўтрымлівалі Клічаў. У ліпені 1942 г. пад націскам намнога большых сіл праціўніка яны былі вымушаны пакінуць пасёлак.

Бой за Клічаў у красавіку 1943 г. быў часткаю плана, распрацаванага камандаваннем Магілёўскай ваенна-аператыўнай групы (ВАГ) пры Магілёўскім падпольным абкоме КП(б)Б, па знішчэнні нямецка-фашысцкіх гарнізонаў. Каардынаваў дзейнасць партызанскіх брыгад начальнік штаба Магілёўскай ВАГ С. Г. Сідарэнка-Салдаценка. Клічаўскі гарнізон (каля 200 гітлераўцаў) меў на ўзбраенні гармату, 4 мінамёты, каля 20 кулямётаў і іншую зброю, быў умацаваны некалькімі дзотамі, сістэмай акопаў.

У адпаведнасці з планам партызанская брыгада 2-я Клічаўская ва ўзаемадзеянні з партызанскай брыгадай 5-й Клічаўскай і ротай партызанскай брыгады 1-й Клічаўскай у 3 гадзіны раніцы 21 красавіка пачала наступаць на Клічаў з поўдня, уздоўж правага берага р. Ольса, партызанская брыгада 5-я Клічаўская (атрады 61-ы, 620-ы, 760-ы) — уздоўж цэнтра пасёлка. Ведаючы пра сканцэнтраванне партызан 277-га атрада 2-й Клічаўскай брыгады ў раёне зыходнага становішча, гітлераўцы спрабавалі знішчыць атрад. Партызаны прынялі бой і разгромілі ворага. У 4 гадзіны раніцы 21.4.1943 г. партызаны пры падтрымцы артылерыйскага і мінамётнага агню ўварваліся ў Клічаў і занялі яго, за выключэннем умацаваных пазіцый гарнізона. Аднак праціўнік атрымаў падмацаванне, выкліканая авіяцыя правяла масіраваную бамбардзіроўку. Паводле загаду камандавання ВАГ партызаны адышлі. У баі гітлераўцы страцілі забітымі і параненымі каля 70 салдат і афіцэраў. Партызаны захапілі 3 кулямёты, мінамёт, 37 вінтовак, у баі страцілі 3 чалавек.

Развадаўскі бой

З партызанскіх нататак І. П. Крыскаўца

Стала вядома, што недалёка ад Усакіна, у вёску Развадава, прыехаў нямецкі карны атрад. Паводле даных нашай разведкі, карнікі заўтра, гэта значыць 5 красавіка, выступаюць на Усакіна, супраць нас. Вырашылі папярэдзіць іх і накрыць на месцы. Тут жа на нарадзе выпрацавалі план аперацыі. Ноччу ўсе атрады займаюць зыходныя рубяжы па ўзлесках вакол вёскі Развадава і ў 6 гадзін раніцы адначасова з усіх бакоў пачынаецца наступленне.

Раніцай у 5 гадзін усе былі на сваіх месцах. Пачынала світаць і мы назіралі за вёскай. Немцы выцягвалі на вуліцу абоз і паўзводна строіліся. Да 6 гадзін раніцы калона ўжо выцягнулася ў канец вёскі. Яны ішлі прама да нас, дзе мы маглі расстрэльваць іх з кароткай дыстанцыі, не даўшы нават развярнуцца. Але загад ёсць загад, і роўна ў 6 гадзін раніцы ён уступіў у дзеянне. А пачакаць яшчэ 10 мінут, і праціўнік быў бы на чыстым полі, а мы ў засадзе.

Загрымелі нашы гарматы, запрацавалі дзесяткі кулямётаў. Бой пачаўся. Некалькі немцаў упалі, астатнія папаўзлі ва ўкрыцці, якіх у іх было дастаткова: палатно чыгункі, равы, скляны, штабелі лесу — усё гэта служыла ворагу. Нам наступаць трэба па гладкім заснежаным полі больш кіламетра.

Карнікі абараняліся адчайна. Чатыры разы нашы роты хадзілі ў атаку, але адкочваліся назад пад шквальным агнём. Пазней устаноўлена, што ноччу да немцаў прыйшла яшчэ адна рота. Мы гэтага не ведалі і пачалі бой па старых разведданых.

Да 12 гадзін у нас ужо былі забітыя і раненыя. Трэцяя рота 208-га атрада страціла каля 20 чалавек. 620-ы атрад страціў камандзіра атрада Васіля Сырцова і камандзіра роты Котава.

У далейшым палкоўнік вырашыў не наступаць, а блакіраваць вёску. І гэта дало выдатныя вынікі. Немцы некалькі разоў спрабавалі вырвацца на Падгор'е, але тут іх сустракалі трапным агнём і з іх папярэдняй роты не ўцалеў ні адзін.

У 16 гадзін над полем бою з'явілася 8 бамбардзіроўшчыкаў. Яны бамбілі і залівалі кулямётным агнём узлескі, не даючы нам падняць галавы. Ад бомбы загінуў камандзір 760-га атрада Колбнеў і яго начальнік штаба, некалькі чалавек было ранена. Пад вечар загад — адысці глыбей у лес, пакінуўшы на ўзлесках дазоры. Гэта і выкарысталі недабітыя гітлераўцы. Чалавек 40 з іх уцяклі на Доўгае.

Раніцай мы зноў сцягнулі кальцо, але знайшлі там толькі забітых і параненых. Усе скляпы былі запоўнены раненымі, яны спаўзаліся туды, шукаючы паратунку ад партызанскіх куль.

Назаўтра адышлі ў лес. Праз некалькі дзён карнікі буйнымі сіламі наляцелі на Развадава, Падгор'е і Усакіна. Яны спалілі гэтыя вёскі, расстралялі дзесяткі мірных жыхароў. Большасць насельніцтва паспела пайсці ў лясы пад абарону партызан.

Бой у Развадаве многаму нас навучыў. Мы пераканаліся, што можам уступаць у адкрыты бой з немцамі і перамагаць іх, што гітлераўцы — героі толькі з безабароннымі старымі і дзецьмі, але яны трусліявыя, калі трапляюць у цяжкае становішча.

Зарэчанска-Усохскі бой

З успамінаў П. М. Вікторчыка

Ад разведкі і сувязных паступілі данясенні: «З Берліна ў Бабруйск прыбыў батальён СС пад камандаваннем маёра Гофмана»; «Дзве роты батальёна Гофмана з'явіліся ў Клічаве».

Мы спачатку не звярнулі асаблівай увагі на гэтыя данясенні. Бо шмат батальёнаў праходзіла праз Клічаў да фронту. І гэты, відаць, хутка пройдзе. Але наша здагадка не апраўдалася. Гофман асеў на Клічаўшчыне. Ён меў спецыяльнае заданне — знішчыць у раёне партызан і падпольшчыкаў, стварыць з мясцовага насельніцтва так званыя «органы кіравання». Выкармак берлінскага гестапа са скуры вылузваўся, каб выслужыцца перад сваімі шэфамі.

— Страляйце ў кожнага сустрэчнага, не шкадуйце ні старых, ні жанчын, ні дзяцей. Усе яны партызаны або звязаны з партызанамі,— павучаў кат сваіх галаварэзаў.

І эсэсаўцы стараліся. Яны расстралялі старога настаўніка Якава Семака і яго хворую жонку Агаф'ю, сям'ю старшыні Бацэвіцкай спажыўкааперацыі Івана Белакурскага, закатавалі да смерці жонку настаўніка Міхаіла Мядзведзева, раструшчылі галаву яе немаўляці. Ад рук бандытаў загінулі рабочы МТС Жураўскі, механік Радкевіч, інвалід грамадзянскай вайны Зенкавец, жыхары вёскі Бёрда браты Марк і Цімафей Тарэлкі. У адным толькі Клічаве карнікі расстралялі больш за пяцьдзесят чалавек, у асноўным жанчын і дзяцей. І ўсе гэтыя бязвінныя ахвяры ўваходзілі ў крывавыя зводкі Гофмана як партызаны, якія загінулі ў баях.

Мацёры эсэсавец выкарыстоўваў самыя гнюсныя і подлыя прыёмы, каб толькі выканаць загады і інструкцыі, што прыходзілі з Берліна. Ён спрабаваў нацкаваць адзін на аднаго нашых людзей, пасварыць іх, убіць паміж імі клін. Эсэсаўцы шнарылі па вёсках і пасёлках, падбіраючы з падонкаў стараст, паліцэйскіх...

Сярод камандзіраў пайшлі размовы аб тым, што трэба ўжо даць гітлераўскаму кату Гофману рашучы бой. На нарадзе каманднага саставу быў распрацаваны план аперацыі. Камандзіры і камісары, начальнікі штабоў атрадаў вырашылі зрабіць марш з нашай пастаяннай базы ў Бярозавым балоце ў вёску Усохі, там прабыць суткі і на світанні заняць клічаўскія дарогі. Меркаванне было такое: Гофман напэўна атрымае звесткі аб засяроджанні партызан ва Усохах і напэўна кіне на нас свой батальён. А мы загадзя падрыхтуемся да сустрэчы карнікаў.

Партызанскія атрады выступілі ў паход. 21 лютага мы ўвайшлі ва Усохі, папрасілі жыхароў на ўсякі выпадак перабрацца ў лес, а да вечара ўжо атрымалі данясенне ад нашых сувязных Івана Пракопавіча Ізоха і Міхаіла Сцяпанавіча Тарасевіча, якія ўладкаваліся па нашаму заданню на работу ў клічаўскую паліцыю, аб тым, што 22 лютага карнікі выступяць на Усохі.

Гэтага нам толькі і трэба было. На досвітку партызаны скрытна занялі зручныя пазіцыі. Атрад Ізоха размясціўся на ўзлессі ўздоўж дарогі, што вяла з вёскі Зарэчча ва Усохі. Узвод на чале з камандзірам Уладзімірам Раманенкам замацаваўся на могілках. Атрад Віктара Свістунова, які нядаўна замяніў на пасадзе камандзіра Спяранскага, размясціўся ў вёсцы Бярозаўка, на правым беразе ракі Ольсы. Атрад Сырцова заняў пасёлак Гліннае.

Мясцовасць нібыта вымерла. Цішыня. Прайшла гадзіна, другая, трэцяя. Ляжаць на снезе холадна. Я так адубеў, што зуб на зуб не трапляў. Па полі мяце замяць, да болі коле ў вачах. Партызаны час ад часу расціраюць падмарожаныя твары,

пераварочваюцца з боку на бок. Ледзяны холад прабірае да касцей. Узнікаюць думкі, ці не дарма мы ляжым.

А другой гадзіне дня ад назіральнікаў паступіў сігнал: «Карнікі!». Па ланцугах паляцела каманда: «Падрыхтавацца да бою!».

Людзі ўглядаліся ў дарогу. З боку вёскі Зарэчча паказаліся фурманкі. Коні ўсё бліжэй і бліжэй. Пачашчана б'ецца сэрца. Забыліся і пра мароз, і пра калючую замяць. Вось ужо бачныя фашысты ў санях. Многія ўкруціліся ў коўдры. Гэта добра! Пакуль гітлеравец выкруціцца з коўдры, яго можна застрэліць. Падводы параўняліся з правым флангам засады. Пара! Але чамусьці не спяшаецца камандзір. У мяне палец ужо даўно на спускавым кручку і ледзве хапае сілы, каб стрымаць сябе, не націснуць. І раптам гучнае, як выстрал: «Агонь!»

Над дарогай забушаваў шквал агню. Карнікі вывальваліся з саней, паўзлі ў бакі, адстрэльваліся. Некаторыя коні панесліся. Стогны, лямант... Праз гром страляніны даносяцца каманды на нямецкай мове. Каля дзесятка гітлераўцаў кінуліся на партызанскі ланцуг. Але ўсе яны былі скошаны доўгай кулямётнай чаргой. З'явіліся страты і ў нас. Я бачу, як два партызаны пацягнулі параненых таварышаў у лес, далей ад бою.

Нешта змоўклі нямецкія каманды. Відаць, афіцэры перабітыя. У гітлераўцаў узмацнілася блытаніна. Адны з іх спрабавалі злавіць коней, каб на санях уцячы, другія хаваліся за гурбамі снегу і стралялі ўверх. Адзін фашыст схаваўся за забітым канём і страляў з аўтамата ўздоўж дарогі і тым самым не даваў партызанам узяць карнікаў у кальцо. Першым заўважыў нямецкага аўтаматчыка камандзір роты Вітоль. Бывалы воін, ён адразу зразумеў, што трэба рабіць. Іван Карлавіч схапіў ручны кулямёт, абышоў фашыста ззаду і даў чаргу. Агонь спыніўся. Нашы байцы выскачылі на дарогу, некаторыя перабеглі яе. Карнікі зразумелі, што іх акружаюць, і пачалі паўзці да лесу. Пачуліся крыкі «ўра!». Раздаліся гранатныя выбухі. Гэта партызаны кінуліся на ворага, які адыходзіў. Мы беглі па глыбокім снезе і стралялі па карніках на хаду.

Бой праз некаторы час сціх. На дарозе і ўзлессі засталіся забітыя гітлераўцы. Сярод іх, як мы даведаліся потым, быў і труп маёра Гофмана. Мы сабралі шматлікія трафеі: дзевяць аўтаматаў, дзесяць ручных кулямётаў, дваццаць вінтовак, некалькі тысяч патронаў.

Мацёраму гітлераўскаму ваўку прыйшоў канец...

Друкуецца па кн.: Викторчик П. М. Над Ольсой-рекой: Партиз. зап. Мн., 1966. С. 68—91 (у перакладзе на беларускую мову).

Дуброўскі бой

З партызанскіх нататак І. П. Крыскаўца

...Гарнізон Клічава — прыкладна каля 300 чалавек — адчуваў недахоп у боепрыпасах. Гэта мы ведалі і закрылі ўсе ўваходы і выхады з раёна.

Стала вядома, што 17 клічаўскіх паліцэйскіх, на чале з новым начальнікам паліцыі немцам Барцам, паехалі ў Бабруйск за боепрыпасамі. Мы перакрылі найбольш верагодныя шляхі іх вяртання і чакалі. Атрады Ізоха і Свістунова займалі пасёлкі Дуброва і Новы Спор — бліжэйшыя да Бабруйска населеныя пункты раёна.

16 сакавіка партызаны ад няма чаго рабіць гулялі ў ачко на трафейныя маркі, астатнія хлопцы адпачывалі. Нам ужо было сумнавата, некалькі дзён ціха, ніводнага выстралу.

Дуброва — пасёлак з трох вуліц. Мы займалі паўночную.

Раптам на першым пасёлку выстрал, потым другі, трэці, чацвёрты. Дзіка заскавытаў, завыў сабака.

— Які дурань страляе па сабаках,— пачаў хтосьці і не закончыў, бо затрашчаў нямецкі аўтамат.

— Ага, значыць, госці з'явіліся.

Каманды ніхто не падаваў, але з усіх хат ужо беглі туды, адкуль хлопалі выстралы.

Займаем сярэдні пасёлак і паміж дамоў прабіраемся на ўскраіну. Мы занялі крайні двор. Са мной Валодзя Гарбачэўскі з кулямётам, Валодзя Цярэшка з вінтоўкай. Такія дробныя групкі на кожным двары.

Немцы на калгасным двары, ад нас 100—200 метраў. Яны трашчаць з кулямётаў, аўтаматаў, трашчаць без карысці. Куды страляюць — не зразумееш.

Гарбачэўскі ўстанавіў кулямёт на штабель дроў і чакае. Мы не страляем. Праціўнік побач, але нас раздзяляюць кусты, нічога не відаць.

Прыняўшы наша маўчанне за слабасць, немцы асмялелі. Вось абоз крануўся па вуліцы, ад яго аддзялілася адна падвода і на шалёным галопе ляціць да нас. Ззаду яе страляніна. У санях пяцёра ў сініх шынялях і футрах.

Свае ці чужыя — вось пытанне, якое займае кожнага з нас. Доўга думаць нельга. Вось яны ўжо ў 50 метрах. Ніводнага знаёмага твару.

— Агонь!

І мы ўтрох разанулі ў лоб імчаўшайся падводзе. Адразу перакуліўся конь і седакі вываліліся ў снег. З усёй зброі мы адкрылі агонь па абозе.

У разгар бою з боку Новага Спору з'явіўся Свістуноў. Не зважаючы на посвіст куль, ён імчаўся ва ўвесь дух, на хаду аддаючы каманды.

— Першы батальён, абыходзь злева, трэці — справа, адразай адыход!

— Уперад за Радзіму! Бі фашыстаў!

Гэтая каманда была не столькі для нас, колькі для праціўніка. Там узняўся неймаверны галдзёж. Атака, якую яны рыхтавалі, сарвалася. Хлопцы здзекаваліся з ворага.

— Эй вы, загалдзелі, як сабакі, а што ж у атаку не ідзяце?

— Давайце цурук (назад) да чортавай мацеры з нашай зямлі.

— Эй, немчура, землякоў падбірайце! — крычалі хлопцы з-за ўсіх вуглоў, каверкаючы нямецкія словы і дапаўняючы іх важкімі рускімі слоўцамі.

Свістуноў з'яўляўся то тут, то там, аддаючы ўжо яўна надуманыя каманды. Яго голас выклікаў у ворага паніку. Яны хутка ўцяклі, пакінуўшы каля дзесятка падвод, не падабраўшы нават параненых.

Нашы трафеі — чатыры вазы патронаў. Як потым высветлілася, немцы ехалі на дапамогу гарнізону Клічава, везлі боепрыпасы.

Такім чынам, патронамі мы забяспечаны. Ноччу з 16 на 17 сакавіка пераязджаем у Кавязу, бліжэй да Клічава. Цяпер клічаўскія карнікі нам нястрашныя, мы нядрэнна ўзброены, маем баявы вопыт.

Ваевіцкі бой

З успамінаў А. Кузняцова

На кані, з гулкім цокатам капытоў па мёрзлай зямлі, Павел Патапейка падскакаў да Макея і падаў яму запіску. Камандзір разведкі паведамляў аб тым, што карнікі занялі Замачулле, Лебядзін Брод, Бярозавае Балота. Партызанскія атрады Марусава, Османа і Паўлава адыходзяць ад Перуноўскага ўрочышча.

Чытаў Макей данясенне Іорына і думаў: «Зразумела, хочуць акружыць нас, узяць ў «мяшок». А мы на ўдар адкажам двайным ударам, разгромім Ваевіцкі гарнізон». Так, гэта будзе падманны манеўр: немцы павінны кінуцца сюды выратоўваць Клічаў.

Ваевічы знаходзяцца пад самым Клічавам. Разгром гэтага гарнізона сапраўды астудзіць запал карнікаў. Яны будуць баяцца за раённы цэнтр і напэўна адцягнуць свае сілы на яго абарону як вялікага апорнага пункта карнай экспедыцыі.

Камандзіры атрадаў Сырцоў і Ізох так і вырашылі. План баявой аперацыі выглядаў прыкладна так: атрад Сырцова скрытна пераправіцца цераз Ольсу і там атакуе праціўніка. Ізохаўцы застануцца ў Макаўі. Калі фашысты, каб пазбегнуць акружэння, кінуцца ў Клічаў, тут іх сустрэне са сваім атрадам Ігнацій Зіноўевіч Ізох. Сакавіцкай раніцаю партызаны атрада Сырцова пайшлі ў паход, трымаючы шлях на Ваевічы.

Пад сотнямі ног гулка вохкала прыхопленая лёгкім марозікам зямля, з хрустам ламалася скарынка лужынак. Але ўзышло сонца і ўжо да паўдня дарогу развезла: яна ператварылася ў брудную мяшанку. Ісці цяжка, з раскіслай зямлі ногі не выцягнеш. Прайшлі спаленае Заполле. На пажарышчах хат самотна, быццам помнікі на могілках, стаялі белыя касцякі печаў. Вось і Сушанка. Рачулка вельмі маленькая, летам вераб'ю па калена, а тут разлілася: пеніцца расталай вадой, бушуе. Мост цераз яе разбураны, давялося пераправяцца па яго пакарабачаных фермах. Захараў лёгка, як цыркач, першым перабраўся на другі бераг. Следам за ім пераправіліся астатнія хлопцы...

І зноў атрад месіць гразь. Па разліках Макея, яны даўно павінны былі прыйсці ў Макаўе, дзе, напэўна, іх чакаюць ізохаўцы. Але нават прыкмет няма патрэбнай вёскі. Змяркалася.

Сырцоў паклікаў правадніка, спытаў, ці далёка вёска.

— Кіламетры два, не болей,— падумаўшы, адказаў той.

...У вёску прыйшлі стомленыя, з прамоклымі нагамі і галодныя. Гаспадар хаты сустрэў камандзіраў гасцінна.

— Праходзьце, хлопцы, стаміліся, мабыць.

У хату ўвайшоў Павел Патапейка. Скуласты рабы твар яго быў заляпаны граззю. Ён перадаў Сырцову новыя разведданыя

пра Ваевіцкі гарнізон. Там, акрамя немцаў, на адпачынку знаходзяцца італьянцы і іспанцы з «Блакітнай дывізіі». Усяго прыкладна чалавек восемдзесят. Калі за разведчыкам зачыніліся дзверы, Ізох сказаў:

— У Ваевічах фашысцкі інтэрнацыянал: там і немцы, і іспанцы, і італьянцы. Гэта нам на руку. Жывуць і бяды не прадчуваюць. А мы ім раніцой дамо ў хвост і ў грыву. Заначуем тут: уся Ольса ў праталінах і расколінах, ноччу можна патапіць хлопцаў.

Сырцоў згадзіўся:

— Няхай хлопцы адпачнуць. А раніцай і рушым.

На досвітку дзяжурныя паднялі партызан. Калона рушыла да ракі. Пераправаўляліся на другі бераг з вялікімі цяжкасцямі. Лёд трашчаў, выгінаўся, вось-вось трэсне. Хлопцы правальваліся ў ваду. Некалькі чалавек ледзь не патанулі. Спатрэбіліся прадбачліва ўзятыя ў вёсцы дошкі і жэрдкі.

З зыходнага рубяжа, стаўшы ў баявы парадак, партызаны рушылі на Ваевіцкі гарнізон. Ішлі ціха, прыгіналіся да самай зямлі. Вартавыя ўбачылі іх толькі каля ваколіцы, але было позна. Не сустракаючы супраціўлення, партызаны кінуліся да фашысцкай казармы. Адтуль па іх пачалі весці хаатычную стральніну. Распачаўся бой, партызаны займалі больш выгаднае становішча, і «саюзнікам-інтэрнацыяналістам» нічога не заставалася, як адступіць да ракі. Ворагі спадзяваліся перайсці Ольсу і ляснымі дарогамі дабірацца да Клічава. Але што гэта? Па рацэ марудна плылі крыгі.

— Лёд крануўся! Крыгаход! — прагучала на розных мовах.

Фашысты адстрэльваліся ад наступаўшых партызан, узбіраліся на льдзіны. Абыякавыя да лёсу людзей, ільдзіны плылі сваім шляхам, пераварочваліся, грувасціліся адна на адну, станавіліся старчаком і, бліснуўшы зялёным зломам, апускаліся ў чорны вір, уцягвалі з сабой тых, хто на іх стаяў.

Нямногім удалося перайсці на бераг. Але там іх сустрэла агнём партызанская засада.

Друкуецца па кн.: К у з н е ц о в А. Р. Партизанские ночи. Саратов, 1980. С. 25—29 (у перакладзе на беларускую мову).

На пераправе ў Заполлі

З партызанскіх нататак І. П. Крыскаўца

Дзесяцідзённыя вылазкі ў Клічаўскі раён, вярней, на яго подступы асобных варожых батальёнаў, былі толькі баявой разведкай ворага нашых сіл. Мы гэта меркавалі. Так яно і атрымалася.

15 ліпеня на подступах да нашага раёна з'явіліся ўжо рэгулярныя нямецкія часці з авіяцыяй і танкамі. Цяпер наступленне вялося з усіх бакоў адначасова: з боку Бабруйска, Асіповіч, Свіслачы, Беразіна, Магілёва, Чачэвіч, Быхава, Рагачова, Кіраўска.

Зноў на рубяжах загрымелі гарматы, затрашчалі кулямёты. Усе атрады выйшлі на барацьбу.

17 ліпеня спецатрад атрымаў заданне заняць абарону ў Заполлі, закрыць запольскую пераправу цераз раку Ольса па шляху Бабруйск — Любонічы, Бацэвічы — Клічаў. Выйшаў туды ўзвод Лукі Рыжковіча і заняў абарону па праваму берагу ракі Ольса. Праз суткі мы выйшлі да яго з астатнімі сіламі спецатрада. Становішча з кожнай гадзінай ускладнялася. Наша надзея на тое, што, сустрэўшы адпор, гітлераўцы адкоцяцца, не апраўдалася. Яны метадычна, не спяшаючыся, наступалі, захопліваючы і замацоўваючы рубяжы.

Ужо на маршы мы пачулі ўзмоцненую стральніну ў Заполлі. Злева баі ішлі ў Бярозавым Балоце, Перасопні, Рудні, Бёрда і навокал на ўсіх подступах да раёна.

У Заполлі нас ужо сабралася чалавек 70 з 6 ручнымі кулямётамі, адным «максімам», процітанкавым ружжом. Да нашага прыходу ўзвод вёў бой і ўзяў у палон аднаго немца. Палонны пакорлівы, як авечка, падлашчваецца, хваліць партызан і рускіх увогуле, шкадуе, што ваяваў супраць такога народа. Праклінае і ганьбіць Гітлера.

— Гітлер капут,— хто не чуў гэтага баязлівага ляманту ад палонных гітлераўцаў, якія ўчора яшчэ крычалі сваё «хайль».

Бой сціх. За мостам стаяў остаў спаленай нямецкай аўтамашыны, валяліся трупы эсэсаўцаў.

А пачаўся бой так.

Гэтая ноч была туманнай. Белай густой заслонай туман закрыў усё. На 10 метраў нічога не бачна. Асабліва густы туман спусціўся над ракой. Рабяты адпачывалі. Толькі ўзмоцненыя пасты і патрулі ахоўвалі сон байцоў і гэтага мірнага сяла, і вось перад світаннем з боку Бабруйска пачуўся шум матораў, гул нарастаў, набліжаўся.

Па вуліцы прабегла калгасніца Антаніна Кушнер. Яна стукала ў вокны, дзе размяшчаліся партызаны, і крычала:

— Хлопцы, чуеце? Машыны ідуць!

Хлопцы ўжо не спалі. Яны занялі загадзя падрыхтаваныя акопы і прыгатаваліся.

Машыны падышлі да спаленага моста і спыніліся, не выключаючы матораў. Колькі іх — невядома: туман белай ватай засланіў усё.

— Эй, падай лодку,— закрычалі з таго берага па-руску, але з яўна нярускім акцэнтам.

— Каму лодку? — наіўна запытаў вартавы.

— Агонь! — скамандаваў камандзір узвода, і адразу ж на тым баку ўзняўся галдзёж і тупат. Машыны, зароўшы матарамі, пачалі разварочвацца назад. Пачулася нямецкае «цурук», ужо добра знаёмае партызанам.

Стралялі без прыцэлу, проста па гулу машын, і ўсё ж стралялі недарэмна. На тым беразе ўжо стагналі раненыя, загарэлася адна машына, астатнія ўцяклі. Туман узняўся, і рабяты, узяўшы лодкі, паплылі за трафеямі. Тут яны выявілі аднаго цэлага немца. Баючыся падняць галаву, ён не змог своечасова адысці і так трапіў у палон.

У падбітай машыне ляжаў станковы кулямёт, многа патронаў, мін. Усё гэта нам вельмі патрэбна. Машыну спалілі.

У часопісах вёўся раздзел «Наш рахунак крываваму Гітлеру», у якім пералічваліся злачынствы акупантаў у Чавускім і іншых раёнах Магілёўскай вобл. На старонках часопісаў змяшчаліся партызанскія частушкі, у большасці сваёй сатырычныя, дзе высмейвалася бязглуздая ідэя Гітлера аб заняволенні народаў, а таксама падкрэслівалася значэнне партызанскага фронту ў справе зрыву планаў германскага камандавання.

Рукапісныя часопісы з'яўляюцца унікальнай скарбніцай творчасці народных мсціўцаў. Тут друкаваліся вершы і проза, змяшчаліся малюнкі і карыкатуры.

Рукапісныя часопісы партызанскіх фарміраванняў, што базіраваліся ў Клічаў-

Старонкі рукапісных партызанскіх часопісаў.

скім раёне, захоўваюцца ў музеі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску, у музеях рэвалюцыі і ў гістарычным музеі ў Маскве. Ёсць яны і ў прыватных калекцыях. У газеце «Правда» (22.8.1984) з'явілася заметка І. Новікава «Сшытак з Парыжа», у якой расказвалася пра знаходку ленінградскага мастака-рэстаўратара К. А. Грушавой, а ў часопісе «Звезда» (1985. № 2) публікацыя Ксеніі Аляксандраўны Грушавой «Загадка рукапіснага сшытка». Пошук далёкіх сваякоў мужа, нашчадкаў А. С. Пушкіна, прывёў Ксенію Аляксандраўну ў 1982 г. ў Францыю. У адным з прыватных парыжскіх клубаў педагогаў-пенсіянераў ёй паказалі звычайны агульны сшытак шэрага колеру. У ім былі 3-і і 4-ы нумары за 1942 г. рукапіснага часопіса «Партизан-диверсант» 128-га партызанскага атрада 14-й партызанскай брыгады, што дзейнічала ў 1942 г. на тэрыторыі Клічаўскага раёна.

У часопісе змешчаны заметкі аб баявых справах атрада з чэрвеня па лістапад 1942 г., замалёўкі з жыцця і баявой дзейнасці партызан. Апісаны апошні бой камандзіра разведвальна-дыверсійнай групы Алены Колесавай, пасмяротна ўдастоенай звання Героя Савецкага Саюза, а таксама аперацыя па разгрому фашысцкага гарнізона ў в. Выдрыца, якой камандаваў А. К. Спрогіс. У часопісе ўпамінаецца 60 прозвішчаў байцоў і камандзіраў. Рэдагавалі часопіс Л. А. Астаф'еў, М. С. Сярдзюк, Б. Ц. Шумілін. Апошні да вайны вучыўся на літаратурным факультэце Ленінградскага універсітэта. Пасля вайны генерал-палкоўнік Б. Ц. Шумілін выказаў меркаванне, што часопіс мог зацвезці ў Францыю хто-небудзь з ваеннапалонных французаў, прыгнаных на сапёрныя работы ў Беларусь і вызваленых партызанамі. Удалося ўстанавіць, што ўсяго ў 128-м партызанскім атрадзе было выдадзена не менш як 11 нумароў часопісаў (4 у 1942 і 7 у 1943 г.).

Захаваліся далёка не ўсе рукапісныя часопісы клічаўскіх партызан. Тыя, што ацалелі, з'яўляюцца унікальнай гістарычнай крыніцай. Яны сведкі таго, як жылі і змагаліся людзі ў глыбокім тыле ворага. Ды і самі яны былі змагарамі-салдатамі, процістаялі фашысцкай прапагандзе, неслі людзям словы праўды і аптымізму, веры ў перамогу.

Г. Д. Кнацько.

Неслі людзям праўду

З партызанскіх нататак І. П. Крыскаўца

...Вялікую ўвагу ўдзялялі мы ў сваёй рабоце прапагандзе і агітацыі, вуснай і друкаванай. Пры аддзеле прапаганды райкома быў моцны, працаздольны калектыў прапагандыстаў і агітатараў. Мы перыядычна інструктавалі іх, забяспечвалі адпаведнымі матэрыяламі, і людзі ехалі ў вёскі, расказвалі там праўду аб усіх важнейшых ваенных і палітычных падзеях.

...27 верасня 1942 г. выйшаў першы нумар клічаўскай раённай газеты «Голас партызана». Перадавы артыкул «Блізкі дзень перамогі над фашызмам» заклікаў насельніцтва раёна дапамагаць фронту, набліжаць перамогу, не даваць гітлераўцам ні грама хлеба. У артыкуле «Аплявуха фашыстам» газета расказвала аб разгроме навяспечанага фашысцкага гарнізона ў Коўбчы.

Справа была так. У палавіне жніўня ў фашысцкай газеце «Новый путь» было надрукавана паведамленне:

«Берлін, 11 жніўня. З Галоўнай кватэры фюрэра. Клічаўскі раён быў доўгі час цэнтрам партызанскага руху. Цяпер германскія ўзброеныя сілы закончылі аперацыю па разгрому моцных партызанскіх злучэнняў. Разгромлены дзесяткі ўмацаваных вёсак і апорных пунктаў. Знішчана 1400 і ўзята ў палон 1200 партызан, захоплена многа ўзбраення і харчавання. Разгромлена звыш 50 партызанскіх лагераў.

Клічаўскі раён і сумежныя раёны поўнасцю ачышчаны ад партызан. У раёне аднаўляецца парадак».

Усё гэта была хлусня. Як відаць, камандуючы аперацыяй ашукаў свайго «фюрэра». Мы вырашылі ў бліжэйшы час даказаць, што мы жывем. Хутка прадставіўся выпадак.

Для нагляду за Усакінскім лесам у Коўбчы было пасаджана 40 паліцэйскіх. Рашылі іх паганяць. Пайшоў узвод спецатрада і рота 208-га атрада. Удар быў настолькі нечаканы, што паліцыя не паспела заняць свае норы. У выніку 39 з 40 здраднікаў былі знішчаны. Адзін найбольш шпаркі змог уцячы ў Клічаў, дзе быў арыштаваны і расстраляны за паніку. Немцы не верылі, што яшчэ могуць быць партызаны пасля такога паведамлення стаўкі Гітлера.

У газетах мы паведамлялі аб зверствах фашыстаў, выкрывалі лжывую прапаганду Гебельса.

У гэты час пачала выходзіць раённая газета «За Советскую Родину» ў Асіповіцкім раёне. Яе рэдагаваў, як і да вайны, Павел Трацэўскі. Газету «Бобруйский партизан» рэдагаваў Сяргей Крамнёў. Пачалі выходзіць газеты ў Кіраўскім, Круглянскім, Магілёўскім, Бялыніцкім і Шклоўскім раёнах. Лістоўкі мы выпускалі рэгулярна з восені 1941 г. На кожнае злабадзённае пытанне, на кожнае мерапрыемства фашыстаў мы адказвалі сваёй лістоўкай.

Карныя аперацыі

Вясной 1942 г., пасля таго як у сакавіку Клічаў быў вызвалены партызанамі, у Клічаўскую партызанскую зону неаднаразова рабілі спробу ўварвацца асобныя карныя падраздзяленні гітлераўцаў. Але поспеху яны не мелі. У сваю чаргу кіраўніцтва партызанскай зоны, асабліва пасля ўтварэння Клічаўскага партызанскага злучэння, прымала энергічныя меры па расшырэнні партызанскага плацдарма. Пад канец чэрвеня 1942 г. абарончыя рубяжы партызан праходзілі па рэках Друць, Ольса, Суша, Бярэзіна, Нясета. Тэрыторыя паміж рэкамі Бярэзіна і Друць, шашэйнымі дарогамі Бабруйск — Чачэвічы, Беразіно — Бялынічы (агульная плошча каля 4 тыс. км^2) стала магутным партызанскім плацдармам. На гэтых рубяжах партызаны грамілі варожыя гарнізоны, пускалі пад адхон цягнікі, вялі «рэйкавую вайну», адбівалі нарабаваны ў мясцовых жыхароў скарб, ахоўвалі насельніцтва, зрывалі планы гітлераўцаў па вывазу рабочай сілы ў Германію. Дзеянні партызан стваралі пагрозу акупантам не толькі ў іх тыле, але і на франтах, куды з-за дыверсій на транспартных камунікацыях не маглі своечасова паступаць жывая сіла і баявая тэхніка. Таму нямецкае камандаванне прыняло рашэнне стварыць групоўку войск і распачаць карныя аперацыі супраць партызан і мясцовага насельніцтва партызанскай зоны.

«Хрушч-1» (Maikäfer-1). Карная аперацыя пад гэтай кодавай назвай праводзілася 30.6—20.8.1942 г. сіламі 203-й ахоўнай дывізіі, спецыяльнага карнага батальёна «Ост» і так званых добраахвотніцкіх батальёнаў «Бярэзіна» і «Дняпро». Абарону партызанскай зоны пад кіраўніцтвам Клічаўскага падпольнага РК КП(б)Б і Клічаўскага аператыўнага цэнтра ажыццяўлялі партызанскія атрады 208-ы імя Сталіна, 152-і, 277-ы, 537-ы, 620-ы імя Чапаева і 760-ы.

Пры падтрымцы звяна бамбардзіроўшчыкаў зводная група карнікаў уклінілася ў партызанскую зону з боку Бабруйска. Пацясніўшы слаба ўзброеныя атрады партызанскай самаабароны і невялікія дазорныя групы 277-га, 152-га і 537-га партызанскіх атрадаў, карнікі занялі вёскі Уласавічы, Любонічы, Сяргеевічы, Кострыцкая Слабада, Кострычы, Дуброва. Праўда, наступленне карнікаў не было нечаканым для партызан. Яшчэ 11 і 14 чэрвеня камандаванне 208-га партызанскага атрада імя Сталіна папярэдзіла аб гэтым камандзіраў партызанскіх атрадаў, якія ўваходзілі ў яго аператыўнае падпарадкаванне.

Калі наступленне карнікаў стала фактам і высветліўся намер праціўніка знішчыць партызан паміж рэкамі Ольса і Друць, камандаванне 537-га і 620-га атрадаў паспрабавала адцягнуць праціўніка з Клічаўскага напрамку і даць магчымасць усім атрадам перагрупавацца сілы. Пад вечар 30 чэрвеня партызаны падышлі зусім блізка да апорнага пункта праціўніка ў Кіраўску і абстралялі яго гарнізон. Карнікі рашылі, што партызаны пачалі контрнаступленне на Кіраўск, і адвялі свае сілы ў в. Сяргеевічы.

Але ўжо 1 ліпеня вораг разгадаў манеўр партызан. Карнікі дзвюма калонамі рушылі на поўнач: з левага фланга каля в. Заполле пачалі фарсіраваць р. Ольса, каб выйсці ў тыл партызан у раёне в. Бацэвічы, а з правага імкнуліся авалодаць пераправай каля в. Ваевічы. Упартае супраціўленне партызан 277-га, 278-га спецыяльнага атрадаў і атрада Дзмітраўскай самаабароны пад кіраўніцтвам П. А. Кушнера сарвала планы наступлення карнікаў каля в. Заполле, пасля чаго акупанты актывізавалі дзеянні на правым крыле. У міжрэччы Сушы і Ольсы разгарнуліся жорсткія баі.

1 ліпеня 760-ы партызанскі атрад выбіў перадавы атрад карнікаў з в. Вялікая Старына, знішчыў 35 гітлераўцаў. Карнікі падпалілі вёску і пачалі адступаць на поўдзень па дарозе Усохі — Кострыцкая Слабада. Але тут іх чакала партызанская засада 620-га і 537-га атрадаў. У кароткім баі праціўнік страціў яшчэ 28 чалавек. Ад поўнага знішчэння іх выратавала падмацаванне. Крахам скончылася і спроба карнікаў у той дзень вечарам захапіць в. Рудня. 4 ліпеня вораг уклініўся ў абарону партызан на ўчастку 277-га атрада, захапіў в. Стары Спор, але і сам апынуўся ў мяшку. Гэта выкарысталі партызаны: сіламі 537-га, 152-га і ротай 277-га атрадаў

акружылі падраздзяленне праціўніка і цалкам яго знішчылі, захапіўшы некалькі дзесяткаў вінтовак і 45-мм гармату.

Асабліва цяжкія баі адбыліся каля вёсак Бярозавае Балота і Перасопня. На дапамогу фашыстам падыходзілі новыя сілы, і камандаванне 208-га атрада прыняло рашэнне адвесці ўсе атрады за р. Ольса, заняць абарону ўздоўж яе правага берага ад Заполля да Клічава (20—25 км фронту). Партызаны адступілі з баямі. 7 ліпеня падраздзяленні 208-га атрада каля в. Лаззё далі бой батальёну 203-й ахоўнай дывізіі, які падыходзіў з усходу. Рух наперад батальёна «Бярэзіна» стрымлівалі 277-ы, 620-ы і 537-ы партызанскія атрады.

Каля в. Перасопня, на подступах да пераправы цераз Ольсу ворага стрымлівалі партызаны 152-га і 760-га атрадаў. У адным з баёў партызаны 152-га атрада знішчылі варожую аўтамашыну, забілі кіраўніка карнай аперацыі камандзіра 608-га ахоўнага палка палкоўніка Зайдліц-Курубаха і ранілі камандзіра асобага батальёна СС «Ост» Дзірлевангера.

Паміж 10 і 13 ліпеня карнікі перагрупавалі сілы: батальён «Бярэзіна», які меў вялікія страты, быў заменены на батальён «Дняпро». Асноўны ўдар сіламі батальёнаў «Ост» і «Дняпро» вораг наносіў па пераправе каля в. Ваевічы, па ключавых пазіцыях партызанскай абароны на паўднёвых падыходах да Клічава.

Усе намаганні карнікаў да 20 ліпеня фарсіраваць Ольсу і захапіць плацдарм не мелі поспеху. Вялікую дапамогу партызанам аказаў Ваенны савет Заходняга фронту. На першы партызанскі аэрадром у раёне Клічава двойчы (15 і 19 ліпеня) прызямляліся савецкія самалёты. Яны даставілі боепрыпасы, сухары, махорку; на Вялікую зямлю самалётамі былі эвакуіраваны цяжкапараненыя. Прылёт самалётаў устрывожыў ворага, і ён з новай сілай пачаў наступленне на Ваевічы. Раніцай 21 ліпеня праціўнік фарсіраваў Ольсу каля в. Вусце і пры падтрымцы артылерыі і бронемашын адначасовым ударам у фронт і з тылу выбіў 22 ліпеня партызан з в. Ваевічы. Баямі за Ваевічы пачалася новая карная аперацыя пад кодавай назвай «Арол».

«Арол» («Adler»). Карная аперацыя праводзілася 20.7—10.8.1942 г. сіламі баявой групы «Арол», якая складалася з часцей вышэйшага начальніка СС і паліцыі «Расія — Цэнтр» групенфюрэра СС Баха-Зелеўскі, часцей 203-й і 286-й ахоўных дывізій, а таксама 2-га паліцэйскага палка, 2 артдывізіёнаў, узмоцненых каманд тайнай палявой паліцыі і СД і зондэркаманд пад агульным камандаваннем ген.-маёра Рыхерта. Мэта аперацыі: акружыць і знішчыць партызанскія атрады ў квадраце Беразіно — Бялынічы — Свіслач — Быхаў, расправіцца з насельніцтвам, захапіць і вывезці з раёна дзеяння запасы прадуктаў, збожжа, жывёлу.

15 ліпеня ўсе сілы групы «Арол» пачалі займаць зыходнае становішча. На шляху яны правялі 2 карныя аперацыі — «маршы прачэсвання». 203-я ахоўная дывізія сіламі трох батальёнаў пачала аперацыю № 5 па прачэсванню раёна паміж р. Бярэзіна і шашой Бабруйск — Мінск, а 286-я — двума батальёнамі і 102-м казацкім батальёнам — аперацыю № 11 з мэтай «уціхамірання» раёна на поўдзень ад шашы Бялынічы — Беразіно. Акрамя таго, у ліпені ў трохвугольніку Магілёў — Бялынічы — Чачэвічы карныя аперацыі супраць партызан і насельніцтва праводзілі 51-ы і 121-ы батальёны 2-га паліцэйскага палка. Наяўнасць такіх сіл праціўніка ў раёне баёў на р. Ольса стварала пагрозу поўнага акружэння партызанскіх атрадаў Клічаўскай зоны. Карнікі мелі намер да 20 ліпеня з трох напрамкаў выйсці ў раён Клічава і разам з паўднёвай групоўкай блакіраваць партызан.

Пераадольваючы супраціўленне партызан, вораг з поўначы, захаду і ўсходу вельмі блізка падышоў да цэнтра Клічаўскай зоны. Карныя аперацыі № 5 і № 11 былі скончаны. Распачыналася выкананне задач аперацыі «Арол». Абставіны патрабавалі рашучых дзеянняў.

25 ліпеня 1942 г. ў штабе 208-га партызанскага атрада адбылася нарада каманднага саставу, на якой было прынята рашэнне пакінуць Клічаў і прыступіць да выканання дырэктывы па блакіраванні транспартных камунікацый. У гэты дзень партызаны пакінулі Клічаў, атрады пачалі адыходзіць на паўночны ўсход за чыгунку Асіповічы — Магілёў ва Усакінскія лясы, дзе разлічвалі перагрупаваць сілы, папоўніць запасы ўзрыўчаткі і боепрыпасаў і выйсці ў зададзеныя раёны. З партызанамі адыходзілі мясцовыя жыхары, што ратаваліся ад карнікаў. У канцы ліпеня ва Усакінскіх лясах сканцэнтравалася 11 партызанскіх атрадаў (больш за 2 тыс. байцоў) і некалькі тысяч жанчын, старых і дзяцей. Усе выхады з лесу гітлераўцы перакрылі, пачалася блакада. Лес падвяргаўся бамбёжкам, артылерыйскаму і мінамётнаму абстрэлу. Ваенны савет Заходняга фронту спрабаваў дапамагчы блакіраваным атрадам. Але скінутыя з самалёта боепрыпасы і медыкаменты не задаволілі нават мінімальнай патрэбы ў іх. Камандуючы нямецкімі войскамі 30 ліпеня

1942 г. накіраваў партызанам прапанову наступнага зместу:

«Командиру партизанских отрядов в районе леса на север от Кличева. Полковнику Ничипоровичу или заместителю. Офицер для специальных поручений зондерфюрер Шмитлейн... имеет от меня полномочия, которые могут привести к соглашению с вами. 1. Место встречи. Мост р. Ольса, 1 км на север от Потока и 750 м на север от железнодорожного моста через р. Ольса. 2. Время встречи. Полковник Ничипорович и зондерфюрер Шмитлейн приближаются к мосту одни, без оружия... При этом необходимо иметь конвой до



Аўтар У.С.Пасэ

10 человек с каждой стороны... Перемирие. 31.7.1942 от 9.00 до 14.00 в окружности на расстоянии 3 км от места переговоров объявляется перемирие. Генерал-лейтенант Рихерт».

Прапанова карнікаў была адхілена. На нарадзе камандзіраў і камісараў блакіраваных атрадаў распрацоўваўся план прарыву. Было прынята рашэнне аб стварэнні ўдарнай групоўкі для прарыву блакады ў напрамку в. Суша. Партызанам дапамагалі мясцовыя жыхары, якія на глухіх сцяжынках у лясах і на балотах выводзілі байцоў і атрады праз загароды карнікаў. У ноч на 3 жніўня 1-я і 2-я роты 208-га атрада пад камандаваннем Бяспоясава і Кудзінава каля в. Усакіна знішчылі загароды карнікаў і забяспечылі партызанскім атрадам і мясцовым жыхарам выхад з акружэння.

«Хрушч»-2 («Maikäfer»-2). Гэта карная аперацыя праводзілася 3—17.5.1943 г. сіламі 2-га грэнадзёрскага самакатнага і 635-га грэнадзёрскага вучэбна-палявога



Аўтар У.С.Пасэ

палкоў, 13-га паліцэйскага палка і трох эскадронаў 600-га палка з прыдадзенымі ім авіяцыйнымі, танкавымі, артылерыйскімі і іншымі падраздзяленнямі, накіраванымі камандаваннем нямецкай групы армій «Цэнтр». Карнікі канцэнтраваным наступленнем з раёнаў Магілёва, Бялыніч, Беразіно і Кіраўска імкнуліся заблакіраваць партызанскія брыгады Клічаўскай зоны ва Усакінскім лесе, а потым знішчыць іх, забяспечыўшы за сабой кантроль над шашой Бабруйск — Магілёў і чыгункай Асіповічы — Магілёў.

3 мая 1943 г. тры баявыя групы ворага пад камандаваннем камандзіраў нямецка-фашысцкіх карных злучэнняў Граў, Цымермана і Шуберта распачалі наступленне. Гітлераўцы разлічвалі завяршыць аперацыю за 5 дзён. У блакадзе апынуліся 4 Клічаўскія (1-я, 2-я, 4-я, 5-я), 3-я Бярэзінская і 6-я Магілёўская партызанскія брыгады. 9-я і 11-я брыгады выйшлі з блакады без баёў. У першы дзень наступлення партызаны спынілі гітлераўцаў і стрымлівалі іх амаль двое сутак. Праціўнік вымушаны быў змяніць тактыку: ён пачаў акопвацца, абсталяваў агнявыя кропкі, хады зносін паміж 3 радамі траншэй. Блакаднае кальцо ўзмацнялася танкамі і бронемашынамі.

5 мая 1943 г. фашысты пачалі масіраваны абстрэл Усакінскага лесу, авіяцыя наносіла бомбавыя ўдары, скідвала касеты з запальнымі бомбамі і бочкі з лёгкаўзгаральнай вадкасцю. Пачаліся лясныя пажары. Камандаванне ваенна-аператыўнай групы пры Магілёўскім падпольным абкоме КП(б)Б загадала брыгадам выходзіць з Усакінскага лесу ў паўднёвым напрамку, у лес на паўночны ўсход ад Клічава. Але ў баі супраць 1-й і 2-й Клічаўскіх брыгад, які працягваўся 4 гадзіны, праціўнік спыніў партызан на паўднёвым напрамку. Партызаны атрымалі новы загад: разгрупавацца па ўсёй лініі акружэння, пакінуць у лагерах і закапаць усё, што магло перашкодзіць хуткаму манеўру і прарыву, частку параненых разам з медперсаналам схаваць у лясным гушчары, 87 параненых вынесці на насілках. У ноч на 6 мая 1943 г. 1-я і 2-я брыгады пад камандаваннем камандзіра ўзвода С. А. Каваленкі зноў пайшлі на прарыў. За аўтаматчыкамі рушыў 208-ы полк, за ім — 2-я брыгада пад камандаваннем Ізоха. Партызаны знішчылі ў час прарыву каля роты гітлераўцаў, артылерыйскую і мінамётную батарэі, 2 бронемашыны. У гэтым баі загінулі 12 партызан і амаль палавіна параненых. 3-я партызанская брыгада пад камандаваннем Яроцкага выйшла ў раён в. Вялікае Махавое. Астатнія брыгады выходзілі невялікімі групамі. У баях з карнікамі партызаны паказалі мужнасць і гераізм. Парторг 121-га атрада Магілёўскай брыгады М. А. Плошкін, байцы 1-й Клічаўскай брыгады Каўпакоў, Шастакоў, Малахаў, параненыя і знясіленыя, змагаліся да апошняга патрона і ў апошні момант падарвалі сябе гранатамі.

Ва Усакінскім лесе фашысты ўчынілі крывавую расправу над знойдзенымі ў лясных шпіталях параненымі: 209 з іх было забіта або прапала без вестак. Акрамя таго, 92 партызаны загінулі ў баях і 10 трапілі ў палон.

У баях з карнікамі партызаны знішчылі каля 400 нямецкіх салдат, афіцэраў і паліцэйскіх. 17 мая нямецкае камандаванне групы армій «Цэнтр» спыніла аперацыю. Партызанскія брыгады вярнуліся на месцы свайго базіравання. Камандуючы аперацыі генерал-лейтэнант Пільц вымушаны быў прызнаць, што адваяваную ў ходзе карнай аперацыі шашэйную дарогу Мінск — Магілёў зноў давялося аддаць партызанам і тыя моцна яе разбурылі.

«Іваноў» («Iwanow»). Гэта карная аперацыя праводзілася 25—26.8.1943 г. супраць партызан і цывільнага насельніцтва Бярэзінскага, Бялыніцкага і Клічаўскага раёнаў. Ажыццяўлялася сіламі 700-га ахоўнага палка, узводаў жандармерыі, сапёрнага і музычнага, эйзатцкаманды, спецыяльнай аўтакалоны для вывазу нарабаванай маёмасці і сельгаспрадукцыі. Кіравалі аперацыяй начальнік 813-й палявой камендатуры палкоўнік Шміт і зондэрфюрэр Ендэн. Карнікі ставілі задачу разграміць партызанскія фарміраванні ў раёне в. Дулебы, захапіць ураджай і гвалтоўна выгнаць насельніцтва з вёсак, размешчаных на поўдзень ад шашы Беразіно — Бялынічы (вёскі Баравіца, Уюноўка, Дулебы, Забродзе, Задор'е, Курганне, Несцераўка, Печы, Рубеж).

Ваенна-палявая камендатура дала карнікам указанне «прымяняць самыя жорсткія меры пакарання да жыхароў вёсак, дзе адбылося супраціўленне». «У тым выпадку,— загадваў палкоўнік Шміт,— калі будзе аказвацца ўзброенае супраціўленне, вёска павінна быць спалена...» Аднак на падыходах да зыходных рубяжоў атакі гітлераўцы былі перахоплены каля в. Забалоцце 113-м і 121-м партызанскімі атрадамі. Прыдадзеная 700-му палку аўтакалона была разгромлена. У в. Быковічы (на паўдарозе са зборнага пункта карнікаў у в. Любушаны) байцы 208-га партызанскага атрада імя Сталіна ў сустрэчным баі атакавалі і адкінулі да шашы штабную роту і адзін з батальёнаў 700-га



Помнік на магіле ахвяр фашызму яўрэйскай нацыянальнасці ва ўрочышчы Лясное каля вёскі Паплавы.



Помнік на магіле ахвяр фашызму каля вёскі Асавы.

палка, прычынілі праціўніку адчувальныя страты. Карная аперацыя правалілася. Партызаны абаранілі насельніцтва ад рабавання і знішчэння.

Паводле няпоўных звестак з апублікаваных матэрыялаў у Клічаўскім раёне ў трох карных аперацыях карнікі спалілі 1755 двароў больш чым ў 30 вёсках, без жытла засталіся 9 тыс. жанчын, старых, дзяцей, забіта каля 900 мірных грамадзян.

Аднак сваёй галоўнай мэты — знішчыць партызан і ліквідаваць партызанскую зону — карнікі не дасягнулі. Хоць з істотнымі стратамі, але партызаны вырваліся з блакады і пасля карнай аперацыі зноў вярталіся на месцы дыслакацыі. Клічаўская партызанская зона прадаўжала жыць і змагацца. Пра гэта сведчыць і загад Магілёўскага падпольнага абкома партыі, у якім кожнаму партызанскаму фарміраванню ўказвалася месца яго дыслакацыі.

У. С. Пасэ.

Крывавыя сляды карнікаў

З успамінаў сведак жудасных злачынстваў, што ўчынялі гітлераўцы на клічаўскай зямлі ў час карных аперацый. Большасць гэтых успамінаў запісаны А. Адамовічам, Я. Брылем, У. Калеснікам.

«ГАЛОЎКА ЯГО БАЛІЦЬ...»

...Вёска Альхоўка. Клічаўскі раён.

Спешыўшыся каля патрэбнай нам хаты, ідзём ад машыны да лаўкі перад гародчыкам, на якой сядзіць дзядок. Ціхенькі, сівы, шэры, маленькі. І не ў цяньку, хоць спёка, а на сонцы. Вітаемся, а ён не адказвае, пытаемся, а ён маўчыць. Ды не ад грубасці, мусіць, бо глядзіць ён на нас ці то прыязнымі, ці то бязгрэшнымі вачыма. Не ўсміхаецца — толькі зірнуў адзін раз, даўгавата і абыякава, і зноў глядзіць кудысьці, нібы наперад, нібы ўдаль.

Вартуе штосьці? Абдумвае? Проста любуецца тым, на што глядзеў столькі гадоў, а ўсё ж не наглядзеўся? Відаць, ні адно, ні другое, ні трэцяе: на ўсё на тое патрэбна нейкая актыўнасць, а ён, дзядок, проста глядзіць. Сядзіць сабе і глядзіць...

Зразумеўшы, адчуўшы, што гэта — не той, хто можа нам дапамагчы, ідзём у

брамку. Ужо на дворыку нас сустракае шустрая, прыветлівая бабуля. Ды яшчэ і талковая — хутка ўцяміўшы, што нам трэба, запрашае ў хату, дзеда свайго з вуліцы не клічучы.

У хаце чыста і пуста, і, не пытаючыся, можна здагадацца, што дзед і баба, як ва ўсіх амаль казках, жывуць адны.

Прысеўшы да стала, бабуля, як і большасць тых, з кім мы ўжо сустракаліся і ў хатах, і на полі, на мікрафон не зважае — проста расказвае людзям, і ўсё.

«...Як мяне, кажаце, завуць? Цмыг, Грыпіна Паўлаўна Цмыг. А колькі мне гадоў? Мне ўжо, хлопчыкі, два гады яшчэ і тады будзе восемдзесят. Ой, даўно ўжо жыву-у, ой-ой-ой!.. (Смяецца). А ён у мяне, мой гаспадар, ужо саўсем... Ён старэйшы за мяне. Мусіць, на трынаццаць ці на чатырнаццаць год. А завуць Амяллян Атрафімаў Цмыг. І той мой дзед быў Амяллян, першы мужык. Гэты мой дзед — удавец быў, у яго пятнаццаць душ забілі немцы, у яме ў той ляжаць. А ён застаўся, гэты дзед.

Ну, я засталася ўдава. Мой сын быў у партызанах. А ён, гэты дзед, ды таго майго дзеда кум. Дык ён кажа:

— Знаеш што, кума, давай мы будзем удваіх.

Дык я кажу:

— Ну, давай.

Сын прыбег з лесу, і я спыталася:

— Так і так, сынок, што рабіць?

— Мама, калі дзе прыхінуцца ёсць, дык ты тут і будзь. Можа, калі парцянкі дасі ці рубашку пераменіш мне, прыбегшы.

Ну, вот мы і зыйшліся з дзедам, і гадоў, мусіць, трыццаць жывём.

Ужо не ў нашай вёсцы жывём, не ў Сушы, а тут.

А цяпер галоўка яго баліць...

Гэты дзед і гэтыя хлопцы збіраліся кучамі — нядзелька была. І жанчыны прыбіраліся, старыя і маладыя. Сядзяць дзе-небудзь, сабраўшыся. Ну, і тады гэта дзед стаіць у курані, а тая баба, яго першая, ды кажа:

— Збіраюць на сабранне. Ідзі, дзед.

— Я схаваюся.

А яна кажа:

— Чаго схаваешся? — Гэта ж мы такія дурныя, бабы.— Што ты схаваешся — усе ж на сабранне пашлі.

Ну, на сабранне, дык на сабранне. Усе гэтыя бабы, і хлопцы маладыя... А хат ужо не было — курані. Хаты папалены былі. Зямлянкі былі. Дзед хацеў у зямлянку пад нары, дык яна не пусціла.

Тады гэтыя немцы і кажуць:

— Вот тры чалавекі — гэты, гэты і гэты (старэнькіх ужо: маладых жа пагналі ў

Амяллян Атрафімаў Цмыг і Грыпіна Паўлаўна Цмыг з в. Альхоўка.

плен), тры чалавекі трэба кароў гнаць. І ганіце іх сюды пад раку, на луг, папасіце іх. А тады ганіце ў Кіраўск. А еслі не будзе кароў, дык і вас не будзе!..

Гэта дзед мне ўжо расказваў усё, калі мы з ім сышліся.

Дык яны пагналі ў Кіраўск.

А яны ўжо іх — немцы людзей тых, што засталіся,— паставілі ў шарэнак, на сабранне. Два пасёлкі было. Кіламетра не было — гэты пасёлак і гэты пасёлак. Дык яны адтуль і адтуль, а пасярод картошка. Выкапалі яму, загатавалі. І паставілі іх у шар, і пілямёты пастаўлялі. І тады: «Столькі і столькі!» і бягом у яму. Гэта расказвалі падводчыкі.

Дык не выдзержаў чалавек адзін з Гарадца, які падводчыкам прыязджаў,— не выдзержаў, памёр.

Людзей у яму, а тады ён пілямётам пастрочыць, пастрочыць. А бабы возьмуць... як толькі ўжо галосіць, дык так во завязваецца, ды тады ўжо ў яму. Кідаецца. Завязаўшы твар хусткай. А тады ўжо, кажа, другія ўсе...

Адкопвалі потым. Мусіць, сто пяцьдзесят гэтых... чараноў...

А як закопвалі іх у той яме, дык зямля, казалі, гэтак во дыша, дыша, дыша!.. Гэта падводчыкі расказвалі. Якраз Хвядотавых сваяк быў. Дык ён казаў: «Так ўсё на мне млела». Памёр той чалавек, ад гэтага і памёр, не выдзержаў.

Калі мы ўжо сышліся са сваім дзедам, дык пашукалі, пашукалі яго сямейных з тыдзень. Чуем — нейкі рой гудзе... А гэта ўжо не рой, ды ўжо мухі, авадні ўсё... А яны закапалі во так — тут дарога, а яны каля дарогі, бліска ў гэтым... Ну, бульбешнік бальшы. Гэты мой дзед і яшчэ чалавекі тры-чатыры: «Давай пойдзем адкопваць. Пахаваем іх аддзельна». Адкапалі. Як за руку возьмецца, ужо, дык і лезе кожа гэ-

Мікалай Фядосавіч і Настасся Дзмітрыеўна Галацэвічы з в. Асавы.

тая ўся. Сапрэлі. Ну, дык некаторыя казалі, каб выцягваць, але мой дзед кажа:

— Не буду я кратаць іх — няхай дзе пакладзены, там і ляжаць.

Там мы іх і прыкапалі, і абгародку паставілі...

После таго ўжо галоўка яго забалела, у дзеда майго. Вот нічога ён так і не ведае... Хлопчыкі мае, як гэта дажыць? І купіць усё трэба, і яго даглядаць, як малое дзіця...»

Вось і казка — не казка пра дзеда і бабу.

Свеціць сонца, дзеці і птушкі шчабечуць, увесь наш свет жыве па-летняму, бабка — вясёлая, шустрая, добрая — плача, а ціхенькі, сівы, шэры, маленькі дзядок глядзіць... Толькі глядзіць і нічога як быццам не бачыць.

Калі і сапраўды нічога, дык добра хоць, што ён не бачыць таксама і рою лясной заедзі, і раскапанай магілы з усім сваім родам, з усёю вёскай — таго, ад чаго «забалела яго галава».

Назаўсёды...

НЕСХАДЗІМАЕ ГОРА

...У вёсцы Асавы на Клічаўшчыне жывуць Анастасся Змітраўна і Мікалай Фядосавіч Галацэвічы. Ён — ціхі, руплівы кравец, яна — растаропная і энергічная гаспадыня ў хаце. Ад іх першых мы пачулі расказ пра трагедыю іх роднай вёскі Люціна, з якое яны перасяліліся сюды, у Осава, пасля вайны. Мужчына як мужчына: пачаў гаварыць як з пратакола, суха і скупа. Жонка перахапіла ініцыятыву. Сямейная пара жыве, мабыць, так дружна, што ў іх няма праблемы, каму гаварыць, каму слухаць: думаюць адно, а выказвае той, хто першы паспее.

Мы і падаём гэты сямейны расказ як адзін. А расказвалі то муж, то жонка ўперамешку.

— Значыць, прыехалі,— пачынае муж,— дзярэўню ацапілі і заходзяць у каждую хату і сяйчас жа і паляць...

Перабівае жонка:

— Высялілі ўсіх на выган. Усё з кварціры, хто сумеў, вынес, а хто не сумеў — не вынес.

Вот мы і сядзім на выгане і глядзім. Яны очань харашыліся, на сябе глядзелі, што красіва ім ляжыць адзёжа. Так яны на сябе паглядвалі. А гавораць яны — непанятна, што яны гавораць. Во калі немец гаворыць, ды панятна, што гэта немец. А то ён не можа ні па-нямецкі, ні па-рускі.

Ну вот, мы там сядзім, думаем, што яны будуць з намі рабіць. Яны паставілі вакруг нас пулямёты ва ўсіх гэта так чатырох вуглах. І мы сядзім. Потым яны сказалі так:

— Ідзіце, жэншчыны, дамой, і дванаццацілетнія рабята. Ідзіце дамой і ганіце вашых курэй, гусей, свіней, кароў. Тады мы пусцім вашых атцоў.

Атцоў яны ўжо вакуіруць у школу. Ну, мы і пайшлі дамой.

А яго (паказвае на мужа) пагналі ў школу.

Ну, мы,— якая была там жывёла, канешне, не жалка, хоць бы пусцілі хазяіна,— усё гэта ўзялі і пагналі. Яшчэ наша карова ўзяла ды хацела ўцячы. Мы ж ужо баяліся страху, дык мы яе не пусцілі ў лес. А загналі яе туды прама, дзе школа. Думаем, ну калі карова наша там, дык хазяіна выпусцяць.

Патом жа яны не пушчалі. Але ён сам неяк сумеў, выбраўся праз каровы.

Мы дома сядзім і глядзім, што будуць рабіць. Адзін немец зайшоў і гаворыць: «Зніміце вот гэтыя часы!» Мы ўзялі іх знялі. Не, не гаворыць, а проста паказвае. І дзецкі матрас яшчэ ляжаў на палу. Дык ён паказвае: «І ета ўбяруе». Мы і ета ўзялі і выташчылі на двор. Як выносілі, дык і маятнік і ўсё там парушылі. Некаторыя паліцэйскія падыходзілі, паварочвалі іх, тыя часы, пакруцілі і бросілі, не ўзялі.

Ну, дык мы і сядзім на гэтым двары і думаем: «Ці пусцяць гэтых нашых гаспадароў, ці не». А хаты там, дзярэўню запалілі.

Патом падходзіць адзін немец, заходзіць у дом, у нас было тры сталы ў хаце, гэтыя ўсе тры сталы злажыў у кучу, чымто абліў і запаліў. А патом выйшаў на двор, з тэй стараны такімі пулямі стрэліў і з гэтай стараны, запаліў. І дом гэты гарыць. Мы з сынам старэйшым Яўгенем — ён цяпер у Бабруйску жыве — сталі ваду насіць, дык яны па нас страляць і гэтага хлопца ранілі. Ён упаў. Ну, а я

перастала ўжо насіць, заліваць дом, як гарэў.

Мужчын яны ўвагналі ў школу. Ну, і там ужо іх не стралялі, а запалілі школу, і ў школе яны ўсе гарэлі. Каторыя ў вокны ўдзіралі, яны ўсіх стралялі. Школа ад нас з паўкіламетра...

Муж:

— Ну, загналі нас, а патом жанчын дамоў адправілі. Загналі, кругом ацапілі, і стаім там, на замок закрылі. А нас, маладзейшых,— на двор, кароў жа трэба загнаць. Вось нас, маладзейшых, і выбралі. Мы падышлі к падводчыку і пытаем:

— Што яны будуць дзелаць?

Кажуць:

— Нічога мы не знаем, ганіце кароў, а самі ў лесе ўцякайце.

Ну, мы кароў пад лес падагналі і бегчы, а яны па нас з аўтаматаў. Але кароў столькі — дык яны высока. А мы пасагнуліся — і тут лес радам...

Пытанне: — А вы, жанчыны, потым прыйшлі на тое месца?

Жонка:

— Ну, канешне. Я думаю: «Можа, дзе ён гарыць?» Я ж не знала. Можа, дзе ўцякаў, можа, дзе гарыць.

Так, адцягвала я некаторых мужчын. Некаторыя гараць, ляжаць людзі, дык я за яго, рыззё гэтае раскіну ды ташчу яго, каб не згарэла цела. Пахараніць хоць бы.

Не засталося ніводнага, каб жывы, семдзесят шэсць чалавек згарэла...

У Люціне жанчыны сышліся ў хату да настаўніцы-пенсіянеркі Марыі Аляксандраўны Пашкевіч. Было якраз свята, зручны дзень для суседскіх адведкаў. Спачатку, відаць, суседак вяла сюды звычайная ў вёсках цікаўнасць: даведацца, што за госці прыехалі на машыне да старой настаўніцы. Пераступалі парог вясёлымі, віталіся, жартуючы, але, уцяміўшы, пра што тут ідзе гаворка, спахмурнелыя, заставаліся ў хаце надоўга.

Зайшлі да настаўніцы Марыя Ананіч, Вольга Максімчык, Аляксандра Тарэлка — жанчыны сярэдніх гадоў. Прыйшла і васьмідзесяцігадовая Вольга Яўменаўна Галацэвіч з пучком зёлак і траў у спрацаваных старэчых руках. Было купалле, спрадвечнае свята сонца, росквіту жыцця, свята кветкі шчасця...

Спачатку выгаварыла свой боль гаспадыня, потым далучаліся адна за другою суседкі. У канцы, расхваляваныя, гаварылі ўсе разам: жалобнае і страшнае жаночае галашэнне па мужчынах — бацьках, мужах, братах, сынах...

Марыя Аляксандраўна Пашкевіч з в. Люціна.

Марыя Аляксандраўна Пашкевіч.

«...Я працавала тут і да вайны. У мяне была кватэра ў вёсцы, сельсавет аплачваў, дваццаць пяць рублёў. У мяне трое дзяцей: сын дваццаць сёмага года (вось у гэтым годзе пойдзе на пенсію з арміі), дачка дваццаць восьмага года і яшчэ дачка трыццаць сёмага года. Я ўдавою засталася з 1937 года. Муж мой..., язва жалудка ў яго была. Аперыравалі яго ў Рагачове два разы — памёр. Прышлося самой выхоўваць дзяцей. Пераехала ў Люцін.

І чуем ужо — сёла немцы жгуць: тут Орліны, адсюль кіламетраў пяць. І яшчэ, за ракою. А дырэктар школы гаворыць:

— Я, вераятна, уеду к мацеры жыць.

— Ну,— гавару я,— а мне ж няма куды ехаць.

І жыву я адна ў школе, ва ўсёй школе: калідор ба-а-льшой! І класы так. І каб сказаць, што я баялася, дык не. У мяне ніякага страху не было. Выйду калінебудзь на вёску, гавораць: там сажглі, там сажглі...

Гэта было, мушу я вам сказаць, у 1942 годзе, відаць, у пачатку апрэля. Дзеці спалі. Я прачнулася. Гляджу ў акно — што-та ўсё на агародах. Рэчы. Ну, якія тагда былі рэчы. Цяпер, знаеце, народ добра жыве, а тады — якія там рэчы! Сундукі — вось што. Да... Так я гавару на дзяцей.

— Дзеці, што-та неспакойна ў вёсцы.

Знаеце, не ўспела я так сказаць, як чую па калідоры: шах-шах-шах! Ідуць! І якраз ідуць у мой, гэта, клас.

— Матка, цурык!

А я нават, ізвініце, не адзелася. І дзеці былі не адзеўшыся.

— Матка, цурык!

Ну,— вораг! Трэба ісці. І гляджу, ужо бегаюць яны па вёсцы, людзей гэтых усіх зганяюць. Сагналі ўсіх мужчын, сагналі ўсіх гэтых жанчын. І вось, значыць, так:

паставілі мужчын на адну сторану, а жанчын — на другую.

Выходзіць адзін фашыст, малады. А я таксама з жанчынамі. Нічога не ўзяла, толькі паліто — на начную рубашку. І дзеці — толькі пальцішка, не надзявалі касцюмаў ніякіх, не ўспелі. Дзеці кажуць:

— Мамачка, ужэ канец жызні.

І вот выходзіць фашыст паміж радамі, малады, бландзін, па-рускі очань харашо разгаварвае. Гаворыць:

— За то, што, значыць, вас очэнь часта навяшчаюць партызаны і... тут румку водкі, значыць,— мы далжны сжэч вашу дзярэўню.

Ну, усе мужчыны стаяць, і жанчыны стаяць.

— Ну вот,— гаворыць той,— прэдлагаю такія вам условіі: падганіці сюды короф,— так і гаворыць,— короф, овец, свіней, значыць...

А школа была агароджана.

— Падганіце сюды, тагда мы мужчын выпусцім. Панятна?

Ну, жыць кожнаму дорага. Мужчыны асталіся, а жанчыны — бягом, пабеглі на вёску і прыгналі гэтых «короф», «овец», «свіней» — усё сюды прыгналі на школьны двор. Паставілі яны тут часавых, а гэтых усіх мужчын, семдзесят шэсць чалавек, усякі ўзрост — і сярэдні, і зусім старыкі, загналі... гэта быў сёмы клас — вось сюды. І пад замок. А жанчынам гавораць:

— Ухадзіце!

Патом — спецыяльна ў іх гэтая карацельная камісія ці атрад — і кожную гэтую кожную халупку бегалі і паджыгалі.

А мне ж некуды ісці. Я асталася там, ад школы метраў так пяць, каля сарая. Села я каля сарая, і дзеці каля мяне — мне ж нет куды ісці. Узяць — нічога я з сабой не ўзяла. Толькі дочка, вось гэтая, дваццаць восьмага года, гаворыць:

— Мама, я збегаю.

Я гавару:

— Не бяжы. Яны падумаюць, што мы імеем связь з парцізанамі.

Бо яны ўсё гаварылі: «Пачаму матка адна жывёць? Дзе мужык?»

Але дочка гаворыць:

— Мама, я зайду, можа, схвачу хоць падушку.

Яна ўзяла тры небальшых падушачкі і выскачыла. Сядзім.

Значыць, тры чалавекі па вуглах давай школу паджыгаць. Бегаюць, бегаюць! А там народ, гэта ж людзі, жывыя людзі!.. Я ж гавару, у гісторыі да сіх пор гэта не слышна, каб такое зверства. Людзі пішчаць да невазможнасці. Крык невазможны быў.

Усё вакол узялося агнём. Адзін праходзіць і гаворыць:

— Гут!

Гэта значыць — харашо. Не, не мне гаворыць, а паміж сабою. Вёска ўся як ёсць гарыць. А мы сядзім з дзецьмі тут. Гэта было зранку, можа, гадзін дзесяць-адзінаццаць. А быў яшчэ сняжок.

— Гут, гут!..

Людзі гараць, народ крычыць. Проста невазможна, ужас!..

А я сяджу... У вушах, у галаве — проста страшна, што робіцца... Бачу — адзін фашыст — конь харошы, высокі такі, але без сядла,— едзе ка мне. Дзеці... Хлопец гэты худы быў такі, тошчы, з лёгкімі ў яго нешта было блага:

— Мама, нам усё цяпер будзе.

А немец узяў гэтую падушачку і хоць бы слова мне сказаў — павярнуўся і паехаў. Давольны ўжо мае дзеці. Ад'ехаўся гэты, другі, вы знаеце, едзе... Едзе другі! Яшчэ адна, знаеце, падушка, ляжыць. Другі таксама ўзяў і паехаў. А мне — каб слова сказалі...

Ну, а народ гэты крычыць усё!..

Скот яны забралі, пагналі ў Елізава. А ў вёсцы ўсякія былі, саўсем прастарэлыя, слабенькія — дык яны іх на хаду так убівалі. Многа па вёсцы ляжала.

Ну, паехалі яны. Некаторыя людзі з дзярэўні сталі прыходзіць і гавораць:

— Ну што, Аляксандраўна?

А ў мяне ў галаве ад ужаса, значыць, трашчыць...

Потым я на сына гавару:

— Сын, туалеты гэтыя асталіся. Здымай дзверы, накрывай, ізвініце, гэтыя дзіркі, і будзем тут жыць.

Ну, і пасяліліся мы там, у туалетах. Дзень сядзім... А калодзежы ўсе атраўлены, есці нічога нет. Дочка мая нічога і не просіць, знаеце, сядзім. Другія дык пайшлі к сваім родзічам у суседнія вёскі, а мне дык некуды. Сяджу я. Ноч пераначавалі. Назаўтра прыйшлі дзеці ка мне, дзевачкі, хадзілі ў другі і трэці клас. Дзеці дырэктара торфазавода. Нехта ім сказаў: «Марыя Аляксандраўна ў туалеце жывёць, не знаю, што з ёю дзелаецца. Ілі яна ўжо саўсем сазнанне пацярала, ілі, гаворыць, што?» Прыходзіць дырэктара-ва, значыць, жана і гаворыць:

— Марыя Аляксандраўна, дакуль вы будзеце здзесь сядзець?

Прыгласіла яна к сабе, торфзавод яшчэ цэлы быў, далі яны мне куток, прынеслі есці.

А ў галаве, у вушах трэск невынасімы, невынасімы... Ну, а жывы ж чалавек — усё жыве, есці ж хочацца. Ну, і я скажу вам праўду — па сёлах хадзіла. Куды прыду — знаюць мяне... (Плача.) Людзі жалелі»...

Марыя Ананіч.

«...Хлопчык быў у мяне, дзесяць гадоў. Я гавару:

— Мой хлопчык, будуць зганяць, будуць нас біць.

Ну, і сталі нас зганяць. Прыйшоў немец, я стала кросны ў хату ўносіць, шкада ж красён, дык я за іх. А ён мне рэвальвер у грудзі і кажа:

— Кінь!

Я кінула. Ён мяне за шыю — на выган. Гоніць і за шыю во так паказвае, куды ісці. А дзіця маё за мяне ўзялося. Прыходзяць на выган і матка мая, і бацька, і сталі мы ўмесце. А тут ужо вот гэты пасёлачак гарыць.

Ну што, стаім мы на выгане. Падышла... Тут маладзіца адна была, падышла яна к паліцэйскаму ці к немцу, дык ён яе кіем па галаве.

Стаяў тут Даніла такі, на пасёлку жыў, дык гаворыць:

— Жанчыны, мужчыны, паб'юць нас, бо ўжо яны параз'ядаліся і паб'юць нас тут на выгане.

Усе ў плач, у плач — і бабы, і дзеці...

Мы стаім ужо сваёй сямейкай: тата з мамай, я з хлопчыкам. А паліцэйскія:

— У школу, у школу! А жанчыны дамоў! — Гавораць: — Ідзіце, ганіце цяпер свае каровы і што ў вас ё, а мы мужчын паганялі і папушчаем іх дамой.

Я гавару:

— Мамачка, гані ты сваю карову, а я сваю, мо тату пусцяць.

Я пайшла сабе дамой, а яна — сабе. Ну, і потым тут стаў выстрал. Усе кажуць: «Паб'юць мужчын». Мама прыбегла, голасу нарабіла:

— Спалілі бацьку!..»

Вольга Максімчык.

«...Мароз, мароз быў бальшы. А нас пагналі на выган. Мужчын управа, жанчын — улева. Тут былі мужчыны нашы, каторыя былі яшчэ ў тую вайну,— панімалі па-нямецку. Пераводчык сказаў, што мужчын папалім, калі ўсё не згоняць.

Ну, што мы? Дзе гусь якая была, дзе кура — усё палавілі. У нас хоць бацькі і не было, дык хаця б самім жывымі быць. Загналі мы і сваё. Свінню толькі паросную не загналі. Прыйшоў немец, наставіў пісталет:

— Гані!..

Мужчына адзін гаворыць:

Люцінскія жанчыны (злева направа): Марыя Ананіч, Вольга Максімчык, Аляксандра Тарэлка, Вольга Галацэвіч.

— Дайце мне гэтых кароў, я паганю.

А мы не даем: нас саміх пастраляюць. Думаем: «Гэта на могілках будуць нас страляць». Пабралі гэтых кароў і гонім туды. Курэй папрыносілі... Паліцэйскія адсякаюць галовы курам, а гэта ўсё на воз, на воз.

Была тут адна красівая дзяўчына, дык немец схаціў — весці яе туды, у школу, дзе мужчыны, дзе палілі. А другі немец не даў.

А патом запалілі і школу...

І хаты згарэлі. Асталіся толькі платы...

Пайшлі мы туды — толькі косці. Чыя нага — угадвалі. Цераз нядзелю адкопвалі, знаходзілі: хто — хто...

Вось так мы і асталіся...»

Аляксандра Тарэлка.

«...5-га, гэта была паска. Нам партызаны перадалі, што гараць суседнія Сталяры. Ноччу прыбеглі:

— Уцякайце, будуць паліць Люцін!..

Усё ўсё павыносілі і папрыходзілі к кладбішчу, гавораць:

— Нікога няма, будзем гуляць тут — паска...

А тут едзе са Сталяроў парцізан, Багдановіч Якаў быў:

— Уцякайце,— кажа,— бо ўжо едуць, цераз рэчку перапраўляюцца, гэтыя немцы і паліцыя.

Мы прыбеглі, ужо чуем, ужо, як палкі ломяць,— страляюць!.. Мы і пабеглі. Відзім здалёк — гарыць Люцін.

Прыбеглі бабы потым. Кажуць:

— Папалілі!..

Мы ўсе парасцяраныя, плачам: «Што рабіць?»

Патом хадзілі, усё раскопвалі. Нашлі: па калена так ножка беленькая, харошанькая ляжала — усё глядзелі мы. Жэншчына пазнала, па кальсонах.

— Гэта, гаворыць, мая работа, саматканая... Гэта майго, гаворыць, нага.

Ён быў брыгадзірам у калгасе, Ананіч Пракоп.

— Гэта,— гаворыць,— майго хазяіна нага...»

Вольга Галацэвіч.

«...І сказалі:

— Забірайце сваё хазяйства і вядзіце ў школу...

А хазяіна ў калону і на выган. Ён і пайшоў. Пайшоў без шапкі, без нічаго, тады ж холадна было. За ім немец пайшоў.

І нявестка была з малым рабёначкам, дык і калысачку на выган узялі...

Паставілі мужчын у школу, а мне далі падводу дзяржаць. Вот я і дзяржу. Паставілі пулямёт каля мяне. Я і дзяржу каня. Патом, як толькі хто ў акно прыгне — пулямёт туда выстраліць. Чалавек і ляжа. Чалавек некалькі так было.

А я дзяржу каня. Патом ён завярнуў пулямёт сюды, дык я і пусціла. Не помню нічога ўжо...

Ну, а патом, калі ўжо ўсіх спалілі, дзярэўня згарэла, усё згарэла — нічаго-о, на бляху ўсё зрабілася. Ну што, далі мне падводу тую самую:

— Едзь на завод!

І сеў са мной пулямёт і немец. І едзем. Дык у мяне нічога жывога не было. Толькі так зубамі калаціла. Думаю: «Усё ўжо мне будзе»...

Прыехалі к масту, ён забраў каня і як стаў страляць нада мною, дык я не помніла, у якую сторану мне ісці. Ну, я ўсё-такі ішла, ішла, ішла і пайшла сюды на кладбішча.

Прышла. Ну што ж, я тутака? Заначавала. Я і не баялася. Я ўжо і не помню нічога: і холадна, і голадна... І я ўжо тут і была.

Назаўтра ўсталі: няма нідзе нікога і нічога, усё ўжо.

І так ужо і асталіся гараваць: і мучаліся — і па лясах, і па палях, і ўсюды. І голыя, і галодныя, і босыя, і ўсякія...»

Бабуля з зёлкамі ў руках на прыполе змоўкла. А маладзейшыя сáма разгаманіліся. Не паспявалі мы разабрацца, улавіць, запісаць, хто гаворыць. Так і даём, уперамешку, як гаварылі яны, адна за адной, адна адну перабіваючы:

— ...Вельмі многа раз нападзенне было, вельмі!

Яшчэ прыйшлі, абнялі ўсю дзярэўню, якія мужчыны былі, хто ў зямлянцы — усіх да аднаго забралі і зноў на завод пагналі. Такое ўжо было гора, што нікому такога гора не было...

— Хлапца тут зноў убілі, трох мужчын убілі — гэта ўсё пасля таго, калі ў школе папалілі...

— Вельмі нападзенне было бальшое на Люцін. Знаеце: завод і лес. Нідзе нічога не бачым. З Віркава, з завода, адсюль — ды на Люцін!.. Дзявацца не было дзе. Што прыдбаў у хату, якога каржа, драніка якога адкапаеш ды калі прыгатуеш — і то схопяць.

— Дзе ж мы гатавалі? На цяпле, на дварэ. Не было дзе ні леч, ні стаць — вельмі, вельмі нісходзімае гора было...

— Адусюль нападзенне! Адусюль — і з завода, і з Заполля, з Віркава — адусюль. Ды ўсё ў Люцін. Вельмі бальшое было гора...

— Першыя дні, пакуль парабілі гэтыя зямлянкі — запаляць кастры. Сцяпан гэты выйдзе: «Уставайце, фабрыка ўжо работае». Ну, шуцяць ужо, ну што ж рабіць? Есці няма чаго. Хто дзе якія стрэлкі са шчаўя, жолудзі — усё сабіраем, ядзім. Босыя, ой!..»

У хату старой настаўніцы прыйшлі дзеці з букетамі кветак. Разам з жанчынамі і дзецьмі ідзём да брацкай магілы, на былое пажарышча школы, у якой да вайны вучыліся люцінскія дзеці, якая стала потым вогнішчам жахлівай смерці іхніх бацькоў...

Ціха стаяць над магілай бярозы. Замоўклі і дзеці.

Недзе тут сядзела тады са сваімі дзецьмі настаўніца, амаль непрытомная ад жаху глядзела на страшны агонь, чула перадсмяротныя крыкі людзей...

Недзе тут праходжваўся з аўтаматам, грэўся каля агню той забойца-фашыст, дзелавіта паўтараючы:

— Гут! Гут!..»

Друкуецца па кн.: Адамовіч А., Брыль Я., Калеснік У. Я з вогненнай вёскі... Мн., 1975. С. 145—148, 301—310.

У СВЯТЫ ДЗЕНЬ, НА ПАКРОВЫ

З успамінаў Марыі Рыгораўны Мароз, 1928 г. нараджэння, з вёскі Доўгае.

Тая страшная ваенная восень 1943 года ўрэзалася ў маю памяць на ўсё жыццё.

У сям'і нашай было шасцёра дзяцей. Я і старэйшая сястра Анюта да вайны вучыліся ў Доўгаўскай школе. Пачалася вайна, абарвала ўсе нашы надзеі.

Вёска наша ўжо ў тыя гады была даволі вялікая, каля двухсот двароў. Кожны дзень людзі жылі ў страху — даходзілі чуткі аб тым, што немцы знішчаюць людзей, грабяць і паляць вёскі. Але па-

Населеныя пункты раёна, якім нанесены страты нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны

Назва населенага пункта	Колькасць напярэдадні вайны		Колькасць знішчаных		Час трагедыі
	двароў	жыхароў	двароў	жыхароў	
1	2	3	4	5	6
Альхоўка	25	89	25	4	жнівень 1942 г.
Арэхаўка	117	365	110	9	восень 1943 г.
Асавы	91	231	91	8	восень 1942 г.
Астапаўка	12	39	12	4	жнівень 1942 г.
Бацэвічы	312	1214	179	71	жнівень 1942 г.
Бёрда	73	219	73	37	сакавік 1943 г.
Бухаўка	17	48	17	4	верасень 1943 г.
Веснік	23	72	23	7	верасень 1943 г.
Вішнёўка	18	47	18	11	верасень 1943 г.
Восаў	8	27	8	3	восень 1942 г.
Вязень*	19	96	19	80	ліпень 1942 г.
Вялікая Старына	40	158	40	26	верасень 1943 г.
Гонча	66	310	59	9	жнівень 1942 г.
Даўжанка	25	76	25	15	верасень 1943 г.
Доўгае	199	420	199	97	верасень 1943 г.
Дубно*	117	293	117	120	жнівень 1942 г.
Жалезная Баравіна	7	17	7	—	верасень 1943 г.
Закупленне	143	370	143	64	жнівень 1942 г.
Залічынка	32	81	32	17	восень 1942 г.
Звальня	20	47	20	16	восень 1942 г.
Іжар	37	95	37	—	верасень 1942 г.
Кавяза	26	73	26	11	жнівень 1942 г.
Лаззё	21	63	21	9	жнівень 1942 г.
Люціна	95	312	95	80	красавік 1942 г.
Макаўе I, Макаўе II	11	40	11	7	красавік 1942 г.
Мяжное	45	154	45	8	жнівень 1942 г.
Новы Мост	13	51	13	6	восень 1942 г.
Орліна	176	598	176	3	восень 1942 г.
Падгор'е	24	110	24	16	восень 1942 г.
Падстружжа	35	122	35	9	восень 1942 г.
Палосы	20	65	20	14	жнівень 1942 г.
Перасопня	29	89	29	10	верасень 1942 г.
Равок	35	118	35	2	красавік 1942 г.
Развадава	38	152	38	60	восень 1943 г.
Рубеж	8	76	8	1	жнівень 1943 г.
Сотнае	5	23	5	2	восень 1942 г.
Стары Спор	25	95	25	10	восень 1942 г.
Суша	98	509	98	53	жнівень 1942 г.
Сялец*	17	64	17	60	жнівень 1942 г.
Тапіла	18	72	18	4	восень 1942 г.
Турэц	118	315	90	19	восень 1942 г.
Усакіна	104	450	104	80	жнівень 1942 г.
Усохі	107	314	107	26	красавік 1942 г.
Халадок	27	78	27	—	верасень 1942 г.
Чырвоная Ніва	40	143	4	3	восень 1942 г.
Чырвоны Бераг	22	81	22	3	восень 1942 г.
Якімава Ляда	23	86	23	1	жнівень 1942 г.
Ялаўка	22	67	22	6	верасень 1943 г.

* Вёскі Вязень і Сялец знішчаны разам з мірнымі жыхарамі і не адноўлены; в. Дубно знішчана разам з мірнымі жыхарамі і адноўлена пасля вайны. Усе тры вёскі ўвекавечаны ў мемарыяльным комплексе Хатынь.



Помнік на брацкай магіле жыхароў спаленых фашыстамі вёсак Вязень і Сялец.

што бяда абыходзіла нас. Усё лета людзі жылі ў лесе ў куранях, у свае хаты прыходзілі толькі што-небудзь узяць. З надыходам восені спраў прыбавілася, трэба было капаць бульбу, выбіраць буракі. Днямі працавалі на сваіх участках, нанач ішлі ў лес. Было ціха. Людзі пасмялелі так, што ўжо і начаваць заставаліся ў вёсцы.

У той дзень (а гэта было, як мне помніцца, на Пакровы), маці з сястрычкай Палінай пайшла ў вёску, а мы засталіся ў лесе. Раптам пачулася страляніна ў лесе збоку Звальні. Як потым даведаліся, немцы ехалі на машынах, і ў балоце загрузлі ў гразі. Кінуўшы машыны, ішлі да вёскі і стралялі. Людзі кінуліся да лесу, але не ўсім удалося ўцячы. Цэлы дзень мы ў страху прасядзелі ў лесе, не ведаючы, што здарылася ў вёсцы. К вечару тата сабраўся ісці, але я не пусціла: лепш сама, будзе не так прыкметна. Аглядваючыся, падкралася праз сад да ямы-схованкі, замаскіраванай галлём пад яблыняй, і хуценька ўскочыла туды. У непрагляднай цьме нехта ціхенька плакаў, не адразу распазнала, што гэта наша Паліна. Яна расплакалася яшчэ больш, і я ніяк не магла дапытацца, дзе маці. Немцаў ужо не было. Навокал дыміліся, дагаралі хаты, хлявы. Людзі сталі выходзіць з лесу, вылазіць са схованак, але маці не было, нідзе не знайшлі і слядоў амаль 100 чалавек вяскоўцаў, якіх захапілі немцы. Было ўжо цёмна, і ўсе вырашылі спыніць пошукі.

У лес я не пайшла, да раніцы мы сядзелі ў лазні, якая стаяла за рэчкай. Пад раніцу ў лазню ўскочыла Гаўрыліха з крыкамі: «Уставайце, людзей спалілі ў нашай стопцы!» Усе выскачылі з лазні і кінуліся да стопкі на краі сяла. Там яшчэ курыліся галавешкі і, прыгледзеўшыся, можна было пазнаць згарэўшыя трупы людзей. Сярод іх я з жахам пазнала і сваю маці. Калі немцы пачалі зганяць людзей у стопку, маці ўдалося непрыкметна піхнуць Палінку ў нашу схованку, а сама вось загінула такой страшэннай смерцю.

Пачало світаць, здалёк пачуўся гул матораў. Немцы! Людзі кінуліся ў лес. Ужо ў гушчары агледзеліся: да вёскі пад'язджалі немцы. Пасля гэтага некалькі дзён мы не набліжаліся да сяла — баяліся карнікаў, бо яны наязджалі досвіткам і позна выязджалі, а ноччу што ўбачыш. Усе гэтыя ночы мужчыны дзяжурылі на ўскрайку лесу на дрэвах, бо з іх было відаць, як на далоні, што робіцца ў вёсцы. Пасля таго, як немцы пакінулі Доўгае, мы ўсе вярнуліся з лесу і пабеглі на вогнішча. Але ніякіх слядоў фашысцкага зверства ўжо не было, валяліся толькі пачарнелыя вілы кругом. Людзі б і не ведалі, куды падзеліся абгарэлыя трупы сяльчан, каб не Гаўрыліха. Яна захацела піць і пайшла да крыніцы, якая была недалёчка. Схілілася да вады і спужалася: поўная крыніца была абгарэлых касцей. Людзі абгледзелі ўсё кругом — і ў балоце былі косці. Цяпер мы зразумелі, чаму на вогнішчы ляжалі вілы. Немцы хацелі скрыць сляды свайго злачынства.

Колькі дзён стаяў над вёскай плач — галасілі ўсе аб нявінна загубленых. Былі спалены сем'і Паддубскага Івана, Паддубская Марына, Шэх Мар'я і чацвёра яе дзяцей, Паддубская Ганна, Клепча Матруна, Мароз Гаўрыла, сям'я Бародзічаў, Рогаль Іван і яго сям'я...

Усакінскі лес

З успамінаў Ф. Зайцава, былога намесніка камандзіра 61-й партызанскай брыгады

СЛОВА ПРА РОДНУЮ ВЁСКУ

У далёкую мінуўшчыну вядуць весткі пра Усакіна. Дзесьці ў пачатку 18 стагоддзя адваявалі сабе сярод дрымучых лясоў ды балот па кавалку зямлі трое сялян. Быў сярод іх і Іван Заяц. У таго Івана нарадзіўся сын Нічыпар, у яго — Сцяпан, у Сцяпана — Лявон, у Лявона — Васіль, а ў Васіля ў 1912 г. — сын Фёдар, гэта значыць аўтар гэтых радкоў.

Спрадвеку не песцілі сялян тутэйшыя мясціны ні ўраджаямі, ні багаццем. Землі былі падзолістыя, малаўрадлівыя, ды і тых «кот наплакаў». Свайго хлеба многім сем'ям хапала толькі да сярэдзіны зімы, пры ўмове, што ў цеста напалавіну дабаўлялі мякіну, бульбу, як правіла, варылі «ў мундзіры», — так менш ішло ў адходы. З наступленнем лета станавілася лягчэй — варылі лебяду, шчаўе, збіралі грыбы, лавілі рыбу. А пашанцуе — дык можна было паласавацца і дзікім мёдам.

Каб пражыць як-небудзь ды сям'ю пракарміць, зараблялі мужыкі, дзе і як толькі маглі. Хто вырабляў бочкі і цэбры, хто нарыхтоўваў карчы для смалакурні ці драў лыка. Сёй-той спрабаваў шукаць сваё шчасце ў далёкай Сібіры ці падаваўся на будаўніцтва дарог у Расію.

У знясільваючай працы, нястачы ды бясконцых клопатах дзень за днём, месяц за месяцам цякло гаротнае сялянскае жыццё. І толькі рэдкія наезды сюды графа Патоцкага ўносілі ў яго нейкае ажыўленне. У навакольных лясах багата было і дзічыны, а ў рэчках — рыбы. Вось і прыязджаў сюды граф адпачыць ад сталічных турбот, паразмяцца, папаляваць. Больш за ўсё шанцавала тады мясцовым хлапчукам. Наймаў іх намешчык у загоншчыкі, плаціў кожнаму па 10—15 капеек. Па тым часе грошы немалыя.

Апошнім разам паляваў граф у мясцовых лясах ужо перад рэвалюцыяй. Усакіна было ўжо даволі вялікай вёскай. Да 90 двароў налічвалася ў ёй, а ўсяго пражывала да 500 «асоб мужчынскага і жаночага полу».

А вось пісьменных на ўсю вёску было толькі двое, ды і тыя з прыезджых. Ні школы, ні царквы Усакіна не мела. Мясцовая моладзь бавіла свой час ля вялікага каменя. Ён узнімаўся над зямлёй і меў даволі роўную паверхню плошчай, бадай, да 30 квадратных метраў. Тут назначаліся спатканні, наладжваліся танцы. Няма цяпер таго каменя: большую частку яго выкарысталі на будаўніцтва апор для чыгуначнага моста цераз раку Ольсу.

Быццам бы і размешчана Усакіна ўдалечыні ад буйных гарадоў і ажыўленых шляхоў, але, здаецца, ні адна буйная падзея не абмінала вёску і часцяком пакідала на сэрцы сялян доўга не зажываючую рану. Пайшлі на імперыялістычную вайну і не вярнуліся да родных парогаў Міхаіл Бяляк, Рыгор і Васіль Шаройкі, Марк і Фёдар Зайцы. У гады грамадзянскай аддалі сваё жыццё за Савецкую ўладу Акім, Іван Андрэевіч і Іван Маркавіч Зайцы, Міхаіл Панасевіч, Аляксей Самец.

Перамагла рэвалюцыя, пачало аднаўляцца сялянскае жыццё. Дазволілі мужыкам без абмежаванняў карчаваць ляды ў лесе і засяваць іх. А падаткам гэтыя землі не абкладаліся. Працуй, колькі хочаш сіл, не лянуйся. Больш поўнымі сталі сялянскія засекі.

У пачатку 20-х гадоў утварылі ў вёсцы леспрамгас. Выраблялі тут калёсныя спіцы ды абады, загатоўкі для фанеры і запалак. З'явілася ў сялян свежая капейка. А тут якраз і краму адкрылі. Калі ласка, хлеб і крупы, мануфактура і дзёгаць і іншыя патрэбныя ў гаспадарцы рэчы. Неўзабаве школа-чатырохгодка пачала працаваць, хата-чытальня.

Не абмінула вёску калектывізацыя. Нямала ўнесла яна сумяццы ў сялянскія галовы. Да трэціх пеўняў зацягваліся іншы раз сходкі ў вёсцы, але так і не прыходзілі мужыкі да адзінай думкі: ісці ў калгас альбо не. Аднак усё больш і больш адчувалі сяляне гнёт мясцовых улад. І ў рэшце-рэшт здаліся. У 1931 годзе ва Усакіне быў створаны калгас, які з надзеяй назвалі сяляне «Усход».

ФАШЫСТЫ ПРЫЙШЛІ

У трыццатыя гады жыў я ў Клічаве, пераехаў сюды з Усакіна. Працаваў намеснікам бухгалтара леспрамгаса. Добра помніцца 22 чэрвеня 1941 года. У гэты нядзельны дзень вырашыў адзначыць сваё 29-годдзе. Дома ўжо поўным ходам ішла падрыхтоўка, калі радыё прынесла страшэнную вестку:

— Вайна!

Праўда, многія сустрэлі гэтае паведамленне даволі спакойна: маўляў, праз дзень-другі фашысты будуць ушчэнт разбіты. Але настрой хутка змяніўся: з фронту прыходзілі ўсё больш і больш трывож-

ныя весткі. Немцы хутка прасоўваліся на ўсход.

У тыя неспакойныя дні ваенкамат у райцэнтры працаваў ледзь не кругласутачна: ішла мабілізацыя. Потым ён з-за частых налётаў фашысцкіх самалётаў перабраўся ў лес за Ольсу. Быў я белабілетнікам, г. зн. прызыву не падлягаў. Але свой абавязак перад Радзімай адчуваў. Вось чаму аднойчы разам з сябрам Зуевым пайшлі запісвацца ў армію добраахвотнікаў. У той дзень у лесе на прызыўным пункце ваенкамата сабраліся сотні людзей. Нечакана з'явіўся нямецкі самалёт, які абстраляў натоўп. Людзі разбегліся хто куды. Зніклі і работнікі райваенкамата.

А баі набліжаліся да Клічава. Хадзілі чуткі, што каля Бабруйска немцы высадзілі вялікі дэсант, а Асіповічы ўжо занятыя ворагам. Аднак ніхто не траціў надзеі, што не дойдуць да нас фашысты, затрымае іх Савецкая Армія. Аднак не збылася тая надзея.

Упершыню я ўбачыў жывых фашыстаў ва Усакіне, куды прыехаў да бацькоў. Гэта былі салдаты перадавых нямецкіх часцей. Паводзілі яны сябе як заваёўнікі і адчувалі на нашай зямлі ўжо гаспадарамі. Немцы наладзілі сапраўднае паляванне на хатніх жывёлін. То з аднаго, то з другога хлеўчыка даносіўся свінячы віск, курынае кудахтанне.

Неўзабаве фашысты з'явіліся і ў Клічаве. Каля 120 немцаў размясціліся на пастой у будынку райкома партыі. І тут яны зноў паказалі сябе. Давялося быць сведкам такога выпадку. У нямецкую камендатуру паклікалі Івана Вершука. Але той не спяшаўся выконваць загад. Тады да яго падбег салдат і, выцягнуўшы ўздоўж спіны бізуном, крыкнуў:

— Шнель! Шнель!

Калі ж фашысту здалося, што Вершук без дастатковага энтузіязму выконвае загад, ён ударыў яго яшчэ раз.

Гэта наводзіла на сур'ёзны роздум. Што ж будзе з усімі намі? Як жыць? Чым карміцца? Бо ўсе прадпрыемствы і ўстановы спынілі сваю дзейнасць. Дзесяткі, калі не сотні жыхароў райцэнтра, у тым ліку і я, засталіся без працы. А ў мяне на ўтрыманні — жонка, двое дзяцей, цешча. Яшчэ каня леспрамгасаўскага даручылі: беражы, маўляў. З ім таксама хапала клопатаў, хаця ў далейшым ён вельмі мяне выручаў. Жывёлу ж карміць трэба. А дзе ў горадзе зямля, паша? Некалькі сотак агароду. Вось і мацнела думка перабрацца з цягам часу да бацькоў, назад ва Усакіна.

Паступова пачаў рыхтавацца да пераезду, стварыць «матэрыяльную базу». Бывала, запрагу каня — і ў Ступнікі. Тут да вайны палігон быў, лётчыкі прылятралі для вучэбнай бамбёжкі. Сюды раней нікога не пускалі, трава ў пояс вырасла. Так што па дваццаць і больш пудоў штодня накошваў.

А аднойчы адбылася ў мяне тут сустрэча, якая ў многім вызначыла ўсё маё далейшае жыццё ў час акупацыі. Толькі я спыніўся крыху адпачыць, зрабіўшы пракос, бачу, набліжаюцца да мяне ваенныя. Прыгледзеўся — нашы, савецкія, са зброяй.

— Чым тут ты займаешся, калі вайна

Былыя партызаны расказваюць моладзі пра баявыя аперацыі ва Усакінскім лесе.

ідзе? Ці не немцам сена рыхтуеш? — запытаў строга адзін з іх.

Давялося ўсё падрабязна тлумачыць ім. Крыху пазней зразумеў я, чаму так недаверліва ставіліся яны да мяне. Аказалася, што непадалёку ў лесе хавалася група савецкіх воінаў, якія адбіліся ад сваёй часці. Маё з'яўленне іх насцярожыла: ці не нямецкі выведнік? Але слова за слова — разгаварыліся, пазнаёміліся. Аказваецца, былі гэта старшы батальённы камісар Ляпкін, старшы лейтэнант Арлоў і малодшы палітрук Гармус. Чацвёртага прозвішча не запомніў. Ваенныя падрабязна распытвалі мяне пра Клічаў, цікавіліся пра вёску Бацэвічы, станцыю Свіслач. Усё, што ведаў, я ім падрабязна расказаў. А потым і кажу:

— Ёсць у мяне бохан хлеба ды кавалак сала. Калі жадаеце...

Упрошваць не давялося. А калі пачаставаў сваіх новых знаёмцаў папяроскамі, наогул добрымі сталі. На развітанне папрасілі падвезці ім у бліжэйшы час пару мяшкоў бульбы. Я насыпаў чатыры, надзейна прыхаваў у дамоўленым месцы.

Дзён праз сем ваенныя сталі канчаткова давяраць мне. Сведчанне таму — запрашэнне ў іх лагер. Знаходзіліся тут чалавек пад сорак. Узначальваў групу падпалкоўнік Лапшын. Вось да яго я і звярнуўся ў першую ж сустрэчу.

— Дазвольце мне,— гавару,— застацца ў вас. Пастараюся вам дапамагчы. І мясцовасць тутэйшую ведаю, і людзей...

Лапшын, крыху падумаўшы, адказаў:

— Што ж, ад дапамогі мы не адмовімся. Толькі ж пераходзіць у атрад не трэба. А пакуль што выканайце нашу просьбу. З'ездзіце ў Бацэвічы. Прыглядзіцеся, колькі там немцаў, чым яны займаюцца, як узброены... Гэта, уласна, было маё першае баявое заданне. Выканаў я яго ўдала. Дапамагло яшчэ і тое, што ў Бацэвічах жылі мае сваякі. Яны многае мне расказалі. А каб усё было больш натуральна, далі мне парсюка: маўляў, прыязджаў пляменнік вось па якой справе.

НОВАЕ ЗАДАННЕ

Мой падрабязны расказ пра паездку ў Бацэвічы ваенныя выслухалі з задавальненнем. Падзякавалі, а падпалкоўнік Лапшын сказаў:

— А цяпер у нас яшчэ адна просьба. Ці не ведаеце вы каго з раённага кіраўніцтва? Пэўна ж, не ўсе з'ехалі... Вельмі хацелася б сустрэцца з імі. Мы не можам сядзець склаўшы рукі. Карысна было б і пра іхнія намеры ведаць...

Некаторых былых адказных работнікаў я, безумоўна, ведаў. Але пасля акупацыі Клічава яны на вуліцах райцэнтра не з'яўляліся. Хаця па «сакрэту» толькі самыя блізкія людзі расказвалі, што кагосьці сустрэлі ў адным месцы, іншага — у другім. А дзе ж мне знайсці каго-небудзь з іх? З такім пытаннем я і звярнуўся да настаўніка Ігната Ізоха, з якім мы апынуліся аднойчы разам у хаце Васіля Заблоцкага. Спачатку той сустрэў маю просьбу без асаблівага энтузіязму. Але крыху падумаў і адказаў:

— Калі тваім знаёмцам-ваенным вельмі патрэбна сустрэцца з раённым начальствам, няхай праз пару дзён прыязджаюць у Клічаў. Да таго ж і немцаў у райцэнтры амаль не засталося.

Дамовіліся аб месцы і часе сустрэчы. Дарэчы, І. Ізох быў у ліку арганізатараў узброенай барацьбы з акупантамі, неўзабаве ўзначаліў адзін з першых партызанскіх атрадаў у раёне.

У Клічаве затрымлівацца не стаў, адразу ж запрог каня і накіраваўся ва Усакіна. Хацелася хутчэй расказаць Лапшыну пра нашу з Ізохам дамоўленасць наконт сустрэчы. З добрым настроем каціў я па прасёлку, калі нечакана данеслася стральніна. Яна то заціхала, то разгаралася зноў. Дзесьці там, за мостам цераз Ольсу, адбывалася нешта незвычайнае. Я сцішыў каня, але працягваў прасоўвацца наперад. Нарэшце дабраўся да Ольсы. І тут убачыў незвычайную карціну. На дарозе ў беспарадку стаяла з дзесятак падвод, ляжалі забітыя коні, трупы немцаў. Да мяне падышлі старшы лейтэнант Арлоў і малодшы палітрук Гармус.

— Ты чаго лезеш пад кулі? — накінуўся на мяне Арлоў.— Не мог пачакаць, пакуль мы тут усё скончым?

Але асаблівай злосці ў яго голасе не было.

— А наогул,— усміхнуўся нечакана Арлоў,— гэта і нядрэнна, што ты тут апынуўся. Выкарыстаем твой тарантас і забяром частку трафеяў...

Мы хуценька ўскінулі на калёсы некалькі скрынь з макаронамі, кансервамі, цыгарэтамі, адвезлі ўсё гэта кіламетраў за дзесяць і прыхавалі.

Набліжаўся тэрмін сустрэчы ваенных з раённым кіраўніцтвам.

Напярэдадні надвячоркам ва Усакіна завіталі Ляпкін, Арлоў і Гармус. Яны пераначавалі ў бацькавай хаце. Раніцой Арлоў і Гармус пераапрануліся ў цывільнае. Я запрог каня. Для надання нашай «экспедыцыі» больш мірнага выгляду далучылася да нас настаўніца мясцовай школы. Усё ў дарозе прайшло спакойна,

а вось у райцэнтры давялося пахвалявацца. Ледзь уехалі ў Клічаў, як насустрач крочаць з дзесятак фашыстаў. Ну, думаю, прапалі. Чую, як за спіной Арлоў шэпча Гармусу:

— Калі што — страляем!

Але і на гэты раз усё абышлося. Толькі выпрабаванні нашы ў той дзень не скончыліся. Калі я пайшоў шукаць каго-небудзь з раённых кіраўнікоў, на кватэру, дзе засталіся Арлоў і Гармус, завітаў немец. Добра, што мая жонка, Ганна Несцераўна, убачыла яго яшчэ здалёк. Яна схапіла на рукі дзіця і выйшла насустрач салдату.

— Чаму твой муж не выходзіць на працу? — запытаў праз перакладчыцу немец. — Калі так будзе працягвацца і далей, камендатура не будзе выдзяляць вам хлеб.

Жонка растлумачыла, што я паехаў да бацькоў у вёску. А наконт хлеба — дык мы, маўляў, пакуль перабіваемся сваім.

На жаль, рызыкавалі мы ў той дзень дарэмна. Нікога з былых мясцовых кіраўнікоў я не знайшоў. Ці штосьці там не ўдалося, а мо ў чым і засумняваліся.

Сустрэча, безумоўна, усё ж адбылася. Толькі пазней і ўжо ва Усакіне. І арганізаваў яе старшыня мясцовага сельскага Савета Сцяпан Кузьміч Заяц.

СМЕРЦЬ ЗА СМЕРЦЬ

Пасля разгрому нямецкага абозу за Ольсай узброеныя сутычкі з немцамі ўспыхвалі ўсё часцей. Гэта ўключаліся ў барацьбу толькі што створаныя партызанскія атрады. У адзін з іх, бадай, самы першы, ўвайшлі камуністы і камсамольцы райцэнтра, пакінутыя для работы ў падполлі. Ён пачаў дзейнічаць у самым пачатку ліпеня. Аснову іншых атрадаў склалі ваенныя, што ў час адступлення ці баёў у акружэнні адбіліся ад сваіх часцей і завязлі ва Усакінскіх лясах. Узначалілі іх такія кадравыя камандзіры Савецкай Арміі, як старшы лейтэнант Паўлаў, падпалкоўнік Лапшын, і іншыя.

Але і немцы ўзмацнялі рэпрэсіі. Часцей і часцей яны бязлітасна, без усякага разбору, распраўляліся і з вінаватымі, і з выпадкова трапіўшымі пад руку людзьмі.

Метрах у 300 ад Клічава на развілцы дарог стаяў радзільны дом. Вырашылі камуністы правесці тут свой партыйны сход. Маўляў, не здагадаюцца фашысты, што ў іх пад самым носам ды яшчэ ў такой ўстанове асмеляцца сабрацца разам іхнія ворагі. А тыя ці самі здагадаліся пра гэта, ці хто, можа, і шапнуў. Так або інакш, неўзабаве пасля таго, як сабраліся камуністы, з сотню немцаў накіраваліся да раддома. Завязалася перастрэлка. Але ўдзельнікам сходу ўдалося разбегчыся.

Такая няўдача раззлавала фашыстаў. Вяртаючыся ў Клічаў, яны па дарозе захапілі ні ў чым не вінаватых траіх Гільшчыных і расстралялі іх. Мясцовыя жыхары бадай што ў адкрытую пачалі выказваць сваё абурэнне дзеяннямі новай улады. Тады фашысты захапілі пяць жанчын і расправіліся з імі. На гэты раз пад расстрэл трапілі сваякі некаторых арганізатараў партыйнага падполля: сястра Якава Зайца — сакратара падпольнага райкома КПБ, жонка ваенкома Вінаградава, жонка Анісіма Бая і сястра жонкі Івана Вітоля — арганізатараў першага на Клічаўшчыне партызанскага атрада.

Гэта выклікала сярод насельніцтва новую хвалю абурэння. Непрыязь да акупантаў перарастала ў нянавісць. Барацьба набывала непрымірымы характар. Неўзабаве партызаны злавілі бургамістра Клічава Мярлінскага — былога галоўнага бухгалтара мясцовага аддзялення Дзяржбанка. Суд быў кароткі — расстрэл.

Ва ўрочышчы Чановішчы была абстраляна грузавая машына, у якой ехалі трое немцаў. Аднаго з іх, цяжка параненага, мясцовыя жыхары прывезлі ва Усакіна. Прыехаўшы ў вёску за сваім салдатам, фашысты выгналі ўсё насельніцтва ў поле, адабралі пецярых хлопцаў і расстралялі іх. Гэта былі Сяргей, Фёдар, Міхаіл, Яфрэм і Рыгор Зайцы.

Такі ж лёс напаткаў і Лявона Зайца, які спрабаваў змалоць партызанскае збожжа на млыне ў Доўгім.

На пастой у вёску Суша немцы накіравалі двух салдат. Партызаны захапілі іх. Хутка ў вёску наляцелі карнікі. Яны сабралі ўсіх жыхароў вёскі, адабралі 22 чалавекі ва ўзросце 50—70 гадоў і расстралялі.

— За кожнага забітага немца,— растлумачыў пасля акцыі афіцэр,— мы будзем знішчаць не менш 10 чалавек.

Рэпрэсіі ўзмацняліся. 14 лютага 1942 года ва Усакіна прыехалі паліцаі з Клічава. Яны без усялякіх на тое прычын расстралялі Івана Шагойку і Андрэя Комара, хоць тыя, як кажуць, былі цішэй вады, ніжэй травы.

Партызаны ў даўгу не засталіся. Была падпалена цыстэрна з бензінам на мясцовым аэрадроме. Затым знішчылі і склады са збожжам і гаручым, што размяшчаліся ў райцэнтры. Жыццё акупантаў станавілася ўсё больш неспакойным. Супраціўленне ім нарастала. Таму фашысты пачалі ствараць ў вёсках гарнізоны, умацоўвалі іх, вербавалі паліцэйскіх, назначалі старастаў, бургамістраў. На жаль, знайшлося сярод нас нямала тых, хто па розных прычынах пайшоў на службу да ворага. Многім з іх потым давялося вельмі шкадаваць аб гэтым: народ не дараваў здрады.

«ГАВОРЫЦЬ МАСКВА!..».

Цяжка і трывожна складвалася наша жыццё ў акупацыі. Быццам і па сваёй зямлі ходзіш, а гаспадаром сябе не адчуваеш. За кожным вуглом таілася небяспека, кожны твой крок мог быць апошнім. Пойдзеш раніцай з дому і не ведаеш, ці вернешся назад. Вельмі прыгнятала тое, што не было ніякіх звестак з фронту. Што там? Як там? А ў верасні немцы пачалі хваліцца, быццам іх войскі захапілі Маскву. І ад гэтага трывожна сціскалася сэрца.

Аднак у рэшце рэшт пашанцавала і нам, удалося паслухаць Маскву. А адбылося гэта вось як. Калі ў чарговы раз завітаў я ва Усакіна да бацькоў, сустрэўся з падпалкоўнікам Лапшыным.

— Паслухай, Фёдар,— звярнуўся ён да мяне.— Ці не ведаеш ты, у каго ёсць радыёпрыёмнік? Вельмі ён нам патрэбны. Да таго ж, разумееш, карыстацца ім у Клічаве ці ў вёсцы небяспечна...

Прыгадаў я такога чалавека. Радыёпрыёмнік меў Якаў Міхайлавіч Зайцаў, які прыехаў да нас перад самай вайной з Заходняй Беларусі. Неўзабаве сустрэўся з ім. Той не тое, што адмовіўся, а нават абрадаваўся маёй просьбе аддаць прыёмнік у атрад.

— Ад яго мне адны непрыемнасці,— гаварыў ён.— І ўключыць баюся, і выкінуць шкада.

Разам з Якавам Міхайлавічам старанна ўпакавалі прыёмнік і накіраваліся ў лес. Адышлі кіламетраў колькі ад вёскі і не вытрымалі, уключылі яго. І вось прагучалі такія знаёмыя для нас словы:

— Гаворыць Масква!

Якраз перадавалі зводку з франтоў. Дыктар паведамляў, што ідуць цяжкія баі пад Ленінградам, а пад Ельняй фашысты пацярпелі жорсткае паражэнне. Галоўнае ж — Масква па-ранейшаму заставалася нашай.

Гэтымі радаснымі звесткамі я паспяшыў падзяліцца са сваімі старымі знаёмымі, калі назаўтра прыехаў на клічаўскі млын. Людзі слухалі мяне, і святлелі іх твары. Аднак гэта мая нястрыманасць ледзь не скончылася для мяне вельмі сумна. Нехта пра маю размову данёс гаспадару млына Пашкевічу і млынару немцу Барцу. Толькі я дабраўся дадому, як яны ўслед за мной на парог.

— Раскажы нам, адкуль ты дабыў тыя звесткі, аб якіх гаварыў на млыне? — запатрабаваў Барц.

Давялося выкручвацца, як толькі мог. Маўляў, сустрэў у Клічаве чалавека ў чорным паліто, вось ён і расказаў мне пра ўсё.

— Дык каму ж верыць? — запытаў я.— Адны кажуць, што Масква ўжо ўзята, другія — што яшчэ адбіваецца...

Барц уважліва паглядзеў на мяне, потым сказаў:

— Нашы ўжо ў Маскве! І запомні: лепш будзе, калі прытрымаеш язык за зубамі.

А хутка яшчэ адзін непрыемны выпадак адбыўся. Зайшоў да мяне мой знаёмы і просіць:

— Дай мне каня бульбу выкапаць.

Яго ж дачка перад гэтым казала маёй жонцы, што яны ўжо справіліся з уборкай. Я і сказаў яму пра гэта. А ён у крык:

— Што, каня пашкадаваў? А да партызан у лес дык ты ездзіць можаш! Вось пачакай, раскажу немцам, чым займаешся.

Ледзь да бойкі ў нас справа не дайшла. Не ведаю, здзейсніў ён тады сваю пагрозу ці не, але ў нямецкую камендатуру заходзіў. Тут я канчаткова зразумеў, што заставацца ў Клічаве небяспечна. І, выбраўшы зручны момант, калі немцы не вельмі лютавалі, паціху перабраўся да бацькоў ва Усакіна.

ЗАПАЛАЛА ВЁСКА

Надышла восень. Зачасцілі дажджы. Час ад часу пажухлую траву пачалі прыхопліваць першыя, яшчэ лёгкія, замаразкі. Атрад Лапшына цяпер ужо трывала заснаваўся ва Усакінскім лесе, кіламетраў у 9—10 ад нашай вёскі. Тут партызаны і вырашылі застацца да вясны. У вольны ад баявых дзеянняў час байцы атрада рыхтаваліся да сустрэчы зімы: уцяплялі зямлянкі, назапашвалі збожжа, бульбу. Але нейкі здраднік (вядома толькі, што ён родам з вёскі Мачэск) вывеў карнікаў да партызанскай стаянкі. Фашысты спрабавалі акружыць і знішчыць атрад. Але Лапшыну з байцамі ўдалося адбіцца ад немцаў. Страцілі толькі аднаго чалавека. Фашысты разграмілі лагер, сабралі якіянііякія трафеі. Пэўна, самым каштоўным сярод іх быў радыёпрыёмнік, перададзены ў атрад Я. М. Зайцавым і мной.

Пазней стала вядома, што атрад Лапшына ўзяў кірунак на Браншчыну. І было ў мяне такое пачуццё, быццам страціў я сваіх самых блізкіх сяброў. Здаецца, і не вельмі часта былі мы разам, але я прывязаўся да іх. Нават узнікла думка адправіц-

ца ўслед... Але давялося ад яе адмовіцца: нельга ж пакідаць адну сям'ю.

Зразумела, заставацца без справы я не мог. Вырашыў цвёрда падавацца ў партызаны. Толькі вось у які атрад? Да таго часу іх ва Усакінскіх лясах было ўжо некалькі. Але атрад Ігната Ізоха ўвесь час перамяшчаўся. Сёння ён тут, заўтра зусім у іншым месцы. Шмат перасоўваўся і атрад Рыгора Паўлава. Але ён меў пастаяннае месца дыслакацыі. Да таго ж многія байцы з атрада былі добра мне вядомыя, часта бывалі ва Усакіне. Так што выбар я зрабіў. А тут яшчэ пашанцавала. Неяк я натрапіў на самога Рыгора Паўлава. Вось ён і кажа:

— Пераходзь да мяне ў атрад. Толькі спачатку падбяры дзесяткі два баявых надзейных хлопцаў. Добра б, каб вы яшчэ зброяй якой разжыліся...

Але перш чым я трапіў у атрад, адбылася яшчэ адна вельмі важная падзея, якая ў многім прадвызначыла маё далейшае жыццё. У ноч на 20 сакавіка 1942 года, аб'яднаўшы свае сілы, атрады Васіля Свістунова, Віктара Лівенцава, Андрэя Юркаўца і Васіля Сырцова вызвалілі ад фашысцкіх акупантаў гарадскі пасёлак Клічаў. Гэта была, бадай, самая буйная перамога партызан. Прыбавілася ў нас упэўненасці, значна ўзрос наш аўтарытэт сярод мясцовых жыхароў. Баявая моц партызан прыкметна ўзрасла, калі ва Усакінскія лясы прыбыў 208-ы атрад палкоўніка У. І. Нічыпаровіча, на рахунку якога ўжо лічылася нямала важкіх баявых здабыткаў.

Неўзабаве пасля вызвалення Клічава ва Усакіне адбыўся раённы партыйны сход. Ён аб'явіў аб аднаўленні ў раёне Савецкай улады. Першым сакратаром райкома партыі быў выбраны Я. І. Заяц. П. М. Вікторчыку даручылі ўзначаліць райвыканком.

Безумоўна, усё гэта фашысты не маглі пакінуць без увагі. У тыя ж дні ў вёску Развадава, гэта ў 6 кіламетрах ад Усакіна, прыбыў вялікі атрад карнікаў. Як потым высветлілася, яны планавалі акружыць вёску. Але 4 красавіка партызаны падышлі да Развадава, занялі зыходныя пазіцыі. Раніцой разгарэўся гарачы бой. Партызаны некалькі разоў спрабавалі атакаваць немцаў, але ўсе іх спробы канчаліся няўдачамі. Яшчэ ляжаў глыбокі рыхлы снег, прасоўвацца па ім было цяжка. Да таго ж фашысты, хаваючыся за хатамі, хлявамі, плотам, вялі вельмі шчыльны агонь. Ад яго загінулі камандзір і начальнік штаба 620-га атрада В. Сырцоў і М. Белакурскі, некалькі партызан. Каб не несці дарэмных страт, палкоўнік У. Нічыпаровіч, які ўзначальваў гэтую аперацыю, даў каманду зняць асаду Развадава.

Партызаны тады ва Усакіна не вярнуліся і разышліся, хто ў свае лагеры, хто застаўся ў лесе. Напалохаўшыся, немцы перабраліся ў вёску Доўгае. Аднак неўзабаве ачухаліся. Даведаўшыся, што Усакіна партызаны пакінулі, разам з паліцаямі награнулі яны ў вёску. Добра яшчэ, што, нібы прадчуваючы бяду, большасць жыхароў кінулася ў лес. Тым, хто затрымаўся ў вёсцы, давялося ратавацца ўцёкамі, калі ўжо запалалі крайнія хаты. Некаторыя трапілі пад фашысцкія кулі. У той дзень загінулі Сцяпан Нічыпаровіч, Фёдар Кузьміч і Мікалай Захаравіч Зайцы, Пракоп Шагойка. Быў застрэлены і потым згарэў разам са сваім домам 103-гадовы Фядос Акімавіч Шагойка. Пайсці ў лес разам з усімі ён адмовіўся:

— Я і Савецкай уладзе не служыў і немцам нічога дрэннага не зрабіў. Не крануць яны мяне.

Спадзяванні старога не апраўдаліся.

У той дзень у вёсцы ўцалеў толькі адзін дом.

Цяжка нават уявіць, колькі выпрабаванняў выпала на долю вяскоўцаў, якія засталіся без даху над галавой. Спачатку хаваліся ў змайстраваных у спешцы буданах: з трох бакоў замацоўваліся яловыя лапкі, замест даху — таксама яны. Гэта абараняла ад ветру, але не ад марозу, які дасягаў ноччу 10 градусаў. Палілі кастры, пілі кіпень.

Палёгка надышла толькі вясной.

З ЗАСАДЫ Ў ЗАСАДУ

У час той карнай акцыі фашыстаў ва Усакіне згарэла хата і майго бацькі. Усёй сям'ёй перабраліся ў лес. Разам з яшчэ адным вяскоўцам пабудавалі штосьці падобнае на зямлянку. А сам рашыў падавацца да партызан. Пра ўмову Р. Паўлава помніў. Многіх агітаваць доўга не трэба было: хлопцы літаральна гарэлі жаданнем адпомсціць фашыстам. Хутка група, якую я сабраў, адправілася ў атрад.

— Прымай папаўненне, Рыгор Кузьміч,— звярнуўся да Паўлава.

— Усе гэтыя хлопцы са мной. Так што, лічыце, заданне ваша перавыканаў.

Паўлаў уважліва агледзеў прыбыўшых (а іх было каля сарака), застаўся задаволены.

— Партызаны будуць хоць куды. Але ж, дарагія таварышы, на лёгкі хлеб не спадзявайцеся.

Летам 1942 года ў раёне вельмі лютаваў атрад нямецкага паслугача Барчыка. Па нашых разліках, было ў яго каля 50 добра ўзброеных паліцэйскіх. І хоць немцы стварылі атрад для барацьбы з партызанамі, здраднікі ахвотна ўдзельнічалі ў карных аперацыях супраць мірнага насельніцтва. І не шкадавалі ні старых, ні малых. Асаблівай жорсткасцю вызначаўся сам Барчык.

Камандаванне партызанскага атрада вырашыла спыніць злачынныя дзеянні паліцаяў. Для гэтага была створана спецыяльная група з 25 партызан, у якую ўвайшоў і я. Старанна распрацаваны план аперацыі прадугледжваў арганізацыю засады ля дарогі Чачэвічы — станцыя Друць. Атрымаўшы боепрыпасы, «сухі паёк» на 2 сутак, на досвітку адправіліся ў шлях.

Калі дабраліся да месца прызначэння, ужо зусім развіднела. Хутка абсталявалі пазіцыі. Чакаем час, другі. Нікога. А есці хочацца... Паціху ўзяліся за свой «сухі паёк». У рэшце рэшт вырашылі падацца ў вёску Ядраная Слабада. Размясціліся, выставілі пасты наглядання. Адзін з 4-х чалавек, на краі вёскі, з боку Чачэвіч, другі — з боку вёскі Калічонкі. Прайшло з паўгадзіны. Ціха. Дай, думаю, наведаюся да хлопцаў, можа махоркай разжывуся. Але не дайшоў і да сярэдзіны вёскі, як з боку Чачэвіч пачуліся стрэлы. Кінуўся я бягом назад. Бачу, разгортваецца ў атаку калона паліцаяў, чалавек за сотню. Як потым высветлілася, гэта быў Барчык са сваімі паслугачамі, ды яшчэ некалькі дзесяткаў немцаў. Атрымалася так: ладзілі засаду ворагу, ды самі трапілі ў яе. Сілы былі вельмі няроўныя. Адстрэльваючыся, пачалі адыходзіць да лесу. Але варожыя ланцугі хутка набліжаліся. Кулі свісталі з усіх бакоў. Я кінуўся на зямлю і папоўз у напрамку лесу. Калі заставалася да хмызняку метраў сто, вырашыў адолець гэтую адлегласць бягом. Толькі ўзняўся на ногі — бачу, стаяць перада мной трое паліцаяў.

Здавацца ў мяне не было ніякага намеру. Бо добра ведаў, што чакае ў такім выпадку. Таму, выхапіўшы наган, я прыклаў яго да скроні. Але ў гэты момант прыгадаліся дзеці, жонка, бацькі... Што ж будзе з імі без мяне? Рашэнне прыйшло імгненна. Замест таго, каб застрэліцца самому, я накіраваў наган на бліжэйшага паліцая. Выстраліў раз, другі. Бачу, дарога свабодная. Саскочыў у праходзячую побач канаву і, сагнуўшыся, наколькі гэта было можна, кінуўся бягом да лесу.

Ужо вечарам выбраўся на ўскраек поля. Сустрэў тут пастуха са статкам. Ён паведаміў, што ў час бою забіта каля 20 немцаў і паліцаяў. Партызан жа загінула толькі двое. Гэта былі кулямётчык Цімафееў і яго другі нумар Лізура. Мы з пастухом пахавалі іх на мясцовых могілках.

Вядома, аперацыю тую наўрад ці можна аднесці да нашых удач. Але з таго часу непрыемнасці для Барчыка пайшлі адна за адной. Накіроўваючыся ў Магілёў, здраднікі напароліся на партызанскі атрад Міхаіла Марусава. Той моцна патрапаў паліцаяў: яны страцілі каля 40 чалавек. Частка атрада Барчыка разбеглася. І ён прывёў у Магілёў замест 100 толькі 30 паліцаяў. За гэта трапіў у нямілась, быў адхілены ад камандавання.

Аднак неўзабаве Барчык зноў вярнуўся на Клічаўшчыну. Сабраў сабе атрад галаварэзаў, лютаваў, як звер. Толькі ж і ён атрымаў сваё.

ПРАРЫЎ

Пасля аднаўлення Савецкай улады на Клічаўшчыне дыхаць партызанам стала лягчэй. З'явілася магчымасць рэгулярна прымаць на мясцовым аэрадроме самалёты з Вялікай зямлі. Яны дастаўлялі нам боепрыпасы, зброю, узрыўчатку, газеты. Трэба адзначыць, што партызаны кантралявалі ў той час значную частку тэрыторыі Быхаўскага, Кіраўскага, Бялыніцкага, Асіповіцкага раёнаў. Так што фашыстам разлічваць на спакойнае жыццё не даводзілася. І, бясспрэчна, мірыцца яны з гэтым былі не намераны.

Дзесьці ў пачатку ліпеня 1942 года на Клічаўшчыну прыбылі два батальёны немцаў. Адзін з іх адразу ж пачаў бой за вёску Ваевічы і захапіў яе. І хоць праз некаторы час партызаны выгналі фашыстаў з вёскі, але ненадоўга.

А з 20 ліпеня ва Усакінскую зону пачалі сцягвацца нямецкія войскі з Магілёва, Бабруйска, Бялыніч і Беразіно. Адчувалася, што немцы рыхтуюцца да вельмі сур'ёзнай аперацыі. Ёй была прысвоена назва «Адлер». Кіраваў ваеннымі дзеяннямі камандзір 286-й ахоўнай дывізіі генерал-маёр Рыхтэр. У яго распараджэнне былі таксама выдзелены 3 батальёны з 203-й ахоўнай дывізіі, 2-і паліцэйскі полк, два артылерыйскія дывізіёны, узмоцненыя каманды тайнай паліцыі, СД і зондэркаманда. Немцы асядлалі ўсе магчымыя выхады з лесу. Пачалася блакада.

Відавочна, фашысты вырашылі расправіцца з партызанамі канчаткова і ў самы кароткі час. З раніцы да вечара над лесам віселі фашысцкія самалёты. Варта было ім заўважыць штосьці, як адразу ж выклікаліся бамбардзіроўшчыкі. Некаторыя ўчасткі лесу бесперабойна абстрэльваліся артылерыяй і мінамётамі. Абодва бакі ўма-

цоўвалі свае пазіцыі, рыхтуючыся да рашаючага бою.

Раптам у лесе ўсё сціхла. Спыніліся налёты самалётаў, артылерыйска-мінамётны абстрэл. Прычына зацішша хутка высветлілася. Аказваецца, напярэдадні немцы скінулі з самалёта на парашуце вымпел з пісьмом на імя камандзіра партызанскага атрада № 208 палкоўніка У. І. Нічыпаровіча...

Нялёгкую задачу давялося вырашаць У. І. Нічыпаровічу. Усе выхады з лесу надзейна перакрыты фашыстамі. Бяспрэчна, і сілы былі вельмі няроўныя. Больш таго, партызаны амаль 20 дзён вялі бесперапынныя баі з ворагам, расходавалі амаль што ўсе боепрыпасы, засталіся без прадуктаў, былі адрэзаны ад сваіх баз.

Што ж рабіць? Ісці ў палон? Але ж хіба магчыма разлічваць на літасць фашыстаў? Хто мае права вырашаць лёс соцень і соцень людзей? Толькі яны самі.

І вось на паляне выстраіліся партызаны.

— Дарагія баявыя сябры! — звярнуўся да іх Нічыпаровіч.— З пачатку вайны мы прайшлі па яе дарогах сотні кіламетраў. Шмат правялі баёў, нямала страцілі сяброў і блізкіх... Вораг не разграміў нас, толькі пацясніў. Ён думае, што мы ў паніцы, бязвыхадным становішчы. Вось і прапануе мне і вам здацца ў палон... Але ж многія з вас на сабе адчулі, што гэта такое. Дык што, ці жадаеце вы яшчэ раз пабываць у руках ворага?

— Не! — у адзін голас адказалі сотні партызан.

Але ж і заставацца ў акружэнні было бяссэнсава: рана ці позна фашысты ўсіх пераб'юць, калі да таго партызаны самі не перамруць з голаду. Выйсце было толькі адно: ісці на прарыў блакады. Не адкладваючы, прыступілі да распрацоўкі плана аперацыі. У якасці кансультанта запрасілі майго бацьку Васіля Лявонавіча Зайца. Ён і выбраў участак для прарыву. Прадугледжвалася фарсіраваць невялікую рачулку Геньку. Бацька ведаў месца, дзе абодва берагі былі цвёрдыя, надзейна трымалі чалавека.

Ноч стаяла цёмная, хоць вока выкалі. Але бацька вывеў партызан у дакладна вызначанае месца. Наперад выйшла група прарыву — некалькі дзесяткаў аўтаматчыкаў і партызан з ручнымі кулямётамі. Грымнула многагалосае «ура!». Застракаталі кулямёты і аўтаматы. Заслон немцаў быў змяты. У абароне фашыстаў утварылася брэш метраў на дзвесце. У яе хлынула калона партызан, усяго каля трох тысяч чалавек. А далей павялі іх знаёмымі лясны мі сцяжынкамі Іван Баброў, Сцяпан Заяц і Васіль Порсік. А ў гэты час група прарыву прадаўжала цясніць фашыстаў на флангах. Да раніцы ўсё было скончана. Нашы страты склалі ўсяго 7 чалавек.

Пасля прарыву партызан мясцовыя жыхары, што хаваліся ва Усакінскім лесе, засталіся без абароны. На іх фашысты і вырашылі спагнаць сваю злосць. Але ім гэта не ўдалося. Справа ў тым, што лясныя жыхары знайшлі спосаб хавацца ад карнікаў. Пачынаюць яны прачэсваць лес — усакінцы неўпрыкмет, асцярожна ідуць за імі. Зразумела, на значнай адлегласці. А то абгоняць немцаў і рухаюцца асцярожна наперадзе іх. Такая «гульня ў хованкі» працягвалася тыдні два. Час ад часу немцам удавалася каго-небудзь злавіць. І тады размова была кароткая — расстрэл.

ВЯРТАННЕ

Дзесьці ў канцы кастрычніка 1942 года, калі карнікі крыху суцішыліся, пачалі партызаны вяртацца ва Усакінскі лес на свае ранейшыя стаянкі. Праўда, усё тут было разбурана, спалена, расцягнута. Але ж аднаўляць лагеры было лягчэй, чым будаваць нанава.

Рады нашы да таго часу прыкметна парадзелі. У ходзе баёў 61-ы партызанскі атрад панёс немалыя страты. Гэта, таксама штодзённая небяспека, па сутнасці, нечалавечыя ўмовы жыцця, адпужвалі людзей. Прыток свежых сіл спыніўся. Былі выпадкі і дэзерцірства.

Адным словам, на старое папялішча вярнулася нас чалавек за сорак. І хоць былі вельмі знясіленыя, галодныя, узяліся за працу. Набліжалася зіма, і трэба было адбудаваць лагер. Хутка аднавілі некалькі зямлянак, узвялі лазню, хлебапякарню.

Паклапаціліся і пра свае сем'і. Жылі яны, лічы што, пад адкрытым небам. Дамовіліся з Мікалаем Кеўлікам, і ў кіламетрах шасці ад лагера выкапалі на дзве сям'і зямлянку. Потым побач уладкаваў сваю сям'ю партызан Рудкоўскі з Быхаўскага раёна.

Аднойчы ў лесе аказалася калона немцаў. Куды і па што яна ішла — невядома. Калі ж фашысты апынуліся каля зямлянак, узнялі страляніну. Пачулі мы яе ў лагеры. У мяне сэрца ледзь не абарвалася, калі зразумеў, дзе страляюць. Ну, думаю, канец там усім надышоў. Калі ўсё сціхла, кінуўся да зямлянкі. І з палёгкай уздыхнуў: усё абышлося і на гэты раз. Ранішні сняжок прыцярушыў сцежку, якая вяла ад дарогі да паселішча маіх родных. Вось немцы і не заўважылі яе, прайшлі міма.

Пасля блакады фашысты не пакінулі

надзеі калі не спыніць, дык абмежаваць дзеянні партызан. Былі ўзмоцнены гарнізоны, асабліва ў Клічаве (яго немцы зноў адбілі ў нас), створаны новыя ў вёсках Дручаны, Сямікаўка, Макаўка і іншых. Акупанты актывізавалі баявыя дзеянні супраць партызан, наладжвалі засады.

Аднак і мы не сядзелі склаўшы рукі. Асабліва ўзняўся наш настрой пасля таго, як да нас дайшлі весткі аб разгроме немцаў пад Сталінградам. Пры кожным зручным выпадку імкнуліся нагнаць страху на фашыстаў і іхніх памагатых, наладжвалі дыверсіі на чыгункі, знішчалі масты. А вясной правялі паспяховую аперацыю па разгрому адразу дзевяці варожых гарнізонаў. Так мы вырашылі адзначыць дзень нараджэння Гітлера.

Нашаму атраду быў даручаны гарнізон у вёсцы Дручаны. Спачатку сюды прыехалі ўтраіх: Рыгор Кузьміч Паўлаў, яго ад'ютант і я (да гэтага часу ўжо камандзір аддзялення разведкі). Уважліва ўсё агледзелі, вызначылі найбольш зручныя падыходы да вёскі. Калі ўсё старанна спланавалі, Паўлаў з ад'ютантам вярнуліся ў лагер, а я застаўся весці назіранне. Дзесьці гадзіны ў тры ночы падышлі партызанскія роты. Стараючыся не ўзнімаць шуму, занялі вызначаныя пазіцыі. У пяць раніцы, як і дамаўляліся, у неба ўзвілася ракета. Страляючы на хаду, мы кінуліся ў атаку. Фашысты люта супраціўляліся. Асабліва доўга адбіваліся паліцэйскія, якія заселі ў доме. Нашы атакі канчаліся няўдачамі. У рэшце рэшт нам удалося падпаліць дом. Неўзабаве ўсё было скончана. У кагосьці знайшоўся кавалак матэрыі чырвонага колеру. Мы начапілі яго на шэст і прымацавалі да даху аднаго з дамоў. Вёска зноў стала савецкай.

Паспяхова выканалі свае задачы па знішчэнні паліцэйскіх гарнізонаў і іншыя атрады. Удача натхніла партызан. Вырашылі яшчэ раз, як гаворыцца, па гарачых слядах вызваліць ад акупантаў і Клічаў. На гэты раз у аперацыю былі ўключаны наш 61-ы, а таксама 277-ы і 278-ы партызанскія атрады. Спачатку ўсё ладзілася. Нягледзячы на даволі шчыльны агонь, партызаны з розных бакоў хутка наблі-



Помнік у гонар Магілёўскага падпольнага абкома партыі і Клічаўскай ваенна-аператыўнай групы каля вёскі Усакіна.

жаліся да райцэнтра. Ужо і недалёка было да крайніх хат, як нечакана наляцела некалькі варожых самалётаў. На нашы галовы густа пасыпаліся бомбы. Мы вымушаны былі адступіць...

А крыху пазней партызаны ў каторы раз апынуліся ў вялікай небяспецы. Нездарма ж кажуць: адна бяда не ходзіць. У маі фашысты зноў пачалі блакіроўку Усакінскага лесу. Давялося пакінуць добра абжытыя ўжо зямлянкі, блукаць па балотах, рабіць працяглыя начныя маршы. Нямала было і сутычак, і жорсткіх баёў з немцамі. Суткамі не елі, не спалі. Радзелі партызанскія рады. Але мы не гублялі надзеі, не падалі духам.

Толькі ў верасні вярнуўся наш атрад на сваю ранейшую стаянку ва Усакінскія лясы. Упарадзе чакалі нас новыя цяжкасці, новыя выпрабаванні і баі. Але ўсё гэта зусім не бянтэжыла партызан. Цяпер гэта былі ўжо вопытныя, спрактыкаваныя байцы, упэўненыя ў сваіх сілах і ў праваце сваёй святой справы.

Вось так і жылі...

...Асабліва цяжка прыходзілася насельніцтву ў час фашысцкіх блакад і прачосаў лясных масіваў. Тады людзі мітусіліся па лесе, забіваліся ў балоты, імкнуліся як мага хутчэй схавацца ў сваіх тайніках.

Нягледзячы на выключна цяжкае становішча, сяляне аказвалі дапамогу і ўзаемадапамогу адзін аднаму ў пабудове нехітрага жылля.

— Жылі мы дружна, не сварыліся,— расказваў калгаснік вёскі Усакіна Сцяпан Фёдаравіч Заяц... З намі, у курані жыла сям'я партызана Міхаіла Васілевіча Зайца. Ніхто не скардзіўся.

Доўгі час знаходзячыся ў лесе, калгаснікі вымушаны былі тут жа займацца і гаспадарчай дзейнасцю. Яны забіралі з сабой у лясы кароў, свіней, авечак і нават хатніх птушак. Прыходзілася прымаць захады да таго, каб у час фашысцкіх прачосаў не ржалі коні, не рыкалі каровы...

У час прачосаў фашысты не толькі знішчалі насельніцтва, але і лясное жыллё, каб тым, каму ўдалося ўцячы, некуды было прытуліцца.

— У час трэцяй блакады,— сказаў калгаснік Мікалай Іванавіч Заяц,— карнікі знайшлі мой курэнь. Жонка з дзяцьмі ўцякла ў глыб лесу. Я застаўся назіраць за фашыстамі і бачыў, як адзін з іх закалоў двух парсюкоў, якіх я трымаў у лесе. Потым ён запаліў курэнь.

Цяжэй за ўсіх было сем'ям, якія мелі малалетніх дзяцей. Ад страху яны плакалі, чым маглі выдаць сваё месцазнаходжанне. Бацькі вымушаны былі зацiскаць дзецям рот, каб не быў чуцен іх голас...

Дужа складаным было забеспячэнне ў лесе харчаваннем. Не заўсёды ўдавалася прыгатаваць нават тыя прадукты, якія калгаснікі вывозілі з сабой з вёскі. Не толькі адсутнічала соль, але не хапала нават вады.

— Ваду бралі з выкапаных у нізкіх мясцінах ям,— апавядаў калгаснік Емяльян Іванавіч Заяц.— Зімой тапілі снег.

Камендант ляснога лагера Васіль Лявонавіч Заяц маляваў такую жудасную карціну:

— Бывала, што людзям суткамі нічога не пападала ў рот, ды і агонь раскласці было небяспечна. Тады ўсе — старыя і малыя — елі нямолатае збожжа. Памятаю, як мы забілі партызанскага каня. З'елі не толькі мяса — варылі нават конскую скуру...

Невыносныя ўмовы фашысцкай акупацыі вымусілі сялян ужываць у ежу не прыдатныя да яды расліны тыпу заячай капусты, дзікага ці конскага шчаўя. З яго насення варылі суп...

У час варожых блакад і прачосак насельніцтва перажывала страшэнныя пакуты не толькі ад голаду, але і ад смагі.

— Калі скончылася блакіроўка,— тлумачыў жыхар Усакіна Фёдар Іванавіч Бандарчык,— то першае, што папрасілі дзеці,— піць! У роце так перасохла, што калі жонка прынесла з рэчкі вады, то яна не ішла ў горла, а вылівалася цераз нос... Дзеці плачуць, а напіцца не могуць. Толькі праз некаторы час, калі крыху прамачылі ў роце, змаглі напіцца...

Друкуецца па кн.: Залескі А. І. Дарогамі партызанскай Беларусі. Мн., 1974. С. 104—106.

Была і свая самаабарона

У пачатку вайны ў многіх вёсках раёна для барацьбы з акупантамі былі створаны фарміраванні самаабароны. Некаторыя з іх дзейнічалі даволі актыўна і былі надзейнай апорай партызан. Ніжэй змяшчаюцца матэрыялы пра самаабарончаў вёсак Кабылянка і Стаялава.

З самаабароны вырас атрад

Мяне звязвала даўняя дружба з камандзірам Кабылянскай групы самаабароны Арцёмам Пракопавічам Доўгім. Гэты чалавек з мужыцкай хітрынкай, за якой схаваны незвычайны розум, спакойны па натуры, не майстар гаварыць, затое вялікі майстар слухаць, карыстаўся ў партызан і жыхароў сельсавета вялікім аўтарытэтам. Калі Арцём Пракопавіч што сказаў — людзі ўсё зробяць. Ён хадзіў па вёсках і цярпліва растлумачваў жыхарам рашэнні райкома партыі і райвыканкома аб стварэнні мясцовай самаабароны, расказваў пра яе задачы і значэнне.

Група калгаснікаў разам з Доўгім правяла некалькі дзён у лесе пад Белым Логам, дзе летам 1941 г. нашы войскі разгромілі мотамеханізаваную дывізію. Самаабаронцы прынеслі з сабой шмат вінтовак, аўтаматаў і гранат. Уся зброя была пачышчана, змазана. Кабылянская група самаабароны налічвала каля ста чалавек, якія амаль усе былі ўзброеныя. Група мела цесную сувязь з 277-м атрадам, які абараняў заходнія і паўднёва-заходнія рубяжы Клічаўшчыны. Калі ў вёскі Кабылянскага сельсавета іншы раз пранікалі невялікія групы ворага, самаабаронцы без дапамогі партызан распраўляліся з імі.

Неяк Арцём Пракопавіч зайшоў да мяне.

— Параіцца з табою трэба,— пачаў ён.— Думалі мы, думалі, прыкідвалі і так і гэтак і зрабілі вывад, што пара нашу групу самаабароны пераўтварыць у партызанскі атрад. Прастору тады будзе больш, не будзем трымацца за адзін свой сельсавет. А гэта толькі на карысць, калі прастор ёсць, дык і ворага біць спадручней. У маіх хлопцаў на гэта вялікая ахвота. А ў самаабарону іншых возьмем. Многія гатовы стаць пад ружжо.

Мне спадабалася такая прапанова. Я параіўся з членамі райкома партыі. Яны падтрымалі Доўгага. Так і вырашылі: групу самаабароны Кабылянскага сельсавета пераўтварыць у партызанскі атрад і прысвоіць яму нумар 115. Камандзірам зацвердзілі Арцёма Пракопавіча Доўгага, а начальнікам штаба — Дзмітрыя Платонавіча Скрыпку.

З кабылянцаў узялі прыклад і некаторыя іншыя групы самаабароны, у прыватнасці Стаялаўская, і перараслі ў партызанскія атрады. Самаабарончаў мы заўсёды лічылі сваім надзейным баявым рэзервам. З гэтых груп да нас прыходзілі добра падрыхтаваныя байцы, якія мелі зброю. А ў дні варожай блакады ўсе самаабаронцы сталі партызанамі, значна павялічыўшы сілу і колькасць нашых атрадаў.

Друкуецца па кн.: Викторчик П. М. Над Ольсой-рекой. Мн., 1966. С. 67 (у перакладзе на беларускую мову).

Стаялаўская самаабарона
З успамінаў былога партызана С. Храпко.

З вясны 1942 г. пад непасрэдным кіраўніцтвам аператыўнага цэнтра ў вёсках раёна пачалі стварацца групы самаабароны з былых служачых, настаўнікаў, рабочых. Пасля разгрому клічаўскага паліцэйскага гарнізона ў сакавіку 1942 г. атрады самаабароны хутка выраслі. Гэта быў рэзерв, за кошт якога папаўняліся партызанскія атрады.

У красавіку 1942 г. настаўнік Стаялаўскай школы Ігнат Цімафеевіч Каўшырка арганізаваў атрад стаялаўскай самаабароны, які пасля вырас да 60 чалавек. Каўшырка ўзначальваў палітычнае кіраўніцтва, камандзірам атрада быў Павел Міхайлавіч Шамаль, начальнікам штаба Сямён Сцяпанавіч Шамаль, камандзірамі ўзводаў — камсамолец Васіль Шамаль і Дзямід Чмара. Самаабаронцы збіралі зброю і боепрыпасы, неслі варту і апавяшчалі насельніцтва і партызан пра набліжэнне карнікаў, рабілі дыверсіі на чыгунцы, мініравалі бальшакі, масты. Супраць партызан Клічаўшчыны былі кінуты 6 нямецкіх дывізій, якія блакіравалі партызан ва Усакінскіх лясах. 22 чэрвеня 1942 г. наш атрад самаабароны ўліўся ў партызанскі атрад. Камандзір атрада Павел Шамаль і начальнік штаба Сямён Шамаль былі схоплены немцамі і расстраляны ў Клічаве. Ігнат Каўшырка працягваў змагацца з ворагам. У лістападзе 1943 г. ў баі ў лясах Слаўгарадскага раёна, выходзячы з акружэння, ён таксама загінуў. Наш былы самаабаронец, затым камандзір узвода станковых кулямётаў Васіль Шамаль быў адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі. Усе яны загінулі, але памяць аб іх назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

Партызанскі млын

...З прыходам нямецка-фашысцкіх захопнікаў вёска Аколіца прыціхла. Не стала чутна і шуму з паравога млына, што стаяў непадалёк. У гэтых мясцінах да вайны быў калгас «Чырвоны прамень», які ўзначальваў Фёдар Яскевіч. Пад восень 1941 г. ён наведаў калгаснага млынара Макара Васілевіча Караўку і сказаў, што партызанам патрэбны хлеб, а для гэтага неабходна мука.

Праз некалькі дзён млын запрацаваў. У ім жыхары Аколіцы і суседніх вёсак ноччу малолі збожжа, якое засталося з даваеннага часу. За гэта яны давалі М. В. Караўку некалькі фунтаў мукі, якая потым адпраўлялася ў лес на выпечку хлеба партызанам. Людзі ведалі пра гэта. Яны разумелі, што той мукі мала, таму аддавалі для народных мсціўцаў частку са сваіх запасаў.

Партызанскі рух на Клічаўшчыне пашыраўся з кожным днём, таму хлеба патрабавалася ўсё больш. Лясныя салдаты ўжо і самі прывозілі збожжа на памол. Млынарам даводзілася працаваць і днём. Рызыка была вялікая, таму выстаўляліся вартавыя.

Аднойчы туманным ранкам немцы і паліцаі наляцелі ў вёску Аколіца і адразу — да млына. У той момант каля яго было некалькі партызан, а фашыстаў — больш за 50. Народныя мсціўцы пахавалі зброю, «напудрыліся» мукой і выйшлі ім насустрач. Немцы прынялі іх за мясцовых сялян. Афіцэр зайшоў у млын і выкруціў з паравога катла залатнік.

Без гэтай важнай дэталі млын не мог працаваць, і яе трэба было недзе знайсці. Пазней на пошукі залатніка адправіліся млынар Караўка і качагар Якаў Захаравіч Заяц. Яны пайшлі ў вёску Максімавічы, дзе быў спалены немцамі млын, але неабходнай дэталі там не было. Тады яны рушылі ў вёску Мацевічы Бярэзінскага

раёна, дзе таксама быў млын. Але і там нічога патрэбнага не знайшлося.

І ўсё ж млын запрацаваў. Залатнік для паравога катла па спецзаданні дастаў партызан Бурымскі. І зноў да народных мсціўцаў пацягнуліся падводы з мукой.

М. Канапліцкі.

Ваявалі ўсёй сям'ёй

На Клічаўшчыне ў гады вайны шмат было такіх сем'яў. Адна з іх — сям'я Яўхім'і Міронаўны і Еўдакіма Патапавіча Маркавых. Яны гадавалі пяцёра дзяцей. Жылі спачатку ў вёсцы Вусце, а ў трыццатых гадах пераехалі ў Чырвоны Бераг. Калі пачалася вайна, сыны Міхаіл і Іван пайшлі на фронт. Малодшыя, Марыя, Аня і падлетак Вася, заставаліся з бацькамі. Не ведала спакою сэрца Яўхім'і Міронаўны. «Як там, на фронце, мае сыночкі, ці вернуцца жывымі»,— гаварыла яна не раз.

Аднойчы цёмнай вераснёўскай ноччу ў акно асцярожна пастукалі. На трывожнае пытанне «Хто?» пачуўся голас Івана. Спачатку маці з бацькам не паверылі слыху. Але гэта быў ён, Іван, знясілены, схуднелы. Ён з невялічкай групай байцоў ледзь прабіўся з акружэння. Доўга блукалі па лесе, імкнучыся выйсці да лініі фронту, але прарвацца не ўдалося. І прывялі сцежкі да роднай хаты.

Хутка Іван устанавіў сувязь з групай ваеннаслужачых, яго аднагалосна выбралі камандзірам. Пазней байцы далучыліся да партызанскага атрада Васіля Паўлавіча Свістунова. У лес да партызан пайшоў і Еўдакім Патапавіч Маркаў. Не ведалі бацька і сын, што Яўхім'ю Міронаўну з дзецьмі схапілі немцы. Хтосьці данёс у Бацэвіцкую паліцыю, што яны маюць сувязь з партызанамі. Допыт нічога не даў. Нават самы меншы, Вася, маўчаў. Толькі вочы гарэлі лютай нянавісцю. Нямецкі афіцэр аддаў загад павесіць маці і траіх дзяцей партызанскай сям'і. Яны ішлі на вачах аднавяскоўцаў у апошні свой шлях. Тое, што здарылася потым, здавалася невераго дным. Удалечыні пачулася страляніна. У суседняй вёсцы завязаўся бой з партызанамі. Немцы, кінуўшы палонных, разбегліся.

Пасля гэтага выпадку ўсёй сям'ёй Маркавы перайшлі ў партызанскі атрад. Кожнаму знайшлося месца. Марыя трапіла ў медсанчасць медыцынскай сястрой. Аня, авалодаўшы зброяй, удзельнічала ў баявых аперацыях. Іван быў ужо назначаны намеснікам камандзіра 128-га партызанскага атрада.Яго смеласць і адвага выклікалі захапленне ў многіх. Марыў стаць падобным на брата і Вася, які разам з бацькам і маці знаходзіўся ў гаспадарчым узводзе. Колькі разоў уяўляў сабе, як з аўтаматам ідзе ў атаку. Але не ўдалося збыцца гэтым марам. Летам 1942 г. ў час прарыву блакаднага кальца трапілі ў палон Вася і яго бацькі. Разам з іншымі іх павялі на расстрэл. Палонныя ў адчаі кінуліся да лесу. Нямногім удалося выратавацца. Аўтаматная чарга скасіла Еўдакіма Патапавіча. Дагнала куля і Васю. Некалькі крокаў заставалася яму да лесу. І тут упаў ён у густыя жнівеньскія травы, каб ніколі не падняцца.

Цяжка перажывала гэта гора сям'я Маркавых. Яўхім'я Міронаўна некалькі дзён шукала магілу родных, але так і не знайшла. Вельмі шмат засталося ва Усакінскім лесе безымянных пясчаных пагорачкаў пасля жорсткіх баёў з акупантамі. Адпомсціць за смерць родных, за слёзы і пакуты пакляўся тады Іван Маркаў. Пра адвагу камсамольца сярод клічаўскіх партызан хадзілі легенды. Чалавек гэты не ведаў страху.

128-ы партызанскі атрад разам з іншымі атрадамі ўдзельнічаў у разгроме нямецка-паліцэйскага гарнізона ў г. п. Клічаве ў сакавіку 1942 г. Вось як апісвае адзін з заключных эпізодаў бою былы камісар атрада Міхаіл Спяранскі: «Іван Маркаў і яшчэ чалавек дзесяць партызан імкліва дабеглі да школы і, ускочыўшы ў будынак, уступілі ў рукапашны бой з ворагам. Дзе кароткімі чэргамі з аўтамата, а дзе і прыкладам Маркаў расчышчаў шлях сваім таварышам».

М. Спяранскі расказвае пра адну з дзёрзкіх аперацый, якая была праведзена пад кіраўніцтвам Івана Маркава. Пасля разгрому варожага гарнізона ў Клічаве ў партызанскіх атрадах амаль не засталося боепрыпасаў. Неабходна было як мага хутчэй папоўніць запасы. Таму, як толькі паведамілі, што недалёка ад Бабруйска знаходзяцца склады боепрыпасаў, якія ахоўваліся невялікім атрадам немцаў, Маркаў папрасіў у камандзіра дазволу выехаць на аперацыю. Раніцой наступнага дня падводы са зброяй і боепрыпасамі прыбылі ў атрад. І так паўтаралася некалькі разоў, пакуль аб усім не даведаўся камендант Бабруйскага гарнізона. Ён аддаў загад узарваць тое, што засталося на складах.

Але гэта не спыніла партызан. Свістуноў з Маркавым распрацавалі план рызыкоўнай аперацыі. Была сфабрыкавана накладная на імя начальніка Глускай паліцыі. Невялікая група смельчакоў, узброеная аўтаматамі, з паліцэйскімі павязкамі на рукавах, выехала ў Бабруйск.

«Пераапранутыя партызаны,— пісаў М. Спяранскі,— паспяхова праехалі на тэрыторыю Бабруйскай крэпасці. Фальшывай накладной і паліцэйскіх павязак было дастаткова для праезду праз усе пасты. Але калі за смельчакамі са скрыгатам зачыніліся жалезныя вароты, у кожнага з іх замерла сэрца. Крэпасць абнесена земляным валам і абгароджана калючым дротам. Кругом немцы. Адсюль не ўцячэш.

Накладная не выклікала падазрэння і ў начальніка склада, нямецкага гаўптмана. Ён толькі спытаў:

— А сам начальнік паліцыі дзе?

— Ён на баявой аперацыі, партызан ганяе,— адказаў Маркаў і падумаў: «Добра, што не адрэкамендаваўся начальнікам паліцыі: гаўптман, відаць, ведае яго асабіста».

— Няўжо асмеліўся сам выехаць? Даўно б так. Сядзіце там, як мышы, а партызаны разгульваюць вольна і сваю справу робяць. А ты кім будзеш? — нечакана спытаў стары афіцэр, падняўшы вочы на Маркава.

— Намеснік начальніка, пан гаўптман! — адрапартаваў Ваня, ціха шчоўкнуўшы абцасамі.

— Глядзі, табе даю патроны, з цябе запатрабую. Ты, я бачу, не труслівы. Служы, старайся. Ачысціш раён ад партызан — будзеш мець узнагароды.

— Дзякую за давер, пан гаўптман! Не сумнявайцеся, боепрыпасы скарыстаем, як належыць. Даю вам слова, што ніводзін сабака не ўцалее.

Атрымаўшы патроны, пагрузілі іх і выехалі з крэпасці. І толькі пры выездзе з горада, каля моста праз Бярэзіну, іх спыніў патруль.

Для праезду цераз мост патрэбен быў спецыяльны начны пропуск, а яго не было. Аўтаматнай чаргой партызаны «знялі» фашыста і, узваліўшы яго ў сані, праскочылі мост. За мостам нястройна зацягнулі песню.

На шашы сустракаліся машыны з нямецкімі салдатамі, але нікому і ў галаву не прыходзіла, што гэта не п'яныя паліцэйскія, а партызаны. Ноччу Маркаў і яго хлопцы былі ўжо ў партызанскім атрадзе...»

Ваню Маркава асабіста ведаў Іван Паўлавіч Крыскавец, рэдактар падпольнай газеты «Голас партызана». У сваёй кнізе «Сустрэчы ў Цераболі» (1971) ён расказвае пра баявую дзейнасць адважнага партызана.

Аднойчы сувязная з Бабруйска Каця Кукушкіна паведаміла, што па вуліцах горада часта раз'язджае адкрытая легкавая машына, з якой нямецкія афіцэры на хаду раскідваюць лістоўкі. Лістоўкі агітавалі насельніцтва запісвацца на службу ў паліцыю і спецыяльныя батальёны.

Маркаў звярнуўся ў рэдакцыю з просьбай надрукаваць партызанскія лістоўкі, знешне падобныя на тыя, што раскідвалі немцы.

Праз некалькі дзён па вуліцах Бабруйска кружыла машына, захопленая партызанамі ў баі. У ёй светлавалосы нямецкі афіцэр (а гэта быў Ваня Маркаў) у самых людных месцах раскідваў лістоўкі. Немцы на гэта ўвагі не звярталі. Яны ведалі, чаго варта гебельсаўская прапаганда. А нашы людзі, толькі глянуўшы на загалоўкі лістовак, хавалі іх, каб прачытаць партызанскі зварот.

...Загінуў Іван Маркаў 10 лютага 1943 г. 128-ы партызанскі атрад дыслацыраваўся ў глухой дуброве каля сяла Мачэск Бярэзінскага раёна. Разам з двума партызанамі Маркаў выехаў у разведку. Як толькі пад'ехалі да вёскі, на партызан абрушыўся агонь дзесяткаў аўтаматчыкаў. Разведчыкі скаціліся ў кювет, і, адстрэльваючыся, пачалі адпаўзаць. Сам Іван, цяжка паранены, адстрэльваўся да таго часу, пакуль білася сэрца.

Пасля вайны прах Івана Еўдакімавіча Маркава быў перанесены з лесу ў цэнтр вёскі Бацэвічы. Ордэн Айчыннай вайны, якім Маркаў быў узнагароджаны пасмяротна, пасля вайны быў уручаны маці, Яўхім'і Міронаўне.

Калі адгучалі майскія салюты Перамогі ў 1945 г., сабралася сям'я Маркавых за адным сталом: маці, Марыя, Аня. Вярнуўся з фронту Міхаіл. Але не было сярод іх загінуўшых бацькі Еўдакіма Патапавіча, Васі і Івана.

Вайна скончылася, але яна засталася ў памяці, у снах людзей, у іх успамінах. Колькі разоў прачыналася Марыя Еўдакімаўна ад страшэннай карціны іх, разам з маці, вядуць на расстрэл, і кожны крок, зроблены па вясковай вуліцы, набліжае іх да апошняй мяжы... Часта ўспаміналася, як у час блакады партызанскіх атрадаў даводзілася, перасільваючы страх і адчай, ратаваць параненых.

...Пры прарыве блакаднага кальца 128-ы партызанскі атрад не паспеў перабазіраваць у надзейнае месца сваю санчасць. Камандаванню нічога не заставалася, як пакінуць 27 параненых у лесе пад наглядам урача Віктара Барысавіча Пятроўскага і медсястры Марыі Еўдакімаўны Маркавай. Была выдзелена варта з трох партызан на чале з Леанідам Васілевічам Цімаховічам.

«Гэта былі самыя цяжкія дні ў маім жыцці,— успамінаў Леанід Васілевіч.—

Каб не трапіць у лапы да фашыстаў, мы перацягнулі параненых на астравок сярод забалочанага лесу. Пятроўскі і Маркава неадступна сачылі за параненымі. Лекаў і перавязачнага матэрыялу не было. У ход ішлі мох, маладое ліcце вольхі і падарожніку, лазовая і ліпавая кара.

Елі ягады і грыбы, шчаўе. Зрэдку выходзілі на палі вёсак Бярозавае Балота і Вялікая Старына, каб накапаць маладой бульбы».

Становішча яшчэ больш ускладнілася, калі партызаны, захапіўшы з сабой кулямёт і аўтаматы, пайшлі ў Бацэвічы за соллю і не вярнуліся. Пэўна, іх схапілі паліцэйскія. Патрэбна было тэрмінова мяняць месца. Вырашылі перабрацца ў балоты бліжэй да Ольсы. Амаль што суткі Віктар Барысавіч, Марыя Еўдакімаўна і Леанід Васілевіч пераносілі параненых на астравок сярод балот. Потым рабілі лёгкія буданы, каб засцерагчы параненых ад непагоды.

Набліжаўся верасень. Патрэбна было шукаць лепшага прытулку. Аднойчы Марыя выпадкова сустрэлася з разведчыкамі 208-га атрада. Яны паведамілі, што, прарваўшы блакаду, клічаўскія партызаны знаходзяцца ў лясах Кіраўскага, Бялыніцкага і Бярэзінскага раёнаў. 128-ы атрад базіруецца за шашой Мінск — Магілёў, недалёка ад партызанскага аэрадрома. Вырашылі любой цаной дабрацца да свайго атрада. Цяжкім быў гэты шлях. Каля васьмідзесяці кіламетраў па варожым тыле пераадолелі партызаны. Цяпер гэта здаецца неверагодным. Але яны дабраліся да партызанскага атрада. Ніхто з параненых не памёр. І вось яны, змучаныя, схуднелыя, стомленыя бясконцай небяспечнай дарогай стаяць перад камандзірам атрада, яшчэ не верачы, што ўсе перажыванні скончыліся. Леанід Цімаховіч дакладвае: «Заданне камандзіра выканана». Сказана па-вайсковаму коратка. Але колькі за гэтымі словамі трывог, цяжкасцей і пакут. Яны, В. Б. Пятроўскі, Л. В. Цімаховіч і М. Е. Маркава, здзейснілі сапраўдны подзвіг — выратавалі 27 чалавечых жыццяў.

Л. Л. Ачыновіч.

«Не сорамна за сваіх настаўнікаў і вучняў»

З успамінаў П. В. Багрыцэвіча

Вялікая Айчынная вайна застала мяне ў в. Нясята, дзе я працаваў дырэктарам школы. На другі дзень вайны мяне і іншых камуністаў выклікалі ў Клічаўскі РК КПБ, дзе адбыўся сход партыйнасавецкага актыву раёна. У прэзідыуме сядзелі Якаў Заяц, Пётр Вікторчык. Нараду адкрыў сакратар РК Клееў. Яна была кароткая: абмеркавалі пытанне аб вераломным нападзе гітлераўскай Германіі на нашу Радзіму.

Заяц, Вікторчык, Букаты і іншыя, хто выступаў, гаварылі аб задачах партарганізацыі раёна па мабілізацыі ўсіх сіл на барацьбу з ворагам. Удзельнікі нарады, вярнуўшыся на свае месцы, пачалі арганізоўваць самаабарону па населеных пунктах, наладзілі начное дзяжурства, займаліся эвакуацыяй тэхнікі МТС ва ўсходнія раёны, архіваў і грашовых дакументаў, пачалі раздаваць насельніцтву пад ахову грамадскую маёмасць калгасаў і МТС, запасы збожжа, кааператыўную ўласнасць і г. д. У раёне ішла перабудова ўсёй работы на ваенны лад, хавалі ад ворага жывёлу, дабро, тэхніку.

Мне, як дырэктару школы, было даручана сабраць настаўніцкі калектыў школы, камсамольскую арганізацыю на чале з яе сакратаром М. Р. Каваленкам. Настаўніцкі калектыў наш быў у асноўным маладзёжны, згуртаваны, з выдатнай прафесійнай падрыхтоўкай, больш за палавіну яго складалі камсамольцы, працавалі на даручаным участку з агеньчыкам, зладжана. Гэта Г. Сцепаненка, К. Жлутко, І. Сакольніцкая, А. Пакроўская, М. Накаў, М. Шпуратаў, М. Шкроба, В. Аўхіменка, Е. Шакелян, Н. Земялціна і іншыя. Аб тым настаўніцкім калектыве і сёння з павагай адзываюцца жыхары вёскі.

Камсамольская арганізацыя школы, якую ўзначальваў Мікалай Рыгоравіч Каваленак, налічвала 16 чалавек. Тут на сходзе дамовіліся арганізаваць самаабарону, назапасіць зброю, арганізаваць дзяжурства ў вёсцы, вылоўліваць парашутыстаў, правакатараў, расказваць насельніцтву праўду аб вайне, рабіць засады на дарогах, весці разведку праціўніка, паклясціся помсціць гітлераўцам. Усе былі ўпэўнены ў перамозе.

Падзеі з першых дзён развіваліся імкліва. Нашы хлопцы камсамольцы К. Стрыгун, В. Рабянок, Е. Каваленак, М. Жураўскі, М. Астроўскі, І. Дубінін, К. Зенкавец, Д. Астроўскі, Б. Каваленак прынялі няроўны бой каля в. Люціна з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Сілы былі няроўныя, заставалася толькі адступіць, каб пазбегнуць страт. І камсамолец Міхаіл Аляксандравіч Астроўскі, які страляў з кулямёта, даў каманду: «Адыходзьце, хлопцы, я вас прыкрыю». Кулямётным агнём ён не даваў прыўзняцца фашыстам, пакуль таварышы не адышлі ў глыб лесу. А калі кінуўся ўслед сам, фашысцкая куля трапіла прама ў сэрца.

Камсамольская арганізацыя ў хуткім часе папоўнілася: з заходніх раёнаў Беларусі, з Беластоцкай вобласці прыбыў да нас сакратар камсамола Леанід Мікалаевіч Дубінін (нарадзіўся ў в. Нясята) і баец Чырвонай Арміі Рыгор Барысавіч Дубінін, якія адыходзілі на Усход на злучэнне з Чырвонай Арміяй. Затрымаліся на некаторы час і арганізавалі ў в. Нясята партызанскае падполле, збіралі зброю, перадавалі яе ў партызанскія атрады, а потым і самі перайшлі да партызан. У наш атрад № 115 брыгады Ізоха з'явіліся Казімір Стрыгун, Васіль Рабянок, Ева Каваленак. Я быў вельмі рады сваім былым вучням, а зараз партызанам. А Барыс Каваленак і Іван Дубінін уступілі ў 278-ы атрад.

Па-рознаму склаўся лёс былых настаўнікаў і вучняў. Груня Сцепаненка была спалена акупантамі ў в. Баркі Кіраўскага раёна, М. Шпуратаў, М. Шкроба, В. Аўхіменка загінулі на фронце пры вызваленні роднай Беларусі. Вельмі трагічны лёс спасціг камсамольцаў Косцю Зінкаўца, Мікалая Каваленка, Леаніда Дубініна, Дзям'яна Астроўскага: па даносе правакатара яны былі арыштаваны паліцаямі і ў лютым 1942 г. расстраляны ў Клічаве разам са сваімі бацькамі.

Шкада іх, маладых і гарачых патрыётаў. Але мне не сорамна як за сваіх настаўнікаў, так і за вучняў.

Маладосць ёсць маладосць

З успамінаў В. Якавенкі, былога сакратара Клічаўскага падпольнага РК ЛКСМБ

Вялікі пералом пад Сталінградам, актывізацыя баявых дзеянняў у тыле ворага, патрыятычны і палітычны ўздым усяго народа натхнілі шырокія масы на партызанскую барацьбу. У нашы атрады прыйшло новае папаўненне. З новай сілай разгарнуліся баі. Адзін за другім пад націскам лясных салдат капітулявалі паліцэйскія гарнізоны. І што характэрна, побач з мужчынамі ў схватку з ворагам уступілі жанчыны, дзяўчаты. Яны і зараз стаяць перад вачыма — маладыя, энергічныя Надзея Лізун, Аляксандра Івашкіна, Ганна Буракоўская, Шура Кок і Марыя Мацюшонак. Баявыя дзяўчаты! Яны былі смелыя і ў разведцы, і на дыверсіях.

Акрамя сістэматычнага ўдзелу ў правядзенні баявых аперацый, даводзілася выконваць значную грамадска-палітычную і камсамольскую работу як камсоргу роты, а з 30 жніўня 1943 г. і як сакратару Клічаўскага падпольнага райкома камсамола па прапагандзе. Адначасова я быў зацверджаны памочнікам камандзіра роты.

Першае баявое хрышчэнне ў ролі камандзіра я атрымаў пры разгроме гарнізона ў вёсцы Казулічы Кіраўскага раёна. У гэтым баі намі было забіта 130 паліцэйскіх і 39 чалавек узята ў палон. У якасці трафеяў нам дасталася пушка, 8 міна-мётаў, 4 станковыя і 8 ручных кулямётаў, 11 аўтаматаў, 39 вінтовак, 4 скрынкі медыкаментаў, 35 коней, 153 пары ботаў, 70 шынялёў, штабныя дакументы і шмат чаго іншага. Амаль такі ж поспех садзейнічаў нам пры налёце на Пацаву Слабаду. Многія маладыя патрыёты ў той час не шкадавалі жыцця дзеля набліжэння перамогі над ворагам. Помню, 1 снежня 1943 г. першы сакратар Клічаўскага падпольнага райкома камсамола М. Д. Лапцёнак адсылаў у Магілёўскі падпольны абком камсамола пастрэлены камсамольскі білет № 3568512, выдадзены Бабруйскім гаркомам ЛКСМБ 24 лютага 1939 г. Юрыю

Пасяджэнне падпольнага райкома камсамола. Карціна мастака Э. А. Белагурава (з фондаў раённага музея).

Рыгоравічу Дулебенцу. Камсамолец гераічна загінуў 18 лістапада 1943 г. ў баі з карнікамі ў в. Уладзіміраўка.

Будучы камсоргам 4-й і 8-й рот, а затым сакратаром падпольнага райкома ЛКСМБ па прапагандзе, мне даводзілася рыхтаваць, афармляць дакументы, прымаць у члены ВЛКСМ у пярвічных арганізацыях рот і на бюро РК ЛКСМБ шмат зусім яшчэ юных, якія ледзь дасягнулі камсамольскага ўзросту хлопцаў і дзяўчат. Прыходзілі яны ў атрад з бацькам ці маці, і тут з цягам часу ўжо зарэкамендавалі сябе ў баях з ворагам. Сярод іх былі Сцяпан Зорын, Соф'я Акуліч, Марыя Мацюшонак, Віктар Піскун і многія іншыя.

...У мае абавязкі побач з ростам радоў ВЛКСМ уваходзіла мабілізацыя камсамольцаў на актыўнасць і баявітасць, узмацненне масава-палітычнай работы сярод моладзі: правядзенне лекцый і дакладаў, сходаў і гутарак, выданне лісткоў і зваротаў, расказ пра юнакоў і дзяўчат, якія найбольш вызначыліся ў баях з фашыстамі.

...Была ў нас і свая мастацкая самадзейнасць, праводзіліся розныя конкурсы. Вось, напрыклад, выпіска з пастановы Клічаўскага падпольнага РК ЛКСМБ ад 20 ліпеня 1943 г. «Аб арганізацыі агляду мастацкай самадзейнасці партызанскіх атрадаў Клічаўскага раёна (інсцэніроўкі, песні, танцы, дэкламацыя, расказы, музыка, харавое выступленне, вершы, складзеныя партызанамі)».

Прэміі: 1-я — ручны кулямёт, 2-я — аўтамат ППШ (калектыву). Індывідуальная: 1-я — аўтамат ППШ, 2-я — вінтоўка з аптычным прыцэлам, 3-я — пісталет ТТ, 4-я — аптэчка, 5-я — бібліятэчка. Журы: Лапцёнак М. Д. (старшыня), Патупчык С. Н. і Гершовіч І. М. Журы прынцыпова і строга ставілася да кожнага выступлення таго ці іншага выканаўцы і заслужана называла лепшых.

Вось пратакол журы ад 4 верасня 1943 г., дзе было запісана, што першая прэмія прысуджана мастацкаму калектыву 2-й роты 277-га партызанскага палка за клаунаду, выкананую У. Чумаковым і Н. Вераб'ёвым. Гэтаму калектыву ўручаны аўтамат ППШ. У. Чумакоў атрымаў на аглядзе пісталет ТТ, а яго таварыш па зброі Р. Ізох — карабін. Бібліятэчка дасталася І. Маркоўскаму. Тут жа, на аглядзе, адзначаліся і баявыя паказчыкі нашых камсамольцаў. Так, у баях за вёскі Любічы, Кабылянка, Мацевічы і Люціна вызначыліся камсамольцы Міхаіл Коўрык, Яўген Дваяглазаў, Марыя Лешчанка, Міхаіл Белабароды і іншыя.

Што ж, маладосць ёсць маладосць: ёй і на вайне не толькі ваяваць, а і павесяліцца трэба.

Пакуль б'ецца сэрца

Малады партызан, што стаяў у сакрэце, раптам насцярожыўся і, расхінуўшы густыя кусты, пачаў прыслухоўвацца. Сумнення не заставалася: па балоце ў бок лагера ішоў чалавек. Чуваць было чвяканне ботаў у гразі...

— Стой! Хто ідзе? — лязгнуўшы замком аўтамата, аклікнуў партызан.— Пароль!..

Праз некалькі мінут мокры да пояса хлопчык ледзь паспяваў адказваць на пытанні партызан. Высветлілася, што гэта пляменнік камандзіра атрада Ігната Ізоха.

У атрадзе хлапчука сустрэлі ветліва.

— Ну, расказвай, Алёша, можа пагуляць да нас прыйшоў? — спытаў, гладзячы па галаве пляменніка, камандзір.

— Не гуляць, а фашыстаў біць! — адказаў Алёша.

— Усё гэта добра,— сказаў камандзір,— толькі давядзецца табе, Алёша, ісці дамоў.

— А куды ісці, калі, самі ведаеце, усю вёску спалілі немцы, 75 мужчын расстралялі.

— Так,— задумліва прамовіў Ізох.— А з кім жа і як жа ты цяпер жывеш?

— У мяне застаўся адзін чатырохгадовы брацік Коля. Дык мы з ім у дзядзькавай зямлянцы жывём,— ціха адказаў Алёша і, падумаўшы, дадаў: — А хто ж гэтым гадам адпомсціць за наша сяло?

— Мы, Алёша, адпомсцім. А ты лепш паеш і лажыся спаць. Ты не крыўдуй на нас, што не можам узяць цябе ў атрад. Права няма ў нас такога. Мы не можам рызыкаваць тваім жыццём. Да таго ж і пра Колю павінен нехта клапаціцца...

Як толькі сцямнела і паміж высокімі соснамі паказаўся малады месяц, стары партызан праводзіў Алёшу да самых зямлянак. Падзякаваўшы партызана за падарунак, Алёша сказаў на развітанне:

— А немцаў я ўсё ж буду біць.

Пазней ён з аўтаматам пачаў хадзіць да ракі і, схаваўшыся ў хмызняку, сачыць

за фашыстамі, што праязджалі на Бабруйск або на Ялізава. Аднойчы на тым беразе паказаўся легкавы аўтамабіль. Бразнулі дзверцы, выйшла трое немцаў, і ўсе яны спусціліся да ракі.

«Афіцэры! — узрадавана прашаптаў хлапчук.— Ладна, мы вам пакажам, як паганіць нашу раку...»

Афіцэры павольна, як дзядулі ў лазні, распраналіся, пераступалі з нагі на нагу, гаварылі аб нечым, пакуль нарэшце самы даўгавязы, сагнуўшыся, як чапля, дугой, не паспрабаваў ваду. Штосьці прагаргатаў на ўсю раку і палез глыбей. За ім паплылі астатнія. Вось яны ўжо так блізка, што Алёша добра іх адрознівае. Уперадзе плыве смуглы, падобны на цыгана, чорнавалосы, з кручкаватым, як у папугая, носам; крыху воддаль, узнімаючы снапы пырскаў,— рыжы і тоўсты. Далёка адстаў ад іх «чапля».

— Цурык! — крыкнуў пярэднім даўгавязы.

І ў тое ж імгненне Алёша націснуў на спускавы кручок, чорнавалосы ўскрыкнуў спалоханым голасам, нырнуў пад ваду, зноў вынырнуў — і на тым месцы, дзе ён толькі што плыў, пайшлі бурбалкі.

Рыжы таўсцяк, ва ўсю размахваючы рукамі, спяшаўся да свайго берага. Але чарга з аўтамата секанула па вадзе, рыжы штосьці выкрыкнуў і, захлынаючыся, пайшоў на дно. Тады Алёша пачаў лавіць на мушку даўгавязага. Калі націснуў на спускавы кручок, не пачуў выстралу.

— Шчасце тваё, сабака, што ўсе патроны выйшлі...

А неяк халодным восеньскім ранкам, калі рачны туман ахутаў прыбярэжныя кусты, Алёша прысеў у вербалозніку і, чакаючы нечага, стаў паглядваць уніз па цячэнні ракі. Звычайна ў такі час з Бабруйска да Ялізава праходзіў катэр, на якім іншы раз было поўна немцаў. А вось і ён, цяжка дыхаючы, паказаўся з-за крутога павароту. У Алёшы гулка забілася сэрца. Што ж адбудзецца зараз на Бярозе-рацэ? Ці ўдасца? Катэр... Гэта ж не бездапаможныя афіцэры ў вадзе...

Катэр набліжаўся... На палубе Алёша налічыў 15 немцаў. Адзін з іх, у акулярах, сядзеў на бочцы і на губным гармоніку найграваў мелодыю рускай песні, а другі сіпата падпяваў: «Волга, Волга, мать родная»...

«Ну, я вам зараз пакажу Волгу!» — і, націснуўшы на курок, давай паліваць свінцом немцаў. Яны падалі, як падкошаная трава, раненыя поўзалі, а тыя, хто ўцалеў, скакалі за борт, стараючыся схавацца за катэрам.

На наступны дзень людзі расказвалі,

А. Галацэвіч.

што партызаны з берага забілі шэсць немцаў на катэры. А немцы аб'явілі насельніцтву быццам яны знішчылі роту партызан, страціўшы ў гэтым баі толькі аднаго салдата.

Праўду ж ведалі ў атрадзе, куды ноччу зноў прабраўся Алёша з неразлучным аўтаматам.

— Ну што ты з ім зробіш! — не хаваў радасці камандзір.

— Як ты яго не прымеш, калі ён ужо даўно лясны салдат і ўступны ўзнос заплаціў...

Так піянер вёскі Люціна Клічаўскага раёна Аляксей Галацэвіч стаў сапраўдным партызанам...

Алёша быў выдатным разведчыкам. Ён перапраўляўся цераз раку ў месцы размяшчэння паліцэйскіх гарнізонаў, здабываў патрэбныя звесткі, звязваўся з надзейнымі людзьмі, распаўсюджваў лістоўкі, іншы раз прыносіў у атрад гранаты, вінтоўкі, патроны, здабытыя ў час вылазак. Пайшла па вёсках слава аб адважным піянеры-разведчыку і мсціўцу. Немцы нават назначылі высокую ўзнагароду тым, хто зловіць Алёшу і даставіць жывым. Але не так лёгка было гэта зрабіць. Затое часта знаходзілі паліцаі дзе-небудзь на сцяне казармаў запіску: «Прывітанне лапавухім нямецкім халуям-бобікам! Час вашай гібелі не за гарамі, а за бліжнімі кустамі... Дзімка-Невідзімка».

...У 1943 г.— летам, калі пачалося жніво,— карны атрад паліцаяў перабраўся ноччу цераз раку і нечакана акружыў зямлянкі вёскі Люціна. Алёша ў той дзень, вяртаючыся з задання, зайшоў да дзядзькі, каб пераапрануцца.

— Алёшанька! — крыкнула, убегшы ў зямлянку, цётка.— Бяжы. Немцы ў вёсцы.

Алёша схапіў свой аўтамат, гранату і кінуўся на вуліцу.

— Стой, здавайся! — закрычалі паліцаі.

Алёша, спрытна пераскочыўшы цераз плот, пабег агародамі. Наперадзе былі

альховыя зараснікі — туды. Паліцаі беглі ўслед і не стралялі: начальнік загадаў злавіць у што б там ні стала жывым.

— Стой, стой! Здавайся, нічога з табой не зробяць! — чуў адважны партызан гучныя выкрыкі «бобікаў».

— Загадваю ўзяць жывым! — выкрыкнуў нехта з іх.

Алёша перабег цераз невялікае балотца. Раптам затрашчаў аўтамат — гэта даў чаргу падаспеўшы афіцэр-немец. Тады пачалі страляць паліцаі. Алёша пахіснуўся, прабег яшчэ некалькі крокаў і ўпаў у гразь. Цяжка падняў галаву, аглянуўся і слабеючым голасам крыкнуў тое, што крычаў чырвоны камандзір у фільме «Чапаеў»:

— Брэшаце, гады, жывым не возьмеце.

Разрыўная куля ўдарыла яму ў руку, і Алёша выпусціў аўтамат. Вакол у кустах трашчалі разрыўныя кулі. Алёша памутнелымі вачыма бачыў яшчэ паліцаяў і немцаў, якія, хаваючыся за кустамі, падбіраліся да яго. Ён прыўзняўся і, сабраўшы апошнія сілы, здаровай рукой адшпіліў ад пояса лімонку, паднёс да вуснаў чаку. Але гарачая куля рассекла яму шчаку, і акрываўленым тварам ён уткнуўся ў мокрую балотную купіну.

Немцы і паліцаі тапталі яго нагамі і білі прыкладамі. Потым адзін з катаў выстраліў хлопцу ў галаву.

І тут непадалёку ўзнялася страляніна. Карнікі кінуліся ўрассыпную.

Калі партызаны адшукалі Алёшу, ён чуць дыхаў. На насілках аднеслі ў вёску, абмылі цёплай вадой і перавязалі чатыры раны. Апошняя куля немца пашкодзіла хлопчыку вуха. Маленькі Коля працягнуў доктару дрыжачыя рукі, папрасіў ахрыплым голасам:

— Дзядзечка, родненькі, не дай памерці браціку...

І Алёша ачуняў.

...Прыйшла вясна 1944 г. Да Бярэзінскіх лясоў набліжаўся фронт. Немцы вывозілі ў Германію мірнае насельніцтва. Дзяцей адвозілі за некалькі кіламетраў і спальвалі ў калгасных свірнах.

— Хто ж майго Кольку абароніць? — пытаў Алёша ў партызан.— Ён жа маленькі, сам не ўцячэ ў выпадку чаго ў лес.

Камандзір атрада дазволіў прывесці брата ў лагер.

І вось аднойчы ноччу на Клічаўскі партызанскі аэрадром прыляцеў з Вялікай зямлі самалёт за параненымі партызанамі. Алёша стаў развітвацца з Колем. Параненых ужо размясцілі ў самалёце, а Коля павіс у брата на шыі і не мог адарвацца.

— Ну, не плач, брацік. Скончыцца вайна, убачымся, і перастань слёзы ліць, не маленькі, праз год у школу пойдзеш,— гаварыў Алёша, а ў самога мокрыя ад слёз шчокі.

— Да пабачэння, Коля, слухайся добрых людзей...

Узмыў самалёт у начное неба і прапаў у бяззоркавай цемры...

Скончылася вайна. Былы юны партызан пісаў усюды запытанні, адшукваў брата Мікалая Піліпавіча Галацэвіча, але аб ім ніякіх звестак.

Сам жа Алёша Галацэвіч загінуў выпадкова. Было гэта ў лістападзе 1945 г. Пайшоў ён са сваім сябрам Міронам Ананічам да чыгуначнага моста рыбу лавіць. Алёша ўжо разматваў вуды, а Мірон яшчэ шукаў пад каменем чарвей.

— Глядзі, што я знайшоў — пачуў Алёша голас сябра, павярнуўся і ўбачыў у руках Мірона вялікі снарад.

— Навошта ён табе? — спытаў Алёша.

— Прыбраць патрэбна куды-небудзь, а то яшчэ бяды наробіць.

Ступіўшы некалькі крокаў, Мірон спатыкнуўся, упаў, і снарад стукнуўся аб камень. Алёшу здалося, быццам нешта зашыпела ў снарадзе. Ён таропка схапіў яго і шпурнуў у раку. Не даляцеўшы да вады, снарад узарваўся.

Цяжка паранены Алёша, не сказаўшы ні слова, неўзабаве памёр. Пахаваны на Люцінскіх могілках побач з героямі-партызанамі.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Пионеры-герои. Мн., 1968. С. 207—219 (у перакладзе на беларускую мову).

* * *

А малодшы брат Алёшы Галацэвіча Коля знайшоўся. Лёс закінуў яго ў далёкі Чэлябінск, дзе ён жыў пад іншым прозвішчам. Але ў памяці яго моцна трымаліся ўспаміны пра Клічаўскія лясы, пра партызанскія кастры, пра пякучыя слёзы пры развітанні з брацікам на партызанскім аэрадроме. І было цвёрдае жаданне знайсці родных, убачыць сястру, братоў, родную вёску.

Ва ўсе канцы краіны адпраўляў Мікалай пісьмы з Чэлябінска, дзе жыў з сям'ёй. Нарэшце ўдача — на адну з радыёперадач «Бюлетэнь пошуку родных» прыйшоў водгук з Магілёўшчыны. Усхваляваны ліст прыслалі родзічы Мікалая — яго сястра і брат Іван, якія ўжо і не спадзяваліся ўбачыць калі-небудзь самага малодшага з сям'і. І паляцелі пісьмы з Чэлябінска ў Беларусь. І хоць у Мікалая было

іншае прозвішча (Безік), чула сэрца, што гэта ён Коля Галацэвіч. Люцінцы перадавалі з рук у рукі фотаздымак, які прыслаў Мікалай. На дзетдомаўскім здымку аднавяскоўцы прызналі маленькага Колю.

І вось хвалюючы дзень. Бацька, Іван Піліпавіч, усё тупаў па пероне, курыў бясконца, а стрыечны брат, Аляксей Майсеевіч, яго супакойваў: «Усё будзе добра, гэта ён, Коля, я ведаю».

Прыбыў цягнік, на перон высыпалі людзі, а мы напружана ўглядаліся ў кожнага, пакуль хтосьці не выгукнуў: «Коля!». Усе кінуліся да яго. Слёзы, пытанні, абдымкі... Мікалай прыехаў з жонкай Марыяй, сынамі Ігарам і Аляксеем, якога назваў у гонар свайго брата.

Усе разам паехалі ў Люціна. На могілках Мікалай пакланіўся магіле Алёшы: «Ну вось, брат, я і знайшоў цябе. Але так позна...»

Хвацкія хлопцы-падрыўнікі

З успамінаў Галацэвіч

Пад кіраўніцтвам Кажушкі ў лагеры была арганізавана майстэрня па вырабу мін і выплаўцы толу, недахоп якога адчувалі дастаткова востра. У агромністых катлах, якія былі падвешаны над зямлёй, дзень і ноч «варыліся» снарады і авіябомбы.

Іх даволі многа знаходзілі ў лясах і каля дарог. Яны не выкарыстоўваліся падрыўнікамі з-за таго, што былі цяжкімі і грубасткімі. Нехта параіў выплаўляць з іх тол. Прапанова заслугоўвала ўвагі, але як было ажыццявіць на практыцы, ніхто не ведаў. Нават простае падагравание бомбаў і снарадаў на агні было надзвычай небяспечным і да таго ж не давала патрэбных вынікаў. Тады вырашылі паспрабаваць разаграваць іх у гарачай вадзе, тэмпература якой падтрымлівалася каля ста градусаў. Першая спроба дала добрыя вынікі. Кажушка, нібы вопытны сталявар, хадзіў з жалезным прутам ад катла да катла і даваў свае заключэнні аб гатоўнасці плаўкі. А ноччу ўжо з гатовай прадукцыяй падрыўнікі прабіраліся знаёмымі ляснымі сцежкамі да чыгуначнага палатна.

Калі фашысты наперадзе кожнага паравоза сталі пускаць платформы з пяском, пачаліся новыя пошукі. Трэба было сканструяваць такую міну, якая б прапускала засцерагальныя платформы, але ўзрывалася пад паравозам.

Партызаны ўзяліся за работу.

— Таварыш камандзір, прыдумаў,— таямніча паведаміў мне аднойчы Павел.

Аказваецца, ён знайшоў такую канструкцыю міны, якая прапускала вагоны і падрывала паравоз. Простае, але надзвычай добрае вынаходства давала нам магчымасць з ранейшым поспехам пускаць пад адхон варожыя эшалоны. Тыя ж цягнікі, што ішлі запаволеным ходам, Кажушка навучыўся «падганяць». Паставіўшы міну, ён ішоў насустрач варожаму эшалону ўздоўж палатна і падпільноўваў яго. Як толькі той паказваўся, Кажушка адкрываў агонь з кулямётаў па вокнах паравоза. Машыніст, імкнучыся як мага хутчэй выйсці з-пад абстрэлу, даваў гранічную скорасць і на поўным ходзе наязджаў на міну.

Пасля кожнай такой перамогі Кажушка ў сваёй зямлянцы даваў «канцэрты». Звычайна яшчэ пры падыходзе да лагера ён прыкоўваў да сябе агульную ўвагу. Хлопцы акружалі яго групу і засыпалі пытаннямі, жартавалі.

— Як жалезка, Павел?

— Ці вытрымлівае нагрузку? Колькі?

— Амаль тры,— называў Кажушка колькасць эшалонаў, якія пайшлі пад адхон.

Потым працэсія накіроўвалася да штаба, падрыўнікі падцягваліся і дакладвалі пра свае вынікі.

Праз гадзіну-другую ў лагеры раптам чуліся моцны стук, спеў, высвістванне — так звычайна пачынаўся чарговы «канцэрт» падрыўнікоў. Каля палаткі Паўла збіраўся амаль увесь атрад. Хлопцы на вёдрах, каструлях, шклянках выстуквалі такі дробат, што хоць вушы затыкай. А то іншы раз прыдумаюць і якую-небудзь імправізацыю на партызанскія тэмы.

«Канцэрт» у Кажушкі звычайна доўжыўся да таго часу, пакуль я ці камісар нарэшце не ішлі ў яго палатку.

— Палундра! Камандзір ідзе! — гучаў голас Паўла, і ўсе падрыўнікі, як дзеці, са смехам і жартамі разбягаліся па лагеры.

Друкуецца па кн.: Ливенцев В. И. Партизанский край. 4 изд. Мн., 1983. С. 227—228 (у перакладзе на беларускую мову).

Засады на шашы

З партызанскіх нататак І. П. Крыскаўца

18 мая мы перадыслацыраваліся ў Заполле з задачай ахоўваць пераправу цераз раку Ольсу з боку Бабруйска і весці нагляд на захад, на Свіслач, да Бярэзіны. Ваевічы і Перасопню, Бярозавае Балота і Усохі займалі Свірыд, Пярэсценка і Міхалап. Пярэсценка стаў камандзірам атрада імя Беразоўскага пасля смерці Колбнева. Макей Міхалап стаў камандзірам 620-га атрада пасля смерці Сырцова. Навакол было спакойна. Праціўнік не з'яўляўся, і мы вырашылі зрабіць невялікай групай вылазку на шашы Бабруйск — Магілёў.

На шляху ў Сяргеевічах узялі правадніком старасту сяла Сцяпана. Праўда, нам не вельмі патрэбен быў праваднік, дарогі знаёмыя. Важней было другое: пабываўшы з намі на баявой аперацыі, староста губляў давер'е сваіх гаспадароў-немцаў. Мала таго, цяпер і ён павінен быў уцякаць у лес пры паяўленні немцаў, як гэта рабілі ўсе жыхары сяла.

Ноччу прыйшлі ў Гуту. Тут, у сямі кіламетрах ад Бабруйска, суткі адпачывалі. У ноч з 25 на 26 мая выйшлі на шашу Бабруйск — Магілёў непадалёку ад горада і заляглі ў 10—15 метрах ад палатна дарогі. Хутка з боку Бабруйска загудзела аўтамашына. Ізох скамандаваў:

— Прыгатавацца!

Зашчоўкалі затворы. Рабяты прыхінуліся да ложа, ловячы мушкай сілуэт машыны. Засада размешчана ў трох месцах. Бакавыя заслоны высунуты ўправа і ўлева на 600—700 метраў па шашы. Іх задача — страляць толькі ў тым выпадку, калі машына прарвецца праз галоўную засаду. Мы яшчэ гадалі, ці варта страляць па адной машыне, калі з боку Кіраўска насустрач уляцела легкавая. Сустрэліся машыны ў цэнтры засады.

— Агонь!

Крытая грузавая машына крута звярнула ў кювет і абярнулася. Па ёй быў дадзены такі агонь, што немцы не паспелі зрабіць ніводнага выстралу. Затое легкавая ледзь не ўцякла. Яна ўварвалася нечакана, і на яе ніхто спачатку не перанёс агонь. Толькі потым апамяталіся і пачалі біць ёй у хвост, у лоб ужо біў правы фланг.

Бой працягваўся 2—3 мінуты. Падабраўшы трафеі, падпалілі машыны і хутка адышлі ў глыб лесу. Праз 8—10 мінут над месцам засады з'явіўся варожы самалёт. Як мы даведаліся, у легкавой машыне ехаў палявы камендант Бабруйска. Ён паспеў даць ракету, выклікаючы дапамогу.

Праз некалькі дзён на гэтую ж шашу выйшаў з ротай Аркадзь Анцюх. Яго ўлоў аказаўся больш багатым. З Магілёва ў Бабруйск на чатырох машынах ехалі маладыя фашысцкія лётчыкі, ехалі атрымаць самалёты. На гэтым шляху іх стукнуў бясстрашны Анцюх. Дзесяткі сцярвятнікаў не будуць кружыць над нашай зямлёй, палохаць нашых дзяцей. Рота падабрала 4 кулямёты, многа аўтаматаў і вінтовак.

Закончыўшы бой, Анцюх не пайшоў адразу дадому, а рашыў пакружыць паблізу, ведаючы, што гітлераўцы гэтую справу не даруюць, яны будуць помсціць насельніцтву. Усе навакольныя вёскі былі ўзяты пад агляд. Аднак карнікі напалі там, дзе ніхто не чакаў. У вёсцы Боркі не было ніводнага партызана. На гэтую вёску і наляцелі гітлераўцы і пачалі расстрэльваць усіх падрад. Звыш 600 чалавек расстралялі і спалілі фашысты ў Борках.

Прадухіліць гэтую дзікую расправу Анцюх не паспеў, але паспеў закрыць засадай шлях адыходу карнікаў. Закончыўшы сваю агідную справу, фашысты кранулісяў шлях. Свінцовым ліўнем сустрэў іх на ўзлессі Анцюх. Звыш паўсотні гітлераўцаў заплацілі сваімі галовамі за злачынства ў вёсцы Боркі.

З гэтай аперацыі другая рота прынесла каля сотні аўтаматаў і вінтовак, а сам Анцюх замацаваў за сабой славу бясстрашнага і таленавітага камандзіра. Аркадзь Анцюх і загінуў як герой пры ўзрыве чыгуначнага моста па магістралі Мінск — Масква. Жыхары вёскі Бацэвічы могуць па праву ганарыцца сваім славутым земляком...

Вось такія яны, Кукушкіны

У Клічаўскім раёне ёсць сяло Вялікая Старына. Я памятаю гэта сяло яшчэ з дарэвалюцыйных часоў. Што і казаць, гэта была сапраўдная дрымучая старына. Ва ўсім сяле не было ні аднаго пісьменнага. Староабрадная царква трымала сваіх падапечных у нянавісці да ўсіх, хто не падзяляў іх веры.

Усіх нестароабрадцаў вялікастарынцы чамусьці называлі хахламі або ерэтыкамі.

Калі стомлены падарожнік заходзіў у хату да староабрадца, то яму не давалі напіцца вады з агульнай сямейнай конаўкі. На такі выпадак у кожнай хаце быў асобны «паганы» посуд.

У Вялікай Старыне палавіна жыхароў мела прозвішча Кукушкіны. Розныя гэта былі людзі. Далёка разнеслася дурная слава пра Ярмілу Кукушкіна. У гады грамадзянскай вайны ён займаўся рабаўніцтвам і забойствамі. Шнырыў па лясах з абрэзам, страляў і белых і чырвоных, а потым раздзяваў забітых, усё забіраў, што пры іх было. А калі гітлераўцы акупіравалі Беларусь, ён стаў паліцэйскім.

Насупраць, цераз вуліцу ад Ярмілы, у крайняй ад лесу хаце жылі Арыфей Ананьевіч і яго жонка Кацярына Лазараўна Кукушкіны. Яны былі таксама непісьменныя і доўгі час верылі ў бога. Але іх дзеці нарадзіліся ў іншы час, яны цягнуліся да святла, да школы. Радаваліся, гледзячы на дзяцей, і бацькі.

Напярэдадні вайны 46-гадовая ўдава Кацярына Лазараўна — Арыфей памёр у 1936 г.— мела вялікую працалюбівую сям'ю з 15 чалавек: два сыны, пяць дачок, дзве нявесткі, пяцёра ўнукаў.

У Вялікай Старыне ўжо некалькі разоў з'яўляўся Ярміла з вінтоўкай і белай павязкай паліцыянта на рукаве. Ад імя бургамістра Бацэвіцкай воласці Нікана Касцяна ён патрабаваў, каб старэйшы сын Кацярыны Лазараўны Арцём таксама стаў паліцэйскім.

Арцём, ці, як яго звалі на сяле, Арцюха, узяў вінтоўку, але пайшоў не ў паліцыю, а ў Бярозавае Балота, да партызан. Але нядоўга давялося партызаніць Арцёму: ён загінуў у перастрэлцы з гітлераўцамі.

У красавіку 1942 г. ў Вялікай Старыне спыніўся на адпачынак толькі што створаны ў Кіраўскім раёне партызанскі атрад. Камандаваў атрадам лейтэнант Сцяпан Свірыд, камісарам быў стары камуніст Герасім Лявонавіч Комар. Разведчыкі даведаліся, што ў сяле многа бежанцаў з гарадоў. Сярод іх і замужняя дачка Кацярыны Лазараўны Каця Кукушкіна, па мужу Янчанка.

Пра ўсё гэта было даложана камандзіру і камісару атрада. Паведамленне аб бежанцах асабліва зацікавіла камісара Герасіма Лявонавіча Комара. Ён распытваў пра іх, удакладняў падрабязнасці, потым папрасіў разведчыкаў пазнаёміць яго з Кацяй.

Пасля гэтай сустрэчы назаўтра Каця пачала збірацца дадому, у Бабруйск. І вось Каця зноў у Бабруйску, у сваім доміку на Камбінацкай вуліцы. Муж уладкаваўся працаваць у нейкую майстэрню. Каця гаспадарыла дома. Мужу яна давярала, але і ён не ведаў, што яна вярнулася з Вялікай Старыны з даручэннем партызан. Прывабная і гасцінная Каця здолела завязаць «сяброўскія» сувязі са служачымі гарадской управы і нават з афіцэрамі.

У чэрвені 1942 г. дайшлі чуткі аб тым, што войскі бабруйскага гарнізона хутка выйдуць на карную экспедыцыю супраць партызан Клічаўскага і Кіраўскага раёнаў.

Удакладніўшы, што гэта сапраўды так, Каця з пятнаццацігадовай сястрой Ірынкай пайшлі з Бабруйска ў Вялікую Старыну. Усе пасты і заставы пры выхадзе з горада абышлі шчасліва. Да Гуты ішлі палеткамі. Па дарозе Каця ўспамінала пра сваю маці. Ёй было толькі шаснаццаць гадоў, як яе аддалі замуж. Гора, нястачу толькі і зведала яна ў жыцці. У пачатку вайны загінуў сын Арцюха, а ў маі 1942 г. фашысцкія каты арыштавалі за сувязь з партызанамі 19-гадовую дачку Ксенію, сястру Каці.

Гуту прайшлі без прыгод. Наперадзе Любонічы. У ляску каля любоніцкага лясніцтва фашысты ўчынілі сапраўдную бойню. Тут яны закатавалі і расстралялі тысячы людзей з Кіраўскага і Клічаўскага раёнаў. Гэта страшнае месца Каця і Ірынка ведалі, баяліся яго, але абысці не маглі. Калі з-за елак раздалося «стой», Ірына пабляднела. На дарогу выйшлі двое з белымі нарукаўнікамі.

— Куды спяшаецеся, ягадкі? Не на спатканне, часам, да таварышаў у Бярозавае Балота?

— А, кукушачкі,— загаварыў, падышоўшы бліжэй паліцай па мянушцы «Пленнік».— Знаёмыя, знаёмыя птушачкі заляцелі. Значыць, усё яшчэ лётаеце?..

Паліцэйскі Яўхім Казека быў родам з Кострыч. У гады першай сусветнай вайны ён быў у палоне ў Германіі, з-за чаго і мянушка «Пленнік» так і прыкіпела да яго. Кострычы зусім недалёка ад Вялікай Старыны, і гэты паліцай добра ведаў сям'ю Кукушкіных. Сустрэча з ім не абяцала нічога добрага.

Сяцёр адвялі ў памяшканне лясніцтва, у якім размясцілася паліцыя. З адкрытых вокнаў даносіўся п'яны вэрхал.

— Пан начальнік! Затрыманы сёстры Кукушкіны. Ідуць з Бабруйска ў партызанскую зону.

— Хто такія? Дзе аўсвайс?

Каця пачала нешта ўталкоўваць п'янаму начальніку, але ён зноў страціў здольнасць што-небудзь разумець.

Тады яна падышла да яго і шапнула нешта на вуха, а ў голас спытала:

— Цяпер ты зразумеў, хто мы такія і куды ідзём?

— А ну-ка, Казека! — запатрабаваў паліцэйскі,— налей ім па шклянцы! Піце, дзеўкі!

— Мы выконваем заданне — не можам піць,— катэгарычна адмовілася Каця.

— А ну, правальвай адсюль! — раптам закрычаў паліцай.

Сёстрам толькі гэта і трэба было.

— Што ты яму такое шапнула, што ён адразу перамяніўся? — спытала Ірынка заваколіцай.

— Сказала, што нас паслаў на заданне сам пан Кальтвасар.

— А хто такі Кальтвасар?

— Халера яго ведае. Па-нямецку гэта азначае «халодная вада».

На шляху — лясная вёска Кострычы. У гэты дзень сёстрам проста не шанцавала. Калі ўвайшлі ў вёску, зусім побач на агародзе раздалося некалькі выстралаў. Блытаючыся ў бульбоўніку, пяцёра паліцэйскіх ганяліся за курыцай. Аднаго з іх Ірынка пазнала — разам вучыліся. Гэта быў Раман Тарэлка з Бярозавага Балота. Па некалькі гадоў сядзеў ён у кожным класе, але так і не змог пераступіць цераз парог трэцяга класа.

— Куды ідзяце?

— Куды трэба — туды і ідзём. Многа будзеш ведаць — без пары састарэеш.

— Адкуль?

— А табе хіба павылазіла: не бачыш, што з Бабруйска? Ад самога Кальтвасара.

— Пакажы дакумент!

— А фігу не хочаш? — дражніла Ірынка.— Мы ў Любонічах не такіх, як ты, сустракалі, з самім панам начальнікам гарэлку пілі. А тваё дзела квактуху лавіць — ідзі даганяй. Ясна? Будзь здароў!

Сёстры шчасліва дабраліся ў атрад. А назаўтра яны пайшлі назад у Бабруйск.

Партызаны добра падрыхтаваліся да сустрэчы з карнікамі і разграмілі іх.

Ішлі дні. Каця працягвала прыёмы з п'янкамі, працягвала жартаваць з агнём. Усё гэта вельмі надакучыла, але Комар і прасіў і загадваў, як салдату, выконваць свой абавязак перад Радзімай.

Сяброўка Каці Аня Падручная жыла каля чыгункі. Яна сачыла за рухам варожых эшалонаў на захад і на ўсход. Калі цягнік з жывой сілай, то запамінала, які род войск, якое ўзбраенне.

Жонка камандзіра Чырвонай Арміі, Аня Падручная разбіралася ва ўсім гэтым дасканала. Памагала і тое, што яна размаўляла па-нямецку. У час прыпынку цягнікоў яна бойка гандлявала піражкамі: гарачанькімі з бульбачкай і з мясам, з яблыкамі і з капустай. Яна ўціралася ў самую гушчу салдат, настойліва зазывала, прапаноўвала, а сама слухала, запамінала.

Звесткі перадаваліся партызанам. Але Каця не магла часта хадзіць у Вялікую Старыну, гэта магло выклікаць падазронасць. Цяпер амаль кожную суботу з вёскі прыходзіла ў Бабруйск яе малодшая сястра Іра, часцяком з ёю была і стрыечная сястрычка Зіна.

Дзяўчынкі прывыклі ўжо да такіх паходаў. У хуткім часе пасля летняй блакады 1942 г. Ірынка і Зіна пабылі ў Бабруйску. Вярнуўшыся з дарогі, стомленая Ірынка прылягла адпачыць. Тады якраз і ўварваліся ў хату карнікі. Іх навёў мясцовы здраднік.

Дзяўчынак арыштавалі і павезлі ў Перасопню, дзе размяшчаўся штаб карнікаў. Сюды ў час допыту якраз зайшоў афіцэр, які часта бываў у Каці на папойках. Ён пазнаў Ірынку. Сказаў, што ведае гэту дзяўчынку і яе сястру — гэта бяскрыўдныя людзі.

Дзяўчынак хутка адпусцілі.

Малодшы сын Кацярыны Лазараўны Іван быў інвалідам. З дзяцінства ён хадзіў з мыліцай. Акупанты не звярталі ўвагі на інваліда, не чапалі яго. Ён завёў каня, драбіны і ездзіў з вёскі ў вёску: нешта купляў, нешта прадаваў або выменьваў. Часта ён наведваўся ў Бабруйск, бываў у Каці, перадаваў даручэнні партызан. Але за Іванам пачалі сачыць, насоўвалася пагроза арышту. На сямейным савеце рашылі, што Івану з сям'ёй трэба пераехаць у Кіраўскі раён, у родную вёску яго жонкі, Мазураўку. Партызаны далі на гэта згоду.

У верасні 1943 г. Іван з сям'ёй паехаў на новае месца. Недалёка ад Мазураўкі іх спынілі карнікі. Прозвішча Кукушкіных ім было вядома. Івана арыштавалі, а потым забілі. Жонку і дзяцей адвезлі ў Кіраўск, на суд ваеннага каменданта.

— Вы хутка пераканаецеся, што мы гуманныя,— сказаў камендант маладой удаве.— Ваш муж быў партызанам і за гэта мы яго пакаралі. А вас усіх я адпушчу пасля медыцынскага агляду дзяцей.

«Медыцынскі агляд» дзяцей зрабілі, пакуль камендант гутарыў з іх маці, якая нават не магла ўявіць сабе ўсёй жахлівасці такой працэдуры. Фашысцкія вурдалакі ўзялі ў дзяцей кроў для пералівання параненаму афіцэру. І не крыху ўзялі, а высмакталі ўсю. Праз некалькі гадзін маленькія пакутнікі — чатырохгадовы Міша і двухгадовы Федзя — памерлі.

Небяспека навісла і над Кацяй у Бабруйску. Гэта быў канец 1943 г. і пачатак

1944 г. Гітлераўцаў білі на ўсіх франтах, і яны сталі звярэць, вымяшчаць злосць на людзях.

У сакавіку ў Каці дзень нараджэння. Гэта быў выпадак сабраць гасцей. Разышліся позна. Прыбіраючы пакой, Каця знайшла на падаконніку запіску. Хтосьці з гасцей папярэджваў: «Уцякайце як мага хутчэй, праз суткі будзе позна — заўтра вечарам вас схопяць».

Калі Каця з мужам Янчанкам і дачкой былі ўжо ў Вялікай Старыне, з Бабруйска прыйшлі весткі, што арыштавана Аня Падручная і многія іншыя патрыёты-падпольшчыкі. Прыходзілі і па Кацю.

У вёсцы ёй таксама нельга было заставацца. Стала вядома, што яе шукаюць немцы і дапамагае ім мясцовы здраднік. Таму прыйшлося перабірацца ў лес. На гэты раз сабраліся ўсе: Каця з мужам Рыгорам Янчанкам, іх шасцігадовая дачушка Валя, сёстры Аня, Ірынка і Кіліна, удава Арцёма — Яфімія і яе малалетнія дзеці Анюта і Праскоўя. Тут была і сама маці вялікай сям'і, Кацярына Лазараўна.

У ноч на 1 красавіка іх знайшлі ў лесе разведчыкі атрада Свірыда. Яны прыйшлі параіцца з Кацяй, як зноў устанавіць сувязь з Бабруйскам. Якраз тады і з'явіліся карнікі, акружылі шалаш. Янчанка, Аня і Ірынка ўсё ж змаглі ўцячы. Цудам выратавалася і Валя. Каця з самай малодшай сястрычкай і сваёй маці трапілі ў лапы ворага.

У той трагічны дзень 1 красавіка 1944 г. загінулі ад рук гітлераўскіх катаў яшчэ пяцёра з сям'і Кукушкіных. Іх расстралялі на папялішчы роднай хаты. Падаючы, Кацярына Лазараўна прыкрыла сабой дачку Кіліну, а Яфімія — сваю Праскоўю. Калі каты зрабілі сваю чорную справу і пайшлі, Кіліна зразумела, што здарылася самае страшнае, яна ўскочыла і закрычала:

— Гады, забілі маму і сястрычку — забіце і мяне!

Адзін з гітлераўцаў вярнуўся і выстраліў ёй у галоўку. А шасцігадовая Праскоўя засталася жыць.

Так змагаліся і так паміралі патрыёты з вялікай сям'і Кукушкіных — простыя савецкія людзі. Дзесяць з пятнаццаці загінулі ў гэтай барацьбе за перамогу над фашызмам...

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: К р ы с к а в е ц І. П. Сустрэчы ў Цераболі. Мн., 1971. С. 40—59.

Браты-героі

З успамінаў А. Макіёнка

Родныя браты, 13-гадовы Лёня і 11-гадовы Вова Баранавы, вайну сустрэлі ў Барысаўскім дзіцячым доме. Да прыходу немцаў у Барысаў усіх дзетдомаўцаў нашы эвакуіраваць не паспелі. Каб не трапіць у кіпцюры да немцаў, браты Баранавы збеглі з Барысава.

Прачулі браты, што ў Клічаўскім раёне шырыцца партызанскі рух, і накіраваліся туды. Па дарозе дзесьці раздабылі ручны кулямёт і патроны да яго.

У лесе яны заўважылі групу людзей, якіх прынялі за паліцэйскіх, і адкрылі бязладны агонь, бо добра страляць не ўмелі. Калі абодва бакі «высветлілі адносіны», партызанам нічога не заставалася, як адвесці юных смельчакоў у 208-ы партызанскі полк.

Хлопчыкі былі залічаны ў гэты полк.

Праз некаторы час разведка 208-га партызанскага палка данесла, што ў Барысаве немцы аднавілі аўтарамонтны завод і рамантуюць свае танкі і аўтамашыны. Партызаны вырашылі знішчыць гэты завод. Камандзір разам з разведчыкамі ламаў галаву, як выканаць пастаўленую задачу.

Думкі камандзіра палка перапынілі браты Баранавы. «Дазвольце нам выканаць гэтае заданне, таварыш камандзір,— у адзін голас выпалілі хлапчукі.— Мы ж ведаем у Барысаве кожны дом, кожны кусцік знаёмы нам у гэтым горадзе». «Добра, хлопцы. Я згодзен. Вам, дзецям, будзе лягчэй прашмыгнуць паміж немцаў, чым нам, дарослым. Давайце абмяркуем дэталі даверанай вам аперацыі».

Праз некаторы час Лёня і Вова рушылі ў доўгі шлях. Да Барысава дабраліся паспяхова. Уважліва вывучылі, калі змяняюцца вартавыя, нагледзелі добры пралаз. Як толькі прадаставілася магчымасць, юныя партызаны праніклі на тэрыторыю аўтарамонтнага завода. У атрадзе хлапчукам далі тэрмітныя шарыкі, якія трэба было раскідаць па тэрыторыі завода. Лёня і Вова хуценька раскідалі шарыкі ў розных месцах. Пераканаўшыся, што агонь набірае сілу, юныя смельчакі гэтак жа непрыкметна, як і прабраліся, зніклі.

За самаадданую смеласць, адвагу і знаходлівасць, праяўленыя пры выкананні гэтай аперацыі, браты Леанід і Уладзімір Баранавы былі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга. Павысілі адважных партызан і ў званні — ім было прысвоена званне старшых сяржантаў...

Сцяг Савецкай. 1968. 25 студз.

Разграмілі акупантаў

З успамінаў былога начальніка штаба партызанскага атрада М. Абаротава

Сфарміраваны з абаронцаў Масквы і партызан Першага атрада Дзмітрыя Мікалаевіча Мядзведзева (Дз. М. Мядзведзеў — аўтар кніг «Гэта было пад Роўна» і «Моцныя духам») партызанскі атрад спецыяльнага назначэння пад камандаваннем маёра Анатоля Пятровіча Шастакова з лютага 1942 года рабіў рэйды па тылах ворага...

Пераправіліся мы ля вёскі Кісцяні цераз Дняпро і ў лясах пад Рагачовам у чэрвені 1943 года ўпершыню сустрэліся з брыгадай Ігната Ізоха, якая прарвалася сюды з блакады з Клічаўскай партызанскай зоны. Сумесна правялі некалькі баявых аперацый. Здружыліся камандзіры і байцы.

Калі разведчыкі паведамілі аб заканчэнні блакады, мы разам пайшлі ў Клічаўскія лясы.

Нашым вачам адкрылася абпаленая ворагам зямля Клічаўшчыны. Былі расстраляны многія мірныя жыхары. Спалены дзесяткі вёсак, асабліва прылесныя.

Ізохаўцы спыніліся ў сасонніку ля былога хімпалігона, ля вузенькай рэчкі Цераболь, прыкрываючы размешчаны непадалёку партызанскі шпіталь. Тут жа працаваў Магілёўскі падпольны абком партыі.

Наш атрад спыніўся на супрацьлеглым беразе ракі, крыху правей дарогі на Каўбчанскую Слабодку. Камандаванне атрада часта наведвалася да ізохаўцаў, у абком. Пазнаёміліся з сакратаром райкома тав. Маўчанскім, сакратаром Клічаўскага райкома партыі тав. Зайцам, высветлілі становішча, дамовіліся аб узаемадзеянні.

Некаторым партызанам з атрада Шастакова дапамогу аказвала зубны ўрач ізохаўцаў. Спачатку неяк нязвыкла было бачыць у лесе працуючую бормашыну, якую спрытна і неяк весела выкарыстоўвала маладая жанчына. Яна больш зручна ўсаджвала ў крэсла чарговага пацыента і, прыемна ўсміхаючыся, жартоўна пытала:

— Не боязна, што ў мае абдымкі трапілі?

А калі Павел Баранаў у тон ёй адказваў:

— Што вы, Вольга! Я згодзен нават здаровых зубоў пазбавіцца, каб усё жыццё быць у вашых цудоўных руках.— Яна, каб прыглушыць сорам, ужо афіцыйна, амаль скамандавала: — Таварыш, адкрыйце рот!

І зноў запрацавала бормашына...

Гэта на нейкі час напамінала даваеннае мірнае жыццё, стварала ўпэўненасць у хуткім яго набліжэнні.

Але за такое мірнае жыццё трэба было яшчэ ўпарта змагацца. Зверствы гітлераўцаў не давалі спакою партызанам, яшчэ больш настойліва імкнуліся яны на свяшчэнную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Налёты партызан ішлі адзін за адным. Усе хацелі ісці ў бой, ніхто не жадаў заставацца ў лагеры. Толькі сілай загаду даводзілася ўтрымліваць партызан на месцы аховы раненых, лагера, прыгатавання ежы.

Такім быў і дзень 15 жніўня 1943 года. Амаль усе ізохаўцы, шастакоўцы, байцы 208-га партызанскага палка і іншых атрадаў знаходзіліся на баявых заданнях.

Раптам з'явіўся разведчык Сяргей Дварэцкі, і амаль разам з ім прыбег сувязны з абкома з запіскай. Стала вядома, што батальён гітлераўцаў ужо заняў вёску Мацевічы, рухаецца на вёску Коўбча і Каўбчанскую Слабодку, з якой дарога прама вяла да нашага і іншых атрадаў. Усяго пяць кіламетраў. Адна гадзіна, і гітлераўцы могуць быць тут. У запісцы абкома партыі была просьба: затрымаць ворага, не прапусціць яго сюды.

Гэта добра зразумеў А. П. Шастакоў і таму, падняўшы па трывозе ездавых і повараў, санітараў і групу партызан, якая толькі што вярнулася з задання, павёў партызан да Каўбчанскай Слабодкі. Нас было ўсяго сорак чалавек, супраць некалькіх сотняў гітлераўцаў, але мы верылі, што не прапусцім ворага.

Ярка свяціла сонца. У сасновым лесе было душна. Маёр Шастакоў з некалькімі коннікамі і кулямётнай тачанкай панесліся наперад галопам. Астатнія партызаны з усіх сіл спяшаліся следам.

Калі мы выйшлі з лесу, густы ланцуг гітлераўцаў наступаў на Каўбчанскую Слабодку.

— Начштаба! Займай з кулямётамі вышыню ля могілак. Секані па ланцугу, а я павяду хлопцаў у атаку,— загадаў мне Шастакоў.

У гэты час з'явіўся ўзвод старшага лейтэнанта Івана Ягорычава, які быў на заданні, а з лесу рыссю імчаліся партызаны на запрэжаных конях з дзвюма гарматамі і батальённым мінамётам — усё, што засталося ў ізохаўцаў і 208-м палку маёра Бяспоясава. Амаль у фланг гітлераўцаў разанулі з трохсот метраў шэсць кулямётаў маёй групы. Грымнулі стрэлы гарматы, зачасціў мінамёт.

З групай партызан Шастакоў кінуўся насустрач гітлераўцам. Яны ад нечаканасці павярнулі і пабеглі за вёску Коўбча. Партызаны яшчэ больш узмацнілі націск. А. П. Шастакоў страляў з маўзера па гітлераўцах, якія дзе-нідзе спрабавалі агрызацца. Яго фігура ў папасе і трафейнай плашч-накідцы за плячыма на высокім і рэзвым кані паяўлялася там, дзе было больш небяспечна. Раптам злева, з нізіны па ім выстралілі. На шчасце, міма. Туды кінуўся юны партызан Юрык Нячаеў і гранатай знішчыў трох гітлераўцаў.

Вораг спрабаваў не пусціць партызан да Коўбчы. Але група кулямётчыкаў стала ахопліваць іх злева. Пушкары і мінамётчыкі далі некалькі залпаў. Шастакоў зноў павёў партызан у атаку. Адстрэльваючыся, гітлераўцы адыходзілі да Мацевіч.

У нас амаль кончыліся боепрыпасы. Вечарэла. Давялося спыніць пагоню.

Са сховішчаў выйшлі жыхары і сардэчна дзякавалі народным мсціўцам за выгнанне фашыстаў, якія рабавалі вёску. Яны разбіралі ўзятую гітлераўцамі ў іх і адбітую намі маёмасць, гасцінна запрашалі ў хаты.

Неўзабаве да нас прыехаў начальнік ваенна-аператыўнага аддзела цэнтра пры абкоме партыі Савелій Герасімавіч Сідарэнка-Салдаценка і перадаў падзяку абкома партыі і асабіста павіншаваў за адважны адпор акупантам.

Вораг мог пайсці ў новае наступленне. Параіўшыся, рашылі пакінуць у Коўбчы разведчыкаў у баявой ахове. Астатнім паступіла каманда заняць абарону ў Каўбчанскай Слабодцы, каб прыкрыць з гэтага боку шпіталь, падпольны абком партыі, партызанскія стаянкі.

С. Г. Сідарэнка-Салдаценка ведаў маршрут вяртання ноччу з задання ізохаўцаў і накіраваў да іх насустрач разведчыкаў паведаміць камандаванню становішча, каб яно пры магчымасці нанесла ўдар па ворагу ў Мацевічах.

Ноччу, здавалася, палымнела неба ад партызанскага агню. Ізохаўцы, скрытна акружыўшы гітлераўцаў, у кароткачасовым баі разграмілі іх, захапілі шмат зброі, боепрыпасаў і палонных. Многія патрыёты пазней былі прадстаўлены да ўрадавых узнагарод.

Гэта было яшчэ адной істотнай дапамогай партызан наступаючым часцям Чырвонай Арміі, укладам у агульнанародную перамогу над ворагам.

...Наш атрад неўзабаве перадыслацыраваўся ў Бялыніцкі раён, дзе разам з іншымі партызанскімі атрадамі працягваў наносіць удары па ворагу, а потым адправіўся ў рэйд на Гродзеншчыну і Брэстчыну.

Выбух на чыгунцы

З успамінаў былога падрыўніка 278-га партызанскага атрада П. Шамаля

...Ішоў трэці год вайны. Набліжалася 25-я гадавіна Чырвонай Арміі. Нам, партызанам Клічаўшчыны, трэба было дастойна адзначыць гэту знамянальную дату. Да свята заставалася некалькі дзён.

— Ёсць баявая задача, хлопцы! — акідваючы ўважлівым позіркам кожнага з нас, сказаў М. І. Кніга.— Неабходна выйсці на чыгунку ў раёне Рагачоў — Тошчыца і пусціць пад адхон варожы цягнік з жывой сілай і тэхнікай.

Размова ў зямлянцы была кароткай. Камандзір партызанскага атрада паведаміў, у які час звычайна праходзяць варожыя эшалоны, якая ахова палатна чыгункі і калі неабходна зручна правесці дыверсію. Узнікла пытанне: хто з камсамольцаў павінен пайсці на складанае і небяспечнае заданне?

Добраахвотнікаў знайшлося нямала. Але выбар выпаў на Васіля Фёдаравіча Зайца, Пятра Платонавіча Кудзіна, Васіля Іванавіча Зайца і мяне. Камандзірам групы падрыўнікоў прызначылі Нічыпара Фёдаравіча Шамаля — старшага лейтэнанта інжынерна-тэхнічных войск Чырвонай Арміі. У першыя дні вайны ён трапіў у акружэнне і адразу ж пайшоў у лес, да партызан. Гэта быў ініцыятыўны і смелы чалавек, любімец народных мсціўцаў. Ён ніколі не сумаваў, як кажуць, крочыў па жыцці з песняй.

Пяць чалавек выбралася ў дарогу. За плячыма ў іх — аўтаматы, тол і міны, у кішэнях па некалькі гранат ды сухары з чэрствага, але смачнага хлеба, выпечанага рукамі Івана Антонавіча Меляшкевіча і яго жонкі Надзі. Партызанскія пекары рабілі ўсё, каб мы, падрыўнікі, былі добра накормлены перад выкананнем баявой аперацыі.

Партызан праводзіў у нялёгкі шлях сакратар Клічаўскага райкома камсамола Аляксандр Сцяпанавіч Дайнека.

— Ну, таварышы, жадаю поспехаў. Майце на ўвазе, што чыгунка паўсюдна добра ахоўваецца фашыстамі, малейшая неасцярожнасць — і можа быць правал баявой задачы.

Аляксандр Сцяпанавіч даваў многія парады. На развітанне ён уручыў некалькі газет і лістовак, якія патрабавалася па дарозе на месца распаўсюдзіць сярод насельніцтва суседняга Кіраўскага і Рагачоўскага раёнаў.

Ноч была светлая. Высока ў небе зяў месяц, мільгацелі зоркі. Мароз, здаецца, мацнеў з мінуты на мінуту. Ён шчыпаў вушы, залазіў пад целагрэйкі. Магчыма, таму партызаны і прыбаўлялі крок, каб крыху сагрэцца. Яны ўважліва лавілі кожны лясны шорах, стараліся нячутна ісці па глыбокім снезе.

Мінаем адну вёску, заходзім у другую. Стукаемся ў акно хаты, што стаіць на водшыбе. Тут жыве партызанскі сувязны. Ад яго даведваемся, што фашысты ўжо даўно не з'яўляліся ў вёсцы. Па ўсім было бачна, што яны моцна баяцца лясных салдат, абыходзяць, нібы ваўкі, многія населеныя пункты Клічаўшчыны.

Нарэшце Усакінскі лес застаўся далёка ззаду.

Вось ужо і шаша Бабруйск — Магілёў. У напрамку Бабруйска рухаецца аўтамашына, за ёй другая, трэцяя. Непрыкметна перабягаем на другі бок дарогі. «Вось бы пальнуць па адной з машын»,— думаў кожны з нас. Аднак камандзір групы перасцярог ад гэтай спакусы, яшчэ раз напомніў, што нас чакае важнае баявое заданне.

Партызанская група падрыўнікоў праходзіла вёску за вёскай. На сваім шляху мы раздавалі насельніцтву газеты і лістоўкі са зводкамі Саюзінфармбюро.

Заходзім у вёску Блізняцы, што размешчана ў трох кіламетрах ад горада Рагачова. Тут мы даведаліся, у які час праходзяць цягнікі з жывой сілай і тэхнікай ворага, як ахоўваецца чыгунка. Адсюль узялі з сабой у якасці правадніка мясцовага жыхара (прозвішча яго не памятаю).

Вось рака Друць, а за ёй — чыгунка. Амаль цэлы дзень вялі назіранне. Устанавілі, што ахова чыгункі вельмі ўзмоцненая.

Пачалі абмяркоўваць планы далейшых дзеянняў. Усе, у тым ліку і наш праваднік, сышліся на адной думцы: трэба арганізаваць дыверсію непадалёку ад пераезду Блізняцы. Месца было падыходзячае — амаль да самага насыпу дарогі падступаў густы лес.

Адзін за адным падкрадаемся да чыгуначнага палатна. Спыняемся. Расстаўляем наглядальнікаў з левага і правага флангаў. Я і камандзір групы Нічыпар Шамаль паўзём па насыпе, абмацваем рэйкі. Халодная сталь апякае рукі. Праходзіць хвіліна-другая. Прыслухоўваемся. За 100—150 метраў, не далей, чуваць крокі вартавога. Немец, відаць, замёрз, стараецца хадзьбой сагрэцца.

Разграбаем нажом снег, падкладаем пад рэйкі міну, да яе прывязваем шнур, за які трэба будзе пацягнуць, калі наблізіцца цягнік.

Чуваць якісьці гул. Няўжо цягнік? Зноў прыслухоўваемся. Так і ёсць — прыбліжаецца паравоз. Уперадзе яго — платформа з пяском.

Ну што ж, будзем яшчэ чакаць. А мароз балюча шчыпле за вушы і ногі, але мы не звяртаем увагі. Чакаем.

На гэты раз паказаўся цягнік. Вагонаў — мноства, некалькі платформ з «тыграмі», цыстэрны з палівам. На сэрцы адлягло. Нарэшце, фашысты атрымаюць «падарунак».

Узрыў міны страсянуў паветра, з дрэў пасыпаўся снег. Вогненнае зарыва ахапіла ўвесь эшалон, з трэскам і грукатам, перакульваючыся, ляцелі пад адхон вагоны.

— Малайцы, хлопцы! — пахваліў усіх камандзір групы падрыўнікоў.— Спрытна кульнулі фашыстаў з іх танкамі. Адвяваліся, сабакі...

За выкананне важнага баявога задання камсамольцы-падрыўнікі былі прадстаўлены да высокіх урадавых узнагарод. Пасля таго мы яшчэ некалькі разоў хадзілі «на жалезку», пусцілі пад адхон не адзін варожы эшалон.

А вечарам, 23 лютага 1943 года, мы паспяхова дабраліся да Церабольскай дачы, у размяшчэнне атрада. Камандаванне партызанскага атрда сустрэла нас цёплым прыёмам.

У тую трывожную ноч

Калі ўжо добра сцямнела, раптам дзесьці побач пачуўся гул машыны.

— Нехта прыехаў,— сказаў Кузьма Рыгоравіч Клепча.

— Можа гітлераўцы,— занепакоіліся людзі, якія знаходзіліся тут.

— Трэба хутчэй даведацца, сынок,— сказаў свайму старэйшаму сыну Арсенію Кузьма Рыгоравіч. Нячутна адчыніліся дзверы зямлянкі. Вакол цемень. У некалькіх крокаў не распазнаць прадметаў. Ціха, толькі чуваць, як шуміць дождж...

— Свае, не бойцеся,— пачуўся ціхі голас.

Праз хвіліну вакол іх ужо стаялі незнаёмыя.

— Мы савецкія лётчыкі — паведамілі яны.— Непадалёку адсюль наш самалёт, яго трэба замаскіраваць. Мы выконваем баявое заданне, дапамажыце. Правядзіце да партызан.

Праз нейкі час яны ўжо грэліся ў зямлянцы. А Арсеній разам са сваім бацькам сабралі людзей, а затым з лётчыкамі адправіліся да самалёта. Яго закацілі ў лес, замаскіравалі галінкамі дрэў. І тады Арсеній сабраўся ў дарогу, да партызан, якія ў гэты час знаходзіліся ў вёсцы Загацце. Арсеній павёў лётчыкаў ляснымі сцяжынкамі.

Ноч. Дождж. Глуха шумяць сосны. Па лесе ідуць тры чалавекі — ўперадзе падлетак, у некалькіх крокаў ад яго з вінтоўкай напагатове — лётчыкі... Праваднік насцярожана прыслухоўваецца да кожнага шораху, рассоўваючы мокрыя галінкі дрэў, ідзе ўперад. Асцярожна вядзе ён лётчыкаў, мінаючы небяспечныя месцы. Ведае, што ад яго зараз залежыць жыццё гэтых вайскоўцаў і выкананне імі задання штаба партызанскага руху. Кашуля ўжо даўно прамокла, але хлопчык не звяртае на гэта ўвагі.

На дарозе пазнаёміліся. Высокага звалі Мікалаем, другога Барысам. Праз паўтары гадзіны былі каля вёскі Загацце. Нечакана пачулася:

— Стой! Хто ідзе?

— Свае,— адказаў Арсеній.

У гэту ноч у партызанскім дазоры знаходзіўся знаёмы партызан Васіль Шумякоў, які па голасе пазнаў падлетка. Неўзабаве ў суправаджэнні партызан лётчыкі былі ў штабе партызанскага атрада імя Марусава. Да самалёта была адпраўлена ахова. А раніцой лётчыкі горача, ад усяго сэрца дзякавалі Арсенію за дапамогу. Было гэта 16 чэрвеня 1943 г.

Тая трывожная ноч запомнілася не толькі Арсенію. Пасля вайны ў Кіраўскі райваенкамат прыйшло пісьмо. Прыслаў яго лётчык экіпажа самалёта «ПО-2» Мікалай Мікалаевіч Весялкоў. Ён прасіў, каб яго пісьмо перасланлі ў вёску Ялоўка Клічаўскага раёна Арсенію і Кузьму Клепчам. Так пачалася перапіска людзей, якіх параднілі суровыя выпрабаванні вайны.

М. Скамейка.

І словам гарачым, і справамі баявымі

Непадалёку ад вёскі Хрэлеў знаходзіцца партызанская магіла. Менавіта тут у сакавіку 1943 г. мы пахавалі свайго баявога камсорга 1-га батальёна 277-га партызанскага атрада Анатолія Гагарына. Вось і цяпер, праз дзесяткі гадоў, як жывы паўстае ён — плячысты, высокі юнак, сціплы і надзейны таварыш.

Вайну Анатоль сустрэў у рэгулярнай арміі. Падраздзяленне, у якім ён служыў, пасля цяжкіх баёў трапіла ў акружэнне і не здолела прабіцца на ўсход. Застаўшыся на акупіраванай тэрыторыі, воін марыў аб узброенай барацьбе з ворагам. І вось у 1941 г. разам са сваімі таварышамі Куцанавым, Гершовічам і іншымі ён стаў партызанам, узначаліў камсамольскую арганізацыю 1-га батальёна. Ён ніколі не стамляўся ў час паходаў, стойка пераносіў цяжкасці суровага партызанскага жыцця і быту. Калі дзе трэба было прагнаць сум, узняць настрой байцоў, камісар батальёна Якаў Счыслёнак накіроўваў туды Анатоля.

Гагарын быў душой моладзі, умеў гарачым праніклівым словам узняць настрой. А што тычыцца спраў, то вось прыклады. Анатоль быў удзельнікам многіх баёў. Так, пры яго ўдзеле дыверсійная група ўзарвала ў 1943 г. вайсковы эшалон ворага на ўчастку чыгункі Орша — Мінск. У сакавіку 1943 г. па рашэнні камандавання два батальёны зрабілі засаду ў вёсцы Сяргеевічы Кіраўскага раёна. 2-гі батальён размясціўся з боку Запольскага гарнізона, а наш батальён — з боку Любонічаў, дзе таксама быў буйны нямецкі гарнізон. Мы старанна рыхтаваліся да сустрэчы захопнікаў.

Адным з самых адказных участкаў засады была ўскраіна вёскі з боку Любонічаў, дзе замацаваўся 1-ы ўзвод 1-й роты. Тут чакаўся галоўны ўдар. У 5 гадзін раніцы сюды прыйшоў Анатоль. Пагутарыў з байцамі і застаўся ў 1-м узводзе. Да таго ж вырашыў быць побач з кулямётчыкамі, што выбралі пазіцыю ў хляве на ўскраіне вёскі. Гэтаму разліку ў складзе Высоцкага і Антонава даручалася першымі ўступіць у бой.

Фашысты паказаліся ў 7 гадзін раніцы. Ішлі яны з боку Любонічаў на Сяргеевічы. Дарэчы, выклікалі іх па тэлефоне на дапамогу бацэвіцкаму гарнізону самі ж партызаны. Як толькі фашысты наблізіліся на 150—200 метраў, кулямётчыкі адкрылі агонь. Немцы ў сваю чаргу ўвесь агонь абрушылі на хлеў. Яны стралялі з усіх

відаў стралковай зброі. А калі «загаварыў» яшчэ і станковы кулямёт, склалася напружаная абстаноўка. У гэты час змоўк і партызанскі кулямёт. Немцы рыхтаваліся да контратакі. Але зноў застракатаў наш кулямёт і партызаны з крыкам «Ура!» перайшлі ў атаку. Бой скончыўся. 50 фашысцкіх ваяк знайшлі тут сваю бясслаўную смерць. Партызаны святкавалі перамогу і адначасова смуткавалі. З хлява вынеслі мёртвага Анатоля Гагарына і параненага кулямётчыка Высоцкага. За імі з кулямётам ішоў Антонаў.

Калі немцы адкрылі агонь з станковага кулямёта, Анатоль быў скошаны свінцовай чаргой. Паранены быў і кулямётчык Высоцкі. Але камсамолец Антонаў не разгубіўся і адкрыў зніштчальны агонь па ворагу, помсцячы за сваіх таварышаў.

Яснай сакавіцкай раніцай 1-ы батальён быў пастроены ля магілы героя непадалёку ад вёскі Хрэлеў. Раздаліся развітальныя залпы салюта.

С. Пірожнік, былы палітрук 1-й роты 1-га батальёна 277-га партызанскага атрада.

«Лепш бы мяне...»

З успамінаў П. М. Вікторчыка

Пасля разгрому батальёна маёра Гофмана гітлераўскае камандаванне кінула на Клічаўшчыну буйныя сілы. Тры карныя атрады доўга раз'язджалі па раёне, імкнуліся напасці на наш след. Не знайшоўшы партызан, гітлераўцы вярнуліся ў Клічаў і ўчынілі там дзікую расправу над насельніцтвам. Людзей хапалі на вуліцах, у хатах, сцягвалі хворых з пасцеляў і загналі ў гараж райвыканкома. Фашысты трымалі жанчын, дзяцей, старых на марозе, не давалі ім ні піць, ні есці. Карнікі пыталіся ў кожнага, дзе партызаны, і, не дабіўшыся адказу, доўга катавалі, а потым расстрэльвалі. Ахвярамі сталі не толькі жыхары Клічава, але і навакольных вёсак — Канстантова, Нясяты, Гончы, Стаялава.

У адзін з тых дзён да мяне падышоў Якаў Іванавіч Заяц. Па яго вельмі засмучаным твары я зразумеў, што здарылася штосьці страшнае. Ён хацеў нешта сказаць, але не адважваўся. Мне стала не па сабе.

— Цяжкую вестку прынёс табе, Мацвеевіч,— нарэшце ціха вымавіў Заяц.— Будзь мужным, дружа. Сувязныя перадалі, што ад рук фашысцкіх забойцаў загінула ўся твая сям'я — жонка і дзеці.

Я не адразу зразумеў, аб чым гаварыў таварыш. Мне толькі здалося, што хтосьці паласнуў нажом па сэрцы, і я, адчуваючы боль, не ведаў, за што мяне ўдарылі. І толькі праз некалькі хвілін да мяне вярнулася ясная свядомасць. Перад вачыма як наяве стаялі жонка Праскоўя Нічыпараўна, мае мілыя дзеткі Вера, Пеця, Дзіна, Сеня, Вова, Рая, Валерка. Няўжо вас няма, дарагія мае?!

— Трымайся, сябра! — паўтарыў Якаў Іванавіч і моцна, па-мужчынску абняў мяне.

Да мяне падыходзілі партызаны. Яны ні на хвіліну не пакідалі мяне аднаго. Я чуў іх спачуванні, але не знаходзіў сілы сказаць ім хоць бы адно слова. Фашысты вырвалі ў мяне сэрца, адабралі асабістае шчасце, пазбавілі сям'і, любоўю да якой я жыў і мацаваў свае сілы ў барацьбе. Я адчуў сябе надломаным, няздольным штосьці рабіць. «Лепш бы мяне, а не іх, лепш бы мяне...»,— свідравала мозг неадчэпная думка.

І я не ведаю, што было б са мною, калі б не таварышы. Я бачыў іх, думаў пра кожнага і ўяўляў, што і яны носяць у сабе цяжкое гора, што многія з іх таксама страцілі або родных, або блізкіх сяброў. Аднак гора не пахіснула іх волю, яны больш рашуча і смела змагаюцца з ненавісным ворагам.

У нас заставалася Радзіма. Любоў да яе робіць чалавека моцным, дае яму тое вялікае шчасце, без якога жыцця ў нас няма.

З дапамогай таварышаў я знайшоў у сабе мужнасць пераадолець асабістае гора, заняў месца ў баявым страі. З таго часу я ўжо перастаў думаць пра тое, што мяне могуць забіць у баі. Думкі былі пра другое: біць бязлітасна ворага і гэтым ушаноўваць памяць пра сям'ю, пра загінуўшых.

Друкуецца па кн.: Викторчик П. М. Над Ольсой-рекой. Мн., 1966. С.33—34 (у перакладзе на беларускую мову).

Пабрацімы

Агонь вайны, апякаючы людскія сэрцы, ачышчаў іх, з'ядноўваў пачуццём вялікага чалавечага братэрства. Тут, у глыбокім тылу ворага, часам на мяжы жыцця і смерці, плячо ў плячо, як пабрацімы, змагаліся з ворагам прадстаўнікі розных нацыянальнасцей. Эпізоды гэтага братэрства ўзнаўляюцца ў надрукаваных ніжэй абразках.

1. На канверце ярка-сіні блакіт возера Рыца ў акаймаванні маляўнічых гор і лясоў вабіў і клікаў. Палюбаваўшыся імі і пакруціўшы пісьмо, сельскі паштальён задумаўся: каму ж яго ўручыць? На канверце напісана: «Могилевской обл. Кличевский р-н, Стар. Максимовичи. Николаю Ивановичу или любому гражданину».

Старыя Максімавічы — вёска вялікая. І Мікалай Іванавіч тут не адзін. Каторому ж адрасавана пісьмо? Але раз адпраўшчык давярае любому грамадзяніну, то можна распячатаць канверт і даведацца. Паштальён распячатаў канверт і пачаў чытаць:

«Привет из Грузии бывший ваш партизан Алазов Искандер Муса оглы (Саша). Привет всем население Ст. Максимовичи. Очень извиняйтесь меня. Письмо я должен был писат конце войны. Я служил спецотряде где был командир Николай Иванович. Я был его адютантом. Я жив здоров работаю на наш селение... Я хочу знат жив или нет мой уважаемый командир... Если жив пуст пишет меня письмо. Я в жизни не забуду его...

Ваш Саша

Алазов Искандер Муса оглы. Груз. ССР Болнисский район село Дарбази»

Ну вось, цяпер ясна. Гэта пісьмо для Мікалая Іванавіча Кнігі, адважнага камандзіра 278-га партызанскага атрада. І пісьмо было пераслана ў Бабруйск, дзе ў той час жыў і працаваў Мікалай Іванавіч.

Гэта вестка з далёкай Грузіі ўзрушыла былога камандзіра, вярнула яго памяць у трывожныя ваенныя гады. Больш як дваццаць гадоў прайшло з часу апошняга развітання, а Алазаў Іскандэр Муса аглы, ці проста Саша, як звалі яго клічаўскія лясныя салдаты, не забыў сваіх далёкіх сяброў, з якімі зрадніўся навекі. Яшчэ б! У цяжкія гады ваеннага ліхалецця разам з імі не раз давялося дзяліць апошні кавалак хлеба, глядзець смерці ў вочы, біць гітлераўскіх акупантаў. Да клічаўскіх партызан Алазаў далучыўся ў Асіповіцкім раёне, дзе сялянская сям'я хавала яго, акружэнца, ад немцаў. Хлопец адразу заслужыў павагу сярод партызан, пра яго смеласць хадзілі легенды. Адважны ад'ютант быў неразлучны са сваім камандзірам, а ў маі 1944 г. выратаваў яму жыццё. На шляху Свіслач — Віркаў партызаны наладзілі засаду. Калі падышлі карнікі, ударылі па іх з усіх відаў зброі. Разгараўся бой. І раптам па ланцугу пранеслася трывожная вестка: «Паранены камандзір». Доўга не раздумваючы, Саша-Іскандэр кінуўся ў самае пекла бою і вынес непрытомнага Мікалая Іванавіча.

Сустрэліся яны зноў на Клічаўшчыне больш чым праз два дзесяцігоддзі, пабрацімы — азербайджанец і беларус. І ўспамінам не было канца...

2. З Клічаўшчынай навек парадніўся ўкраінец Міхаіл Дзмітравіч Грыцан, камандзір 152-га партызанскага атрада.

...152-і артылерыйскі полк, дзе камандаваў узводам лейтэнант Міхаіл Грыцан, адступаў з цяжкімі баямі. Гэтыя чэрвеньскія дні 1941 г., дні адступлення — самыя цяжкія з франтавой біяграфіі. Міхаіл асцерагаўся варожай кулі. І не таму, што баяўся смерці: пад палінялай гімнасцёркай схаваны сцяг палка. Грыцан адчуваў яго цяпло кожную хвіліну, быццам чырвонае палотнішча пякло за кожны крок адступлення з роднай зямлі. Але дапамагала выжыць і выстаяць вера ў тое, што яны вызваляць радзіму ад чужынцаў. На клічаўскай зямлі, куды выйшаў Грыцан з рэшткамі палка, ішлі баі. Затым былі баявыя дзеянні ў Быхаўскім, Кіраўскім, Бярэзінскім раёнах. 152-і партызанскі атрад вырас у брыгаду, і ёю нязменна камандаваў Міхаіл Грыцан. А камандзіру ішоў усяго дваццаць трэці год...

3. Адным з першых вёў сваю роту ў бой за Клічаў 20 сакавіка 1942 г. латыш Ян Карлавіч Вітоль. Гэты бой стаў апошнім у яго жыцці. Смяротна паранены, ён ужо не бачыў, як над вызваленым Клічавым узняўся сцяг перамогі. Лёс прывёў Яна на беларускую зямлю. На Клічаўшчыне ён працаваў перад вайной, тут завёў сям'ю, марыў пабываць яшчэ не раз у роднай Латвіі. Але навечна застаўся ў зямлі Беларусі.

Шумяць беларускія беластвольія бярозы ў маленькім скверыку ў цэнтры Клічава над магілай адважнага партызана. Адна з вуліц райцэнтра носіць яго імя.

4. Група партызан 61-га партызанскага атрада пад кіраўніцтвам Якава Каўшыркі атрымала важнае заданне: сабраць звесткі пра размяшчэнне ворага і даставіць прадукты харчавання для партызанскага атрада, які быў у акружэнні. Адпраўляючыся ў дарогу, лясныя салдаты ведалі: трэба вярнуцца. Любой цаной! Чаго б гэта ні каштавала! Але яны не вярнуліся. Выканаўшы заданне, група была вымушана прыняць бой з намнога большымі сіламі праціўніка. Акружаныя ворагам, партызаны адстрэльваліся да апошняга патрона. Прыкрываючы адзін аднаго, трымаліся разам неразлучныя сябры — беларус Валодзя Валенда і башкір Хамат Саітаў. Яны пасябравалі з першых дзён свайго партызанскага жыцця. Валодзя вельмі

М. В. Ханінаў.

любіў слухаць бясконцыя распавяданні Хамата пра яго родную Башкірыю, пра тое, як неадольнае жаданне зноў убачыць яе горы і стэпы дапамагло Хамату ўцячы з варожага палону, перамагчы ўсе нягоды і зноў узяцца за зброю ў партызанскім атрадзе. Вось і цяпер яны як маглі дапамагалі адзін аднаму. Калі страляць не было чым, партызаны кінуліся на фашыстаў урукапашную: калолі іх штыкамі, білі прыкладамі. Хамат як мог абараняў Валодзю крывым башкірскім нажом. Ім так не хацелася паміраць у гэты цёплы жніўеньскі дзень... Але на кучынскім полі, усеяным трупамі фашыстаў, навечна засталіся 13 байцоў 61-га партызанскага атрада. Сярод іх беларус Уладзімір Валенда і башкір Хамат Саітаў.

5. Зноў і зноў памяць звала на Клічаўшчыну калмыка Міхаіла Ванькаевіча Ханінава. Беларуская жанчына, якая выратавала яго, параненага, ад смерці, стала яго другой маці на ўсё астатняе жыццё. Пасля вайны Ханінаў прыязджаў на Клічаўшчыну, каб прайсці былымі партызанскімі сцежкамі, сустрэцца са сваім юнацтвам, сябрамі партызанамі 15-га партызанскага атрада. А яны добра помнілі «Мішу Чорнага», як называлі Ханінава ў гады вайны. Заўсёды, калі патрабавалася выканаць асабліва важнае заданне, яго даручалі роце Мішы Чорнага, за галаву якога фашысты абяцалі 10 тысяч марак. Але Ханінаў быў няўлоўны. За баявыя заслугі ён узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.

Памяць аб вайне, боль за спаленыя беларускія вёскі, трывога за будучыню чалавецтва, удзячнасць брацкаму беларускаму народу, які мужна перанёс усе жахі вайны,— галоўныя тэмы вершаваных твораў калмыцкага паэта, сэрца якога, як ён прызнаецца, назаўсёды засталося «на ўліку над Вольсай-ракой». Вершы Міхаіла Ханінава — гэта заклік да людзей усёй планеты: «Свет наш прыгожы, свет наш без войнаў дзецям і ўнукам пакінуць».

Адзін з яго вершаў пра Клічаў, напісаны М. Ханінавым у пасляваенны час, друкуецца ніжэй.

КЛІЧАЎ

Да Ольсы ціхіх берагоў
Лячу, спяшаюся здалёку.
Сустрэну Беларусь я зноў
У пошумным зялёным змроку.
І зноў у памяці — вайна:
З агню і полымя да хвалі
Тут беглі за сасной сасна
І не дабегшы, паміралі...
Пасёлак жыў між дрэў і траў
І шэры птах гады адлічваў,
Тады, у сорак першым, стаў
Сталіцай партызанскай Клічаў.
Грымотна выбух абпаліў
Бярозку пад акном роддома.
У рукі зброю ўзяў актыў —
І прама ў бой з бюро райкома.
Граната і гранёны штык
Далей працягвалі размову,
На рубяжах смяротных тых
Крывёй пісалі пастанову...
Нам Сталінградскі чуўся гром,
Нам чуўся гул «Кацюш» натхнёны,
Над Ольсай, Сожам і Дняпром
Ляцелі ў прорву эшалоны.
Не раз ішлі праз посвіст куль
І праз варожую блакаду.
Шмат заваёўнікаў адсюль
Мы не пусцілі к Сталінграду.
Нам Клічаў, быццам Сталінград,
У Ольсе бачылі мы Волгу.
І арміяй стаў наш атрад,
І верым мы ў перамогу.
Прабіты кулямі ў баях,
Абпалены ўжо не аднойчы,
Над Клічавам трапеча сцяг
І свеціць людзям днём і ноччу.
Святло высокае плыве
На далячыні гарызонту,
Радзіма нас цяпер заве
Героямі ляснога фронту...

6. Асноўная маса гітлераўцаў, успамінае ў сваіх партызанскіх нататках І. П. Крыскавец, старанна выконвала ўстаноўку «фюрэра і рэйхсмаршала»: рабавалі, забівалі, гвалтавалі, палілі. «Немцы — звяры» — так пісалі мы ў гэтыя дні ў сваіх лістоўках. І гэта было правільна, бо гітлераўская армія дзейнічала па-звярынаму.

Узнікае, аднак, пытанне: ці ўсе немцы былі гітлераўцамі?

У ходзе вайны мы пераканаліся, што далёка не ўсе. У гітлераўскай арміі былі людзі, якія спачувалі нашаму народу, а некаторыя з іх знайшлі ў сабе сілы для таго, каб уступіць у актыўную барацьбу супраць гітлерызму.

У час аднаго з баёў у пачатку 1943 г. да нас перайшлі лейтэнант і сяржант нямецкай арміі Фрыдрых і Отта. Фрыдрых — член Камуністычнай партыі Аўстрыі, адзін з кіраўнікоў аўстрыйскага камсамола. Отта да пачатку вайны быў членам гітлераўскага саюза моладзі. Захопніцкая вайна, якую вёў фашызм, раскрыла яму вочы на праўду. Прыйшлося перагледзець свае погляды на падзеі. У гэтым яму памог Фрыдрых, з якім яны пасябравалі на фронце.

Фрыдрых прапанаваў нам стварыць партызанскі атрад з немцаў. Яго падтрымалі і назначылі камандзірам. Хутка за Друццю ў раёне вёсак Вялікія Бялевічы, Вендараж, Хрыпялёва паявілася група чалавек сорак немцаў з чырвонымі бантамі на пілотках. Яны насілі форму нямецкай арміі, узброены былі нямецкімі вінтоўкамі і аўтаматамі, а ў баях храбра білі гітлераўцаў.

Папаўняў свой атрад Фрыдрых з ліку палонных. Калі раней мы ўсіх палонных вымушаны былі транспартаваць за фронт, дык зараз іх перадавалі Фрыдрыху. Отта гутарыў з палоннымі на сваёй салдацкай мове, а потым разам з камандзірам рашалі, каму можна і каму нельга давяраць.

— Отта — мой асобы аддзел,— жартуючы, гаварыў Фрыдрых.

І ўсе, каго прымалі ў атрад, ваявалі сумленна.

У камандзіра 537-га атрада Свірыда быў ездавым стары нямецкі салдат. Ён удзельнічаў у баявых аперацыях, смела хадзіў у атаку на гітлераўцаў, а ў цяжкай абстаноўцы рэзва драпаў ад учарашніх сваіх. Вельмі злосны быў стары на фашыстаў, ды і баяўся жывым трапіць у іх лапы.

У нас у атрадах былі французы, чэхі, палякі, венгры. Узаемаадносіны з венгерскімі салдатамі ў партызан наогул былі дружалюбныя.

Неяк на станцыі Нясята быў невялікі гарнізон з венгерскіх салдат. Непадалёку ад станцыі вёска Турэц. І вось у гэту вёску адначасова хадзілі на танцы і партызаны, і венгры. І ніякіх эксцэсаў паміж імі не было. Сустракаліся як бы хлопцы з дзвюх суседніх вёсак.

Або яшчэ прыклад. Разведка Свірыда затрымала пад Бабруйскам чатырох венгерскіх салдат. Прывялі іх у лагер каля Перунова, а там прынялі як гасцей. Адпачывалі і частаваліся яны тыдзень, а потым іх адпусцілі ў часць. Каб іх адсутнасць не лічылі ўцёкам, Свірыд па іх просьбе напісаў пісьмо на імя іх камандзіра часці аб тым, што салдаты затрымаліся не па сваёй віне. У постскрыптуме гэтага пісьма Свірыд папракнуў венгерскага палкоўніка за тое, што яго салдаты забралі ў вёсцы Гута ў сем'яў партызан карову, швейную машыну і самавар.

Венграм на дарогу далі хлеба і сала, паўлітра гарэлкі і па 100 рублёў грашыма, вывелі за межы дыслакацыі партызан і адпусцілі.

Праз чатыры дні двое з іх зноў прыйшлі ў Перуноўскія лясы.

Палкоўнік прыслаў пісьмо партызанам. Ён дзякаваў за рыцарскія адносіны да яго салдат і за пісьмо.

— Я не гітлеравец і не хартыст,— пісаў палкоўнік.— Маю радзіму, таксама як і вашу, катуюць фашысты. Абяцаю, што салдаты маёй часці не будуць ваяваць супраць партызан. Грошы (400 рублёў) вяртаю назад, бо мае салдаты ў шляху выдаткаў не мелі.

У заключэнне венгерскі палкоўнік яшчэ раз дзякаваў за пісьмо і паведаміў аб тым, што ўсё ўзятае ў вёсцы Гута ўжо вернута, а вінаватыя пакараны.

Мы праверылі і пераканаліся, што карова, швейная машына і самавар з прабачэннем вернуты.

Партызаны-немцы і венгры выпускалі антыфашысцкія лістоўкі і засылалі іх у гарнізоны ворага.

Клятве Гіпакрата не здрадзілі

Вайна была найвялікшым выпрабаваннем і для медыцынскіх работнікаў. У самым яе пачатку ў Бацэвіцкую бальніцу паступала многа параненых, абгарэлых і знявечаных чырвонаармейцаў, якім патрэбны былі дапамога, ратунак. Але не хапала ложкаў, медыкаментаў, харчавання. Да таго ж была і вялікая рызыка: маглі наляцець акупанты і расправіцца і з лекарамі, і з іх пацыентамі. Дарэчы, так яны і зрабілі ў Клічаве — расстралялі групу медыцынскіх работнікаў.

Толькі людзі ў белых халатах не здрадзілі свайму абавязку і рабілі ўсё, што маглі, каб выратаваць нашых байцоў. Гэтак жа мужна і самаахвярна дзейнічалі медыкі і ў партызанскіх атрадах.

З успамінаў У. А. Ціхамірава, Героя Савецкага Саюза, былога камандзіра 12-й партызанскай кавалерыйскай дывізіі імя Сталіна

...Калі я знаходзіўся на аперацыйным стале, то ўбачыў маладую жанчыну, якая, як я потым даведаўся, была фельчарам

Бацэвіцкай бальніцы — Ася Саламонаўна Ноткіна (Гурэвіч), жонка хірурга гэтай жа бальніцы Майсея Львовіча Гурэвіча. Перавязка ран прайшла цярпіма, але прысохлыя стужкі прасціны цяжка адрываліся ад апёкаў і выклікалі востры боль. Потым стала лягчэй...

Пазней, калі пачалі зажываць раны, мы ўбачылі, што людзі, якія нас акружаюць, не проста выконваюць свае абавязкі, а сапраўды змагаюцца з ворагам. Назаву некаторых з іх: медсёстры Алена Васілеўна Жукава, Яўгенія Іосіфаўна Малашэвіч, Ніна Андрэеўна Цярэшка (Заблоцкая), Марыя Георгіеўна Ляйкова, Вікторыя Тарасаўна Шумская, Соф'я Цярэнцьеўна Яскевіч, Ася Саламонаўна Гурэвіч і галоўны ўрач — хірург Майсей Львовіч Гурэвіч; слаўныя нашы нянечкі, як ласкава называлі іх параненыя,— Домна Кандратаўна Белакурская, Марыя Фёдараўна Яскевіч, Усціння Яскевіч, Вольга Ціханаўна Яскевіч, Нявіцкая і Ганна Оадава. У палаце разам са мною знаходзіўся лётчык Мікалай (Красоўскі?), у якога былі моцныя апёкі твару і рук. Яго самалёт-бамбардзіроўшчык быў збіты ў першыя дні вайны пры бамбёжцы варожай калоны ўздоўж ракі Бярэзіны.

А параненыя ўсё паступалі і паступалі... Медыцынскі персанал бальніцы працаваў днём і ноччу. Прасілі піць, стагналі цяжкапараненыя, часта чулі слова «сястрычка».

Помнік медыцынскім сёстрам на могілках у Клічаве.

Акрамя дапамогі параненым супрацоўнікі бальніцы займаліся дастаўкай харчавання. Так, медсястра Марыя Ляйкова, нянечка Домна Белакурская, кухарка Клаўдзія Яскевіч ездзілі ў краму ў Бацэвічы.

Марыя Ляйкова разам з сяброўкамі хадзілі па калгасных палях, збіралі лісты тытуню, якія высушвалі і раздавалі параненым байцам і камандзірам.

У глухіх вёсках яшчэ існавалі калгасы, і нашы нянечкі і медсёстры прывозілі адтуль мяса і малако. Насельніцтва актыўна ўключалася ў збор харчоў і адзення для параненых. Сярод жанчын — хатніх гаспадынь, якія ўзначалілі збор прадуктаў, былі Алена Адамаўна Бурэйка, яе сястра Ганна Адамаўна, Марыя Ільінічна Церашонак і іншыя. Калі з прадуктамі стала асабліва цяжка, некалькі хатніх гаспадынь і калгасніц узялі шэфства над параненымі. Адмаўляючы сабе, сваім дзецям, яны дзяліліся харчамі з параненымі байцамі. Так рабілі Пугачова, Маслоўская, Ганна Ганчарык, Максімовіч і іншыя.

Хутка скончыліся і бінты, нянечкі і медсёстры арганізавалі мыццё неравязачнага матэрыялу, пачалі выкарыстоўваць белае палатно.

Немцы стварылі камендатуру ў вёсцы Бацэвічы. Пачалася зверская расправа над насельніцтвам і актывістамі. За самую нязначную дапамогу воінам і партызанам расстрэльвалі.

Урач-хірург М. Л. Гурэвіч, яўрэй па нацыянальнасці, употайкі прыходзіў у бальніцу і рабіў аперацыі...

Калі праз Бацэвічы праходзіла нямецкая вайсковая часць, нехта сказаў немцам аб знаходжанні параненых у бальніцы. Нечакана ў нас з'явіліся фашысты: палкоўнік, урач і некалькі аўтаматчыкаў. Бальніца была акружана...

Наша становішча было сур'ёзным. Трэба было неадкладна нешта рабіць: падавацца ў лес або ў бліжэйшую глухую вёску. За гэтую небяспечную справу зноў узяліся нашы медсёстры і нянечкі. Знайшлі каня з павозкай і адвезлі нас у Кострычы. Калі ўсё супакоілася, я вымушаны быў вярнуцца ў бальніцу, бо адкрылася рана на назе...

Ужо ішоў другі месяц нашага знаходжання ў бальніцы. З кожным днём мы ўсё больш адчувалі недахоп прадуктаў, медыкаментаў, неравязачнага матэрыялу. Немцы пачалі запалохваць супрацоўнікаў бальніцы тым, што іх пакараюць за дапамогу параненым, адправяць ў лагеры

для ваеннапалонных разам з параненымі, але нашы слаўныя дзяўчаты і жанчыны не звярталі на гэта ўвагі. Многія параненыя недалечанымі ўцякалі ў лес, але іх таксама трэба было апрануць, абуць і даць на дарогу харчоў хаця б на 2—3 дні. Усё гэта зноў узялі на свае кволыя на выгляд, але моцныя плечы нянечкі і медсёстры. Ужо каторы раз яны ўпотайку звярталіся за дапамогай да насельніцтва. І людзі дапамагалі чым маглі.

Нас засталося ўжо каля 20 чалавек, калі зноў з'явіліся фашысты. Яны пачалі грубa зрываць павязкі з ран, правярацъ, ці не хаваюцца тут здаровыя вайскоўцы нашай арміі або партызаны. Медперсанал стараўся абараніць параненых, але яго адганялі прыкладамі.

Марыя Ляйкова, Ніна Цярэшка, Вікторыя Шумская і Яўгенія Малашэвіч спрабавалі вывесці нас па аднаму праз кухню чорным ходам у бальнічны двор, а потым у лес. Але гэта ім не ўдалося. Пачалося варварскае збіванне параненых. Нас вывелі на вуліцу і пасадзілі ў павозкі.

На душы было цяжка. Столькі турбот, рызыкі, бяссонных начэй, а ў выніку — палон. Але мы былі нязломныя духам. Не! Мы яшчэ пазмагаемся. І мы, былыя параненыя, выканалі прысягу. Амаль усе вярнуліся і ў партызанах працягвалі барацьбу з ворагам.

Здравоохранение Белоруссии. 1970. № 5. С. 8—12 (у перакладзе на беларускую мову).

Першае выпрабаванне

З успамінаў былога партызана П. Шамаля

Ужо які час пад Бабруйскам часці Чырвонай Арміі вялі цяжкія баі з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Шырокая рака Бярэзіна служыла сур'ёзнай перашкодай на шляху ворага. Але сілы былі няроўныя. Фашысты азвярэла лезлі наперад, кідаючы на галоўныя напрамкі свайго ўдару танкавыя і мотапяхотныя дывізіі.

Да гэтага часу з-пад Ворлінскіх лясоў, дзе кіпеў гарачы бой, у Бацэвіцкую сельскую бальніцу паступіла больш за 40 цяжка параненых чырвонаармейцаў. Сярод іх было некалькі камандзіраў.

Хутка нямецка-фашысцкія захопнікі, нібы вараннё, накінуліся на зямлю Кліччаўшчыны. Прыйшлі яны і ў Бацэвічы — мірны населены пункт, пачалі наводзіць свой «новы парадак».

Тым часам прадукты харчавання ў бальніцы канчаліся. Прыйшлося звярнуцца за дапамогай да Паўла Іванавіча Харлапа і Івана Антонавіча Меляшкевіча, сваіх надзейных людзей.

Першы з іх да вайны працаваў у вёсцы Бярозаўка, што непадалёку ад Бацэвіч, старшынёй калгаса імя Дзяржынскага, другі — бухгалтарам. Кароткімі ліпеньскімі начамі яны пачалі прыносіць з калгаснай фермы бітоны з малаком. Для раненых зарэзалі некалькі авечак. Прадукты паступалі да загадчыка гаспадаркі бальніцы Міхаіла Ждановіча. Жонка яго (яна працавала ў бальніцы прачкай) разам з поварам Усцінняй Ануфрыеўнай Яскевіч гатавала страву, па-мацярынску карміла раненых воінаў.

Зубному ўрачу Яўгенні Іосіфаўне Малашэвіч тады давялося працаваць у Бацэвіцкай бальніцы неравязачнай сястрой. Яна таксама рабіла ўсё, каб раненыя хутчэй паправіліся.

П. І. Харлап і бухгалтар Меляшкевіч разам з іншымі членамі праўлення калгаса раздавалі аднавяскоўцам, усім сем'ям чырвонаармейцаў хлеб і жывёлу. З пачатка месяца вайны Іван Антонавіч збіраў зброю і боепрыпасы і перадаваў тым, хто ішоў у лес, хто рыхтаваўся да актыўнай і бязлітаснай барацьбы з чужынцамі. Ён трымаў сувязь з партызанамі. А праз некаторы час і сам стаў народным мсціўцам. Ляснымі салдатамі былі яго жонка, дачка Марыя і сын Мікалай.

Фашысты рабавалі насельніцтва. Забіралі кароў і свіней, хатнюю птушку, збожжа і бульбу. Толькі некалькі галоў маладняку буйной рагатай жывёлы заставалася ў Бацэвічах.

Неяк да Ждановіча дайшла чутка, што вось-вось з бацэвіцкай фермы забяруць апошніх цялят. «А чым жа карміць раненых?» — думаў ён. Вырашыў схадзіць на калгасны двор. Рызыкуючы жыццём, пад носам у фашысцкай варты Міхаіл Еўдакімавіч прыгнаў на бальнічны двор 15 цялят. Яму дапамагла жонка Ганна Раманаўна. Цялят рэзалі па патрэбнасці і кармілі чырвонаармейцаў.

Наступіла восень 1941 г. Многія з раненых паправіліся. Яны шукалі сувязі з партызанамі, каб зноў змагацца з ворагам. Ждановіч дапамагаў ім. Ён перапраўляў іх у лес, многіх забяспечыў зброяй. Народнымі мсціўцамі сталі Сяргей Васілевіч Бялікнікаў з Віцебска (ён загінуў у адным з баёў на Кліччаўшчыне), лётчык У. К. Якавенка (цяпер жыве ў

Мінску), танкіст лейтэнант У. А. Ціхаміраў. Апошні з часам арганізаваў на Случчыне партызанскі атрад і за актыўныя баявыя дзеянні быў удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза. Зараз ён пенсіянер, жыве ў Мінску. Успамінаючы тыя далёкія ваенныя гады, у пісьме да свайго баявога таварыша, з якім лячыўся ў Бацэвіцкай бальніцы, ён пісаў:

«Таварыш мой, сябра мой па зброі, пабрацім па пакутах! Успомні імёны медыкаў, якія выратоўвалі нашы жыцці. Раскажы сваім дзецям і ўнукам аб іх мужнасці, адданасці і любві да сваіх воінаў. Пакланіся ім да зямлі, пацалуй іх рукі, якія мылі твае і мае акрываўленыя бінты. Паглядзі на іх галовы — гэта з-за цябе і мяне яны пасівелі...»

Неўзабаве немцы даведаліся, што былыя раненыя ідуць да партызан і вырашылі знішчыць параненых байцоў.

...Да бальніцы пад'ехала грузавая аўтамашына, кузаў якой быў накрыты брызентам. З яе выскачылі эсэсаўцы і камендант Бацэвіч з аўчаркай. Загадалі: «Усім у машыну!» Ждановіч аслупянеў. Але не разгубіўся. Ён пачаў прасіць каменданта пакарміць раненых чырвонаармейцаў. Фашысты згадзіліся. А Міхаіл Еўдакімавіч тым часам непрыкметна зайшоў у памяшканне бальніцы і папярэдзіў параненых аб небяспецы:

— Ратуйцеся, як хто можа! Тут — эсэсаўцы.

І ён адчыніў вокны бальніцы.

Побач рос хмызняк, а крыху далей цямнеў лес. Многім чырвонаармейцам удалося ўратавацца. А васьмёра чалавек, цяжка параненых, у тым ліку бязногага, фашысты вынеслі на насілках, кінулі ў аўтамашыну і павезлі. Як потым стала вядома, усіх іх расстралялі...

Так ваявалі медыкі

Лёгка ўявіць, як многа значылі медыцынская дапамога, майстэрства ўрачоў і медсясцёр у тых выключна складаных і цяжкіх умовах, у якіх давялося жыць і змагацца партызанам. Медыцынскую дапамогу спачатку аказвалі тыя, хто меў хоць якія-небудзь адносіны да лячэння. Напрыклад, у 277-м атрадзе, а потым і ў 2-й Клічаўскай партызанскай брыгадзе, быў санінструктарам Ілья Яфімавіч Жыцелеў, дэзінфектар па адукацыі. У далейшым у 277-ы атрад уступілі былы галоўны ўрач Бацэвіцкай раённай бальніцы Гурэвіч, яго жонка фельчар Ася Саламонаўна Ноткіна (потым начальнік медслужбы атрада «Чэкіст»), фельчар Мікалай Сілавіч Харлап, медсястра Ніна Якаўлеўна Сямак з в. Бацэвічы, Антаніна Іванаўна Ламакіна з в. Бярозавае Балота, зубны ўрач Вольга Слука з Слуцкага раёна, урач Марыя Іванаўна Плотніцкая з Масквы, урач з г. Пензы Дзмітрый Аляксандравіч Дзяржавін, фельчары Фёдар Максімавіч Ананіч, Фёдар Елісееў з в. Чырвоны Лес, Міхаіл Дзянісавіч Пірожнік з в. Орліна, медсястра Галіна Мікалаеўна Бабяк і А. Заяц. Медыцынскую службу 128-га партызанскага атрада ўзначаліў урач Віктар Барысавіч Пятроўскі, 61-га атрада — Марфа Васілеўна Паўлавец, 278-га атрада — Мікалай Паўлавіч Кніга, 113-га атрада — Уладзімір Фаміч Курганович. У 113-м атрадзе пачалі працаваць урач-хірург Ілья Іванавіч Астапенка і медсястра Ніна Аляксееўна Патапава, у 128-м — медсястра Марыя Еўдакімаўна Маркава, у 620-м — Агнія Сцяпанаўна Старадворская, якая затым узначаліла санчасць 720-га атрада.

Хуткі рост атрадаў, актывізацыя баявых дзеянняў прывялі да ўтварэння новых форм арганізацыі партызанскіх сіл, у тым ліку і медыцынскай службы. Ужо ў той час у атрадзе № 208 была створана санчасць, якую ўзначаліў старшы ваенфельчар. У яе ўваходзілі ўрачы хірург і тэрапеўт і два фельчары. У кожнай роце і гаспадарчым узводзе быў санінструктар. У санчасці атрада № 208 працавалі ўрачы Віктар Лапцеў і Іван Іванавіч Бандарчык, медсястра Ганна Іосіфаўна Астроўская, якая прыйшла ў атрад з Барысаўскага падполля ў маі 1942 г. і была прызначана памочнікам начальніка санітарнай службы гэтага ж атрада.

У пачатку разгортвання партызанскага руху на Клічаўшчыне медыцынскую дапамогу партызанам і насельніцтву аказвалі медработнікі, якія па тых ці іншых прычынах апынуліся на акупіраванай ворагам тэрыторыі. Яны падтрымлівалі кантакты з мясцовымі падпольшчыкамі і патрыятычна настроенымі людзьмі, хавалі і лячылі партызан, даставалі, дзе толькі маглі, і перадавалі ў партызанскія атрады медыкаменты. Актыўна аказвалі медыцынскую дапамогу партызанам урач Бацэвіцкай райбальніцы Алена Буяноўская, фельчар Калбчанскага фельчарска-акушэрскага пункта Антон Мікалаевіч Капскі, фельчар Ганчанскага пункта В. А. Шэпетаў, зубны ўрач Бацэвіцкай бальніцы Яўгенія Іосіфаўна Малашэвіч. Фельчар Таццяна Сямёнаўна Філончык наладзіла сувязь з аптэкамі Бабруйска, рэгулярна дастаўляла партызанам медыкаменты і неабходныя матэрыялы.

Асабліва шмат добрых слоў трэба сказаць у адрас ваенных урачоў-акружэнцаў. Яны складалі больш за палавіну агульнай колькасці ўрачоў, што працавалі ў партызанскіх атрадах. Ваенны ўрач А. П. Макараў, трапіўшы ў палон, у лагеры для ваеннапалонных у г. Крычаве стварыў падпольную групу з урачоў і медсясцёр. Наладзіўшы ў канцы 1942 г. сувязь з партызанамі, яны сталі перапраўляць у навакольныя лясы байцоў Чырвонай Арміі, што папраўляліся. Калі ўзнікла пагроза правалу, А. П. Макараў 18 мая 1943 г. пайшоў у партызаны і стаў урачом партызанскага атрада № 277.

У сваёй рабоце лясныя медыкі шырока выкарыстоўвалі народную медыцыну — лячылі з дапамогай розных траў і раслін. Яшчэ адной крыніцай медзабеспячэння партызан былі багатыя трафеі, з якіх беражліва выбіралі ўсё тое, што магло быць карысным у партызанскіх шпіталях, і ў першую чаргу дэфіцытныя медыкаменты і неабходныя матэрыялы.

Паводле ўспамінаў партызанскага доктара А. П. Макарава, аперацыйнымі заламі служылі звычайныя зямлянкі. Аперыравалі пры святле газоўкі. Растваралі лекі дажджавой або снегавой вадой, якая замяняла дыстыляваную. З-за адсутнасці неабходных матэрыялаў выкарыстоўвалі прасціны, саматканае палатно, аконныя фіранкі, што прыносілі мясцовыя жыхары.

У медыцынскім абслугоўванні партызан важную ролю адыгрывала своечасовая эвакуацыя параненых на Вялікую зямлю. Рэгулярна партызанскія аэрадромы ў Клічаве і Цераболі прымалі самалёты, якія прывозілі зброю, боепрыпасы, медыкаменты, а на зваротным шляху вывозілі дзяцей і цяжкапараненых партызан. Пры аэрадроме ў Цераболі было арганізавана нешта накшталт эвакашпіталя, персанал якога клапаціўся аб лячэнні параненых, праводзіў пры неабходнасці тэрміновыя аперацыі і ўстанаўліваў чаргавасць адпраўкі параненых. Усяго за год партызанскага руху на Вялікую зямлю з Клічаўскай партызанскай зоны эвакуіравана больш за 300 цяжкапараненых партызан. А з пачатку 1943 г. савецкі тыл стаў асноўнай крыніцай медзабеспячэння партызанскіх атрадаў. Лётчыкі прывозілі ў партызанскія атрады вялікую колькасць перавязачных матэрыялаў, індывідуальных пакетаў, сродкаў абязбольвання. Апошнія дазвалялі значна шырэй практыкаваць пры неабходнасці хірургічныя ўмяшанні.

Непасрэднае кіраўніцтва медзабеспячэннем Клічаўскай партызанскай зоны было ўскладзена на начальніка санітарнай службы Клічаўскай ваенна-аператыўнай групы (з кастрычніка 1943 г. па сакавік 1944 г. начальнікам быў Мікалай Паўлавіч Кніга).

Пры наступальных баявых дзеяннях каля месца бою размяшчаўся медыцынскі пункт, дзе аказвалі першую медыцынскую дапамогу. Характар раненняў быў розны: асколачныя, кулявыя, штыкавыя раны, пашкоджанні ад удараў прыкладамі, рознага роду пераломы, кантузіі, шокі. Неадкладная медыцынская дапамога аказвалася непасрэдна на полі бою ў парадку сама- і ўзаемадапамогі, санінструктарамі, медсёстрамі, фельчарамі і ўрачамі на медыцынскім пункце. Поле бою было па сутнасці рабочым месцам для медыкаў. Самаадданa працавалі на полі бою, не звяртаючы ўвагі на небяспеку, мужныя санітаркі з Клічаўскага раёна Рэгіна Дзмітрыеўна Калінкіна і Ірына Вікенцьеўна Каржанеўская, медсястра Агнія Сцяпанаўна Старадворская, Аляксандра Цішко, Марыя Еўдакімаўна Маркава і многія-многія іншыя.

Складанай і цяжкай была работа партызанскіх медыкаў. Трэба было дапамагаць не толькі партызанам, але і жыхарам навакольных вёсак. У 1943—44 гг. насельніцтва многіх вёсак раёна хварэла на сыпны тыф і каросту. У снежні 1943 г. была ўспышка тыфу і ў партызанскіх атрадах. Медперсаналу партызанскіх атрадаў з дапамогай савецкага тылу ўдалося шмат зрабіць па папярэджанні гэтага захворвання. Шырока праводзіліся прышчэпкі сыпнатыфознай вакцынай, а таксама прышчэпкі супраць інфекцыйных страўнікава-кішачных захворванняў.

А. І. Катлярэнка.

«Нізка пакланіцеся доктару»

З успамінаў М. П. Кнігі, доктора медыцынскіх навук, прафесара, былога начальніка медыка-санітарнага аддзела Магілёўскага падпольнага абкома КПБ

Медыцынскую службу ў партызанскіх атрадах спачатку давялося несці тым, хто меў пра гэту справу хоць нейкае ўяўленне. Так, медсанчасць атрада № 208 доўгі час узначальвала медсястра Ганна Іосіфаўна Астроўская; галоўным урачом, калі можна сказаць, у 277-м атрадзе (а затым і 2-й Клічаўскай партызанскай брыгадзе) быў санінструктар Ілья Яфімавіч Жыцелеў.

Зусім дрэнна абстаяла справа з перавязачнымі матэрыяламі, медыкаментамі. Замест ваты іншы раз выкарыстоўваўся мох, а замест бінтоў ішлі ў ход бялізнавыя анучы, чыстыя анучы. Поўнасцю адсутнічалі сродкі руху раненых, што вельмі абцяжарвала партызанскія атрады, скоўвала іх баявую дзейнасць. Асабліва гэта выяўлялася ў час правядзення фашыстамі карных аперацый. Замест таго, каб умацоўваць абарону баявых пазіцый, камандаванне атрадаў выдзеліла вялікую колькасць людзей для пераносі раненых у бяспечнае месца. Лясныя паўзабалочаныя сцяжынкі былі цяжкапраходнымі, і, каб эвакуіраваць аднаго хворага на 8—12 км, неабходна было заняць не менш як 12 чалавек.

Урачамі станавіліся медсёстры, а работу санітараў выконвалі жанчыны з навакольных вёсак. Адсутнасць старэйшага медперсаналу ў радах народных мсціўцаў тлумачылася тым, што з першых дзён вайны медыкі былі прызваны ў армію і разам з ёй адступілі на ўсход. Тыя, хто трапіў у акружэнне, былі ў большасці сваёй схоплены акупантамі і адпраўлены ў канцлагеры. Праз гэта фашысцкае пекла прайшлі многія медыцынскія работнікі. Дарэчы, і сам я, каб не трапіць у Барысаўскі канцлагер, ледзьве выбраўся з акупіраванага ворагам Мінска і, хаваючыся па глухіх вёсках, разам з сям'ёй дабраўся да роднай мне Клічаўшчыны, каб тут, побач з землякамі-партызанамі, весці барацьбу з заклятым ворагам. Само сабой зразумела, што, трапіўшы ў атрад Ігната Зіноўевіча Ізоха, мне з першых дзён давялося займацца лячэннем раненых і хворых. На медыка ў тыя дні людзі глядзелі як на выратавальніка, а мы, не маючы пад рукамі ні адпаведнага інструменту, ні дастатковай колькасці неабходных лякарстваў, нярэдка цярпелі фіяска.

Бадай, самай першай і самай крыўднай маёй няўдачай была смерць Івана Карлавіча Вітоля. Былы чэкіст, адзін з арганізатараў партызанскага руху на Клічаўшчыне, Іван Карлавіч атрымаў раненне 20 сакавіка 1942 года ў баі за Клічаў. Параненых аказалася тады нямала. Усе яны былі дастаўлены ў вёску Бярозавае Балота і размешчаны ў сялянскай хаце. Хутка агледзеўшы разам з фельчарам А. Капскім параненых і зрабіўшы кожнаму з іх неабходныя перавязкі, мы зноў схіліліся над пакутуючым ад болю Іванам Карлавічам. Куля прашыла яму жывот. Патрабавалася тэрміновая хірургічная аперацыя, але мы нічога не маглі зрабіць.

— Прыстрэльце, хлопцы,— прасіў Іван Карлавіч.— Сіл маіх больш няма...

Жыццё чалавечае дагарала на нашых вачах, а мы з Капскім бездапаможна стаялі і вінавата глядзелі на таварыша, які паміраў. Пад рукамі ў нас нават не было анестэзіруючых сродкаў, каб хоць крыху суцішыць боль Івану Карлавічу.

Пасля вызвалення раёна ў 1942 г. працаваць медыкам стала крышку лягчэй. Мы збіралі ўсё, што маглі і што засталося ад разрабаваных ворагам былых амбулаторый і бальніц. У лясах было выкапана і абсталявана некалькі зямлянак, дзе размяшчаліся «палаты хворых», «партызанская паліклініка». Папаўняўся і штат медыцынскіх работнікаў. У 128-м атрадзе начальнікам санчасці стаў урач Віктар Барысавіч Пятроўскі, у атрадзе № 61 — урач Марыя Васілеўна Паўлавец. Медперсанал рабіў усё магчымае, каб аказваць насельніцтву неабходную медыцынскую дапамогу, хоць гэта было іншы раз даволі складана і цяжка. Справа не толькі ў тым, што цывільных хворых даводзілася лячыць непасрэдна дома, для чаго патрабавалася дадатковая баявая ахова, але і ў тым, што сярод насельніцтва сустракаліся розныя інфекцыйныя захворванні, для паспяховага лячэння якіх неабходны былі дэфіцытныя ў той час медыкаменты. Да прыкладу, можна ўспомніць хоць бы такі выпадак. У 5-гадовага хлопчыка з вёскі Бёрда была выяўлена дыфтэрыя зева. Тэрмінова патрабавалася антытаксічная сываратка. Мы пераварушылі ўсе запасы сваіх паходных аптэк, а неабходнага лякарства не было. Жыццё дзіцяці выратавала выпадковая сустрэча кагосьці з медсясцёр з былой мінскай настаўніцай Таццянай Іосіфаўнай Доўгай, у якой нейкім цудам аказаліся дзве ампулы патрэбнай сывараткі.

...Клічаўскі раён гітлераўскія карнікі

рашылі задушыць у кальцы блакады. У апошняй дэкадзе ліпеня 1942 г. фашысты кінулі сюды тры пяхотныя дывізіі, прыдаўшы ім немалую колькасць артылерыі, бронемашын і авіяцыі. У такі час бяспрыкладная мужнасць патрабавалася ад усіх. Разам з партызанамі ў адным страі ішлі і медыкі.

Ахвяруючы жыццём, урач Пятроўскі і медсястра Маркава разам з партызанам 128-га атрада Леанідам Цімаховічам выратавалі 27 параненых партызан. Больш як месяц яны лячылі і хавалі іх у лясах і балотах.

...Для нас, партызанскіх медыкаў, прылёт савецкіх самалётаў у тыл ворага быў вялікай радасцю, бо лётчыкі разам з баявымі грузамі прывозілі сюды і медыкаменты, і хірургічныя інструменты, а накіроўваючыся назад, заўсёды забіралі раненых, якім трэба было працяглае шпітальнае лячэнне.

Вось некалькі старонак з дзённіка, якія яскрава гавораць аб той неацэннай дапамозе:

«22 верасня 1942 г. з Усакінскага лясного аэрадрома накіравана ў Маскву 15 цяжкапараненых партызан з 810-га атрада і трое хворых дзяцей...»

«3 кастрычніка ўрач Сямён Кобыш з 277-га атрада накіраваў самалётам за лінію фронту 5 параненых партызан...»

«7 кастрычніка з аэрадрома ў вёсцы Дзмітраўка самалёт павёз на Вялікую зямлю афіцэра разведупраўлення Заходняга фронту Артура Карлавіча Спрогіса, параненага ў схватцы з акупантамі каля горада Барысава, і некалькі цяжкахворых з лазарэта 128-га партызанскага атрада».

«7 лістапада. Позна ноччу прыляцеў самалёт на Усакінскую лясную пляцоўку. Узяў на борт групу параненых партызан, сярод якіх і 60-гадовы Андрэй Васілевіч Заяц. Сям'я Андрэя Васілевіча вельмі пацярпела ў час блакады: загінуў яго сын Уладзімір — партызан 61-га атрада, фашысты расстралялі двух унукаў старога і яго дачку...».

Лётчыкі дастаўлялі ў партызанскія зоны вялікую колькасць перавязачных матэрыялаў і індывідуальных пакетаў, анестэзіруючых сродкаў. Апошняе дазваляла нам, медыкам, шырэй практыкаваць пры неабходнасці хірургічныя ўмяшанні. Для апрацоўкі рук перад аперацыяй мы ў большасці выпадкаў выкарыстоўвалі самагонны спірт. Стэрылізацыя інструментарыю і іншага неабходнага хірургічнага матэрыялу праводзілася на агні ў вёдрах або гліняных гаршках. Пасля паўгадзіннага кіпення ваду зліваліі, а аперацыйныя прадметы заставаліся ў посудзе, які адначасова служыў і стэрыльным столікам.

«Людзі ў белых халатах» — так любоўна называе народ сваіх медыкаў. Мы, партызанскія ўрачы, фельчары, медсёстры, санітары не хадзілі ў гэтай звыклай для медыкаў уніформе. На тое былі свае прычыны, так дыктавалі нам трывожныя абставіны тых дзён. Але без белых халатаў кожны з нас нёс на сваіх плячах тую вялікую адказнасць за жыццё і здароўе, якая ўскладзена на нас нашай прафесіяй.

Памятаю і ніколі не забуду выпадак на партызанскім аэрадроме паблізу вёскі Усакіна ў ліпені 1943 г. Партызан, які, мяркуючы па бінтах, быў цяжка паранены ў твар, чакаючы самалёта з Масквы, дыктаваў дзяўчыне-медсястры пісьмо сваім таварышам па атрадзе.

— А яшчэ, рабяты,— глухаватым голасам павольна гаварыў ён,— нізка пакланіцеся ад мяне доктару. Калі б не яна, не Таццяна Іванаўна, не яе залатыя рукі, даўно не быць бы мне на гэтым свеце. Я, напэўна, не буду ўжо бачыць, але я ўпэўнены, што буду жыць. Вялікае, вялікае ёй дзякуй!

Не ведаю ні прозвішча гэтага хлопца, не ведаю, у якім партызанскім атрадзе ён ваяваў, не ўдалося мне ўстанавіць і прозвішча доктара «Таццяны Іванаўны», якой так нізка-нізка прасіў пакланіцца паранены баец. Ды, напэўна, і не ў канкрэтных прозвішчах тут справа. Выпадак гэты мне запомніўся таму, што няма для медыка вышэйшай узнагароды, чым сардэчная чалавечая падзяка.

Апошні бой героя

КАВАЛЁЎ Піліп Іванавіч — Герой Савецкага Саюза (15.8.1944). Нарадзіўся 27.11. 1916 г. ў в. Гайкоў Чэрыкаўскага р-на. Беларус. З 1935 г. працаваў у саўгасе, на заводзе ў Запарожжы, брыгадзірам у Чэрыкаўскай МТС. У Чырвонай Арміі з 1939 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. З чэрвеня 1941 г. на фронце, з чэрвеня 1942 г. пасля ранення змагаўся ў тыле ворага ў дыверсійнай групе, з ліпеня 1943 г. камандзір групы падрыўнікоў партызанскага атрада 255-га, потым — партызанскага палка 255-га, які дзейнічаў і на тэрыторыі Клічаўскага раёна. Падрыхтаваў 13 дыверсійных груп, пусціў пад адхон 19 эшалонаў, падарваў 30 аўтамашын з жывой сілай і тэхнікай во-



П. І. Кавалёў.

рага. Загінуў у баі 17.3.1944 г. Быў пахаваны ў в. Баркі Кіраўскага р-на, перапахаваны ў в. Кавяза Клічаўскага р-на. Яго імем названа вуліца ў г. Чэрыкаў. Пра апошні бой Героя расказвае ў сваіх успамінах А. Захарава.

...Сярэдзіна лета 1942 г. Праз лінію фронту ў тыл ворага пранікла група з 12 чалавек. Гэта былі дыверсанты-падрыўнікі... Толькі ўзышлі на палатно, а з-за насыпу высыпала вялікая група варожых салдат. Завязаўся бой. З бліжэйшага бункера застракатаў кулямёт. У гэтым кароткім, але гарачым баі, першым баі ў тыле ворага, група паказала вытрымку, уменне хутка арыентавацца на мясцовасці. З групы найбольш вызначыліся тры байцы — Кароткі Уладзімір, Кавалёў Піліп, Шыцікаў Іван. Яны агнём сваіх аўтаматаў прыкрылі адыход таварышаў, знішчылі праціўніка і дагналі сваіх.

Усе трое — у мінулым байцы Чырвонай Арміі. З першых дзён вайны ўдзельнічалі ў цяжкіх баях, спазналі горыч адступлення. Кавалёў Піліп у баях за Ленінград на Выбаргскім напрамку ў верасні 1941 г. быў цяжка паранены. Лячыўся ў шпіталі на Урале. А калі выпісалі, сказалі, што ў строй яму ўжо не вярнуцца.

Ён настойліва прасіў, каб прызналі годным да службы ў войску. Адмовілі. Тады ён напісаў у Маскву, у Штаб партызанскага руху, і ўжо не прасіў, а патрабаваў накіраваць яго ў тыл ворага, на Беларусь, каб працягваць барацьбу з ненавісным захопнікам. Тут, у Маскве, калі іх навучалі падрыўной справе, ён і сустрэўся з Шыцікавым і Кароткім. У партызанах яны сталі шчырымі сябрамі.

...Яшчэ не астыўшы ад гарачага бою, партызаны пайшлі падрываць эшалон. Яны вывучылі падыходы, патруляванне, выбралі месца для падрыву. Залеглі зусім блізка да палатна. Чакаюць цягніка...

— Падрыхтавацца! — пачулася нягучная каманда Кавалёва. Імклівы рывок — і дыверсанты каля рэек. Тол, міна,— усё прыведзена ў гатоўнасць і закладзена.

Раптам Кавалёў вылаяўся:

— Чуеце, хлопцы, паражняк ідзе?! — Ратуй міну і тол! — і дадаў: — Не сумуйце, хлопцы, дачакаемся цяжкавагавага.

І праўда. Праз невялікі прамежак часу ішоў доўгачаканы цяжкавагавы цягнік.

— Ну, гэта наш,— спакойна вымавіў Піліп і накіраваўся закладваць міну. З процілеглага боку паказаліся патрулі.

— Даць агню! — загадаў Кавалёў.

Немцы не паспелі апамятацца, як былі змецены партызанскім агнём.

У сцюжу і ў мяцеліцу, у праліўны дождж і ў мароз Кавалёў спяшаўся на чыгунку. Па дарозе падбівалі аўтамашыны ворагаў, узрывалі і падпальвалі масты, знішчалі невялікія гарнізоны. Бывала, калі скажаш: «Адпачні, Піліп! Дай сваім хлопцам перадых». «Не, таварыш камісар, справа прадстаіць гарачая, а хлопцы самі рвуцца ў дзеянне». Заўсёды падцягнуты, добры, з іскрынкамі ў карых вачах, ён ішоў сам на барацьбу і вёў за сабою людзей. Баявы рахунак Кавалёва Піліпа Іванавіча ўсё рос і рос.

...Прыгравала веснавое сонца, ужо даносіўся з-за Дняпра гул гармат Чырвонай Арміі, быў вызвалены Рагачоў, і партызаны, імкнучыся наблізіць вызваленне роднай Беларусі, усё мацней і мацней наносілі ўдары па ворагу.

17 сакавіка 1944 г. было вырашана разграміць вайсковыя часці праціўніка, што рухаліся да фронту па шашы Магілёў — Бабруйск. Выйшлі ўсёй брыгадай. Гэта была сіла: каля трох тысяч партызан і партызанак! Добра ўзброеныя, загартаваныя ў барацьбе байцы.

Аперацыя была старанна распрацавана і падрыхтавана. Кожны атрад і батальён палка ведаў сваю задачу. І калі вайсковая часць праціўніка ўвайшла ў раён нашай засады, разгарэўся бой. Раптоўнасць наступлення партызан не дала магчымасці праціўніку разгарнуцца. У першыя хвіліны бою ўся тэхніка была выведзена са строю. Адступаць фашыстам не было куды, і яны амаль ўсе былі перабіты.

У гэтым баі каля вёскі Баркі Кавалёў П. І. камандаваў ротай. Бой ужо заціхаў. Чуліся апошнія стрэлы. Партызаны кінуліся на шашу збіраць багатыя трафеі. У гэты час Піліп Іванавіч, устаўшы ва ўвесь рост, акінуў позіркам сваіх байцоў і гучна сказаў: «З перамогай вас, таварышы партызаны!». І раптам павольна апусціўся на калені. Калі да яго падбеглі партызаны, сэрца яго не білася. Выявілася: гітлераверец на процілеглым баку дарогі, спрабуючы ўцячы, даў чаргу з аўтамата. І адна з тых шалёных куль трапіла проста ў сэрца Піліпа Іванавіча.

Друкуецца па кн.: Люди легенд. М., 1965. Вып. 1. С. 540—547 (у перакладзе на беларускую мову).

Вызваленне

Часці Чырвонай Арміі вызвалялі Клічаўшчыну ў ходзе ўзаемадзеяння войск 1-га і 2-га Беларускіх франтоў, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Магілёва і Бабруйска. Войскі 2-га Беларускага фронту пад камандаваннем Г. Ф. Захарава наступалі на Магілёў. Армія І. Т. Грышына прарвала абарону праціўніка, з ходу фарсіравала Дняпро і пачала праследаванне ворага. 28 чэрвеня быў вызвалены Магілёў і савецкія войскі выйшлі ў міжрэчча Друці і Дняпра.

На межах Клічаўскага раёна першыя рэгулярныя часці Чырвонай Арміі з'явіліся на пяты дзень Беларускай наступальнай аперацыі. Раніцай 27 чэрвеня 1944 г. прагучалі першыя залпы гармат 348-й стралковай дывізіі, якая фарсіравала Друць і пачала праследаванне праціўніка.

Арміі А. В. Гарбатава і П. Л. Раманенкі разам з іншымі войскамі акружылі буйную групоўку ворага ў раёне Бабруйска. Патрэбна было хутчэй перарэзаць камунікацыі праціўніка, каб перашкодзіць яму падкідваць рэзервы ў Бабруйск. У гэтых адносінах важнае значэнне мела вызваленне Клічаўскага раёна. На досвітку 27 чэрвеня на паўднёвым захадзе раёна з'явіліся часці 82-й стралковай дывізіі 65-й арміі 1-га Беларускага фронту, дзе каля вёсак Усохі, Зарэчча, Бацэвічы пачаліся баі. Адначасова часці 323-й стралковай дывізіі 11-й арміі атрымалі загад блакіраваць шашу Магілёў — Бабруйск і вызваліць навакольныя населеныя пункты. Бой за шашу быў нядоўгі: у 21.00, падавіўшы кулямётна-аўтаматны агонь і агонь самаходных гармат, дывізія перарэзала шашу і вызваліла вёскі Убалацце, Перасека, Апалінарава.

На 348-ю дывізію была ўскладзена задача вызваліць Клічаў. З гэтай мэтай з двух палкоў быў сфарміраваны перадавы атрад пад камандаваннем маёра А. С. Паўлаўца. У ноч з 27 на 28 чэрвеня Клічаў быў вызвалены.

28 чэрвеня вайсковыя злучэнні дывізіі працягвалі баі па вызваленні населеных пунктаў Клічаўшчыны, выбілі фашыстаў з вёсак Дзмітраўка, Іванаўка, Кабылянка, вечарам 29 чэрвеня дывізія фарсіравала Бярэзіну.

Выконваючы загад блакіраваць чыгунку Магілёў — Асіповічы і замацавацца на рубяжы Нясята — Пярэкаль — Дуброва — Арэхаўка, актыўныя баявыя дзеянні вяла 82-я стралковая дывізія, якая ў ходзе жорсткіх баёў вызваліла вёскі Нясяту, Пярэкаль, Дуброву, Арэхаўку.

28 чэрвеня байцы дывізіі пачалі фарсіраваць Бярэзіну. Першым фарсіраваў раку і захапіў чыгуначны мост разведузвод пад камандаваннем старшыны Матросава. Узвод утрымліваў мост да падыходу асноўных сіл. За мужнасць Матросаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

29 чэрвеня на тэрыторыю Клічаўшчыны ўступілі 380-я і 385-я стралковыя дывізіі. Яны фарсіравалі Друць і завязалі бой за вёскі Даўжанку і Доўгае. Жорсткае супраціўленне ворага сустрэлі байцы 385-й дывізіі каля в. Суша. У 17.30 батальён 1208-га стралковага палка пачаў наступленне на вёску. Першая атака поспеху не мела. Пад агнём кулямётаў і гармат батальён залёг. Нават намаганні ўсяго палка не прынеслі поспеху. Імкнучыся ўтрымаць Сушу, праціўнік чатыры разы пераходзіў у контратакі пры падтрымцы чатырох самаходных гармат. Але раніцай 1 ліпеня на дапамогу падышлі часці 380-й стралковай дывізіі і Суша была вызвалена.

Значную дапамогу рэгулярным войскам у вызваленні Клічаўшчыны аказалі парт-



Помнік на месцы злучэння партызан з часцямі Чырвонай Арміі каля вёскі Паплавы.

тызаны. З пачатку Беларускай наступальнай аперацыі Ваенна-аператыўная група Магілёўскага падпольнага абкома партыі рыхтавала партызанскія фарміраванні вобласці да ўзаемадзеяння з часцямі Чырвонай Арміі. 27 чэрвеня была склікана нарада каманднага саставу атрадаў, якую праводзіў камандзір ВАГ С. Г. Салдаценка-Сідарэнка. Ён паставіў задачу: перашкаджаць праціўніку ўзрываць пры адступленні масты і пераправы, спальваць населеныя пункты, замацоўвацца на зручных для абароны рубяжах, знішчаць адступаючыя групоўкі ворага. Так, на дарозе Нясята — Вязоўка партызанскі атрад 278-ы напаў на адступаючы гітлераўскі артылерыйскі полк. У час бою знішчана 59 чалавек, захоплена 8 гармат, аўтаматы і вінтоўкі.

28 чэрвеня 1944 г. каля в. Паплавы партызанскія палкі 15-ы, 277-ы і партызанскія атрады 25-ы, 115-ы, 278-ы злучыліся з часцямі Чырвонай Арміі.

Л. Л. Ачыновіч.

На вогненных франтавых дарогах

Гэтак жа мужна і стойка, як і ў глыбокім тыле ворага — у партызанскай зоне, змагаліся нашы землякі і на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Яны насмерць стаялі, абараняючы Брэсцкую крэпасць, Магілёў, Маскву, Сталінград, Ленінград, грамілі захопнікаў пад Курскам, на ўмацаваных рубяжах на Дняпры, вызвалялі ад фашысцкага рабства народы Еўропы, штурмавалі Берлін. На зямлі, на моры і ў небе яны не шкадавалі ні сіл, ні самога жыцця дзеля перамогі над ворагам.

З першага да апошняга дня вайны знаходзіўся на фронце камандзір мінамётнага аддзялення **Мікалай Рыгоравіч СІЛІВОНЧЫК.** У чэрвені 1942 г. полк, у якім ён ваяваў, быў пераКінуты пад Сталінград. Баявыя пазіцыі мінамётчыкаў Сілівончыка знаходзіліся ў якіх-небудзь 100 м ад Волгі. А пазней былі Данскі фронт, Курска-Арлоўская дуга, вызваленне роднай Беларусі. Франтавік ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, медалямі.

Калі пачалася вайна, **Леанід Дзмітрыевіч АЎСЯНКІН** вучыўся ва Ульянаўскім агульнавайсковым ваенным вучылішчы. У снежні 1942 г. разам з іншымі курсантамі быў накіраваны на Паўночна-Заходні фронт. Камандзір узвода ПТР Л. Дз. Аўсянкін удзельнічаў у баях пад Старой Русай, на Арлоўска-Курскай дузе. Біў ворага ў Польшчы і Германіі. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I, II ступеняў, медалямі.

Перад часцю, у якой служыў **Цімафей Трафімавіч САЗАНАВЕЦ,** стаяла задача: любой цаной стрымаць немцаў, якія рваліся ў г. Гдыню. Камандаванне часці даручыла разведчыкам Сазанаўца сабраць звесткі пра колькасць узбраення і размяшчэнні праціўніка. Салдаты выдатна справіліся з заданнем. Цімафей выказаў думку, што кулямётныя разлікі трэба перанесці ў іншае месца, бо вораг, відаць, іх засек, а байцам акапацца, каб нямецкія танкеткі прычынілі ім менш шкоды. Раніцой немцы адкрылі ўраганны агонь, снарады ляцелі ў тыя месцы, дзе зусім нядаўна знаходзіліся нашы кулямётныя разлікі. Паспяхова справіліся байцы і з нямецкай тэхнікай. За гэта Ц. Сазанавец быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

На світанні 22 чэрвеня, калі з-за Буга на Брэсцкую крэпасць абрушыўся страшэнны ўдар фашысцкіх войск, артылерыст **Іван Герасімавіч ДУЛЕБЕНЕЦ** разам з іншымі ўступіў у бой. Дзесяць дзён у поўным акружэнні батарэя вяла агонь. А калі скончыліся снарады, байцы вырашылі выходзіць з акружэння. Потым баявы шлях Івана Герасімавіча пралёг праз Беларусь, Заходнюю Украіну, Польшчу, Германію. Мужнасць артылерыста адзначана ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За баявыя заслугі» і іншымі баявымі ўзнагародамі.

Вайна застала гандлёвае судна, на якім знаходзіўся матрос **Іван Ілыч РЫЖКОВІЧ,** у Паўночным моры. З вялікай цяжкасцю дабраліся савецкія маракі да палаючай у агні Радзімы. Шмат разоў уступаў ужо ваенны карабель, дзе служыў Рыжковіч, у баі з ворагам у Белым і Баранцавым морах, ахоўваў нашы паўночныя рубяжы, змагаўся з ворагам за парты Петсама, Кіркінес, Мурманск.

Неаднойчы гарэў у танку танкіст **Іван Канстанцінавіч КУШНЕР.** Асабліва цяжкай была бітва пад Прохараўкай. Раненне, атрыманае ў гэтым баі, не дазволіла Івану Канстанцінавічу больш удзельнічаць у баявых аперацыях. Пасля вайны ён прысвяціў жыццё настаўніцкай працы.

У небе над Растовам пачаў вайну штурман эскадрыллі **Васіль Рыгоравіч ЗАГАРОЎСКІ.** За ўзорнае выкананне баявых заданняў, мужнасць і гераізм ён узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і двума ордэнамі Чырвонай Зоркі.

Ад Кіева да Нарвегіі праляглі ваенныя

дарогі **Івана Фёдаравіча ГАЛАЦЭВІЧА.** Курсантам ваеннага вучылішча трапіў ён на фронт, удзельнічаў у баях за Маскву, Ленінград. Зімой 1942—43 гг. у складзе войск сувязі ахоўваў «Дарогу жыцця» на Ладажскім возеры. Калі быў начальнікам сувязі асобнага разведбатальёна 114-й стралковай дывізіі, у 1944 г. аказаўся ў Нарвегіі. У бітве за горад Кіркінес было вызвалена 75 тысяч савецкіх грамадзян, якіх трымалі тут на прымусовых работах.

Кожны дзень, рызыкуючы жыццём пад кулямі ворага, забяспечваў сувязь воінскіх падраздзяленняў сувязіст **Міхаіл Лявонавіч КОЎРЫК.** За мужнасць і адвагу ўзнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

Радыст **Андрэй Герасімавіч ШАХУНОЎ** у першыя дні вайны ўдзельнічаў у цяжкіх баях на Карэльскім перашыйку. Фашысты настолькі блізка падышлі да нашай лініі абароны, што каардынаты, якія перадаваў Шахуноў для артылерыйскага абстрэлу, сталі каардынатамі яго ўласнага месцазнаходжання. Але радыст, не раздумваючы, выклікаў агонь на сябе і толькі цудам застаўся жывы.

У мірны час знайшла баявая ўзнагарода — ордэн Славы III ступені — ветэрана **Андрэя Якаўлевіча ЖЫТНІКАВА.** У баях пад Рыгай склалася цяжкае становішча: быў паранены камандзір артылерыйскага разліку, загінуў наводчык, а нямецкія танкі набліжаліся. Тады старшына Андрэй Жытнікаў стаў за панараму гаўбіцы і адкрыў агонь па «фердынандах». Успыхнуў адзін танк, другі. Атака адбіта, але гэтага ўжо не бачыў салдат, бо сам быў цяжка паранены.

Ордэн Славы III ступені атрымаў пасля вайны і **Аляксей Васілевіч САЛАНОВІЧ** з в. Дуброва Бацэвіцкага сельсавета. Пад прыцэльным агнём снайпера ён змацаваў парваны снарадам кабель і забяспечыў сувязь батарэі з назіральным пунктам камандзіра. А. В. Салановіч узнагароджаны такса ма медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Будапешта», «За ўзяцце Берліна».

У баі пад Кёнігсбергам атрымаў цяжкае раненне **Аляксандр Іванавіч МАЦЮШОНАК.** Вораг кінуў у бой 12 «тыграў». 11 танкаў было падбіта, але палягло і шмат нашых салдат. Амаль што год лячыўся ў шпіталях Мацюшонак. Радзіма адзначыла мужнасць салдата ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

Радавым пачаў вайну **Усевалад Карпавіч ШАМАЛЬ,** а закончыў яе старшым лейтэнантам з трыма баявымі ордэнамі і васьмю медалямі. Яму «шанцавала» быць у самым пекле вайны: Сталінградская бітва, Курская дуга, фарсіраванне Дняпра, Віслы, Одэра, вызваленне Кіева, Варшавы, штурм Берліна, разгром Квантунскай арміі на Далёкім Усходзе.

Васіль Рыгоравіч КРЫВАНОС з в. Жэрдзішча ўдзельнічаў у вызваленні Варшавы. На старонках чырвонаармейскай газеты было змешчана паведамленне пра гераічны ўчынак франтавіка пад загалоўкам «Подзвіг ездавога Крываносава»: «Даставіўшы на агнявую боепрыпасы, ездавы Васіль Крыванос убачыў, што яго таварышы паранены. Гармата маўчала, а вораг у гэты час пачаў атаку. Крыванос хутка перавязаў параненых, перанёс іх ва ўкрыцце... Ці ж можна дапусціць, каб гармата маўчала, калі вораг блізка?! Адважны ездавы адзін замяніў гарматны разлік. Ён падносіў снарады, затым зараджаў, наводзіў на цэль і біў ворага прамой наводкай.

Гітлераўцы адкрылі па гармаце агонь з кулямётаў і мінамётаў. Але Крыванос не ўступіў ворагу і працягваў стойка абараняцца. Калі немцы падбілі гармату і з яе нельга было страляць, ён выкаціў яе з-пад абстрэлу праціўніка.

За гераічны подзвіг у баі і выратаванне матэрыяльнай часткі ездавы Крыванос прадстаўлены да ўзнагароды. Лейтэнант Б. Тужалкін».

У званні маёра закончыў вайну **Рыгор Навумавіч ВІКТОРЧЫК.** У складзе кавалерыйскага палка 12-й кавалерыйскай дывізіі ўдзельнічаў у баявых дзеяннях на тэрыторыі Беларусі, на Паўднёва-Заходнім фронце, у Венгрыі, у Чэхаславакіі, Аўстрыі. За баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, медалём «За баявыя заслугі» і інш. У мірны час узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Сярод мужных абаронцаў Магілёва ў першыя дні вайны быў камандзір узвода 141-га асобага зенітна-артылерыйскага дывізіёна **Пётр Аўрамавіч ШПАК,** настаўнік па прафесіі. Ваенныя дарогі прывялі яго ў Нарвегію. Пасля вайны ён зноў працаваў настаўнікам.

Франтавік **Іван Платонавіч СКРЫПКА** вызваляў ад ворага родную Клічаўшчыну. Тут ён сустрэўся з братам Дзмітрыем, які быў начальнікам штаба 115-га партызанскага атрада.

Абаранялі Ленінград гвардыі сяржант **Павел Андрэевіч ЖЛОБІЧ,** кавалер ордэна Чырвонай Зоркі **Іван Макаравіч ГРУЗД,** радыст, малодшы сяржант 199-га артылерыйскага палка **Іван Апанасавіч**

КУШНЯРОЎ, радавы 114-га Чырванасцяжнага артылерыйскага палка **Якаў Архіпавіч ЗАБЛОЦКІ.**

У студзені 1942 г. на Клічаўшчыну да Ядвігі Адольфаўны Сцяпура прыйшло пісьмо з Ленінградскага фронту, дзе ваяваў яе муж, ад камандзіра 12-га Асобнага запаснога палка цяжкіх танкаў. Ён паведамляў: «...В боях с немецко-фашистскими оккупантами сержант **ХРАПКО Константин Карпович** проявил себя храбрым и волевым танкистом, хорошо знающим свое дело и наносил удары по злобному врагу».

Удзельнікам прарыву блакады Ленінграда быў ураджэнец в. Віркаў **Іван Кандратавіч ФЯСЬКО.**

Емяльян Прохаравіч МАЦЮШОНАК з в. Паплавы пачаў службу ў Ваенна-Марскім Флоце ў 1938 г. У гады Вялікай Айчыннай вайны — рулявы катэра «Охотник», удзельнік абароны Севастопаля.

Жыхар г. п. Клічава **Іван Пятровіч МАЦЮШОНАК** удзельнічаў у гераічнай абароне Масквы. Калі мінула небяспека для сталіцы, артылерыйскую часць, у якой служыў І. П. Мацюшонак, перакінулі ў асаджаны Ленінград. Батарэі размясціліся на Пулкаўскіх вышынях. Механік-вадзіцель сяржант І. П. Мацюшонак ноччу дастаўляў на цягачы боепрыпасы па Ладажскім возеры. Днём часта замяняў стомленых ці параненых артылерыстаў. Аднойчы яго цягач абстраляў нямецкі самалёт. Воін атрымаў сем раненняў. Перамагаючы боль, Іван Пятровіч даставіў груз да месца прызначэння і страціў прытомнасць. У Ленінградзе ён быў узнагароджаны медалём «За адвагу». Вайну закончыў у Берліне і штыком распісаўся на сцяне рэйхстага. Пасля дэмабілізацыі працаваў механікам Бацэвіцкай МТС, а потым 12 гадоў слясарыў на лесапункце.

Тысячы партызан клічаўскіх партызанскіх атрадаў уліліся ў 1944 г. ў рады дзеючай арміі. Гналі ворага на захад **Макар Карпавіч ЗАЯЦ, Даніла Іванавіч АСТРОЎСКІ, Аляксандр Іванавіч МАЦЮШОНАК, Іван Данілавіч РУСЕЦКІ.**

Былы партызан 278-га партызанскага атрада **Міхаіл Іванавіч КАЗЕЛА** з в. Новыя Максімавічы прымаў удзел у вызваленні г. Мінска. Франтавыя дарогі прывялі яго да Берліна. У час Берлінскай аперацыі ваяваў у складзе 68-га гвардзейскага механізаванага палка камандзірам мінамётнага разліку. За ўдзел у знішчэнні браняпоезда, які абараняў аэрадром Цемпельгоф, авалоданні аэрадромам узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Ціт Аляксандравіч ЯФРЭМАЎ з в. Закупленне быў стралком-радыстам 9-га бамбардзіровачнага і 723-га штурмавога авіяпалкоў. Ваяваў у складзе Калінінскага, 1-га Прыбалтыйскага, 1-га Беларускага франтоў. Зрабіў 67 баявых вылетаў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй». 9 кастрычніка 1944 г. ў паветраным баі ў раёне г. Шаўляй самалёт быў падбіты, Яфрэмаў атрымаў цяжкае раненне. Дэмабілізаваны ў 1947 г. Пасля вайны працаваў старшынёй сельскага Савета і калгаса ў Клічаўскім раёне.

Андрэй Піліпавіч ЧАЙКА з в. Новая Арэхаўка перад вайной працаваў тэхнікам-землеўпарадчыкам зямельнага аддзела Клічаўскага райвыканкома. У снежні 1939 быў прызваны ў Чырвоную Армію, служыў у 1941-м армейскім запасным стралковым палку м. Мураўі Ленінградскай вобласці. У студзені 1940 г. камандаваннем палка быў накіраваны на вучобу ў Асіповіцкае ваенна-пяхотнае вучылішча. З 29 ліпеня да жніўня 1941 г. ўдзельнічаў у баях на Бабруйскім і Гомельскім напрамках (Заходні фронт), старшым кулямётчыкам 1-га нумара станковага кулямёта. У верасні 1943 г. накіраваны ў 141-ю Невельскую асобную танкавую брыгаду намеснікам камандзіра роты па тэхнічнай частцы (1-ы Прыбалтыйскі фронт). З ліпеня 1944 г. ваяваў у складзе 2-га Украінскага фронту ў 25-м гвардзейскім танкавым палку 2-га мехкорпуса 6-й мехбрыгады. Удзельнік Арлоўска-Курскай бітвы, вызвалення Беларусі, баёў у Венгрыі і Чэхаславакіі. Тройчы быў паранены, гарэў у танку. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалём «За адвагу» і інш. Загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага за авалоданне гарадамі і важнымі стратэгічнымі вузламі аб'яўлена сем падзяк.

Уладзімір Міхайлавіч КАРАЧУН з в. Новае Курганне ў Вялікую Айчынную вайну быў камандзірам узвода 50-міліметровых ротных мінамётаў і 82-міліметровых батальённых мінамётаў, карэкціроўшчыкам агню. Удзельнік абароны Сталінграда, вызвалення Беларусі, штурму Берліна. Тройчы паранены і двойчы кантужаны. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеняў, медалямі «За баявыя заслугі», «За абарону Сталінграда», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй» і інш.

Пра мужнасць **Івана Мікалаевіча ДОЎГАГА** з в. Чаравач сведчыць пісьмо, якое атрымала яго маці з фронту: «Дарагая Марыя Емяльянаўна! Камсамольская арганізацыя часці, дзе служыць і ваюе Ваш сын у цяперашні час, пасылае Вам сваё палымянае камсамольскае прывітанне і жадае Вам поспеху ў Вашым жыцці.

Паведамляем, што Ваш сын Доўгі Іван Мікалаевіч змагаецца на фронце з нямецка-фашысцкімі вылюдкамі як герой. У мінулым баі немцы пусцілі супраць нашай часці да шасці танкаў, але ніхто перад імі не задрыжаў, савецкаму воіну не страшная фашысцкая браня.

Ваш сын Іван, нягледзячы на тое, што танкі былі ўжо блізка, смела ўступіў у бой і агнём са свайго процітанкавага ружжа падбіў фашысцкі танк. Услед за ім астатнія байцы адбілі атаку нямецкіх танкаў. За гэты гераічны подзвіг Ваш сын прадстаўлены да ўрадавай узнагароды.

Вы як маці павінны ганарыцца сваім сынам-героем. Жадаем Вам поспехаў у Вашай паўсядзённай рабоце і дзякуем за выхаванне такога сына. Ваш сын жывы і здаровы і па-ранейшаму нішчыць фашысцкіх акупантаў.

З камсамольскім прывітаннем камсорг воінскай часці 02862-М гв. малодшы лейтэнант Васільева».

На вялікі жаль, Доўгі Іван Мікалаевіч пазней быў цяжка паранены і памёр ад ран.

Іван Піліпавіч БЕЛАЗОР з в. Буднеў напярэдадні вайны закончыў ваеннае танкавае вучылішча ў Нова-Барысаве, стаў лейтэнантам. У Вялікую Айчынную вайну ваяваў у складзе 2-й танкавай арміі 1-га танкавага корпуса. Удзельнічаў у баях на Курска-Арлоўскай дузе. Загінуў пры выкананні задання ў красавіку 1945 г. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

Для **Платона Дзямідавіча ШАЛАЯ** вайна пачалася ў 1939 г. на Карэльскім перашыйку, дзе ён быў артылерыстам. Потым у Вялікую Айчынную вайну абараняў Ленінград, адкуль з баямі дайшоў да Германіі. Капітан П. Д. Шалай узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалём «За абарону Ленінграда».

Кузьма Андрэевіч СТАСЁНАК з в. Чаравач да вайны працаваў пастухом, рабочым на лесараспрацоўках, на будаўніцтве чыгункі Магілёў — Асіповічы, пасля заканчэння курсаў гандлёвых работнікаў загадваў магазінам. У 1930 г. добраахвотна пайшоў у Чырвоную Армію, быў курсантам Мінскага ваеннага вучылішча, служыў у БВА. У час Вялікай Айчыннай вайны ваяваў на Заходнім і Ленінградскім франтах. З 1958 г. ў запасе, палкоўнік авіяцыі. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За абарону Масквы», «За абарону Ленінграда», «За перамогу над Германіяй».

Л. Ачыновіч, Т. Касцюкевіч.

Паядынак

КРЫВАНОС Павел Ананьевіч — Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Альхоўка Клічаўскага р-на. Скончыў Бабруйскі лесатэхнікум (1940 г.). У Чырвонай Арміі з 1940 г. На фронце з 1941 г. Камандзір танкавага ўзвода мал. лейтэнант П. А. Крыванос вызначыўся пры ліквідацыі варожай групоўкі каля Віцебска. Памёр ад ран 27.6.1944 г. Пахаваны ў в. Скрыдлева Віцебскага р-на ў брацкай магіле воінаў і партызан, на магіле каля абеліска ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Яго імя носяць вуліца ў Клічаве, Клічаўская сярэдняя школа № 1, дзе створаны яго музей, а каля школы ўстаноўлены бюст героя. Пра подзвіг героя і распавядаецца ў гэтым нарысе.

...Яшчэ не развіднела, а ўзнятыя па трывозе танкісты выводзілі машыны на дарогу, што вяла на захад, ставілі іх у паходную калону. Камандзіры рот, вярнуўшыся ад камандзіра палка, баявую задачу сваім узводам не ставілі, а назвалі толькі канцавы пункт маршу — Бурыносаў лес пад г. Сянно. Павел Крыванос, правёўшы па вызначаным маршруце чырвоную хвалістую паласу на тапаграфічнай карце, каля лесу паставіў кропку. Не ведаў ён тады, што гэта простая кропка, якую ён не аднойчы ставіў у канцы маршрутаў, падвядзе рысу пад яго жыццём.

Мясцовасць была перасечаная, наперадзе стаяў вялікім масівам Бурыносаў лес. Складанасць была ў тым, што Віцебск і Сянно і гэты Бурыносаў лес ужо былі ў нашым тыле, а войскі, гонячы ворага, пайшлі да мяжы з Польшчай і ў Літву.

У гэту бітву з варожага боку ўводзіліся тысячы салдат і каля дзесятка самаходак, сярод якіх былі нават «фердынанды». З нашага боку ўводзілася

П. А. Крыванос.

тры сотні стралкоў і аўтаматчыкаў, 12 гармат і 22 трыццацьчацвёркі. Суадносіны былі няроўныя. Пяхоты ў нас было мала, затое танкі — грозная ўдарна-агнявая сіла — давалі нам пэўную перавагу. Каб хутчэй расправіцца з ворагам, трэба было стварыць кальцо вакол масіву лесу, зрабіць так званы «кацёл», паслядоўна расчляняць ворага, знішчаючы яго па частках. Так пачаўся разгром 206-й пяхотнай дывізіі гітлераўскага вермахта, якая шукала паратунку ў беларускіх лясах.

Для праціўніка атака была нечаканай, але ён сустрэў нас бесперапынным ліўнем кулямётнага і аўтаматнага агню. Перад узводам Крываноса была пастаўлена задача: на правым флангу роты пераадолець масіў кустоў і маладога падлеску на ўзлессі, выйсці праз рэдкалессе да выцягнутай з поўначы на поўдзень паляны, узяць яе пад агнявы кантроль. Камандзірскі танк ішоў ледзь не ўшчыльную з машынай Крываноса. Падпалкоўнік Солцер кіраваў ходам атакі, падпраўляючы баявы курс, каардынуючы агонь артылерыі і танкаў, вызначаючы слабыя месцы праціўніка. Па яго камандзе ўзвод Крываноса рушыў да лесу, дзе быў зручны выхад да рэдкалесся і паляны. Камандзірскі танк пайшоў туды ж. Але праціўнік, відаць, таксама звярнуў увагу на гэта месца, праз якое машыны маглі пранікнуць у сэрца яго абароны, і прыкрыў яго засадай. Калі камандзірскі танк наблізіўся да кустоў, раптам з-за зеляніны падлеску высунулася дула гарматы.

— «Фердынанд»! — крыкнуў Крываносу яго механік-вадзіцель.

Імгненна крутануўшы ўправа перыскоп, Крыванос убачыў, што дула «фердынанда», напалову вытыркнуўшыся з кустоў, было нацэлена ў вежу танка камандзіра часці. Яшчэ імгненне і бранябойная балванка, выпушчаная з блізкай адлегласці, праб'е браню вежы і выведзе са строю экіпаж. Полк застанецца ў крытычны момант без кіравання атакай. Пагражальнасць сітуацыі ўбачылі іншыя экіпажы. Але камандзір не заўважыў небяспекі. Павел Крыванос умомант ацаніў абстаноўку: ён не паспее павярнуць сваю гармату і зрабіць прыцэльны стрэл раней, чым адкрые агонь «фердынанд». Можна б тараніць варожую самаходку, але гэта не спыніць яе: можа хапіць і адзінага, але ракавога стрэлу. Заставалася толькі адно: закрыць сваёй бранёй машыну камандзіра.

Ніколі не прыспешваў свой экіпаж камандзір узвода. Як бы ні склаліся абставіны, аддаваў заўсёды спакойныя і дакладныя каманды. А зараз рэзка загадаў:

— Механік! Уперад! Газуй! Хутка!

Матор зароў, танк ірвануўся з месца. Усе бачылі, як да ўзлеску набліжаліся тры машыны ўзвода Крываноса. Ішлі яны клінам — наперадзе машына камандзіра ўзвода, астатнія — за паўсотні метраў ззаду і на столькі па баках. Метраў за 30 управа ад танка Крываноса, адстаўшы на паўтара — два корпусы, кароткімі рыўкамі прабіраўся ў кірунку ўзлеску камандзірскі танк падпалкоўніка Солцера. І раптам... насупраць танка камандзіра часці з кустоў высунулася дула гарматы. Здавалася, падзеі пайшлі амаль сінхронна. Трыццацьчацвёрка Паўла Крываноса ўзяла ўправа, рэзка ці то рванула, ці то скокнула наперад, пад наведзенае дула ворага. І ў гэты момант успыхнула полымя з дула нямецкай самаходкі. Танк Крываноса спыніўся. З усіх бакоў да праклятага куста павярнуліся танкавыя вежы, варушачы дуламі гармат. Яшчэ хвілінку — і ад «фердынанда» засталася б гара металічнага лому. Але ажыла машына Крываноса. Неяк няўпэўнена, некалькі разоў тузануўшыся, павярнулася яго гармата і ва ўпор ударыла па самаходцы. Дула «фердынанда» апусцілася ледзь не да зямлі. Вось і настала расплата... У многіх, хто бачыў гэты паядынак, была надзея, што экіпаж у машыне Крываноса ўцалеў, тым больш, што па радыё адтуль данеслася каманда:

— Узводу выконваць задачу!

Усе чулі гэту каманду, але ніхто тады не ведаў, што выстрал Павел Крыванос зрабіў апошнімі намаганнямі волі, сцякаючы крывёю і трацячы прытомнасць. Калі яго дасталі з танка, ён яшчэ дыхаў. Праз прыплюшчаныя, нібыта падсіненыя лёгкім налётам вейкі спрабаваў ён разгледзець сяброў, што схіліліся над ім. Пазнаўшы свой экіпаж, ён з натугай усміхнуўся, амаль непаслухмянымі вуснамі, але разборліва і выразна з горыччу прамовіў:

І. І. Ваганаў.

П. С. Дронін.

І. Н. Кавалёў.

К. М. Канойка.

— Так і не папіў я вады з бацькоўскай студні...

А да роднай Клічаўшчыны было ўжо зусім блізка... *В. І. Сянькевіч.*

ВАГАНАЎ ІВАН ІВАНАВІЧ

Генерал-маёр авіяцыі. Нарадзіўся 9.11.1922 г. ў г. п. Клічаў. Скончыў авіяцыйнае вучылішча і Ваенна-паветраную акадэмію. У час Вялікай Айчыннай вайны ваяваў на Сталінградскім і Бранскім франтах, вызваляў Прыбалтыку. Пасля вайны быў начальнікам палітаддзела Цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю. А. Гагарына, членам Ваеннага савета Паветранай арміі, загадчыкам мемарыяльнага музея акадэміка С. П. Каралёва. Пасля выхаду на пенсію жыве ў Маскве. Узнагароджаны трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, «За службу Радзіме» III ступені, медалямі, дыпломам і медалём імя Ю. А. Гагарына. Ганаровы грамадзянін Клічава.

ДРОНІН ПЁТР СЦЯПАНАВІЧ

Контр-адмірал. Нарадзіўся 27.2.1922 г. ў в. Хадэчын Клічаўскага р-на. Скончыў Пермскае авіяцыйна-тэхнічнае вучылішча Ваенна-Марскога Флоту. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны накіраваны ў Ваенна-паветраныя сілы Чарнаморскага флоту, дзе да 1946 г. служыў механікам у авіяцыйным знішчальным палку. Пасля вайны скончыў Ціхаакіянскае Вышэйшае Ваенна-Марское вучылішча. Служыў на ўсіх флатах былога СССР, быў штурманам і камандзірам падводнай лодкі, камандзірам брыгады і эскадры падводных лодак. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

КАВАЛЁЎ ІОСІФ НЕСЦЕРАВІЧ

Генерал-лейтэнант войск сувязі. Нарадзіўся 6.10.1893 г. ў в. Віркаў Клічаўскага раёна. У Чырвонай Арміі з 1918 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. З 1932 г. начальнік аддзелаў сувязі ваеннай акругі. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Айчынную вайну начальнік войск сувязі Ленінградскага фронту. У 1946—58 гг. на адказных пасадах у Савецкай Арміі, начальнік Вышэйшых акадэмічных курсаў сувязі. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 6 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Кутузава II ступені, Суворава II ступені, Багдана Хмяльніцкага I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр 13.10.1969 г.

КАНОЙКА КАНСТАНЦІН МАКАРАВІЧ

Генерал-маёр. Нарадзіўся 17.6.1911 г. ў в. Заполле Клічаўскага р-на. Меў вышэйшую ваенную і юрыдычную адукацыю. Да Вялікай Айчыннай вайны служыў у Арлоўскай ваеннай акрузе. У час вайны — на Заходнім, Сцяпным, 2-м Украінскім франтах. Удзельнічаў у баях у складзе 20-й арміі, 4-й і 7-й гвардзейскіх армій. Абараняў Маскву, ваяваў на Курска-Арлоўскай дузе, удзельнічаў у Корсунь-Шаўчэнкаўскай аперацыі, вызваленні Кіева і Прагі, Румыніі і Венгрыі. Пасля вайны служыў у Цэнтральнай групе войск, Маскоўскай, Паўночнай і Адэскай ваенных акругах. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Памёр у 1992.

Было наканавана лятаць

У даваенны час самалёт, ці як яго часта называлі ў вёсцы аэраплан, здаваўся цудам. І, бадай, не было хлапчука, сэрца якога б не запаланіла крылатая мара. Толькі ў нямногіх з іх, у тым ліку і ў Івана Ізоха з Клічава, мара гэта стала явай. Аднойчы Ваня сказаў дома, што хоча стаць лётчыкам. І паведаміў пра гэта ў апошні дзень перад ад'ездам на вучобу ў Магілёўскі аэраклуб.

У юнака выявіліся выдатныя здольнасці да лётнай справы. Яшчэ ў аэраклубе ён налятаў больш за 1000 гадзін, а потым паступіў у лётнае ваеннае вучылішча, якое таксама скончыў выдатна.

Летам 1941 г. Ваня праводзіў свой чарговы адпачынак у родным Клічаве, дзе і застала яго вайна, якая з'явілася суровым выпрабаваннем для маладога лётчыка. Да 17 чэрвеня 1943 г. Ізох зрабіў 217 баявых вылетаў, правёў 27 паветраных баёў. Часцей за ўсё паветраныя баі даводзілася весці адразу з некалькімі варожымі самалётамі, але малады лётчык выходзіў пераможцам. За баявыя заслугі старшы лейтэнант Ізох у кастрычніку 1942 г. быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Летам 1943 г. пад Арлом і Белгарадам гітлераўцы зрабілі апошнюю спробу арганізаваць вялікае наступленне на савецка-германскім фронце. У раёне Арла завязаліся моцныя баі. Старшы лейтэнант Ізох да гэтага часу быў камандзірам авіяэскадрыллі. Толькі з 14 да 31 ліпеня 1943 г. ён асабіста збіў 8 варожых самалётаў.

Свой апошні паветраны бой наш зямляк правёў 3 жніўня 1943 г. ў раёне Бакланаўкі. У пары з ім вылятаў капітан Ярыкаў. Супроць нашых двух знішчальнікаў вялі бой 4 МЕ-109. З гэтага бою старшы лейтэнант Іван Мікітавіч Ізох не вярнуўся...

М. Захараў.

Баявы шлях Міхаіла Буцанца

Ён апрануў форму салдата ў 1939 г. Вестка аб нападзе фашысцкай Германіі на нашу Радзіму застала яго ў горадзе Лібава, і ў першы ж дзень ён прыняў баявое «хрышчэнне»: давялося знішчаць нямецкіх дэсантнікаў, спазнаць радасць першай перамогі над ворагам. І хоць потым апякала сэрца горыч адступлення, але кожны быў упэўнены, што гітлераўская армія не такая ўжо і непераможная, як пра гэта на ўвесь свет трубіла гебельсаўская прапаганда.

Камандзір кулямётнага аддзялення Мікалай Буцанец разам з таварышамі ў баях пад Нарвай адбіў не адну атаку ворагаў. Тут быў паранены разрыўной куляй у правую руку. Пасля шпіталя рана загаілася. І зноў бой, на гэты раз пад Таржком. Даводзілася адбіваць у дзень па 5—6 атак праціўніка. У час адной з іх быў пашкоджаны кулямёт. Тады Буцанец падняў воінаў у рукапашны бой, і яны перамаглі. За гэты бой камандзір кулямётчыкаў атрымаў першую баявую ўзнагароду — медаль «За адвагу».

Мікалай Васілевіч у другі раз быў паранены. Падлячыўся і зноў на фронт — вызваляць Малдавію. Мікалая Буцанца прызначылі камандзірам узвода. Непадалёку ад Кішынёва загінуў камандзір роты, тады Буцанец прыняў камандаванне і павёў роту ў бой. Воіны дзейнічалі імкліва, захапілі дзве батарэі праціўніка. За гэты бой Мікалай Васілевіч быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Потым былі баі на тэрыторыі Румыніі, Балгарыі. У адной з атак чырвонаармейцы пад камандаваннем Буцанца захапілі варожы дзот, за што яго ўзнагародзілі ордэнам Айчыннай вайны I ступені, а за ўзяцце горада Брно — такім жа ордэнам II ступені. Другі ордэн Чырвонай Зоркі Буцанцу ўручылі за мужнасць у баях на тэрыторыі Венгрыі, а трэці — за вызваленне Вены. У гэтым горадзе савецкія воіны захапілі пяціпавярховы дом, але не паспелі ачысціць трэці, чацвёрты і пяты паверхі, як гітлераўцы ўварваліся на першы. Узвод аказаўся ў пастцы, але і з гэтай складанай сітуацыі воіны выйшлі пераможцамі.

Пасля заканчэння баёў на Захадзе давялося ваяваць з японскімі самураямі на Далёкім Усходзе: з баямі дайшоў Мікалай Буцанец да Порт-Артура. Пасля вайны працаваў на радзіме ў калгасе «Савецкая Беларусь».

А. Дземідзенка.

Распісаўся на рэйхстагу

Да вайны Патап Лукіч Доўгі працаваў настаўнікам. У канцы 1939 г. яго прызвалі на службу ў Чырвоную Армію. У хуткім часе закончыў Смаленскую палкавую школу, стаў камандзірам кулямётнага разліку. Прымаў удзел у баях з белафінамі. У жніўні 1941 г. яму прысвоілі воінскае званне малодшага лейтэнанта. Маладому камандзіру давялося вадзіць байцоў у бой пад Ленінградам, адбіваць па некалькі атак фашыстаў на дзень.

Пасля прарыву блакады горада на Няве Патап Лукіч у складзе 1-га Беларускага фронту ўдзельнічаў у вызваленні Польшчы, з баямі дайшоў да Берліна. Асабліва запомніўся бой пры фарсіраванні р. Одэр у красавіку 1945 г. Здарылася так, што ён замяніў камандзіра батальёна і прыняў камандаванне на сябе. У незвычайна цяжкіх умовах байцы пераправіліся цераз раку, замацаваліся на беразе і забяспечылі пераправу іншым часцям. За гэтую аперацыю Патап Лукіч быў узнагароджаны ордэнам Аляксандра Неўскага.

Потым батальён дайшоў да Берліна, дзе воіны распісаліся на рэйхстагу.

Тройчы перамог смерць

Пра гэты эпізод Вялікай Айчыннай вайны дапамог даведацца выпадак. Сам герой падзей ніколі і нікому не расказваў, лічыў, што нічога незвычайнага не адбылося — на вайне як на вайне.

Зоркі ўнук першым убачыў прозвішча свайго дзеда на сцягах славы мемарыяла на Мамаевым кургане. Па складах прачытаў: «Выратавалі мільёны, сябе не выратавалі», і тут жа — «лейтэнант Заяц Кірыла Фёдаравіч». Доўга і незразумела глядзеў на золата літар, потым недаверліва спытаў:

— Дзядуля, гэта ты?

Так, аказалася, што ён: сярод прозвішчаў абаронцаў Сталінграда выбіта і яго імя — чалавека, які тройчы ўваскрэс з мёртвых, пераможыў уласную смерць.

Гэту сцэну падглядзелі і змаглі зняць на плёнку кінадакументалісты «Беларусьфільма». Не арганізавалі, а менавіта падглядзелі ў час здымак на месцах былых баёў, выпадкова сустрэўшы ветэрана-пенсіянера з Клічаўскага раёна К. Зайца. Той упершыню пасля вайны прыехаў у горад на Волзе, каб пакланіцца памяці загінуўшых сяброў-аднапалчан і паказаць унуку мемарыял, які ўзведзены ўдзячнымі нашчадкамі.

...Вераснёўскай раніцай 1942 г. лейтэнанта Кірылу Зайца цяжка параніла. Байцы бачылі: разарваўся снаряд — і, як падкошаны, паваліўся ўзводны. Вырашылі, што камандзір загінуў, і адправілі родным пахавальную, якую тыя атрымалі пасля вызвалення Беларусі. Другі раз трохвугольнік без маркі са словамі «Ваш сын погиб смертью храбрых...» палявая пошта прынесла пасля таго, як у час атакі яго напаткала варожая куля. Здарылася гэта зусім недалёка ад родных мясцін. Але ўсім смярцям на злосць ён выжыў і зноў пайшоў на перадавую. І зноў цяжкае раненне, шпіталь. Выпісаўся, прыехаў дадому на пабыўку. Усё сяло збеглася паглядзець на героя, толькі і было чуваць: «З таго свету вярнуўся».

А пазней, у разгар вяселля, з'явіўся паштальён і прынёс трэцюю пахавальную на Кірылу Фёдаравіча, якую ён сам жа і атрымаў. Схаваў на памяць: доўга жыць буду, вырашыў, і ніякі фашыст не страшны, калі тройчы ўваскрасаў.

...Пра гэту гісторыю аўтары новага поўнаметражнага дакументальнага фільма «Навальнічная даль памяці» (сцэнарыст А. Вялюгін, рэжысёры В. Сукманаў і Р. Ясінскі, аператары А. Алай і А. Сіманаў) даведаліся пазней. А даведаўшыся, не змаглі не ўключыць расказ пра яе ў стужку, якую здымалі да 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Калі работа над



І. М. Ізох. К. Ф. Заяц.

карцінай ужо завяршылася, удалося зняць на плёнку яшчэ адну шчаслівую падзею ў жыцці ветэрана. Праз 41 год пасля тых памятных баёў яго знайшла ўзнагарода — медаль «За абарону Сталінграда».

Р. Новікаў.

Бамбіў Берлін у 1941

Блакітнае неба вабіла Міхаіла Акуліча. І ён вельмі радаваўся, калі ў 1941 паступіў у авіятэхнічную школу. Не думаў, не гадаў, што неба стане арэнай жорсткіх баёў. Але ж здарылася менавіта так. У самы разгар вайны гвардыі старшага сяржанта Акуліча накіравалі ў экіпаж штурмавіка паветраным стралком.

Вылет за вылетам рабіў экіпаж. І хоць яго і іншыя баявыя машыны суправаджаліся нашымі знішчальнікамі, даводзілася сустракацца з ворагам у небе. І тут ад Міхаіла Пятровіча залежала многае. Пасля яго трапных стрэлаў шмат фашысцкіх самалётаў было збіта. І яшчэ ў пачатку вайны ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Аднойчы, калі фашысцкія захопнікі былі непадалёку ад Масквы, экіпаж атрымаў важнае ўрадавае заданне — зрабіць вылет на бамбёжку Берліна. Выдатнае ўменне і веданне сваёй справы тады паказалі нашы авіятары. Мусіць, не чакалі фашысты, што ў той час, калі ў небяспецы Масква, над Берлінам з'явяцца савецкія самалёты. А яны з'явіліся і прынялі ворагу адчувальныя страты. Неўзабаве Міхаілу Акулічу давялося прыняць удзел у другім такім жа рэйсе на Берлін. Ён таксама тады пачынаўся ад Масквы.

Пазней, калі фронт адкаціўся ад Масквы, экіпаж самалёта атрымаў заданне на знішчэнне ворага ў Оршы. Там савецкія авіятары разбамбілі варожы аэрадром.

М. П. Акуліч.

Але здарылася так, што фашысцкі знішчальнік перабіў антэну і самалёт страціў сувязь з аэрадромам, збіўся з курсу. Было гэта ў начны час, таму авіятары, далёка адляцеўшы ад лініі фронту ў свой тыл, прызямліліся, як кажуць лётчыкі, «на пуза». Самалёт хутка адрамантавалі — і зноў у неба, зноў баявыя вылеты. Камандзір экіпажа гвардыі маёр Аляксандр Ніканораў стаў сапраўдным майстрам начных палётаў. Аднойчы яму было даручана даставіць боепрыпасы клічаўскім партызанам. Гэтае даручэнне было выканана дакладна.

Усяго Міхаіл Пятровіч Акуліч у складзе гераічнага экіпажа ўдзельнічаў у 198 баявых вылетах. Ён узнагароджаны таксама ордэнам Айчыннай вайны, многімі медалямі, атрымаў 11 падзяк Вярхоўнага Галоўнакамандуючага.

Прысягаў жыццём

У нядзелю 22 чэрвеня 1941 г. ў танкавай часці, дзе служыў Мікалай Булойчык з в. Куцін, намячалася вялікая ўрачыстасць — прыняцце ваеннай прысягі. Але свята не адбылося... Раніцай іх паднялі па трывозе. У свядомасць салдат уварвалася слова «вайна».

Грозныя баявыя машыны спешна мчалі да Харкава. А праз некалькі дзён танкавая часць выйшла на перадавую. На гэтым участку фронту варожыя сілы былі намнога большыя за нашы. Стаялі насмерць. Пакуль прыйшло падмацаванне, брыгада страціла шмат людзей і баявых машын. І зразумеў тады салдат Мікалай Булойчык, што не такі ўжо і моцны вораг, як выхваляўся. Цаной свайго жыцця воіны брыгады не дазволілі чужынцам зрабіць ні кроку наперад.

Брыгада перафарміроўвалася, папаўнялася тэхнікай і людзьмі ў Маскве. Прымалі прысягу на Краснай плошчы без асаблівых урачыстасцей. І адразу на фронт. На гэты раз танкістам давялося стрымліваць шалёную атаку гітлераўцаў пад Белай Царквой. Некалькі нашых танкаў згарэла, тлелі гімнасцёркі на плячах байцоў. Але брыгада выстаяла, вораг не прайшоў. За гэта Мікалай Булойчык атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі. Потым жорсткія баі з ворагам пад Масквой, на Курскай дузе. Вызваляў Невель, Полацк. За адзін з баёў на тэрыторыі роднай Беларусі ён атрымаў другі ордэн Чырвонай Зоркі. Баявыя дарогі прывялі ў Прыбалтыку. У час наступлення на Вільнюс Мікалай Булойчык быў паранены. Падлячыўся ў Асіповічах, на дзянёк завітаў у родную вёску Куцін. Потым зноў на фронт, дабіваць ворага. Нашы войскі былі ўжо за Одэрам, калі ён вярнуўся ў сваю часць. Брыгада наступала. Варожы снарад узарваўся пад танкам, і Мікалай Булойчык застаўся без нагі. У шпіталі ён атрымаў трэці ордэн Чырвонай Зоркі. А яшчэ былі медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

Абаронца Брэсцкай крэпасці

З фотаздымка, што змешчаны ў экспазіцыі 4-й залы музея мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», дапытліва глядзіць на наведвальнікаў прыгожы хлопец у ваеннай форме. Гэта палітрук Сцяпан Цярэнцьевіч Зыскавец, адзін з гераічных удзельнікаў абароны Брэста.

З маленства зведаў Сцяпан цану хлеба і сялянскай працы. Бацька памёр рана, і застаўся ён у вялікай сям'і за галоўнага карміцеля. Давялося быць і пастухом, і малатабойцам, і цесляром. Добра ведалі юнака ў роднай вёсцы Усохі, што на Клічаўшчыне, як чалавека сумленнага, чулага і сур'ёзнага.

У дваццацігадовым узросце прызвалі Сцяпана ў Чырвоную Армію. Служыў ў Бабруйску, Мазыры, іншых гарадах Беларусі. І ўвесь час настойліва вучыўся. Пасля курсавой падрыхтоўкі быў прызначаны намеснікам камандзіра батальёна сувязі па палітчасці. На гэтай пасадзе і выявіліся выдатныя якасці маладога камісара — увага да падначаленых, імкненне падтрымаць воіна ў бядзе, дапамагчы яму захаваць душэўную раўнавагу.

Неспакойна было ў той час на рубяжах Савецкай дзяржавы. Правакацыі на Кітайска-Усходняй чыгунцы, баі каля возера Хасан, ваенны канфлікт на рацэ Халхін-Гол... Не адзін рапарт пісаў камандаванню Сцяпан з просьбай накіраваць яго туды, дзе грымела кананада, але безвынікова.

Удалося трапіць на фронт толькі ў 1939 г., калі пачаліся баявыя дзеянні супраць белафінаў. Тут ён быў паранены. Урачэбная камісія прапанавала пайсці ў запас па стане здароўя. Але Зыскавец адмовіўся. У той час, калі на Захадзе згушчаліся хмары, ён лічыў сваім абавязкам застацца ў страі. У званні палітрука ён быў прызначаны начальнікам клуба пры Брэсцкім ваенным шпіталі. Начальнік шпіталя ваенурач 2-га рангу Б. А. Маслаў, яго намеснік батальённы камісар П. С. Багацееў высока цанілі арганізатарскія здольнасці, кіпучую дзейнасць С. Ц. Зыскаўца.

Але стан яго здароўя выклікаў трывогу. Камандаванне шпіталя прапанавала палячыцца ў Сочы. «Пісьмаў сюды больш не пішыце,— паведамляў Сцяпан маці Ганне Сцяпанаўне.— Еду на курорт. Жонку і дачку Тамару адпраўляю ў Мазыр...» Толькі не ўдалося ажыццявіць задуманае. Пачалася вайна. На Валынскае ўмацаванне, дзе знаходзіўся шпіталь і жыла сям'я Зыскаўца, з першых гадзін фашысты абрушылі ўраган артылерыйскага агню. Гарэлі будынкі, гінулі хворыя. Шалёны націск фашыстаў стрымлівалі пагранічнікі, невялікая група воінаў, якія займаліся на курсах шафёраў. Узяліся за зброю медыкі, хворыя.

Палітрук Зыскавец змагаўся на ўчастку паміж хірургічным аддзяленнем і ракой Буг. Тут баі былі асабліва жорсткія. Фашысты рваліся да штаба шпіталя. Але савецкія воіны адбівалі адну атаку за адной. Радзелі рады абаронцаў. Некалькі ран атрымаў Зыскавец. Познім вечарам у непрытомнасці яго схапілі фашысты. Яны адразу ж зразумелі, што перад імі камуніст — на левым рукаве гімнасцёркі была чырвоная зорка палітрука. Камісар не прасіў літасці і дастойна прыняў смерць. У крэпасці загінулі яго пяцігадовая дачка Тамара і жонка Роза.

В. Ласковіч.

Крылаты Аляксей Вікторчык

Гэта прозвішча на Клічаўшчыне ведае, бадай, кожны: Пётр Мацвеевіч Вікторчык у час вайны быў актыўным арганізатарам партызанскага руху на тэрыторыі раёна. Аляксей — яго старэйшы сын. Перад вайной ён скончыў Тамбоўскае лётнае вучылішча грамадзянскай авіяцыі і працаваў лётчыкам у авіятрадзе ў Архангельску, абслугоўваў зімоўкі і экспедыцыі палярнікаў. Яшчэ да пачатку вайны яго адклікалі ў Ленінград, дзе фарміравалася 112-я вучэбная эскадрылля, у якую яго залічылі лётчыкам-інструктарам. Сама лётная школа знаходзілася ў г. Чарапавец. Інструктар А. П. Вікторчык падрыхтаваў 2 групы лётчыкаў. А калі школу перавялі ў Новасібірскую вобласць, напісаў рапарт з просьбай накіраваць на фронт. У маі 1942 г. яго адклікалі ў Маскву і прызначылі ў асобую паўночную авіягрупу Ленінградскага фронту. Удзельнічаў у абароне Ленінграда і ў прарыве блакады. Давялося зрабіць шмат вылетаў па дастаўцы ў блакіраваны Ленінград прадуктаў харчавання, медыкаментаў, боепрыпасаў, а з горада вывозіць дзяцей і хворых.

У складзе 17-га начнога бамбардзіровачнага авіяпалка ўдзельнічаў у баях на Курскай дузе. У час бітвы за Маскву полк, дзе служыў А. П. Вікторчык, дыслацыраваўся пад Вязьмай, адкуль рабіліся баявыя вылеты на Смаленска-Рослаўскім напрамку, бамбілі нямецкія аэрадромы, эшалоны ў Ельні, Смаленску, Дарагабужы, Оршы, Асіповічах, Бабруйску і інш.

Калі нашы часці выйшлі да р. Проня, полк перабазіраваўся пад Віцебск для падтрымкі войск 3-га Беларускага фронту. У красавіку 1944 г. А. П. Вікторчыка накіравалі ў 49-ы Чырванасцяжны Гродзенскі знішчальны авіяполк, у складзе якога ён вызваляў Варшаву.

У Вялікую Айчынную вайну Аляксею Вікторчыку давялося ваяваць на Ленінградскім, Волхаўскім, Цэнтральным, Заходнім і 2-м і 3-м Беларускіх франтах. Двойчы быў паранены, у яго целе застаўся з вайны 21 асколак, 15 з іх атрымаў у баях пры вызваленні роднай Магілёўшчыны і Мінска, астатнія 6 — пад Варшавай. Тады лічылі, што ён загінуў, адправілі паведамленне бацьку, але Аляксей быў жывы. Яго падабралі нашы танкісты і адправілі на лячэнне ў шпіталь на Урал, дзе ён і сустрэў дзень Перамогі.

Т. М. Касцюкевіч.

Танкіст Іван Сокалаў

Ёсць пра што ўспомніць былому танкісту Івану Юр'евічу Сокалаву з в. Канстантоў. У 1940 г. служыў на граніцы. Першае баявое хрышчэнне атрымаў у г. Алітус у Літве. Удзельнічаў у баях пад Масквой, адсюль гнаў гітлераўцаў на сваім танку да Берліна. Першую ўзнагароду — ордэн Чырвонай Зоркі атрымаў пры разгроме Корсунь-Шаўчэнкаўскай групоўкі ворага. У гэтым баі Іван Юр'евіч знішчыў тры варожыя танкі. Вызначыўся яго экіпаж і пры вызваленні Варшавы. За мужнасць у гэтым баі ён узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і ордэнам Славы III ступені. У адным з баёў на тэрыторыі фашысцкай Германіі нямецкі браняпоезд не дазваляў савецкім воінам разгортваць наступленне. І тут Сокалаў вывеў свой танк на прамую наводку. Ад трапных гарматных стрэлаў браняпоезд загарэўся. За гэта Іван Юр'евіч атрымаў яшчэ адну вышэйшую салдацкую ўзнагароду — ордэн Славы II ступені.

Ад Масквы да Берліна

ГРЫШАНОВІЧ Іосіф Дзмітрыевіч, нар. ў 1907, партызан, загінуў 23.9.1942, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

ГУРЛО Мацвей Гаўрылавіч, нар. ў 1917, расстраляны ў 1942.

ГУРЛО Сцяпан Гаўрылавіч, нар. ў 1909, расстраляны ў 1942.

ДУБОВІК Мікалай Сцяпанавіч, нар. ў 1926, партызан 278-га асобнага атрада, загінуў 12.1.1944, пахаваны ў в. Любічы.

ЖЛУКТА Ермалай Сцяпанавіч, нар. ў 1900, партызан, загінуў 23.9.1942, пахаваны ў в. Любічы.

ЖЛУКТО Іван Ануфрыевіч, нар. ў 1912, загінуў у 1942 пры самаабароне.

ЖЛУКТО Іван Васілевіч, нар. ў 1900, партызан, загінуў 20.3.1942 у час разгрому нямецкага гарнізона ў Клічаве, пахаваны ў в. Канстантоў.

КАЛЕСНІК Аляксей Ігнатавіч, нар. ў 1916, загінуў у 1944.

КАНОЙКА Іван Макаравіч, нар. ў 1906, камандзір аддзялення партызанскага атрада, загінуў у 1942.

КАНОЙКА Мікалай Арцёмавіч, нар. ў 1911, да вайны працаваў шафёрам, партызан, загінуў 10.3.1943, пахаваны ў в. Заполле.

КАНОЙКА Мікалай Піліпавіч, нар. ў 1920, партызан, загінуў у 1943.

КОГАН Ізраіль Юр'евіч, нар. ў 1912, загінуў 6.2.1943, пахаваны ў в. Заполле.

КУШНЕР Міхаіл Восіпавіч, нар. ў 1922, партызан, загінуў у верасні 1942, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

МАРКОЎСКІ Васіль Фёдаравіч, нар. ў 1922, партызан, загінуў 31.12.1943.

ПІРОЖНІК Васіль Клімавіч, нар. ў 1918, камандзір аддзялення 277-га партызанскага палка, загінуў 10.11.1943, пахаваны ў в. Люціна.

САЗАНАВЕЦ Вера Іванаўна, нар. ў 1927, вывезена ў 1943 ў Германію, адкуль не вярнулася.

САЗАНАВЕЦ Пётр Раманавіч, нар. ў 1925, вывезены ў 1943 ў Германію, далейшы лёс невядомы.

СУШКО Антон Сяргеевіч, нар. ў 1912, расстраляны ў 1942.

СУШКО Віктар Мікітавіч, нар. ў 1910, ст. лейтэнант, загінуў у 1942 пры самаабароне.

СУШКО Даніла Сяргеевіч, нар. ў 1918, загінуў у 1942.

СУШКО Іван Мікітавіч, нар. ў 1905, партызан, загінуў 23.9.1942, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

СУШКО Міхаіл Цімафеевіч, нар. ў 1919, партызан, загінуў у ліпені 1942, пахаваны ў в. Бярозава Балота.

СУШКО Цімафей Мікітавіч, нар. ў 1916, загінуў у 1943.

ВЁСКА ЗАРЭЧЧА

АРЦІМОВІЧ Яфім Якаўлевіч, нар. ў 1912, сакратар райкома партыі ў Зах. Беларусі, партызан, павешаны ў 1943 у Клічаве.

БЕЛАКУРСКІ Пётр Прохаравіч, нар. ў 1920, партызан, загінуў у 1942 у в. Зарэчча.

БЕЛАКУРСКІ Рыгор Прохаравіч, нар. ў 1912, партызан, загінуў у 1942 у в. Усохі.

ВЕРНІКОЎСКІ Франц Віктаравіч, нар. ў 1910, партызан, загінуў у жніўні 1942, пахаваны ў в. Усакіна, яго сям'ю расстралялі ў 1943.

ЛОМАЎЦАЎ Іван, партызан 620-га асобнага атрада імя Чапаева, затым 115-га асобнага атрада, загінуў у 1944.

ЛОМАЎЦАЎ Уладзімір Іванавіч, партызан

В. К. Пірожнік.

З. П. Баразна.

І. З. Баразна.

М. З. Баразна.

М. З. Баразна.

620-га асобнага атрада імя Чапаева, загінуў у 1942 у в. Цераболь разам з сынам дашкольнага ўзросту.

МАКСІМОВІЧ Пётр Карпавіч, нар. ў 1891, да вайны працаваў на спіртзаводзе, партызан, загінуў у в. Бацэвічы.

ПІРОЖНІК Наталля Пракопаўна, нар. ў 1917, партызанка, загінула ў красавіку 1942.

ТАРЭЛКА Юстына Цярэнцьеўна, нар. ў 1918, расстраляна ў 1943.

ФІЛОНЧЫК Уладзімір Іванавіч, нар. ў 1912.

ЯСКЕВІЧ Вольга Цярэнцьеўна, нар. ў 1908.

ЯСКЕВІЧ Надзея Харытонаўна, нар. ў 1923, да вайны працавала медсястрой у Слоніме, партызанка 277-га атрада, загінула ў 1943.

ЯСКЕВІЧ Фёдар Цярэнцьевіч, нар. ў 1910, да вайны працаваў старшынёй калгаса, расстраляны ў 1943.

ВЁСКА ЛЮБІЧЫ

БАРАЗНА Захар Паўлавіч, нар. ў 1882, расстраляны 12.2.1943 за сувязь з партызанамі.

БАРАЗНА Іван Захаравіч, нар. ў 1907, расстраляны 12.2.1943 за сувязь з партызанамі.

БАРАЗНА Марыя Захараўна, нар. ў 1912, расстраляна восенню 1943 за сувязь з партызанамі.

БАРАЗНА Міхаіл Захаравіч, нар. ў 1921, расстраляны 12.2.1943 за сувязь з партызанамі.

БАРАЗНА Пётр Якаўлевіч, нар. ў 1927, быў вывезены ў Германію, загінуў у г. Кёльн.

НОВІКАВЫ, расстраляны ў 1943 як партызанская сям'я.

ВЁСКА ЛЮЦІНА

АНАНІЧ Андрэй Іванавіч, нар. ў 1889, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Антон Самуілавіч, нар. ў 1914, расстраляны ў г. Асіповічы.

АНАНІЧ Васіль Мікавіч, нар. ў 1879, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Васіль Трафімавіч, нар. ў 1902, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Васіль Цімафеевіч, нар. ў 1896, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Ганна Раманаўна, нар. ў 1915, загінула ў 1942 у час бамбёжкі.

АНАНІЧ Герасім Адамавіч, нар. ў 1892, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Даніла Давыдавіч, нар. ў 1892, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Дзмітрый Іванавіч, нар. ў 1917, загінуў у 1942 пры самаабароне.

АНАНІЧ Захар Мікітавіч, нар. ў 1878, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Іван Пятровіч, нар. ў 1925, партызан, загінуў 6.6.1944, пахаваны ў в. Дзмітраўка.

АНАНІЧ Іван Рыгоравіч, нар. ў 1917, загінуў у 1942 пры самаабароне.

АНАНІЧ Іван Трафімавіч, нар. ў 1925, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Ігнат Дзянісавіч, партызан 277-га атрада, загінуў 16.11.1942.

АНАНІЧ Ігнат Сымонавіч, нар. ў 1899, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Кацярына Фёдараўна, нар. ў 1892, спалена ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Лукаш Фядосавіч, нар. ў 1902, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Малання Майсееўна, нар. ў 1904, расстраляна ў Асіповічах.

АНАНІЧ Марыя Іванаўна, нар. ў 1924, спалена ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Марыя Мікалаеўна, нар. ў 1940, спалена ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Мікалай Яфімавіч, нар. ў 1901, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Міхаіл Захаравіч, нар. ў 1918, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Міхаіл Пятровіч, нар. ў 1928, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Міхаіл Сямёнавіч, нар. ў 1892, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Надзея Еўдакімаўна, нар. ў 1906, расстраляна ў в. Вязэе Асіповіцкага р-на.

АНАНІЧ Надзея Майсееўна, нар. ў 1925, партызанка, памерла ад тыфу ў чэрвені 1943, пахавана ў в. Усакіна.

АНАНІЧ Наталля Пятроўна, нар. ў 1914, спалена ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Ніна Мікалаеўна, нар. ў 1937, спалена ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Патап Лявонавіч, нар. ў 1902, спалены ў 1942 у будынку школы.

В. Т. Ананіч.

Ф. І. Ананіч.



Я. С. Ананіч.

І. Г. Галацэвіч.

АНАНІЧ Пётр Адамавіч, нар. ў 1901, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Пётр Іванавіч, нар. ў 1888, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Пётр Мікалаевіч, нар. ў 1885, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Пракоп Давыдавіч, нар. ў 1894, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Раман Лявонавіч, нар. ў 1894, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Раман Мінавіч, нар. ў 1882, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Рыгор Піліпавіч, нар. ў 1912, сувязны партызанскага атрада, загінуў 16.6. 1942.

АНАНІЧ Рыгор Фаміч, нар. ў 1904, партызан 277-га атрада, загінуў 16.11.1942.

АНАНІЧ Сцяпан Антонавіч, нар. ў 1908, спалены 6.4.1942.

АНАНІЧ Сцяпан Іванавіч, нар. ў 1888, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Сцяпан Мікітавіч, нар. ў 1862, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Сяргей Савельевіч, нар. ў 1889, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Сяргей Яфімавіч, нар. ў 1902, расстраляны ў Асіповічах.

АНАНІЧ Сяргей Яфімавіч, нар. ў 1904, сувязны партызанскага атрада, загінуў 16.11. 1942.

АНАНІЧ Трафім Дзям'янавіч, нар. ў 1882, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Улас Мінавіч, нар. ў 1880, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Трафім Іванавіч, нар. ў 1889, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Трафім Сямёнавіч, нар. ў 1888, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Фёдар Іванавіч, нар. ў 1905, партызан, закатаваны фашыстамі ў 1943 у Клічаве.

АНАНІЧ Фёкла, спалена ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Фядос Арцёмавіч, нар. ў 1893, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Цімафей Віктаравіч, нар. ў 1877, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Яўстрат Мікітавіч, нар. ў 1897, спалены ў 1942 у будынку школы.

АНАНІЧ Яўтух Сямёнавіч, нар. ў 1892, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Аляксей, юны партызан (гл. пра яго артыкул «Пакуль б'ецца сэрца»).

ГАЛАЦЭВІЧ Аляксей Рыгоравіч, нар. ў 1921, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Анастасія Герасімаўна, нар. ў 1888, спалена ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Антон Самуілавіч, нар. ў 1914, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Васіль Лаўрэнавіч, нар. ў 1902, вывезены ў Германію, дзе і загінуў.

ГАЛАЦЭВІЧ Гаўрыла Іванавіч, нар. ў 1912, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Дзмітрый Іванавіч, нар. ў 1917, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Захар Герасімавіч, нар. ў 1872, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Іван Віктаравіч, нар. ў 1892, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Іван Гаўрылавіч, нар. ў 1922, партызан, загінуў 15.3.1942, пахаваны ў в. Кавяза.

ГАЛАЦЭВІЧ Іван Кузьміч, нар. ў 1925, партызан, загінуў 22.2.1944, пахаваны ў в. Дзмітраўка.

ГАЛАЦЭВІЧ Іван Мікалаевіч, нар. ў 1888, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Іван Рыгоравіч, нар. ў 1872, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Іван Рыгоравіч, нар. ў 1917, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Іван Фёдаравіч, нар. ў 1922, партызан, загінуў 9.2.1943, пахаваны ў в. Мацевічы Бярэзінскага р-на.

ГАЛАЦЭВІЧ Ігнат Дзянісавіч, нар. ў 1924, партызан.



І. К. Галацэвіч.

П. Ц. Зіновіч.

У. П. Крыхун.

ГАЛАЦЭВІЧ Кандрат Фёдаравіч, нар. ў 1882, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Кузьма Андрэевіч, нар. ў 1880, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Лаўрэнцій Кузьміч, нар. ў 1872, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Лукаш Фёдаравіч, нар. ў 1902, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Мікалай Васілевіч, нар. ў 1902, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Мікалай Захаравіч, нар. ў 1914, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Мікалай Мінавіч, нар. ў 1888, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Мікалай Фаміч, нар. ў 1897, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Міхаіл Антонавіч, нар. ў 1937, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Міхаіл Кірылавіч, нар. ў 1940, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Настасся Герасімаўна, нар. ў 1882, загінула ў 1942.

ГАЛАЦЭВІЧ Павел Іванавіч, нар. ў 1897, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Раман Сямёнавіч, нар. ў 1879, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Рыгор Піліпавіч, нар. ў 1912, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Саўка Данілавіч, нар. ў 1888, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Стафан Іванавіч, нар. ў 1912, расстраляны ў 1942 у Асіповічах.

ГАЛАЦЭВІЧ Сцяпан Іванавіч, партызанскі сувязны.

ГАЛАЦЭВІЧ Сямён Тарасавіч, нар. ў 1913, вывезены ў Германію, дзе і загінуў.

ГАЛАЦЭВІЧ Сяргей Яфімавіч, нар. ў 1902, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Тарас Захаравіч, нар. ў 1903, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Уладзімір Майсеевіч, нар. ў 1924, партызан, загінуў 12.2.1942 у в. Мацевічы Бярэзінскага р-на.

ГАЛАЦЭВІЧ Фёдар Фёдаравіч, спалены ў 1942 у будынку школы.

ГАЛАЦЭВІЧ Фядора Юстынаўна, нар. ў 1907, загінула ў 1942 у час бамбёжкі.

ГАЛАЦЭВІЧ Фядос Кузьміч, нар. ў 1877, спалены ў 1942 у будынку школы.

ЗІНОВІЧ Павел Цярэнцьевіч, нар. ў 1902, расстраляны ў Асіповічах.

ІЛЬНЧЫК Сямён Дзямідавіч, нар. ў 1892, спалены ў 1942 у будынку школы.

КРЫХУН Кастусь Пятровіч, нар. ў 1922, спалены ў 1942 у будынку школы.

КРЫХУН Марыя Пятроўна, нар. ў 1916, працавала настаўніцай.

КРЫХУН Пётр Сямёнавіч, нар. ў 1862, спалены ў 1942 у будынку школы.

КРЫХУН Рыгор Емяльянавіч, нар. ў 1920, спалены ў 1942 у будынку школы.

КРЫХУН Уладзімір Пятровіч, нар. ў 1924, партызан, загінуў 11.1.1942 пры самаабароне.

КУЗЬМЯНКОЎ Міхаіл Уладзіміравіч, нар. ў 1902, спалены ў 1942 у будынку школы.

МАЛАТКЕВІЧ Павел, нар. ў 1901, спалены ў 1942 у будынку школы.

ПЕТРУШКЕВІЧ Ілья Міхайлавіч, нар. ў 1917, працаваў прадаўцом, загінуў у 1943 пры самаабароне.

ПЕТРУШКЕВІЧ Міхаіл Пятровіч, спалены ў 1942 у будынку школы.

ТАРЭЛКА Пётр Пракопавіч, нар. ў 1920, расстраляны ў 1942.

ТАРЭЛКА Фядосся Паўлаўна, нар. ў 1888, спалена ў 1942 у будынку школы.

ВЁСКА МАЛАЯ ВОЛЬСА

ГАРОХ Іван Яфімавіч, нар. ў 1902, партызан, загінуў 23.9.1942, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

ГАРОХ Міхаіл Пятровіч, нар. ў 1924, партызан, расстраляны ў 1942 у в. Любонічы Кіраўскага р-на.

ГАРОХ Пётр Яфімавіч, нар. ў 1909, расстраляны 23.9.1942, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

КАЛЕСНІК Міхаіл Андрэевіч, нар. ў 1921.

КРАЎЧАНКА Яфрэм Паўлавіч, нар. ў 1902, загінуў у 1942 у в. Любонічы пры самаабароне.

ЛУКАШЭВІЧ Уладзімір Іванавіч, нар. ў 1918, партызан, загінуў 28.9.1942 пры самаабароне, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

МІХАЛАП Іван Лук'янавіч, нар. ў 1914, працаваў старшынёй калгаса «VII з'езд», партызан, расстраляны ў 1942.

ПРОРВІЧ Іван Нічыпаравіч, нар. ў 1912, працаваў бухгалтарам у калгасе «VII з'езд», партызан, загінуў у 1942 у в. Люціна.

САЗАНАВЕЦ Іван Емяльянавіч, нар. ў 1901, расстраляны ў верасні 1942, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

САЗАНАВЕЦ Пракоп Емяльянавіч, нар. ў 1914, партызан 537-га атрада, прапаў без вестак у маі 1943.

ЮРКАВЕЦ Рыгор Мацвеевіч, нар. ў 1910, партызан, загінуў 23.9.1942, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

ВЁСКА НОВЫ СПОР

ЖЛУТКО Іван Андрэевіч, сувязны партызанскага атрада, расстраляны 1.11.1942.

ЖЛУТКО Рыгор Макаравіч, нар. ў 1913, партызан, загінуў у 1942, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

КУШНЕР Тарас Іванавіч, нар. ў 1922, партызан, расстраляны ў 1942 у в. Любонічы Кіраўскага р-на.

САЗАНАВЕЦ Васіль Макаравіч, нар. ў 1923, партызан, загінуў 22.7.1942 у в. Канстантоў.

ТАРЭЛКА Цімафей Мікалаевіч, нар. ў 1914, партызан, загінуў у 1942 у в. Любічы.

ВЁСКА ОРЛІНА

АНАНІЧ Васіль Максімавіч, нар. ў 1925, партызан, загінуў у 1944, пахаваны на вайсковых могілках каля в. Усакіна.

АНАНІЧ Фёдар Максімавіч, нар. ў 1922, партызанскі санітар, загінуў у 1944, пахаваны ў в. Усакіна.

ЗОРЫН Аляксей Апанасавіч, нар. ў 1928, партызан, загінуў у 1942.

ЗОРЫН Рыгор Прохаравіч, нар. ў 1907, камандзір партызанскага аддзялення, загінуў 16.2.1943, пахаваны ў в. Вялікая Старына.

ЗОРЫН Яўген Мацвеевіч, нар. ў 1928, загінуў у 1942.

ЗУБРЫЦКІ Фёдар Мікалаевіч, нар. ў 1923, партызан 277-га атрада, прапаў без вестак 6.5.1943.

КОЗЫР Іван Фёдаравіч, нар. ў 1911, працаваў загадчыкам фермы, сувязны партызанскага атрада, загінуў у сакавіку 1943.

ПІРОЖНІК Аляксандр Фёдаравіч, нар. ў 1914, камандзір аддзялення партызанскага атрада, загінуў 26.6.1943, пахаваны ў в. Хадэчын.

ПІРОЖНІК Аляксей Фёдаравіч, нар. ў 1914, партызан, загінуў у 1944.

ПІРОЖНІК Мікалай Сяргеевіч, нар. ў 1925, партызан, загінуў 13.4.1943, пахаваны ў в. Усакіна.

ПІРОЖНІК Міхаіл Дзянісавіч, нар. ў 1922, партызанскі санітар, загінуў у 1943, пахаваны ў в. Усакіна.

ПІРОЖНІКАЎ Мікалай Фёдаравіч, нар. ў 1924, партызан, загінуў 20.4.1943, пахаваны ў в. Усакіна.

РУДОЙ Рыгор Трафімавіч, нар. ў 1926, партызан 277-га палка, загінуў 28.10.1943, пахаваны ў в. Пацава Слабада Кіраўскага р-на.

РУДОЙ Фёдар Трафімавіч, нар. ў 1924, партызан, памёр ад ран 6.3.1943.

САЗАНАВЕЦ Марыя Іванаўна, нар. ў 1898, партызанка.

ЯСКЕВІЧ Уладзімір Яфімавіч, нар. ў 1910, загінуў у 1941.

ВЁСКА УСОХІ

АЎТУХОВІЧ Марк, нар. ў 1908, расстраляны ў 1943 у в. Бацэвічы.

ГАРОХ Сцепаніда Міхайлаўна, нар. ў 1908, расстраляна ў 1943 у в. Бацэвічы.

ЕРАМЕЕЎ Даніла Іванавіч, нар. ў 1923, загінуў у 1941.

ЕРАМЕЕЎ Фадзей Харытонавіч, нар. ў 1919, расстраляны ў 1942 у Магілёве.

ІВАНОЎ Фёдар, нар. ў 1895, расстраляны ў 1943 у в. Бацэвічы.

КАЗЕКА Сямён Савельевіч, нар. ў 1905, расстраляны 23.5.1943 у в. Бацэвічы.

Партызанскі сувязны

Да вайны Сямён Савельевіч Казека працаваў лесніком. Жыў з сям'ёй у вёсцы Усохі ва ўласнай хаце каля самага лесу. Ён адзін з першых уключыўся ў барацьбу з ворагам — стаў партызанскім сувязным у атрадзе, якім камандаваў Ігнат Зіноўевіч Ізох. Дом Казекі часта наведвалі партызаны. У падвале была ўстаноўлена іх рацыя, тут прымаліся зводкі Саўінфармбюро, якія Сямён Савельевіч потым распаўсюджваў сярод насельніцтва. Ён таксама наведваўся ў атрад, прыносіў важныя звесткі пра ворага.

Але гітлераўцы, як кажуць, не дрымалі: сачылі за домам Казекі, бо западозрылі яго ў сувязі з партызанамі. Некалькі разоў яны прыходзілі за ім, але не заставалі дома. Заўважыўшы сачэнне, Сямён пакінуў вёску і пайшоў у атрад.

Аднойчы майскай ноччу 1943 г. ён прыйшоў даведацца, як жыве сям'я. Яго схапілі і адвезлі ў Бацэвічы да каменданта, каб дазнацца пра месцазнаходжанне партызанскага атрада. Але дарэмна. Нягледзячы на катаванні, патрыёт не выдаў баявых таварышаў.

Калі вялі на расстрэл, ён ішоў з высока ўзнятай галавой, пагардліва, з агідай гледзячы на захопнікаў. Сямёна і яго таварышаў паставілі каля плота. Нямецкі афіцэр падышоў да партызанскага сувязнога і спытаў:

— Гаворыйт, во іст партызан? Антвортэн!

— Партызан? — перапытаў Сямён.— Ведаю. Але не шукайце іх, яны абяцалі хутка самі наведацца, каб цябе, таўстапузага чорта, павесіць на першай жа асіне.

— Бандыт! Малчаць!

У адказ Сямён плюнуў у твар афіцэру. Фашыст, як ашпараны, адскочыў у бок і злосна скамандаваў салдатам. Тыя ўскінулі аўтаматы. Так загінуў партызанскі сувязны Сямён Савельевіч Казека.

С. Зыскавец.

КАСЦЯН Васіль Фёдаравіч, нар. ў 1910.

КАСЦЯН Галіна Фёдараўна, нар. ў 1913, расстраляна ў 1943 у в. Бацэвічы.

КАСЦЯН Ганна Фёдараўна, нар. ў 1916, расстраляна ў 1944 у г. п. Кіраўск.

КАСЦЯН Іван Апанасавіч, нар. ў 1900, расстраляны ў маі 1943 у в. Бацэвічы.

КАСЦЯН Іван Міхайлавіч, нар. ў 1887, расстраляны ў 1944 у г. п. Кіраўск.

КАСЦЯН Іван Фёдаравіч, нар. ў 1920, расстраляны ў 1942 у Магілёве.

КАСЦЯН Ігнат Сяргеевіч, нар. ў 1922, расстраляны 23.5.1943 у в. Бацэвічы.

КАСЦЯН Сцепаніда Міхайлаўна, сувязная, загінула 20.2.1942.

КАСЦЯН Сямён Герасімавіч, нар. ў 1901, загінуў у 1942.

КАСЦЯН Юрый Сямёнавіч, нар. ў 1895, партызан, загінуў 6.5.1944.

КАСЦЯН Яўсей Фёдаравіч, нар. ў 1902, партызан, загінуў 17.5.1943, пахаваны ў в. Бацэвічы.

КРЫХУН Марфа Купрэеўна, нар. ў 1914, загінула ў 1943.

КУЗНЯЦОЎ Апанас, расстраляны ў 1943 у в. Бацэвічы.

ПІРОЖНІК Антон Ягоравіч, нар. ў 1905, сувязны партызанскага атрада, загінуў 23.5.1943 у в. Бацэвічы.

ПІРОЖНІК Васіль Сцяпанавіч, нар. ў 1921, расстраляны ў 1943 у в. Бацэвічы.

ПІРОЖНІК Міхаіл Георгіевіч, нар. ў 1914, расстраляны ў 1943 у в. Бацэвічы.

ПІРОЖНІК Сцяпан Георгіевіч, нар. ў 1901, расстраляны ў 1943 у в. Бацэвічы.

РАЙДОЛЬФ Эдуард, загінуў у 1943.

ТАРЭЛКА Аляксей Мітрафанавіч, нар. ў 1920, вывезены ў Германію, дзе і загінуў.

ТАРЭЛКА Аляксей Сільвестравіч, нар. ў 1910, партызан, загінуў 29.5.1943, пахаваны ў в. Бацэвічы.

Рубцы на сэрцы

Набліжалася вясна 1943 года. На пагорках ужо з'явіліся веснавыя праталіны.

— Ад зямліцы цяплом аддае,— сказаў Аляксей жонцы.— Будзем, Анюта, новую кузню майстраваць замест спаленай немчурой, час бароны ды плугі ладзіць...

І закіпела работа. Хоць і не такую ладную, як старая, але кузню паставілі...

Каваля адарваў ад працы прарэзлівы жаночы крык: «За што, паночкі, адпусціце!» Аляксей убачыў на парозе кузні паліцэйскага са спісам у руках.

— Тарэлка Аляксей?

— Я.

— Збірайся, сволач!

Аляксей пакінуў распаленае жалеза ў горне, не паспеўшы прыладзіць лемех да плуга, на якім заўтра мог бы араць зямлю, і вымушаны быў пайсці пад канвоем па вуліцы роднай вёскі. Яго прывялі да школы, дзе стаяла машына. Двое гітлераўцаў штурхнулі каваля ў праём дзвярэй машыны. Тут ужо былі аднавяскоўцы Апанас Кузняцоў, Антон Пірожнік, Марк Аўтуховіч і іншыя. У той жудасны дзень за сувязь з партызанамі фашысты арыштавалі 16 чалавек і прывезлі ў камендатуру вёскі Бацэвічы.

Аднаго за адным выклікалі на допыт, адтуль пакалечаныя целы шпурлялі ў камеру. Наступіла чарга Аляксея.

— А вось і яшчэ адзін партызан.

Каваль пазнаў раз'юшанага бургамістра Касцяна, па мянушцы Канавал. Тут жа за сталом сядзелі нямецкі палкоўнік і здраднікі Чмара і Ананіч. Рэзкі ўдар збіў Аляксея з ног. Толькі пырснулі ў вачах і разляцеліся іскры, нібы ў кузні нехта стукнуў молатам па разагрэтым кавалку жалеза. Сабраўся з сіламі, устаў.

— Ты мушку прыпаяў? — Касцян тыцнуў вінтоўкай у залыты крывёю твар.— Зараз ты будзеш гаваркі.

У кабінет зайшоў паліцэйскі. Аляксей прызнаў у ім чалавека, які зусім нядаўна прывозіў у кузню на рамонт зброю. Тады яны разам рамантавалі і гармату.

Катавалі іх два тыдні. Білі да непрытомнасці.

— У тую апошнюю раніцу мне дазволілі перадаць мужу яду,— успамінае Марыля Пірожнік.— Жудасна было на іх глядзець. Былі да таго збітыя, што і ад ежы адмаўляліся. Ведалі ўжо, што растраляюць. Мой Антон вынес мне дакументы, вопратку,— Марыля Пірожнік на хвіліну змоўкла, выцерла слёзы, цяжка ўздыхнула.— Дзень і ноч прасядзела я з бацэвіцкімі бабамі ў склепе. Пільнавалі, калі будуць весці. Калі вывелі, хацела пабегчы, засланіць сваім целам. Але стрымалі бабы, не пусцілі. 23 мая 1943 года ў 11 гадзін раніцы іх расстралялі.

М. Ягела.

ТАРЭЛКА Мітрафан Антонавіч, нар. ў 1890, загінуў у 1943.

ТАРЭЛКА Рыгор Анісімавіч, нар. ў 1905, загінуў у 1944.

ТАРЭЛКА Фядора Фёдараўна, нар. ў 1908, расстраляна ў 1943 у в. Бацэвічы.

ШЭЛЕГ Міхаіл Венядзіктавіч, расстраляны ў 1943 у в. Бацэвічы.

ЯГЕЛА Праскоўя Іванаўна, нар. ў 1915, вывезена ў Германію, дзе і загінула.

ЯГЕЛА Сцяпан Дзянісавіч, нар. ў 1874, расстраляны ў 1944.

ВЁСКА ЧЫРВОНАЯ НІВА

ВАРОНІЧ Ганна Васілеўна, нар. ў 1910, расстраляна ў 1943.

ВАРОНІЧ Іван Іванавіч, нар. ў 1928, расстраляны ў 1943.

ВАРОНІЧ Харытон Васілевіч, нар. ў 1890, расстраляны ў 1943.

ГАЙДУН Андрэй Якаўлевіч, партызан.

ГАЛАЦЭВІЧ Іван Паўлавіч, нар. ў 1924, партызан, загінуў 5.5.1942, пахаваны ў в. Асінаўка.

ГАЛАЦЭВІЧ Раман, нар. ў 1910, партызан.

ГАЛАЦЭВІЧ Уладзімір Акулавіч, нар. ў

А. С. Тарэлка.

І. Е. Маркаў.

І. Е. Сушко.

Ю. К. Маркаў.

1918, сувязны партызанскага атрада, загінуў у студзені 1942.

ПІРОЖНІК Аляксей Іванавіч, нар. ў 1914, партызан, расстраляны ў 1942.

ПІРОЖНІК Мікалай Раманавіч, нар. ў 1914, партызан, расстраляны ў снежні 1942.

ПІРОЖНІК Міхаіл Якаўлевіч, нар. ў 1923, сувязны партызанскага атрада, памёр ад ран у 1944.

ПРЫБЫЛЬСКІ Георгій Кузьміч, нар. ў 1910, ветфельчар, партызан, загінуў 10.4.1943, пахаваны ў в. Аннаўка Рагачоўскага р-на.

РУДОЙ Аляксей Іванавіч, нар. ў 1920, партызан, загінуў у 1943.

ЯСКЕВІЧ Пётр Іосіфавіч, нар. ў 1908, памочнік камандзіра роты партызанскага атрада, загінуў 2.6.1944.

ВЁСКА ЧЫРВОНЫ БЕРАГ

МАРКАЎ Іван Еўдакімавіч, нар. ў 1915, партызан, загінуў 10.2.1943 у разведцы каля в. Мачаск Бярэзінскага р-на, пахаваны ў брацкай магіле ў в. Бацэвічы.

ВЁСКА ЮЗАФІН

АЎСЯНІК Пётр Іванавіч, нар. ў 1920, расстраляны 23.9.1942 у в. Любонічы Кіраўскага р-на.

ЖЛУКТА Яўген Архіпавіч, нар. ў 1925, расстраляны 23.9.1942, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

КАНОЙКА Архіп Сідаравіч, нар. ў 1898, працаваў у сельсавеце, партызан, расстраляны 23.9.1942, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

КАНОЙКА Васіль Мікітавіч, нар. ў 1895, партызан, загінуў 23.9.1942, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

КАНОЙКА Міхаіл Акімавіч, нар. ў 1922, партызан, расстраляны 23.9.1942, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

САЗАНАВЕЦ Іван Гаўрылавіч, нар. ў 1924, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

САЗАНАВЕЦ Фёдар Мікітавіч, нар. ў 1911, партызан, расстраляны 23.9.1942, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

СУШКО Іван Емяльянавіч, нар. ў 1915, партызан, расстраляны 23.9.1942, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

СУШКО Ніканор Сямёнавіч, нар. ў 1924, партызан, расстраляны 23.9.1942, пахаваны ў в. Любонічы Кіраўскага р-на.

СУШКО Рыгор Міхайлавіч, нар. ў 1923, партызан, расстраляны 23.9.1942, пахаваны ў в. Любонічы, Кіраўскага р-на.

ВЁСКА ЯКІМАВА ЛЯДА

БЕЛАЗОР Макар Данілавіч, нар. ў 1919, сувязны 277-га партызанскага атрада, загінуў у ліпені 1942.

ВАЙТУСЁНАК Уладзімір Іванавіч, нар. ў 1909, партызан, загінуў 20.8.1941, пахаваны ў в. Вусце.

МАРКАЎ Юрый Кірэевіч, нар. ў 1913, загінуў у 1944.

ВІРКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВІРКАЎ

БАДУН Сямён Сямёнавіч, партызан, загінуў у 1944.

ГАЛАЦЭВІЧ Васіль Аляксеевіч, партызан, загінуў у 1942.

ГАЛАЦЭВІЧ Вольга Васілеўна, партызанка, загінула ў 1942.

КАВАЛЁЎ Павел Несцеравіч, нар. ў 1904, партызан, загінуў 6.9.1943, пахаваны ў в. Старое Сяло.

ЛАПАЦІН Васіль Мікалаевіч, нар. ў 1910, сувязны партызанскага атрада, загінуў 25.9.1943.

ЛАПАЦІН Васіль Фёдаравіч, нар. ў 1901, сувязны партызанскага атрада, загінуў у жніўні 1941.

ЛАПАЦІН Іван Мікалаевіч, нар. ў 1912, партызан.

ЛАПАЦІН Іосіф Мікалаевіч, нар. ў 1912, партызан.

ЛАПКО Мірон Іванавіч, нар. ў 1909, сувязны партызанскага атрада, загінуў у верасні 1943, пахаваны ў в. Старое Сяло.

СТРЫГУН Пётр Іванавіч, расстраляны ў чэрвені 1942.

ФЯСЬКО Мікалай Іванавіч, нар. ў 1917, сувязны партызанскага атрада, загінуў у красавіку 1942.

І. М. Лапацін.

П. І. Шарко.

І. В. Гушча.

І. К. Оргіш.

ФЯСЬКО Уладзімір Андрэевіч, партызан, загінуў у 1944.

ФЯСЬКО Уладзімір Мікалаевіч.

ШАРКО Павел Іванавіч, нар. ў 1914, да вайны працаваў настаўнікам, партызан, загінуў 11.5.1943, пахаваны ў в. Усакіна.

ВЁСКА ЕЛЬНІЦА

ФЯСЬКО Міхаіл Васілевіч, да вайны працаваў у калгасе «Прагрэс», партызан 760-й партызанскай брыгады імя М. Беразоўскага, прапаў без вестак 5.4.1944.

ВЁСКА КАЛІНАЎКА

КАЗАК Іван Самуілавіч, нар. ў 1924, загінуў у 1944.

САВАСЦІЁНАК Міхаіл Цімафеевіч, нар. ў 1911, загінуў у 1943 у час бамбёжкі.

ВЁСКА ЛЯНЁЎКА

АЛЯХНОВІЧ Іван Яфімавіч, нар. ў 1922, партызан, загінуў у 1944.

ЗЯНОВІЧ Марыя Андрэеўна, нар. ў 1924, партызанка, загінула ў 1943 у час прарыву варожай блакады ва Усакінскіх лясах.

ЗЯНОВІЧ Мікалай Андрэевіч, нар. ў 1921, загінуў у 1942 у в. Лянёўка.

ЗЯНОВІЧ Мікалай Мітрафанавіч, нар. ў 1919, партызан, загінуў у красавіку 1942.

В. М. Заяц.

М. М. Кажамякін.

КАРАЛЁК Марыя Васілеўна, нар. ў 1918, яна і яе пяцёра дзяцей загінулі ў 1943 у час прарыву варожай блакады ва Усакінскіх лясах.

МАН Ганна Іванаўна, партызанка, загінула ў 1943 у час прарыву варожай блакады ва Усакінскіх лясах.

МАН Соф'я Дзмітрыеўна, нар. ў 1944, загінула ў 1944 у час бамбёжкі.

ПІРОЖНІК Наталля Максімаўна, нар. ў 1925, загінула ў 1944 у час абстрэлу вёскі.

ПІРОЖНІК Сцяпан Мікалаевіч, загінуў у 1944 у час бамбёжкі.

САЎКО Іван Майсеевіч, нар. ў 1912, загінуў у 1944 пры спробе ўцячы з палону, пахаваны ў в. Люціна.

ФЕДАЦЕНКА Фёдар Фёдаравіч, партызан, загінуў 4.8.1942, пахаваны ў в. Коўбча.

ФЯСЬКО Міна Фёдаравіч, нар. ў 1904, расстраляны ў ліпені 1941.

ВЁСКА МІХАЛОЎ

КАЎШЫЛОЎ Мікалай Архіпавіч, нар. ў 1926, партызан 760-й партызанскай брыгады імя М. Беразоўскага, загінуў у чэрвені 1944, пахаваны ў в. Дручаны Бялыніцкага р-на.

ЛЕБЕДЗЕЎ Аляксандр Кузьміч, партызан, загінуў 23.2.1944.

ВЁСКА СТАРОЕ СЯЛО

ЖУКОВІЧ Пётр Сцяпанавіч, партызан, загінуў 2.1.1944.

РЫЖКОВІЧ Мікалай Іванавіч, нар. ў 1922, партызан, забіты 15.5.1943, пахаваны на вайсковых могілках каля в. Усакіна.

ФЯСЬКО Міхаіл Васілевіч, нар. ў 1922, партызан, прапаў без вестак 5.4.1944.

ХАРОШЧА Павел Сямёнавіч, памёр ад ран 6.6.1944, пахаваны ў Бярэзінскім р-не Мінскай вобл.

ГАНЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЛЯКСАНДРАЎКА

ГУШЧА Іван Васілевіч, нар. ў 1906, загінуў у 1942.

М. Л. Оргіш.



А. П. Цмыг.



Я. Л. Заблоцкі.

Я. М. Заблоцкі.

ВЁСКА БАБОЎКА

ХРАПКО Марфа, нар. ў 1909, закатавана фашыстамі ў 1942.

ВЁСКА БАРКІ

АЎТУХОВІЧ Мікалай Іванавіч, нар. ў 1907, расстраляны ў 1944.

АЎТУХОВІЧ Сяргей Аляксандравіч, нар. ў 1874, партызан, загінуў у сакавіку 1944.

АЎТУХОВІЧ Трафім Аляксеевіч, нар. ў 1895, расстраляны ў 1944.

ВАЛЬКЕВІЧ Марыя Ільінічна, нар. ў 1941, расстраляна ў 1944.

ВАЛЬКЕВІЧ Надзея Ільінічна, нар. ў 1890, расстраляна ў 1944.

ВАЛЬКЕВІЧ Надзея Ільінічна, нар. ў 1942, расстраляна ў 1944.

ВАЛЬКЕВІЧ Ульяна Аляксееўна, нар. ў 1880, расстраляна ў 1944.

ЖЫВІЦА Іван Ігнатавіч, нар. ў 1895, расстраляны ў 1944.

КУЗЬМІН Іван Кузьміч, нар. ў 1905, партызан, загінуў 13.5.1943, пахаваны ў в. Бярозава Балота.

КУЗЬМІН Кузьма Кірылавіч, нар. ў 1896, расстраляны ў 1944.

ЛАБАЦКАЯ Малання Пятроўна, нар. ў 1890, спалена ў 1944.

ЛАБАЦКАЯ Пелагея Пятроўна, нар. ў 1892, спалена ў 1944.

ЛАПЫЦЬКА Лукер'я Навумаўна, нар. ў 1908, расстраляна ў 1944.

ЛАПЫЦЬКА Яфім Іванавіч, нар. ў 1894, расстраляны ў 1944.

МАМАЙ Павел Фёдаравіч, нар. ў 1895, расстраляны ў 1944.

ОРГІШ Іван Кандратавіч, нар. ў 1901, расстраляны ў 1944.

ОРГІШ Марыя Лаўрэнаўна, нар. ў 1905, расстраляна ў 1944.

ОРГІШ Фама Кандратавіч, нар. ў 1907, расстраляны ў 1944.

СЕРАДЗІНСКІ Уладзімір Мікалаевіч, нар. ў 1922, партызан, прапаў без вестак 11.7.1943.

СТРЫГУН Марыя Антонаўна, нар. ў 1918, расстраляна ў 1944.

СЯКЕРСКІ Іван Аляксандравіч, нар. ў 1918, расстраляны ў 1944.

ТРАЦЭЎСКАЯ Акуліна Мартынаўна, нар. ў 1907, расстраляна ў 1944.

ТРАЦЭЎСКАЯ Валянціна Пятроўна, нар. ў 1934, расстраляна ў 1944.

ТРАЦЭЎСКІ Браніслаў Пятровіч, нар. ў 1938, расстраляны ў 1944.

ТРАЦЭЎСКІ Віктар Пятровіч, нар. ў 1936, расстраляны ў 1944.

ТРАЦЭЎСКІ Леанід Пятровіч, нар. ў 1939, расстраляны ў 1944.

УДОВЕНКА Іван Трафімавіч, нар. ў 1913, партызан, прапаў без вестак у ліпені 1943.

ЦІШКЕВІЧ Іван Максімавіч, нар. ў 1900, расстраляны ў 1944.

ЦМЫГ Аркадзь Пракопавіч, нар. ў 1922, партызан, загінуў у 1944.

ЦМЫГ Раман Кузьміч, нар. ў 1906, расстраляны ў 1944.

ЦМЫГ Якаў Аляксандравіч, нар. ў 1902, расстраляны ў 1944.

ВЁСКА ГОНЧА

АКУЛІЧ Яфім Сяргеевіч, нар. ў 1908, да вайны працаваў старшынёй калгаса, расстраляны ў 1942.

АНДРЭЕЎ Андрэй Цімафеевіч, нар. ў 1913, партызан, загінуў 12.2.1942, пахаваны ў Клічаве.

ДРЭНЬ Андрэй Андрэевіч, нар. ў 1909, загінуў у 1943.

ДРЭНЬ Дзмітрый Васілевіч, нар. ў 1905.

ЗАБЛОЦКАЯ Ганна Міхайлаўна, нар. ў 1918, расстраляна ў 1942.

ЗАБЛОЦКІ Якаў Лявонавіч, загінуў у 1942.

ЗАБЛОЦКІ Якаў Міхайлавіч, нар. ў 1918, расстраляны ў 1942.

ЗАЯЦ Васіль Маркавіч, нар. ў 1915, да вайны працаваў сакратаром сельсавета, партызан, расстраляны ў 1942.

КАЖАМЯКІН Міхаіл Майсеевіч, нар. ў 1913, партызан, загінуў 13.1.1944, пахаваны каля в. Люціна.

Урокі мужнасці

Малады настаўнік Міхаіл Кажамякін, што прыехаў выкладаць біялогію і геаграфію ў Ганчанскую школу, быў родам з Гомельшчыны. Гэта было ў 1935 г. пасля заканчэння Мінскага настаўніцкага інстытута. Адначасова з работай у школе юнак працягваў завочна вучобу ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Сярод калег у школе Міхаіл Кажамякін карыстаўся аўтарытэтам. Прадмет, які ён выкладаў, навучэнцы ведалі вельмі добра. Яго былая вучаніца, а затым настаўніца Ганчанскай школы Ніна Васілеўна Валовік часта ўспамінае Міхаіла Майсеевіча і свае ўрокі стараецца праводзіць цікава і самаддана, як калісьці праводзіў іх ён.

Не думаў, не гадаў тады Міхаіл Кажамякін, што ў хуткім часе яму гэтак жа самаахвярна давядзецца ў жыцці даваць і ўрокі мужнасці. А выйшла менавіта так.

Абзавёўшыся сям'ёй, Кажамякін разам са сваёй жонкай Марыяй Барысаўнай Краснапольскай жыў у вёсцы Гонча да самай вайны. І калі на Клічаўшчыне пачалі арганізоўвацца першыя атрады народных мсціўцаў, Міхаіл не вагаўся. Ён раздабыў зброю, патроны і ў пачатку 1942 г. прыйшоў у 277-ы партызанскі атрад, дзе і быў залічаны радавым 9-й роты 3-га батальёна.

Былы настаўнік быў на рэдкасць адважны, смелы, праяўляў кемлівасць і храбрасць, заўсёды знаходзіўся на пярэднім краі.

— Памятаецца мне такі выпадак,— расказвае былы партызан 277-га атрада Васіль Кірылавіч Валовік.— Мы грамілі варожы гарнізон у Малінаўцы, што ў Кіраўскім раёне. У гэтай аперацыі Міхаіл трымаў сябе спакойна. Ён адзін з апошніх вярнуўся з вёскі пасля бою, несучы захопленую ў ворага зброю.

Свой апошні бой Кажамякін правёў у вёсцы Люціна. У ноч на 13 студзеня 1944 г. атрад павінен быў знішчыць варожы гарнізон. Прыкладна апоўначы камандаванне пачало падбіраць найбольш смелых, адважных партызан, якім даручалася першымі ўварвацца ў логава ворага. Міхаіл Кажамякін добраахвотна пайшоў у гэту групу. Відавочцы расказваюць, што ён першы ўварваўся ў вёску і распачаў няроўны бой, але ў гэтым баі і загінуў. Таварышы па зброі пахавалі Міхаіла Кажамякіна разам з яго сябрамі на развілцы дарог каля вёскі Люціна.

М. Счыслёнак.

КАЗЛОЎСКІ Сцяпан Макаравіч, нар. ў 1888, расстраляны ў 1942.

КАРАЛЁК Васіль Сцяпанавіч, нар. ў 1914, расстраляны ў 1942.

КАРАЛЁК Фядора Якімаўна, нар. ў 1907, загінула ў 1942 у час бамбёжкі.

КРЫВАНОС Васіль Акімавіч, нар. ў 1902.

ЛАГУШКА Кацярына Харытонаўна, нар. ў 1888, расстраляна ў 1942.

ХАРЛАП Ульяна Патапаўна, нар. ў 1917, расстраляна 18.10.1941.

ШЧЭПЕТАЎ Васіль Антонавіч, нар. ў 1914, расстраляны ў 1942.

ВЁСКА ДРАНІ

ВАСІЛЬЕЎ Дзмітрый Юр'евіч, нар. ў 1904, сувязны партызанскага атрада, загінуў у снежні 1944.

ДРЭНЬ Васіль Фёдаравіч, нар. ў 1925, падарваўся на міне ў 1945.

КАРАЛЁК Іван Сяргеевіч, нар. ў 1940, забіты ў 1943, пахаваны ў в. Драні.

КАРАЛЁК Марыя Сяргееўна, нар. ў 1943, расстраляна ў 1943.

КАРАЛЁК Ніна Сяргееўна, нар. ў 1936, расстраляна ў 1943.

КАРАЛЁК Сідар Антонавіч, нар. ў 1870, расстраляны ў 1943.

КАРАЛЁК Сяргей Сцяпанавіч, нар. ў 1912, расстраляны ў 1943.

ХАРЛАП Іван Раманавіч, нар. ў 1926, забіты ў 1943.

ВЁСКА ЖЭРДЗІШЧА

АЧЫНОВІЧ Ганна Антонаўна, нар. ў 1920, расстраляна ў 1942.

ЗАЯЦ Дзмітрый Якімавіч, нар. ў 1917, расстраляны ў 1942.

ЗАЯЦ Іван Якімавіч, нар. ў 1910, сувязны партызанскага атрада, загінуў у чэрвені 1942 у Клічаве.

ЗАЯЦ Праскоўя Іванаўна, нар. ў 1910, расстраляна ў 1941.

ЗАЯЦ Раман Якімавіч, нар. ў 1910, да вайны працаваў старшынёй калгаса, расстраляны ў 1942.

ЗАЯЦ Якаў Якімавіч, нар. ў 1904, расстраляны ў 1942.

ЗАЯЦ Яфім Якімавіч, нар. ў 1917, расстраляны ў 1942.

ПРАХАРЭНКА Захар Севасцьянавіч, нар. ў 1906, расстраляны ў 1942.

ПРАХАРЭНКА Севасцьян Л., нар. ў 1887, расстраляны ў 1942.

СНІТКО Канстанцін Лазаравіч, расстраляны ў 1942.

СНІТКО Юстын, нар. ў 1920, расстраляны ў 1942.

ВЁСКА ІЖАР

САНЬКО Аляксандр, нар. ў 1900, да вайны працаваў сакратаром сельсавета, расстраляны ў 1942 у Клічаве.

ВЁСКА МАЛІННЕ

БЕЧКАЎ Пётр Аляксеевіч, нар. ў 1905 расстраляны ў 1942.

У. П. Харлап.

В. А. Шчэпетаў.

У. С. Бандарчык.

МАРОЗ Мікалай Сяргеевіч, нар. ў 1906, расстраляны ў 1942.

ШЭХ Ефрасіння Якаўлеўна, нар. ў 1919, расстраляна ў 1942.

ВЁСКА МЯЖНОЕ

БУРАКОЎСКАЯ Ганна Захараўна, нар. ў 1915, загінула ў 1942 у час бамбёжкі.

ДЗЕГЦЯРОНАК Кацярына Паўлаўна, нар. ў 1930, загінула ў 1942.

МІХНЁНАК Антон Пятровіч, нар. ў 1902, сувязны партызанскага атрада, партызан, загінуў у 1943.

ВЁСКА ПАДСТРУЖЖА

АКУЛІЧ Даніла Анісімавіч, нар. ў 1923, расстраляны ў 1941.

АКУЛІЧ Пелагея Іванаўна, нар. ў 1908, расстраляна ў 1941.

ГАРОХ Вольга Дзям'янаўна, нар. ў 1938, спалена ў 1941.

ГАРОХ Мальвіна Дзям'янаўна, нар. ў 1937, спалена ў 1941.

ГАРОХ Марыя Дзям'янаўна, нар. ў 1936, спалена ў 1941.

КУШНЕР Іосіф Еўдакімавіч, нар. ў 1890, расстраляны ў 1941.

ПІРОЖНІК Міхаіл Анісімавіч, нар. ў 1905, сувязны партызанскага атрада, расстраляны ў 1942.

ЯСКЕВІЧ Якім Канстанцінавіч, нар. ў 1895, расстраляны ў 1941.

ВЁСКА РАГІ

АЧЫНОВІЧ Міхаіл Іванавіч, нар. ў 1928, падарваўся на міне ў 1943.

БУЦАНЕЦ Міхаіл Сямёнавіч, нар. ў 1918, загінуў у 1943.

ВАЛОВІК Міхаіл Іванавіч, нар. ў 1912, загінуў у 1943 у час бамбёжкі.

КЛІНДЗЮК Васіль Піліпавіч, нар. ў 1928, падарваўся на міне ў 1943.

КЛІНДЗЮК Піліп Максімавіч, нар. ў 1898, загінуў 4.8.1942.

КЛІНДЗЮК Фёдар Іванавіч, нар. ў 1920, расстраляны ў 1942.

КУДЗІН Рыгор Фёдаравіч, нар. ў 1936.

КУДЗІНА Надзея, загінула.

ТАРАСЕВІЧ Міхаіл Мінавіч, нар. ў 1928, падарваўся на міне ў 1943.

ВЁСКА СВЁКРАВА

МАРОЗ Мікалай Васілевіч, сувязны партызанскага атрада, загінуў 6.12.1941.

ВЁСКА СЫМАНАЎКА

МАСЛАВА Ганна Пракопаўна, нар. ў 1928, расстраляна ў 1944.

МІХАЛАП Домна Фёдараўна, нар. ў 1907, расстраляна ў 1944.

ВЁСКА ТАЧЫШЧА

МАЦЮШОНАК Пётр Іванавіч, нар. ў 1926, загінуў у партызанскім атрадзе.

УСЦІНЧЫК Канстанцін Лазаравіч, нар. ў 1919, загінуў у 1943 у час бамбёжкі.

УСЦІНЧЫК Ларыён Канстанцінавіч, нар. ў 1919, загінуў у 1944 у час бамбёжкі.

ЧОРНАЯ Ганна Пятроўна, нар. ў 1914, расстраляна.

ЧОРНЫ Іван Сямёнавіч, нар. ў 1936, расстраляны.

ВЁСКА УБАЛАЦЦЕ

БАНДАРЧЫК Праскоўя Рыгораўна, нар. ў 1897, спалена ў 1944.

БАНДАРЧЫК Ульяна Сяргееўна, нар. ў 1919, сувязная партызанскага атрада, загінула ў ліпені 1942.

Не забыта — жыве гераічная быль

Некалі тут на дзесяткі вёрст цягнулася непралазная твань — Ласінае балота. Але прыйшлі на гэта балота людзі, і на беразе рачулкі-змейкі вырас першы домік, другі, трэці, і паўстаў сярод балота пасёлак лесарубаў — Убалацце. Тут у 30-я гады ў розных сем'ях і нарадзіліся дзяўчынкі: Ульяна Бандарчык і Надзя Сай. Лёс і

юнацтва ў іх былі падобныя: абедзве рана засталіся без бацькоў, абедзве марылі стаць педагогамі. Розніца была толькі ў тым, што чарнявая Уля любіла на вечарынах спяваць з сяброўкамі ці стрымгалоў пусціцца ў іскрамётны танец, а светлавалосая, не вельмі гаваркая Надзя брала гітару і моўчкі, сам-насам аддавалася музыцы.

Вайна застала Надзю ў Мінску, дзе яна вучылася, а Ульяну дома, куды яна толькі што вярнулася пасля заканчэння інстытута ў Гомелі. Навала вайны дасягнула і маленькай вёсачкі Убалацце. Здавалася, замерла жыццё. Не спявалі па вечарах дзяўчаты, нават не высыпала на вясковую вуліцу гаманлівая дзетвара.

З усіх бакоў прыходзілі жудасныя навіны. Неяк Надзі давялося пабыць на Кіраўшчыне ў вёсцы Боркі, дзе гітлераўцы ўчынілі крывавую расправу над мірным насельніцтвам. Пра гэта яна расказала дома і сваёй сяброўцы Ульяне. І яны прынялі рашэнне — змагацца.

Чэрвеньскім вечарам 1942 г. яны разам з аднавяскоўцам Іванам Хвашчэўскім прыйшлі ў партызанскі атрад № 277, які размяшчаўся ў вёсцы Бярозавае Балота. Іх залічылі ва ўзвод разведкі.

Першым заданнем было наладзіць сувязь з 5-й партызанскай ротай. Апрануўшыся ў сялянскае адзенне, Ульяна адправілася ў суседні Кіраўскі раён. Начавала ў лесе. А на досвітку — зноў у дарогу.

Недзе тут, зусім недалёка ад бальшака, яе родная вёска. Нахлынулі ўспаміны пра дзяцінства, вучобу ў школе...

І раптам як з-пад зямлі выраслі постаці гітлераўцаў. Абшукалі дзяўчыну і, нічога не знайшоўшы, загадалі ісці з імі. Ульяна стала тлумачыць, што заблудзілася і ніяк не знойдзе дарогі дадому. І так шчыра расплакалася, што гітлераўцы паверылі ёй і адпусцілі. А праз гадзіну-другую разведчыца, паспяхова выканаўшы заданне, вярталася ў атрад.

У другі раз Ульяна ўзялася разведаць пра жывую сілу і ваенную тэхніку гарнізона ў вёсцы Гарадзец. Нямецкаму вартавому яна мімікай і жэстамі растлумачыла, што шукае карову, якая ўцякла. Той прапусціў яе ў вёску, а затым і назад.

Калі карнікі рыхтаваліся блакіраваць партызанскія лясы, у вёску Перасопню наехала шмат немцаў. Партызаны вырашылі ўдакладніць намеры гэтай блакады. Надзя і Ульяна са згоды камандавання пайшлі на чарговае заданне разам. Праз пэўны час яны павінны вярнуцца на ўмоўленае месца. Але...

На вясковай вуліцы разведчыц затрымалі фашысты: іх пазнаў і выдаў знаёмы паліцай.

...Збітыя і акрываўленыя стаялі яны перад нямецкім афіцэрам, які дамагаўся атрымаць дакладныя звесткі пра партызанскі атрад. Але дзяўчаты маўчалі. Іх зноў білі. Яны маўчалі і тады, калі ім прыціскалі дзвярамі пальцы, калі пад пазногці заганялі іголкі, калі выкручвалі і ламалі рукі, выбівалі зубы...

Ліпеньскай раніцай, калі над зямлёй яшчэ не развеяўся начны туман, гітлераўцы пакінулі вёску. Змучаных дзяўчат яны ўзялі з сабою. Непадалёку ад вёскі, на раздарожжы, спыніліся. Афіцэр паклікаў да сябе двух немцаў і кіўнуў галавой у бок партызанак. Дзяўчаты ўсё зразумелі і ў апошні раз акінулі позіркам звілістую стужку дарогі, лес, з-за якога павольна выплывала летняе сонца. І тут аўтаматная чарга абарвала жыццё партызанак-разведчыц, слаўных дачок Клічаўшчыны — Ульяны Бандарчык і Надзеі Сай.

М. Счыслёнак.

БАНДАРЧЫК Цімох Пятровіч, нар. ў 1893, спалены ў 1944.

БАРАН Аляксей Іванавіч, нар. ў 1890, расстраляны ў 1944.

БАРАН Віктар Іванавіч, нар. ў 1925, загінуў у 1943 у в. Баркі.

БАРАН Ганна Мацвееўна, нар. ў 1918, загінула ў 1943 у в. Баркі.

БЯЛЯЦКІ Міхаіл Арцёмавіч, нар. ў 1924, спалены ў 1943.

ГУБАРЭВІЧ Ананій Сцяпанавіч, нар. ў 1920, загінуў 23.3.1944.

КАПУСЦІН Рыгор Сямёнавіч, нар. ў 1893, расстраляны ў 1943.

КАРЧЭЎСКАЯ Марыя Архіпаўна, нар. ў 1918, працавала загадчыцай магазіна, расстраляна ў 1943 за сувязь з партызанамі.

КАРЧЭЎСКІ Архіп Сямёнавіч, нар. ў 1893, да вайны працаваў старшынёй калгаса, расстраляны ў 1943.

КРУГЛІКАЎ Мікалай Антонавіч, нар. ў 1913, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

МАНЛЕВІЧ Валянцін Мікалаевіч, нар. ў 1926, загінуў у 1943.

НАРКЕВІЧ Браніслаў Аляксандравіч, спалены ў 1944.

НОВІК Міхаіл Пятровіч, нар. ў 1900, спалены ў 1943.

ПРАКАПОВІЧ Дзяніс Андрэевіч, нар. ў 1900, да вайны працаваў сакратаром сельсавета, расстраляны ў 1942 у Клічаве.

ПРЫБЫЛЬСКІ Кузьма Пятровіч, нар. ў 1917, расстраляны ў 1942.

САЙ Надзея Аляксееўна, нар. ў 1924, да вайны вучылася ў педінстытуце, сувязная партызанскага атрада, загінула ў ліпені 1942, пахавана ў в. Убалацце (гл. пра яе ў артыкуле «Не забыта — жыве гераічная быль»).

СОБАЛЬ Акуліна Сяргееўна, нар. ў 1897, спалена ў 1944.

СОБАЛЬ Іван Акулавіч, нар. ў 1914, спалены ў 1944.

СОБАЛЬ Магдаліна Пятроўна, нар. ў 1899, спалена ў 1944.

ХАРЛАП Мікіта Аляксеевіч, нар. ў 1892, расстраляны ў 1943.

ЦМЫГ Іван Кузьміч, нар. ў 1903, партызан, загінуў 1.7.1942.

ШЛАПАК Андрэй Іванавіч, нар. ў 1910, партызан, загінуў 12.11.1942.

ВЁСКА ХАЛАДОК

ІЗОХ Вольга Сяргееўна, нар. ў 1921, расстраляна ў 1942 за сувязь з партызанамі, пахавана ў Клічаве.

ЛОБАЧ Вольга Сяргееўна, нар. ў 1919, расстраляна ў 1943 у Клічаве.

ЯКІМАВЕЦ Макар Сцяпанавіч, нар. ў 1905, сувязны партызанскага атрада, расстраляны ў 1943 у в. Заполле.

ВЁСКА ХРЭЛЕВА

АКУЛІЧ Аляксандра Паўлаўна, нар. ў 1938.

АКУЛІЧ Матруна Сяргееўна, нар. ў 1901.

АКУЛІЧ Пелагея Сямёнаўна, нар. ў 1903.

АКУЛІЧ Пётр Дзям'янавіч, нар. ў 1916, загінуў у 1943 у час бамбёжкі.

АКУЛІЧ Уладзімір Андрэевіч, нар. ў 1928, загінуў у 1943 у в. Каршукі Кіраўскага р-на.

МІХАЛАП Феня Мінаўна, нар. ў 1895.

МІХАЛАП Фядос Мікітавіч, нар. ў 1895.

НЕВЯДОМСКАЯ Зоя, нар. ў 1927, партызанка, загінула 5.5.1943.

НЕВЯДОМСКІ Іван, нар. ў 1921, партызан, загінуў 22.3.1943.

САЛАНОВІЧ Ігнат Васілевіч, нар. ў 1916, загінуў у 1944.

ХАРЛАП Аляксандр Аляксандравіч, нар. ў 1939, расстраляны ў 1943.

ХАРЛАП Варвара Навумаўна, нар. ў 1891, расстраляна ў 1943.

ХАРЛАП Васіль Ігнатавіч, нар. ў 1920, загінуў у 1944.

ХАРЛАП Ігнат Навумавіч, нар. ў 1895, загінуў у 1944.

ДОЎГАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БРЫЛЁЎКА

БАРЛЮГОЎ Аляксандр Барысавіч, нар. ў 1921, партызан, загінуў у ліпені 1944.

ГАНЧАРОВА Марыя Лук'янаўна, нар. ў 1922, расстраляна ў 1944.

ПІНЧУКОВА Александрыя Ніканаўна, нар. ў 1922, расстраляна ў 1944.

ВЁСКА ВІШНЁЎКА

КАРАЎКА Аляксандр Емяльянавіч, нар. ў 1912, працаваў кавалём у калгасе, яго жонка **КАРАЎКА Варвара Васілеўна** і трое іх дзяцей спалены ў 1942 у в. Доўгае.

КАРАЎКА Мікалай Фядосавіч, нар. ў 1921, загінуў пры выкананні баявога задання ў в. Цвёрдаў Быхаўскага р-на.

КАРАЎКА Фядос Іванавіч, нар. ў 1898, загінуў у 1943.

РАМАНОВІЧ Іван Емяльянавіч, нар. ў 1911 і яго сын Іван, 10 гадоў, расстраляны ў 1942, пахаваны ў в. Дубно.

Н. А. Сай.

ВЁСКА ДАЎЖАНКА

ГАНЧАРОЎ Іван Ніканоравіч, нар. ў 1908, расстраляны.

ГАНЧАРОЎ Іван Пятровіч, нар. ў 1924, падарваўся на міне ў 1942.

ЖУКАЎ Іван, сувязны партызанскага атрада, падарваўся на міне.

ІСЛЕЎСКАЯ Вольга Фёдараўна, нар. ў 1923, расстраляна ў 1943 за сувязь з партызанамі.

САПРУНОВА Марыя, нар. ў 1882, расстраляна ў 1943.

САПРУНОЎ Анікей Мінавіч, нар. ў 1904, расстраляны ў 1943.

САПРУНОЎ Сяргей Навумавіч, нар. ў 1890, расстраляны ў 1943.

ВЁСКА ДОЎГАЕ

ДАЙНЕКА Марыя Кузьмінічна, нар. ў 1922, спалена разам з маці ў 1942.

ДАЙНЕКА Мікалай Раманавіч, нар. ў 1922, загінуў у 1943.

КЛЕПЧА Галіна Сямёнаўна, нар. ў 1939, загінула ў 1942.

КЛЕПЧА Лілія Сямёнаўна, нар. ў 1940, загінула ў 1942.

КЛЕПЧА Сцяпан Сідаравіч, нар. ў 1914, сувязны партызанскага атрада, загінуў 14.9. 1942.

КЛЕПЧА Фядора Лаўрэнаўна, нар. ў 1870, загінула ў 1942.

КРАЎЦОЎ Нічыпар Сцяпанавіч, нар. ў 1902, да вайны працаваў старшынёй калгаса, партызан, загінуў у маі 1943.

МАНЁНАК Зоя Кузьмінічна, нар. ў 1920, спалена разам з дваімі дзецьмі.

МАРОЗ Васіль Максімавіч, нар. ў 1922, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1941.

УС Іосіф Васілевіч, нар. ў 1908, да вайны працаваў настаўнікам, расстраляны ў 1943.

ШЭХ Аляксей Сцяпанавіч, нар. ў 1915, партызан, памёр ад ран 23.6.1944, пахаваны ў Ганцавіцкім раёне.

ШЭХ Іосіф Васілевіч, нар. ў 1903, сувязны партызанскага атрада, расстраляны ў маі 1943.

ВЁСКА ДУБНО

БАРОДЗІЧ Барыс Міхайлавіч, нар. ў 1882, яго жонка Ганна, іх дачка Ганна, яе дачка Алена расстраляны ў 1942.

БАРОДЗІЧ Людміла Іванаўна, нар. ў 1938, расстраляна ў 1942.

БАРОДЗІЧ Марыя Васілеўна, нар. ў 1880, расстраляна ў 1942.

БАРОДЗІЧ Ніна Барысаўна, нар. ў 1909, расстраляна ў 1942.

БАРОДЗІЧ Сяргей Іванавіч, нар. ў 1935, расстраляны ў 1942.

ВАЗІЛА Васіль Васілевіч, сувязны партызанскага атрада.

ВАЗІЛА Васіль Сямёнавіч, нар. ў 1910, сувязны партызанскага атрада, загінуў 22.4.1942.

ВАЗІЛА Карней Міхайлавіч, нар. ў 1909, да вайны працаваў трактарыстам, забіты ў 1942 за сувязь з партызанамі.

ВАЗІЛА Соф'я Міхайлаўна, нар. ў 1920, забіта ў 1942 за сувязь з партызанамі.

ВІРШЫЦ Мікалай Аляксандравіч, нар. ў 1910, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1942.

ЖУК Дзям'ян Апанасавіч, нар. ў 1900, сувязны партызанскага атрада, расстраляны ў маі 1943.

КАЗЕЛА Васіль Васілевіч, нар. ў 1908, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1942.

КАРАЎКА Васіль Уласавіч, загінуў у 1942.

КАРАЎКА Віктар Васілевіч, нар. ў 1926, загінуў у 1942.

КАРАЎКА Віктар Васілевіч, нар. ў 1897, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1942.

КАРАЎКА Вольга Пятроўна, нар. ў 1926, загінула ў 1942.

КАРАЎКА Емяльян Міхайлавіч, нар. ў 1884, расстраляны ў 1942.

КАРАЎКА Еўдакія Васілеўна, нар. ў 1918, расстраляна ў 1942.

КАРАЎКА Іван Емяльянавіч, нар. ў 1918, партызан 61-га атрада, загінуў 8.8.1942.

КАРАЎКА Іван Кандратавіч, нар. ў 1912, загінуў у 1942.

КАРАЎКА Іван Раманавіч, нар. ў 1902, загінуў у 1942.

КАРАЎКА Іван Уласавіч, загінуў у 1942.

КАРАЎКА Кандрат Васілевіч, нар. ў 1904, працаваў на чыгунцы, загінуў у 1942.

КАРАЎКА Канстанцін Кандратавіч, нар. ў 1926, загінуў у 1942.

КАРАЎКА Лазар Васілевіч, нар. ў 1909, загінуў у 1942.

КАРАЎКА Леанід Лазаравіч, нар. ў 1930, загінуў у 1942.

КАРАЎКА Любоў Пятроўна, нар. ў 1936, загінула ў 1942.

КАРАЎКА Марыя Іванаўна, загінула ў 1942.

КАРАЎКА Марыя Пятроўна, нар. ў 1920, загінула ў 1942.

КАРАЎКА Марыя Пятроўна, нар. ў 1932, загінула ў 1942.

КАРАЎКА Марыя Цімафееўна, нар. ў 1875, загінула ў 1942.

КАРАЎКА Мікалай Фядосавіч, нар. ў 1923, партызан 61-й брыгады, загінуў 30.10.1943.

КАРАЎКА Міхаіл Пятровіч, нар. ў 1924, загінуў у 1942.

КАРАЎКА Ніна Лазараўна, нар. ў 1926, загінула ў 1942.

КАРАЎКА Ніна Пятроўна, нар. ў 1927, загінула ў 1942.

КАРАЎКА Пётр Васілевіч, нар. ў 1904, партызанскі сувязны, загінуў 8.8.1942.

КАРАЎКА Пётр Віктаравіч, нар. ў 1923, загінуў у 1942.

КАРАЎКА Пётр Лазаравіч, нар. ў 1925, загінуў у 1942.

КАРАЎКА Пётр Рыгоравіч, нар. ў 1884, загінуў у 1942.

КАРАЎКА Фёдар Іванавіч, нар. ў 1920, партызан, загінуў 17.3.1944.

КАРАЎКА Яўген Раманавіч, нар. ў 1908, загінуў у 1942.

КЛЕПЧА Галіна Сямёнаўна, нар. ў 1935, загінула ў 1942.

КЛЕПЧА Лілія Сямёнаўна, нар. ў 1937, загінула ў 1942.

КЛЕПЧА Сямён Давыдавіч, нар. ў 1904, сувязны партызанскага атрада, расстраляны ў маі 1943.

КЛЕПЧА Фядора Лаўрэнаўна, нар. ў 1892, загінула ў 1942.

КРЫВАНОС Віктар Захаравіч, нар. ў 1924, сувязны партызанскага атрада, расстраляны 28.8.1942.

ЛАПАТКА Мікалай Васілевіч, нар. ў 1870, загінуў у 1942 за сувязь з партызанамі.

МАНЁНАК Аляксандр Рыгоравіч, нар. ў 1904, партызан, загінуў у 1942.

МАНЁНАК Андрэй Васілевіч, нар. ў 1896, загінуў у 1942.

МАНЁНАК Архіп Васілевіч, нар. ў 1902, загінуў у 1942.

МАНЁНАК Варвара Пятроўна, нар. ў 1905, загінула ў 1942.

МАНЁНАК Васіль Сцяпанавіч, нар. ў 1923, загінуў у 1942.

МАНЁНАК Домна Васілеўна, нар. ў 1927, загінула ў 1942.

МАНЁНАК Іван Мікалаевіч, нар. ў 1922, курсант ваеннага вучылішча, расстраляны ў 1941 у в. Чачэвічы Быхаўскага р-на.

МАНЁНАК Іван Стафанавіч, нар. ў 1925, партызан 61-га атрада, расстраляны 8.8.1942.

МАНЁНАК Іван Сцяпанавіч, нар. ў 1925, расстраляны ў 1942.

МАНЁНАК Іван Сцяпанавіч, нар. ў 1940, загінуў у 1942.

МАНЁНАК Ілья Пятровіч, нар. ў 1902, расстраляны ў 1942.

МАНЁНАК Кацярына Мікітаўна, нар. ў 1928, загінула ў 1942.

МАНЁНАК Ксенія Іванаўна, нар. ў 1885, расстраляна ў жніўні 1942.

МАНЁНАК Лізавета Рыгораўна, нар. ў 1925, расстраляна ў 1942 за сувязь з партызанамі, пахавана ў в. Загацце.

МАНЁНАК Лукер'я Якаўлеўна, нар. ў 1910, расстраляна ў 1942.

МАНЁНАК Марыя Кірылаўна, нар. ў 1887, расстраляна ў жніўні 1942.

МАНЁНАК Марыя Трафімаўна, нар. ў 1920, расстраляна ў 1942.

МАНЁНАК Мікалай Раманавіч, нар. ў 1910, працаваў на чыгунцы, загінуў 8.8.1942.

МАНЁНАК Мікіта Васілевіч, нар. ў 1902, партызан, расстраляны 2.8.1942.

МАНЁНАК Павел Архіпавіч, нар. ў 1920, загінуў 8.8.1942.

МАНЁНАК Павел Сцяпанавіч, нар. ў 1911, камандзір аддзялення партызанскага атрада, загінуў 14.2.1944.

МАНЁНАК Павел Фёдаравіч, нар. ў 1912, партызан, расстраляны ў 1942.

МАНЁНАК Пелагея Фёдараўна, нар. ў 1916, загінула ў 1942.

МАНЁНАК Пётр, 4 гады, забіты ў 1942.

МАНЁНАК Раман Мацвеевіч, нар. ў 1924, партызан, расстраляны ў 1942.

МАНЁНАК Рыгор Мацвеевіч, нар. ў 1895, сувязны партызанскага атрада, загінуў у маі 1943.

МАНЁНАК Рыгор Сцяпанавіч, нар. ў 1894, загінуў у 1942.

МАНЁНАК Рыгор Фёдаравіч, нар. ў 1903, партызан, загінуў 8.8.1942.

МАНЁНАК Сцяпан Андрэевіч, нар. ў 1889, расстраляны ў жніўні 1942.

МАНЁНАК Сцяпан Мацвеевіч, нар. ў 1886, партызан 61-га атрада, загінуў у верасні 1942.

МАНЁНАК Сцяпан Сцяпанавіч, нар. ў 1909, расстраляны ў 1942.

МАНЁНАК Сцяпан Трафімавіч, нар. ў 1884, расстраляны ў 1942.

МАНЁНАК Сямён Сцяпанавіч, нар. ў 1904, расстраляны ў 1942.

МАНЁНАК Сяргей Сцяпанавіч, нар. ў 1905, партызан, расстраляны ў 1942.

МАНЁНАК Тамара Сцяпанаўна, нар. ў 1937, загінула ў 1942.

МАНЁНАК Уладзімір Архіпавіч, нар. ў 1924, загінуў у 1942.

МАНЁНАК Уладзімір Сцяпанавіч, нар. ў 1924, загінуў у 1942.

МАНЁНАК Уладзімір Сямёнавіч, нар. ў 1924, сувязны партызанскага атрада, загінуў 8.8.1942.

МАНЁНАК Фёдар Лаўрэнавіч, нар. ў 1887, партызан 61-га атрада, загінуў у ліпені 1942.

МАНЁНАК Фёдар Сяргеевіч, нар. ў 1923, расстраляны 8.8.1942.

МАНЁНАК Фёдар Трафімавіч, нар. ў 1894, расстраляны ў 1942.

МАНЁНАК Філімон Сямёнавіч, нар. ў 1915, партызан 61-га атрада, загінуў у ліпені 1942, пахаваны ў в. Суша.

МАНЁНАК Фядос Андрэевіч, нар. ў 1878, расстраляны ў жніўні 1942.

МАНЁНАК Фядос Мацвеевіч, нар. ў 1892, партызан 61-га атрада, загінуў 7.5.1943.

МАНЁНАК Яўген Сцяпанавіч, нар. ў 1890, загінуў у 1942.

ПАДДУБСКАЯ Матруна Савельеўна, нар. ў 1913, расстраляна ў жніўні 1942.

РАМАНОВІЧ Аляксей Сяргеевіч, нар. ў 1925, партызан, загінуў у красавіку 1942.

РАМАНОВІЧ Галіна Мікалаеўна, расстраляна ў жніўні 1942.

РАМАНОВІЧ Генадзь Іванавіч, 1 год, загінуў у 1942.

РАМАНОВІЧ Іван Сяргеевіч, нар. ў 1913 і яго сын Рыгор, 1 год, расстраляны ў жніўні 1942.

РАМАНОВІЧ Кірыла Міхайлавіч, нар. ў 1901, расстраляны ў красавіку 1942.

РАМАНОВІЧ Міхаіл Кірылавіч, сувязны партызанскага атрада, расстраляны 10.4.1942.

РАМАНОВІЧ Пётр Мікалаевіч, нар. ў 1926, партызан, загінуў у 1942.

РАМАНОВІЧ Пётр Міхайлавіч, нар. ў 1926, расстраляны ў 1943.

РАМАНОВІЧ Уладзімір Рыгоравіч, нар. ў 1910, сувязны партызанскага атрада, расстраляны 8.8.1942.

СКАМЕЙКА Кірыла Андрэевіч, нар. ў 1914, партызан, расстраляны 8.8.1942.

СМАЛЯК Соф'я Міхайлаўна, нар. ў 1901, расстраляна ў 1942.

ЦІХАНАЎ Прохар Фёдаравіч, нар. ў 1909 і яго сыны: Міхаіл, 9 гадоў, Мікалай, 7 гадоў, расстраляны 8.8.1942.

ЦМЫГ Аляксандр Дзям'янавіч, нар. ў 1927, загінуў у 1942, пахаваны ў в. Дручаны Бялыніцкага р-на.

ЦМЫГ Васіль Іванавіч, нар. ў 1924, расстраляны ў жніўні 1942.

ЦМЫГ Вольга Дзям'янаўна, нар. ў 1926, расстраляна ў 1942.

ЦМЫГ Ганна Лявонаўна, нар. ў 1934, расстраляна ў 1942.

ЦМЫГ Дзям'ян Андрэевіч, нар. ў 1894, расстраляны ў 1942.

ЦМЫГ Іван Рыгоравіч, працаваў на чыгунцы, расстраляны ў 1942.

ЦМЫГ Марыя Іванаўна, нар. ў 1901, расстраляна ў 1942.

ЦМЫГ Мар'яна Дзям'янаўна, загінула ў 1942.

ЦМЫГ Ніна Сяргееўна, нар. ў 1934, расстраляна ў 1942.

ЦМЫГ Фёдар Дзям'янавіч, нар. ў 1923, расстраляны ў 1942.

ШЭХ Аркадзь Нічыпаравіч, нар. ў 1928, расстраляны ў 1942.

ШЭХ Марфа Іванаўна, нар. ў 1902, расстраляна ў 1942.

ШЭХ Надзея Нічыпараўна, нар. ў 1926, расстраляна ў 1942.

ШЭХ Ніна Нічыпараўна, нар. ў 1930, расстраляна ў 1942.

ШЭХ Нічыпар Андрэевіч, нар. ў 1904, расстраляны ў 1942.

ШЭХ Уладзімір Нічыпаравіч, нар. ў 1932, расстраляны ў 1942.

ВЁСКА ЗАГАЦЦЕ

АСІПЕЦ Савелій Апанасавіч, нар. ў 1916, расстраляны ў 1944 у Оршы.

ЗНАСКЕВІЧ Андрэй Эдуардавіч, нар. ў 1909, расстраляны ў 1942.

ЗНАСКЕВІЧ Вера Казіміраўна, нар. ў 1905, расстраляна ў 1942.

ЗНАСКЕВІЧ Кацярына Фёдараўна, нар. ў 1904, яе дзеці: Валя, 9 гадоў, Адольф, 7 гадоў, Уладзімір, 5 гадоў, загінулі ў 1942.

ЗНАСКЕВІЧ Фелікс Іосіфавіч, нар. ў 1912, загінуў у Оршы.

ЗНАСКЕВІЧ Ян Іосіфавіч, нар. ў 1924, загінуў у 1942.

КЛЕПЧА Аляксей Макаравіч, нар. ў 1901, загінуў у 1943.

КЛЕПЧА Анатоль Аляксеевіч, нар. ў 1934, падарваўся на міне ў 1942.

КЛЕПЧА Васіль Андрэевіч, нар. ў 1923, расстраляны ў 1942.

КЛЕПЧА Васіль Сідаравіч, нар. ў 1911, загінуў у 1942.

КЛЕПЧА Васіль Сяргеевіч, нар. ў 1910, загінуў летам 1942.

КЛЕПЧА Віктар Харытонавіч, нар. ў 1928, загінуў у 1942.

КЛЕПЧА Вольга Нічыпараўна, нар. ў 1923, партызанка, загінула 15.12.1943.

КЛЕПЧА Вольга Яфімаўна, нар. ў 1920, загінула летам 1942.

КЛЕПЧА Еўдакім Іванавіч, сувязны, загінуў 12.3.1942.

КЛЕПЧА Іван Аляксеевіч, нар. ў 1925, загінуў у 1943.

КЛЕПЧА Ірына Ільінічна, нар. ў 1905, загінула ў 1942.

КЛЕПЧА Марыя Мінаўна, нар. ў 1915, загінула летам 1942.

КЛЕПЧА Ніканор Сцяпанавіч, нар. ў 1918, загінуў у Оршы.

КЛЕПЧА Параска Іванаўна, нар. ў 1884, загінула ў 1942.

КЛЕПЧА Рыгор Уласавіч, нар. ў 1900, загінуў у 1942.

КЛЕПЧА Трафім Рыгоравіч, нар. ў 1901, загінуў у 1942.

КЛЕПЧА Фёдар Міхайлавіч, нар. ў 1925, загінуў у 1942.

КЛЕПЧА Харытон Мікітавіч, нар. ў 1901, да вайны працаваў старшынёй калгаса, сувязны, загінуў у жніўні 1942.

КЛЕПЧА Цімафей Дарафеевіч, нар. ў 1879, загінуў у 1943.

КЛЕПЧА Якаў Іванавіч, нар. ў 1914, партызан, загінуў 6.5.1943.

КЛЕПЧА Якаў Фёдаравіч, нар. ў 1918, афіцэр, кіраваў атрадам самаабароны, расстраляны ў 1942.

КЛЕПЧА Яфім Дарафеевіч, нар. ў 1900, загінуў у сакавіку 1943.

КЛЕПЧА Яфім Міхайлавіч, нар. ў 1884, расстраляны ў 1942.

МАРОЗ Марыя Юстынаўна, нар. ў 1922, загінула ў 1942.

ПАДДУБСКІ Іван Яфрэмавіч, нар. ў 1926, загінуў у 1942 за сувязь з партызанамі.

ПАДДУБСКІ Ягор Паўлавіч, нар. ў 1927, загінуў у 1942.

РАДЧАНКА Марыя Мінаўна, нар. ў 1919, загінула ў 1942.

РАДЧАНКА Павел Рыгоравіч, нар. ў 1917, працаваў рабочым на лесаскладзе, загінуў у 1942.

ВЁСКА ЗАКУПЛЕННЕ

БАРКОЎ Васіль Нічыпаравіч, нар. ў 1912, сувязны партызанскага атрада, расстраляны ў жніўні 1942.

БІНДЗЮКОВА Фядора Уладзіміраўна, спалена ў 1942.

КАВАЛЕЎСКІ Авяр'ян, нар. ў 1870, спалены ў 1942.

КАНДРАШОВА Алена, спалена ў 1942.

КРАЎЧАНКА Іван Рыгоравіч, нар. ў 1903, да вайны працаваў старшынёй сельсавета, партызан, павешаны 6.8.1943.

МІХАЙЛАВА Марфа Васілеўна, спалена ў 1942.

ЦАЛАДОНАЎ Апанас, спалены ў 1942.

ЦЕЦЕРУКОЎ Пётр Цімафеевіч, нар. ў 1908, расстраляны ў 1943.

ВЁСКА ЗАЛІЧЫНКА

КАВАЛЁНАК Аляксей Фёдаравіч, нар. ў 1925, партызан, расстраляны 10.8.1942.

КАВАЛЁНАК Міхаіл Фёдаравіч, нар. ў 1927, расстраляны.

КАВАЛЁНАК Фёдар Архіпавіч, нар. ў 1907, загінуў у 1942.

КАВАЛЁНАК Фёдар Восіпавіч, нар. ў 1910, партызан, расстраляны 8.8.1942.

КАРАЎКА Аляксей Самсонавіч, нар. ў 1928, партызан, загінуў 2.8.1942, пахаваны ў в. Дубно.

КАРАЎКА Іван Емяльянавіч, нар. ў 1923, расстраляны ў 1942.

КАРАЎКА Іван Іванавіч, нар. ў 1927, расстраляны ў 1942.

КАРАЎКА Ірына Фёдараўна, нар. ў 1915, расстраляна ў 1942.

КАРАЎКА Міхаіл Емяльянавіч, нар. ў 1923, расстраляны ў 1942.

КАРАЎКА Пётр Арцёмавіч, нар. ў 1912, расстраляны ў 1942.

КЛЕПЧА Вера Казіміраўна, нар. ў 1905, працавала рабочай на чыгунцы, расстраляна ў 1942.

КЛЕПЧА Пётр Цітавіч, нар. ў 1917, да вайны працаваў старшынёй сельсавета, расстраляны ў 1942.

МАНЁНАК Аляксандр Сяргеевіч, нар. ў 1927, расстраляны ў 1942.

МАНЁНАК Васіль Захаравіч, нар. ў 1863, расстраляны ў 1942.

МАНЁНАК Васіль Сцяпанавіч, нар. ў 1911, да вайны працаваў на чыгунцы, партызан, загінуў 2.8.1942, пахаваны ў в. Дубно.

МАНЁНАК Іван Сяргеевіч, нар. ў 1925, партызан, загінуў 8.8.1942.

МАНЁНАК Марыя Кірылаўна, нар. ў 1898, расстраляна ў 1942.

МАНЁНАК Мікіта Васілевіч, нар. ў 1902, партызан 278-га атрада, загінуў 2.8.1942, пахаваны ў в. Дубно.

МАНЁНАК Міхаіл Фёдаравіч, нар. ў 1927, расстраляны ў 1942.

МАНЁНАК Рыгор Савельевіч, нар. ў 1898, расстраляны ў 1942.

МАНЁНАК Сяргей Трафімавіч, нар. ў 1894, расстраляны ў 1942.

МАНЁНАК Фёдар Лаўрэнавіч, нар. ў 1884, расстраляны ў 1942.

РАМАНОВІЧ Канстанцін Рыгоравіч, нар. ў 1924, партызан, загінуў 2.8.1942, пахаваны ў в. Дубно.

ВЁСКА ЗВАЛЬНЯ

КОЛЕСАЎ Пётр Кірсанавіч, партызан 152-га палка, прапаў без вестак у 1943.

МАКЕЕЎ Іван Паўлавіч, нар. ў 1922, партызан, загінуў 6.5.1943.

САВЕЛЬЕЎ Пётр Мінавіч, нар. ў 1913, партызан, загінуў 12.1.1944, пахаваны ў в. Любічы.

ВЁСКА КАЛІЧОНКА

БЕГУНОЎ Дзмітрый Іванавіч, нар. ў 1913, партызан, загінуў 17.5.1943, пахаваны на вайсковых могілках каля в. Усакіна.

БЕГУНОЎ Фёдар Яфімавіч, нар. ў 1898, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

БІБІЛЬНІКАЎ Апанас Якаўлевіч, нар. ў 1910, расстраляны ў 1942.

БІБІЛЬНІКАЎ Дзмітрый Апанасавіч, нар. ў 1925, расстраляны ў 1942.

ЗАЙЦАЎ Пётр Рыгоравіч, нар. ў 1915, працаваў прадаўцом, расстраляны ў 1943.

КЛЕПЧА Піліп Іванавіч, нар. ў 1922, партызан, загінуў 7.3.1944.

МАКСІМКОЎ Адам Мікалаевіч, нар. ў 1911, расстраляны.

ФЕДАСЕЕЎ Рыгор Васілевіч, нар. ў 1915, афіцэр, расстраляны ў 1942 за сувязь з партызанамі ў в. Доўгае.

ЦІМАШКОЎ Павел Пятровіч, нар. ў 1912, да вайны працаваў шафёрам, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1942 у в. Сінюга Магілёўскага р-на.

ШАРАНКОЎ Адам Мічітавіч, нар. ў 1917, да вайны працаваў настаўнікам, камісар партызанскага атрада, загінуў у 1943.

ШАРАНКОЎ Мікіта Іванавіч, нар. ў 1879, расстраляны ў 1943.

ШАРАНКОЎ Мікіта Панцеляймонавіч, нар. ў 1883, расстраляны ў 1943.

ШАЎЦОВА Ефрасіння Несцераўна, нар. ў 1917, да вайны працавала медсястрой, партызанка, загінула 6.5.1943.

За Радзіму, за таварышаў!

У маі 1943 г. фашысты блакіравалі Усакінскія лясы, дзе базіраваліся многія партызанскія атрады. Наш 255-ы партызанскі атрад заняў баявыя пазіцыі. Цяжка параненых і хворых было загадана вывесці ў бяспечнае месца. Наглядаць за імі засталася фельчар Фрося Шаўцова, ласкавая «доктарка» родам з в. Калічонка.

Разведка паведаміла, што немцы з сабакамі ідуць ланцугамі па балоце ў бок размяшчэння партызан. Вораг накіроўваўся якраз у лагер, дзе знаходзіліся параненыя і хворыя. Камандзір атрада Марусаў, які, дарэчы, таксама тады хварэў і быў тут, загадаў усім, хто можа трымаць зброю, заняць абарону, а цяжка параненых адправіць у іншае месца. Усе клопаты па адпраўцы іх у больш бяспечнае месца ляжалі на плячах Фросі. Немцы імкліва набліжаліся да лагера, ужо былі чуваць іх галасы, а неўзабаве кулі прасвісталі над галовамі партызан.

Бачачы, што жменька змучаных людзей не справіцца з намнога большай сілай праціўніка, камандзір атрада даў загад адыходзіць. Фрося Шаўцова з аўтаматам у руках заняла зручнае для стральбы месца за зямлянкай. Праз некалькі хвілін між дрэў паказалася першая група гітлераўцаў. Азіраючыся па баках, яны асцярожна краліся да зямлянкі. Калі адлегласць да немцаў скарацілася да дзесяткаў крокаў, загаварыў Фросін аўтамат. Ад нечаканасці фашысты, пакінуўшы на зямлі некалькі сваіх ваяк і страляючы на хаду, рынуліся назад.

Калі на хвіліну змоўкла страляніна, Фрося адчула, што на грудзях і на спіне стала вільготна. Яна здагадалася, што параненая, але не ўпала духам. Ведала, шо фашысты на гэтым не супакояцца, таму, хоць і слабела ад страты крыві і вострага болю ў грудзях, стала чакаць. У хуткім часе ўжо з другога боку зноў паказалася група гітлераўцаў. Сабраўшы апошнія сілы, Фрося кінула гранату ў самую іх гушчу. Разам з выбухам яна адчула новы штуршок у грудзі і на яе вочы ўпала чорная заслона...

Вялікі смутак агарнуў нас, яе аднавяскоўцаў і баявых таварышаў. Пасля блакады мы з сяброўкай Марусяй Шаўцовай пайшлі да камандзіра, каб адпусціў нас на баявое заданне. Вельмі хацелася адпомсціць за Фросю. Мы ўзялі міны і з Усакінскіх лясоў пайшлі на шашу Магілёў — Бабруйск. У вёсцы Чарнаградзі сустрэліся з сувязным, распыталі пра ўсё, а потым накіраваліся да шашы. Выбраўшы зручнае месца, чакалі вечара. Мы заклалі на дарозе міны. На другі дзень з ранку сталі сачыць за дарогай. Пачуўся гул машын. Чакалі з нецярпеннем. Вось праходзіць адна машына, другая... Раптам — страшэнны выбух. Гэта вам, гады, за баявую сяброўку Фросю, за родную Беларусь! *М. Зайцава.*

ШАЎЦОВА Таццяна Аляксандраўна, нар. ў 1900, расстраляна.

ШАЎЦОЎ Васіль Міхеевіч, нар. ў 1905, расстраляны ў 1942 за сувязь з партызанамі.

ШУМЯКОЎ Пётр Ільіч, партызан, загінуў 10.7.1943, пахаваны ў в. Гулы.

ШУМЯКОЎ Пётр Лукашавіч, нар. ў 1895, расстраляны ў 1943.

ВЁСКА МІЛОЕ

ЖЫГАЛЬСКАЯ Зінаіда Ульянаўна, нар. ў 1923, загінула ў 1943 за сувязь з партызанамі.

КАЧКІН Юлій Сцяпанавіч, сувязны, загінуў у жніўні 1942, пахаваны ў в. Чачэвічы Быхаўскага р-на.

КЛЕПЧА Святлана Міхайлаўна, нар. ў 1939, расстраляна.

ПЕЧАНЬ Прохар Андрэевіч, нар. ў 1902, да вайны працаваў на лесаскладзе, расстраляны ў 1942 у в. Чачэвічы.

САЛАЎЁЎ Уладзімір Мікалаевіч, нар. ў 1922, загінуў у 1942.

М. С. Белагрэцкі.

М. Н. Гусакоў.

С. І. Есіпёнак.

М. Я. Сырамалот.

ВЁСКА НОВАЯ СЛАБОДКА

ГАБРЫЛЁВА Галіна Адамаўна, загінула ў 1942 у час бамбёжкі.

ГАБРЫЛЁВА Яўгенія Пятроўна, загінула ў 1942 у час бамбёжкі.

ГАНЧАРОВА Марыя Герасімаўна, нар. ў 1885, расстраляна ў 1943.

ЗАЙЦАЎ Ігнат Васілевіч, нар. ў 1889, **ЗАЙЦАВА Зенія Андрэеўна,** нар. ў 1889, **ЗАЙЦАЎ Аляксей Ігнатавіч,** нар. ў 1932, расстраляны ў 1944 за сувязь з партызанамі.

КАРАЛЁЎ Аляксандр Дзмітрыевіч, падарваўся на міне.

КАЧАЕВА Настасся Ігнатаўна, нар. ў 1900, загінула ў час бамбёжкі.

КЛЕПЧУКОЎ Аляксей Апанасавіч, нар. ў 1925, загінуў у 1942 у час бамбёжкі.

КЛЕПЧУКОЎ Васіль Якімавіч, нар. ў 1931, падарваўся на міне ў 1944.

КЛЕПЧУКОЎ Дзмітрый Апанасавіч, нар. ў 1912, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

КЛЕПЧУКОЎ Дзямід Данілавіч, нар. ў 1908, расстраляны ў 1943.

КЛЕПЧУКОЎ Канстанцін Данілавіч, нар. ў 1908, працаваў кавалём, расстраляны ў 1943.

КЛЕПЧУКОЎ Пётр Майсеевіч, нар. ў 1922, расстраляны ў 1942.

КЛЕПЧУКОЎ Сяргей Мінавіч, пахаваны ў в. Усакіна.

КЛЕПЧУКОЎ Якім Фёдаравіч, нар. ў 1901, расстраляны ў 1943.

КЛЕПЧУКОЎ Яфім Фёдаравіч, нар. ў 1908, расстраляны ў 1942.

ЛАГУН Мікалай Сцяпанавіч, нар. ў 1922, да вайны працаваў настаўнікам, расстраляны ў 1942.

ЛЯВІЦКАЯ Раіса, нар. ў 1923, загінула ў час бамбёжкі.

ЛЯВІЦКІ Дзмітрый Іванавіч, нар. ў 1923, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

ПІНЧУКОВА Соф'я Мікалаеўна, нар. ў 1922, расстраляна ў 1943.

ПІНЧУКОЎ Максім Ярмолавіч, нар. ў 1904, **ПІНЧУКОВА Хрысціна Аляксандраўна,** нар. ў 1905, **ПІНЧУКОВА Зінаіда Максімаўна,** нар. ў 1926, **ПІНЧУКОВА Тамара Максімаўна,** нар. ў 1938, **ПІНЧУКОЎ Уладзімір Максімавіч,** нар. ў 1941, загінулі ў час бамбёжкі.

ПІНЧУКОЎ Рыгор Максімавіч, загінуў у час бамбёжкі.

ШЭХ Сцяпан Міхайлавіч, нар. ў 1889, расстраляны ў 1942.

ВЁСКА ЯДРАНАЯ СЛАБАДА

АРБУЗАВА Лідзія Кандратаўна, нар. ў 1884, расстраляна 2.2.1945.

БАРАНЧУК Лукаш Раманавіч, нар. ў 1893, расстраляны 2.2.1943.

БЕЛАГРАЦКІ Мікалай Сяргеевіч, нар. ў 1924, загінуў у 1941.

ГАВАРУНОЎ Іосіф Паўлавіч, нар. ў 1900, загінуў у 1943.

ГАДУНОВА Марыя Севасцьянаўна, нар. ў 1920, яе дзеці Таццяна, Вольга расстраляны 2.2.1943 у Крычаве за сувязь з партызанамі.

ГУСАКОЎ Максім Нічыпаравіч, нар. ў 1902, працаваў рабочым у леспрамгасе, расстраляны ў 1943.

ДАНІЛЁНАК Андрэй Дзям'янавіч, нар. ў 1880, загінуў у 1943.

ДАНІЛЁНАК Усцін Паўлавіч, нар. ў 1903, расстраляны ў 1942.

ЕСІПЁНАК Сцяпан Ільіч, нар. ў 1901, да вайны працаваў старшынёй калгаса, загінуў у 1944 за сувязь з партызанамі.

ЗАФЕЙНЕР Ігнат Іванавіч, нар. ў 1871, расстраляны ў 1943 за сына-партызана, пахаваны ў в. Новая Слабодка.

КАВАЛЁЎ Гурый Малахавіч, нар. ў 1876, загінуў у 1943.

КУШНЯРОЎ Аляксандр Сцяпанавіч, нар. ў 1889, расстраляны ў 1943.

КУШНЯРОЎ Аляксей Сямёнавіч, нар. ў 1880, загінуў у 1943.

КУШНЯРОЎ Іван Аўрамавіч, нар. ў 1910, загінуў у 1943.

КУШНЯРОЎ Ніканор Савельевіч, нар. ў 1901, у 1941 схоплены гітлераўцамі і закатаваны за дапамогу чырвонаармейцам.

КУШНЯРОЎ Уладзімір Васілевіч, нар. ў 1928, загінуў у 1943.

ЛЕБЕДЗЕЎ Іван Пятровіч, нар. ў 1903, загінуў у 1943.

ПАЛАЗКОВА Ганна Сцяпанаўна, нар. ў 1926, расстраляна ў 1943.

ПАЛАЗКОВА Марыя Аляксееўна, нар. ў 1884, загінула ў 1943.

ПАЛАЗКОЎ Ягор Якаўлевіч, нар. ў 1871, загінуў 2.2.1943.

РЫБАКОВА Ганна Ільінічна, нар. ў 1923, да вайны працавала настаўніцай, загінула ў 1943.

РЫБАКОЎ Мікалай Апанасавіч, нар. ў 1910, загінуў у 1943 за сувязь з партызанамі.

САМУЙЛЁНАК Фядосся Мартынаўна, нар. ў 1883, расстраляна ў 1943 за сувязь з партызанамі.

САМУЙЛЁНАК Ягор Кліменцьевіч, нар. ў 1921, падпольшчык, схоплены карнікамі і расстраляны пасля падрыву эшалона, каля в. Слабада Стаўбцоўскага р-на.

САПРУНОЎ Анікей Мінавіч, нар. ў 1912, партызан 61-й брыгады, загінуў 18.3.1944, пахаваны ў в. Даўжанка.

СІЛКОЎ Аляксандр Яфрэмавіч, нар. ў 1877, загінуў у 1943 у час бамбёжкі.

СЫРАМАЛОТ Мікалай Яўстафіевіч, нар. ў 1910, загінуў у 1943 за сувязь з партызанамі.

ШУХНОЎ Андрэй Нічыпаравіч, нар. ў 1872, загінуў у 1943.

ВЁСКА ЯЛОЎКА

КЛЕПЧА Дзям'ян Іванавіч, сувязны партызанскага атрада, схоплены карнікамі 13.5. 1943, далейшы лёс невядомы.

КАЎБЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АКОЛІЦА

БЕРАЗІНСКІ Адась, расстраляны ў 1941.

БЕРАЗІНСКАЯ Адэля, расстраляна ў 1943 за сувязь з партызанамі.

ГУШЧА Галіна Яўгенаўна, нар. ў 1923, загінула 8.9.1942 у в. Нача Крупскага р-на.

ГУШЧА Іосіф Апалінаравіч, нар. ў 1920, партызан, загінуў 10.5.1943.

ГУШЧА Іосіф Іванавіч, нар. ў 1917, да вайны працаваў шафёрам, партызан, загінуў 5.5.1944.

ГУШЧА Міхаіл Апалінаравіч, нар. ў 1925, партызан, загінуў 29.12.1942, пахаваны ў в. Жабаўка Бярэзінскага р-на.

ДУБІНА Мікалай Фёдаравіч, нар. ў 1910, загінуў у фашысцкім палоне ў Магілёве.

ІЗМЕР Аляксандр Іванавіч, нар. ў 1914, загінуў у фашысцкім палоне ў Магілёве.

КАВАЛЁНАК Алена Лявонаўна, расстраляна як жонка партызана.

КАРДЫМОН Міхаіл Агеевіч, нар. ў 1922, партызан, загінуў у 1942.

КУДРАВЕЦ Пётр Фёдаравіч, нар. ў 1908, загінуў у фашысцкім палоне ў Магілёве.

КУДРАВЕЦ Уладзімір Фёдаравіч, працаваў рабочым у леспрамгасе, партызан, расстраляны ў 1943.

КУДРАВЕЦ Яўмен Фёдаравіч, нар. ў 1901, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1944.

КУРМАС Мікалай Апанасавіч, нар. ў 1898, партызан, загінуў 9.12.1943.

НУПРЫЕНКА Марфа Іванаўна, расстраляна ў 1943.

ПІНЧУК Іван, нар. ў 1918, загінуў у фашысцкім палоне ў Магілёве.

ЦЭДРЫК Леанід Леанідавіч, нар. ў 1908, загінуў у 1943 у фашысцкім палоне ў Магілёве.

І. А. Гушча.

М. А. Гушча.

ШАМКО Аляксандр, нар. ў 1914, загінуў у фашысцкім палоне ў Магілёве.

ШАПАВАЛАЎ Віктар Кірылавіч, нар. ў 1922, партызан, загінуў 10.5.1943.

ЮРЧОНАК Іван Васілевіч, нар. ў 1913, працаваў бухгалтарам у леспрамгасе, расстраляны ў в. Коўбча.

ЯБЛОНСКАЯ Рэгіна Пятроўна, працавала прадаўцом, расстраляна ў 1942.

ЯБЛОНСКІ Іван Зігмунтавіч, партызан, загінуў 23.3.1944.

ЯБЛОНСКІ Пётр Баляслававіч, нар. ў 1925, загінуў 18.11.1943.

ВЁСКА ВЯЛЕНІК

КІКЛЕВІЧ Рыгор Паўлавіч, нар. ў 1922, працаваў на чыгунцы, партызан, загінуў 8.8.1943, пахаваны ў в. Вяцер Акцябрскага р-на.

ВЁСКА ГАНАРАТАЎ

ВАЛОВІК Антон Сцяпанавіч, нар. ў 1904, да вайны працаваў брыгадзірам у калгасе, расстраляны ў 1942.

ВАЛОВІК Арсен Андрэевіч, нар. ў 1902, партызан, загінуў 22.6.1942.

ВАЛОВІК Іван Андрэевіч, нар. ў 1920, загінуў у лютым 1943.

НЕСЦЯРОВІЧ Іосіф Данілавіч, нар. ў 1890, сувязны партызанскага атрада, загінуў у жніўні 1942, пахаваны ў в. Усакіна.

САМЕЦ Арсен Мікалаевіч, нар. ў 1903, загінуў у 1942.

А. І. Ізмер.

САМЕЦ Васіль Арсенавіч, нар. ў 1927, расстраляны ў 1942.

ВЁСКА ЗАКУЦКІ ДВАРОК

БЯГАНСКАЯ Станіслава Іосіфаўна, нар. ў 1906, загінула ў 1943.
КАВАЛЁНАК Адам Якаўлевіч, нар. ў 1929, загінуў у 1942.
КАВАЛЁНАК Пётр Якаўлевіч, нар. ў 1920, загінуў у 1942.
КАВАЛЁНАК Таццяна Якаўлеўна, загінула ў 1942.
КАВАЛЁНАК Якаў Іванавіч, нар. ў 1889, загінуў у 1942.
КАРЖАНОЎСКІ Пётр Іванавіч, нар. ў 1920, партызан, пахаваны ў в. Закуцце.
КРЫВАНОС Васіль Цімафеевіч, нар. ў 1890, загінуў у 1943, пахаваны ў в. Закуцце.
КРЫВАНОС Настасся Пятроўна, нар. ў 1914, загінула ў 1942 у час бамбёжкі.
МЕЛЬНІЧОНАК Ганна, нар. ў 1892, загінула ў 1942 у час бамбёжкі, пахавана ў в. Закуцце.

ВЁСКА ЗАКУЦЦЕ

АЧЫНОВІЧ Пракоп Ігнатавіч, нар. ў 1900, загінуў у 1943.
ДЗЕГЦЯРОНАК Павел Міронавіч, нар. ў 1910, загінуў у 1941.
ІЗМЕР Васіль Фаміч, нар. ў 1900, расстраляны ў 1943.
ІЗМЕР Іван Васілевіч, нар. ў 1927, расстраляны ў 1943.
ІЗМЕР Пётр, нар. ў 1925, партызан, загінуў у 1943.
КАВАЛЁНАК Аляксандр Васілевіч, нар. ў 1919, партызан, загінуў у 1941.
КАВАЛЁНАК Мікалай Васілевіч, нар. ў 1909, партызан, загінуў у 1942.
КАВАЛЁНАК Уладзімір Мітрафанавіч, нар. ў 1924, партызан, загінуў 28.2.1944 у в. Бярозава Балота.
КАРДЫМОН Жанна Паўлаўна, нар. ў 1924, партызанка-разведчыца, загінула 11.5.1943 у в. Закуцкі Дварок.

Яе звалі Жаннай

...Расла дзяўчына рухавай, бадзёрай. Любіла Жанна чытаць кнігі пра вайну, пра гераічныя подзвігі, завучвала на памяць ваенныя песні.

Вайна застала дзяўчыну ў Мінску. На свае вочы бачыла яна, як нямецкія захопнікі па-варварску разбуралі яе родны горад, забівалі ні ў чым не вінаватых людзей. Заставацца ў горадзе было немагчыма. У першыя ж дні вайны дзяўчына рассталася са сваёй маці, рассталася назаўсёды. Жанна перабралася ў вёску Коўбча да сваіх родных.

Але знакі вайны ўсюды былі аднолькавыя. Фашысцкія гвалтаўнікі неслі з сабой слёзы, разбурэнне, смерць. У Коўбчы, як і ў іншых навакольных вёсках, пачалі арганізоўвацца атрады самаабароны. У цераольскіх лясах з'явіліся першыя партызанскія атрады. Юная Жанна адразу ж прымкнула да народных мсціўцаў. Ішоў ёй тады васемнаццаты год.

Многія былыя прызаны з атрада «25 год Кастрычніка» і зараз памятаюць невысокую дзяўчыну з русымі косамі і блакітнымі вачыма. Гэта была Жанна Паўлаўна Кардымон, душа атрада, радавы баец і санітарка ў баі, вясёлая спявачка ў вольны ад баявых паходаў час.

...Май 1943 года. Фашысты блакіравалі цераольскія лясы. Партызанскі атрад «25 год Кастрычніка» трапіў у варожае акружэнне недалёка ад вёскі Усакіна. Вораг з кожным днём набліжаўся да месца размяшчэння народных мсціўцаў. Выхад быў адзін: прарыў блакады. Падзяліўшыся на невялічкія групы, партызаны ноччу пачалі ў розных месцах прарываць варожае кальцо.

...Іх было трое: Міхаіл Акуліч, Аляксей Крыскавец і Жанна. Рашылі прарвацца праз акружэнне каля вёскі Закуцце. Цёмнай майскай ноччу партызаны пераплылі раку Вольсу і ўзялі кірунак на вёску. І тут нечакана сутыкнуліся з ворагам. Завязаўся няроўны бой з вялікім атрадам узброеных да зубоў фашыстаў. Гітлераўцы, як расказваюць сведкі гэтага бою, здзіўляліся храбрасці маладых партызан. Да апошняга патрона змагаліся яны з фашыстамі. Аляксея Крыскаўца варожая куля скасіла першага. Не жадаючы трапіць у палон да ворага, паранены, узарваў сябе гранатай Міхаіл Акуліч.

Жанна працягвала бой з фашыстамі адна. Яна бачыла, як побач загінулі геройскай смерцю яе сябры, і ёй хацелася адпомсціць за іх, знішчыць як мага больш гітлераўцаў. Параненая, сцякаючы крывёю, Жанна трапным агнём касіла варожых салдат, закідвала іх гранатамі. Але гітлераўцы вужакай падпоўз да юнай партызанкі ззаду, адкуль яна не чакала небяспекі, і варожая куля абарвала жыццё Жанны.

М. Счыслёнак.

СЫРАМАЛОТ Аляксандр Андрэевіч, нар. ў 1910, сувязны 278-га асобнага атрада, загінуў 15.6.1942.
СЫРАМАЛОТ Аляксандр Дзмітрыевіч, нар. ў 1910, партызан, загінуў у 1944.
СЫРАМАЛОТ Васіль Ігнатавіч, нар. ў 1925, партызан, загінуў у 1942.
СЫРАМАЛОТ Іван Сымонавіч, нар. ў 1932, загінуў у 1943 у час бамбёжкі.

А. А. Сырамалот.

М. Е. Паддубскі.



А. М. Капскі.

М. І. Кніга.

ВЁСКА КАЎБЧАНСКАЯ СЛАБОДКА

КАВАЛЁНАК Іван Ільіч, нар. ў 1905, загінуў у 1942.
КАВАЛЁНАК Леанід Міхайлавіч, нар. ў 1912, да вайны працаваў у міліцыі, загінуў у 1942.
ПАДДУБСКІ Мікалай Емяльянавіч, нар. ў 1913, сувязны партызанскага атрада, загінуў у ліпені 1942.

ВЁСКА КОЎБЧА

БУЦАНЕЦ Павел Васілевіч, нар. ў 1913, партызан, загінуў 19.12.1942.
БУЦАНЕЦ Уладзімір Васілевіч, нар. ў 1912, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1942.
ДУБІНА Ганна Фёдараўна, нар. ў 1924, загінула ў 1944.
ДУБІНА Пётр Фёдаравіч, нар. ў 1926, загінуў у 1944.
ІЗМЕР Андрэй Васілевіч, нар. ў 1912, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1942, пахаваны ва Усакінскіх лясах.
ІЗМЕР Уладзімір Сямёнавіч, нар. ў 1924, партызан, загінуў 21.10.1941, пахаваны ў в. Усакіна.
КАПСКІ Антон Мікалаевіч, нар. ў 1884, фельчар, партызан, загінуў у 1943.
КАРДЫМОН Міхаіл Андрэевіч, нар. ў 1912, да вайны працаваў у леспрамгасе, сувязны партызанскага атрада, загінуў у жніўні 1942.
КАРДЫМОН Міхаіл Мікалаевіч, нар. ў 1920, да вайны працаваў рахункаводам у леспрамгасе, загінуў у 1942.
КАРДЫМОН Міхаіл Міхайлавіч, нар. ў 1920, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1942, пахаваны ва Усакінскіх лясах.
КАРДЫМОН Пётр Фёдаравіч, нар. ў 1930, загінуў у 1944.
КНІГА Васіль Цімафеевіч, нар. ў 1926, студэнт.
КНІГА Іван Ігнатавіч, нар. ў 1913, партызан, загінуў 3.8.1942.
КНІГА Мікалай Іванавіч, нар. ў 1917, да вайны працаваў настаўнікам, сувязны партызанскага атрада, загінуў у ліпені 1942.
КНІГА Мікіта Іванавіч, нар. ў 1907, партызан, загінуў 11.5.1943.
КНІГА Міхаіл Андрэевіч, нар. ў 1919, працаваў загадчыкам магазіна ў в. Аколіца, сувязны партызанскага атрада, загінуў у жніўні 1942.
КНІГА Пётр Іванавіч, нар. ў 1921, сувязны партызанскага атрада, загінуў у жніўні 1942, пахаваны ва Усакінскіх лясах.
МЕЛЬНІЧОНАК Юрый Фёдаравіч, нар. ў 1904, сувязны партызанскага атрада, загінуў у жніўні 1942, пахаваны ў в. Усакіна.
ПЕРУНОЎСКІ Міхаіл Фёдаравіч, загінуў 20.5.1944.
САНЬКО Мікіта Еўдакімавіч, сувязны партызанскага атрада, загінуў у сакавіку 1943.
САНЬКО Яўхім Еўдакімавіч, нар. ў 1897, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1942, пахаваны ў в. Усакіна.
ЯСКЕВІЧ Фёдар Цярэнцьевіч, нар. ў 1899, да вайны працаваў старшынёй калгаса «Чырвоны прамень», партызан, загінуў 2.8.1942, пахаваны ў в. Аколіца.

ВЁСКА КРУШЫННІК

ВАЛОВІК Міхаіл Максімавіч, партызаніў на Украіне, загінуў у 1944.
КНІГА Павел Мікітавіч, нар. ў 1915, камандзір узвода партызанскага атрада, загінуў 5.5.1943, пахаваны ў в. Усакіна.
КРОТ Нічыпар Іванавіч, нар. ў 1902, сувязны партызанскага атрада, загінуў у жніўні 1942, пахаваны ва Усакінскіх лясах.
МЕЛЬНІЧОНАК Міхаіл Фёдаравіч, нар. ў 1915, партызан, загінуў 11.5.1943 каля в. Цераболь.
ПЕРУНОЎСКІ Іван Фёдаравіч, нар. ў 1912, сувязны партызанскага атрада, загінуў у чэрвені 1942.
ТАРАСЕВІЧ Андрэй Кірэевіч, нар. ў 1903, сувязны партызанскага атрада, загінуў у ліпені 1942, пахаваны ў в. Усакіна.

ВЁСКА КУЦІН

КАЎФМАН Зяма Янкелеўна, нар. ў 1891, расстраляна.
КАЎФМАН Міра Янкелеўна, нар. ў 1913, расстраляна.
КАЎФМАН Тайба Зосімаўна, нар. ў 1890, расстраляна ў 1942.
КАЎФМАН Янкель Ганевіч, нар. ў 1872, расстраляны ў 1942.

А. К. Тарасевіч.

В. Г. Кніга.

В. Ю. Пінчук.

М. Ф. Берагейка.

РЫБЧОНАК Цярэнцій Васілевіч, нар. ў 1897, загінуў у 1942.

РЫБЧОНАК Шэйна Янкелеўна, загінула ў 1942 у в. Барсучына.

САМЕЦ Фёдар Іванавіч, нар. ў 1916, партызан.

ВЁСКІ ЛІПНІЦА, ДУБОВЫ ЛОГ

КНІГА Васіль Герасімавіч, нар. ў 1908, да вайны працаваў у калгасе «Вольная праца», служыў у Чырв. Арміі, у першыя дні вайны трапіў у фашысцкі палон у Мінску, адкуль уцёк, партызан, загінуў у 1943 у час прарыву варожай блакады.

МАРМЫЛЬ Макар Акімавіч, нар. ў 1912, да вайны працаваў у калгасе «Вольная праца», загінуў у 1942 у в. Старая Ліпніца ў час бамбёжкі.

ПІНЧУК Антон Піліпавіч, нар. ў 1926, партызан.

ПІНЧУК Васіль Юр'евіч, нар. ў 1920, камандзір узвода партызанскага атрада, загінуў 11.9.1943.

ПУГАЧ Антон Антонавіч, нар. ў 1922, партызан, загінуў 4.6.1944.

РУБІНЧЫК Мэндаль, нар. ў 1878, расстраляны ў 1941.

РУБІНЧЫК Хая Беркаўна, нар. ў 1880, расстраляна ў 1941.

ШПАК Васіль Сідаравіч, нар. ў 1914, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

ШПАК Іван Сідаравіч, нар. ў 1905, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

ШПАК Сідар Сідаравіч, нар. ў 1880, расстраляны разам з сынамі летам 1943 за сувязь з партызанамі, пахаваны ў в. Ліпніца.

ШПАК Трафім Сідаравіч, нар. ў 1907, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

ЮРЧАНКА Мікалай Мікітавіч, нар. ў 1910, партызан, загінуў 29.5.1944 у в. Капланцы Бярэзінскага р-на.

ВЁСКА НОВЫЯ МАКСІМАВІЧЫ

БАГДАНОВІЧ Міхаіл Канстанцінавіч, нар. ў 1895, загінуў у 1942.

БЕЛАБАРОДАЎ Фёдар Карнеевіч, нар. ў 1903, да вайны працаваў настаўнікам, партызан, загінуў 15.5.1942.

БЕРАГЕЙКА Мікалай Фёдаравіч, нар. ў 1900, партызан, загінуў у 1942 у в. Бацэвічы, пахаваны ў в. Заполле.

БУЛАГ Сямён Мікалаевіч, нар. ў 1920, да вайны працаваў настаўнікам, загінуў у 1941.

КАВАЛЁНАК Мікалай Цярэнцьевіч, нар. ў 1905, загінуў у 1941.

КАЗЕЛА Аляксандр Сяргеевіч, нар. ў 1905, загінуў у 1942.

КАРНАЧ Мікалай М., партызан, загінуў 16.2.1942.

КЕДЫЧ Юлій Пракопавіч, загінуў у 1942.

КУКІН Іван Юльянавіч, нар. ў 1909, партызан, загінуў 19.6.1944.

ЛІСАКОВІЧ Алена Іванаўна, нар. ў 1922, расстраляна ў 1942.

ЛІСАКОВІЧ Іван Мікітавіч, нар. ў 1882, расстраляны ў 1942.

ЛІСАКОВІЧ (МІЦКЕВІЧ) Клаўдзія Іванаўна, нар. ў 1912, расстраляна фашыстамі ў 1942.

ЛІСАКОВІЧ Марыя, нар. ў 1884, расстраляна ў 1942.

МІЦКЕВІЧ Зінаіда Іванаўна, нар. ў 1910, расстраляна ў 1942.

МІЦКЕВІЧ Іван Іосіфавіч, нар. ў 1914, расстраляны ў 1942.

МІЦКЕВІЧ Таня, 3 гады, расстраляна ў 1942.

МІЦКЕВІЧ Уладзімір Францавіч, да вайны працаваў настаўнікам, загінуў у в. Галынка Бярэзінскага р-на.

У. І. Мязян.

Б. А. Гурэцкі.

МЯЗЯН Уладзімір Іванавіч, нар. ў 1907, да вайны працаваў настаўнікам, загінуў у 1942, пахаваны ў в. Мацевічы Бярэзінскага р-на.

ПІНЧУК Іван Нічыпаравіч, нар. ў 1905, да вайны працаваў старшынёй калгаса, спалены ў 1941 у Клічаве.

ПІНЧУК Міхаіл Іванавіч, нар. ў 1924, расстраляны ў 1941 за дапамогу партызанам.

ЦЯРЭШКА Іван Пятровіч, нар. ў 1895, расстраляны ў 1942 у в. Галынец Магілёўскага р-на, пахаваны ў Магілёве.

ЦЯРЭШКА Уладзімір Іванавіч, нар. ў 1914, партызан, палітрук узвода, загінуў 2.7.1942.

ШПАК Нестар Аляксеевіч, нар. ў 1909, партызан, загінуў 5.5.1943, пахаваны ў в. Усакіна.

ЯЎСЕЕЎ Павел Яфрэмавіч, нар. ў 1924, партызан, загінуў у 1943.

ВЁСКА НОВЫЯ НАБАРКІ

ГУРЭЦКІ Браніслаў Адамавіч, нар. ў 1914, камандзір узвода 277-га палка, загінуў 1.5.1944, пахаваны ў в. Турэц.

ЗАЛОВІЧ Ахроім і яго сям'я расстраляны ў 1942.

ЗАЛОВІЧ Міхась, партызан, расстраляны ў 1943.

Пра майго таварыша

З Міхасём Заловічам мы шчыра сябравалі. Жыў ён ад мяне недалёка. Мы разам вучыліся ў школе, разам коўзаліся на самаробных каньках, каталіся на санках, гулялі ў снежкі. Улетку працавалі на калгасных палях, а ў вольны час бегалі на рэчку купацца. І часта на лузе, дзе-небудзь пад кустом, праседжвалі цэлыя гадзіны за чытаннем цікавай кнігі. Чыталі мы звычайна ўголас, па чарзе. Любілі таксама памарыць аб тым, як мы, скончыўшы сямігодку, паедзем у горад вучыцца, кім хто з нас будзе. Апрача ўсяго, Міхась ведаў шмат казак і ўмеў іх цікава расказваць. Непрыкметна беглі дні нашага шчаслівага дзяцінства.

І раптам ўсё гэта абарвалася: пачалася вайна...

Праз некалькі дзён вайна дайшла і да нашага калгаса. Спачатку мы чулі выбухі, ад якіх дрыжала зямля. Потым выбухі пачалі мацнець, і ў вокнах нават звінелі і высыпаліся шыбы. А вечарамі мы бачылі водбліскі вялікіх пажараў на захадзе.

Але самае страшнае і горшае пачалося, калі да нас уварваліся немцы. У першыя дні яны, як галодныя ваўкі, накідваліся на курэй і парсюкоў, а потым пачалі распраўляцца з людзьмі. Якія толькі пакуты не цярпелі нашы людзі, трапіўшы ў лапы да лютых фашыстаў.

Мы з Міхасём хадзілі на балота і там хаваліся ад немцаў, бо яны часта наляталі на нашу вёску. На гэтым балоце пасля баёў засталося нямала зброі. І мы пачалі збіраць яе. Увечары, як цямнела, мы вярталіся дадому і прыносілі з сабой то вінтоўку, то рэвальвер, то гранату або яшчэ што-небудзь. Усё гэта хавалі ў патаемныя мясціны. Хавалі мы свае трафеі паасобку і думалі, калі хто і знойдзе, дык не ўсё. Вядома, я ведаў Міхасёву хованку, а ён маю. Частку зброі мы закопвалі проста на балоце.

Аднойчы восеньскай ноччу немцы з паліцаямі зрабілі налёт на нашу вёску. Яны ўварваліся ў хату Міхасёвага бацькі. Міхась паспеў выскачыць у сенцы. Тут яго затрымаў паліцай.

— Пусці мяне,— смела сказаў Міхась.— Я не з гэтага дома, я пастух і быў у іх па чарзе.

Паліцай паверыў і прапусціў яго. Было халодна, дзьмуў сыры вецер. Міхась быў у адной сарочцы, але, не зважаючы на холад, з усёй сілы пабег за вёску.

Тым часам немцы схапілі Міхасёвых бацькоў, трох сясцёр і меншага брата, і, не даўшы ім нават апрануцца, выгналі на двор. Потым іх пагналі за вёску. Брат Міхасёў кінуўся наўцёкі, але тут жа быў смяротна паранены. Бацькі рвалі на сабе валасы, бачачы як памірае іх сын.

Нямецкія каты прывялі сям'ю Заловіча да гумна, што стаяла за вёскай на водшыбе, паставілі ўсіх да сцяны і расстралялі.

Цяжка апісаць, як балюча перажываў мой таварыш смерць сваіх бацькоў і родных. Некалькі дзён ён плакаў горкімі слязамі. Людзі стараліся суцешыць яго, але гэта не дапамагала. Цяпер ён застаўся адзін з усёй сям'і. Міхась не знаходзіў сабе месца. У яго была адна думка: адпомсціць нямецкім катам.

Недалёка за лесам праходзіла шаша. У ціхія дні адтуль даносіўся шум нямецкіх машын. Гэта навяло Міхася на думку зрабіць засаду. Ён адкапаў дзве гранаты, дастаў з-пад бэлькі запалы, схаваныя ў анучцы, і пайшоў з дому.

На дарозе выбраў зручнае месца, уставіў запалы ў гранаты і стаў чакаць.

Неўзабаве на дарозе паказаліся машыны. Міхась падрыхтаваўся да сустрэчы. Першую машыну ён прапусціў: на ёй ехалі салдаты. На другой, адкрытай легкавой машыне Міхась убачыў афіцэраў са срэбнымі пагонамі. Калі машына пады

шла блізка, ён размахнуўся і шпурнуў гранату. Раздаўся выбух...

Трэцяя машына з салдатамі спынілася. Міхась, не доўга думаючы, кінуў у яе другую гранату, а сам — у лес.

Пакуль пад'ехалі новыя машыны, Міхась быў ужо далёка. Немцы ўзнялі страшэнную страляніну. Кулі барабанілі па дрэвах, свісталі ў галлі над галавой. Але яму пашанцавала выскачыць з-пад абстрэлу.

Цяпер Міхасю хацелася толькі аднаго: знайсці партызан і далучыцца да іх.

Аднойчы, позняй восенню, у нашу вёску прыйшлі ўзброеныя людзі. Іх было шмат. Спачатку мы не ведалі, што гэта за войска, і кінуліся хавацца. Але праз некалькі хвілін людзі загаманілі:

— Партызаны прыйшлі!

Якая была радасць! Нарэшце мы на свае вочы ўбачылі самых сапраўдных партызан — нашых заступнікаў!

Так Міхась стаў партызанам: ён прасіўся сам, і яго прынялі. Мне не пашанцавала: па хваробе мяне ў партызаны не ўзялі. Цяпер я ўжо радзей сустракаўся з Міхасём. Але сяды-тады ён наведваў мяне. Я аддаў яму ўсю сваю зброю, закапаную асобна. У Міхася было схавана пяць вінтовак і два ручныя кулямёты, і ў мяне сёе-тое знайшлося. Усё гэта мы здалі ў атрад.

Міхась павесялеў яшчэ больш. Разам з партызанамі ён хадзіў у засады, прымаў удзел у іншых баявых аперацыях. Ён паказаў сябе не толькі смелым, але і спрытным партызанам. Не было таго, каб ён не выканаў даручанага задання.

Хутка на грудзях майго таварыша закрасаваўся ордэн Чырвонай Зоркі, які ён атрымаў за падрыў нямецкага эшалона і чыгуначнага моста пад Магілёвам. За ўдзел ва ўзяцці нямецкага гарнізона ў Клічаве ён быў узнагароджаны медалём «За адвагу». Больш таго, яму даручылі нават камандаваць аддзяленнем, у якое ўваходзілі дарослыя партызаны.

Прыходзячы іншы раз у вёску, Міхась расказваў мне пра сваё баявое жыццё. Я з цікавасцю слухаў і прасіў яго, каб прыняў мяне ў сваё аддзяленне. А ён паслухае і скажа:

— Што мы цябе на плячах насіць будзем?

Праўда, адзін раз ён згадзіўся ўзяць мяне ў разведку. Мы хадзілі тады на Бярэзіну глядзець, ці ёсць там пераправа.

Аднойчы Міхась расказаў, як ён трапіў у палон да немцаў і як уцёк з-пад расстрэлу.

Было гэта так.

Камандзір атрада паслаў яго і яшчэ двух партызан у разведку. Цёмнай ноччу разведчыкі прыйшлі ў вёску, дзе стаяў нямецкі гарнізон. Заходзяць на адзін двор. Раптам моцна забрахаў сабака. Нямецкі патруль адкрыў агонь. На стрэлы збеглі ся немцы. Разведчыкі, адстрэльваючыся, падаліся назад цераз агароды. Яны ўцяклі б ад небяспекі, каб не аўчаркі, якія наваліліся ім на плечы. Немцы акружылі разведчыкаў і з дапамогай сабак захапілі іх.

Разведчыкаў прывялі да афіцэра. Як ні лютаваў афіцэр, яны не сказалі ні слова.

Пачынала світаць. Афіцэр загадаў звязаць разведчыкам рукі і весці на расстрэл.

За вёскай на ўскрайку лесу была яма, дзе немцы расстрэльвалі нашых людзей. Туды і павёў нямецкі салдат разведчыкаў.

Смерць, здавалася, была немінучая. Але Міхась не траціў надзеі да апошняй хвіліны. Па дарозе ён непрыкметна варушыў рукой і расхістаў вяроўку. І ўжо амаль каля самай ямы ён адважыўся на апошнюю спробу выратавацца: з усёй сілы тузануў рукамі. Вяроўка развязалася. У той жа момант Міхась накінуўся на немца, збіў яго з ног, а сам — у лес. За ім пабеглі і яго таварышы.

Немец апрытомнеў і пачаў страляць. Куля трапіла Міхасю ў руку. У лесе таварышы перавязалі Міхасю руку, і ён вярнуўся ў свой атрад.

Улетку 1943 г. немцы накіравалі на партызан дывізію. Пачаўся жорсткі бой.

Камандзір паслаў Міхася з аддзяленнем на дарогу, у засаду. Задача — не дапусціць падмацавання немцам. Там ужо была група партызан, пасланая раней. Міхась далучыўся да іх.

Хутка разведка паведаміла, што па дарозе ідуць нямецкія машыны. Камандзір загадаў падрыхтавацца да бою.

Падпусціўшы ворага метраў на сто, партызаны адкрылі агонь. Машыны спыніліся, і з іх выскоквалі нямецкія салдаты. Шмат іх пакасілі ў гэты час партызаны.

Але прыбывалі ўсё новыя і новыя машыны. Не зважаючы на ахвяры, немцы пачалі насядаць.

Сілы былі няроўныя, камандзір аддаў загад адыходзіць у глыб лесу.

Міхась з адным кулямётчыкам прыкрываў адыход. Ён страляў з карабіна з-пад дрэў. Недалёка страчыў кулямёт яго таварыша. Раптам кулямёт змоўк. Міхась азірнуўся на момант і ўбачыў, што яго таварыш ляжыць забіты. Паўзком ён падаўся да кулямёта. У гэты час куля трапіла яму ў правую нагу. Паўзці стала цяжка. Усё цела ахапіла гарачыня. Але ён поўз сантыметр за сантыметрам.

Тым часам немцы асмялелі. Яны думалі, што ўжо нікога жывога ля кулямёта не засталося, калі ён маўчыць. І яны на ўвесь рост кінуліся ўперад.

Але ў той жа момант кулямёт ажыў. З лямантам фрыцы падалі на зямлю. Потым немцы зноў адкрылі агонь па кулямёце. Міхась адчуў, як нешта гарачае апякло яго левую руку. Ён толькі мацней сціснуў зубы і рабіў сваю справу правай рукой. Яму трэба было ўжо адыходзіць, але ў запасе яшчэ засталіся патроны. Міхасю хацелася знішчыць як мага больш ворагаў, не прапусціць іх.

Захапіўшыся боем, ён не чуў, як да яго падкраліся два немцы. Яны наваліліся знячэўку, сціснулі і пацягнулі да сваіх.

Немцы прывезлі акрываўленага, ледзь жывога Міхася ў свой гарнізон. Два дні яны катавалі яго, дапытваючыся пра сілы партызан. Толькі дарэмна: не сказаў ім Міхась ні слова. Нічога не дабіўшыся, каты расстралялі яго.

Героя сяляне пахавалі на сваіх могілках.

Ля магілы майго таварыша расце бярозка. Яна ціха шуміць пад ветрам. Паслухаеш — і здаецца, што гэта яна спявае жалобную песню пра таго, хто тут пахаваны. І памяць пра каго доўга-доўга будзе жыць у думках і сэрцах людзей, за якіх ён аддаў сваё маладое жыццё.

Жорж Рабаў.

КАРАЧУН Надзея Канстанцінаўна, нар. ў 1913, расстраляна ў 1942.

КНІГА Канстанцін Данілавіч, вучань, расстраляны ў 1942.

ПАЎЛЮШЧЫК Рыгор Рыгоравіч, нар. ў 1902, расстраляны ў 1942.

ТУМІЛОВІЧ Канстанцін Уладзіміравіч, нар. ў 1924, расстраляны ў 1942.

ВЁСКА ПАГАРЭЛАЕ

АЧЫНОВІЧ Андрэй Емяльянавіч, нар. ў 1904, партызан 208-га атрада імя Сталіна, загінуў 20.7.1942.

ДУБІНА Міхаіл Фёдаравіч, нар. ў 1928, вучань, падарваўся на міне ў 1945.

ЗАБЛОЦКАЯ Вольга Васілеўна, нар. ў 1923, расстраляна ў 1944, пахавана ў в. Коўбча.

ЗАБЛОЦКІ Васіль Васілевіч, нар. ў 1925, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1943.

КАРДЫМОН Міхаіл Васілевіч, нар. ў 1927, вучань, расстраляны ў 1944.

КНІГА Аксіння Іванаўна, нар. ў 1884, расстраляна ў 1944.

КНІГА Андрэй Антонавіч, нар. ў 1881, расстраляны ў 1944.

КНІГА Валянціна Мікалаеўна, расстраляна.

КНІГА Зося Андрэеўна, нар. ў 1911, расстраляна ў 1944.

КНІГА Матруна, расстраляна.

КНІГА Мікалай Аверкавіч, расстраляны.

КНІГА Пётр Андрэевіч, нар. ў 1922, партызан, закатаваны ў 1944.

МЕЛЬНІЧОНАК Іван Іосіфавіч, нар. ў 1902, сувязны партызанскага атрада, памёр ад ран 23.4.1944.

ПЕРУНОЎСКАЯ Валянціна Рыгораўна, нар. ў 1926, вучаніца.

ПЕРУНОЎСКІ Мікалай Мікалаевіч, нар. ў 1925, сувязны партызанскага атрада, загінуў 15.9.1942.

ПЕРУНОЎСКІ Міхаіл Мікалаевіч, нар. ў 1929, вучань, загінуў у 1944.

ПЕРУНОЎСКІ Рыгор Фёдаравіч, нар. ў 1910, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1942.

ПЕРУНОЎСКІ Сяргей Фёдаравіч, нар. ў 1904, працаваў у леспрамгасе, сувязны 208-га палка імя Сталіна, загінуў 21.5.1944.

САМЕЦ Дарафей Назаравіч, нар. ў 1902, партызан, загінуў у ліпені 1942.

САНЬКО Андрэй Малашкавіч, нар. ў 1880, загінуў у 1944.

ВЁСКА ПАЛАМ

АШЭЙЧЫК Іван Кузьміч, нар. ў 1908, да вайны працаваў старшынёй калгаса, партызан, загінуў 3.8.1942.

БЕРАГЕЙКА Мікалай Фёдаравіч, нар. ў 1909, да вайны працаваў старшынёй Кабылянскага сельсавета, партызан, загінуў у 1943, пахаваны ў в. Усакіна.

БЕРАГЕЙКА Фёдар Іосіфавіч, нар. ў 1922, партызан, загінуў 3.8.1942, пахаваны ў в. Мацевічы Бярэзінскага р-на.

КАПАНЕЦ Міхаіл Васілевіч, нар. ў 1926, партызан, загінуў 4.7.1944.

КАРНАЦКІ Іван Васілевіч, нар. ў 1919, партызан, загінуў 9.9.1943, пахаваны ў в. Забродзце Быхаўскага р-на.

КАРНАЧ Мікалай Макаравіч, нар. ў 1904, да вайны працаваў у Доўгаўскім сельсавеце, расстраляны ў 1942 у Беразіно.

КУШНЕР Мікалай Андрэевіч, нар. ў 1922, партызан, расстраляны ў 1944.

ЛІЗУРА Іван Архіпавіч, нар. ў 1910, партызан, загінуў 1.7.1942 пад Бялынічамі.

ЛІЗУРА Пётр Сямёнавіч, нар. ў 1911, партызан, загінуў 4.8.1942, пахаваны ў в. Мацевічы Бярэзінскага р-на.

МАКАРЭВІЧ Дзмітрый Акулавіч, нар. ў 1913, расстраляны ў 1942 у Беразіно.

МАКАРЭВІЧ Іван Адамавіч, нар. ў 1913, партызан, загінуў у 1943.

МАКАРЭВІЧ Мікалай Адамавіч, нар. ў 1917, партызан, загінуў у 1942.

ЮРЧАНКА Мікалай Мікітавіч, партызан.

ВЁСКА РЭПІШЧА

КНІГА Васіль Піліпавіч, нар. ў 1923, сувязны партызанскага атрада, загінуў у ліпені 1944.

КНІГА Вольга Мікітаўна, нар. ў 1918, расстраляна ў 1944.

КНІГА Міхаіл Рыгоравіч, нар. ў 1921, расстраляны ў 1944.

КНІГА Павел Мікітавіч, нар. ў 1915, партызан, загінуў 5.5.1943, пахаваны ў в. Усакіна.

М. Я. Белабароды.



П. Ц. Патупчык.

Х. Н. Патупчык.

М. А. Грайло.

МІРАНОВІЧ Караліна Піліпаўна, нар. ў 1907, расстраляна ў 1944.

ВЁСКА СТАРЫЯ МАКСІМАВІЧЫ

БЕЛАБАРОДЫ Мартын Якаўлевіч, нар. ў 1904, арганізатар партызанскага руху на Віцебшчыне, загінуў у 1943.

БЕЛАБАРОДЫ Міхаіл Піліпавіч, нар. ў 1907, партызан, загінуў 14.7.1943.

КІКЛЕВІЧ Іван Нічыпаравіч, нар. ў 1924, партызан, загінуў 20.3.1942.

КНІГА Антон Кузьміч, нар. ў 1911.

КНІГА Арсен Аляксеевіч.

КНІГА Валянцін Ігнатавіч, нар. ў 1923, партызан.

КНІГА Дзмітрый Міхайлавіч, нар. ў 1915, загінуў у 1942.

КНІГА Іван Аляксандравіч, нар. ў 1906, загінуў у 1945.

КНІГА Марыя Мікітаўна, нар. ў 1880, загінула ў 1942.

КНІГА Мікалай Ананьевіч, нар. ў 1905, быў у фашысцкім палоне, адкуль уцёк, партызан.

КНІГА Мікалай Міхайлавіч, нар. ў 1920, расстраляны ў 1942.

КНІГА Міхаіл Іванавіч, нар. ў 1875, загінуў у 1942.

КНІГА Нічыпар Мікітавіч, нар. ў 1906, загінуў у 1942.

КНІГА Фядора Акімаўна, нар. ў 1902, расстраляна ў 1942.

КНІГА Фядора Міхайлаўна, загінула ў 1942.

КУДЗІН Іван Антонавіч, нар. ў 1922, партызан, прапаў без вестак.

МЕЛЯШКЕВІЧ Алена Іосіфаўна, нар. ў 1922, да вайны працавала настаўніцай, партызанка, загінула вясной 1942.

МЕЛЯШКЕВІЧ Канстанцін Іосіфавіч, нар. ў 1905, загінуў у 1942.

ПАТУПЧЫК Валянцін Ігнатавіч, нар. ў 1924, партызан, загінуў у 1943.

ПАТУПЧЫК Вера Іванаўна, нар. ў 1905, загінула вясной 1942.

ПАТУПЧЫК Іван Ігнатавіч, нар. ў 1924, загінуў 24.10.1942.

ПАТУПЧЫК Мікалай Рыгоравіч, нар. ў 1922, да вайны працаваў настаўнікам, партызан, загінуў у маі 1942.

ПАТУПЧЫК Пётр Ціханавіч, нар. ў 1921, да вайны працаваў настаўнікам, партызан, загінуў 8.8.1944, пахаваны ва Усакінскіх лясах.

ПАТУПЧЫК Хрысціна Нічыпараўна, расстраляна ў 1942.

РАБАЎ Аляксандр Рыгоравіч, нар. ў 1925, партызан 208-га палка імя Сталіна, памёр у 1944.

СІЛІН Мікалай Андрэевіч, нар. ў 1911, партызан, загінуў у жніўні 1942, пахаваны ў в. Закуцце.

ФЯДОРЧАНКА Фёдар Фёдаравіч, нар. ў 1905, да вайны працаваў настаўнікам, партызан 278-га атрада, загінуў 4.8.1942, пахаваны ў в. Коўбча.

ЧУГУНОЎ Аляксандр Іванавіч, нар. ў 1915, партызан, камандзір аддзялення, загінуў у 1942, пахаваны ў в. Усакіна.

ВЁСКА СТАРЫЯ НАБАРКІ

БУКАТЫ Пётр Васілевіч, нар. ў 1907, да вайны працаваў суддзёй у Клічаве, загінуў 26.3.1942 у в. Драні.

ПАТУПЧЫК Іван Васілевіч, нар. ў 1897, расстраляны 15.5.1942.

КЛІЧАЎСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ВЁСКА БЁРДА

АСТРОЎСКАЯ Юзэфа Андрэеўна, нар. ў 1914, партызанка, загінула 5.5.1943.

ВАЙЦЯХОЎСКАЯ Надзея Селівестраўна, нар. ў 1921, расстраляна ў Клічаве.

ГРАЙЛО Мікалай Аляксеевіч, нар. ў 1907, працаваў рабочым на шклозаводзе «Кастрычнік», камандзір аддзялення партызанскага атрада, загінуў 6.8.1943, пахаваны ў в. Асавы.

КУЛІК Саўка Яфімавіч, нар. ў 1910, загінуў у 1942.

СОЛТАН Сяргей Максімавіч, нар. ў 1879, загінуў у 1944.

СТУКАЛЬСКІ Васіль Сымонавіч, нар. ў 1884, расстраляны ў 1942.

СТУКАЛЬСКІ Емяльян Сямёнавіч, нар. ў 1873, партызан, загінуў 21.7.1942, пахаваны ў Клічаве.

ЮРКАВЕЦ Агапа Канстанцінаўна, нар. ў 1912, загінула ў 1942.

ЮРКАВЕЦ Рыгор Сямёнавіч, нар. ў 1902, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1943.

ЮРКАВЕЦ Уладзімір Еўдакімавіч, нар. ў 1919, партызан, загінуў у 1943.

ЯКІМАВЕЦ Васіль Максімавіч, нар. ў 1924, партызан.

ЯКІМАВЕЦ Васіль Савельевіч, нар. ў 1875, партызан, загінуў 15.7.1942, пахаваны ў Клічаве.

ЯКІМАВЕЦ Міна Савельевіч, нар. ў 1901, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1943.

ВЁСКІ ВАЕВІЧЫ, ПЕРАСОПНЯ

ВАЙТУСЁНАК Уладзімір Сцяпанавіч, партызан, загінуў у 1943.

ВАРОНІЧ Восіп Андрэевіч, нар. ў 1905, загінуў у час прарыву варожай блакады.

ВАРОНІЧ Патап Кандратавіч, нар. ў 1909, сувязны партызанскага атрада, загінуў у лістападзе 1942 у Клічаве.

ВАРОНІЧ Рыгор Навумавіч, нар. ў 1905, сувязны партызанскага атрада, загінуў у сакавіку 1943.

ГАЛЫНСКІ Міхаіл Хомавіч, нар. ў 1905, да вайны працаваў у калгасе «Пераможац», сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1943, пахаваны ў Клічаве.

ГАРОХ Аляксей Васілевіч, нар. ў 1881, сувязны партызанскага атрада, загінуў 25.5.1942.

ГАРОХ Марфа, нар. ў 1909.

ЖУДРО Міхаіл Віктаравіч, нар. ў 1914, партызан, загінуў 27.6.1943, пахаваны ў Клічаве.

ЗАРУБА Пётр Фёдаравіч, нар. ў 1915, партызан, загінуў 6.5.1943.

ІВАНОЎ Павел, загінуў у час прарыву варожай блакады.

КОМАР Уладзімір Сямёнавіч, нар. ў 1920.

КОЎРЫК Іван Дзмітрыевіч, нар. ў 1904, партызан, загінуў 27.5.1943, пахаваны ў в. Бацэвічы.

КРЫСКАВЕЦ Дзяніс Васілевіч, нар. ў 1910, загінуў у час прарыву варожай блакады.

КУДЛОЎСКАЯ Надзея Максімаўна, нар. ў 1905, загінула ў час прарыву варожай блакады.

КУДЛОЎСКІ Антон Самсонавіч, нар. ў 1905, загінуў у час прарыву варожай блакады.

КУШНЕР Іван Дзям'янавіч, нар. ў 1898, расстраляны ў 1944.

КУШНЕР Усцін Майсеевіч, нар. ў 1878, партызан, загінуў у маі 1943.

ЛАГУШКА Віктар Андрэевіч, нар. ў 1911, сувязны партызанскага атрада, загінуў у ліпені 1942 у Клічаве.

МАРКАЎ Аляксандр Платонавіч, нар. ў 1910, сувязны партызанскага атрада, загінуў у маі 1942.

ПАХВАЛЁНЫ Іван Максімавіч, нар. ў 1933, загінуў у час прарыву варожай блакады.

ПАХВАЛЁНЫ Іван Сцяпанавіч, нар. ў 1905, загінуў у час прарыву варожай блакады.

ПАХВАЛЁНЫ Максім Фёдаравіч, нар. ў 1905, сувязны партызанскага атрада, загінуў у маі 1942.

ПАХВАЛЁНЫ Міхаіл Апанасавіч, нар. ў 1920, загінуў у 1944.

Я. М. Дайнека.

К. А. Жлобіч.

ПЕКУР Міхаіл Герасімавіч, нар. ў 1906.

ПРАНОТА Яфім, нар. ў 1912, расстраляны.

ПШОН Іван, нар. ў 1919, партызан, загінуў у маі 1943.

ДРАКА Валерый Лук'янавіч.
ДРАКА Ганна Цімафееўна.
ДРАКА Лідзія Лук'янаўна.
ДРАКА Марыя Лук'янаўна.
ДРАКА Марыя Цімафееўна.
ДРАКА Міхаіл Лук'янавіч.
ДРАКА Надзея Лук'янаўна.
ДРАКА Ульяна Рыгораўна.
ДРАКА Фёкла Акімаўна.
ДРАКА Якаў Лук'янавіч.
ЗАЯЦ Міна Рыгоравіч.
ЗАЯЦ Рыгор.
ЗАЯЦ Тэкля.
ЗАЯЦ Цімафей Данілавіч.
ЗАЯЦ Яфім'я Рыгораўна і адзін член яе сям'і.
КРЫВАНОС Аксіння Сідараўна.
КРЫВАНОС Аляксандра Сілаўна.
КРЫВАНОС Анатоль Паўлавіч.
КРЫВАНОС Ганна Паўлаўна.
КРЫВАНОС Еўдакія Пятроўна.
КРЫВАНОС Еўдакія Ціханаўна.
КРЫВАНОС Іван Якаўлевіч.
КРЫВАНОС Лідзія Сідараўна.
КРЫВАНОС Міхаіл Паўлавіч і 3 члены яго сям'і.
КРЫВАНОС Міхаіл Сідаравіч.
КРЫВАНОС Настасся Нічыпараўна.
КРЫВАНОС Ніна Сідараўна.
КРЫВАНОС Пётр Паўлавіч.
КРЫВАНОС Уладзімір Сідаравіч.
КРЫВАНОС Якаў Іванавіч.
ЛЕСКАВЕЦ Васіль Сцяпанавіч.
ЛЕСКАВЕЦ Ганна Іванаўна.
ЛЕСКАВЕЦ Паліна і 2 члены яе сям'і.
ЛЕСКАВЕЦ Пелагея Сцяпанаўна.
ЛЕСКАВЕЦ Пётр Сцяпанавіч.
ЛЕСКАВЕЦ Сцяпан Рыгоравіч.
ЛЕСКАВЕЦ Уладзімір Іванавіч.
ЛЕСКАВЕЦ Фядора.
МАЙСЕЕНКА і 3 члены гэтай сям'і.

ВЁСКА ТУРЧЫЛОЎ

САЛАЎЁВА Любоў Данілаўна, нар. ў 1925, загінула ў жніўні 1943, пахавана ў Клічаве.

ВЁСКА УСАКІНА

БАНДАРЧУК Варвара, расстраляна ў 1941.
БАНДАРЧУК Іван, расстраляны ў 1941.
БАНДАРЧУК Таццяна Емяльянаўна, нар. ў 1920, і двое яе дзяцей расстраляны ў 1942.
БЯЛЯК Сцяпан Васілевіч, нар. ў 1896, сувязны партызанскага атрада, загінуў 15.7.1942.
ДРАЗДОЎ Аляксандр Ігнатавіч, нар. ў 1918,

партызан 61-га атрада Магілёўскай ВАГ, загінуў 26.6.1944.

ЗАЙЦАЎ Макар Кузьміч, яго жонка Зоя і сын Алег загінулі ў 1942 у час прарыву варожай блакады.

ЗАЙЦАЎ Мікалай Сямёнавіч, нар. ў 1908, партызан 278-га атрада, загінуў 15.5.1944, пахаваны ў в. Слабодка.

ЗАЙЦАЎ Фёдар Кузьміч, нар. ў 1911, і яго маці Наталля Мартынаўна загінулі ў 1942 у час прарыву варожай блакады.

ЗАЯЦ Васіль Андрэевіч, яго жонка Дар'я і іх дзеці Ганна, Фёкла, Надзея, Марыя, Пётр, Андрэй расстраляны ў 1943.

ЗАЯЦ Васіль Іванавіч, нар. ў 1924, партызан, загінуў у 1942.

ЗАЯЦ Ганна Антонаўна і яе дзеці Аляксандра, Вольга, Леанід загінулі ў 1942 у час прарыву варожай блакады.

ЗАЯЦ Дзяніс Аляксеевіч, нар. ў 1904, партызан, загінуў у 1942.

ЗАЯЦ Ефрасіння Іванаўна, нар. ў 1918, яе маці Марыя Іванаўна і 3 дзяцей расстраляны ў 1942.

ЗАЯЦ Іван Сідаравіч, нар. ў 1926, загінуў у красавіку 1942.

ЗАЯЦ Ірына Васілеўна і яе дзеці Зося, Вольга, Зіна, Галіна, Марыя расстраляны ў 1942.

ЗАЯЦ Лявон Міхайлавіч, нар. ў 1901, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1941, пахаваны ў в. Доўгае.

ЗАЯЦ Мікалай Захаравіч, нар. ў 1930, загінуў у 1943.

ЗАЯЦ Міхаіл Васілевіч, нар. у 1904, сувязны партызанскага атрада, расстраляны 3.4.1942.

ЗАЯЦ Настасся Сідараўна, яе дачка і двое ўнукаў расстраляны ў 1942.

ЗАЯЦ Нічыпар Лявонавіч, нар. ў 1895, партызан, загінуў у маі 1942.

ЗАЯЦ Рыгор Гаўрылавіч, нар. ў 1906, загінуў у жніўні 1941.

ЗАЯЦ Рыгор Маркавіч, нар. ў 1908, яго жонка і трое іх дзяцей расстраляны ў 1942.

ЗАЯЦ Рыгор Маркавіч, нар. у 1915, сувязны партызанскага атрада, загінуў 20.7. 1943.

ЗАЯЦ Сцепаніда і яе дзеці Галіна, Міхаіл, Якаў расстраляны ў 1942.

ЗАЯЦ Сцяпан Нічыпаравіч, нар. ў 1895, сувязны партызанскага атрада, загінуў у чэрвені 1942.

ЗАЯЦ Сямён Іванавіч, нар. ў 1891, яго жонка Ганна і іх дачка Аляксандра расстраляны ў 1942.

ЗАЯЦ Сяргей Іванавіч, нар. ў 1914, сувязны партызанскага атрада, загінуў у жніўні 1941.

ЗАЯЦ Уладзімір Дарафеевіч, нар. ў 1926, працаваў кавалём, загінуў у 1942.

ЗАЯЦ Фёдар Антонавіч, нар. ў 1918, сувязны партызанскага атрада, загінуў у жніўні 1941.

ЗАЯЦ Фёдар Мартынавіч, нар. ў 1870, сувязны партызанскага атрада, загінуў у маі 1942.

ЗАЯЦ Фёдар Піліпавіч, нар. ў 1893, загінуў у 1942.

ЗАЯЦ Фядот Міхайлавіч, яго жонка Варвара, яе маці Лізавета, нявестка Ульяна, яе дзеці Леанід і Еўдакія расстраляны ў 1942.

ЗАЯЦ Хрысціна Сцяпанаўна, нар. ў 1898, расстраляна ў 1943.

ЗАЯЦ Якаў Фёдаравіч, нар. ў 1907, сувязны партызанскага атрада.

КАЛБАСКА Сцяпан Міхайлавіч, нар. ў 1918, да вайны працаваў бухгалтарам у леспрамгасе, партызан, расстраляны 3.4.1942.

КОМАР Андрэй Піліпавіч, нар. ў 1902, ляснічы, расстраляны 14.2.1942 за сувязь з партызанамі.

ЛЕСКАВЕЦ Пётр Іванавіч, нар. ў 1925, загінуў у 1942 у в. Доўгае.

ЛІФАНАЎ Купрыян Іванавіч, нар. ў 1914, партызан 277-га палка, загінуў 28.10.1943, пахаваны ў в. Кавяза.

ПОРСІК Іван Мацвеевіч, нар. ў 1901, партызан, загінуў 8.5.1942.

ПОРСІК Раман Рыгоравіч, нар. ў 1889, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1942.

САКАЛОЎСКАЯ Еўдакія Панкратаўна, нар. ў 1925, расстраляна ў 1942, пахавана ў в. Асавы.

САКАЛОЎСКІ Панкрат, яго жонка Аляксандра і сын Сцяпан расстраляны ў 1942.

САМЕЦ Васіль Сяргеевіч, нар. ў 1927, загінуў у 1942.

САМЕЦ Сяргей Васілевіч, нар. ў 1888, партызан, загінуў у 1943.

ТАМАШОВЫ Соф'я, Ганна, Людміла, Марыя і іх бацькі расстраляны ў 1942.

ШАГОЙКА Васіль Емяльянавіч, нар. ў 1910, партызан, расстраляны ў 1942.

ШАГОЙКА Ганна Рыгораўна, нар. ў 1893, загінула ў 1941.

ШАГОЙКА Іван Захаравіч, нар. ў 1905, сувязны партызанскага атрада, загінуў у лютым 1942.

ШАГОЙКА Пракоп Емяльянавіч, нар. ў 1907, загінуў у 1942.

ШАГОЙКА Сямён Фёдаравіч, нар. ў 1903, сувязны партызанскага атрада, загінуў у жніўні 1942.

ШАГОЙКА Феадосій Акімавіч, загінуў у 1942.

ШАГОЙКА Фёдар Захаравіч, нар. ў 1903, сувязны партызанскага атрада, загінуў у 1942.

ШАГОЙКА Хрысціна Андрэеўна, нар. ў 1914, і яе дзеці Аляксандр, Святаслаў расстраляны ў жніўні 1942.

ВЁСКА ЯЗВЫ

ХРАПКО Несцер Рыгоравіч, нар. ў 1900, загінуў 7.11.1942, пахаваны ў Клічаве.

ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

Вось і «адышлі тыя годы, адгрымелі паходы...». Вогненны смерч вайны недзе яшчэ каціўся на Захад, а над шматпакутнай клічаўскай зямлёй з лета 1944 г. свяціла мірнае сонца. Праўда, радасць вызвалення змешвалася з пачуццём вялікага гора і роспачы. Столькі загублена чалавечых жыццяў, столькі пакалечана лёсаў! Так знявечана, зрэзана акопамі, зрыта снарадамі і бомбамі зямля! На месцы большасці населеных пунктаў — груды галавешак ды абсмылелыя шыі пячных комінаў. У самім Клічаве ўцалела ўсяго некалькі дамоў. Агульныя страты, нанесеныя акупантамі Клічаўскаму раёну, склалі 804,3 млн. руб. (у цэнах таго часу). Былі разбураны ўсе прамысловыя прадпрыемствы, МТС, навучальныя, медыцынскія і культурна-бытавыя ўстановы, разрабаваны калгасы і саўгасы, вывезены ці прыведзены ў непрыгоднасць машыны і інвентар, забраны тысячы галоў свойскай жывёлы. Карнікі знішчылі 61 вёску, спалілі больш за 3 тыс. дамоў. Загублена ці адпраўлена ў Германію каля 4 тыс. жыхароў раёна.

Здавалася, спатрэбяцца дзесяцігоддзі, каб адрадзіць гэты няшчадна разрабаваны і абяскроўлены вайною партызанскі край. Тым больш што мужчыны, якія маглі трымаць зброю, пайшлі на фронт. З бядой і разрухай сам-насам засталіся пераважна старыя, жанчыны і дзеці. І надзей на дапамогу пасля вызвалення заставалася ўсё менш, бо з фронту ішлі і ішлі «пахавальныя».

І ўсё ж жыццё брала сваё. 29 чэрвеня 1944 г. Клічаўскі РК КП(б)Б і раённы выканаўчы камітэт Савета дэпутатаў працоўных прынялі пастанову «Аб аднаўленні Савецкай улады ў раёне».

Да родных сядзіб пакрысе збіраліся

Першыя выхаванцы Нясяцкага дзіцячага дома. 1948 г.

раскіданыя па свеце вайной людзі. Найперш трэба было агарaць хоць якоенебудзь жытло. Хто ладзіў абгараэлую, але ўцалелую хаціну, хто пераабсталёўваў пад жыллё лазню ці хляўчук, а найчасцей капалі зямлянкі. Будавалі і новыя дамы. У гэтым вялікую дапамогу аказвала дзяржава. Да пачатку 1945 г., паводле звестак раённай газеты, было адбудавана 117 разбураных і пастаўлена 340 новых дамоў. А на падыходзе было яшчэ 340 хат для навасёлаў. Але яшчэ 2 тыс. сем'яў заставаліся ў зямлянках.

Паступова адраджалася і эканоміка раёна. На працягу трох месяцаў пасля вызвалення былі адноўлены 102 калгасы, 25 малочнатаварных, 66 авечкагадоўчых і 11 птушкагадоўчых ферм. Пачалі дзейнічаць Нясяцкая, Бацэвіцкая і Красінская МТС. Яшчэ ў 1944 г. сталі выдаваць прадукцыю райпрамкамбінат, швейная і шавецкая арцелі, бандарна-сталярны цэх, млын пры лясгасе. Адкрываліся і медыцынскія ўстановы: урачэбныя ўчасткі ў вёсках Дамітраўка, Віркаў, Уладзіміраўка і Бацэвічы, у Востраўскім сельсавеце — акушэрска-фельчарскі медучастак. Арганізавана дзяржаўная санітарная інспекцыя, а ў раённым цэнтры — санітарная супрацьэпідэмічная станцыя. Ва урачэбных установах раёна працавала 6 урачоў, 5 фельчараў, 15 медсясцёр.

На старонках газеты «Сталінская праўда» паведамлялася пра пачатак павучальнага года: «1 верасня ў 65 пачатковых школах нашага раёна празвінеў званок, які абвясціў аб пачатку навучальнага года — першага навучальнага года пасля трохгадовай нямецкай акупацыі... Зараз у пачатковых школах шумна. Больш за 7 тыс. вучняў запоўнілі школьныя памяшканні. Толькі ў першы клас прыйшло каля 4 тыс. вучняў».

У пачатку лютага 1945 г. на нарадзе старшынь сельсаветаў і калгасаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі і савецка-партыйнага актыву паведамлялася, што кожнаму жыхару, дом якога спалены акупантамі, дзяржава дае доўгатэрміновы крэдыт і бясплатныя лесаматэрыялы. Прапаноўвалася стварaць будаўнічыя брыгады і, нягледзячы на вострую патрэбу ў жыллі, адбудоўваць вёскі прыгожа, дыхтоўна.

Тым часам набліжалася вясна і першая сяўба на вызваленай зямлі. Пра складанасці таго часу расказаў на старонках «Настаўніцкай праўды» 30 красавіка 1945 г. Н. Таболін, які партызаніў на Клічаўшчыне ў час Вялікай Айчыннай вайны: «Цяжкая гэта была пасяўная — першая пасля вызвалення раёна. У вёсках засталіся толькі жанчыны ды дзеці. Кіламетраў на 15—20 цягалі яны на сваіх плячах па паўтара, а то і па 2 пуды насення, мінеральных угнаенняў ад станцый Нясета, Друць, Тачанка. Рыхтавалі глебу уручную, рыдлёўкамі. У некаторых калгасах аралі і перавозілі грузы на каровах, нявія цудам захаваліся ў сялян. Людзі разумелі: каб найхутчэй аднавіць разбураныя ворагам фабрыкі і заводы, трэба правесці пасяўную як мага хутчэй і лепш».

Не спынялася будаўніцтва. У ліпені 1945 г. райгазета паведамляла, што ў калгасе «Уперад» узімку вывезена многа лесаматэрыялаў, з якіх пастаўлена 40 зрубаў. Многія сем'і справілі навасселле, а ў многіх дамах ідуць апошнія работы. Пад канец 1945 г. ў в. Усакіна адбудавана 40 дамоў, пастаўлена многа зрубаў. 30 сем'яў справілі навасселле ў новых дамах і ў в. Суша.

Першы ўраджай быў чэзлы. Але і той часткова асыпаўся, часткова парос у сціртах, што стаялі ў полі аж да самага снегу. Усё, што намалацілі, адправілі ў дзяржаўныя засекі. На працадні — як давялося: дзе выдалі трохі праросшага жыта, а дзе і нічога. А ў дадатак па вёсках хадзілі рознага роду агенты, «выбіваючы» падаткі з і без таго збяднелых падвор'яў. Людзі пакорліва і маўкліва цягнулі гэты нялёгкі жыццёвы воз, з дня ў дзень ходзячы на працу. І не толькі з-за высокай сваёй свядомасці. За нявыхад на працу, за недагляд тэхнікі ці, крый Божа, за жменю ўкрадзеных каласоў можна было, як піць даць, загрымець за краты.

Тым не менш хоць і марудна, але раён набіраў разгон. Вярталіся дадому франтавікі. Адбудоўваліся вёскі. Павялічвалася колькасць тэхнікі ў МТС. Сем'і, якія асабліва пацярпелі ў час вайны, атрымалі дапамогу крэдытамі, бясплатнымі лесаматэрыяламі, жывёлай, вопраткай.

Вось кароткія фрагменты з летапісу тых нялёгкіх гадоў пасляваеннага аднаўлення, пра якія нісала раённая газета «Сталінская праўда».

15 ліпеня 1946 г.

«АБ ВЫНІКАХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА МТС, ТРАКТАРНЫХ БРЫГАД І ТРАКТАРЫСТАЎ РАЁНА НА 1 ЛІПЕНЯ 1946 г.»

Разгледзеўшы вынікі сацыялістычнага спаборніцтва МТС, трактарных брыгад і трактарыстаў раёна на 1 ліпеня 1946 г., райвыканком і райком КП(б)Б пастанавілі:

1. Прызнаць пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве Нясяцкую МТС (дырэктар тав. Букаты, старшы механік тав. Красноў, старшы партарганізатар тав. Кавалёнак), якая выканала план трактарных работ на 105 %, выпрацоўка на адзін 15-сільны трактар склала 260,4 га мяккага ворыва.

2. Прызнаць пераможцамі ў сацыялістычным спаборніцтве наступныя брыгады:

а) трактарную брыгаду № 1 — брыгадзір Атрашонак (Бацэвіцкая МТС), якая выпрацавала на 15-сільны трактар 343,3 га мяккага ворыва, сэканоміўшы 2950 кг гаручага;

б) трактарную брыгаду № 3 — брыгадзір Макарчанка (Нясяцкая МТС), якая выпрацавала на адзін 15-сільны трактар 336 га мяккага ворыва, сэканоміўшы 1731 кг гаручага.

3. Адзначыць трактарную брыгаду № 1 — брыгадзір Гаўрылёнак (Нясяцкая МТС), якая выпрацавала на адзін 15-сільны трактар 288 га мяккага ворыва, сэканоміўшы 1372 кг гаручага.

4. Прызнаць пераможцамі ў сацыялістычным спаборніцтве трактарыстаў:

а) М. Кардымона і М. Мельнічэнку (трактарная брыгада № 3, Нясяцкая МТС), якія выпрацавалі на 15-сільным трактары 385 га мяккага ворыва, сэканоміўшы 1975 кг гаручага;

б) В. Стасевіча і П. Каўшырку (трактарная брыгада № 1, Бацэвіцкая МТС), якія выпрацавалі на 15-сільным трактары 344 га мяккага ворыва, сэканоміўшы 1976 кг гаручага.

5. Адзначыць добрую работу трактарыстаў, якія дасягнулі высокай выпрацоўкі:

М. Бажкова і М. Доўгага (Нясяцкая МТС), якія выпрацавалі на трактары ХТЗ 350,5 га мяккага ворыва, сэканоміўшы 834 кг гаручага;

І. Кнігу і Ф. Мычку (Нясяцкая МТС), якія выпрацавалі на трактары ХТЗ 597 га мяккага ворыва;

М. Кудлоўскага і І. Лызова (Бацэвіцкая МТС), якія выпрацавалі на трактары ХТЗ 975 кг гаручага.

ДАПАМОГА ІНВАЛІДАМ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

...У нашым раёне інваліды Айчыннай вайны на працягу мінулага года атрымалі льготы па пастаўках малака, мяса і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў. 30 інвалідаў атрымалі ад дзяржавы бясплатна кароў у асабістае карыстанне. За першае паўгоддзе інвалідам выдадзена з сельгасбанка для будаўніцтва дамоў назык на 90 тыс. рублёў і 65 тыс. рублёў для пакупкі дробнай жывёлы. У гэтым годзе 8 чалавек з нашага раёна пабывалі на курортах, у санаторыях, дамах адпачынку. За паўгоддзе інвалідам выплачана 500 968 рублёў пенсій і 4760 рублёў на разавыя дапамогі. Нямала зроблена па ўладкаванню інвалідаў на работу. У сучасны момант 65 % інвалідаў працуюць у калгасах, на прадпрыемствах і установах на кіруючых пасадах. 15 інвалідаў уладкаваны на вучобу. Вялікая дапамога аказана па забеспячэнню прамтаварамі.

М. Чарняк.

5 мая 1947 г.

КАЛГАСНІКІ СЕЛЬГАСАРЦЕЛІ «ПЕРШАГА МАЯ» КАБЫЛЯНСКАГА СЕЛЬСАВЕТА ВЫЛУЧЫЛІ КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР СКРЫПКУ ЛЮБОЎ МІХАЙЛАЎНУ

...Скрыпка Л. М. нарадзілася ў 1925 г. ў в. Кабылянка ў сям'і селяніна-бедняка. У 1930 г. яе бацькі ўступілі ў калгас. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны Любоў Міхайлаўна і яе сям'я прымалі актыўны ўдзел у партызанскім руху. У 1942 г. за сувязь з партызанамі немцы расстралялі яе бацьку і спалілі дом. Брат яе знаходзіўся ў партызанскім атрадзе № 15, адважна змагаўся з нямецкімі захопнікамі і загінуў у баі. На яго месца ў атрад прыйшла Любоў Міхайлаўна.

Пасля вызвалення раёна ад акупантаў Любоў Міхайлаўна актыўна працуе ў калгасе «Першага Мая». За 1946 г. яна выпраца-

Перапынак у час палявых работ у калгасе імя Сталіна. 1950 г.

вала 400 працадзён. З'яўляецца сакратаром пярвічнай камсамольскай арганізацыі калгаса.

14 сакавіка 1948 г.

ПЕРАДАВІКІ ПРЭМІРАВАНЫ

Рашэннем Бабруйскага аблвыканкома перадавікі нарыхтовак і вывазкі лесу нашага раёна, якія забяспечылі поўнае выкананне сезоннага плана, прэміраваны. Так, старшыня Усохскага сельсавета тав. Скрыпка прэміраван гадзіннікам. Старшыня калгаса «Чырвоны прамень» Каўбчанскага сельсавета тав. Кавалёнак у якасці прэміі атрымаў веласіпед. Прэміраваны лепшыя лесарубы і возчыкі. Сярод іх возчык калгаса «Чырвоны прамень» Каўбчанскага сельсавета тав. Гушча, які прэміраван паляўнічым ружжом.

9 мая 1948 г.

КАЛГАС «ПЯЦІГОДКА» ЗАНЕСЕН НА РЭСПУБЛІКАНСКУЮ ДОШКУ ГОНАРУ

Па прадстаўленні аблвыканкома, абкома КП(б)Б і Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР калгас «Пяцігодка» Дзмітраўскага сельсавета (старшыня тав. Шамаль) занесен на рэспубліканскую Дошку гонару, а таксама з'яўляецца кандыдатам на атрыманне Сцяга Савета Міністраў БССР і ЦК КП(б) Беларусі. Калгас выканаў план сяўбы ранніх збожжавых культур да 21 красавіка на 110 %, яравой пшаніцы — на 108%, ільну — на 100 %. Сяўба праведзена за 6 рабочых даён пры добрай якасці ўсіх работ. Праведзена падкормка і баранаванне азімых на плошчы 74 га.

27 чэрвеня 1948 г.

РАДЫЁФІКАЦЫЯ І ТЭЛЕФАНІЗАЦЫЯ

У калгасах Клічаўскага і Дзмітраўскага сельсаветаў ужо налічваецца 250 радыёкропак. У райцэнтры днямі праведзена 2 км радыёлініі на Набярэжнай і Берагавой вуліцах. Тэлефанізаваны Уладзіміраўскі, Максімавіцкі і Кабылянскі сельсаветы. Заканчваецца тэлефанізацыя Востраўскага сельсавета, пасля чаго з райцэнтрам будуць звязаны тэлефоннай сувяззю 13 сельсаветаў.

П. Ізох.

У ДОЎГАЎСКАЙ ХАЦЕ-ЧЫТАЛЬНІ

За апошні час значна палепшыла сваю работу Доўгаўская хата-чытальня, загадчыкам якой працуе М. Т. Яфрэмаў. Тут чыста, утульна. На сталах раскладзены газеты, часопісы, брашуры, ёсць бібліятэка, гармонь. Вечарамі сюды збіраюцца калгаснікі, моладзь. Праводзяцца громкія чыткі газет, гутаркі. Пры хаце-чытальні рэгулярна працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці. Цікавы вечар самадзейнасці быў праведзены ў хаце-чытальні да пятай гадавіны вызвалення Савецкай Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Шэх Мікалай, Шэх Пятрок.

Першая агітбрыгада Клічаўскага Дома культуры. 1953 г.

КАНДРАТ КРАПІВА НАВЕДАЎ СВАІХ ВЫБАРШЧЫКАЎ

Гэтымі днямі ў нашым раёне ў сваіх выбаршчыкаў пабываў дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, вядомы беларускі пісьменнік Кандрат Кандратавіч Крапіва. Ён наведаў рад калгасаў Бацэвіцкага і Нясяцкага сельсаветаў, пазнаёміўся з жыццём і працай калгаснікаў. У Нясяцкім сельсавеце Кандрат Кандратавіч наведаў сямігадовую школу, спіртзавод, дзіцячы дом, пагутарыў з рабочымі і дзецьмі, адказаў на рад пытанняў, якія цікавілі выбаршчыкаў. Перад выездам з Клічава К. Крапіва выступіў з дакладам «10-годдзе ўз'яднання беларускага народа ў адзінай Беларускай Савецкай дзяржаве» ў раённым Доме культуры.

Н. Фёдараў.

27 лістапада 1949 г.

НОВАЯ ПАЧАТКОВАЯ ШКОЛА

У в. Наплавы Клічаўскага сельсавета пабудавана новая пачатковая школа. Памяшканне яе добра абсталявана. У класах светла, цёпла і ўтульна. Пры адкрыцці школы сіламі вучняў быў арганізаваны вечар мастацкай самадзейнасці.

Н. Ліпніцкі.

1 лютага 1951 г.

ШЭСЦЬ СТУДЭНТАЎ У АДНОЙ СЯМ'І

Лічаныя адзінкі ў дарэвалюцыйнай в. Суніа маглі распісацца. І гэтых людзей лічылі «грамацеямі». ...Зараз нікога з сушанцаў не здзіўляе тое, што ў сям'і іх земляка Крывоноса Лявона шэсць студэнтаў. Трое з іх — Марыя, Якаў, Любоў працуюць настаўнікамі ў школах раёна і завочна вучацца ў Магілёўскім педагагічным інстытуце. Галіна працуе загадчыцай раённай бібліятэкі, вучыцца ў Бабруйскім настаўніцкім інстытуце. Надзея і Святаслаў вучацца стацыянарна: Надзея ў Магілёўскім дашкольным педагагічным вучылішчы, Святаслаў у Магілёўскім медыцынскім тэхнікуме...

А. Паўлаў.

Год на год, як кажуць, не падобны: былі і лепшыя, і горшыя. У цэлым эканоміка раёна адраджалася. Тыя прадпрыемствы, што наспех былі пушчаны ў першыя пасляваенныя гады, патрабавалі расшырэння, рэканструкцыі. Тое ж можна сказаць і пра многія фермы ў калгасах і саўгасах. І тым не менш парасткі новага, перадавога ўсё глыбей пускалі карані, набіралі сілу. Так, у 1965 г. ў сярэднім па раёне ўраджай збожжавых і зернебабовых культур склаў 8,1 ц/га. А ў саўгасах «Нясята», «Клічаўскі», «Ганчанскі» азімай пшаніцы атрымана па 16—18 ц/га, у 3-й брыгадзе калгаса імя К. Маркса ўраджай яе дасягнуў 20,8 ц/га. Па 12—14 ц/га на ўсёй плошчы атрымалі ўраджай ячменю ў калгасах імя Леніна, імя К. Маркса, «Уперад да камунізму», у саўгасах «Красінскі», «Нясята» і «Клічаўскі». У брыгадзе саўгаса «Добраахвотнік» ураджайнасць азімага жыта склала па 18 ц/га на плошчы 50 га.

У сярэднім па раёне на 100 га сельгасугоддзяў атрымана па 210,7 ц малака і 21,9 ц мяса, надой ад кожнай каровы склаў 1673 кг малака. Даяркі саўгаса «Красінскі» Г. К. Шапавалава, Л. І. Арэшка, А. Ф. Смаль, В. К. Белакурская, Т. Р. Шалай надаілі ад кожнай каровы па 2300—2640 кг малака, а Н. К. Манёнак з гэтай жа гаспадаркі — 2681 кг.

За гады 8-й пяцігодкі (1966—70) сярэднегадавы тэмп прыросту прамысловай вытворчасці склаў 8,9%. Камбінат бытавога абслугоўвання насельніцтва асвоіў 19 відаў новых паслуг. На харчкамбінаце распачаты выпуск цукерак. Устаноўлена новае абсталяванне на маслазаводзе і ў цагельным цэху прамкамбіната. Рэалізацыя прадукцыі лясгаса падвоілася. Пасаджаны лясы на плошчы 2237 га. Павялічыўся продаж тавараў прамысловых, харчовых і культурна-бытавога прызначэння: халадзільнікаў у 3 разы, пральных машын у 2,7 раза, трыкатажных вырабаў у 2,2 раза, круп у 2,3 раза.

Валавая прадукцыя сельскагаспадарчай

Агляд маладняку ў саўгасе «Доўгаўскі». 1960 г.

Уборка бульбы ў калгасе імя Энгельса. 1954 г.

Заслужаныя калгаснікі з калгаса «Перамога» (злева направа): І. Е. Сямяшонак, А. П. Ізох, І. С. Ізох. 1964 г.

вытворчасці вырасла на 32%. Сяроднегадавая вытворчасць збожжа павялічылася ў 1,5 раза, бульбы — на 56%, мяса — на 55%, малака — на 64% і гародніны — на 15%. Ураджай збожжавых у 1970 г. склаў 13,5 ц/га, бульбы — 103,8 ц/га. На 100 га сельгасугоддзяў атрымана 286,2 малака і 54,1 ц мяса.

Заданне 9-й пяцігодкі (1971—75) па рэалізацыі прамысловай прадукцыі выканана датэрмінова. Пабудавана больш за 200 аб'ектаў вытворчага і культурнага прызначэння. Сярод іх — комплексы для адкорму 1000 галоў буйной рагатай жывёлы ў калгасе імя Будзённага і на 400 кароў у калгасе «Савецкая Беларусь», навучальны корпус на 960 навучэнцаў саўгаса-тэхнікума, сяроднія школы ў Клічаве, Пярэкалі, Дзмітраўцы, гасцініца, дзіцячыя сад-яслі ў райцэнтры і інш.

Сяроднегадавая вытворчасць валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі ў параўнанні з 8-й пяцігодкай павялічылася ў 1,5 раза. Звыш задання прададзена дзяржаве 6,3 тыс. тон збожжа, 7,5 тыс. тон бульбы. У 9-й пяцігодцы ў сяроднім атрымана за год па 23 775 тон збожжа пры ўраджайнасці 16,8 ц/га. Лепшых вынікаў у вырошчванні збожжавых культур дасягнуў калгас «Кастрычнік», дзе атрымана 20,8 ц/га, а ў паляводчай брыгадзе калгаса імя Леніна, якую ўзначальвала аграном В. І. Савіцкая, ураджайнасць збожжавых склала па 26,1 ц/га. У калгасе імя Будзённага з гектара сабрана па 148 цэнтнераў бульбы. На 100 га сельгасугоддзяў атрымана 294 цэнтнеры малака і 59 цэнтнераў мяса. Надой малака ад каровы склаў 1954 кг. 138 работнікаў палёў і ферм узнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Фондазабяспечанасць у калгасах і саўгасах вырасла на 80%. Аб'ём капіталаўкладанняў перасягнуў 15 млн. рублёў. Калгасам і саўгасам пастаўлена больш за 350 трактароў, каля 100 грузавых аўтамабіляў, 130 збожжавых камбайнаў.

У 10-й пяцігодцы (1976—80) аб'ём прамысловай прадукцыі павялічыўся на 19%. Але па тэмпах росту прамысловай вытворчасці і прадукцыйнасці працы раён не выйшаў на запланаваныя рубяжы. Ні адно з прадпрыемстваў не справілася з выпускам прадукцыі па асартыменце. Пабудаваны агульнаадукацыйныя школы ў вёсках Нясята і Доўгае, клуб на 300 месцаў у Бацэвічах, 13 магазінаў, здадзена ў эксплуатацыю 23,3 тыс. м^2 жылля.

Калгасам і саўгасам пастаўлена 314 трактароў, 110 грузавых аўтамашын, 127 збожжавых камбайнаў. Асноўныя фонды сельскагаспадарчага прызначэння

Група перадавікоў вытворчасці. Сяроднія 1980-х гадоў.

павялічыліся на 13,5 млн. рублёў, або на 45%. Меліяратары раёна атрымалі 80 адзінак тэхнікі, асушылі каля 5 тыс. га зямель. Толькі ў саўгасе «Доўгаўскі» ў сельскагаспадарчы абарот уведзена каля 600 га меліяраваных зямель. Сяроднегадавы аб'ём валавой прадукцыі ў калгасах і саўгасах павялічыўся на 18,3%, мяса і малака — на 19%, збожжа — на 20%, бульбы — на 34%. Выкананы планы пяцігодкі па продажы дзяржаве бульбы, гародніны, садавіны, малака, воўны. Аднак недавыкананы планы продажу дзяржаве мяса, збожжа, ільнопрадукцыі. Нізкай заставалася прадукцыйнасць дойнага статка: за апошнія 2 гады надой на адну карову па раёну склаў 1900 кг малака, што адпавядала ўзроўню 1966 г.

11-ю пяцігадовую праграму (1981—85) па выпуску таварнай прадукцыі прамысловыя прадпрыемствы выканалі да 7 лістапада 1985 г. Было здадзена ў эксплуатацыю больш за 200 аб'ектаў рознага прызначэння, у т. л. прамысловы комплекс па гадоўлі і адкорму буйной рагатай жывёлы ў саўгасе «Добраахвотнік», Максімавіцкая сярэдняя школа, 679 кватэр. Плошчы меліяраваных зямель расшырыліся амаль на 4 тыс. га. На 120 км павялічылася працягласць аўтамабільных дарог з гравійным і асфальтавым пакрыццём.

Аб'ём валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі ў 1985 г. склаў 29 млн. рублёў. Гаспадаркі атрымалі прыбытак больш за 10 млн. рублёў з рэнтабельнасцю 36%. З кожнага гектара пасеваў сабрана па 22,5 ц збожжа, 149 ц бульбы.

У 12-й пяцігодцы (1986—90) забяспечана выкананне дзяржаўнага заказу на ўсіх прамысловых прадпрыемствах раёна. Аб'ём сельскагаспадарчай прадукцыі павялічыўся ў параўнанні з сяроднегадавым узроўнем мінулай пяцігодкі на 51%, вытворчасць мяса вырасла ў 2,3 раза, малака і зерня — у 1,5 раза, надой малака ад каровы пабольшаў на 1042 кг і склаў 3127 кг. Самы высокі сяродні надой малака ад каровы быў у племзаводзе «Нясята» (4103 кг). Аператары машыннага даення з племзавода «Нясята» Г. А. Белазор, М. П. Кунцэвіч, Ф. П. Вароніч, Ф. Я. Кунцэвіч атрымалі яго больш чым па 6 тыс. кг, М. Н. Сазанавец, Н. Ф. Грычанок, Р. Ф. Аўсянік з калгаса імя Будзённага — больш чым па 5 тыс. кг, 39 аператараў машыннага даення — больш чым па 4 тыс. кг.

Упершыню ў раёне ўраджайнасць збожжавых склала больш як 30 ц/га, а кармавых караняплодаў — 700—800 ц/га. Самы высокі ўраджай збожжавых — 40,4 ц/га атрыманы ў калгасе імя Будзённага, у калгасах імя К. Маркса і «Савецкая Беларусь» — 36,8 ц/га, у саўгасе-тэхнікуме — 36,6 ц/га.

Амаль па 264 цэнтнеры бульбы з гектара атрымалі ў калгасе «Радзіма», 260 ц/га — у калгасе імя Будзённага, больш за 230 ц/га — у племзаводзе «Нясята», у калгасах імя Тэльмана, «Савецкая Беларусь». Пад канец 12-й пяцігодкі ў раёне не было нерэнтабельных гаспадарак, прыбытак у 1990 г. дасягнуў 24 млн. рублёў пры рэнтабельнасці вытворчасці 45%.

За пяцігодку пабудаваны дамы культуры ў вёсках Арэхаўка, Нясята, Максімавічы, 3 дзіцячыя сады, 12 магазінаў, тэрапеўтычны корпус раённай бальніцы, аптэка, амбулаторыя ў в. Арэхаўка, грамадская кацельня, 660 кватэр.

Сённяшні дзень Клічаўшчыны

Звесткі, якія друкуюцца ніжэй, асабліва па сельскай гаспадарцы, да разраду сённяшніх можна аднесці ўмоўна. Але паводле рашэння раённай камісіі ў кнізе вырашылі пакінуць менавіта паказчыкі за 1990 і 1991 гады: гэта быў самы высокі рубеж, якога дасягнуў раён у сельскагаспадарчай вытворчасці за ўсю сваю гісторыю.

Насельніцтва. Паводле перапісу насельніцтва ў 1989 г. на тэрыторыі раёна пражывала 24 364 чалавекі, з іх 48% жанчын і 52% мужчын; 22 812 беларусаў, 1068 рускіх, 296 украінцаў, 48 палякаў і 140 чалавек іншых нацыянальнасцей. Колькасць жыхароў на 1 км^2 складала 13,5 чалавека. У 1991 г. нарадзіліся 325, памёрлі 382 чалавекі; зарэгістравана 198 шлюбаў і 43 разводы. У народнай гаспадарцы заняты 10 773 чалавекі: 67% у сельскай гаспадарцы, 7% у прамысловасці, 7% у народнай асвеце, 8% на транспарце і ў будаўніцтве, 5% у ахове здароўя, 6% у кіраванні. Сярод занятых у народнай гаспадарцы 1172 чалавекі мелі вышэйшую адукацыю, 2867 — сяроднюю спецыяльную, 4624 — агульную сяроднюю і 3609 — няпоўную сяроднюю.

Сельская гаспадарка. У раёне 8 калгасаў і 5 саўгасаў. Калгасы: імя К. Маркса (цэнтр в. Віркаў), імя Леніна (в. Бацэвічы), імя Будзённага (в. Заполле),

Табліца 1

Агульная зямельная плошча і размеркаванне сельскагаспадарчых угоддзяў па землекарыстальніках на 1.1.1993 г. (га)

Каму належаць	Агульная зямельная плошча	Сельгасугоддзі	з іх:			
			ворная зямля	шматгадовыя насаджэнні	сенажаці	пашы
Землі калгасаў	38 617	31 926	18 102	97	6792	6935
Землі саўгасаў	24 289	19 845	12 365	47	3918	3515
Сялянскія (фермерскія) гаспадаркі	392	371	320	—	33	18
Землі населеных пунктаў і пасёлкаў гарадскога тыпу	7195	1919	721	10	415	773
Землі прамысловых прадпрыемстваў	23 889	8	1	—	7	—
Клічаўскі лясгас	83 365	653	80	1	503	69
Чыгуначны транспарт	607	28	—	—	28	—
Аўтамабільны транспарт	550	7	6	—	—	1
Землі іншых прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў	523	120	85	9	9	17
Землі дзяржаўнага запасу	212	(водныя рэсурсы)				
Усяго зямель	179 639	54 877	31 680	164	11 705	11 328

імя Тэльмана (в. Стары Востраў), «Зарэчны» (в. Бёрда), «Савецкая Беларусь» (в. Коўбча), «Радзіма» (в. Новыя Максімавічы), «Нясята» (в. Нясята). Саўгасы: «Добраахвотнік» (в. Арэхаўка), «Клічаўскі» (в. Патока), «Доўгаўскі» (в. Доўгае), «Ганчанскі» (пасёлак Ганчанскі); Магілёўскі саўгас-тэхнікум (г. п. Клічаў). У 1992 г. было 12 фермерскіх гаспадарак, агульная плошча сельскагаспадарчых угоддзяў якіх складала 392 га. Гаспадаркі раёна спецыялізуюцца на вытворчасці мяса-малочнай прадукцыі. У саўгасе «Добраахвотнік» дзейнічае комплекс па дарошчванні і адкорме 10 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы ў год. 60% тэрыторыі раёна занята лесам. Глебы дзярнова-падзолістыя, пераважна супясчаныя (84,2%) і пясчаныя (15,6%). Па ўрадлівасці яны адносяцца да 4-й групы (бал ворных зямель 35). Каб атрымаць высокія ўраджаі, іх неабходна добра ўгнойваць і прытрымлівацца агратэхнікі. І ў гэтым кірунку многае зроблена: раён з апошніх месцаў па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі перамясціўся ў лік першых 5—10 раёнаў Магілёўшчыны.

Прамысловасць у асноўным звязана з перапрацоўкай мясцовай сыравіны. Працуюць лясгас, дрэваапрацоўчы камбінат, торфапрадпрыемства «Ганчанскае», масларобны завод, лесапункт Бабруйскага леспрамгаса, цагельня, цэх харчовых прадуктаў. У 1992 г. выраблена каля 3000 кухонных набораў «Цераболь», 21100 навясных шафаў, 34300 штук бандарнага посуду, 1635 т натуральнамалочнай прадукцыі. Вывезена драўніны 83 500 м³. Пачата будаўніцтва новага мэблевага цэха. За перыяд дзейнасці торфапрадпрыемствам «Ганчанскае» (з 1957 г.) здабыта 4181,5 тыс. т торфу, у т. л. 598 тыс. т кускавога, 3583,5 тыс. т фрэзернага.

Механізаваны двор калгаса імя Будзённага.

Табліца 2

Парк трактароў, збожжаўборачных камбайнаў, грузавых аўтамабіляў і сельгасмашын на канец 1991 г. (шт.)

Від тэхнікі	Усяго	у тым ліку	
		у калгасах	у саўгасах
Трактары	796	339	350
Збожжаўборачныя камбайны	160	95	65
Грузавыя аўтамабілі	456	153	213
Плугі трактарныя	234	107	110
Сеялкі трактарныя	191	112	79
Культыватары трактарныя	264	142	113
Жняяркі	18	9	9
Бульбаўборачныя камбайны	65	33	32
Буракаўборачныя камбайны	2	—	2
Льноўборачныя камбайны	17	12	5
Зернеачышчальныя машыны	40	16	24

Табліца 3

Пасяўныя плошчы і ўраджайнасць асноўных сельскагаспадарчых культур у калгасах і саўгасах (1990 г.)

Віды сельскагаспадарчых культур	Пасяўная плошча, га	Ураджайнасць, ц/га
Збожжавыя культуры	14 705	30,4
Бульба	1694	115
Лён-даўгунец	470	
	ільновалакна	4
	ільнасемя	2,2
Кармавыя каранеплоды	14 322	660
Агародніна	24	163

Будаўніцтва. У 1966 г. пачала дзейнічаць перасоўная механізаваная калона (ПМК) № 89. За гэты час колькасць рабочых павялічылася з 61 да 163 чалавек, у эксплуатацыю ўведзена 19 869 га асушаных зямель, на 14 558 га выкананы работы, што не патрабуюць асушэння, пабудавана 86 км дарог з гравійна-пясчаным пакрыццём і буйныя аб'екты асушэння і арашэння з сажалкамі. У г. п. Клічаў дзейнічае дарожна-рамонтна-будаўнічае ўпраўленне № 126. Міжгаспадарчая перасоўная механізаваная калона (МІПМК) № 258 выконвае вялікі аб'ём жыллёвага і вытворчага будаўніцтва.

Табліца 4

Пагалоўе жывёлы (1990 г.)

Віды жывёлы	Ва ўсіх катэгорыях гаспадарак	У тым ліку	
		у калгасах і саўгасах	у падсобных гаспадарках
Буйная рагатая жывёла	41 259	37 383	3876
у тым ліку каровы	13 272	9586	3686
Свінні	19 975	11 797	8178
Авечкі і козы	1219	632	587

У 1990 г. ў калгасах і саўгасах атрымана 9 тыс. т мяса (у жывой масе), 29 568 т малака і 2,6 т воўны.

Транспарт і сувязь. Пасажырскія перавозкі і дастаўку народнагаспадарчых грузаў забяспечвае аўтапарк № 16, у якім 15 аўтобусаў і 40 грузавых аўтамашын. Ён абслугоўвае 10 прыгарадных маршрутаў працягласцю 2125 км. У раёне 20 аддзяленняў сувязі. За 1992 г. імі адпраўлена 571,8 тыс. пісем, 6,4 тыс. пасылак, 10,7 тыс. тэлеграм, 23,1 тыс. грашовых пераводаў, 122,3 тыс. пенсіённых выплат, дастаўлена 2430,88 тыс. газет і журналаў. Устаноўлены 2721 тэлефон, з іх 1637 на кватэрах, 9357 радыёкропак, 5693 тэлевізары.

Райспажыўсаюз арганізаваны ў 1924 г. Уключае 3 гаспадарча-разліковыя арганізацыі: аб'яднанне грамадскага харчавання, камбінат кааператыўнай прамысловасці, каапнарыхтоўкапрам. Спажывецкая кааперацыя — самая буйная гандлёвая арганізацыя ў раёне. Гандлёвая дзейнасць райспажыўсаюза ажыццяўляецца праз 110 гандлёвых прадпрыемстваў, у сельскай мясцовасці працуе 70 ма-

газінаў. Маланаселеныя пункты абслугоўваюць 12 крам дома, ларкі і 2 аўтамагазіны. У раёне 10 прадпрыемстваў грамадскага харчавання, у т. л. 1 рэстаран, 3 сельскія сталовыя, кафэ «Утульнасць», піўны бар, павільён «Турыст», кандытарскі цэх, магазін «Кулінарыя». Прадпрыемствы кааператыўнай прамысловасці спажывецкай кааперацыі раёна выпускаюць тавары народнага спажывання (пераважна хлебабулачныя і кандытарскія вырабы), займаюцца нарыхтоўкай 25 відаў прадукцыі, абарот 28 млн. рублёў. Раённая спажывецкая кааперацыя аб'ядноўвае 16 300 пайшчыкаў. З 1954 г. працуе хлебазавод.

Бытавое абслугоўванне. У г. п. Клічаў ёсць Дом быту, у якім размешчаны 2 атэлье, 3 майстэрні, цырульня, пракатны пункт, фатаграфія, гарадскі прыёмны пункт, сталярны ўчастак, які аказвае паслугі па рамонту і вырабу мэблі, распілоўцы лесаматэрыялаў. У інтэрнаце саўгаса-тэхнікума размешчаны пральня, комплексна-прыёмны пункт. Сельскаму насельніцтву паслугі аказваюць 15 комплексна-прыёмных пунктаў, за кожным з якіх замацавана пэўная зона абслугоўвання; пры іх працуе 12 швейных майстэрань. У 14 комплексных прыёмных пунктах абсталяваны рабочыя месцы для рамонту радыётэлеапаратуры, цырульных работ. Быткамбінат аказвае 20 асноўных відаў паслуг: індпашыў, выраб мэблі, абутку, рамонт адзення, абутку, трыкатажу, мэблі, гадзіннікаў, бытавой тэхнікі, кватэр, паслугі фатаграфіі, цырульні, пракату рытуалаў, сельгаспаслугі, хімчыстка і афарбоўка адзення, мыццё бялізны і інш. Камбінат мае 254 адзінкі тэхналагічнага абсталявання, арандуе 8 аўтамашын, на камбінаце працуюць 203 чалавекі.

Народная адукацыя. У раёне 12 сярэдніх, 7 васьмігадовых, 7 пачатковых школ, у якіх вучацца 3226 дзяцей (1993 г.). 9 сярэдніх школ размешчаны ў тыпавых будынках, будуецца Каўбчанская СШ. Усе школы маюць кабінеты, майстэрні, бібліятэкі, спартыўныя залы і пляцоўкі, 10 цяпліц, 14 сховішчаў для агародніны. Цэнтр прафесійнай падрыхтоўкі вучняў — Клічаўскі міжшкольны вучэбна-вытворчы камбінат пабудаваны ў 1961 г. Яго кабінеты і лабараторыі аснашчаны сучасным абсталяваннем, вучэбнымі і наглядными дапаможнікамі, працуюць 2 дысплейныя класы. Навучанне ажыццяўляюць 336 настаўнікаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Ёсць сярод іх заслужаныя настаўнікі Беларусі, 16 прысвоена званне «Выдатнік адукацыі», 9 узнагароджаны ордэнамі і медалямі.

У раёне дзейнічаюць міжгаспадарчы лагер «Ольса», міжшкольны лагер пры Пярэкальскай СШ, дзіцячая турысцкая база, дзіцяча-юнацкая спартыўная школа, у якой займаюцца 450 дзяцей. У 40 гуртках Дома школьніка займаюцца 520 вучняў.

У раёне 20 дзіцячых садоў, 14 з іх размешчаны ў тыпавых будынках. Выхаванне дзяцей ажыццяўляюць 112 выхавальнікаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

Ахова здароўя. Працуюць цэнтральная раённая бальніца на 215 ложкаў, 4 участковыя бальніцы на 100 ложкаў, амбулаторыя, 18 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, фельчарскі пункт, санэпідэмстанцыя, раённая і 4 сельскія аптэкі. Медыцынскую дапамогу насельніцтву аказваюць 39 урачоў, 8 урачоў-стаматолагаў з вышэйшай і 246 медыцынскіх работнікаў з сярэдняй адукацыяй. У раённай бальніцы 7 аддзяленняў: тэрапеўтычнае на 60 ложкаў, хірургічнае на 50, неўралагічнае на 20, гінекалагічнае на 20, дзіцячае на 30, радзільнае на 15, інфекцыйнае на 20 ложкаў, пабудаваны новы тэрапеўтычны корпус на 120 месцаў. Пры бальніцы дзейнічаюць таксама стаматалагічнае і зубапратэзнае аддзяленні, клініка-біяхімічная лабараторыя, кабінеты фізіятэрапіі, электракардыяграфіі, фібрагастэраскапіі, УЗІ, масажу і лячэбнай фізкультуры, рэнтгенкабінет. Кругласутачна працуе аддзяленне хуткай медыцынскай дапамогі.

Раённая паліклініка разлічана на 250 наведванняў за змену, прыём вядзецца па 18 спецыяльнасцях. Працуюць кабінеты прафілактыкі і даўрачэбнага прыёму, спелеатэрапіі і бронхасанацыі, выкарыстоўваюцца фізіятэрапеўтычнае лячэнне і масаж. У райцэнтры 3 тэрапеўтычныя і 3 недыятрычныя ўчасткі, на якіх тэрапеўт абслугоўвае каля 800, а педыятр каля 600 хворых.

Узведзены будынкі раённай аптэкі і санэпідэмстанцыі, Арэхаўская амбулаторыя на 100 наведванняў, Доўгаўская ўчастковая бальніца, Каўбчанскі і Максімавіцкі фельчарска-акушэрскія пункты, 6 жылых дамоў для медработнікаў.

Аздараўленню насельніцтва спрыяе развіццё фізкультуры і спорту. У раёне створаны 52 калектывы фізічнай культуры, ДзЮСШ, пабудаваны культурна-спартыўны комплекс. Арганізацыяй фізкультурна-аздараўленчай работы ў раёне займаюцца 38 спецыялістаў.

Культура. У раёне 18 клубных устаноў,

Выступленне танцавальнага калектыву на адкрыцці стадыёна ў Клічаве.

9 дамоў культуры, раённая і дзіцячая бібліятэкі, 26 бібліятэчных філіялаў, раённы музей народнай славы, дзіцячая школа мастацтваў, 6 сельскіх дзіцячых музычных школ. У клубах раёна працуюць 247 гурткоў і калектываў мастацкай самадзейнасці, 36 аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах, у якіх займаецца 3426 чалавек. Акадэмічнаму хору і аматарскаму аб'яднанню «Праца, творчасць, ініцыятыва» раённага Дома культуры, фальклорнаму ансамблю Нясцкага сельскага Дома культуры прысвоена званне народнага. Аматарскае аб'яднанне «Праца, творчасць, ініцыятыва», якое займаецца канструяваннем самаробных трактароў і іншай тэхнікі для вёскі, у 1990 г. адзначана дыпломам II ступені ЮНЕСКА. Папулярнасцю карыстаецца аркестр народнай песні і музыкі «Рэтра» Клічаўскай школы мастацтваў і аркестр народнай песні і музыкі Арэхаўскага Дома культуры. У раёне сталі традыцыйнымі агляды этнаграфічных і харавых калектываў, агітацыйна-мастацкіх брыгад. Штогод праводзяцца народныя святканні і масавыя гулянні «Масленіца», «Каляды», «Гуканне вясны», «Купалле» і восеньскі кірмаш.

У музычных школах мастацтваў займаецца каля 400 вучняў, на іх базе працуюць 4 дзіцячыя і 3 харэаграфіч-

Мотабольная каманда ў час гульні.

Агітацыйна-мастацкая брыгада раённага Дома культуры.

ныя калектывы, 4 дзіцячыя вакальна-інструментальныя ансамблі, 2 аркестры народных інструментаў. Паслугамі бібліятэк, фонд якіх больш за 300 тыс. кніг, карыстаюцца больш як 16 тыс. чалавек. Ва ўстановах культуры працуюць 45 клубных работнікаў, 42 бібліятэкары, 30 настаўнікаў дзіцячых музычных школ.

Нашы знакамітыя землякі. Клічаўская зямля ўзгадавала многа таленавітых і працавітых людзей, якія ўмельствам і рупнасцю сваёй памнажалі і памнажаюць славу раёна. Працуюць яны не толькі на сваёй радзіме, а і ва ўсіх кутках Беларусі і за яе межамі. Так што камісіі па стварэнні гэтай кнігі давялося прыкласці нямала намаганняў, каб сабраць пра іх неабходныя звесткі. І наперад просім прабачэння ў тых, пра каго мы не даведаліся і чые прозвішчы, магчыма, не трапілі ў гэты спіс.

Героі: Герой Савецкага Саюза П. А. Крыванос і Герой Сацыялістычнай Працы Г. М. Кудзін.

Военачальнікі: контр-адмірал П. С. Дронін, генерал-маёр І. І. Ваганаў, генерал-лейтэнант І. Н. Кавалёў, генерал-маёр К. М. Канойка, генерал-лейтэнант М. А. Лапацін.

Перадавікі вытворчасці: узнагароджаныя ордэнам Леніна — В. П. Буцанец, С. Н. Кавалёў, К. М. Койпіш, У. Ф. Комар, У. П. Коўрык, К. А. Стасёнак, Г. М. Трызна, М. К. Шадура; узнагароджаныя ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі — М. С. Аўтуховіч, Г. Ф. Жудро, У. В. Казлоў, В. І. Каралёк, К. М. Койпіш, І. І. Кудзін, М. А. Кудлоўскі, А. Р. Манёнак, І. С. Пракапёнак, І. І. Тарэлка; узнагароджаныя ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга — В. Р. Александровіч, М. С. Аўтуховіч, Ю. С. Аўтуховіч, Г. П. Багрыцэвіч, У. А. Баразна, М. В. Бацура, С. І. Бедункевіч, Я. І. Белакурскі, А. В. Буцанец, В. П. Буцанец, Н. І. Буцанец, А. Д. Буяк, М. А. Грузд, У. С. Грынюк, А. Т. Дубініна, Г. П. Жудро, П. К. Забродскі, В. П. Зайцава, Н. М. Зінкавец, А. П. Кандратовіч, В. І. Каралёк, І. П. Каўшырка, Т. І. Кірушкіна, В. С. Клепча, Я. Р. Клімаў, У. Ф. Комар, П. І. Корбут, С. М. Крыванос, К. І. Кудзін, М. І. Кушнер, М. М. Кушнер, Н. М. Маліноўская, А. Р. Манёнак, І. І. Матусевіч, Р. С. Мігдасёў, Л. В. Міхалап, А. П. Паркалаў, В. І. Савіцкая, А. С. Сазанавец, В. М. Сазонаў, В. І. Серадзінскі, М. А. Сінькевіч, Н. А. Станкевіч, З. К. Страгнаткін, В. Ф. Страх, Я. А. Стукальскі, В. Р. Сырамалот, І. І. Тарэлка, Г. М. Трызна, К. І. Умец, І. К. Харлап, З. П. Цецерукова, Л. М. Цітко, В. Ф. Чыжэўскі, В. А. Шах, В. П. Шумякова, І. С. Юркавец, А. К. Ялінскі; узнагароджаныя ордэнам Працоўнай Славы II ступені — В. М. Кніга, К. П. Лескавец, В. Ф. Страх; III ступені — А. А. Баркоўскі, А. Р. Белазор, М. К. Белазор, Я. І. Белакурскі, У. В. Белы, І. П. Буцанец, Ф. П. Вароніч, М. А. Галацэвіч, А. І. Дзегцяронак, В. П. Дзятлёнак, А. А. Доўгая, У. М. Дрозд, Л. П. Журава, Л. Р. Зенкавец, М. В. Ізмер, Ф. Л. Казлоў, Г. М. Канойка, В. М. Караткевіч, Р. Я. Клепча, В. М. Кніга, І. В. Князік, З. А. Козыр, М. І. Конанава, М. М. Корсак, В. Е. Кудзіна, С. У. Кунцэвіч, К. Ц. Лапаціна, М. С. Лапуноў, С. В. Леановіч, К. П. Лескавец, Я. І. Сазанавец, Т. М. Сакава, М. К. Сілін, С. І. Скрыпка, Ю. В. Скудны, Г. А. Солтан, Р. М. Стасюкевіч, В. Ф. Страх, Я. А. Стукальскі, М. І. Сырамалот, І. У. Тарэлка, А. Ю. Татур, Я. А. Харлап, Я. Ф. Харлап, У. В. Цікавы, В. Ф. Юркавец, М. І. Яўстрацік; узнагароджаныя ордэнам «Знак Пашаны» — І. С. Абразевіч, Л. Я. Акуліч, В. Р. Александровіч, М. С. Арлова, Р. Я. Арцімянкоў, М. К. Ачыновіч, Г. П. Багрыцэвіч, А. А. Бараноўскі, А. А. Барлюгоў, У. Н. Бародзіч, С. І. Бедункевіч, А. Р. Белазор, А. Л. Белакурская, Н. С. Белакурская, В. В. Белічэнка, І. І. Бурачэўскі, А. І. Буцанец, М. В. Буцанец, А. П. Вададохаў, П. М. Варакса, І. А. Васілеўскі, Я. Н. Вацура, М. А. Галацэвіч, З. М. Ганчарова, М. А. Грузд, У. С. Грынюк, А. У. Гусакоў, І. І. Данільчык, А. І. Дзегцяронак, У. А. Дзенісевіч, В. П. Дзятлёнак, П. Л. Доўгі, У. М. Дрозд, М. Р. Дубінін, М. І. Дубровскі, В. М. Ільінчык, Я. М. Кавалёнак, Ф. Л. Казлоў, П. Ф. Калячка, В. І. Каралёк, В. П. Каўшырка, В. С. Клепча, І. В. Князік, І. М. Койпіш, К. П. Койпіш, У. Ф. Комар, М. І. Конанава, К. М. Коршак, Л. Д. Красоўская, У. М. Краўчанка, Н. П. Крыванос, І. Я. Кудзін, М. У. Кунцэвіч, А. М. Лапко, С. В. Леановіч, П. І. Ляткоўскі, Я. Дз. Малахоўскі, М. Дз. Мароз, І. Ц. Мацюшонак, К. Ф. Мацюшонак, М. А. Мельнічонак, М. Ц. Мельнічонак, В. Ц. Механікаў, М. Ц. Механікаў, П. І. Мычка, У. Ф. Новік, М. Ф. Осіпава, А. П. Паркалаў, І. В. Патупчык, В. А. Паўлюк, Н. В. Пац, М. М. Пінчук, І. С. Пракапёнак, П. Г. Радзіміновіч, Д. Г. Рубінштэйн, Х. Ф. Рыбчонак, А. С. Сазанавец, М. А. Сай, К. Ф. Сакава, І. І. Саўчанка, Т. Я. Сілкова, М. А. Сінькевіч, М. Д. Скрыпка, В. П. Солтан, С. У. Солтан, Н. І. Старавойтава, В. І. Старажук, В. Ф. Страх, М. А. Страх, Я. А. Стукальскі, У. А. Сукора, М. І. Сырамалот, Ф. Е. Сямёнава, У. І. Тарэлка, Г. М. Трызна, В. І. Усціновіч, В. І. Філончык, М. К. Філончык, К. Я. Харлап, М. І. Харлап, Я. А. Харлап, Г. Р. Хаткевіч, В. С. Цімашкоў, М. М. Чуліцкі, К. Ф. Чыжонак, Дз. К. Шаблінскі, Н. Т. Шаранок, М. М. Шатуха, А. Я. Шчуракоў, І. С. Юркавец, У. Д. Якімавец, А. К. Ялінскі; узнагароджаныя ордэнам Дружбы народаў — В. Р. Александровіч, М. С. Арлова, А. А. Бабак, Ч. А. Бародзін, М. В. Буцанец, Б. Б. Быліна, М. Г. Гарнакоў, В. С. Клепча, А. С. Сазанавец, І. К. Харлап.

Лаўрэаты Дзяржаўных прэмій: М. Дз. Грузд (Дзяржпрэмія СССР), У. А. Салановіч (Дзяржпрэмія БССР).

Удастоены звання «Заслужаны...»: М. Р. Атрашонак, І. Д. Буяк, П. Ф. Бяляк, А. Е. Герашчанка, У. В. Казлоў, А. П. Кандратовіч, В. Р. Кандратовіч, М. М. Кандраценка, В. М. Касцян, У. В. Скараходаў, Л. М. Цітко, М. Дз. Шалай (настаўнікі); К. М. Самсонік (медыцынскі работнік), В. Ф. Ачыновіч (работнік гандлю), В. Ф. Юркавец (работнік прамысловасці), І. К. Маркаў (работнік сувязі).

Пісьменнікі: Г. А. Васілеўская, Л. М. Дайнека, Я. В. Зазека, А. П. Кудравец, М. І. Татур, М. С. Шаўчонак.

Дактары навук: І. В. Гушчын (юрыдычных), М. П. Кніга (медыцынскіх), А. А. Смоліч (геаграфічных).

Кандыдаты навук: А. В. Акуліч, П. В. Акуліч, І. П. Біруля, М. Ф. Бабарыка, В. М. Букаты, А. І. Вікторчык, В. П. Галееў, У. А. Дайнека, І. Ф. Дронін, А. А. Жлутко, В. І. Заяц, А. І. Ізох, В. Р. Ізох, М. К. Калячка, М. І. Касцян, С. І. Касцян, П. Я. Корачкін, Г. А. Купцель, Т. Ц. Латоціна, А. М. Лебедзеў, Г. В. Маркаў, У. А. Мароз, М. Ц. Мацюшонак, П. С. Мязян, І. І. Пірожнік, У. Ф. Русецкі, У. А. Салановіч, В. Дз. Чыжонак, А. І. Шамаль, Э. П. Шпакоўскі, А. В. Юркавец, П. П. Якшонак.

З гісторыі школы

Доўгаўская сярэдняя школа — старэйшая ў раёне. Заснавана яна ў 1863 г. як Доўгаўскае народнае вучылішча, потым стала сямігадовай, а затым — сярэдняй школай. Да вайны навучалася ў ёй 250 чалавек. Класы размяшчаліся ў трох будынках. Параўнальна нядрэнна былі абсталяваны і забяспечаны наглядными дапаможнікамі кабінеты фізікі, біялогіі, мовы і літаратуры; была багатая бібліятэка.

Даваеннымі дырэктарамі былі І. Б. Дубінка і П. А. Цярэшка. У школе працавала 18 настаўнікаў-прадметнікаў і 2 настаўнікі пачатковых класаў. У чэрвені 1941 г. адбыўся першы выпуск дзесяцікласнікаў.

У час акупацыі гітлераўцы разбурылі і знішчылі школьнае абсталяванне, наглядныя дапаможнікі і кнігі спалілі. Памяшканне школы выкарыстоўвалі для размяшчэння матарызаваных вайсковых часцей. Фашысты схапілі настаўнікаў І. В. Уса і С. С. Клепчу і пасля доўгіх здзекаў расстралялі каля в. Бухаўка, потым закатавалі школьнага камсамольца В. М. Мароза. У першыя дні пайшлі

на фронт выпускнікі школы І. С. Дайнека, І. М. Мароз, І. М. Заяц, М. П. Мароз, А. П. Мароз, І. А. Дайнека. Усе загінулі.

Пасля вызвалення вёскі ў 1944 г. пабудавана часовае памяшканне пад школу. Было цесна, не хапала падручнікаў, не было паперы. Першыя пасляваенныя настаўнікі: Н. В. Марозава, Н. Ф. Шэх, Ф. М. Навумовіч, М. Ц. Яфрэмаў і У. В. Казлоў. У 1946—85 гг. школу ўзначальваў удзельнік Айчыннай вайны, заслужаны настаўнік, кавалер двух ордэнаў Славы У. В. Казлоў. Многа сіл прыклаў ён, каб пабудаваць новую школу, расшырыць вучэбную плошчу. У студзені 1980 г. пастаўлены новы мураваны будынак пад школу, пазней пабудаваны сталовая, аўтакласс з гаражом, абсталяваны майстэрні, набыты слясарныя верстакі і інструменты. Ёсць трактар для абучэння школьнікаў прафесіі механізатара. Многія выпускнікі працуюць у саўгасе «Доўгаўскі». Сярод іх М. М. Мароз, А. Д. Мароз, М. Дз. Мароз, В. М. Каўбаска, Ю. І. Мароз. Настаўніцкай прафесіі прысвяцілі сябе П. С. Кавалеўскі, А. М. Мацюшонак, Л. Ф. Кліндзюк, Л. А. Смычкоўская, А. С. Плясконная, Д. І. Цітова і інш. І настаўнікі і навучэнцы шануюць добрыя традыцыі школы.

А. Юрэвіч.

Магілёўскі саўгас-тэхнікум

Створаны ў 1963 г. ў Клічаве як тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі (навучалася 120 чалавек). Тэхнікум размяшчаўся ў невялікім вучэбным корпусе з 4 аўдыторыямі для тэарэтычных і 4 для лабараторна-практычных заняткаў, меў інтэрнат (на 50 чалавек) з актавай залай на 135 месцаў, бібліятэкай і чытальнай залай, трактар і грузавую аўтамашыну. Працавалі ў тэхнікуме 4 выкладчыкі.

У красавіку 1974 г. ён рэарганізаваны ў Магілёўскі саўгас-тэхнікум. Цяпер гэта адна з буйнейшых навучальных устаноў Беларусі. За 30 гадоў існавання тут падрыхтавана і выпушчана больш за 7 тыс. спецыялістаў сярэдняга звяна: тэхнікаў-механікаў, тэхнікаў-электрыкаў, тэхнікаў-электрамеханікаў. Многія з іх сталі добрымі спецыялістамі і арганізатарамі сельскагаспадарчай вытворчасці: В. С. Шылаў — дырэктар саўгаса «Колас», Г. В. Кураленка — галоўны інжынер калгаса «Чырвоная зорка» Магілёўскага р-на, У. К. Доўбня — старшы навуковы супрацоўнік Беларускага аграрнага тэхнічнага універсітэта.

У 1992—93 навучальным годзе ў тэхнікуме займаліся 1242 чалавекі (на стацыянарным аддзяленні 856, на завочным — 386 чалавек). Расшырылася яго матэрыяльная база: яму належыць 2895 га ворнай зямлі, 4435 га сельскагаспадарчых угоддзяў, 2153 галавы буйной рагатай жывёлы, у т. л. 800 кароў, 1440 свіней. У машынна-трактарным парку гаспадаркі 62 трактары, 45 аўтамабіляў, 15 камбайнаў. Адкрыты швейны цэх. Працуе 55 выкладчыкаў, 16 майстроў вытворчага навучання, 17 лабарантаў. У тэхнікуме створаны музей, працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці. Гонарам навучальнай установы з'яўляецца мотабольная каманда, якая неаднаразова выходзіла пераможцам у рэспубліканскіх спаборніцтвах на прыз земляка Героя Савецкага Саюза П. А. Крываноса.

Наш лясгас

На Клічаўскай зямлі, дзе ні едзеш — усюды лясы, пералескі. З лесам звязана ўсё жыццё тутэйшых жыхароў: з яго — не толькі дравіна, але і дзічына, пчаліны мёд. Гэта і сенажаці на палянах, ляды, зёлкі і многае іншае. У час вайны лес быў родным домам для партызан і многіх жыхароў раёна. Няшчадна пакалечыла і вынішчыла яго вайна. Ды і пасля вызвалення не лягчэй было зялёнаму волату. Трэба было адбудоўваць вёскі, грамадскія пабудовы, наладжваць гаспадарку — і зноў выручаў верны зялёны сябра. Яно і зараз цяжка сабе ўявіць эканоміку раёна без лесу.

Праўда, цяпер з лесу не толькі бяруць, але і клапоцяцца пра яго. Праблемамі выкарыстання, зберажэння і аховы лесу займаецца Клічаўскі лясгас, які быў створаны ў 1936 г. Агульная яго плошча (на 1.1.1993 г.) 86,1 тыс. га, у т. л. 76,7 тыс. га пад лесам. У склад лясгаса ўваходзяць 9 лясніцтваў і лесапункт, працуе 360 чалавек. Штогод лясгас нарыхтоўвае 60,7 тыс. кубаметраў дравіны, у т. л. 37,7 тыс. кубаметраў па бюджэце, 23 тыс. кубаметраў па гаспадарчым разліку.

Разліковая лесасека па галоўным карыстанні (па 1-й і 2-й групах) складае 98,5 тыс. кубаметраў. Высечка лесу (асвятленне і прачыстка) праводзіцца штогод на плошчы 1100 гектараў. Кожны год лясгасам закладваюцца новыя лясы на плошчы 250 гектараў, з іх 65 % механізаваным спосабам. Сярэдняя выпрацоўка лесапасадачнай машыны — 33 гектары ў год.

Лясны гадавальнік займае 6,7 гектара, у ім вырошчваюцца сеянцы хвоі, елкі, дубу. На ўсёй плошчы лясоў ажыццяўляецца авіяпатруляванне лясоў. У адпаведнасці з праектам арганізацыі і развіцця гаспадаркі праводзяцца біятэхнічныя і паляўніча-гаспадарчыя мерапрыемствы.

У лесапункце вырабляюцца піламатэрыялы, тара скрыначная, клёпка, загатоўкі на паркет, падлогавая абшыўка, зрубы садовых домікаў, тэхналагічныя драніцы.

М. І. Круты.

Клічаўскі лесапункт.

Першыя фермеры

Мець асабістую гаспадарку, каб самім карміцца з яе і іншым прадукцыю пастаўляць, у раёне пакуль адважыліся нямногія. Але ж гэта ўмелыя і працавітыя людзі, якія добра ведаюць хлебаробскую справу і тэхніку. Васіль Пятровіч Лук'яновіч, нягледзячы на сваю маладосць,— адзін з дасведчаных механізатараў раёна. Разам з братамі Юрыем і Уладзімірам вырашылі апрацоўваць 50 гектараў зямлі, стварыць сваю ферму. Прыдбалі трактар МТЗ і штурмуюць браты Лук'яновічы фермерскую цаліну. Іван Міхайлавіч Тарэлка таксама атрымаў каля 40 гектараў зямлі ў гэтай жа гаснадарцы.

А вось Валерый Міхайлавіч Пірожнікаў, вырашыўшы звязаць свой далейшы лёс з вёскай, зямлёй-карміцелькай, рызыкнуў пераехаць з Бабруйска ў саўгас «Ганчанскі». Ужо набыў трактар, некаторы навясны і прычапны сельгасінвентар. Збіраецца павялічыць участак з двух гектараў да 40—50.

Доўгі час працавалі механізатарамі ў саўгасе «Доўгаўскі» Вячаслаў Рыгоравіч Ганчароў і Леанід Аляксеевіч Карасёў. Гэтыя хлебаробы атрымалі ў асабістае карыстанне па 11 гектараў зямлі.

Мікалай Ануфрыевіч Шаблінскі працаваў механізатарам у калгасе імя Тэльмана. Ён узяў 5 гектараў зямлі, мае ўжо невялікую ферму: 4 каровы, 2 цялушкі, некалькі свіней і авечак. А ўвіхаецца па гаспадарцы пакуль з дапамогай каня — выпрабаванай сялянскай цяглавай сілы.

Кожную раніцу на прыёмным пункце малаказавода можна бачыць трактар фермера з г. п. Клічаў Аляксандра Фёдаравіча Амбросьева. Вось як ён сам расказвае пра сваю справу:

«Завесці асабістую гаспадарку мы з жонкай вырашылі гады два таму назад. Дарэчы, ёй ніколі не даводзілася даглядаць жывёлу. А зараз нават раздойвае першацёлак.

Акрамя дзвюх цельных цялушак на падворку 4 каровы. Для сваёй сям'і трымаем свіней. Вымушаны будзем, напэўна, гадаваць і свінаматку. Дарэчы, яшчэ адна перавага фермера: як бы там ні было, у чарзе за малаком, мясам, смятанай, маслам стаяць не трэба.

Маем 5 гектараў зямлі. Давялося самім яе распрацоўваць, каменне збіраць. Сеялі ячмень, авёс, па паўгектара буракоў і бульбы. Аднак, паводле самых сціплых падлікаў, збожжам трэба засяваць 7—8 гектараў. Таму напісалі заяву, каб далі яшчэ 10 гектараў ворыва. Спадзяёмся, што новы палетак будзе лепшы і з больш урадлівай глебай. Вядома, з цягам часу там, дзе знаходзіцца зямля, трэба будзе і будавацца — жытло ставіць, а таксама штосьці накшталт летняга лагера для жывёлы.

У сваім занятку я бачу і вялікую магчымасць працоўнага выхавання дзяцей, фарміравання ў іх погляду на жыццё, будучую прафесію. Дзесяцігадовы сын Валодзя сэрцам прыкіпеў да тэхнікі, любіць бываць у полі. Калі будзе ўсё добра, праз некаторы час ён стане добрым памочнікам. Цікавасць да гаспадарання праяўляе ўжо і шасцігадовая дапытлівая

Маша. Хто ведае, можа фермерствам нашым дзецям давядзецца займацца ўсё жыццё?

Станавіцца на ногі, абжывацца ўсім нялёгка, у тым ліку і фермеру-пачаткоўцу. Добра, калі ў кіраўнікоў мясцовых улад знойдзеш спачуванне і падтрымку. Толькі дзякуючы асабіста старшыні раённага Савета М. А. Сінькевічу мне пашчасціла яшчэ па ранейшай цане набыць новы трактар МТЗ. Ёсць плугі да яго, старэнькая снісаная бульбакапалка.

Яшчэ калі працаваў экскаватаршчыкам у ДРБУ-126, жыў з сям'ёй у ведамаснай кватэры. Пры маім звальненні начальнік управлення М. М. Шыбко і галоўны бухгалтар І. Ф. Віткоўскі згадзіліся па сходнай цане прадаць нам гэты дом. Дапамог і дырэктар саўгаса «Добраахвотнік» М. Е. Мацюшонак. Працоўны калектыў выступіў гарантам пры атрыманні мною пазыкі. З гэтай жа гаспадаркі выдзелілі нам дзвюх цельных цялушак, за якіх мы будзем разлічвацца цялятамі, пастаўляючы маладняк на жывёлагадоўчы комплекс. Гэта таксама нам выгадна».

Вялікая сям'я Кундзікавых

Калі зайшла ў хату, была прыемна ўражана: дзяцей так многа і ўсе з такой цікаўнасцю стрыглі вачанятамі, разглядаючы незнаёмую жанчыну. І ўсе такія чыстыя, прычасаныя. Купкай стаяць вакол Маргарыты Уладзіміраўны.

Адчуваю, што пытанне да дзяцей, якіх узяла на выхаванне ў сям'ю Кундзікава Маргарыта Уладзіміраўна, былая загадчыца дзіцячага сада,— «ці лепш з мамай?» — не да месца. Але яно само сабой зрываецца.

— Лепш,— ціха адказвае шасцігадовая Лена і прыціскаецца бліжэй да Маргарыты Уладзіміраўны.

— З мамай, толькі з мамай! — радасна выгукнуў Міша, якому таксама споўнілася 6 гадкоў. А маленькі Міхасік не разумее пытання. Ён сядзіць на руках маці, абдымае яе і раз-пораз цалуе. Потым дае пацалаваць ёй кожны свой пальчык на ручцы.

— На дзіва ласкавае дзіця,— гаворыць Маргарыта Уладзіміраўна.— На жаль, сапраўдным бацькам хлопчык аказаўся непатрэбны.

Але ж яму пашанцавала: ён не застаўся сіратой.

Маргарыта Уладзіміраўна ўзяла ў сям'ю дзяцей у пачатку лютага 1990 г. Лену і Мішу — з Магілёўскага дома дзіцяці, а Міхаську — з Бабруйскага. Потым даведалася, што ў Магілёўскім жывуць дзве сястрычкі Міхаські, і, безумоўна ж, вырашыла ўзяць і іх. Яна і яе муж Сяргей Аляксеевіч, які працуе прарабам Клічаўскай МПМК-258, рашэннем райвыканкома зацверджаны бацькамі-выхавацелямі. Вось так разам яны вырашылі папоўніць сям'ю. Сваіх чацвёра, няхай будзе яшчэ пяцёра.

— Сябруем з мужам з дзяцінства... Верылі, што па жыцці будзем ісці разам і што ў нас будзе вялікая сям'я,— прызнаецца Маргарыта Уладзіміраўна,— так што ўсё прадумана.

Успамінае, як выбірала сваіх малышоў у дзіцячым доме. Зайшлі з дырэктарам Людмілай Пятроўнай Дземянчук, дзеці сядзелі за сталом. Усе разам узнялі галоўкі насустрач цётцы, у кожнага ў вачах надзея: «Можа, гэта мая мама?»

Людміла Пятроўна падыходзіла да тых, якіх можна было браць у сям'ю, і гладзіла па галоўцы. Такі быў умоўны знак, каб не патрывожыць параненыя душы

М. У. Кундзікава сярод сваіх дзяцей.

астатніх. Маргарыта Уладзіміраўна глядзела на аднаго, другога, трэцяга... Сэрца разрывалася. Усім патрэбна мама. Але ж ці ўсіх возьмеш?

— Калі б не муж, я б не адважылася на такі крок,— працягвае Маргарыта Уладзіміраўна.— Залатыя ў яго рукі і дзяцей любіць.

А ім, гэтым птушаняткам, вельмі патрэбна сям'я, нармальнае жыццё. Якія ўмовы ў дзіцячых садах ні стварай, а сям'і не заменіш.

— Лена і Міша адстаюць у развіцці ад сваіх цяперашніх брацікаў Захаркі і Ягоркі, маіх родных сыноў,— расказвае Маргарыта Уладзіміраўна.— Адкуль ім ведаць тое, што ведаюць нашы дзеці. Калі зайшлі ў кватэру, вельмі здзіўляліся ўсяму: мэблі, хатнім рэчам. А якімі вачамі глядзелі, як пякуцца бліны, робяцца дранікі, пельмені. Яны ж гэтага ніколі не бачылі.

Рашэннем Клічаўскага райвыканкома за дзіцячым домам сям'і Кундзікавых замацаваны шэфы: раённая паліклініка, гарпа, камбінат бытавога абслугоўвання, дрэваапрацоўчы камбінат, МПМК-258, Магілёўскі саўгас-тэхнікум. Дзіцячы фонд падарыў халадзільнік і тэлевізар.

Пяцёра дзяцей: Захар, Ягор, Міхаіл, Алена і Кацярына ўжо школьнікі. Што казаць — клопатаў хапае. Але хапае на ўсіх і душэўнай цеплыні, і мацярынскай любові. Ніхто не ў крыўдзе — ні свае родныя, ні прыёмныя. Гэта адна вялікая, дружная і шчаслівая сям'я. *Н. Юркіна.*

Чарнобыльскі след

26 красавіка 1986 г. наша жыццё расколалася на дзве часткі: да і пасля Чарнобыля. На вялікі жаль, чорны смерч радыяцыі зачапіў і Клічаўшчыну. Праўда, толькі крылом. Паводле паведамлення кампетэнтных службаў радыенуклідамі (цэзій-137 і стронцый) забруджана ўсходняя частка раёна — тэрыторыя Доўгаўскага сельсавета. Тут у 17 населеных пунктах забруджанасць радыенуклідамі ад 1 да 5 кюры на квадратны кіламетр. Яны знаходзяцца пад перыядычным радыяцыйным кантролем.

Бяда спасцігла лясы Клічаўшчыны: з 86 132 гектараў 14 009 забруджаныя. Такія плошчы выяўлены ў Патоцкім, Усакінскім, Ганчанскім, Клічаўскім лясніцтвах, 6658 гектараў у Доўгаўскім лясніцтве (62 гектары ад 10 да 15 кюры на квадратны кіламетр).

У верасні 1990 г. райвыканком зацвердзіў «Праграму па ліквідацыі на тэрыторыі раёна вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС». Яна прадугледжвае вырашэнне дзвюх асноўных праблем: забеспячэнне жыццядзейнасці насельніцтва, якое пражывае на забруджанай тэрыторыі; размяшчэнне перасяленцаў з забруджаных тэрыторый іншых раёнаў.

Клічаўшчына гасцінна сустрэла сем'і, што прыехалі сюды з раёнаў адсялення, для іх выдзелены 72 кватэры. У калгасе «Радзіма» для перасяленцаў пабудаваны пасёлак. 8 сем'яў атрымалі кватэры ў пасёлку, што пабудаваны ў калгасе імя Будзённага. Асаблівая трывога за дзяцей. У зоне працуюць 4 школы, дзе навучаецца 150 школьнікаў. У сем'ях пражывае 80 дзяцей дашкольнага ўзросту. Па лініі арганізацыі «Дзеці Чарнобыля» школьнікі і дашкольнікі выязджаюць на лячэнне і аздараўленне ў Прыбалтыку і на Чарнаморскае ўзбярэжжа.

Апошняя вышыня маёра

Іван Трафімавіч Кавалёў нарадзіўся ў 1939 г. ў в. Ядраная Слабада Клічаўскага раёна. Працаваў у Кіеве, Казахстане. З 1962 г. ў міліцыі. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

...Суботні дзень 1991 г. ў станіцы Засаўскай Краснадарскага краю прайшоў без здарэнняў. Але а трэцяй гадзіне ночы ў кватэры ўчастковага Кавалёва пачуўся тэлефонны званок. Вартаўнік прадуктовага магазіна паведаміў, што невядомыя, якія прыехалі на машынах, спрабуюць прабрацца ў склад. Кавалёў хуценька

І. Т. Кавалёў.

сабраўся і выскачыў на вуліцу. Пазней высветлілася: злачынцы «бралі» магазін пад покрывам ночы, спадзеючыся і на гэты раз пазбегнуць пакарання.

У суседнім квартале Іван Трафімавіч заўважыў чужыя «Жыгулі» — ясна, на «шухеры». І тут жа пачалася перастрэлка. Участковы стаў на шляху добра арганізаванай злачыннай групы. У няроўнай схватцы Іван Трафімавіч быў смяротна паранены.

У дзень яго пахавання мора станічнікаў выйшла на вуліцы, каб развітацца з чалавекам, які столькі сіл аддаў у імя іх спакою. Было да слёз крыўдна: да выхаду на заслужаны адпачынак яму заставалася ўсяго некалькі месяцаў. Чвэрць стагоддзя назад прыехаў сюды Іван Трафімавіч з сям'ёй з Беларусі. За сумленнасць, за цвёрды, але памяркоўны характар станічнікі праўвалі беларуса Кавалёва казаком. Тут ён даслужыўся да звання маёра. На жаль, гэта была апошняя яго вышыня.

М. Таргоня.

Дараваць можна, але забыць нельга

З успамінаў Марыі Якімаўны Ананіч

Той цёплы майскі дзень 1944 г. не забуду ніколі. Мы ўжо ведалі аб перамогах Чырвонай Арміі, спадзяваліся, што і для нас вайна хутка скончыцца, не давядзецца больш калаціцца ад страху пры кожным з'яўленні немцаў. Хто б мог падумаць, што наперадзе яшчэ больш нялёгкія месяцы новай няволі.

...Немцы акружылі нашу невялічкую вёсачку Чырвоная Ніва. Яны заходзілі ў кожную хату і, акінуўшы позіркам маладых дзяўчат і жанчын, загадвалі ім хутка збірацца ў дарогу. Куды і ці надоўга — не казалі. Супраціўляцца было дарэмна. Пры нязначнай затрымцы непаслухмяных білі прыкладамі аўтаматаў. Пазней да нас далучылі моладзь з суседняй в. Люціна і натоўпам у 50 чалавек пад аховай пагналі па дарозе ў в. Заполле. Думалі, што вядуць капаць акопы. Але ўсё аказалася значна горш: забралі на работу ў Германію. Дагэтуль без слёз не магу ўспамінаць тую дарогу. Да Бабруйска — у перапоўненых да адказу грузавіках, потым два тыдні праз Полыччу і Германію ў бітком набітых таварных вагонах амаль без вады і ежы.

З размеркавальнага лагера, куды мы спачатку трапілі, мяне і яшчэ некалькіх землякоў накіравалі ў г. Кёльн. Амаль палова апынулася на фабрыках і заводах, нас жа, шэсць дзяўчынак, узялі прыбіраць вуліцы. Разбіралі разбураныя ад бомбаў дамы, на тачках вазілі цэглу і смецце. Праца цяжкая, не жаночая, але выручаў вясковы гарт. Пад вечар ужо ледзь хапала сіл дайсці да лагера, памыцца, праглынуць рэдкі суп з агародніны без мяса з маленькім кавалачкам хлеба. Ноч праводзілі на вузкіх двухпавярховых нарах. Раніцай у спешцы выпівалі кубак цёплай бурды (лічылася гэта кавай) і ў суправаджэнні аховы ішлі на працу. Нішчымным быў і абед: дзве лустачкі хлеба, часам з танюсенькім кружочкам таннай каўбасы. І так з дня ў дзень, доўгія 8 месяцаў. Голад мучыў пастаянна. У размовах кожны дзень успаміналі беларускую бульбу, марылі, што, калі вернемся дамоў, будзем есці яе колькі душа пажадае: варыць клёцкі, пячы дранікі.

Месяцы за 4 да вызвалення мяне з сяброўкай узялі служанкамі ў сям'ю нямецкага начальніка. У той час у Германіі ўжо не спадзяваліся на перамогу і, як бы замольваючы грахі, ставіцца да нас пачалі лепш. Неяк на вялікдзень гаспадыня спякла пірог і пачаставала нас, а палову дала ў лагер нашым землякам. Зрэшты і раней сустракаліся сярод гараджан спагадлівыя людзі: калі ціхенька сунуць акраец хлеба, калі хлебныя карткі. Гэтыя добрыя знакі павагі і спачування радавалі, але істотна аблягчыць наша жыццё не маглі.

Нацярпеліся мы страху і перад канцом вайны. Амаль кожны дзень бамбілі саюзнікі. Горад ператварыўся ў суцэльныя руіны. Бомбы неслі смерць не толькі немцам, нямала загінула і нашых людзей. Некалькі тыдняў не дажыў да вызвалення малодшы брат маёй сяброўкі. Да сённяшняга дня засталіся шрамы на галаве, назе і пад сэрцам у Ганны Паўлаўны Ананіч з в. Люціна. Але галоўныя шрамы ад вайны засталіся ў душы.

Нядаўна мне зноў давялося пабываць у г. Кёльн. Бургамістр горада запрасіў у госці групу былых «усходніх рабочых» з розных гарадоў былога Савецкага Саюза. Мы хадзілі па тых месцах, дзе жылі і працавалі, сустракаліся з прадстаўнікамі розных грамадскіх арганізацый, студэнтамі, школьнікамі. І ў душы не было крыўды на гэтых людзей. Іншае пакаленне, іншая краіна. Але і забыцца, выкрасліць з памяці ўсё, што здарылася, нельга. Гэта ж маё жыццё, гісторыя майго народа.

Людзі працоўнай доблесці

КУДЗІН Ганна Мікітаўна — перадавік сельскагаспадарчай вытворчасці, Герой Сацыялістычнай Працы. Нарадзілася 1.1.1930 г. ў в. Старое Курганне. Працоўную дзейнасць пачала ў 1948 г. ў калгасе «Авангард» Клічаўскага раёна. З 1952 г. свінарка, у 1956—60 гг. цялятніца саўгаса «Красінскі». У 1966 г. за поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Узнагароджана ордэнам Леніна, медалямі. Жыве ў г. Бабруйску. Пра яе нялёгкі лёс расказваецца ў гэтым матэрыяле.

Калі Ганна Мікітаўна Кудзін пераехала ў Бабруйск і ўладкавалася на кандытарскую фабрыку, калючыя языкі кпілі:

— Во, гераіня на «салодкую работу» падалася.

— А што, Залатая Зорка ёсць — навошта гноем дыхаць...

Толькі не ведалі, як не салодка на душы было ў самой Ганны Мінітаўны і калі пераязджала ў горад, і калі працавала ў мармеладным цэху. Сама яна не раз прызнавалася, што нарадзілася жывёлаводам, што гэта прафесія, якой яна прысвяціла жыццё,— яе лёс. Так, сам лёс нібыта вёў яе да вяршынь жывёлагадоўчага майстэрства.

Ёй было ўсяго 9 гадоў, калі на беларускім фронце загінуў бацька. У мачыхі былі свае дзеці, і Ганна з братам апынуліся ў Магілёўскім дзіцячым доме. А тут у хуткім часе вайна, якая закінула дзясцей-сірот далёка ў Казахстан, у адзін з населеных пунктаў Джамбульскага раёна. Дзяцей з Беларусі прытуліў дзіцячы дом імя Абая.

— Як родных прынялі нас казахі,— расказвала Ганна Мікітаўна.— Адразу ў школу пайшлі. Праўда, выкладанне вялося на казахскай мове, таму яе мы вывучалі, як кажуць, з азоў.

Аб жыцці ў далёкім Казахстане ў Ганны Мікітаўны засталіся самыя цёплыя ўспаміны. Ёй, дачцэ селяніна, няцяжка было прызвычаіцца да сельскай гаспадаркі. Даспадобы прыйшлося і тое, што дзеці казахаў праходзілі абавязковае навучанне ў жывёлагадоўчай школе. Спачатку дзіўна было бачыць, як хлапчук 3—4 гадоў так смела і зграбна сядзіць вярхом на кані. Там з маленства дзеці прывыкалі да жывёлы, дапамагалі бацькам.

— Дарэчы, пры дзіцячым доме ўтрымлівалі невялікія статкі авечак і цялят, якіх выхаванцы са старэйшымі таксама даглядалі,— працягвала Г. Кудзін.— Для цялят, напрыклад, быў спецыяльны басейн з пляцоўкай, дзе раз у тыдзень іх купалі, а на пляцоўцы давалі магчымасць ім адпачыць і абсохнуць. Так жывёла прывыкала да працэдур і да нас, а мы вучыліся даглядаць яе. У школе мы асвойвалі не толькі правілы догляду, а вывучалі таксама склад лепшых рацыёнаў кармлення, заатэхніку, ветэрынарыю. Такім чынам, скончыўшы школу, юнакі і дзяўчаты мелі неабходныя веды і нядрэнныя практычныя навыкі па догляду дамашняй жывёлы.

Прывыкла Ганна да новага месца і вырашыла назаўсёды застацца ў Казахстане. Але пасля выгнання гітлераўцаў з Беларусі ўсё часцей з роднай Клічаўшчыны прыходзілі лісты. Яе мілы лясны край ляжаў у руінах і для яго адраджэння патрэбны былі маладыя рукі. Мясцовыя кіраўнікі не хацелі адпускаць спрытную, працавітую дзяўчынку. Тады яна звярнулася ў Джамбульскі райком камсамола, там ёй выдалі пуцёўку ў калгас «Авангард» — прама ў родную вёску Старое Курганне. З гэтай пуцёўкай і прыйшла Ганна да старшыні калгаса.

— Лёгка сказаць — на ферму,— старшыня горка ўсміхнуўся.— А дзе яна, тая ферма? Вось вас, кажаш, вучылі даглядаць цялят?

— Так,— пагадзілася Ганна,— вельмі добра вучылі...

— А ў нас ферма камбінаваная: тры каровы, двое цялят, чатыры свінні. Якую жывёлу будзеш даглядаць?

— А якую скажаце, тую і буду,— пачуў рашучы адказ.

Старшыня яшчэ доўга разважаў пра жывёлу, пра кармы і памяшканні для яе. Яго пераканаўчыя меркаванні, што свінні самая лепшая ў тых умовах для колькаснага развядзення жывёла, зразумела і Ганна. Так яна стала свінаркай.

Дзесяць гадоў працавала ў калгасе «Авангард», потым — у саўгасе «Красінскі». Пачынаючы з тых чатырох свінак, выгадавала іх не адну тысячу. А калі свінаферму перадалі другой гаспадарцы, а ў «Красінскім» арганізавалі ферму па вырошчванню буйной рагатай жывёлы, пайшла даглядаць цялят.

Пэўна, не ўсе веды, атрыманыя ў школе Джамбульскага раёна, можна было рэалізаваць тут. І памяшканне для жывёлы, і кармы, і кліматычныя ўмовы (зімой вада замярзала) не давалі магчымасці ўсё зрабіць як трэба. Але Ганна настойліва ажыццяўляла тыя правілы догляду маладняку, што спасцігла ў Казахстане. І вынікі працы задавальнялі ўсіх.

— Да 1971 г. працавала на ферме,— гаворыць Ганна Мікітаўна.— Гэта, лічы, 22 гады ад цямна да цямна з шуфлем ды

Г. М. Кудзін.

В. Р. Александровіч.

М. С. Аўтуховіч.

Г. П. Багрыцэвіч.

тачкай... А тут падкралася хвароба — стала дрэнна бачыць. Разгарну часопіс ці газету — літары то танцуюць, то зліваюцца ў адну пляму. Думала, само пройдзе, саромелася да доктара звярнуцца. Меркавала: а што людзі скажуць, яшчэ падумаюць, што ад цяжкасцей уцякла. Мае перажыванні заўважыў нават першы сакратар Магілёўскага абкома партыі, які аднойчы завітаў на ферму. Прызналася яму ў сваёй бядзе. Ён усё зразумеў і тут жа дапамог. Накіравалі мяне ў Мінск да вядомага прафесара-акуліста Т. В. Бірыч, якая паставіла несуцяшальны дыягназ. Было забаронена выконваць цяжкую працу. Патрэбны былі спакой і адпачынак, адпаведнае лячэнне, а потым — хірургічная аперацыя. Але ж я без работы не магла жыць. Вось і ўладкавалася на больш «лёгкую» і «салодкую» работу — у мармеладны цэх. Колькі працавала тут, усё спадзявалася, што зрок палепшыцца і можна будзе вярнуцца на любімую працу. Толькі паляпшэння не дачакалася і да пенсіі. Так і засталася ў горадзе.

Дай Вам Бог здароўя і шчасця, Ганна Мікітаўна! А за астатняе не перажывайце.

М. Дз. Грузд.

М. А. Грузд.

На Клічаўшчыне не забыліся пра Вас, успамінаюць добрым словам. Для землякоў Вы — зорка першай велічыні, пакуль што на ўвесь раён адзіная гераіня працы.

АЛЕКСАНДРОВІЧ Васіль Рыгоравіч. Нарадзіўся 4.11.1938 г. ў в. Стаялава Клічаўскага р-на. У 1956 г. працаваў у Клічаўскім лясгасе. У 1962 г. скончыў вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі ў Бабруйску. У 1962—74 гг. трактарыст саўгаса «Красінскі», з 1974 г. працуе ў Магілёўскім саўгасе-тэхнікуме. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, «Знак Пашаны».

АЎТУХОВІЧ Міхаіл Сцяпанавіч. Нарадзіўся ў 1928 г. ў в. Стаялава Клічаўскага р-на. Працоўную дзейнасць пачаў у 1946 г. трактарыстам. Больш за 40 гадоў апрацоўваў палі ў вёсках Дзмітраўка, Маркаўшчына, Стаялава. Прозвішча яго было першым выгравіравана на Пераходным кубку пераможцаў спаборніцтва сярод механізатараў раёна. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1989 г.

БАГРЫЦЭВІЧ Георгій Пятровіч. Нарадзіўся ў 1935 г. ў в. Курганне Клічаўскага р-на. З 1959 г. шафёр саўгаса «Нясята». У 1960—67 гг. загадчык склада спіртзавода, у 1967—71 гг. шафёр. У 1964 г. завочна скончыў Шанталаўскі сельскагаспадарчы тэхнікум у Смаленскай вобл. У 1971—86 гг. брыгадзір паляводчай брыгады, у 1986—88 гг. інжынер па тэхніцы бяспекі, у 1988—91 гг. загадчык па гаспадарцы. З 1991 г. працуе брыгадзірам на жывёлагадоўчым комплексе. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны».

БЕДУНКЕВІЧ Станіслаў Іосіфавіч. Нарадзіўся ў 1930 г. ў в. Коўбча Клічаўскага р-на. Працоўную дзейнасць пачаў з 1946 г. трактарыстам. Пасля службы

С. І. Бедункевіч.

Я. І. Белакурскі.

В. П. Буцанец.

А. Д. Буяк.

ў Савецкай Арміі з 1951 г. трактарыст калгаса «Савецкая Беларусь». Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны». З 1985 г. на пенсіі. Жыве ў в. Коўбча.

БЕЛАКУРСКІ Яўген Іванавіч. Нарадзіўся ў 1939 г. ў в. Бацэвічы Клічаўскага р-на. Працоўную дзейнасць пачаў у 1962 г. шафёрам у райсельгастэхніцы. З 1979 г. шафёр у райсельгасхіміі. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Славы III ступені.

БУЦАНЕЦ Вольга Піліпаўна. Нарадзілася ў 1933 г. ў в. Усакіна Клічаўскага р-на. У 1950—72 гг. свінарка калгаса «Іскра камуны», у 1972—90 гг. загадчыца свінагадоўчай фермы калгаса «Савецкая Беларусь» у в. Закуцце. Узнагароджана ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга. З 1990 г. на пенсіі. Жыве ў в. Закуцце.

БУЯК Аляксандр Давыдавіч. Нарадзіўся 9.1.1919 г. ў в. Арэхаўка Клічаўскага р-на. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў выкладчыкам ваеннай справы ў Пярэкальскай школе, старшынёй калгаса ў в. Плоскае. З 1957 г. брыгадзір паляводчай брыгады, даглядчык буйной рагатай жывёлы ў саўгасе «Добраахвотнік». Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, 2 ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1982 г.

ГРУЗД Марат Дзмітрыевіч, трактарыст-выпрабавальнік Мінскага трактарнага завода, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Нарадзіўся 1.1.1932 г. ў в. Турэц Клічаўскага р-на. Пасля заканчэння Дзмітраўскай сямігодкі працаваў слесарам-інструментальшчыкам на Мінскім трактарным заводзе. З 1956 г. трактарыст-выпрабавальнік у цэху новых машын. З 1971 па 1984 г. трактарыст-кансультант у замежных краінах, куды экспартавалася прадукцыя Мінскага трактарнага завода. У 1971 г. за асваенне серыйнай вытворчасці уніфікаванага колавага трактара «Беларусь» прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР. Памёр у 1988 г.

ГРУЗД Міхаіл Аляксандравіч. Нарадзіўся ў 1949 г. ў в. Нясята Клічаўскага р-на. У 1968 г. скончыў прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 1 у Магілёве, працаваў трактарыстам у саўгасе «Нясята». Пасля службы ў Савецкай Арміі з 1970 г. працуе трактарыстам у саўгасе «Нясята». Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны».

ЖУДРО Генадзь Фёдаравіч. Нарадзіўся ў 1933 г. ў в. Канстантоў Клічаўскага р-на. Працоўную дзейнасць пачаў у 1953 г. прычэпшчыкам у калгасе «Перамога» (цяпер Магілёўскі саўгас-тэхнікум). У 1954—57 гг. у Савецкай Арміі. У 1959 г. скончыў вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі ў Бабруйску, у 1959—63 гг. трактарыст калгаса «Перамога». У 1964 г. скончыў аднагадовую школу падрыхтоўкі кіруючых кадраў пры Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. У 1964—71 гг. брыгадзір комплекснай брыгады калгаса «Зара», у 1971—74 гг. трактарыст саўгаса «Зара», з 1974 г. ў Магілёўскім саўгасе-тэхнікуме. Дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі ў 1975—80 гг. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Г. Ф. Жудро.

П. К. Забродскі.

С. Н. Кавалёў.

В. І. Каралёк.

В. С. Клепча.

ЗАБРОДСКІ Пётр Казіміравіч. Нарадзіўся ў 1910 г. ў пас. Майдан Барашыўскага р-на Жытомірскай вобл. У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у вызваленні Беларусі, Украіны, Польшчы. У 1949 г. накіраваны на работу ў Беларусь. Працаваў намеснікам начальніка абласнога управалення сельскай гаспадаркі ў Бабруйску. У 1953 г. ў ліку 30-тысячнікаў накіраваны ў Клічаўскі р-н старшынёй калгаса «Савецкая Беларусь». Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны». Жыве ў г. п. Докшыцы Віцебскай вобл.

КАВАЛЁЎ Сцяпан Несцеравіч. Нарадзіўся ў 1889 г. ў в. Лянёўка Клічаўскага р-на. З 1922 г. працаваў у леспрамгасе бракёрам-прыёмшчыкам, майстрам, дзесятнікам. З 1953 г. на пенсіі. Узнагароджаны ордэнам Леніна. Памёр у 1961 г.

КАРАЛЁК Валянціна Іванаўна. Нарадзілася ў 1942 г. ў в. Антонаўка Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл. Працавала даяркай у саўгасе «Краснапольскі». У 1963 г. скончыла Клімавіцкі зааветэрынарны тэхнікум і да 1986 г. працавала загадчыцай малочнатаварнай фермы ў племсаўгасе «Нясята», з 1986 г.— заатэхнік-селекцыянер. Узнагароджана ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны».

КЛЕПЧА Васіль Сцяпанавіч. Нарадзіўся 5.3.1921 г. ў в. Ялоўка Клічаўскага р-на. Працоўную дзейнасць пачаў з 1936 г. ў калгасе «Вендараж» Магілёўскага р-на. У 1940—46 гг. у Чырвонай Арміі, служыў на Далёкім Усходзе. Скончыў завочна Усесаюзны ўлікова-крэдытны тэхнікум (1954), Мінскі інстытут народнай гаспадаркі (1960). У 1946—48 гг. начальнік групы інкасатараў Лунінецкага аддзялення Дзяржбанка Брэсцкай вобл., у 1948—55 гг. кіраўнік аддзялення Дзяржбанка ў Жабінкаўскім р-не, у 1955—58 гг.— у Іванаўскім р-не Брэсцкай вобл., у 1958—59 гг. узначальваў аддзяленне Дзяржбанка ў г. Барысаў Мінскай вобл., у 1959—64 гг. начальнік аддзела кадраў Беларускай рэспубліканскай канторы Дзяржбанка, у 1964—71 гг. намеснік кіраўніка, у 1971—86 гг. кіраўнік Беларускай рэспубліканскай канторы Дзяржбанка. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, «Знак Пашаны», медалямі. З 1986 г. на пенсіі. Жыве ў Мінску.

КОЙПІШ Кацярына Мікалаеўна. Нарадзілася ў 1921 г. ў в. Закоркі Клічаўскага р-на. Працавала ў паляводстве і жывёлагадоўлі. У 1962—77 гг. даярка калгаса імя Тэльмана. Узнагароджана ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі. З 1977 г. на пенсіі.

КОМАР Уладзімір Фядосавіч. Нарадзіўся ў 1932 г. ў в. Канстантоў. Працоўную дзейнасць пачаў у 1947 г. трактарыстам Бацэвіцкай МТС. Пасля службы ў Савецкай Арміі ўзначальваў авечкаферму ў калгасе «Перамога», комплексную брыгаду ў калгасе «Зара». З 1947 г. ў Магілёўскім саўгасе-тэхнікуме: начальнік вытворчага ўчастка, брыгадзір комплекснай паляводчай брыгады. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны».

А. Р. Манёнак.

І. С. Пракапёнак.

К. М. Койпіш.

У. Ф. Комар.

У. П. Коўрык.

І. І. Кудзін.

КОЎРЫК Уладзімір Пятровіч. Нарадзіўся ў 1931 г. ў в. Равок Клічаўскага р-на. Працоўную дзейнасць пачаў з 1951 г. У 1954 г. скончыў вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі. У 1957—92 гг. трактарыст-машыніст саўгаса «Нясята». Узнагароджаны ордэнам Леніна. З 1992 г. на пенсіі. Жыве ў в. Нясята.

КУДЗІН Іван Іванавіч. Нарадзіўся ў 1928 г. ў в. Таценка Клічаўскага р-на. З 1945 г. працаваў у саўгасе «Нясята». У 1957—73 гг. кіраўнік Буднеўскага аддзялення саўгаса, у 1973—81 гг. старшы аграном. Узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Памёр у 1987 г.

МАНЁНАК Аляксандр Раманавіч. Нарадзіўся ў 1930 г. ў в. Дубно Клічаўскага р-на. Працоўную дзейнасць пачаў у 1948 г. трактарыстам Красінскай МТС. У 1956—72 гг. брыгадзір трактарнай брыгады Красінскай МТС, калгаса «Калектывіст», саўгаса «Красінскі», саўгаса «Клічаўскі» (у 1972—82 гг. трактарыст гэтага саўгаса). Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, бронзавым медалём ВДНГ. Памёр у 1982 г.

ПРАКАПЁНАК Іван Савельевіч. Нарадзіўся ў 1934 г. ў в. Дзмітраўка Клічаўскага р-на. Працоўную дзейнасць пачаў з 1954 г. ў леспрамгасе, дзе да 1989 г. працаваў шафёрам лесавозной машыны. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны». З 1989 г. на пенсіі. Жыве ў в. Дзмітраўка.

САЗАНАВЕЦ Анатоль Савельевіч. Нарадзіўся 8.10.1938 г. ў в. Заполле Клічаўскага р-на. У 1955 г. скончыў курсы механізатараў. Працуе трактарыстам-машыністам у калгасе імя Будзённага. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, «Знак Пашаны».

СІНЬКЕВІЧ Міхаіл Аляксандравіч. Нарадзіўся ў 1938 г. ў в. Шкава Акцябрскага р-на Гомельскай вобл. Працоўную дзейнасць пачаў у 1957 г., працаваў памочнікам экскаватарщыка. Пасля службы ў Савецкай Арміі скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Працаваў загадчыкам механічнай майстэрні ў саўгасе «Насовічы» Добрушскага р-на Гомельскай вобл. У 1967—75 гг. галоўны інжынер, намеснік старшыні калгаса «Гігант», у 1975—77 гг. старшыня калгаса імя Някрасава Бабруйскага р-на, у 1977—83 гг. намеснік старшыні, начальнік управалення сельскай гаспадаркі Бабруйскага райвыканкома. У 1983—90 гг. першы сакратар Клічаўскага райкома партыі. З 1990 г. старшыня Клічаўскага раённага Савета дэпутатаў працоўных. Узнагароджаны 2 ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, 2 ордэнамі «Знак Пашаны».

СТРАХ Васіль Фёдаравіч. Нарадзіўся ў 1933 г. ў в. Турчылоў Клічаўскага р-на. Працоўную дзейнасць пачаў у 1948 г. З 1951 г. трактарыст саўгаса «Клічаўскі».

А. С. Сазанавец.

М. А. Сінькевіч.

В. Ф. Страх.

Я. А. Стукальскі.

І. І. Тарэлка.

Г. М. Трызна.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Славы III ступені.

СТУКАЛЬСКІ Яўген Акімавіч. Нарадзіўся ў 1928 г. ў в. Лаззё Клічаўскага р-на. Больш за 30 гадоў працуе ў лясной гаспадарцы: быў лесніком, піларамшчыкам. Зараз ляснік Бёрдаўскага лясніцтва. Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны», Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ТАРЭЛКА Іосіф іосіфавіч. Нарадзіўся ў 1935 г. ў в. Нясята Клічаўскага р-на. Працоўную дзейнасць пачаў у 1955 г., працаваў трактарыстам у Міёрскай МТС Віцебскай вобл. У 1956—58 гг., 1961—62 гг. рабочы Ерагодскага леспрамгаса ў Архангельскай вобл. У 1958—61 гг. і з 1962 г. трактарыст саўгаса «Нясята», слесар па рамонце сельгасмашын. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, бронзавым медалём ВДНГ. Памёр у 1992 г.

ТРЫЗНА Ганна Міхайлаўна. Нарадзілася ў 1926 г. ў в. Бярозаўка Клічаўскага р-на. У 1945—54 гг. настаўніца пачатковых класаў у в. Малая Вольса. У 1954—80 гг. брыгадзір комплекснай брыгады ў калгасе імя Будзённага, у 1981—82 гг. інжынер па тэхніцы бяспекі. Выбіралася народным дэпутатам раённага Савета. Узнагароджана ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны». З 1982 г. на пенсіі.

ХАРЛАП Іван Кузьміч. Нарадзіўся 2.4.1937 г. ў в. Ваевічы Клічаўскага р-на. З 1955 г. працаваў рабочым на будоўлі ў Барнауле, у 1956—60 гг.— на Друцкім лесапункце Клічаўскага р-на, у 1960—63 гг.— у райпрамкамбінаце. У 1969—79 гг. шафёр у райсельгастэхніцы, з 1979 г.— у райсельгасхіміі. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў.

ЮРКАВЕЦ Іван Сцяпанавіч. Нарадзіўся ў 1935 г. ў в. Убалацце Клічаўскага р-на. Працоўную дзейнасць пачаў з 1953 г. ў Клічаўскім лясгасе. Пасля службы ў Савецкай Арміі з 1958 г. працаваў машыністам на ТЭЭМП-2М па здабычы кускавога торфу, у 1962—92 гг.— машыністам па здабычы фрэзернага торфу на торфапрадпрыемстве «Ганчанскае». З 1992 г. слесар па рамонце машын. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны».

Заслужаныя работнікі Беларусі

Заслужаныя настаўнікі

АТРАШОНАК Марыя Рыгораўна, нарадзілася ў 1921 г. ў в. Дзмітраўка Клічаўскага р-на. З 1940 г. настаўніца рускай мовы і літаратуры Пухальскай сямігадовай школы Замбраўскага р-на Беластоцкай вобл. Удзельніца партызанскага руху на Клічаўшчыне. У 1946—48 гг. інспектар вячэрніх школ у Жалудоцкім р-не, у 1948—76 гг. настаўніца рускай мовы і літаратуры Дзмітраўскай СШ. Званне прысвоена ў 1967 г. Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі. З 1976 г. на пенсіі. Жыве ў в. Дзмітраўка.

БУЯК Іван Давыдавіч, нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Старая Арэхаўка Клічаўскага р-на. У 1939—41 гг. дырэктар Хрыпялёўскай НСШ у Магілёўскім р-не. Удзельнік партызанскага руху на Клічаўшчыне. У 1944—81 гг. намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце, дырэктар, настаўнік Нясяцкай СШ. Званне прысвоена ў 1960 г. З 1981 г. на пенсіі. Жыве ў Магілёве.

І. К. Харлап.

І. С. Юркавец.

М. Р. Атрашонак.

І. Д. Буяк.

БЯЛЯК Паліна Фёдараўна, нарадзілася ў 1915 г. ў в. Стаялава Клічаўскага р-на. У 1932—41 гг. настаўніца пачатковых класаў у школах Клічаўскага р-на. У 1944—47 гг. намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Маркаўшчынскай сямігадовай школы, у 1947—71 гг. настаўніца пачатковых класаў Клічаўскай СШ. Званне прысвоена ў 1965 г. З 1971 г. на пенсіі. Жыве ў г. п. Клічаў.

ГЕРАШЧАНКА Аляксандра Елісееўна, нарадзілася ў 1935 г. ў в. Вялікі Восаў Краснапольскага р-на. У 1958—61 гг. настаўніца Наваельненскай СШ Краснапольскага р-на, у 1961—67 гг. настаўніца, намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце сямігадовай школы на станцыі Азіяцкая Кучывінскага р-на Свярдлоўскай вобл., у 1967—91 гг. настаўніца матэматыкі Дзмітраўскай СШ Клічаўскага р-на. Званне прысвоена ў 1976 г. З 1991 г. на пенсіі. Жыве ў в. Дзмітраўка.

КАЗЛОЎ Уладзімір Віктаравіч, нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Закупленне Клічаўскага р-на. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1945—46 гг. настаўнік Ядрана-Слабадской школы, у 1946—85 гг. дырэктар Доўгаўскай СШ. Званне прысвоена ў 1972 г. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай рэвалюцыі, Славы II і III ступені, Айчыннай вайны II ступені. Памёр у 1985 г.

КАНДРАТОВІЧАнуфрый Прохаравіч, нарадзіўся ў 1913 г. ў в. Дзмітраўка Клічаўскага р-на. У 1934 г. выхавацель Ратамскага дзіцячага дома ў Мінскім р-не. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1946—73 гг. настаўнік, дырэктар, арганізатар пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай работы Дзмітраўскай СШ. Званне прысвоена ў 1968 г. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і Айчыннай вайны II ступені. Памёр у 1991 г.

КАНДРАТОВІЧ Вера Рыгораўна, нарадзілася ў 1915 г. ў г. Асіповічы. У 1944—47 гг. працавала настаўніцай Маркаўшчынскай сямігадовай школы, у 1947—70 гг. настаўніца Клічаўскай СШ. Званне прысвоена ў 1967 г. Памерла ў 1979 г.

КАНДРАЦЕНКА Марыя Мітрафанаўна, нарадзілася ў 1923 г. ў в. Зеляніца

П. Ф. Бяляк.

А. Е. Герашчанка.

У. В. Казлоў.

А. П. Кандратовіч.

В. Р. Кандратовіч.

М. М. Кандраценка.

В. М. Касцян.

У. В. Скараходаў.

Кіраўскага р-на. У 1944—49 гг. настаўніца ў Кіраўску, у 1949—78 гг. настаўніца, намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Бацэвіцкай СШ Клічаўскага р-на. Званне прысвоена ў 1968 г. З 1978 г. на пенсіі. Жыве ў в. Бацэвічы.

КАСЦЯН Вольга Маркаўна, нарадзілася ў 1923 г. ў в. Усохі Клічаўскага р-на. У 1944—47 гг. працавала настаўніцай Нясяцкай сямігадовай школы, у 1947—86 гг. настаўніца, намеснік дырэктара, дырэктар Усохскай 8-гадовай школы. Званне прысвоена ў 1967 г. З 1986 г. на пенсіі. Жыве ў в. Усохі.

СКАРАХОДАЎ Уладзімір Васілевіч, нарадзіўся ў 1939 г. ў в. Роўнішча Краснапольскага р-на. У 1961—66 гг. настаўнік працы Сялібскай СШ Бярэзінскага р-на Мінскай вобл., у 1966—89 гг. выкладчык, загадчык аддзялення, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Магілёўскага саўгаса-тэхнікума. Званне прысвоена ў 1976 г. Памёр у 1989 г.

ЦІТКО Леанард Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1929 г. ў в. Горанка Краснапольскага р-на. У 1951—53 гг. працаваў настаўнікам, у 1953—58 гг. намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Пярэкальскай СШ, з 1958 г. дырэктар Ганчанскай СШ. Званне прысвоена ў 1967 г. Жыве ў пас. Ганчанскі.

ШАЛАЙ Марыя Дзямідаўна, нарадзілася ў 1924 г. ў в. Стаялава Клічаўскага р-на. Удзельніца партызанскага руху на Клічаўшчыне. У 1944—47 гг. на камсамольскай рабоце. У 1948—86 гг. працавала настаўніцай Стаяльскай 8-гадовай школы. Званне прысвоена ў 1970 г. Узнагароджана ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені. З 1986 г. на пенсіі. Жыве ў в. Стаялава.

Заслужаны работнік гандлю і грамадскага харчавання

АЧЫНОВІЧ Валянціна Фёдараўна, нарадзілася ў 1936 г. ў в. Стаялава Клічаўскага р-на. У 1956—57 гг. працавала ў адным з магазінаў Мінска, у 1957—91 гг. буфетчыца, прадавец, тавараправед, інструктар-арганізатар райспажыўсаюза, загадчыца аддзела універмага ў Клічаве. Званне прысвоена ў 1977 г. З 1991 г. на пенсіі. Жыве ў Клічаве.

Заслужаны работнік прамысловасці

ЮРКАВЕЦ Віктар Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1938 г. ў в. Кавяза Клічаўскага р-на. У 1961—64 гг. працаваў на асваенні цалінных зямель у Казахстане. З 1964 г. рабочы, брыгадзір комплекснай брыгады Клічаўскага лесапункта. Званне прысвоена ў 1976 г. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнай Славы II і III ступені, медалём ВДНГ. Жыве ў в. Кавяза.

Заслужаны ўрач

САМСОНІК Кацярына Міхайлаўна, нарадзілася ў 1924 г. ў в. Міхалоў Клічаўскага р-на. У 1949—52 гг. працавала за-

І. К. Маркаў.

К. М. Самсонік.

Л. М. Цітко.

М. Дз. Шалай.

В. Ф. Ачыновіч.

В. Ф. Юркавец.

гадчыцай Уладзіміраўскага ўрачэбна-бальнічнага ўчастка, у 1952—59 гг.— загадчыца акушэрска-гінекалагічнага, у 1960—69 гг.— хірургічнага аддзяленняў Клічаўскай раённай бальніцы, у 1969—92 гг. была хірургам 4-й паліклінікі ў Мінску. Званне прысвоена ў 1968 г. Памерла ў 1992 г.

Заслужаны сувязіст

МАРКАЎ Іван Кірылавіч, нарадзіўся ў 1925 г. ў в. Смалярня Клічаўскага р-на. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1949—66 гг. начальнік аддзялення сувязі ў в. Бацэвічы і на ст. Нясета, у 1966—82 гг. тэхнік, начальнік, намеснік начальніка, старшы інструктар па эксплуатацыйных і вытворчых пытаннях раённага вузла сувязі. Званне прысвоена ў 1966 г. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Славы III ступені, Айчыннай вайны II ступені. З 1982 г. на пенсіі. Жыве на ст. Нясета.

Нашы землякі — беларускія пісьменнікі

ГАЛІНА ВАСІЛЕЎСКАЯ

Пісьменніца Галіна Ануфрыеўна Васілеўская (дзявочае прозвішча Скрыпка-Банат) нарадзілася ў 1927 г. ў Клічаве. Бацька — інвалід грамадзянскай вайны, быў рабочым-будаўніком, маці — швачкай. З 1932 г. сям'я жыла ў Мінску. Да вайны Г. Васілеўская скончыла 6 класаў 9-й мінскай сярэдняй школы. У 1945 г. экстэрнам здала экзамены за дзесяцігодку, а ў 1950 г. скончыла аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ. Працавала радыёжурналістам (1950—53), літаратурным супрацоўнікам часопіса «Сельская гаспадарка Беларусі» (1953—59), з 1959 г. ў часопісе «Работніца і сялянка», з 1979 г. адказны сакратар часопіса «Полымя». У 1982—88 гг.— дырэктар бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі, з 1988 г. на пенсіі. Узнагароджана медалём, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларусі.

Літаратурнай працай пачала займацца з 1953 г. Спачатку пісала нарысы, артыкулы. У 1959 г. апублікавала першае апавяданне «Блакітныя канверты». У Г. Васілеўскай шмат твораў для дзяцей і юнацтва: дакументальна-мастацкія аповесці пра юную партызанку Рыму Кунько («Маланка ўначы», 1963) і юнага партызана-разведчыка Ціхана Барана («Малюнак на снезе», 1969), аповесць-хроніка «Бывай, Грушаўка» (1978) пра жыццё і ўдзел падлеткаў у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў акупіраваным фашыстамі Мінску. Інтэрнацыянальнай дружбе дзяцей прысвечана яе аповесць «Я еду на вярблюдзе» (1970), напісаная пасля паездкі ў Егіпет. Пра адзін год з жыцця беларуса Віталя Пятроўскага, самага юна-

Г. А. Васілеўская.

Л. М. Дайнека.

га вынаходніка ў былым СССР, расказана ў аповесці «Крылы (1987), дзяцінству В. Харужай прысвечана аповесць «Што помніцца...» (1991). Творы пісьменніцы перакладаліся на рускую, армянскую, малдаўскую і інш. мовы. Песні на словы Г. Васілеўскай напісаў М. Мацісон.

ЛЕАНІД ДАЙНЕКА

Пісьменнік і паэт Леанід Мартынавіч Дайнека нарадзіўся ў 1940 г. ў в. Змітраўка 2-я. У 1956 г. скончыў сярэднюю школу, у 1957—59 гг. вучыўся ў тэхнічным вучылішчы ў Ніжнім Тагіле. У 1959—60 гг. працаваў на металургічным камбінаце, у трэсце «Уралспецбуд», а ў 1960—63 гг. служыў у Савецкай Арміі. Скончыўшы ў 1967 г. аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ, працаваў рэдактарам перадач для дзяцей і юнацтва на Віцебскай студыі тэлебачання. З 1971 г. старшы рэдактар Беларускага тэлебачання ў Мінску, у 1972—89 гг. адказны сакратар часопіса «Маладосць». З 1989 г. загадчык рэдакцыі паэзіі выдавецтва «Мастацкая літаратура». Узнагароджаны медалямі.

Друкавацца пачаў з 1961 г. Пісаў вершы, паэмы, выдаў паэтычныя зборнікі «Галасы» (1969), «Бераг чакання» (1972), «Начныя тэлеграмы» (1974), «Мая вясна саракавая» (1979), «Вечнае імгненне» (1981), «Сняжынкі над агнём» (1988). Некаторыя вершы пакладзены на музыку П. Альхімовічам, А. Залётневым, Ю. Семянякам. З 1976 г. Л. Дайнека аддае перавагу прозе. Першыя яго апавяданні змешчаны ў кнізе «Бацькава крыніца» (1976), якая з'явілася прадвеснікам раманнага эпасу пісьменніка.

Раманы «Людзі і маланкі» (1978), «Запомнім сябе маладымі» (1981) прысвечаны падзеям Кастрычніка і грамадзянскай вайны на Беларусі. У рамане «Футбол на замірацаваным полі» (1983) пісьменнік аналізуе складаныя маральна-этычныя праблемы сучаснасці. Трывога за нашу сучаснасць і будучыню, відаць, спарадзіла духоўную патрэбу заглянуць у гісторыю, у выніку чаго з'явіліся раманы «Меч князя Вячкі» (1985) і «След Ваўкалака» (1988), за якія прысуджана Дзяржаўная прэмія Беларусі.

АД БАЦЬКАВАЙ КРЫНІЦЫ

Леаніду Дайнеку ў свае пяцьдзесят ёсць на што азірнуцца: яго літаратурны палетак, рупліва засеяны і дагледжаны, багата ўскаласіў. Жанравы дыяпазон творчасці пісьменніка даволі шырокі: лірык, навеліст, раманіст, публіцыст, крытык... І трэба шчыра сказаць, да якога б літаратурнага жанру ні звярнуўся Л. Дайнека, ён выяўляе здольнасць па-майстэрску раскрыць змест твора, пранікнуць у сутнасць закранутых жыццёвых праблем.

Ужо ў першым зборніку вершаў «Галасы» аўтар засведчыў уменне спалучаць рэалістычную дакладнасць малюнка з пранікнёным лірызмам і яркай метафарычнасцю. У наступных кніжках паэзіі, захаваўшы непасрэднасць успрымання жыцця, Л. Дайнека імкнецца напоўніць вобразы паглыбленым сэнсам, выйсці на шырокія мастацкія абагульненні. У некаторых вершах быў відавочным сюжэтны пачатак, спроба паказаць зменлівасць душэўнага стану лірычнага героя, адметныя рысы яго характару, што з бясспрэчнасцю гаварыла: у паэце выспяваў празаік. І таму натуральна, што неўзабаве ў друку з'явіліся апавяданні Л. Дайнекі, якія потым склалі зборнік «Бацькава крыніца». Празаічны дэбют пісьменніка прыцягнуў увагу чытача вастрынёй і займальнасцю сюжэтаў, каларытна выпісанымі персанажамі, паэтычнасцю мовы. Аднак новая літаратурная пазіцыя, якою пісьменнік паспяхова авалодаў, была для яго неспакойнай творчай натуры недастатковай, адчуваючы свой мастакоўскі патэнцыял, ён лічыў яе толькі подступам да галоўнага. Раманны эпас — вось тая стыхія, у якой на поўную моц раскрыўся і разгарнуўся самабытны талент пісьменніка. Незабыўныя рэвалюцыйныя падзеі Кастрычніка на Беларусі знайшлі адлюстраванне ў раманах «Людзі і маланкі», «Запомнім сябе маладымі», якія прывабліваюць паказам драматычнага паядынку старога і новага свету, непаўторнымі абліччамі змагароў за лепшую долю. Дакрануўшыся ў гэтых творах да пакутнага нараджэння сацыялістычнай дзяржаўнасці нашага народа, Леанід Дайнека адчуў патрэбу асэнсаваць і іншыя перыяды яго гісторыі. Таму было заканамерным, што ў сваім наступным рамане «Футбол на замірацаваным полі» пісьменнік звяртаецца да сучаснасці, закранае складаныя праблемы нашай сённяшняй рэчаіснасці, сцвярджаючы думку аб тым, што і ў спакойным бегу дзён непазбежна выспяваюць вострыя сацыяльныя і маральныя канфлікты.

Кожным сваім новым творам Л. Дайнека як бы падносіць нечаканы сюрпрыз: пасля «Футбола на замірацаваным полі» адзін за другім публікуюцца раманы «Меч князя Вячкі» і «След Ваўкалака», у якіх на нас дыхнула сівой даўніной, полымем смяротных боек, што вялі нашы продкі з чужынцамі за сваю свабоду і незалежнасць. Што гэта? Вымушанае шараханне аўтара, якому не ўдаецца замацавацца на аднойчы абранай тэматычнай дзялянцы? Але ж тое, што можна прыняць за непастаянства пісьменніцкай увагі, мае сваю пераканаўчую логіку. Адчуць сувязь часоў, спазнаць і высветліць гістарычную радаслоўную свайго народа — гэта духоўная патрэба сучасніка, наследніка ўсяго, што стваралі і за што змагаліся яго папярэднікі. Чалавек, як і народ, не адказаўшы на пытанні, адкуль ён і хто ён, што ў яго за плячыма, не можа па-сапраўднаму адбыцца, адкрыць сябе самога, разумна спраектаваць сваю будучыню. Далёкая мінуўшчына ў раманах Л. Дайнекі ўспрымаецца не як нешта прывідна архаічнае, а як драматычныя і гераічныя старонкі гістарычнага лёсу беларускага народа, як пярэдадзень сённяшняй рэчаіснасці. Пісьменнік, як сувязны вякоў, працягвае свой мастакоўскі провад з былога ў сучаснасць, робячы магчымым жывую размову продкаў і нашчадкаў. Ці трэба гаварыць, як важна гэта ў нашым духоўным жыцці зараз, у час перабудовы, калі пачалося адраджэнне нацыянальных святынь і каштоўнасцей народа.

Калі чытаеш раманы Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі» і «След Ваўкалака», пераносішся ў атмасферу жыцця і барацьбы нашых прашчураў і не можаш не захапляцца гераічнымі постацямі персанажаў, якія ўспрымаюцца як жывыя людзі з іх тагачасным адзеннем, з іх хваляваннямі, думкамі, настроямі... І ўсё гэта перададзена пісьменнікам з такой пераканаўчасцю, з такой пранізлівай праўдзівасцю, нібыта ён сам толькі што пабываў у камандзіроўцы ў тых незапомных часах. Вобразы герояў пісьменніка не могуць не зачароўваць сваёй апантанай любоўю да роднай зямлі, самаахвярнасцю ў бітвах за яе свабоду. Як не ўпадабаць легендарнага князя Вячку, які ўвасобіў у сабе столькі трагічнай красы, чалавечай годнасці і мужнасці! Яго пагібель пры абстрэле Юр'ева — гэта праява братэрскай лучнасці суседніх народаў. Урокі гісторыі і сёння вучаць нас мудрасці сяброўскага яднання, папярэджваюць ад згубнасці, адчужанасці і адасобленасці. Гэткім жа павучальным з'яўляецца для нас і вобраз полацкага князя Усяслава Брачыслававіча, якога суайчыннікі за розум і бясстрашша любоўна празвалі Чарадзеем, Ваўкалакам. Свет яго думак, яго дасціпнасці і лагодлівасці, яго заклапочанасці лёсам народа сугучны таму, што і сёння хвалюе нас.

І яшчэ адна асаблівасць раманаў Л. Дайнекі — яркая выражаная паэтычнасць моўных сродкаў, шырокае выкарыстанне слоўнага жывапісу, разгорнутых метафар, асацыятыўных вобразаў. У добрай згодзе з паэзіяй проза пісьменніка плённа працуе на раскрыццё складаных аўтарскіх задум, на вырашэнне сюжэтных калізій і стварэнне непаўторнасці характараў персанажаў.

Некаторыя лічаць, што Леанід Дайнека свой гістарычны эпас стварае ў рэчышчы таго, што рабіў Уладзімір Караткевіч, абапіраючыся на яго вопыт, наследуючы яго творчыя традыцыі. Думаецца, што гэта зусім розныя мастакі. Калі ў У. Караткевіча зайздросны палёт фантазіі растварае абрысы канкрэтных падзей і постацей у ружаватай рамантычнай дымцы, дык Леанід Дайнека рэалістычным аб'ектывам з бязлітаснасцю высвечвае мінулае да зрокава адчувальных падрабязнасцяў і дэталяў побыту продкаў, пакідаючы ўражанне поўнай дакладнасці адлюстравання ім у творах.

З прыязнасцю сустракае чытач кожны новы твор Леаніда Дайнекі, кнігі якога не залежваюцца на паліцах,— яны сумленна працуюць на духоўнае ўзбагачэнне сучасніка. Нездарма раман «Меч князя Вячкі» ўдастоены высокай узнагароды — Літаратурнай прэміі імя Івана Мележа.

Ад бацькавай крыніцы бярэ пачатак вірлівая плынь мастакоўскай ракі Леаніда Дайнекі, кіруючыся да мора, імя якому беларуская літаратура. Вось ужо дзесяткі гадоў ён шчодра аддае сваю творчую энергію прыгожаму пісьменству бацькаўшчыны, абяцаючы нам радасць новых сустрэч.

Пятрусь Макаль.

ЛіМ. 1990. 26 студз.

ЯЗЭП ЗАЗЕКА

Празаік, літаратуразнавец, фалькларыст Язэп Васілевіч Зазека нарадзіўся ў 1907 г. ў в. Востраў у сям'і рабочага. Бацька працаваў на бровары, маці памерла, калі Язэпу было тры гады. Выхоўвала яго бабуля. У 1920 г. ён скончыў царкоў-

І. В. Зазека.

А. П. Кудравец.

напрыходскую школу, у 1922 г.— школу сялянскай моладзі. Прайшоў ваенную падрыхтоўку ў часцях асобага прызначэння, прымаў удзел у ліквідацыі банд у Чэрвеньскім раёне. У 1922—30 гг. батрачыў, працаваў рабочым. Займаўся ў палітэхнікуме. У 1932 г. Я. Зазека паступіў на літаратурны факультэт Вышэйшага педагагічнага інстытута. З другога курса адкліканы на работу ў апараце ЦК ЛКСМБ, потым працаваў у палітаддзеле МТС прапагандыстам у прыгранічных раёнах. З 1934 г. Я. Зазека працягваў вучобу ў інстытуце, пасля скончэння яго (1936) — у аспірантуры пры тым жа інстытуце. З 1940 г. намеснік дырэктара Беластоцкага педагагічнага інстытута. У Вялікую Айчынную вайну Я. Зазека ўдзельнік падпольнага і партызанскага руху. З 1943 г. і да вызвалення Беларусі быў рэдактарам газеты «Свіслочская правда», якая выдавалася партызанскай брыгадай імя Чапаева Беластоцкага злучэння. З 1944 г. працаваў намеснікам дырэктара, дэканам філалагічнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута. У 1949—52 гг. загадваў кафедрай Адэскага педінстытута. З 1952 г. ён дацэнт кафедры рускай літаратуры БДУ, дзе працаваў да выхаду на пенсію (1973). Узнагароджаны Ганаровай граматай і Граматай Вярхоўнага Савета Беларусі, медалямі, польскім ордэнам «Крыж партызана».

Першае апавяданне «На сталёвых павуцінніах» Я. Зазека апублікаваў у часопісе «Маладняк» (1930). Першы зборнік апавяданняў «Рукою ворага» выдадзены ў 1932 г. Яго апавяданні і нарысы — водгук на хвалюючыя надзённыя пытанні жыцця, апавяданні і нарысы пасляваеннага перыяду прысвечаны жыццю і барацьбе народных мсціўцаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар кніг для дзяцей «Лясныя сябры» (1966), «Сонечны алень» (1969), «Трывожная ноч» (1972). Я. Зазека выступаў з артыкуламі ў перыядычным друку на літаратурныя і фальклорныя тэмы. Навуковыя інтарэсы яго былі звязаны пераважна з даследаваннем беларускага фальклору, у прыватнасці партызанскай паэзіі ваеннага перыяду, сувязі яе з прафесійнай літаратурай. Памёр у 1977 г.

АНАТОЛЬ КУДРАВЕЦ

Празаік і перакладчык Анатоль Паўлавіч Кудравец нарадзіўся ў 1936 г. ў в. Аколіца ў сям'і калгаснікаў. Бацька, Павел Хведаравіч, быў дарожным майстрам у Клічаве. Маці, Аксеня Іванаўна, працавала ў калгасе «Чырвоны прамень». У 1949 г. бацька трагічна загінуў. Шасцёра дзяцей выхоўвала маці. У 1951 г. А. Кудравец скончыў сямігодку ў в. Коўбча і паступіў у Слуцкае педвучылішча, якое закончыў у 1955 г. Настаўнічаў у Віркаўскай сямігадовай школе Клічаўскага раёна. У 1955 г. прызваны ў армію. Пасля вяртання з арміі (1958) паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ. Яшчэ студэнтам А. Кудравец працаваў у рэдакцыі газеты «Калгасная праўда» (1962—63), шмат ездзіў па Беларусі. Пасля заканчэння універсітэта (1963) ён працаваў у рэдакцыі літаратурна-драматычных перадач Беларускага радыё (1963—65), у газеце «Літаратура і мастацтва» (1965—66), у выдавецтве «Беларусь» (1966—70), адказным сакратаром у часопісе «Маладосць» (1970—72). З 1972 г. А. Кудравец — галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура», з 1974 г. ў апараце ЦК КПБ — інструктар, загадчык сектара мастацкай літаратуры. З 1978 г. галоўны рэдактар часопіса «Нёман». Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета Беларусі. Выбіраўся дэпутатам Мінскага абласнога Савета народных дэпутатаў, членам рады Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 1979 г. ў складзе дэлегацыі Беларускай ССР удзельнічаў у рабоце XXXIV сесіі Генеральнай Асамблеі ААН.

У друку А. Кудравец упершыню выступіў у 1960 г. з цыклам кароткіх апавяданняў пра жыццё калгаснай вёскі. У тым жа годзе яго мініяцюры змясціў часопіс «Маладосць». Першы зборнік апавяданняў «На зялёнай дарозе» выйшаў з друку ў 1968 г. Творчасці пісьменніка ўласцівы глыбокі псіхалагізм, уменне праз побыт, непаспешлівае разгортванне падзей перадаць унутраны драматызм чалавечых характараў, лёс людзей на

важных гістарычных этапах развіцця краіны. У многіх творах А. Кудравец выявіў цікавасць да вострых праблем сучаснай вёскі. Прыкметнай з'явай беларускай прозы стаў яго раман «Сачыненне на вольную тэму» (1984), у якім створаны маштабны, каларытны вобраз селяніна, сумленнага шчырага працаўніка і абаронца роднай зямлі. За гэты раман пісьменніку ў 1985 г. прысуджана дзяржаўная прэмія Беларусі імя Я. Коласа. Пяру А. Кудраўца належаць кнігі «Раданіца» (1971), «Дзень перад святам» (1975), «Зімы і вёсны» (1976), «На балоце скрыпелі драчы» (1979), «За чужымі далямі» (1981), выбранае ў двух тамах (1987), «Смерць нацыяналіста» (1992). А. Кудравец з'яўляецца аўтарам сцэнарыя тэлефільма «Восеньскія яблыкі» (1975; пастаўлены ў 1977). На кінастудыі «Беларусьфільм» экранізаваны яго аповесць «Раданіца» (сцэнарый разам з Коневым) і апавяданне «Халады ў пачатку вясны». А. Кудравец выступае і як перакладчык. У яго перакладах выйшлі кнігі Дж. Свіфта «Падарожжы Гулівера» (1974), У. Іванава «Сібірскія апавяданні» (1975), А. Нурпеісава «Змрок» (1978) і «Нягоды» (1981), К. Сіманава «Дні і ночы» (1979), А. Тамсаарэ «Аповесці» (1980), У. Караленкі «Аношні прамень» (1984). Творы А. Кудраўца выходзілі асобнымі выданнямі на рускай, латышскай, эстонскай, нямецкай, балгарскай мовах, перакладаліся на азербайджанскую, узбекскую, украінскую, чувашскую і іншыя мовы.

ЗА ЧУЖЫМІ ДАЛЯМІ

Гэта кніга трывог, роздумаў, разважанняў А. Кудраўца ў час яго знаходжання ў Злучаных Штатах Амерыкі, дзе ён прымаў удзел у рабоце сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. І ў тыя разважанні-роздумы сонечным промнем упляталіся траяткія успаміны пра мілую сэрцу Клічаўшчыну, якія друкуюцца ніжэй...

...Адчуванне радзімы жыве разам з разуменнем таго, што ты не адзін, што за табой стаіць нешта вельмі вялікае і вельмі дарагое — магутнае, добрае, прыгожае, непаўторнае...

У чабор твой, радзіма,
Хачу я
прытомленым тварам
зарыцца...

Гэтыя цудоўныя радкі Пімена Панчанкі прыйшлі сюды перад святам разам са «Звяздой» і вось ужо колькі дзён цёплай музыкай гучаць ува мне, гавораць пра тое вялікае шчасце, якое чакае мяне наперадзе: вільготны ўзболатак дзе-небудзь на Клічаўшчыне, далей — яловы лес з застоенай цішынёй, вострым смаловым пахам, высокае сухое неба над галавой...

Роўна гудуць турбіны самалёта. Засталася далёка ззаду, за многія сотні міль Амерыка. Унізе паволі плыве пад самалёт чарната, падсвечаная белымі праплешынамі. Чарната — гэта Атлантыка, белае — воблакі, яны то слізгаюць адзіночнымі плямамі, то збіваюцца ў чароды; тады прастора пад крыламі самалёта нагадвае плашч-палатку. Доўга гляджу ўніз, і раптам, на нейкае імгненне мне здалося, што ўнізе — Гараднянка — рэчка майго маленства ў самую баявую пару свайго жыцця — пару ледаходу; цёмнае — вада, белае — крыгі. Выцякаючы з Язерскага балотца, па Стаськовай пасецы, яна доўга віляла па забалочаным лузе, між Аколіцкіх пасёлкаў, каб недалёка ад млына прыняць яшчэ адну рачулку з Анатолеўскага балота.

Ідучы ў школу, мы абавязкова павінны былі пераходзіць гэтую рачулку. Але цікавей за ўсё гэта было рабіць у час разліву, калі па ёй ціхім караванам плылі, ляніва разварочваючыся, крыгі, а сама яна заліваа вадой усю нізіну, хаваючы пад сабой, а то і змываючы і невялікі мосцік, і кладкі да мосціка, і ўсю грэблю.

І хоць крыгі былі невялікія і рэдка на якой з іх можна было праплысці «ад зямлі да зямлі», ад сухога да сухога без рызыкі выкупацца, але тады яны здаваліся вялікімі і небяспечнымі, мусіць, таму і цяпер, з вышыні дзесяці кіламетраў, я пазнаў сваю рачулку. І вельмі ўзрадаваўся гэтаму. Бо з той пары, калі мы — перша-чацвёртакласнікі — перапраўляліся цераз яе, прайшло трыццаць год. Усе мы з дзяцей сталі бацькамі, а некаторыя паспелі набыць важную годнасць дзядоў.

Шмат што змянілася на Аколіцкай зямлі за гэты час. Апрача ўсяго гэтага мінула дзесяць год, як не стала і самой рэчкі. Не выстаяла яна перад прамалінейным машынным наступам меліярацыі, якая не пакінула ёй ні рэчышча, ні вады — хіба што па костачкі на дне конусападобных жалабоў-каналаў...

Друкуецца па кн.: К у д р а в е ц А. За чужымі далямі. Мн., 1981. С. 50, 74—75.

МІКОЛА ТАТУР

Перакладчык, паэт, крытык Міналай Ігнатавіч Татур нарадзіўся ў 1919 г. ва ўрочышчы Застар'е ў сялянскай сям'і. Маці памерла ў 1921 г., бацька ў 1931 г. рэпрэсіраваны (памёр у 1932). М. Татур вучыўся ў польскай пачатковай школе ў в. Аколіца Клічаўскага раёна.

М. І. Татур.

М. С. Шаўчонак.

З 1931 г. выхоўваўся ў польскім Бабруйскім дзіцячым доме, скончыў там сямігодку і паступіў у Мінскі індустрыяльна-педагагічны тэхнікум, потым у Мінскі настаўніцкі інстытут нацменшасцей на польскае аддзяленне факультэта мовы і літаратуры, якое скончыў у 1937 г. У 1937—40 гг. працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, завучам СШ № 2 у г. Сянно Віцебскай вобл. У 1940—41 гг.— завучам польскай СШ у г. Друскепікі (цяпер Друскінінкай, Літва). У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнічаў у партызанскім руху, быў цяжка паранены, доўга лячыўся ў шпіталях. Пасля вайны працаваў рэдактарам, загадчыкам рэдакцыі мастацкай літаратуры ў Дзяржаўным выдавецтве Беларусі (1944—63), загадчыкам рэдакцыі выдавецтва «Полымя» (1963—66), дырэктарам Бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі (1970—79). З 1979 г. на пенсіі. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі, Ганаровай граматай і Граматай Вярхоўнага Савета Беларусі.

Літаратурную дзейнасць М. Татур пачаў у 1948 г. з перакладаў. Добрае веданне беларускай, рускай і польскай моў дазваляе яму рабіць пераклады, блізкія да арыгінала, трапна перадаваць мастацкую манеру кожнага пісьменніка. Ён пераклаў многія творы рускіх, польскіх, украінскіх і інш. пісьменнікаў, раманы В. Ажаева «Далёка ад Масквы» (1951, з У. Шахаўцом), М. Нікіціна «Паўночная Аўрора» (1953, з В. Зубам), У. Кочатава «Журбіны» (1955), А. Венцлавы «Дзень нараджэння» (1961, з С. Дзяргаем), А. Лупан «Трэція пеўні» (1971), Э. Бэкмана «Чародка белых варон» (1973), А. Ірасека «Скалакі» (1974, з Я. Васілёнкам), У. Умарбекава «Зялёная зорка» (1976), аповесці М. Прышвіна, А. Гайдара, А. Мусатава, апавяданні А. Вішні, Л. Первамайскага, Я. Івашкевіча і інш. Шмат зрабіў як перакладчык М. Татур для тэатра. З 1951 г. ён выступае як літаратурны крытык, з 1979 г. друкуе эпіграмы.

МАРЫЯ ШАЎЧОНАК

Паэтэса Марыя Сіланцьеўна Шаўчонак (псеўданім М. Аляксеева) нарадзілася ў 1944 г. ў в. Новы Востраў у сям'і селяніна. У 1961 г. скончыла сярэднюю школу, у 1965 г. філалагічны факультэт БДУ. У 1965—66 гг. яна настаўнічала ў Ракавіцкай СШ Шчучынскага раёна, у 1966—78 гг. працавала ў Шчучынскай раённай газеце «Савецкая вёска». З 1978 г. старшы рэдактар Гродзенскай студыі тэлебачання. Узнагароджана медалём.

Першы верш М. Шаўчонак надрукаваны ў газеце «Піянер Беларусі» ў 1954 г. Рэгулярна выступае ў перыядычным друку з 1958 г. Яна аўтар зборнікаў вершаў «Белая ластаўка» (1971), «Свята зямлі» (1976), «Бацькоўскае імя» (1981), «Раса-расінка» (1985). Лірычны герой яе вершаў — наш сучаснік, чалавек багатай душы і высакародных памкненняў, які дбае аб пераемнасці пакаленняў, марыць аб сапраўдным каханні. Пейзажная лірыка паэтэсы стварае аптымістычны настрой, дае надзею на лепшую будучыню. На словы яе вершаў Л. Захлеўным, Г. Вагнерам і І. Кузняцовым напісаны песні.

ЗЯМЛЯ МАЯ

Зямля мая! Якое шчасце,
Што больш нідзе няма такой,
Што да цябе магу прыпасці,
Пагладзіць ласкава рукой.
Што васілёк твой сінякрылы
І шчодрасць спелая суніц
З такой жывой, гаючай сілай
Перад сабой схіляюць ніц.
Такое ўсё — не наглядзецца,
Такое ўсё — што не ўявіць,
Калі б адняць яго ад сэрца,
То як магло б яно пражыць.
І дзе б яму было вучыцца
Добразычлівасці сяброў,
Каб не магло не прычасціцца
Да родных пушчаў і бароў.

Шлях у навуку

Як ужо адзначалася, клічаўская зямля ўзгадавала шмат вучоных. Ніжэй змяшчаюцца матэрыялы пра дактароў навук, а таксама нататкі-ўспаміны некаторых кандыдатаў навук пра перажытае на Клічаўшчыне.

ІВАН ВІТАЛЬЕВІЧ ГУШЧЫН

Доктар юрыдычных навук (1988), прафесар (1990). Нарадзіўся 17.12.1934 г. ў в. Стары Спор Клічаўскага р-на. Працоўную дзейнасць пачаў вучнем повара ў 1951 г. ў Баранавічах. Працаваў інструктарам станцыі юных натуралістаў, механікам, экспедытарам тэлефонна-тэлеграфнай канторы. У 1958 г. пасля заканчэння юрыдычнага факультэта БДУ накіраваны следчым-стажорам пракуратуры Ашмянскага р-на. З 1959 г. — следчы, пракурор Мядзельскага р-на, з 1963 г.— вілейскі міжраённы пракурор Мінскай вобл. З 1967 г., пасля заканчэння аспірантуры — старшы выкладчык, дацэнт, загадчык кафедры Калінінградскага універсітэта. З 1976 г. загадчык кафедры Карагандзінскага універсітэта. З 1978 г. ў Гродзенскім універсітэце імя Я. Купалы (з 1989 г. загадчык кафедры дзяржаўнага, працоўнага і сельскагаспадарчага права, з 1990 г. дэкан факультэта правазнаўства).

На долю гэтага чалавека выпала столькі выпрабаванняў, што іх хапіла б на дзесятак лёсаў.

Карані старажытнага роду Гушчаў губляюцца дзесьці ў 18 ст. Перадаючы сямейныя паданні з пакалення ў пакаленне, унукі, праўнукі захавалі звесткі аб тым, як прапрадзед яшчэ ў пачатку 19 ст. пераехаў на Клічаўшчыну, у Бацэвіцкую воласць. Сяляне воласці вялі доўгія спрэчкі з памешчыкам Незабытоўскім аб тым, каму належыць участак зямлі ля лесу, недалёка ад вёскі Бярозавае Балота. Пакуль цягнуліся спрэчкі, сяляне пабудавалі на ўскрайку лесу некалькі хацін, назваўшы паселішча Стары Спор. І хаця ўлада вырашыла спрэчку на карысць Незабытоўскага, назва вёскі так і засталася, а яе жыхары мелі славу людзей незалежных, вальнадумцаў.

У Старым Споры пасялілася і сям'я Віталя Іванавіча Гушчы. Перад Вялікай Айчыннай вайной ён працаваў брыгадзірам трактарнай брыгады Бацэвіцкай МТС. Жонка, Фяліцыя Дамінікаўна, хадзіла на працу ў калгас. У сям'і гадаваліся чацвёра дзяцей.

Вайна жорстка абышлася з сям'ёй Гушчаў, як і з сем'ямі амаль усіх жыхароў Старога Спору. Мужчыны пайшлі на фронт, у партызаны. Акупанты сваю злосць спаганялі на мірных жыхарах. Восенню 1942 г. яны спалілі ўсю вёску датла, пакінуўшы пасля сябе папялішчы. Жанчын, старых і дзяцей у суправаджэнні нямецкіх аўтаматчыкаў пагналі, не сказаўшы куды. Сярод вяскоўцаў была і Фяліцыя Дамінікаўна Гушча з дзецьмі. Маленькую Галю несла на руках. Ішла моўчкі з адзінай думкай: «Як уратавацца і ўратаваць дзяцей?» І калі ў калоне выйшла нейкая замінка, і немцы і канваіры сабраліся воддаль, маці, моцна трымаючы за рукі дзяцей, кінулася ў кусты ля дарогі. Беглі доўга, падаючы, хаваючыся ў пералеску, але немцы дагналі ўцекачоў і са звярынай жорсткасцю сталі іх збіваць. Маці, як магла, прыкрывала сабой дзяцей, але не ўсё было ў яе сілах. Васьмігадовага Івана гітлераўцы білі прыкладамі, стараючыся трапіць па руцэ, на якой не зацягнулася рана. Яшчэ вясной яго, вясковага пастушка, у час бою ля Старога Спору, параніла ў правую руку. Цяпер жа ад бязлітасных удараў рука ператварылася ў крывавую масу. Дарэчы, тады ж ён быў паранены яшчэ ў жывот і ў нагу.

Уцекачоў вярнулі ў строй, і калона рушыла далей. К вечару людзей прывялі ў вёску дзесьці пад Кіраўскам і загналі ў вялікую будыніну. Прыталіліся ўсе ў страху: няўжо паліць стануць?!

Але ноч прайшла спакойна. Вязняў амаль не кармілі, і хлапчукі згаварыліся хадзіць у вёску прасіць у жыхароў чаго-небудзь з ежы. Паліцэйскія не звярталі на гэтыя «паходы» асаблівай увагі.

Іван прыносіў маці з оястрычкай то некалькі халодных бульбін, то кавалак хлеба. Маці чарнела ад думак: дзесьці ў партызанскім атрадзе з бацькам знаходзіліся старэйшыя дзеці.

А сям'ю чакала новае выпрабаванне. У пошуках прадуктаў Іван абышоў некалькі вёсак. Калі вярнуўся назад — не было ні людзей, ні аховы. Хлопчык кінуўся шукаць родных, стаў у людзей пра іх распытваць, але ніхто не ведаў, куды немцы пагналі вязняў.

Толькі ў 1944 г., пасля вызвалення раёна, хтосьці паведаміў хлопцу, што маці з дачкой жыве ў Баранавічах. Бацька ж пайшоў на фронт. Іван вырашыў дабірацца да Баранавічаў. Такіх галодных, змучаных, бяздомных дзяцей, сірот вайны тады блукала шмат па краіне. Не раз міліцыянеры здымалі Івана з цягнікоў і адпраўлялі ў дзіцячыя дамы. Праз некаторы час ён зноў вяртаўся на вакзалы, каб дабрацца да запаветнага горада, дзе жыла маці. Але маці яму ўдалося адшукаць

І. В. Гушчын.

М. П. Кніга.

толькі ў 1949 г. (яна выйшла замуж і змяніла прозвішча). Івана ж усе лічылі загінуўшым. Яго з'яўленне было радаснай нечаканасцю. Азмрочыла толькі паведамленне аб тым, што дзесьці на фронце загінуў бацька. У той вечар Іван паабяцаў сабе адшукаць яго магілу, чаго б гэта ні каштавала. Толькі ў 1981 годзе з Выканаўчага Камітэта таварыства Чырвонага Крыжа прыйшоў ліст: «Польскі Чырвоны Крыж паведаміў, што астанкі Вашага бацькі, радавога Гушчы Віталя Іванавіча, 1903 года нараджэння, памёршага ад ран 4 жніўня 1944 года, пахаваны ў магіле № 1 на савецкіх вайсковых могілках у г. Аўгустове...» Іван Вітальевіч пабываў у польскім горадзе Аўгустове. Стаяў, схіліўшы галаву, на акуратных дагледжаных могілках сталы чалавек, вучоны, і горка думаў аб тым, што вось і застаецца бацька на чужыне, далёка ад роднай Клічаўшчыны. Успамін аб ёй часта дапамагаў выстаяць хлопцу ў цяжкіх жыццёвых сітуацыях. Выпрабаванні загартавалі характар юнака, навучылі дабівацца пастаўленай мэты. Пасля заканчэння школы рабочай моладзі ў Баранавічах Іван паспрабаваў адшукаць работу. Але гэта аказалася немагчымым — каму быў патрэбен работнік, у якога пасля ранення не дзейнічала правая рука? У момант вялікага адчаю напісаў Іван пісьмо начальству ў «вярхі». Праз некаторы час хлопца адшукала сакратар Баранавіцкага абкома партыі Ларыёнава і дапамагла ўладкавацца вучнем повара. Гэтая сардэчная жанчына шмат разоў яшчэ дапамагала Івану, радавалася яго поспехам. Відаць, спадабалася ўпартасць гэтага юнака, яго вялікае жаданне ісці да пастаўленай мэты...

У 1953 г. Іван Вітальевіч паступіў на вучобу ў Мінскі юрыдычны інстытут. З гэтага часу жыццё яго назаўсёды звязана з навукай. *Л. Маркава.*

МІКАЛАЙ ПАЎЛАВІЧ КНІГА

Беларускі вучоны ў галіне оталарынгалогіі, доктар медыцынскіх навук (1955), прафесар (1958). Нарадзіўся 28.1.1902 г. ў в. Коўбча. Пасля заканчэння ў 1929 г. медыцынскага факультэта БДУ займаўся практычнай і навуковай дзейнасцю ў лячэбных установах Беларусі. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у арганізацыі партызанскай барацьбы на Клічаўшчыне, быў начальнікам санітарнай службы атрада. З сакавіка 1944 г. ўзначальваў санітарны аддзел ваенна-аператыўнай групы пры Магілёўскім падпольным абкоме партыі. З лета 1944 г. ў Мінскім медыцынскім інстытуце, з 1952 г. загадчык кафедры оталарынгалогіі, з 1958 г. галоўны оталарынголаг Міністэрства аховы здароўя Беларусі. З 1962 г. ўзначальваў навуковае таварыства оталарынголагаў Беларусі. Асноўныя працы па праблемах склеромнай інфекцыі. Узнагароджаны 2 ордэнамі, медалямі. Памёр у 1972 г.

Каб не было новых Курапатаў

З успамінаў І. М. Ананіча

АНАНІЧ Іван Максімавіч — кандыдат медыцынскіх навук (1970). Нарадзіўся 28.3. 1930 г. ў в. Орліна Клічаўскага р-на. Зведаў горкі лёс члена сям'і «ворага народа»: у 1938 г. беспадстаўна рэпрэсіраваны і расстраляны яго бацька Максім Ільіч. З 1946 г. жыў у г. Пружаны Брэсцкай вобл. У 1956 г. скончыў Мінскі медінстытут, працаваў загадчыкам Свіслацкага ўрачэбнага участка Асіповіцкага раёна. З 1958 г. ў апараце Магілёўскага абласнога аддзела аховы здароўя, адначасова ўрач абласной бальніцы. З 1960 г. на кафедры хвароб вуха, горла і носа Мінскага медінстытута пры 4-й клінічнай бальніцы, дзе працуе да гэтага часу. Яму прысвоена вышэйшая кваліфікацыйная катэгорыя па спецыяльнасці отарыналарынгалогія. Мае навуковыя публікацыі па праблемах хранічнага танзіліту і гнойнага запалення сярэдняга вуха.

Успамінаць пра гэта неймаверна цяжка, бо немагчыма спасцігнуць розумам: чаму ў нашым самым гуманным у свеце, як абвяшчалася, грамадстве, дзе нібыта ўсё рабілася ў імя чалавека, лютавала такая жорсткасць у адносінах да людзей? Чаму праліта столькі нявіннай крыві, пакалечана столькі чалавечых лёсаў! Мне вельмі хацелася знайсці на гэта адказ, і я раскапаў многа дакументаў пра асуджэнне і расстрэл майго бацькі. Ідучы па слядах асабістай трагедыі, я, відаць, больш чым хто іншы спазнаў д'ябальскі механізм знішчэння народа. І ад таго спазнання яшчэ больш трывожна і балюча сэрцу.

Бацька мой Максім Ільіч Ананіч узначальваў калгас, адзін з лепшых у раёне. Аднойчы злавіў злодзея за руку. А той аднёс куды трэба паклёп, што бацька — варожы агент. І закруціліся д'ябальскія жорны. У ноч на 14 студзеня 1938 г. бацьку арыштавалі, скруцілі рукі і прывязалі да саней. То быў пачатак яго цяркістага шляху на той свет. А мы, чацвёра дзяцей і маці, засталіся, аслупянелыя, каб потым да дна выпіць горкую чашу лёсу членаў сям'і «ворага народа».

Праўда, калі пачалася вайна, з'явілася надзея, што цяжар бруднага кляйма і недаверу спадзе, а справядлівасць возьме верх. Мы неяк адразу знайшлі сваё месца сярод людзей, разам з імі, як маглі, дапамагалі чырвонаармейцам, што трапілі ў акружэнне. У іх ліку быў і У. Ціхаміраў, затым Герой Савецкага Саюза, які пісаў пра гэта ў сваіх успамінах. А пазней нрыйшоў да маці партызанскі камісар М. Кніга, які добра ведаў бацьку, і сказаў, што верыць у яго сумленнасць і абавязкова дакажа гэта пасля перамогі. А пакуль прасіў дапамагчы партызанам. Маўляў, вы — сям'я «ворага народа», і вам акупанты паверацъ. Маці, Сцефаніда Мацвеёўна, згадзілася. Так мы з ёю сталі партызанскімі сувязнымі-разведчыкамі. У лапцях, у старой вопратцы вяла яна мяне з вёскі ў вёску, збіраючы патрэбныя партызанам звесткі. А потым, калі спалілі в. Бярозавае Балота, для нас агаралі зямлянку і пакінулі на тым «маяку» для сувязі.

Маці суцяшала нас і верыла, што пасля перамогі выпусцяць з турмы яе Максіма. Відаць, думалі пра гэта і два яе старэйшыя сыны — Фёдар і Васіль, якія змагаліся ў партызанскіх атрадах і абодва загінулі ў баі. Паранена і кантужана была ў баі і сястра Паліна.

Перад вызваленнем мы знаходзіліся ў партызанскім атрадзе. Калі злучыліся з Чырвонай Арміяй, радасці не было межаў. Але на сэрца хутка зноў лягла поч таго самага страшнага паклёпу і недаверу: ніхто з нашай сям'і не быў прадстаўлены да ўзнагароды. Рабілася гэта ў масавым

І. М. Ананіч.

парадку, а нас усіх абышлі ўсё па той жа прычыне: члены сям'і «ворага народа». А пазней, нягледзячы на пісьмовыя сведчанні партызан і мясцовых улад, вышэйшыя партыйныя органы не пацвердзілі нашага ўдзелу ў партызанскім руху.

Але выпрабаванні на гэтым не скончыліся. Мы настойліва шукалі бацьку. Аднойчы прыйшоў адказ, што ён асуджаны на 10 гадоў і высланы на Новую Зямлю «без права перапіскі». Каму патрэбен быў такі падман? У 1989 г., задыхаючыся ад хвалявання і слёз, я чытаў у Мінску пратакол № 1011 ад 25.3.1938 г. Яго падпісаў начальнік 8-га аддзела КДБ рэспублікі, лейтэнант (ведаю, але не называю яго прозвішча), засведчыўшы, што ён уласнаручна расстраляў майго бацьку. І тут жа, як халодны душ, новае паведамленне: «не вінаваты і рэабілітаваны».

Цяпер я часта бываю ў Курапатах. Не, лягчэй не стала! Есць, праўда, адно суцяшэнне. Гаротная наша маці ўсё рабіла, каб мы не азлобіліся, не пагасілі дабрыні ў сваіх душах. Яна, бедалага, так намучылася, што прасіла не плакаць па ёй пасля смерці, бо смерць лічыла вялікім збавеннем ад чорнай ілжы і здзекаў, што выпалі на яе долю. Бацька ж вельмі хацеў, каб я быў доктарам. Я і стаў ім, дапамагаю людзям, часам ратую ад смерці, вучу студэнтаў-медыкаў. Сястра Паліна настаўнічала, мае званне «Заслужаны настаўнік Беларусі». Так што запавет бацькоўскі не чарсцвець душой, несці людзям дабрыню мы выканалі. А трывога вось адкуль: як жа тое пустазелле, што так пышна буяла ў нашым грамадстве? Ці не пусціць яно зноў свае ядавітыя карані? Каб перасцерагчы людзей, хачу расказаць ім пра ўсё перажытае ў дакументальнай аповесці. Каб ніколі не было новых Курапатаў.

Дарагія мае настаўнікі

З успамінаў В. П. Галеева

ГАЛЕЕЎ Віктар Пятровіч — кандыдат эканамічных навук (1968), дацэнт (1975). Нарадзіўся 1.1.1936 г. ў в. Новы Спор Клічаўскага р-на. Працаваў у калгасе «Камсамолец» Клічаўскага р-на, служыў у ВМФ. У 1963 г. скончыў Маскоўскую сельскагаспадарчую акадэмію імя К. А. Ціміразева (эканамічны факультэт), у 1968 г.— аспірантуру гэтай акадэміі. З 1968 г. асістэнт кафедры эканомікі і арганізацыі Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута. З 1969 г. ў Гомельскім універсітэце імя Францыска Скарыны на кафедры палітэканоміі, з 1976 г. дацэнт гэтай кафедры, з 1992 г. дацэнт кафедры эканамічных тэорый. Асноўныя навуковыя публікацыі па праблемах павышэння эфектыўнасці вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі на аснове развіцця аграпрамысловага комплексу і ўдасканалення эканамічных адносін ва ўсіх фазах узнаўлення.

Шмат часу мінула, як я першы раз увайшоў у студэнцкую аўдыторыю ў якасці выкладчыка. Гэта былі хвіліны вялікага хвалявання і напружання. Дарэчы, пачуццё гэта не пакідае і зараз, ужо ў даволі сталым узросце: я кожны раз нібыта ўпершыню пераступаю парог аўдыторыі. Відаць, яно ад жадання зацікавіць студэнтаў, адчыніць ім дарогу да ведаў, дапамагчы выбраць дарогу ў жыцці, як дапамагалі і нам нашы дарагія настаўнікі.

Часта ўспамінаю свайго першага настаўніка Івана Кузьміча Саўчыка — надзвычай цікавага і таленавітага чалавека. Быў ён яшчэ зусім малады. Але яго павага да сваёй прафесіі, да вучняў і іх бацькоў прываблівала ўсіх. Нездарма нашы таты і мамы былі частымі наведвальнікамі школы, што прымушала нас яшчэ з большай адказнасцю ставіцца да ўрокаў, быць неабыякавымі да ведаў. Іван Кузьміч ніколі не забываўся заўважыць поспехі сваіх выхаванцаў, своечасова пахваліць, падтрымаць. Мы гэта адчувалі і вельмі стараліся. Іван Кузьміч спачатку быў адзіны настаўнік на ўсю пачатковую школу. У адну змену вучыліся першы і трэці класы, у другую — другі і чацвёрты. Бывала, у адным класе ўрок фізкультуры, а ў другім арыфметыка ці мова. Тады настаўнік даручаў лепшаму вучню з трэцяга ці чацвёртага класаў правесці фізкультуру з вучнямі першага або другога класаў. Пашанцавала пабыць «настаўнікам» некалькі разоў і мне. Спадабалася. Напэўна, тады і з'явілася мара стаць школьным настаўнікам.

А далей на маім шляху былі новыя, але такія ж таленавітыя, сардэчныя і ўсімі паважаныя настаўнікі. З цеплынёй і вялікай удзячнасцю ўспамінаю настаўніц беларускай мовы і літаратуры Вольгу Маркаўну Касцян і Таццяну Іванаўну Лаўрынаву, а таксама настаўніцу матэматыкі Галіну Іванаўну Фешчанка. Іх уласныя паводзіны, веданне прадмета, сціпласць былі паказальнымі. Усё гэта ўмацоўвала маё пачуццё павагі да працы настаўніка.

Але стаць школьным настаўнікам не давялося. Толькі мара гэта не пакідала мяне. І яна здзейснілася. У гэтым немалая заслуга выкладчыкаў Маскоўскай сельскагаспадарчай акадэміі імя К. А. Ціміразева, куды я паступіў пасля службы на флоце. З асаблівай цеплынёй у сэрцы адзначаю сярод іх доктара эканамічных навук прафесара Еўдакію Андрэеўну Рудакову, якая добра разумела студэнтаў, цікавілася іх жыццём і захапленнямі. Дзякуючы ёй я стаў наведваць навуковы студэнцкі гурток, якім яна кіравала. Заняткі ў гуртку былі для мяне сапраўднай асалодай і давалі адпаведны плён. Тыя гады і з'явіліся пачаткам маей навуковай і педагагічнай працы. Прыемна ўспомніць таксама чалавека бацькоўскіх пачуццяў акадэміка Колеснева Самуіла Георгіевіча, прафесара Куўшынава Івана Сцяпанавіча і іншых. Усім ім, пачынаючы з Івана Кузьміча, нізка кланяюся і шчыра дзякую.

Удзячная памяць

З успамінаў В. Р. Ізоха

ІЗОХ Валянцін Рыгоравіч — кандыдат філасофскіх навук (1971). Нарадзіўся 9.3. 1936 г. ў Клічаве. У 1964 г. скончыў гістарычны факультэт БДУ. Працаваў асістэнтам, з 1970 г. малодшы, затым старшы навуковы супрацоўнік, вучоны сакратар аддзела сацыялогіі Інстытута філасофіі і права АН Беларусі. З 1974 г. дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі БДУ. Асноўныя навуковыя публікацыі па праблемах сацыяльнай філасофіі, сацыялогіі вёскі, культуры, міжнацыянальных адносін. Узнагароджаны медалём Г. М. Кржыжаноўскага АН СССР.

У памяці шмат перажытага, але часцей за ўсё згадваюцца падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Гэта быў час сапраўднай праверкі людзей: час мужнасці і гераізму адных, здрадніцтва і падзення другіх. У пачатку вайны мне было няпоўных

6 гадоў. Горка было глядзець на разгубленых вяскоўцаў, на змарнелых чырвонаармейцаў, што ў роспачы адступалі пад націскам ворага. Але, помню, у маім дзіцячым сэрцы (без усякага перабольшання!) жыла нязгасная вера, што ўсё гэта часова, што мы абавязкова пераможам. Веру гэту я пераняў ад бацькі і маці, ад майго дзядулі.

Помню, як у адзін з тых першых дзён фашысцкага нашэсця на маіх вачах у промнях сонца, што дагарала над лесам, памірaў малады лейтэнант. У лесе каля в. Убалацце знаходзілася група нашых камандзіраў-акружэнцаў. Аднойчы яны папрасілі вяскоўцаў напаліць лазню. Пад вечар паслалі ў вёску ад'ютанта камандзіра палка, каб той усё як след выведаў. А тут, як на ліха, карнікі... І скасілі лейтэнанта свінцом. Курчыўся ён ад болю, трымаючыся за жывот, а мяне душылі слёзы: так шкада было маладога камандзіра і так балюча за тое, што ўжо не ўбачыць яму ні белага свету, ні дня перамогі.

А потым было трывожнае, поўнае небяспекі і напружання жыццё ў партызанскай зоне. З Клічава, да якога падступалі карнікі, нас пераправілі да партызан. Я помню мужных людзей, што не шкадавалі сябе дзеля перамогі. Гэта мой дзед, Іван Рыгоравіч Ізох, які цаной свайго жыцця выратаваў мяне і сястрычку. Гэта знакаміты ў нашым раёне Яніс Вітоль, скошаны кулямётнай чаргой пры штурме нямецка-паліцэйскага гарнізона ў Клічаве. Гэта мужны Аркадзь Анцюх, што загінуў у баі пры падрыве моста цераз раку Нача. І многія, многія іншыя дарагія мне людзі. У іх ліку — дзесяткі маіх родзічаў і блізкіх. Неяк з праслаўленым партызанскім камандзірам Ігнаціем Ізохам успаміналі ўсіх Ізохаў, якія загінулі ў час вайны. Успаміналі і запісвалі. Спіс дайшоў да 84. Але ці ўсіх успомнілі?

В. П. Галееў.

Г. А. Купцель.

Для мяне асабіста яны не загінулі, а, нябачныя, узышлі на п'едэстал. Таму кожны раз, калі бываю ў Клічаве, абавязкова іду да Кургана Бессмяротнасці. Падымаюся па прыступках і, як з жывымі, вітаюся: «Добры дзень, дарагі мой дзядуля! Добры дзень, Яніс Вітоль! Добры дзень, Аркадзь Анцюх! Добры дзень, слаўныя мае землякі!»

Праз усё жыццё нясу ўдзячную памяць пра гэтых людзей, імкнуся на іх раўняцца. Іх прыклад быў мне дапамогай у цяжкія гадзіны, калі служыў у парашутна-дэсантных войсках, калі выконваў адказнае заданне па размініраванні Старарускага раёна. Наогул імкнуся ісці па жыцці цвёрда і адкрыта, мець на ўсё свой погляд. Відаць, гэта таксама ад іх, маіх родных і землякоў. Шчырае ім за ўсё дзякую!

Карані

З успамінаў Г. А. Купцеля

КУПЦЕЛЬ Георгій Аляксандравіч — кандыдат тэхнічных навук (1968). Нарадзіўся 8.4.1936 г. ў в. Коўбча Клічаўскага р-на. У 1959 г. скончыў Беларускі політэхнічны інстытут. Працаваў майстрам на Велікалуцкім машынабудаўнічым заводзе, з 1961 г.— канструктарам Мінскага спецыяльнага канструктарскага бюро № 3. Пасля сканчэння аспірантуры (1966) — малодшы, потым старшы навуковы супрацоўнік Інстытута торфу Акадэміі навук Беларусі. З 1975 г. дацэнт Беларускага політэхнічнага інстытута, адначасова ў 1980—85 г. намеснік дэкана горнамеханічнага факультэта па навуковай рабоце. Цяпер ён дацэнт Беларускай політэхнічнай акадэміі. Асноўныя яго навуковыя публікацыі і вынаходніцтвы прысвечаны праблемам тэхналогіі, механізацыі, здабычы і перапрацоўкі карысных выкапняў.

Прозвішча маё даволі рэдкае на Клічаўшчыне. Яно з'явілася тут у 1915 г. Як сведчыць даведка, выдадзеная мяшчанскім грамадскім управленнем Бельскага павета Гродзенскай губерні (яна і зараз захавалася ў сямейным архіве), мой дзед Аляксандр Аляксеевіч Купцель жыў там з сям'ёй. У сувязі з наступленнем немцаў ён вымушаны быў пакінуць сваё месца жыхарства і выехаць у глыб Расійскай імперыі. На падводзе з дзецьмі і небагатымі пажыткамі праехаў сотні кіламетраў, але даехаўшы да вёскі Коўбча на Клічаўшчыне, ён асеў тут на пастаяннае месца жыхарства. Не маючы, як кажуць, ні кала,

ні двара, ён з бабуляй батрачыў у панскім маёнтку. Так і пражыў тут шматлікія войны і акупацыі.

У 1922 г. мясцовыя ўлады выдзелілі дзеду з маёнтка Ганаратаў 8-гектарны кавалак прыдатнай і 11 га непрыдатнай зямлі. Праз некалькі гадоў, працуючы з сям'ёй ад цямна да цямна, дзед так павёў гаспадарку, што стаў даволі моцным серадняком. Гэта, вядома, не спадабалася мясцовым уладарам. Гаспадарку пачалі абкладваць непамернымі падаткамі. Пры гэтым, як кажуць, дралі шкуру некалькі разоў у год. А калі ўжо не стала чым выплачваць, забралі жывёлу і нават харчы. Больш таго, сталі страшыць высылкай.

Дзед не сцярпеў такой несправядлівасці і напісаў скаргу аж самому Калініну ў Маскву. Зрабіў гэта кемліва і асцярожна. Ведаючы, што нісьмо могуць пераханіць мясцовыя ўлады, ліст ён адправіў з Магілёва праз свайго сына, майго бацьку, які тады служыў у Чырвонай Арміі ў Магілёве. Як ні дзіўна, праз некаторы час дзеду вярнулі ўсё канфіскаванае, а самаўпраўнікаў — старшыню Каўбчанскага сельсавета і некаторых іншых мясцовых начальнікаў — зняслі з пасад і аддалі пад суд. Вось такі неверагодны на той час выпадак здарыўся з сям'ёй Купцеляў.

Потым дзед гэтак жа сумленна працаваў у калгасе. Бацька ваяваў і дайшоў да Берліна. Пасля быў бухгалтарам у лясніцтве. Маці ўвесь час шчыравала ў калгасе. Так што нашы купцелеўскія карані, як кажуць, здаровыя і глыбокія. Відаць, невыпадкова ў той нялёгкі час мы, трое дзяцей, атрымалі вышэйшую адукацыю: брат скончыў Гродзенскі медыцынскі інстытут, сястра — Беларускі політэхнічны інстытут. Усе мы вельмі ўдзячныя бацькам, дзеду і бабулі, ад якіх перанялі добрасумленнасць, працавітасць, любоў да людзей, нецярпімасць да несправядлівасці.

Споведзь

З успамінаў У. А. Салановіча

САЛАНОВІЧ Уладзімір Аляксеевіч — журналіст, кандыдат эканамічных навук (1973), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1976). Нарадзіўся 7.12.1935 г. ў в. Сычкава Бабруйскага раёна. З канца 1941 г. жыў у в. Дуброва Клічаўскага р-на. У 1959 г. скончыў аддзяленне журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. Працаваў у абласной газеце «Магілёўская праўда», з 1961 г.— на Беларускім радыё, з 1966 г. ўласны карэспандэнт Дзяржтэлерадыё СССР па Беларусі, з 1969 г. загадчык рэдакцыі эканомікі «Беларускай Энцыклапедыі». Адказны за выданне энцыклапедычных даведнікаў «2000 нрафесій», «Меліярацыя», «Іх імёнамі названы...», «Энцыклапедыя сельскага гаспадара» і інш. Дзяржаўная прэмія за ўдзел у стварэнні 12-томнай энцыклапедыі Беларусі. Навуковыя публікацыі па праблемах кіравання вытворчасцю.

Тое, пра што хачу расказаць, спачатку здавалася дробязным. Але работа над кнігай-хронікай «Памяць» пераканала, што мы вельмі слаба ведаем сваю гісторыю і што ў краязнаўстве часта істотнай з'яўляецца дробязная на першы погляд дэталь. Хачу засведчыць, што ў рамантычнай назве маёй вёскі Дуброва няма памылкі, хоць зараз стаіць яна ў чыстым полі, як на бубне, адкрытая ўсім вятрам, і ад дуброў ці гаёў не засталося нават і следу.

Але ж калісьці тут шумела векавая пушча з карабельнымі соснамі і векавымі дубамі-волатамі. Пра гэта расказваў мне дзед Васіль, а ён чуў гэта ад свайго дзеда. І вяліся тут многія звяры, нават мядзведзі.

Ды яшчэ на маёй памяці вёску акаймоўвала мора зеляніны. На нашым крайнім ад Усохаў пасёлку неяк у самыя «соткі» ўразаўся прамавугольнік гаю з ляшчыны, грабоўніку, вербалозу і ліпы. Далей распасціралася сенажаць з такім густым травастоем і ярка стракатай квеценню, што, гуляючы ў жмуркі, варта было адбегчыся на якіх дзесяць крокаў, кінуцца на зямлю — і сховішча было забяспечана.

За сенажацямі пачынаўся багністы лог, зарослы алешнікам, які чамусьці называўся Барсукі. Так і казалі: «Пойдзем па маліну ў Барсукі». А маліны, чорных і чырвоных парэчак, каліны там былі зарасніки. Па другі бок усохскай дарогі, за бродам, цягнуўся такі ж багністы, з альхою Ягелаў лог, у які ўкліньвалася высокая лапіна сухадолу з ельнікам пад назвай Градка. Ад Кострычаў (гэта ўжо Кіраўскі раён) Дуброву адмяжоўвала журавінавае балота. Самы канец вёскі прыкрываў Андрэеў бярэзнік, а праз якіх метраў 200—300 туліўся Анютчын гаёк... На Захадзе, у бок в. Юзафін, цягнуўся дрыгвяністы Сазонаў лог. Паміж сярэднім і крайнім, ці як мы іх называлі «маленькім» і «вялікім» пасёлкамі, таксама зелянеў гай, які вясной кіпеў квеценню чаромхі. А на поўдні «вялікага» пасёлка вымахаў ладны хвойнік, дзе зарадзілі баравікі.

Божа, якое гэта было раздолле! Якая чысціня! Якая прыгажосць! Дыхалася,

здавалася, не паветрам, а нейкім гаючым водарам-настоем. Надвячоркам і з самага світанку навакольле поўнілася пошчакам салаўёў, куваннем зязюль, пераклікам дзеркачоў і працяглым жабіным хорам. А ўдзень у жыце сваё пагражальнае «пад-па-лю» высвісталі перапёлкі. Недзе зусім блізка галёкала жаўна. А ў небе раз-пораз прарэзліва стракаталі бакасы-«баранчыкі».

І ўся гэта непаўторная паэма-казка нечакана-негадана, нібы па волі злога духа, была загублена: магутная меліяратыйная тэхніка бязлітасна знішчыла ўсю прыгажосць, вывернула з каранямі, ператрушчыла. Вось так і апынулася наша Дуброва сярод чыстага поля.

Засталася толькі адна ўцеха: як ні сіліліся асушыць балота за «вялікім» пасёлкам, да канца яго так і не адолелі. Неяк, калі чарговы раз я наведаў Дуброву, цётка Каця (цяпер ужо нябожчыца) сказала: «Схадзіў бы да нашага балота. Кажуць, што журавін і буякоў шмат». Балота гэта сапраўды «наша» і вельмі дарагое сэрцу, бо звязана з дарагімі мне людзьмі — дзедам Васілём і бабай Матрунай, шчырасць і сардэчная дабрыня якіх так арганічна ўпляталіся ў цудоўную казку таго прыроднага асяроддзя, дзе прайшло маё дзяцінства.

Балота знаходзіцца на былой дзедавай зямлі (там быў яго хутар) і носіць найменне нашага роду — Барбарына. Дзедаву маці звалі Варвара, а ў народзе — Барбара. Адсюль і род наш празвалі Барбарынскім. Я, калі трэба прадставіцца камунебудзь з тутэйшых людзей, з гонарам гавару: «Я Васіля Барбарынага ўнук». І ўсё ім зразумела.

Прадзед мой Аляксей (бацька дзеда) памёр маладым, пакінуўшы пяцёра сыноў, старэйшаму з якіх было 12 гадоў. Усе працавалі ў паноў падпаскамі. Потым дзед купіў зямлю і дзякуючы сваёй кемлівасці, стараннасці зажыў заможна, ды так, што трапіў пад раскулачванне. Выслаць не выслалі, але абадралі, як лінку. Пакрыўджаны такім разбоем, дзед у калгас не

У. А. Салановіч.

пайшоў, а падаўся ў плытагоны. Быў ён ад прыроды дужы (у акрузе яго лічылі асілкам) і вельмі спрытны (казаў, што стоячы на адным бервяне з шастом у руках, мог пераплыць не толькі Ольсу, а нават і Бярэзіну).

У час вайны загінулі 2 яго сыны: адзін на Беласточчыне, у першы дзень гітлераўскага нашэсця, а другога (майго бацьку) расстралялі акупанты ў маі 1942 г. Застаўшыся круглым сіратой, я да заканчэння дзесяцігодкі рос у доме дзеда Васіля. Можа, не ўсе паверацъ, але ў хаце ні разу не чуў мацяршчыны і лаянкі. Нізка кланяюся маім дарагім дзядулю і бабулі за школу сялянскай мудрасці, дабрыні і сумленнасці.

Успамінаючы пра дзяцінства, я неяк злавіў сябе на вельмі цяжкай думцы. У Дуброве засталося так мала дарагіх мне аднавяскоўцаў — сваякоў, суседзяў, знаёмых. І не засталося ніводнага мужчыны з Салановічаў-Барбарынцаў. А гэта значыць, што і род наш на гэтым у Дуброве скончыўся. Такі роздум цяжкай скрухай апякае сэрца. І хочацца аднаго: завітаць да родных мясцін, непрыкметна для чужога вока кінуцца на зямлю і выплакацца. А на развітанне сказаць: «Дзякуй табе, родны мой кут! Даруй, што спаўна не аддзячыў табе, што не збярог цябе!» Але, колькі буду жыць, ты, як святыня, заўжды будзеш у маёй памяці. Няхай хоць часцінка таго святога ўспаміну застанецца і ў гэтых радках: можа каму спатрэбіцца.

Лунаюць песні над Нясятай

Ці не таму ў нас зашмат ліха-бяды, што мы, дбаючы пра хлеб надзённы, забылі пра хлеб духоўны? Толькі ці багацеем ад гэтага?

Вёска Нясята — на спадзіне. Глянеш з узгорка — далячынь лугавая, лясная. Колькі песень лунала над ёй: то жаўрукамі ў небе, то вярбою нізкаю над крыніцаю. Спяваюць тут і цяпер. Толькі, на жаль, у асноўным на канцэртах і яшчэ на вяселлях і іншых святах. Цяжка, з вялікім скрыпам адраджаем колішняе звыклае сельскаму жыхару. І безумоўна, бязмерна ўдзячныя тым, хто беражэ песню, рады, што песня гэтая жыве. Чвэрць стагоддзя спяваюць нясяцкія спявачкі. Расквітнеў

іх талент. Нядаўна спявачкі з Нясяты сталі дыпламантамі рэспубліканскага конкурсу беларускай народнай песні.

Аляксандра Мікалаеўна, Марыя Рыгораўна, Зоя Іванаўна Астроўснія не радня паміж сабою, іх яднаюць суседскія, вясковыя адносіны і песня. Марыя Рыгораўна Шышанкова, Ганна Антонаўна Скрыпка, Надзея Цімафееўна Кавалёнак, Лізавета Аляксандраўна Пекур, Софія Дзянісаўна Гушча... Самаддана выводзяць яны народныя мелодыі ў стагоддзе дваццаць першае...

А песні іх адвечныя і вечныя, як само жыццё:

А ў лесе ды на верасе,
Там Васілька ды каня пасе.
Яго дзевачка абед нясе.
Сядзем, Васілька, паабедаем,
Я табе скажу дзіва дзіўнае...

І сярод пяюх — выканальніц народных напеваў — няўрымслівая бабуля Лізавета Аляксандраўна Пекур. Мясцовая. Ёй ужо за 80 гадоў. Шмат пабачыла на сваім вяку. «Нас шасцёра душ было ў сям'і,— гаворыць яна,— адна пара абутку, галадуха адвечная. І ўсяго ж капіталу — голас ды песні матуліны».

Лёс сапраўды не пашкадаваў Лізавету Аляксандраўну. Пасля вайны засталася ўдавой. Адзін за адным памерлі тры сыны і дачка; апошняму хлопчыку было дванаццаць гадкоў. «Кволых гора губіць, а я — дужая,— уздыхаючы, гаворыць баба Ліза, так называюць яе ў Нясяце.— Іду, бывала, з поля, вочы слёзным туманам засцілае, а я спяваю. Так душа мая ратавалася ад гора-бяды. На руках — дзве дачкі. Было, што і «ўлада» крыўдзіла. Нічога. Выжыла. Дзяўчынак сваіх на ногі паставіла, а цяпер спяваю. Абезгалоселі нашы вёскі. Бывае, на вяселлі ці гулянцы ўзляціць песня, ды і кане, як птушка з падбітымі крыламі: мелодыю памятаюць, а словы забыліся. Люблю спяваць песні вясельныя». І заспявала:

А на дварэ дробны дожджык ідзе,
Слізгота,
А нашаму Іваначку жаніціся ахвота.
Яго ж татачка ў веснічках стаіць —
Не вяліць...

...Рэпетыцыя фальклорнага ансамбля Нясяцкага сельскага Дома культуры. Радасцю поўнішся, калі глядзіш на гэту васьмёрку: столькі ў іх імпэту, ініцыятывы, улюбёнасці ў песню. Пачуццё глыбокай павагі выклікае і «рэжысёр» Святлана Паўлаўна Мароз, дырэктар Нясяцкага сельскага Дома культуры. Нялёгка ёй стрымліваць самадзейных артыстаў і ў рэпертуары, і ў выбары ракурсу. Але энергія і вытрымка дапамагаюць ёй быць падзвіжніцай культуры народнай.

— Трывога бярэ за народную песню,— гаворыць Святлана Паўлаўна.— Але выручае думка, што нашы людзі спявалі заўсёды. Душу-песню з народа не вымеш. У яго ж на кожны жыццёвы выпадак, на кожны паварот то песня, то прыпеўка. Ён імі і на бяду адгукаецца. Калі браць па вялікаму рахунку, то народная песня — энцыклапедыя жыцця, кодэкс яго мудрасці і маралі. Кожнае далучэнне да гэтага багацця робіць чалавека чысцейшым. Я на сваіх «артыстак» налюбавацца не магу. Пенсіянеры ўсе. Узрост немалады, а ніводнай рэпетыцыі не прапускаюць. Праспявалі свае песні амаль ва ўсіх гаспадарках раёна.

Зараз на базе Дома культуры ў Нясяце створаны яшчэ два ансамблі выканаўцаў народных песень: жаночы і мужчынскі.

Фальклорны ансамбль Нясяцкага Дома культуры.

І адгукнецца ў сэрцы...

Іх двое. Абодва настаўнікі, абодва надзеленыя талентам. Іх ведаюць далёка за межамі раёна. Гэта Аркадзь Паўлавіч Юркавец і Іван Якаўлевіч Сазанавец.

А. П. Юркавец нарадзіўся ў 1926 г. ў в. Восава, што пад Клічавам. А ў сталыя гады пераехаў на радзіму сваіх бацькоў у в. Усохі і асеў тут, назаўсёды звязаўшы свой лёс са школай, хоць педагагічнай навукі і не праходзіў. Пра яго кажуць, што анёл нёс талент на траіх, ды аднаму яму, Аркадзю Паўлавічу, узычыў. І сапраўды ён з'яўляецца ўлюбёнцам трох муз.

Бадай, больш ведаюць яго як разьбяра па дрэве. У яго хаце стаіць такарны станок, тут жа мноства адмысловых інструментаў і загатовак з дрэва. Запусціць Аркадзь Паўлавіч станок, спрытна запрацуе інструментамі — і на вачах драўляная загатоўка ператвараецца то ў зайчыка, то ў дамавіка. У хаце цэлая выстаўка выразаных з дрэва звяркоў, птушак, казачных герояў, а таксама прыгожа аздобленых прадметаў побыту. Гэтаму майстэрству ён навучае дзяцей ва Усохскай нямоўнай сярэдняй школе, дзе вядзе ўрокі працы. Дзеці з задавальненнем і радасцю прыходзяць на гэтыя ўрокі чарадзейства. Яны і самі многае ўжо спасцігліі. Пра тое сведчаць іх работы. Асабліва ўражваюць карункі з дрэва, якімі ўпрыгожаны школьная майстэрня і калодзеж на школьным двары. Вырабы Аркадзя Паўлавіча не раз дэманстраваліся на раённых і абласных выстаўках народнай творчасці. А яшчэ Аркадзь Паўлавіч скончыў Гомельскае музычнае вучылішча і выкладае ў школе музыку, раскрывае сваім выхаванцам чароўны свет гукаў. Возьме ў рукі гармонік — і той зальецца светлымі пералівамі, узніме і панясе кудысьці ў далячынь на крылах мелодыі. Гэта пачуццё ўзнікае заўжды, калі слухаеш сольнае выступленне Аркадзя Паўлавіча на канцэртах самадзейных артыстаў. Іграе ён і на іншых музычных інструментах. Хіба дзіва, што такі чалавек заўсёды жаданы і паважаны і на вяселлі, і на хрысцінах. Вядома ж, і яго вучням урокі музыкі прыносяць вялікую асалоду.

Ёсць у Аркадзя Паўлавіча і яшчэ адно захапленне — маляванне. Больш за ўсё любіць ён пейзажы, у якіх падкрэслівае гарманічнасць навакольнага свету.

Іван Якаўлевіч Сазанавец таксама разьбяр. Нарадзіўся ў в. Бабоўка ў 1931 г., вядзе ўрокі працы ў Ганчанскай сярэдняй школе. Вялікі ён майстар і нястомны шукальнік. Каля яго двара ледзь не батанічны сад у мініяцюры: яблыні, кусты чорных, залацістых парэчак, агрэсту маскоўскага, каліны, садовых малін. А побач кветкі — язмін, ружы, лілеі, флёксы... Праўда, кветкі пад наглядам Настассі Нічыпараўны, жонкі Івана Якаўлевіча. Астатняе ж — выдумка мужа. У садку што ні дрэва, то новы сорт. Прышчэпкі Іван Якаўлевіч робіць сам, у асноўным зімой. Прыцягвае ўвагу груша пад акном. Дзівоснае дрэва: семнаццаць прышчэпак ад іншых пладовых дрэў. Садок для І. Я. Сазанаўца як той дэндрарый. Тут ён нешта эксперыментуе, правярае, вышуквае, а потым знаходку пераносіць на прышкольны ўчастак, дэманструе яе ў біялагічным кабінеце школы.

А. П. Юркавец.

І. Я. Сазанавец на ўроку працы ў Ганчанскай сярэдняй школе.

Зойдзеш у дом — яшчэ ў пярэднім пакоі вырабы з бярозы, на сцяне ласіныя рогі, на падстаўцы чучала савы.

А пабывайце ў школьнай майстэрні! У распараджэнні дзяцей самыя розныя станкі, інструменты. Разнастайныя вырабы з дрэва, металу здзіўляюць сваёй арыгінальнасцю, непаўторнасцю, высокім майстэрствам. Сумнення ніякага няма — гэта жывое ўяўленне настаўніка Івана Якаўлевіча перайшло да вучняў. Падобнае можна ўбачыць у доме Сазанаўца. Там і смешны касалапы Мішка з бочачкай мёду, арляняты на скале са злоўленай гадзюкай, арляня, якое сочыць за вожыкам, пясец, каршунок. Усё гэта зроблена з драўніны, адшліфавана, даведзена да дасканаласці. Самы звычайны прадмет у руках майстра ажывае, набывае непаўторныя фарбы. Вось з каровінага рогу раскрываюцца пялёсткі цюльпанаў. З гэтага ж матэрыялу і асятровая рыбіна, вельмі падобная да сапраўднай. Прывабныя чайныя сервізы з бярозы, ліпы, вольхі. Шмат вясёлага гумару ў кампазіцыі, што на прыборы для алоўкаў: бабёр з бабрыхай пабудавалі плаціну цераз рэчку, і з гэтай нагоды весялосць — бабёр іграе на гармоніку, а бабрыха скача. Удаліся Івану Якаўлевічу фігуркі чаплі на балоце, вавёркі (сядзіць на дрэве, а знізу дзве лайкі спрабуюць дастаць яе).

Вельмі шкада, што не ўсё давялося паглядзець: частка лепшых вырабаў Івана Якаўлевіча вандруе. Яны дэманстраваліся на выстаўцы ў Мінску, а потым накіраваны ў Маскву.

Настаўнік і вучні — у цеснай дружбе з прыродай. Некалькі гадоў у школе пад кіраўніцтвам Івана Якаўлевіча працавала лясніцтва. З якой радасцю свяціліся вочы дзяцей, калі яны апраналі форму леснікоў, лесатэхнікаў, ляснічага. Чым толькі не займаюцца, дзе толькі не бываюць вучні са сваім настаўнікам! То яны робяць домікі для птушак і ставяць іх на дрэвах, то рассяляюць мурашнікі, то шчыруюць у гадавальніну Ганчанскага лясніцтва. Пад наглядам леснікоў школьнікі вырошчваюць у гадавальніку саджанцы хвой, яблынь. Абапал дарог пасадзілі 900 дрэўцаў. «Зялёныя» патрулі ўзялі на сябе клопат па ахове птушыных гнёздаў.

Глядзіш на ўсе гэта і радуешся: як добра, што ёсць на свеце людзі, якія шчодра дораць нам прыгажосць. А прыгожае — толькі дакраніся да яго сэрцам! — абавязкова адгукнецца дабрынёй.

Ул. Назараў.

Страдывары з Заполля

— Выходзіць, спецыяльна прывезлі нам сваю балалайку? — спыталі Антона Пракопавіча ў кансерваторыі.— Што ж, давайце праверым, на што яна здольная.

Выкладчык зняў са сцяны новенькі інструмент і прапанаваў:

— Сыграем што-небудзь разам. Я на гэтай, вы — на сваёй.

Селі побач дацэнт з кансерваторыі і народны майстар з Клічаўскага раёна. Спачатку няўпэўнена, а потым усё дружней, весялей зазвінелі струны балалайкі. Калі скончылі іграць, выкладчык адклаў у бок сваю балалайку, узяў самаробную, прывезеную на праверку, і нечакана прапанаваў:

— Ці не згадзіліся б вы, Антон Пракопавіч, зрабіць паўсотні вось такіх для маіх студэнтаў?

— Дык я ж спецыяльна музычнымі інструментамі не займаюся. Проста захапляюся ў вольны час,— адказаў Антон Пракопавіч.— Па спецыяльнасці я фельчар.

Слова за слова — разгаварыліся. І памяць павяла госця ў далёкія 30-я гады. Прыехаў неяк на канікулы суседскі хлопец з балалайкай. Вакол яго ўся моладзь збіралася. А паехаў — ціха стала ў вёсцы. Вось тады сямікласнік Антон Клімовіч і вырашыў змайстраваць сваю балалайку. Першая, праўда, няўдалая атрымалася. А другая загучала не горш, чым у таго студэнта. Антон сам пачаў на ёй іграць. А потым у бацькавага брата знайшоў кавалачкі старой разбітай скрыпкі, зняў памеры і зрабіў новую, потым яшчэ адну... Залатыя рукі ўмельца дзівосна спалучаліся з чуццём музыканта. Можа, таму і атрымліваліся ў яго, самавука, такія цудоўныя інструменты, на якіх ён сам так віртуозна іграў. Ні адна вечарынка ў сяле не праходзіла без Антона Клімовіча і яго скрыпкі. З таго часу захапленне стала яго другім прызваннем.

Толькі ў гады Вялікай Айчыннай вайны давялося надоўга адкласці любімы занятак. Якраз вясной 1941 г. ён скончыў ваенна-медыцынскае вучылішча. Усяго месяц праслужыў, і грымнула вайна. Удзельнічаў у баях пад Віцебскам і Смаленскам, пад Масквой і Ленінградам, у Прыбалтыцы. І ўсе гады на перадавой. Двойчы быў паранены. Многім байцам выратаваў жыццё, многіх вярнуў у строй. Перамога застала Антона Клімовіча ў Прыбалтыцы. Іх артылерыйскаму падраздзяленню далі некалькі дзён адпачынку. Вось тады малады лейтэнант медыцынскай службы ўспомніў пра сваё захапленне і змайстраваў балалайку. Вакол яго пачалі збірацца байцы, каб паслухаць цікаву музыку, задушэўную песню. Звальняючыся ў запас, Клімовіч падараваў гэту балалайку і сказаў на развітанне:

— На памяць ад ваенфельчара. А сабе я яшчэ зраблю.

І змайстраваў, ды не адну, хоць не так ужо многа было ў яго вольнага часу ў Заполлі, куды накіравалі яго працаваць загадчыкам фельчарска-акушэрскага пункта. Участак вялікі — 6 вёсак. Маладыя спецыялісты не вельмі тут затрымліваліся. Таму часта ўсю нялёгкую ношу сельскага медработніка даводзілася несці аднаму. Ды яшчэ грамадская работа: быў дэпутатам сельскага Савета, удзельнічаў у мастацкай самадзейнасці.

Але Антон Пракопавіч выкройваў час, каб змайстраваць балалайку ці скрыпку. А вечарам спяшаўся ў клуб на рэпетыцыю ансамбля народных інструментаў. А вось калі пайшоў на пенсію — увесь вольны час аддаваў свайму захапленню.

— З матэрыяламі толькі цяжкавата,— казаў Антон Пракопавіч.— Нарыхтоўкай іх у рэспубліцы ніхто не займаецца. А каб зрабіць сапраўдны інструмент, патрэбна стогадовая елка,— белая, бойкая, з дробнымі і стройнымі ствалами, як струна. Ды і клён патрэбен асаблівы. Я іх навучыўся адбіраць, калі лесарубам працаваў да вайны. А колькі клопатаў з падрыхтоўкай і апрацоўкай матэрыялаў! Але з чым можна параўнаць тую радасць, якую нараджае першы гук зробленай тваімі рукамі скрыпкі ці балалайкі? Словамі гэта не перадаць, гэта трэба адчуць.

Няма ўжо Антона Пракопавіча ў жывых. Але светлая, добрая памяць пра чулага мясцовага доктара і натхнёнага майстра-самавука жыве. Спяваюць, радуюць людзей зробленыя ім народныя інструменты.

М. Назаровіч.

«Благаслаўляю прыгажосць»

Аляксандр Уладзіміравіч Дубінін — мастак-афарміцель Клічаўскага аддзела культуры. Працуе ў асноўным у жанры пейзажа. На яго карцінах усе поры года. Вось вясна — бярозы, налітыя сокам; здаецца, яшчэ хвіліна — і смарагдавая зеляніна ўпрыгожыць іх косы. А на зямлі — дзіва ды толькі: яшчэ няма сакавітай травы, а блакітныя пралескі ўжо цягнуць свае галоўкі, радуюцца жыццю і пяшчотнаму блакітнаму небу. Побач зімовы пейзаж: санная дарога, толькі што пракладзеная па снежным лузе, далей стагі сена і лес. А вось і зусім знаёмае, роднае: масток, кінуты цераз лясны ручай. Сакавітыя, яркія фарбы напамінаюць, што не за гарамі і лета.

І нарэшце — восеньскія матывы. Яны заўсёды самыя каларытныя, самыя адметныя ў творчасці мастака. Ён бачыць штосьці сваё ў гэтай пары года. А яшчэ Аляксандр Уладзіміравіч — майстар разьбы па дрэве. Клічаўчане, ды і прыезджыя, затрымліваюць свой позірк на прыгожа аздобленых будынках дзіцячай і цэнтральнай бібліятэк. Яго работа!

Нарадзіўся Аляксандр Уладзіміравіч у 1948 г. ў в. Нясята. Ад дзеда Зміцера пераняў творчыя адносіны да працы, уменне разумець нрыгожае, ствараць яго сваімі рукамі.

Пачаў маляваць, выразаць з дрэва. З узростам майстэрства шліфавалася. Была нават думка стаць прафесійным мастаком. Паспрабаваў паступаць у Мінскі тэатральна-мастацкі інстытут. Не пашанцавала. Пайшоў працаваць. Аднак любоў да мастацтва брала сваё. З цягам часу завочна скончыў Маскоўскі універсітэт народнай творчасці. Зараз працуе ў майстэрні пры раённым Доме культуры. У яго шмат задумак. Удзельнічаў у раённых і абласных выстаўках самадзейна-мастацкай творчасці. Узнагароджаны дыпломам абласнога ўпраўлення культуры.

Так, яшчэ многія краявіды Клічаўшчыны, несумненна, ажывуць на яго палотнах, крануць чалавечыя сэрцы трапяткой

улюбёнасцю ў родны край. «Я благаслаўляю прыгажосць, што азарае і натхняе мяне,— прызнаецца Аляксандр Уладзіміравіч.— І хачу аднаго: каб гэты ачышчальны агонь сагрэў душы людзей, адкрыў ім вочы, навучыў любіць і берагчы прыроду».

В. Грышанава.

Харавы калектыў

У 1987 г. акадэмічнаму хору раённага Дома культуры прысвоена званне народнага. Расце майстэрства самадзейных артыстаў. У рэпертуары хору ўрыўкі з опер, творы беларускіх і замежных кампазітараў. Слухачам вельмі падабаюцца ў выкананні хору кантата «Песні Белай Русі» кампазітара А. І. Хадоска, хор сялян з оперы Б. Сметаны «Прададзеная нявеста», «Аве Марыя» Дж. Качыні, лірычныя песні І. Лучанка і Ю. Семянякі, «Урачыстая песня» М. Магамаева і інш.

У складзе хору больш за 40 чалавек. Гэта выкладчыкі музычных школ Раіса Бардзілоўская, Ірына Габрусь, Сандра Яшчук, Уладзімір Ігнатовіч, Уладзіслаў Яфімаў, Аляксандр Красько, настаўнікі Галіна Заскевіч, Антаніна Ачыновіч, Святлана Харчанка, Ірына Мелкаступава, работнікі Дома культуры і дзяржустаноў Тамара Астроўская, Зоя Махнарылава, Ганна Сахарчук, Наталля Барысёнак, Уладзімір Клепча.

Пры харавым калектыве створаны вакальны ансамбль, трыо вакалістаў, дуэты. ёсць салісты (Вольга Мацюшонак, Віктар Верхаўцоў, Уладзімір Ігнатовіч).

Нязменным мастацкім кіраўніком хору з'яўляецца Раіса Уладзіміраўна Ціхаміра-ва, канцэртмайстрам — Ніна Штэйнберг.

Самадзейныя артысты бралі ўдзел у рэспубліканскім тэлевізійным конкурсе «Пеўчае поле» ў 1990 г., у рэспубліканскім фестывалі харавой музыкі, прысвечаным 100-годдзю з дня нараджэння Р. Шырмы, дзе былі адзначаны дыпломамі. Гэты калектыў неаднойчы выступаў на сцэнах Дамоў культуры не толькі ў сваім раёне, але і ў Бялынічах, Асіповічах, Глуску, Бабруйску, у вёсках Краснапольскага і Слаўгарадскага раёнаў, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай катастрофы. І ўсім слухачам ён даспадобы сваім высокім выканаўчым майстэрствам.

Агапа-чарадзейка

Агапа Іванаўна Белазор спрактыкаваным рухам рассцілае посцілкі, сурвэткі, ручнікі, і нібы рознакаляровая вясёлка зіхаціць перад вачыма. Чаго толькі няма на гэтых створаных яе рукамі рэчах! Чырвоныя, ружовыя, блакітныя кветкі, птушкі, адмысловы арнамент... Чарадзейка ды толькі!

Лёс не шкадаваў гэтую жанчыну. З дзяцінства зведала яна голад і холад, цяжкую непасільную працу. Бацька вельмі рана памёр. Маці гадавала 9 дзяцей, але жывымі засталіся толькі яна, Агапа, і сястра Таццяна. Ды не зачарсцвела душа, захавала прыроджаны аптымізм, гумар, веру ў людзей, любоў да родных мясцін.

Нарадзілася Агапа Іванаўна ў 1911 г. ў в. Буднеў. Тут працавала ў калгасе, разам з мужам Васілём Прохаравічам Белазорам выхавала чацвёра дзяцей. Але, мабыць, самае адметнае — яе творчасць. У вёсках умець добра ткаць — не вялікае дзіва, бо гэты занятак для жанчын таго часу быў першай неабходнасцю. Жаночыя рукі ткалі палотны, апраналі сям'ю, упрыгожвалі сваё жыллё. Але тое майстэрства, якога дасягнула ў ткацтве Агапа Іванаўна, здзіўляла нават вясковых жанчын.

А ткаць яна пачала яшчэ ў дзяцінстве, атрымаўшы ад маці першую навуку гэтага ўмельства. Праўда, маці ткала проста, без адмысловых узораў — пераважна палатно на адзенне, а дзяўчынцы хацелася перакласці на палатно тое, што нараджалася ў яе душы. Больш складаныя прыёмы яна пераняла ў суседкі Таццяны. Спрытная і кемлівая ад прыроды, Агапа хутка сама пачала ствараць новыя ўзоры, якія ўражвалі сваёй незвычайнасцю. Першая яе самастойная работа — льняны ручнік у пяць нітоў, аздоблены вышыўкай «макоўка» з нітак «запалач», як называлі іх у народзе. Потым былі посцілкі, дываны, тканыя «дымкай», «пераборамі» ў 6—8 нітоў, палатно, з якога шылася адзенне.

Па сённяшні дзень у хаце Агапы Іванаўны стаіць вечная спадарожніца яе

Акадэмічны хор раённага Дома культуры.

жыцця — швейная машына «Зінгер». На паліцах у шафе захоўваецца палатно і мноства тканых вырабаў мінулых гадоў. Ложкі ў хаце засланы посцілкамі, а на абразах у куце — прыгожы белы ручнік з багатым беларускім арнаментам. За сваё жыццё Агапа Іванаўна саткала дзесяткі ручнікоў і посцілак. Многія з іх аддала сваёй дачцэ Марыі, якая жыве на Поўначы. Ёсць яе вырабы і ў аднавяскоўцаў.

Саматканыя посцілкі і ручнікі Агапы Іванаўны дэманстраваліся на выстаўках у Мінску, Магілёве. У 1987 г. яе посцілка, сатканая «дымкай» з чорных і чырвоных нітак, была прадстаўлена на Усесаюзным фестывалі народнай творчасці і адзначана Дыпломам Саюза мастакоў СССР і бронзавым медалём Усесаюзнай ВДНГ.

Гэта жанчына і цяпер не ведае стомы, хоць размяняла ўжо дзевяты дзесятак. Вочы яе жывыя, са смяшынкай, гаворка і рухі жвавыя. І заўсёды ў працы: то на агародзе корпаецца, то ў двары жывёлу даглядае, а ў астатні час вяжа кашулі, жакеты — для сябе, для дзяцей і ўнукаў.

Т. Касцюкевіч.

«Пошук, творчасць, ініцыятыва»

Так называецца аматарскае аб'яднанне, якое ў 1987 г. створана пры раённым Доме культуры і аб'ядноўвае аматараў сельскагаспадарчай тэхнікі. Старшыня яго — майстар дарожна-рамонтнага будаўнічага ўпраўлення А. Л. Коўрык. Члены клуба займаюцца канструяваннем трактароў і іншых сельскагаспадарчых машын, абменьваюцца вопытам, дэталямі машын, дапамагаюць адзін аднаму ў зварачных і такарных работах. Раз у год у кастрычніку праводзяць выпрабаванні сваіх вынаходак, бяруць удзел у выстаўках і аглядах самадзейнай сельскагаспадарчай тэхнікі. Міні-трактар «Лань», які зрабіў А. Л. Коўрык, дэманстраваўся на І Рэспубліканскай выстаўцы ў Брэсце (1989). Гэта вынаходка адзначана дыпломам і грашовай прэміяй. У 1990 г. аматарскае аб'яднанне адзначана дыпломам II ступені ЮНЕСКА. На Рэспубліканскай выстаўцы «Аматарства Беларусі» ў г. Мінску (1991) старшыня клуба А. Л. Коўрык за свой самадзейны міні-трактар атрымаў Дыплом II ступені і ўзнагароджаны турыстычнай пуцёўкай на возера Байкал. У 1991 г. аб'яднанню прысвоена званне народнага. Члены клуба займаюцца не толькі тэхнікай, але і выяўляюць здольных людзей у раёне. Разам з работнікамі Дома культуры ўдзельнічаюць у вечарах і святах, якія праводзяцца ў раёне.

Боль Афганістана

Афганская вайна чорным крылом лягла і на шматпакутную Клічаўскую зямлю. У мацярок, удоў-салдатак і асірацелых дзяцей яшчэ не зарубцаваліся раны ад страшнай вайны з фашызмам, а далёкі і чужы Афганістан прынёс новыя выпрабаванні, калецтвы і смерці. У афганскай вайне прымалі ўдзел 47 прызыўнікоў з Клічаўскага раёна, з іх чацвёра заплацілі за гэту авантуру сваімі жыццямі.

ВАЛОВІК Андрэй Іванавіч. Нарадзіўся 2.5.1967 г. ў в. Галішчына. Беларус. Маці, Еўдакія Іванаўна, пенсіянерка, бацька, Іван Андрэевіч, жывёлавод калгаса «Савецкая Беларусь». У 1982 г. Андрэй скончыў Закуцкую васьмігадовую школу, у 1985 г. — Бялыніцкае ПТВ № 40. Працаваў трактарыстам у калгасе «Савецкая Беларусь». У 1985 г. прызваны ў Савецкую Армію, у 1986 г. накіраваны ў Афганістан. Радавы А. І. Валовік загінуў 23.5.1986 г. Пахаваны ў в. Ганаратава Клічаўскага р-на. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

...У той дзень А. І. Валовік разам з сябрамі ўдзельнічаў у баявой аперацыі. З засады мяцежнікі адкрылі агонь па галаўной машыне, у якой знаходзіўся Андрэй. Праз агонь і дым нельга было разгледзець, адкуль вёўся абстрэл. Андрэй адчыніў люк танка і пачаў засякаць агнявыя пункты ворага. Разлік буйнакалібернага кулямёта праціўніка быў знішчаны, танк амаль выйшаў з-пад абстрэлу, але душманская куля трапіла ў сэрца Андрэя.

КУЧЫНСКІ Уладзімір Васілевіч. Нарадзіўся 9.7.1962 г. ў в. Закоркі 1-я. Беларус. Бацькі, Васіль Герасімавіч і Ніна Сяргееўна, пенсіянеры. У 1979 г. Уладзімір скончыў Востраўскую сярэднюю школу, у 1980 г. — Мінскае ПТВ № 114. Працаваў электраманцёрам кантактных сетак трамвайна-тралейбуснага ўпраўлення ў г. Мінску. У 1980 г. прызваны ў Савецкую Армію, у 1981 г. накіраваны ў Афганістан. Радавы У. В. Кучынскі загінуў у баі 21.4.1982 г. Пахаваны на радзіме. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Імем У. В. Кучынскага названа вуліца ў в. Стары Востраў Клічаўскага раёна.

МАЦЮШОНАК Алег Рыгоравіч. Нарадзіўся 3.7.1962 г. ў г. п. Клічаў. Беларус. Маці, Галіна Рыгораўна, пенсіянерка, бацька, Рыгор Фёдаравіч, рабочы Клічаўскага лясгаса. У 1978 г. Алег скончыў 8 класаў Клічаўскай сярэдняй школы № 2, у 1981 г.— Буйніцкае ПТВ № 1. Працаваў механізатарам у калгасе імя Жданава Клічаўскага раёна. У 1981 г. прызваны ў Савецкую Армію, у 1982 г. накіраваны ў Афганістан. Камандзір самаходнай гаўбіцы, малодшы сяржант А. Р. Мацюшонак пры выкананні баявога задання цяжка захварэў. Памёр 19.7. 1982 г. Пахаваны на радзіме. Пасмяротна ўзнагароджаны медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту».

ШПАК Сяргей Мікалаевіч. Нарадзіўся 5.5.1966 г. ў в. Стары Востраў. Беларус. Бацькі, Марыя Якаўлеўна і Мікалай Рыгоравіч, пенсіянеры. У 1983 г. Сяргей скончыў Востраўскую сярэднюю школу, працаваў памочнікам камбайнера ў калгасе імя Тэльмана. У 1984 г. прызваны ў Савецкую Армію, у 1985 г. накіраваны ў Афганістан. Радавы С. М. Шпак загінуў 26.1.1986 г. Пахаваны на радзіме.

Святыні Клічаўшчыны

На Клічаўскай зямлі шмат помнікаў, да якіх не зарастаюць сцежкі, а ў дні народных урачыстасцей кладуцца кветкі. Сярод помнікаў ёсць і галоўныя святыні, пра якія распавядаецца ніжэй.

КУРГАН БЕССМЯРОТНАСЦІ

Ён знаходзіцца на паўночна-ўсходняй ускраіне Клічава каля дарогі на в. Чачэвічы. Насыпаны ў 1967 г. ў гонар партызан і савецкіх воінаў, якія ўдзельнічалі ў вызваленні раёна. На яго вяршыні — стэла і скульптуры воіна, партызана і дзяўчыны. У падножжы помніка закапана капсула са спісам воінаў, партызан і мірных жыхароў, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, з запаветам нашчадкам і тэкстам клятвы працоўных раёна вечна захоўваць памяць пра тых, хто аддаў сваё жыццё за свабоду і незалежнасць.

Курган Бессмяротнасці — святыня на Клічаўскай зямлі, сімвал мужнасці і стойкасці яе абаронцаў, удзячнай памяці нашчадкаў. Тут праводзяцца многія ўрачыстасці. Яму прысвячаюцца паэтычныя радкі.

Г. Ісакава.

КУРГАН

Над ціхай Ольсай палымнеюць зоры,
Ці над лугамі сцелецца туман,
На ўскрайку лесу, быццам у дазоры,

А. І. Валовік.

У. В. Кучынскі.

А. Р. Мацюшонак.

С. М. Шпак.

За Клічавам узвышаецца Курган,
Курганам Бессмяротнасці завецца
Той насып рукатворны над зямлёй.
Ён — помнік славы, памяць нашых сэрцаў,
Аб тых, хто засланіў наш край сабой.
Спыніце, людзі, войнаў ліхалецце,
Каб іх не зведаць болей на планеце,
Спыніце смерць свінцовых ураганаў,
Каб больш не насыпаць такіх Курганаў.

І. Іваноў

БАЛЛАДА О КУРГАНЕ

Чуть прорежутся
Звёзды над бором,
Забелеет над Ольсой туман,
Я иду не спеша косогором
На бессмертный курган-великан.
И взойдя на вершину кургана,
Я, волнуясь, гляжу на большак,

Курган Бессмяротнасці.

По которому шли партизаны,
По-солдатски печатая шаг.
Сколько их
Нынче в живе осталось?
Приглядитесь, друзья-земляки!
Может, самая малая малость
Ходит с вами у Ольсы-реки.
Имена их друзей нам знакомы,
На храненье их принял курган,
Чтоб жила
В стенах каждого дома
Слава кличевских партизан,
Чтобы юноши помнили свято,
Выбирая свой жизненный шлях,
Как за них умирали когда-то
Эти люди в сосновых лесах.
В ранний час и в глухие потемки,
В дни торжеств и в печальные дни,—
Сохрани их, курган, для потомков,
Подвиг их на века сохрани.

УСАКІНСКІ МЕМАРЫЯЛЬНЫ КОМПЛЕКС

На гераічнай Клічаўскай зямлі ёсць мясціны, якія даносяць да нас подых Вялікай Айчыннай вайны і водгукі жорсткіх баёў нашых землякоў з ворагам.

Усакінскі партызанскі лес — сведка даўніх баёў — і цяпер яшчэ не залячыў раны, пакінутыя вайной, не загладзіліся яшчэ і не зараслі глыбокія бомбавыя варонкі. У паўкіламетры ад сэрца партызанскага краю — вёскі Усакіна — метадам народнай будоўлі ўзведзены мемарыяльны комплекс Партызанскай славы. Гэта даніна мужнасці савецкіх людзей, вечная памяць пра тых, хто загінуў у жорсткай схватцы з ворагам.

Мемарыял аб'ядноўвае 4 помнікі. Пачынаецца комплекс мемарыяльным знакам у гонар Магілёўскага падпольнага абкома партыі, які з красавіка 1943 г. дыслацыраваўся і дзейнічаў на тэрыторыі Клічаўскай партызанскай зоны. Гэта граніты маналіт, на якім змешчана пліта з надпісам: «Усакінскі лес у гады Вялікай

Айчыннай вайны быў месцам арганізацыі партызанскага руху. У 1943—1944 гадах тут базіраваўся Магілёўскі падпольны абком КП(б)Беларусі і штаб ваенна-аператыўнай групы партызанскіх злучэнняў».

Воддаль, на маляўнічым узвышшы — могілкі мемарыяла. Пад векавымі хвоямі размешчана 18 брацкіх магіл. Астанкі загінуўшых партызан, якія былі пахаваны ў розных месцах усакінскага лесу, перавезены сюды восенню 1984 г. Тут знайшлі апошні свой прытулак больш за 400 загінуўшых герояў. Іх імёны на чорных плітах гранітнай сцяны Памяці. Над брацкімі магіламі сярод схіленых сцягоў узвышаецца журботная фігура салдата, адлітая з бронзы. Полымя Вечнага агню выбіваецца з чашы ў форме зоркі.

Вузкая сцяжынка, збочыўшы ў лес, вядзе да партызанскага лагера. Тут амаль усё так, як было ў сапраўдным паселішчы народных мсціўцаў, што знаходзілася ў вёсцы Цераболь за 8 кіламетраў адсюль. Густыя вершаліны дрэў надзейна

Фрагменты партызанскага лагера ва Усакінскім лесе (рэканструкцыя): 1. Зямлянка ўзвода. 2. Зямлянка сакратара Клічаўскага падпольнага РК КП(б)Б Я. І. Зайца. 3. Зямлянка сакратара Магілёўскага абкома КП(б)Б Д. С. Маўчанскага. 4. Партызанская пякарня. 5. Калодзеж.



Усакінскі мемарыяльны комплекс. Могілкі.

хавалі ад вока чужынцаў партызанскае жытло — зямлянкі. Непадалёк хлебапякарня, калодзеж-журавель, кухня — уладанні гаспадарчага ўзвода. У цэнтры — штабныя зямлянкі, дзе распрацоўваліся і абмяркоўваліся планы баявых аперацый. Амаль што не зачыняліся дзверы друкарскай зямлянкі, дзе рыхтаваліся выпускі партызанскіх газет, лістовак, працаваў друкарскі станок. Самаадданa змагаліся за жыццё параненых урачы і медсёстры ў зямлянцы медсанчасці.

На другім кіламетры ад Усакіна абапал дарогі, што вядзе да самага трагічнага помніка «Расколатая хата», шапочуць лісцем 140 маладых дрэўцаў. Яны нібы працягваюць жыццё знішчаных тут фашыстамі 140 мірных жыхароў вёсак Вязень і Сялец. Раздзеленыя невялікім полем, тут калісьці стаялі вёскі з такімі назвамі. У жніўні 1942 г. карнікі з батальёна Дзірлівангера сагналі жанчын, старых, дзяцей да ямы і расстралялі іх. Дамы былі разрабаваны і спалены. Астанкі мірных жыхароў пахаваны ў брацкай магіле ля падножжа помніка.

Вёскі гэтыя пасля вайны не адрадзіліся. Як нанамін пра іх — 2 вялікія камні з надпісамі «Вязень» і «Сялец» і вершаваныя радкі — наказ загінуўшых жывым:

Той скрываўлены ранак
быў чорным ад горкага дыму,
І дрыжэла зямля ад смяротнага стогну ахвяр.
Боль пякучы ў сэрцах стрымайце,
беражыце Радзіму,
Каб ніколі не выбухнуў
новы ваенны пажар!

Музей народнай славы

Адкрыты 10.8.1969 г. Мае 6 экспазіцыйных залаў агульнай плошчай 200 м², 4000 экспанатаў асноўнага фонду, якія расказваюць пра найбольш цікавыя падзеі з гісторыі Клічаўшчыны. Ёсць дакументы і матэрыялы пра старажытную мінуўшчыну краю. Прадстаўлена вялікая калекцыя прадметаў сялянскага побыту, рэчаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Некаторыя матэрыялы расказваюць пра падзеі 1917 г., правядзенне калектывізацыі ў раёне. Асобная тэма — расказ пра землякоў, што сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій. У экспазіцыі змешчаны матэрыялы пра ўраджэнца вёскі Бацэвічы, першага прафесара геаграфіі Беларусі А. А. Смоліча, расстралянага ў 1938. Шмат матэрыялаў музея прысвечана ўдзелу ўраджэнцаў Клічаўшчыны ў Вялікай Айчыннай вай-

не. Стэнды залаў расказваюць пра ўзнікненне і разгортванне падполля і партызанскага руху ў раёне. Сярод экспанатаў — пастанова РКП(б)Б і райвыканкома ад 4.4.1942 г. «Аб аднаўленні Савецкай улады на тэрыторыі Клічаўскага раёна», экзэмпляры падпольных газет «Голас партызана» і «За радзіму», фатаграфіі іх супрацоўнікаў, пішучая і друкарская машынкі, макет партызанскай друкарні, прагальныя друкарскія планкі, радыёстанцыя Героя Савецкага Саюза А. Ф. Колесавай, кулямёты, мінамёты, іншая зброя, асабістыя рэчы, абмундзіраванне партызан, медыцынскія інструменты партызанскіх урачоў і інш. Тут жа фатаграфіі камандзіра саставу Клічаўскага аператыўнага цэнтра, дакументы, асабістыя рэчы, узнагароды камандзіра Клічаўскай ваенна-аператыўнай групы І. З. Ізоха, ніраўнікоў Клічаўскага падполля П. М. Вікторчыка і Я. І. Зайца, матэрыялы пра дзейнасць камсамольскага падполля, пра лётчыкаў 19-га авіяатрада 101-га авіяпалка, якія дастаўлялі грузы з Вялікай зямлі, матэрыялы аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў у раёне, аб вызваленні гарадскога пасёлка і раёна воінамі 348-й стралковай дывізіі і партызанамі Клічаўскага злучэння. У экспазіцыі таксама дакументы і бюст Героя Савецкага Саюза земляка П. А. Крываноса, дыярамы «Партызанскі лагер ва Усакінскім лесе», «Разгром варожага гарнізона ў Клічаве 20.3.1942 г.», «Партызанскі аэрадром» (маст. А. Шкляр), карціна «Пасяджэнне падпольнага райкома камсамола» (маст. Э. Белагураў). Дзейнічае філіял музея — Усакінскі мемарыяльны комплекс (адкрыты ў 1985 г.).



Ветараны Вялікай Айчыннай вайны ў Клічаўскім музеі.

Клічаўскі вальс

Ты для нас родны з дзяцінства,
Мы ганарымся табой,
Еду з Масквы я ці з Мінска,
Чую твой шум, Цераболь.
Прыпеў: Край партызанскай славы,
Горад над Ольсай-ракой,
Помняць палі і дубравы
Подзвіг вялікі твой.
Радасна выйсці за Клічаў,
Глянуць у шыр-далячынь,
Быццам бы нас з табой кліча
Неба бяздоннага сінь.

Прыпеў

Ольсы празрыстыя воды,
Гоман бялюткіх бяроз
Я праз баі і паходы
Шчыра у сэрцы пранёс.

Прыпеў

Славаю рук працавітых
Множым мы славу тваю.
Краю мой, сонцам спавіты,
Гімны спявае жыццю.

Прыпеў

Як не згінаецца долу
Ранены кулямі клён,
Мае жалезную волю
Наш партызанскі раён.

Прыпеў

АСНОЎНЫЯ СКАРАЧЭННІ, ПРЫНЯТЫЯ Ў КНІЗЕ «ПАМЯЦЬ»

авіяц. (авиац.) — авіяцыйны
арт.— артылерыйскі
в. (д.) — вёска (деревня)
вобл. (обл.) — вобласць
воп.— вопіс
г.— год, горад
гл.— глядзі
г. п.— гарадскі пасёлак
гв.— гвардзейскі, гвардыі
ДА — Дзяржаўны архіў
інж. (инж.) — інжынерны
інш.— іншыя
истреб.— истребительный
кав.— кавалерыйскі
кап.— капітан
л.— ліст
лейт.— лейтэнант
мал. (мл.) — малодшы
отд.— отдельный
нар. (р.) — нарадзіўся
палк.— палкоўнік
пас. (пос.) — пасёлак
рад. (ряд.) — радавы
развед.— разведвальны
р-н — раён
с.— сяло
С.— старонка
сп.— стралковы полк
сд.— стралковая дывізія
с/с — сельсавет
ст.— старшы, станцыя, станіца
старш.— старшына
сярж. (серж.) — сяржант
т.— том
танк.— танкавы
ф.— фонд
Чырв. Армія — Чырвоная Армія
штурм.— штурмавы
яфр. (ефр.) — яфрэйтар

ЗМЕСТ

АД ШЧЫРАГА СЭРЦА . . . 17
Клічаўскі раён (кароткая даведка) . . . 18
ХТО МЫ І АДКУЛЬ . . . 19
Клічаў і Клічаўшчына . . . 19
Археалагічныя знаходкі сведчаць . . . 20
Як жылі ў сярэднявеччы . . . 26
Навіннасці сялян маёнтка Вольса . . . 29
Пасля прыгону . . . 31
Дакументы сведчаць . . . 40
Данясенне палкоўніка Рэйхарта шэфу жандараў князю Далгарукаву пра разгром атрада Дыбоўскага каля в. Ялоўка . . . 41
З данясення Мінскаму губернатару . . . 41
З абвінаваўчага акта па справе сялян в. Дулебна Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета Мінскай губерні . . . 41
Звесткі пра колькасць насельніцтва ў Бацэвіцкай воласці Бабруйскага павета . . . 42
З гісторыі населеных пунктаў . . . 42
«Лёс асудзіў мяне на раннюю гібель...» . . . 69
Прысуд выканаў невядомы. Урыўкі з нарыса У. Арлова . . . 71
Данясенне начальніка С.-Пецярбургскай губернскай жандарскай управы ў дэпартамент дзяржаўнай паліцыі № 2768 . . . 74
Данясенне Віленскага, Ковенскага і Гродзенскага генерал-губернатараў пану міністру ўнутраных спраў № 337 . . . 74
Ці была Клічаўшчына бязбожнай? . . . 75
З легенд і паданняў Клічаўшчыны . . . 81
ВЯЛІКІ ПЕРАЛОМ . . . 84
Подых рэвалюцыі . . . 84
На новы лад . . . 86
Што пісала пра Клічаўскі раён Бабруйская акруговая газета «Камуніст» у 1925 годзе . . . 87
Чорны цень рэпрэсій . . . 90
Эканоміка раёна напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны . . . 91
Дзьмуў вецер перамен. З успамінаў І. П. Лук'яновіча . . . 94
Клічаўскае раённае таварыства краязнаўства . . . 95
Клічаўскі кірмаш . . . 95
І назвалі калгас «Абуджэнне» . . . 97

Аб чым пісала раённая газета «Сталінскі шлях» у 1938 годзе . . . 100
Салодкае слова — воля! . . . 101
Бацэвіцкі пан — міністр Польшчы . . . 104
Палац Назабытоўскага ў Бацэвічах . . . 107
Першы прафесар геаграфіі на Беларусі . . . 108
«Незалежнасць Беларусі» . . . 113
Лёс Наталоўскага польскага сельсавета . . . 114
Жыў-быў кулак Антон . . . 115
Салодкае слова — воля! (працяг) . . . 116
Блуканне па пакутах. З успамінаў М. Л. Кушнер . . . 123
Вернутыя імёны. Спіс жыхароў Клічаўскага раёна, якія беспадстаўна рэпрэсіраваныя і рэабілітаваныя . . . 124
Удзельнікі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі . . . 151
Аб чым пісала раённая газета «Сталінскі шлях» у 1940 годзе . . . 152
Воіны-землякі, якія загінулі ў савецка-фінляндскую вайну . . . 154
Аб чым пісала раённая газета «Сталінскі шлях» у 1941 годзе . . . 156
У ПОЛЫМІ ВАЙНЫ . . . 157
Партызанскі край . . . 157
Клічаўская партызанская зона . . . 171
Партызанскія фарміраванні . . . 171
Арганізатары партызанскага руху . . . 175
Баявыя аперацыі . . . 177
Бой за Клічаў . . . 178
Развадаўскі бой . . . 182
Зарэчанска-Усохскі бой . . . 183
Дуброўскі бой . . . 184
Ваевіцкі бой . . . 185
На пераправе ў Заполлі . . . 188
Дакументы сведчаць . . . 188
З пастановы Клічаўскага падпольнага райкома КП(б)Б і выканкома раённага Савета дэпутатаў працоўных аб узнаўленні савецкай улады ў Клічаўскім раёне . . . 188
Пастанова Клічаўскага падпольнага райкома КП(б)Б і выканкома раённага савета дэпутатаў працоўных аб веснавой сяўбе і карыстанні зямлёю на тэрыторыі Клічаўскага савецкага раёна ў 1942 г. . . . 188
Пратакол № 5 пасяджэння Клічаўскага падпольнага райкома КП(б)Б па пытанні рэалізацыі пастановы ад 23 красавіка 1942 г. «Аб стварэнні фондаў таварыскай дапамогі» . . . 189
Пастанова Клічаўскага падпольнага райкома КП(б)Б і выканкома раённага Савета дэпутатаў працоўных аб размеркаванні азімых пасеваў, сенакосных угоддзяў і стварэнні ў раёне харчовых фондаў абароны . . . 189
Пісьмо сакратара падпольнага РК КП(б)Б Я. І. Зайца ў ЦК КП(б)Б з просьбай прыслаць урача, медыкаменты і інш. . . . 190
Рашэнне ўпаўнаважанага ЦК ЛКСМБ па Магілёўскай вобл. І. А. Матыля аб склінанні і парадку правядзення раённых падпольных камсамольскіх канферэнцый . . . 191
Пратакол 1-й падпольнай камсамольскай канферэнцыі Клічаўскай раённай арганізацыі ЛКСМБ . . . 191
Пастанова Клічаўскага падпольнага райкома КП(б)Б Магілёўскай вобл. аб зборы сродкаў на пабудову танкавай калоны «Беларускі партызан» . . . 192
Зводка штаба ваенна-аператыўнай групы пры Магілёўскім падпольным абкоме КП(б)Б аб разгроме партызанамі гарнізонаў праціўніка 20 і 21 красавіка 1943 г. . . . 193
Загад № 11 ваенна-аператыўнай групы пры Магілёўскім падпольным абкоме КП(б)Б аб адначасовым разгроме партызанамі 8 варожых гарнізонаў у ноч на 13 красавіка 1943 г. . . . 194
З палітданясення сакратара Клічаўскага падпольнага райкома ЛКСМБ М. Д. Лапцёнка . . . 194
Партызанскі друк . . . 195
Неслі людзям праўду . . . 200

Карныя аперацыі . . . 201
Крывавыя сляды карнікаў . . . 206
«Галоўка яго баліць...» . . . 206
Несхадзімае гора . . . 208
У святы дзень, на Пакровы . . . 212
Усакінскі лес . . . 215
Вось так і жылі . . . 223
Была і свая самаабарона . . . 224
Нартызанскі млын . . . 225
Ваявалі ўсёй сям'ёй . . . 226
«Не сорамна за сваіх настаўнікаў і вучняў» . . . 228
Маладосць ёсць маладосць . . . 229
Пакуль б'ецца сэрца . . . 230
Хвацкія хлопцы-падрыўнікі . . . 233
Засады на шашы . . . 234
Вось такія яны, Кукушкіны . . . 234
Браты-героі . . . 237
Разгромілі акупантаў . . . 238
Выбух на чыгунцы . . . 239
У тую трывожную ноч . . . 240
І словам гарачым, і справамі баявымі . . . 241
«Лепш бы мяне...» . . . 242
Пабрацімы . . . 242
Клятве Гінакрата не здрадзілі . . . 245
З успамінаў У. А. Ціхамірава . . . 245
Першае выпрабаванне . . . 247
Так ваявалі медыкі . . . 248
«Нізка пакланіцеся доктару» . . . 250
Апошні бой героя . . . 251
Вызваленне . . . 253
На вогненных франтавых дарогах . . . 254
Паядынак . . . 257
Было наканавана лятаць . . . 260
Баявы шлях Міхаіла Буцанца . . . 260
Распісаўся на рэйхстагу . . . 261
Тройчы перамог смерць . . . 261
Бамбіў Берлін у 1941 . . . 262
Прысягаў жыццём . . . 262
Абаронца Брэсцкай крэпасці . . . 263
Крылаты Аляксей Вікторчык . . . 264
Танкіст Іван Сокалаў . . . 264
Ад Масквы да Берліна . . . 264
Змагаўся і ў Войску Польскім . . . 266
На вайне як на вайне . . . 266
І франтавік, і нартызан . . . 267
Красная плошча ў маім лёсе . . . 268
Курс — партызанскі аэрадром . . . 268
Воіны-землякі, якія загінулі і прапалі без вестак на франтах Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг. . . . 269
Воины Красной Армии, погибшие при обороне и освобождении Кличевского района и захороненные на его территории . . . 347
Партизаны — уроженцы других районов и областей, которые погибли и похоронены на территории Кличевского района . . . 353
Загінуўшыя партызаны і асобы, якія актыўна садзейнічалі партызанскаму руху, удзельнікі антыфашысцкага руху і падполля, члены іх сем'яў, мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору . . . 359
ПАД МІРНЫМ НЕБАМ . . . 409
Сённяшні дзень Клічаўшчыны . . . 415
Нашы знакамітыя землякі . . . 420
З гісторыі школы . . . 421
Магілёўскі саўгас-тэхнікум . . . 422
Наш лясгас . . . 422

Першыя фермеры . . . 423
Вялікая сям'я Кундзікавых . . . 424
Чарнобыльскі след . . . 425
Апошняя вышыня маёра . . . 425
Дараваць можна, але забыць нельга . . . 426
Людзі працоўнай доблесці . . . 427
Заслужаныя работнікі Беларусі . . . 432
Нашы землякі — беларускія пісьменнікі . . . 435
Шлях у навуку . . . 441
Лунаюць песні над Нясятай . . . 447
І адгукнецца ў сэрцы... . . . 449
Страдывары з Заполля . . . 450
«Благаслаўляю прыгажосць» . . . 451
Харавы калектыў . . . 452
Агапа-чарадзейка . . . 452
«Пошук, творчасць, ініцыятыва» . . . 453
Боль Афганістана . . . 454
Курган Бессмяротнасці . . . 454
Усакінскі мемарыяльны комплекс . . . 455
Музей народнай славы . . . 457
Клічаўскі вальс . . . 458

У пошуку, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў да кнігі «Памяць» прымалі ўдзел:

Прадстаўнікі грамадскасці Клічаўскага раёна: У. Р. Альцыванович, М. В. Аляхновіч, І. П. Барышчык, І. Ф. Галацэвіч, С. С. Ждановіч, Т. М. Ільянава, М. І. Ісаічкін, Т. М. Касцюкевіч, В. Р. Коўрык, М. І. Круты, С. В. Кудзін, В. Ц. Лепікаў, В. М. Лепа, С. І. Лісаковіч, К. Л. Малішэўская, Г. І. Маркава, І. В. Маркаў, С. В. Мароз, В. Р. Мігдасёў, А. П. Міхалап, А. В. Мязян, У. М. Назараў, У. У. Новік, Л. Я. Русецкая, З. І. Самец, З. Е. Самуйлёнак, Т. М. Талпыга, М. М. Тарасава, Н. М. Фралкова, Т. В. Харкевіч, К. С. Харлап, Н. У. Храмянкова, В. П. Шыдлоўскі.

Навукоўцы Мінска: У. Дз. Будзько, А. І. Валахановіч, Г. Дз. Кнацько, В. Я. Кудрашоў, А. Л. Манаенкаў, У. С. Пасэ, М. А. Сакалова.

Над кнігай працавалі: навуковыя рэдактары: У. А. Салановіч (рэдактар-складальнік), Т. І. Малашэвіч, Н. П. Ракіцкая, В. А. Юшкевіч; літаратурны кантроль: Т. М. Бутэвіч (загадчык рэдакцыі), навуковыя рэдактары М. А. Маўзон, Т. П. Панчанка, Е. П. Фешчанка, рэдактар М. К. Хадыка; рэдактар-картограф В. Ф. Надзененка; фотакарэспандэнты: Г. М. Бажанкоў (загадчык рэдакцыі), В. У. Харчанка.

Фота В. У. Харчанкі, з архіва БелЭн, Клічаўскага музея народнай славы, асабістых архіваў.

Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Клічаўс. р-на / Бела-
П15 рус. Энцыкл.; Гал. рэд. Беларус. Энцыкл.: Б. І. Са-
чанка (гал. рэд.) і інш.; Рэдактар-складальнік
У. А. Салановіч; мастак А. М. Хількевіч.— Мн.:
БелЭн, 1995.— 462 с.

ISBN 985-11-0009 9

Мэта гэтага выдання — на канкрэтным фактычным матэрыяле пазнаёміць чытачоў з гісторыяй Клічаўскага раёна ад глыбокай старажытнасці да нашых дзён. У кнізе змешчаны вялікая колькасць архіўных дакументаў (многія з іх друкуюцца ўпершыню), публікацыі з кніг, газет і часопісаў, успаміны ўдзельнікаў і відавочцаў падзей. Да кожнага раздзела даюцца гісторыка-краязнаўчыя нарысы. Цэнтральнае месца адведзена падзеям, што здзейснены ў час Вялікай Айчыннай вайны ў гэтым партызанскім краі.

Клічаўская хроніка будзе цікава не толькі жыхарам раёна, а і ўсім, хто змагаўся тут з акупантамі, а таксама тым, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, сваёй Бацькаўшчыны.

9470620000—011
П ——————— 13—95
М 318(03)—95

ББК 63.3(2Б)

Масава-палітычнае выданне

ПАМЯЦЬ

Гісторыка-дакументальная хроніка Клічаўскага раёна.

Мастацкі рэдактар *Г. І. Емец*
Тэхнічныя рэдактары: *М. І. Грыневіч, І. І. Цыцаня, Н. М. Шэвель*
Карэктары: *В. І. Багдановіч, Л. С. Зіза, Г. Дз. Навіцкая, А. В. Семенчукова, Л. У. Сідарава, Л. В. Суцягіна, А. А. Федасеева*

Здадзена ў набор 19.01.94. Падпісана да друку 06.04.95. Фармат 60×90 1/16. Папера афсетная. Гарнітура звычайная новая. Друк афсетны. Ум.-друк. арк. 29,0. Ум. фарб.-адбіткаў 33,0. Ул.-выд. арк. 47,41. Тыраж 3000 экз. Зак. 732.

Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 10. Рэспубліка Беларусь. 220072, Мінск, вул. Ф. Скарыны, 15а.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. Рэспубліка Беларусь. 220005, Мінск, вул. Чырвоная, 23.